Зямля, якой ужо не ўбачыш

Лідчына XVIII — XIX стагоддзяў ва ўспамінах

Зямля, якой ужо не ўбачыш

Лідчына XVIII — XIX стагоддзяў ва ўспамінах

2026

УДК 82-3
ББК 84
З-99

Шрифты предоставлены компанией «ПараТайп»

Зямля, якой ужо не ўбачыш : Лідчына XVIII — XIX стагоддзяў ва ўспамінах / сост. Леанід Лаўрэш. — [б. м.] : [б. и.], 2026. — 368 с. [б. н.]

З-99

Гэта другая кніга ў серыі «Лідскі кнігазбор», заснаванай ў 2018 годзе. Кніга складаецца з лідскіх мемуараў XVIII — XIX стагоддзя.

УДК 82-3
ББК 84

© Леанід Лаўрэш, составитель, 2026

pawet.net

Уступ

Гістарычная Лідчына складалася раней з сучасных Лідскага, Шчучынскага і Воранаўскага раёнаў Гродзенскай вобласці (у 1920–30-х гг. у Лідскі павет уваходзіла таксама і частка сучаснага Іўеўскага раёна), яшчэ адна частка гістарычнай Лідчыны засталася ў сучаснай Летувіскай рэспубліцы. Гэтая зямля мае цікавую і слаўную гісторыю, і ўспаміны жыхароў Лідчыны, сучаснікаў і актыўных удзельнікаў гістарычных падзей — найцікавейшыя крыніцы для вывучэння нашай гісторыі.

Менавіта ўспаміны канкрэтных, жывых і апрыёры суб'ектыўных людзей, уносяць жывы струмень у апісанне даўніны, дазваляюць зразумець, чым і дзеля чаго жылі людзі, што іх хвалявала, у што яны верылі і на каго спадзяваліся. Я шмат гадоў прысвяціў збору мемуараў, датычных Лідчыны, і частка гэтых тэкстаў надрукавана ў зборніку.

Гэтая кніга змяшчае лідскія ўспаміны XIX ст. Пры складанні кнігі, я сыходзіў з канцэпцыі «Доўгага XIX стагоддзя» — гістарычнага перыяду, які ахоплівае час ад Французскай рэвалюцыі (1789 г.) да пачатку Першай сусветнай вайны (1914 г.), канцэпцыі, прапанаванай гісторыкам Эрыкам Хобсбаўмам. Дарэчы, Хобсбаўм папулярызаваў таксама і паняцце «Кароткага XX стагоддзя» ў прамежку паміж 1914 і 1991 г.

Нажаль, лідскіх мемуараў, ранейшых за пачатак XIX ст., акрамя ўспамінаў прафесара Станіслава Юндзіла, выявіць пакуль не ўдалося.

Важнымі тэкстамі для гісторыі Лідчыны з'яўляюцца ўспаміны Мірона-Браніслава Нарбута — пляменніка гісторыка Тэадора Нарбута, паўстанца 1863 г., чалавека адукаванага і дасведчанага, дачкі гісторыка — Тэадоры Нарбут (Манчунскай). Таксама друкуюцца ўспаміны з дзяцінства пра паўстанне 1863 г. заснавальніка беларускай археалогіі Вандаліна Шукевіча, лідскага суддзі Юльяна Гжымайлы-Прыбыткі і Альжбеты Табенскай. Мемуары паўстанцаў адцяняюць успаміны афіцэраў рускага войска. Сярод іншых цікавых тэкстаў, вялікую каштоўнасць маюць успаміны Яўстаха Шалевіча і Міхала Шымялевіча.

Міхал Шымялевіч быў найбольш дасведчаным гісторыкам і краязнаўцам нашага горада першай паловы XX ст., але лідскае краязнаўства мае больш глыбокія карані. Думаю, тут дапушчальна будзе зрабіць маленькае адступленне. Першым лідскім краязнаўцам можна назваць бацьку беларускай гісторыі Тэадора Нарбута, які нажаль не пакінуў мемуараў, але напісаў шмат грунтоўных тэкстаў у тым ліку і па гісторыі Лідчыны. Археолаг, этно-

граф, фальклярыст і лідскі краязнавец Вандалін Шукевіч нарадзіўся ў часы, калі яшчэ жыў Нарбут. Гэты чалавек шмат зрабіў не толькі ў галіне археалогіі Лідчыны, але таксама займаўся этнаграфіяй, быў знаным і паважаным грамадскім дзеячам. Да першай генерацыі лідскіх краязнаўцаў можна аднесці і Маламажэйкаўскага святара Льва Савіцкага, які хоць і адносіўся да плыні заходнерусістаў, але напісаў вельмі цікавую гісторыю сваёй царквы.

Другая генерацыя лідскіх краязнаўцаў з'явілася на пачатку XX ст. і дзейнічала да 1939 г. Сапраўднай вяршыняй іх дзейнасці было выданне гістарычна-краязнаўчай газеты «Лідская зямля» (Ziemia Lidzka).

Здаецца, што увесь масіў тэкстаў гэтай кнігі дае адносна добрае уяўленне пра жыццё Лідчыны ў XIX ст. Я, як складальнік кнігі, спадзяюся, што яна будзе цікавай і карыснай для ўсіх хто вывучае ці проста цікавіцца гісторыяй нашага края. Хацелася б верыць, што з часам, выйдзе і наступны том лідскіх успамінаў, які складзецца з тэкстаў, што не патрапілі ў гэты.

Перакладчыкам і каментатарам тэкстаў, калі не пазначаны іншыя асобы, з'яўляецца Леанід Лаўрэш.

З кнігі знакамітага прафесара біялогіі Станіслава Юндзіла: «Успаміны майго жыцця»[1]

Я нарадзіўся 6 траўня 1761 года ў Лідскім павеце, у Ясенцах, у бедным дзедзічным маёнтку майго бацькі, Бенедыкта Дуніна-Юндзіла. Я быў старэйшым сынам Ружы Даўгятлоўны, другой жонкі майго бацькі. Ад першага шлюбу з Квяткевічоўнай ён меў сыноў Шымона, Міхала і дачку Марцыяну, якая выйшла замуж за Насевіча. Мой малодшы брат Юзаф, памёр у дзяцінстве. Праз чатыры ці пяць гадоў пасля майго нараджэння я страціў маці, і мой бацька ажаніўся з Мартай Сангіноўнай, якая, пад разважлівым бацькоўскім наглядам, не стала ля мяне мачыхай.

Беднасць маёнтка майго бацькі *(Такім чынам, Юндзіл не паходзіў з багатай сям'і, як пісаў Юзаф Бялінскі ў кнізе: Uniwersytet wilenski. T. III. S. 205.)* не дазволіла яму даць двум маім старэйшым братам належную адукацыю ў школах. Таму пазней, працай і намаганнямі, а таксама невялікім пасагам маёй маці, некалькі павялічыўшы сваё багацце, бацька больш клапаціўся пра маё выхаванне. На шостым ці сёмым годзе я пачаў вучыцца чытаць, пісаць і лічыць, а потым, праз настаўнікаў, якіх прывезлі ў маёнтак, пачаў вывучаць лацінскую граматыку па падручніку Альвара і чытаць у старых паперах стараруская (стабеларускія — *Л. Л.*) рукапісы[2]. Калі ўжо крыху вывучыў лацінскую граматыку і меў ужо пэўны прагрэс у пісьме, бацьку здавалася, што адпраўка мяне з дому палегчыць маё далейшае выхаванне, а магчымасць практыкавацца ў эканамічных разліках і юрыдычных пытаннях забяспечыць маю будучыню.

Таму ў красавіку 1773 года ён перадаў мяне Казіміру Даўгялу, паўнамоцнаму камісару літоўскага стражніка Пацея, у Алькеніках. Даўгяла, хоць і меў адно прозвішча з маёй маці, не быў маім сваяком. Але з-за фінансавых даўгоў перад маім бацькам ён абяцаў арганізаваць для мяне вывучэнне вышэйзгаданых прадметаў. Гэта навучанне было нядоўгім — літоўскі стражнік Пацей памёр у тым жа годзе, мой настаўнік пакінуў службу, і восенню я

[1] Pamiętniki Ks. Stanislawa Jundziłła. Kraków, 1905. S. 4—5.

[2] У Юндзіла: *«… przez sprowadzonych do domu nauczycielow grammatyki łacińskiej Alwara i czytania na starych papierach ruskiego skoropisu»*. З чаго бачна, што каля 1770-га года, маладога шляхціца вучылі старабеларускай мове нароўне з лацінай, якая тады была мовай навукі і адукацыі, і раней за полькую мову.

вярнуўся дадому. Бацька не дазваляў мне доўга адпачываць дома. Увесь час прасіў мяне заняцца чымсьці карысным і хутка прыдумаў для мяне новую працу. У той час было прынята, каб чопавы падатак[1] у павеце збіралі адмысловыя асобы, якіх называлі контрагенты. Блізкі сусед, Ежы Хмялеўскі, атрымаў гэтую малавыгадную пасаду, і, паколькі ён сам не ўмеў пісаць, па просьбе бацькі ўзяў мяне памочнікам. Такім чынам, падарожнічаўшы амаль два месяцы з карчмы ў карчму, з мястэчка ў мястэчка, я змог убачыць увесь Лідскі павет уздоўж і ўпоперак і прывезці дадому некалькі заробку.

У 1774 годзе мой добры бацька, лічачы мае першыя юнацкія гады амаль дарэмна змарнаванымі і бачачы маё пастаяннае жаданне вучыцца, нарэшце, падштурхнуты маімі паўторнымі просьбамі, ахвяраваў сваімі старанна сабранымі грошамі і вырашыў ва ўзросце чатырнаццаць гадоў запісаць мяне ў школу піяраў у Лідзе. З самага пачатку майго знаходжання ў школе я заўважыў, наколькі карыснымі грунтоўнымі былі пачаткі лацінскай граматыкі, якія я атрымаў ад сваіх хатніх настаўнікаў. Я не толькі апынуўся на роўні амаль з усімі сваімі аднакласнікамі ў першым класе, але нават лёгка пераўзышоў многіх, так што адразу пасля першага года мяне перавялі ў другі клас, а ў наступным годзе я таксама прасунуўся, і лёгка быў пераведзены ў трэці клас (у кожным класе вучыліся па два гады — *Л. Л.*). Такім чынам, пасля першых двух гадоў я перастаў быць цяжарам для майго бацькі, бо дзякуючы маім поспехам у вучобе і належнаму выкананню ўсіх абавязкаў, школьныя ўлады не толькі вызвалілі мяне ад утрымання наглядчыка нада мной, але праз некалькі месяцаў, нягледзячы на маладосць, я сам стаў хатнім наглядчыкам за іншым вучнем.

1777 год стаў больш важным і вырашальным у маім жыцці. У гэтым годзе, разважаючы, які далейшы і больш пэўны жыццёвы шлях я павінен абраць, без чыіх-небудзь угавораў, падыходаў ці парадаў, памятаючы толькі пра выпадковыя прапановы майго бацькі шукаць сваю будучыню ў святарстве, яшчэ не маючы шаснаццаці гадоў, у красавіку я заявіў айцу Вольнеру, рэктару піяраў у Лідзе, што маю жаданне далучыцца да іх ордэна. Наколькі я памятаю, рэктар з разуменнем прыняў маю заяву і хутка пасля гэтага, развітаўшыся з бацькам і сям'ёй, я адправіўся ў Шчучын, а адтуль неўзабаве, каб пачаць свой навіцыят, у Любяшаў. У тым жа годзе, у пачатку ліпеня, я апрануў манаскі строй піяраў.

Статут гэтай Кангрэгацыі прадугледжваў два гады навіцыяту, на працягу якіх я меў час падумаць, ці працягваць гэтую справу, ці адмовіцца ад яе. Я меў права вывучаць свае схільнасці…

[1] Чопавы падатак — падатак з усякага роду напояў як замежных, так і мясцовых. У каралеўскіх гарадах (Ліда — каралеўскі горад) захоўваўся да канца XVIII ст. і перавышаў ўсе астатнія падаткі разам узятыя.

Лідчына ва ўспамінах Яўхіма Лелевеля[1]

Студзень, 1805 г.

Выехалі з Гародні і некалькі вёрст ехалі чыстым полем… Начавалі ў Мількаўшчыне і, паехаўшы далей, наблізіліся да піва Паца. … ніхто не абміне гэтай карчмы, якую ўтрымлівае Пац, дзе можна атрымаць пацаўскае піва, якое падобнае на варшаўскае, але толькі падобнае.

Шчучын — горад, слаўны піярамі.

Едучы далей, убачылі мураваны двор з дзвюма драўлянымі афіцынамі — было бачна, што гэта раней слаўнае, а зараз занядбанае месца. Гэта Вялікае Мажэйкава. Перад дваром, да брамы, трэба праехаць па ездні паміж двума сажалкамі. Далей на шляху стаіць вялікая мураваная карчма. Мажэйкава належыць Янкоўскаму.

На начлег спыніліся ў Мыто. Гэта вёска, з якой мы ў цемры выехалі рана і пераблыталі дарогу. Але недарма, бо прычынай памылкі была не цемра, а тое, што Казімір Гаваровіч (спадарожнік Лелявеля — *Л. Л.*) недалёка адсюль меў сёстраў, з якімі хацеў сустрэцца. Гэтак фурман дадаў нам вялікі кавалак дарогі. Але магчымасць убачыць Ліду, была добрай платай за памылковы выбар дарогі з Мыто[2].

Ліда — мураваны горад з драўлянымі сценамі[3]. Тут ёсць толькі мураваныя касцёлы, з іх піярскі касцёл ужо 6 гадоў як накрыўся дахам і белым пакрыццём[4]. Апрача гэтых двух з паловай касцёлаў[5] ёсць яшчэ замак з чатырма высокімі сценамі, які сведчаць што Ліда была горадам літоўскіх князёў і мела здольнасць да абароны. Па рагах замка стаяць разваленыя вежы, з трох бакоў замка цячэ рака Лідзейка[6] а за замкам — драўляная пустая царква[7]. Больш няма мураваных пабудоў, толькі адна карчма мае мураваную пярэднюю сцяну. Корчмаў шмат, і яны новыя. У Лідзе Казімір су-

---

[1] Listy Joachima Lelewela: oddział pierwszy: listy do rodzeństwa pisane. Poznań, 1878. T. 1. S. 43–44., 338., 340., 421–422.

[2] З Мыто ў Вільню Лелявель павінен быў паехаць па так званым Мытлянскіму тракце праз Заполле і далей праз Жырмуны. Але збочыў на Ліду.

[3] Гэта метафара Лелявеля кажа пра наяўнасць мураванага замка з касцёламі ў цалкам драўляным горадзе.

[4] Верагодна, маецца на ўвазе белы тынк.

[5] Касцёлы: фарны, кармеліцкі і трэці, недабудаваны, піярскі — адсюль «два з паловай касцёлы».

[6] Насамрэч рэкі Лідзейка і Каменка.

[7] Грэка-каталіцкая царква Уваскрасення Гасподняга

стрэўся з сёстрамі, пасля чаго мы паехалі далей і спыніліся ў Жырмунах, княстве князя Радзівіла. Недалёка стаіць княскі двор, а каля драўлянага касцёла з мураванымі калонамі маецца дзве карчмы. У адной з іх мы спыніліся і дачакаліся астранома Пачобута. Адсюль мы паехалі разам, але ён раней за нас прыехаў у Вільню.

Слаўнае мястэчка Воранава мінулі кругам і начавалі ў Беняконях. Тут дзве карчмы за некалькі крокаў адна ад другой. Адна карчма з чырвонымі вокнамі. Была нядзеля і таму мы разам з Пачобутам паслухалі імшу і паехалі далей. Мінуўшы Малыя і Вялікія Салешнікі мы патрапілі ў карчму «Альжбета», якая славілася абдзіралаўкай. Гэта тая карчма, у якой адразу пасля яе пабудовы, гаспадар пільнаваў, хто ж першы ў яе ўвойдзе. Першай ўвайшла кабета Альжбэтка, чым і надала карчме сваё імя. Такім чынам яна ўвекавечылася на той час, покуль будзе стаяць карчма. Вечарам прыехалі ў Вільню і, хоць была ноч, распакавалі рэчы.

…

Студзень, 1821 г.

[На шляху з Слоніма] … пасля перавозу цераз Нёман перамагалі пяскі. Пад'язджаючы да Ліды пачалася горшая дарога, грэблі разгразліся, а ў самой Лідзе ўтварылася страшнае балота, бо тут дрэнны брук. Гэта была нядзеля. Стаяла дрэннае надвор'е, і дні былі прыкрыя і шэрыя. Буда нашай карэты бараніла ад ветру, які дуў у тыл. […]

Праўдай з'яўляецца тое, што дарогі зараз не спакойныя. Каля самай Вільні знойдзена разбітая брычка. На той дарозе, якой мы ехалі ў ваколіцах Ліды, бачылі брычку са слядамі разбою, без каня і людзей. Кажуць, што на іншым тракце каля Мерачы знайшлі двух забітых маладых Бярэтаў — сыноў варшаўскага архітэктара і віленскага муляра.

….

Кастрычнік, 1824 г.

…Уначы… пераправіліся цераз Нёман і даехалі да тракту, які вядзе з Гародні ў Вільню. Ужо было зразумела, што да шабата (яўрэйскае рэлігійнае свята, у дадзеным выпадку маецца на ўвазе субота — *Л. Л.*) мы да Вільні не даедзем, і таму павярнулі на Ліду, дзе патомак Арона (яўрэй-фурман — *Л. Л.*) меўся адправіць набажэнства. Тут Анацэвіч[1] меў сястру, якая была замужам за доктарам медыцыны Счубам, таксама тут ён меў знаёмага палкоўніка і таму затрымаўся ў Лідзе. А я тым часам пасярод чатырох муроў

[1] Анацэвіч пісаў пра Ліду падчас праезду яго праз адну частку Гарадзенскай губерні ў ліпені і жніўні 1822 г.: *«На шляху з Вільны ў Ліду, мястэчка Жырмуны абазначае мяжу паміж рускай (беларускай. — Л. Л.) і літоўскай мовамі. Аднак у ваколіцах ёсць адна вёска, дзе жыхары размаўляюць па-літоўску, хоць навокал пануе руская мова (беларуская — Л. Л.) На жаль, я не меў часу наведаць у Лідзе архіў, вельмі старажытны…»*. Цыт. па: Габрусевіч С. А., Марозава С. В. Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё. Спадчына. Гродна, 2005. С. 186.

замка… дасканала і спакойна, без кантат і клёкату Жэготы (мянушка прафесара Анацэвіча — *Л. Л.*) чытаў граматычныя абсервацыі Мразінскага[1]. Хутка субота закончылася, і ўначы мы рушылі ў Вільню. Аднак з'явіліся іншыя праблемы, горшай з якой было сапсаванае кола. У поўдзень спыніліся ў Яшунах дзе жыве Міхал Балінскі — зяць Снядэцкага ….

[1] Юзаф Мразінскі (1784–1839), польскі генерал і мовазнавец. Лелявель, верагодна, у Лідзе чытаў яго нядаўна надрукаваную кнігу: Mroziński Józef. Pierwsze zasady gramatyki języka polskiego. Warszawa, 1822.

Дзённік дамініканскага візітатара (фрагмент)[1]

Аўтар дзённіка — правінцыял ордэна Дамініканцаў, але яго імя ў публікацыі не ўказана.

1822 г., лістапад.

6. Выезд з Гародні праз Скідаль міма маёнтка пана Заха, на начлег у карчме Андрушаўцы[2]. Карчма дрэнная, панства Нарбуты запрашалі на начлег да сабе ў маёнтак.

7. Праз Шайбакполе прыехалі ў Васілішкі.

8. Васілішкі — пачатак візітацыі.

9. Выслана пошта да Ліды. Гасцяванне заняло цэлы дзень. Дні стаяць дажджлівыя і цёплыя.

12. Вялікі вецер. На кватэру прыйшлі людзі, яны плачуць, у мясцовасці голад. Exekucya[3] ў яўрэяў неміласэрная, яўрэі давялі да апошняй галечы.

13. Дождж. Людзі Васілішак, ачмураныя некаторымі злымі людзьмі, падалі скаргу на прыёра[4], сабралі шмат подпісаў. Але многія нічога не зналі пра скаргу. Людзі ў Васілішках сапсаваныя блізкасцю горада і яўрэямі. Зладзейства і п'янства для большай часткі сталася звычайнай з'явай.

14. Прыгожы дзень. Мароз.

15. Ранні выезд праз Мыто[5]. Мыто калісьці было прыгожым і добраўпарадкаваным мястэчкам: карчма дзедзіча васпана Паца, зараз карчма заняпала, стаіць паштовы дом, уніяцкая царква, як руіна, грэбля ў дрэнным стане. Паснедалі ў крупаўскай карчме. Нікчэмна, належыць Скіндарам. Ліда засталася па правай руцэ. Начавалі мы ў карчме ксяндзоў піяраў, карчма была б зручная, калі б не прусакі — казуркі занесеныя з глыбіні Расіі ў

---

[1] Археографический сборник документов издаваемый при управлении Виленского учебного округа. Вильна, 1904. Т. 14. С. 136–137.

[2] Андрушаўцы (Andruszowce), васпана Ельца двор, вёска і дзве карчмы, капліца уніяцкая, у напрамку паміж поўначчу і летнім усходам, чвэрць мілі ад Ляцкага касцёла — Гл: Вопісы парафій Лідскага дэканата у 1784 г. // Лідскі Летапісец. 2013. 2 (62). С. 41.

[3] У дадзеным тэксце слова мае сэнс «эксплуатацыя».

[4] Прыёр — тытул настаяцеля невялікага мужчынскага каталіцкага кляштара або старэйшага пасля абата-настаяцеля члена манаскай супольнасці (першага памочніка абата). Манастыр, у якім мае месца жыхарства прыёр, называецца прыёрства.

[5] Мыто (Myto), мястэчка і уніяцкая царква васпана Паца — Гл: Вопісы парафій Лідскага дэканата у 1784 г. // Лідскі Летапісец 2013. №4 (64). С. 32.

Літву. Гэтая казурка завецца прусаком таму, што яна тут з'явілася такім чынам: была прынесеная азіяцкімі ордамі падчас паходу рускіх на Прусію[1], у валадараннe царыцы Лізаветы[2].

16. Дзень пахмурны. Каля шостай гадзіны выехалі з начлегу, у лесе каля Салешнікаў нас спаткалі людзі, адзін хаваўся у рове, другі ішоў з лесу. Коні панеслі і толькі выпадкова не нарабілі шкоды. Вандроўнік папрасіўся на службу, але, пэўна, намер меў скарыстацца з паламаных вазоў. Начлег меў у карчме каля млына панны Гараінавай.

[1] Руска-пруская вайна 1757—1762 гг. Гл. па тэме: Лаўрэш Леанід. «На жаль, у нас не водзяцца гэтыя звяркі...» Якая армія прынесла ў Беларусь тараканаў? // Наша Гісторыя. 2020. №5. С. 89–91.

[2] Лізавета Пятроўна (1709–1761) — расійская імператрыца з дынастыі Раманавых.

Фрагмент успамінаў Андрэя Розэна[1]

Зімовыя кватэры нам вызначылі ў Гарадзенскай губерні: штабу дывізіі — у Лідзе, а штабу палка — у Беліцы. Я кватараваў у фальварку[2] каля Ішчалны, што належаў у той час удаве Лясковіч[3], якая мела дарослую дачку, панну Францішку[4]. Уваходзячы ў вялікі салон, заўважаем на сцяне вялікую залатую раму, але ў ёй не абраз, а толькі надпіс на пергаменце: *«У такім і такім годзе, месяцы і дні Аляксандр I Дабраславёны сваёй прысутнасцю ўганараваў замак Ішчална»*. Па-свецку выхаваная дачка гаспадыні паказала мне дыяментавую стралу, падараваную ёй царом, якому яна грала на арфе[5]. Гэты музычны інструмент для добрай акустыкі, меў свой асобны круглы пакой з высокай столлю, гэты пакой знаходзіўся каля салона. Грала панна Францішка з вялікім артыстызмам і пачуццём. У святочныя дні я бываў у іх дамовай капліцы. Кватараваў тады за тры вярсты. Не было куды траціць доўгія вечары, бо можна было толькі граць ў цвіка[6] са старым, які ўгаворваў мяне такімі словамі: *«Пан барон, хто не рызыкуе, той не мае»*. З

---

[1] Lużne obrazki. Rok 1821 // Ziemia Lidzka. 1937. №12. (Фрагмент з кнігі: Розен Андрей. Одиссея недавних дней: В ссылку. Москва, 1899.) Аўтар, чалавек з арыстакратычнай эстляндскай сям'і, 20 красавіка 1818 г. атрымаў чын падпаручніка лейб-гвардыі Фінляндскага палка, а ў красавіку 1821 г. разам з усім корпусам гвардыі маршыраваў з Пецярбурга ў «Літоўскую губерню», адкуль вярнуўся ў 1822 г. За ўдзел у гуртках «декабристов» у 1826 г. яго судзілі, пазбавілі правоў і саслалі ў Сібір. Пасля доўгіх гадоў выгнання вярнуўся дахаты і дажыў да сівой старасці.

[2] Фальварак Баяры, за 3 вярсты ад Ішчалны.

[3] Пра Караля Валя гл. успаміны Мірона Браніслава Нарбута.

[4] Элеанора Лясковіч з Шукевічаў, удава па мужу Каралю. Караль Лясковіч, з 1802 г. маршалак Лідскага павета, памёр у 1818 г. Іх дачка Францішка, дзедзічка Ішчалны, Ваверкі, Баброў і г. д., выйшла замуж за Антона Скарбак-Важынскага, маршалка Цельшаўскага павета. Была знанай і паважанай арфісткай. Др. Юзаф Франк, апавядаючы пра арганізаваны ім дабрачынны канцэрт у Вільні ў 1815 г., заўважыў: «Панна Лясковіч, дачка маршалка, абяцала граць на арфе» (Pamiętniki. Wilno, 1913.). Гэта слаўная арфа цудоўнай італьянскай работы ўпрыгожвала салон у ішчалнскім палацы яшчэ ў 1915 г. — *Заўвага публікатара гэта артыкула ў «Лідскай Зямлі» Міхала Шымялевіча.*

[5] У Лідскім павеце, імператар пешшу наведаў Ішчалну — маёнтак Караля Лясковіча, піў з Лясковічам гарбату, слухаў ігру дачкі гаспадара Ішчалны на арфе. Каля Ішчалны рускі імператар інспектаваў 4-ы корпус генерал-ад'ютанта Шувалава (штаб у Васілішках) які складаўся з 11-й і 23-й пяхотных дывізій, аднаго гусарскага палка з 2-й кавалерыйскай дывізіі і дзвюх артылерыйскіх брыгад. — Гл: Бутурлин Д. История нашествия императора Наполеона на Россию. Т.1. С. Петербург, 1837. С. 88–89.

[6] Цвік — картачная гульня.

дачкой (паннай Лясковіч — *Л. Л.*) мы чыталі творы Шатабрыяна і Ламартына. Яна мела ладную служку-яўрэйку, якую навярнула ў каталіцкую веру. Найчасцей і з запалам мы размаўлялі на рэлігійныя тэмы: здавалася мне, што яна разам з пробашчам старалася зрабіць мяне каталіком. Неяк адведаў Маліноўскага, які стаяў са сваёй ротай у Шчучыне. Там звыкла жылі два лекары. Адзін з іх меў прыгожую жонку і, зачараваны яе шармам, я пайшоў на прыступ. Маліноўскі з гэтага поваду жартаваў, што яна была падобна на яго сястру Ганну, якую я ўбачыў першы раз два гады таму, але яшчэ не ведаў, што яна стане маім лёсам.

У Лідзе ў святочныя і нядзельныя дні арганізоўваліся забавы — найлепшая справа для афіцэра у паходзе. Жыхары Ліды і ваколіц прымалі мяне з вялікай сардэчнасцю — тым больш, што мой брат жыў тут ужо два гады як ад'ютант Літоўскага корпуса. Для павелічэння танцавальнай залы разабралі сцяну і злучылі два сумежныя пакоі. У выніку, у сярэдзіне залы утварылася невялікая ўпадзіна, і мы, танцуючы вальс, уздымаліся ўверх і ўніз, але гэта не перашкаджала танцам і весялосці пад музыку яўрэйскага аркестра і пры святле сальных свечак. Як заўжды танцы скончыліся на світанку, і я нават не задумваючыся, дзеля забавы, вярнуўся на места кватаравання якое знаходзілася за 30 вёрст ад горада. Скарачаў сабе шлях толькі мармытаннем розных мелодый. І нічога, нават не адчуў стомы.

У снежні рота Маліноўскага вартавала штаб палка ў Беліцы. Той час і гэтае мястэчка засталіся ў маёй памяці назаўжды. У штаб звыкла з'язджаліся гульцы, і тут гулялі мы ў карты — у банк і штос. 14 снежня 1821 г. за адзін вечар, ці дакладней за адну ноч, я прайграў усю маю гатоўку і ў дадатак значную суму ў доўг. Я быў, як аслеплены, мне бракавала сілы волі, і я ўсё шукаў выпадак, каб адыграць усё назад, але ўсё больш пагружаўся ў даўгі. Нешчаслівую тую схільнасць да гульні ў карты я перасіліў у сабе толькі да 1823 г. Ад таго часу сплыло шмат гадоў, і ніколі болей я не гуляў у азартныя гульні.

У лютым 1822 г. наша рота вартавала штаб корпуса ў Мінску. Праз тры тыдні, вярнуліся ў Ішчалну. Камандзір роты, яго высокасць барон Саргер паехаў у адпачынак, а старэйшы за ім афіцэр Румянцаў захварэў, і таму камандаваць ротай даручылі мне. З-за гэтага я пакінуў Ішчалну і пераехаў у мястэчка Жалудок — уласнасць графа Тызенгаўза. Тут два разы на дзень адбывалася муштра.

У траўні 1822 г. корпус гвардыі атрымаў загад вяртацца ў Пецярбург. Маршыравалі праз Вільню, дзе ў прысутнасці цара чатыры дні працягваліся манеўры.

Успаміны Дома лідскіх піяраў. апошняга рэктара ксяндза Вайшвілы (фрагмент)[1]

У ніжэй пададзеным фрагменце аўтар апісвае арганізацыю школы і навучання ў звычайным піярскім асяродку Літоўскай правінцыі.

Дом школы быў драўляны, як і ўсе тутэйшыя пабудовы, і дастатковы па памерах, каб прыняць усіх вучняў. Адзіныя ўваходныя дзверы былі павернуты да калегіюма[2], каб прэфект і настаўнікі праз свае вокны маглі бачыць усіх тых, хто выходзіць і ўваходзіць. Праз тыя дзверы школы вучні ўваходзілі ў вялікія сені, якія зваліся калідорам і які займаў усю даўжыню школы. Такое памяшканне было патрэбна, бо тут збіралася ўся школа і месцічы падчас публічных выступаў, тут агалашаліся распараджэнні, датычныя вучняў, пасля штогадовых экзаменаў, перад ад'ездам вучняў дахаты, тут нават ставіліся тэатральныя пастаноўкі. З калідора меліся ўваходы ў класы, якіх было два — у адным і другім канцы дома, падзеленыя сярэдняй сцяной. У класах стаялі простыя лавы, а насупраць уваходных дзвярэй мелася драўляная кафедра настаўніка. Толькі ў адным класе над кафедрай вісеў абраз Найсвяцейшай Панны Ласкавай — ён быў адзінай аздобай школы.

Дамкі ў горадзе, якія здымалі вучні, былі зручныя, аднаасобныя, стаялі ўдалечыні ад мітусні і непрыстойных месцаў, якія маглі стаць перашкодай у навуках; у гэтых дамах больш не было дазволена жыць нікому акрамя гаспадароў, а наведаць іх маглі толькі бацькі ці сваякі вучняў, іншыя — толькі, калі мелі ў гэтым пільную патрэбу. Школьнае кіраўніцтва назірала, каб у пакоях падтрымлівалася чысціня і парадак; каб не было нічога, што магло нанесці шкоду здароўю або пагражаць добрым норавам.

У кожным доме былі прызначаныя прэфектам, так званыя дырэктары — старэйшыя дома і настаўнік — бліжэйшы дазорца, пад наглядам і вартай якога знаходзіліся ўсе тутэйшыя вучні. Дырэктар сам быў вучнем вышэйшага класа; права кіраўніцтва малодшымі ён атрымліваў праз поспехі ў навуках і добрыя паводзіны. Яму належала берагчы вучняў, як зрэнку вока; трымаць іх у межах правіл, спіс якіх, зацверджаны прэфектам, заўсёды знаходзіўся перад вачыма, бо вісеў на сцяне ў пакоі вучня. Таксама старэйшы тлумачыў і паўтараў з малодшымі новыя лекцыі, навучаў і выхоўваў іх

[1] Wspomnienie Domku Pijarow Lidzkich. Napisal Ks. Jozafat Wojszwillo Ostatni Rektor Pijarow Lidzkich, rkps B. Ossolinskich // Z dziejow ziemi lidzkiej. Warszwa, 1997. S. 88–92.

[2] Зараз гэта адміністрацыйны будынак царквы.

у дабрыні, бараніў ад ўсяго дрэннага і хібнага, прывіваў прынцыпы рэлігіі і маралі, старшынстваваў у хатніх набажэнствах, суправаджаў малодшых у касцёл і школу і на адваротным шляху, адказваў за ўсе іх правіны. Кіраўнік школы старанна назіраў за тым, каб усё дакладна і строга выконвалася, часта наведваў вучняў і сачыў, каб усё было добра.

Без пісьмовага дазволу ніводнаму вучню не дазвалялася выходзіць з дома, дзе ён жыў нават для сустрэчы з іншымі вучнямі, жыўшымі ў самых блізкіх дамах; у выпадку супольнай прагулкі вучняў за горад патрэбны быў дазвол прэфекта, тады з вучнямі ішоў сам прэфект ці хтосьці з настаўнікаў.

Расклад часу на працягу дня вісеў у жытле кожнага з вучняў на сцяне, расклад наступны:

6—00, раніца. Пад'ём, малітва, паўтор навук, сняданак.

7—00. Імша, пасля яе адразу ў клас.

8—00 — 10—00. Заняткі. Пасля заняткаў вяртанне дахаты, падрыхтоўка да заняткаў.

12—00. Абед, пасля абеду кароткі адпачынак і паўтор урокаў.

2—00 — 4—00. Заняткі. Пасля заняткаў вяртанне дахаты і паўтор урокаў. Падвячорак, падрыхтоўка да заняткаў.

7—00. Вячэра, пасля вячэры кароткі адпачынак, падрыхтоўка да заняткаў.

9—00. Пасля малітвы — адпачынак.

Аўторкамі і чацвяргамі, у другой палове дня, заняткаў у школе не было. Замест гэтага вучні паўтаралі навукі ў сябе на кватэры, займаліся пісьмом, рыхтавалі практыкаванні, разам гулялі на школьным двары і пры тым заўсёды знаходзіліся пад наглядам прэфекта, настаўнікаў і дырэктараў.

З першым званком, за палову гадзіны на пачатку заняткаў, у свае класы прыходзілі ўсе вучні, каб здаць аўдытарам тое, што было зададзена раней. Аўдытары, разам з выбранымі імі сябрамі выслухоўвалі адказы вучняў і запісвалі ў так званую «эрату», якую аўдытар павінен мець і ўпісваць туды ўласнай рукой лепшага вучня, так званага імператара. Меліся і аўдытары аўдытараў, якія ў сваю чаргу выслухвалі гэтых абраных. Усе ўзроўні набываліся вучнямі добрай працай і поспехамі ў навуках.

Тых, хто адказваў добра, ў «эраце» пазначалі «si», што значыла «зух» ці «умее», тых, хто дэманстраваў дрэнныя веды, пазначалі літарамі «nb», г. з. «non bene» — «нядобра». Тых, хто не мог пераказаць матэрыял ці нават не чытаў яго, пазначалі «nr» — non recitavit, што значыла — «не падрыхтаваўся». Тых, хто нічога не вывучыў, пазначалі літарамі «ns» — nescit, «не ведае». Тых жа, хто наогул не прыйшоў ці спазніўся, пазначалі «0». Такім чынам адным поглядам на «эрату» было бачна старанне або нядбайнасць дзяцей.

Настаўнік, прыйшоўшы ў клас, кленчыў на найніжэйшую прыступку перад кафедрай і пачынаў малітву: «*Veni Sancte Spiritus!*»[1] якую потым пра-

маўлялі вучні: «*Repie tuorum corda fidelium, et tui amoris ignem in eis accende*». Потым настаўнік: «*Emitte Spiritum tuum et creabuntur*». Вучні: «*Et renovabis faciem terrae*». Настаўнік: «*Oremus. Deus, qui corda fidelium Sancti Spiritus illustratione docuisti. Da nobis in eodem Spiritu recta sapere, et de eius semper consolatione gaudere. Per Dominum nostrum Iesum Christum Filium tuum, qui tecum vi vit et regnat in unitate eiusdem Spiritus Sancti Deus per omnia saecula saeculorum*». Вучні: «*Амен*». Потым ўсе разам «*Sub tuum praesidium confugimus sancta Dei Genetrix! Nostras deprecationes ne despicias in necessitatibus, sed a periculis cunctis libera nos semper, Virgo gloriosa et benedicta*»[2].

Пасля гэтай малітвы настаўнік займаў месца на кафедры і праглядаў «эраты», пільных вучняў заахвочваў добрым словам, а дрэнных па-баць-коўску павучаў і ўжываў сродкі, якія схілялі да выпраўлення. Настаўнікі ў класах не аб'мяжоўваліся выкладаннем сваіх прадметаў і тлумачэннем іх, але моцна імкнуліся ўшляхетніць сэрца, натхніць да сапраўднай пабожнасці, любові, рэлігіі і цноты, каб выхаваць жывых членаў Касцёла і гонар грамадства. Праца гэта была няспынная, забірала ўвесь час, які нельга марнаваць у справе выхавання. Ведалі, як рабіць гэта пры выкладанні асобных навук, рабілі гэта нават у гадзіны забаў і адпачынку, выхоўвалі пры кожнай справе, карыстаючыся ёй на дабро вучням. Словам, старанна і безупынна ператваралі дзетак у добрых анёлкаў. Такія былі намеры, такая мэта, такі дух, такое прызначэнне пабожных школ пры ордэне Св. Юзафа Каласантага.

Першынство ў класе можна было атрымаць толькі праз школьныя заслугі, гэта значыць, за добрыя паводзіны і добрыя поспехі ў навуках. Нічога іншага не ўлічвалася. Сірата, які жыў з жабрацтва і апранаўся ў зашмальцаваны капот, куртачку ці бякешу, альбо шарачковы шляхціц, калі добра вучыліся і паводзілі сябе, займалі першае месца ў класе, а бліскучы і выпешчаны паніч — апошняе, калі ён не быў годны больш вышэйшага праз сваю маральнасць і поступ у навуках.

---

[1] *«Прыйдзі, Дух Святы!»*. — лац.

[2] *«O lux eatissima, reple cordis intima tuorum fidelium»* — «О блажэннае Святло нябёсаў, напаўняй сэрца Тваіх верных прыхільнікаў; *„Et tui amoris ignem in eis accende“* — і запалі ў іх агонь Тваёй любові; *„Emitte Spiritum tuum et creabuntur“* — Пусці ў сябе стваральчы дух; *„Et renovabis faciem terrae“* — Ты абнаўляеш твар зямлі; *„Oremus. Deus, qui corda fidelium Sancti Spiritus illustratione docuisti. Da nobis in eodem Spiritu recta sapere, et de eius semper consolatione gaudere. Per Dominum nostrum Iesum Christum Filium tuum, qui tecum vi vit et regnat in unitate eiusdem Spiritus Sancti Deus per omnia saecula saeculorum“* — Памолімся. Божа, Святым Тваім Духам Ты напоўніў ўсіх вернікаў; Тым самым Духам даруй нам пазнанне ісціны і вечнае ў ёй суцяшэнне. Праз Госпада нашага, Твайго Сына, Госпада нашага Ісуса Хрыста, Які валадарыць з разам і адначасна з Табой, і сілай Святога Духа, Бог, на вякі вякоў; *„Sub tuum praesidium confugimus sancta Dei Genetrix! Nostras deprecationes ne despicias in necessitatibus, sed a periculis cunctis libera nos semper, Virgo gloriosa et benedicta“* — Пад апеку Тваёй міласэрнасці / Мы звярнуліся, Багародзіца. / Ня адхілі нашы просьбы, / Якія Табе прыносім/ У сваіх патрэбах, але выратуй нас ад небяспекі, [Ты] адзіная чыстая і дабраславёная». — *лац.*

Імператар і аўдытары мяняліся штомесяц, каб ніхто не быў па-за гэтай добрай сістэмай. Кожны мог заняць кантралюючую пасаду і той, які сёння кантраляваў, заўтра сам быў кантраляваны. Таму пагроза страціць сваю ступень была пільным стымулам да вучэння, да пастаяннай асцярожнасці, каб не сапсаваць меркаванне пра сябе. Сярод вучняў нават былі такія, якія жадалі сапхнуць вучняў з вышэйшым узроўнем, каб адпомсціць. З часам яны так захапляліся спаборніцтвам, што значна паляпшалі свае вынікі.

У класе і касцёле панавала ціша, вучні паводзілі сабе спакойна і сціпла, і самы малы праступак адмысловы цэнзар заносіў у сшытак і перадаваўся прэфекту ці настаўніку. Таму парушальніка не абмінала кара, адпаведная правапарушэнню, і такім чынам падтрымлівалася строгая дысцыпліна і прыстойны парадак.

Лекцыя пачыналася і заканчвалася з малітвай. Калі школьны званок адзначаў канец заняткаў, настаўнік выходзіў з-за кафедры, кленчыў там, дзе рабіў гэта перад пачаткам лекцыі, і казаў: «*Tu autem Domine miserere nobis*», вучні адказвалі: «*Deo gratias*». Потым настаўнік: «*Oremus. Animus tibi gratias Omnipotens Deus pro universis beneficiis tuis. Qui vivis et regnas cum Deo Patre in Unitate Spiritus Sancti Deus, per omnia saecula saeculorom*». Вучні: «*Amen*». Настаўнік: «*Benedicamus Domino*». Вучні: «*Deo gratias*». Настаўнік: «*Et fidelium animae per misericordiam Dei requiescant in pace*». Вучні: «*Amen*». Усе разам: «*Sub tuum praesidium…*»[1]. Пасля чаго вучні парамі выходзілі са школы разам з настаўнікам, які праводзіўшы іх, вяртаўся дадому.

Апісаў толькі пачатак і канец урока але і падчас урока рабіліся набажэнствы і малітвы, гэта паказвае, што ў гэтых школах усё пачыналася, рабілася і заканчвалася ў імя Бога і для яго святой хвалы.

Катэхізатар працаваў, каб моцна прывіць рэлігійныя законы, схіліць да таго, каб вучні іх палюбілі і да смерці жылі згодна з гэтымі дабраславёнымі законамі Хрыста і яго Касцёла. Такім чынам, праз нябесную навуку рабіліся намаганні, каб вучні былі жыхарамі нябёсаў і таму выраслі самымі высакароднымі і карыснымі членамі грамадскасці — менавіта такімі станавіліся добрыя вучні і вызнаўцы Хрыста.

Было 4 класы, кожны клас меў толькі аднаго настаўніка, назвы браліся ад выкладанага прадмету. І так: пачатковы, ці 1 клас называўся «Infima»[2], 2-гі — «Gramatyka», 3-ці — «Poezja», 4-ты — «Retoryka». Ва ўсіх класах вы-

[1] *«Tu autem Domine miserere nobis»* — «Госпадзе, памілуй нас; *„Deo gratias“* — Хвала ўсявышняму;: *„Oremus. Animus tibi gratias Omnipotens Deus pro universis beneficiis tuis. Qui vivis et r? gnas cum Deo Patre in Unitate Spiritus Sancti Deus, per omnia saecula saeculorom“* — Памолімся. Падзякуем Усемагутнаму Богу, за ўсе яго дабрадзействы. Ён жывы і валадарыць з Богам Айцом у адзінстве Духа Святога, Бога, на вякі вякоў;, *„Benedicamus Domino“* — Дабраславім Госпада; *„Deo gratias“* — Падзякуем Госпаду; *„Et fidelium animae per misericordiam Dei requiescant in pace“* — Хай душы верных з ласкі Госпада спачываюць у міры; *„Sub tuum praesidium…“* — Пад абаронай». — *лац.*

кладанне было на лаціне, толькі тлумачэнні рабіліся на роднай мове, для чаго сэнс навук перакладаўся з лаціны, у старэйшых класах вучні ўжо пісалі на лаціне складаныя тэксты. Для таго і маліліся на лаціне — старэйшыя ўжо разумелі, а малодшыя вучылі мову.

Былі нават уведзены ўзоры вусных лацінскіх размоў у хаце і школе, узоры называліся «Quid est dictum?»[3]. Яны вымагалі паўтарэння таго, што прамаўлялася, гэта добра стымулявала ўвагу вучняў і прыносіла свой плён.

Экзамены адбываліся пры канцы кожнага месяца, іх ўзначальваў рэктар, на экзаменах вызначаўся прагрэс вучняў у навуках. Штогадовы ж экзамен рабіўся ў прысутнасці грамадства перад ад'ездам на летні адпачынак.

Усе вучні штодзённа слухалі святую імшу, стоячы на каленях, уставалі толькі на Евангелле, а ў нядзелі і па святах слухалі дзве імшы, казанні і катэхізмы. У касцёл уваходзілі парамі, кожны стаяў на сваім месцы, укленчваў у гонар Збаўцы падчас Найсвяцейшых сакрамантаў, а потым уставаў. Ніжэйшыя класы стаялі бліжэй да ўвахода, а вышэйшыя далей. Усе сціпла чакалі выхад каплана і імшу. Перад імшой прэфект ці настаўнік — старшы ў касцёле, пачынаў: «*Tantum ergo Sacramentum*»[4]. Пры гэтым усе вучні падалі на калені і скланяліся перад Найвышэйшым Сакрамантам і прамаўлялі гэты гімн. Потым старэйшы казаў: «*Panem de coelo praestitisti eis*»[5]. Вучні: «*Omne delectamentum in se habentem*»[6]. Старэйшы: «*Oremus. Deus, qui nobis sub sacramento mirabili passionis tuae memoriam reliquisti..*»[7]. Вучні: «*Amen*». Потым слухалі святую імшу, кожны, пабожна молячыся па кніжцы. Пасля імшы старшы казаў: «*Tu autem Domine miserere nobis*»[8], — і заканчваў набажэнства той самай малітвай разам з вучнямі, як і пасля заняткаў у школе. Пасля малітвы вучні ўставалі і парамі выходзілі з касцёла прама ў класы, першымі ішлі пачатковыя класы, за імі старэйшыя. Споведзі былі штомесяц, а перад Вялікаднем некалькі дзён адбываліся рэкалекцыі.

Пры школе мелася касцельнае брацтва Найсвяцейшай Панны Ласкавай вядомае пад назвай садалістаў[9]; усе вучні лічылі для сябе гонарам быць імі. Абавязкам было адпраўляць малое набажэнства Н. Панны (Officium parvum) і выконваць міласэрныя ўчынкі, практыкавацца ў пабожнасці. Паміж сабой выбіралі прэфекта, віца-прэфекта і тых, хто апекаваўся хворымі. Прэфект падчас урачыстасці Н. П. Ласкавай у касцёле, са святочна ўбранай

[2] Ніжэйшы — *лац.*

[3] *«Quid est dictum?»* — Што гэта такое. — *лац.*

[4] *«Tantum ergo Sacramentum»* — Гэта святая тайна — *лац.*, гімн які выконваецца перад «Святымі Дарамі».

[5] *«Panem de coelo praestitisti eis»* — Ты даў нам хлеб нябесны» — лац.

[6] *«Omne delectamentum in se habentem»* — Які змяшчае ў сябе ўсю радасць — *лац*.

[7] *«Oremus. Deus, qui nobis sub sacramento mirabili passionis tuae memoriam reliquisti...»* — Памолімся. Божа, які пакінуў нам у незвычайным сакраманце ўспамін ... — *лац*.

[8] *«Tu autem Domine miserere nobis»* — Госпадзе, памілуй нас — *лац.*

[9] Каталіцкае таварыства свецкіх людзей.

малой кафедры казаў на памяць прамову, якую звычайна пісаў ці правіў настаўнік рыторыкі, і пасля няшпараў[1] запрашаў на святочны сход вучняў і знакамітых садалістаў. Бацькі лічылі за гонар, калі гэта быў іх сын.

Садалісты ў нядзелю і на свята спявалі ў касцёле пра Н. Панну, у вольны час — і ў школе, асобна старэйшы клас і асобна малодшы. Гэтыя два адзелы, ці, дакладней, два набажэнствы, мелі розныя назвы: першы называўся «большая малітоўня» (oratorium maius), а другі — «меншая малітоўня» (oratorium minus). Настаўнік, які ўзначальваў першую, называўся «старшынём большай малітоўні» (Praeses oratorii maioris), а другі — «старшыня меншай малітоўні» (Praeses oratorii minoris). Кожны з іх выдаваў і падпісваў патэнты садалістаў.

Увесну, калі станавілася цёпла, у кожную сераду ажно да вакацый, пасля паўднёвай лекцыі ўсе садалісты ў касцёле, укленчыўшы перад алтаром Н. П. Ласкавай, спявалі літаніі да яе, а пры канцы

«*Sub tuum praesidium confugimu …*»[2]

і

«*Deus aeterne! Unus aeterne!*
Indignas nostras preces non sperne!»[3]

[1] Няшпары — чытанні малітваў нараспеў.

[2] *«Sub tuum praesidium confugimu…»* — О, блажэннае Святло нябёсаў … — *лац.*

[3] *«Deus aeterne! Unus aeterne! Indignas nostras preces non sperne!»* — Адвечны Бог, адзіны несмяротны, не пагарджай малітвамі вернікаў! — *лац.*

Успаміны Мірона Браніслава Нарбута

Першы публікатар мемуараў Мірона Браніслава Нарбута — найлепшы ў XX ст. знаўца лідскай гісторыі Міхал Шымялевіч — пісаў:

«Аўтар успамінаў Мірон Браніслаў Нарбут, сын Фрыдэрыка, скарбовага камісара Гродзенскай губерні па межах, нарадзіўся ў маёнтку Варонічы ці Нікадзімава Сабакінскай воласці (Сабакінцы, цяпер Першамайскае. — *Л. Л.*) Шчучынскага павета ў 1822 г. Яго дзед Караль Нарбут быў земскім пісарам ў Лідскім павеце, прадзед Ігнат — земскім суддзёй, прапрадзед Іосіф Казімір Нарбут — у 1759–1768 гг. маршалкам Лідскага павета. Пасля заканчэння 5-класнай павятовай вучэльні ў Лідзе Мірон Браніслаў Нарбут паступіў служачым канцылярыі на службу да павятовага маршалка ў Лідзе і тут у 1853 г. стаў сакратаром той жа канцылярыі. У 1863 г. пераведзены на такую самую пасаду ў Навагрудак. У 1863 г. узяў удзел у паўстанні і быў саслaны ў Арэнбургскую губерню, дзе і пачаў пісаць гэтыя мемуары. Праз нейкі час пасля амністыі вярнуўся ў родны край і памёр, жывучы ў сваякоў. Быў жанаты з Канстанцыяй Марачэўскай і пакінуў патомства. Мемуары я атрымаў у 1913 г. з рук пана Мацея Марачэўскага, ганаровага суддзі Лідскага павета, якому тут за дазвол апублікаваць мемуары сардэчна дзякую. Божа аддзяч!

Мемуары напісаны на 107 старонках фармату чвэрці звыклага аркуша паперы рукой аўтара. У мемуарах шмат розных выпісак з розных аўтараў на польскай, рускай, украінскай, чэшскай і французскай мовах. Сам тэкст мемуараў у некалькіх месцах не чытаецца, на некалькіх старонках ёсць толькі загалоўкі. Тэкст скарочаны адносна арыгінала. На жаль, не ўсе пададзеныя аўтарам факты, даты і імёны дакладныя. Мемуары напісаны ў выгнанні пасля дзесяцігадовай нябытнасці аўтара на радзіме і таму мусяць мець памылкі, якія, аднак, не змяншаюць дужа іх вагі як дакумента эпохі. Выправіць мемуары і зрабіць заўвагі немагчыма праз брак месца (у «Ziemi Lidzkaj». — Л. Л.). Частка мемуараў прайшла праз расійскую цэнзуру і без пазначэння імя аўтара была надрукаваная ў 80-я гг. прошлага стагоддзя (у 1880-я гг. — *Л. Л.*) у «Каласах»[1]. Тая публікацыя сталася бібліяграфічнай рэдкасцю. Зараз мемуары друкуюцца цалкам»[2].

[1] Таксама друкаваліся іншыя главы, «Шляхта ваколічная» у Tygodnik Ilustrowany», №7 tom 1. 12 lutego 1876., «Шлюбныя войскі» у Tygodnik illustrowany №. 18 tom 1. 29 kwietnia 1876. У заўвагах да гэтых артыкулаў пазначана, што тэксты — частка вялікай працы «Ліда і Лідзяне»

Лідскі павет у сярэдзіне XIX ст.

Мірон Браніслаў Нарбут

Ліда і лідзяне[3]

Лідскі павет — даўнейшы асяродак маёй сям'і, якая заўсёды прысвячала сваё жыццё грамадскаму служэнню свайму Краю. Там я нарадзіўся, там правёў значную частку свайго жыцця, таму гэтая малая Радзіма заўжды мне дарагая. Таму ўспаміны пра яе мілыя майму сэрцу і цешаць мяне ў самоце, да якой выгнанца давяло выгнанне, і гэтыя ўспаміны саграваюць мяне. Не раз уваскрасаюць у памяці знаёмыя постаці, вядомыя калісьці шырокаму колу лідзян; жыва паўстаюць перад вачыма розныя здарэнні, найбольш значныя акалічнасці з грамадскага жыцця павета, разнастайныя выпадкі: калі самотныя, калі смешныя, а часам і ўзнёслыя, на якія багатая гісторыя кожнай шляхцянскай сям'і на Літве.

І абуджаецца ахвота занатаваць хоць што-небудзь з тых успамінаў, каб даўжэй захаваць іх для сябе, бо толькі імі жывіцца выгнанец паміж сваімі.

Ліда — павятовы горад Віленскай губерні, месціцца на раўніне над малой рэчкай Лідзеяй, жыхарства з большага яўрэйскае, налічвае да 4000 жыхароў. Па-жмудску слова «Ліда» азначае месца, выцерабленае ад лесу. З даўнейшых ліцвінскіх часоў належала ўдзельным князям Гальшанскім, было невялікай фартэцыяй ці малым абарончым замкам, рэшткі муроў якога — адзіныя сведкі старажытнасці ў гэтым горадзе. За польскім часам Ліда была павятовым горадам Віленскага ваяводства, пасля падзелу Краю яе прылучылі да Гарадзенскай губерні, а ў 1843[4] годзе зноў была прыпісаная да Віленскай губерні. Адзіная доўгая вуліца пад назвай Віленская праходзіць праз усю даўжыню горада на адлегласць вярсты. Упоперак ідзе другая доўгая вуліца Каменская, убок — кароткія вуліцы: Сенатарская і Крывая, напрыканцы якой — рынак, дзе прадаюць розныя спажывецкія тавары. Ёсць тры касцёлы: Фара — фундацыі Масявічаў, пакармеліцкі (цяпер у руінах) — фундацыі Нарбутаў і папіярскі (перароблены на расейскую царкву), пабудаваны ў тым ліку за кошт расійскага цара Паўла I, і некалькі мураваных камяніц[5]. Горад мае павятовую школу, якую даўней утрымоўвалі піяры, аптэку, цукерню ды вайсковы шпіталь.

якую павінен цалкам выдаць Браніслаў Ортык (верагодна, псеўданім Браніслава Нарбута).

[2] Ziemia Lidzka. 1936. №5.

[3] Miron Bronisław Narbutt. Lida i Lidzianie // Ziemia Lidzka. 1997. №4–5 (26–27).

[4] Насамрэч у 1842 г.

На прыгожых і добра дагледжаных стараннямі Клары Якавіцкай з агульных складак парафіяльных могілках ёсць драўляны касцёл, фундаваны Вінцэнтам Нарбутам[6] — мясцовым пробашчам і дэканам.

Даўней, калі ў цэлай Рэчы Паспалітай віравала грамадскае жыццё, і Ліда мела цікавейшыя часы: вялікія зборы шляхты на сеймікі для выбараў дэпутатаў і паслоў на сеймы, барацьба партый і шумная агітацыя за тых ці іншых паслоў.

Пасля падзелу Краю, ужо пры панаванні Аляксандра I, на якога ліцвіны ўскладалі вялікія надзеі ў паляпшэнні будучыні Краю, існавалі гучныя казіно і забавы. Пазней з гэтага развілося шулерства, разбэшчанасць і п'янства так, што гэтыя звады панавалі тут болей, чым дзе-небудзь у другім месцы. Моцна і голасна высмейваў іх друкаваны ў тыя часы ў Вільні сатырычны часопіс «Навіны Бруковыя».

Трымаў у Лідзе вінны шынок яўрэй Азік (якога я помню яшчэ з часоў, калі хадзіў у школу). Апроч тых гасцей, што прыбывалі з павета і наведвалі гэтую ўстанову, было некалькі жыхароў горада сталага ўзросту, якія цэлыя дні праводзілі ў шынку. Гэта былі так званыя агульнікі — пастаянныя наведвальнікі, якія плацілі Азіку поўную квоту і мелі права піць у яго гарэлку без разліку, зразумела, нікога не частуючы. Гаспадар шынка дасканала ведаў ступень жадання і мажлівасці кожнага даруслага жыхара наваколля і таму ніколі не меў страт. Апавядалі мне і пра гульню, што праводзілася толькі ў вінярні Азіка. Кола бібулаў[7] сядалі вакол стала, у келіхі налівалася віно і ў поўным маўчанні, з напружанай увагай, пільнавалі палёт мух: на чый першы келіх сядала муха, той выйграваў, г. зн. меў права выпіць ві-

[5] Першы касцёл у Лідзе знаходзіўся побач з замкам і пабудаваны з дрэва на ахвяраванні князя ВКЛ Ягайлы ў 1387 г. У 1765–1770 гг. ксяндзом М. Зянкевічам быў пабудаваны новы цагляны. Насупраць фарнага касцёла на сродкі Адама Нарбута і яго жонкі Эльжбеты ў 1672 г. Быў пабудаваны цагляны касцёл і кляштар кармелітаў, які быў зачынены ў 1832 г., у 1908 г. будынкі касцёла і кляштара кармелітаў былі разабраныя, цэгла пайшла на будаўніцтва казармаў паўночнага вайсковага гарадка. Лідскі Іосіфаўскі касцёл піяраў будаваўся ў 1794–1825 гг. 15 траўня 1797 г. падчас пераезду са Слоніма ў Вільню кляштар наведаў расійскі імператар Павел I са сваімі сынамі Аляксандрам і Канстанцінам. Ён ахвяраваў на пабудову храма 5000 руб. У 1825 г. пасля 25-гадовага будаўніцтва будынак піярскага касцёла быў завершаны і ўрачыста асвечаны 4 ліпеня 1825 г. У жніўні 1842 г. касцёл піяраў згарэў. У 1863 г. перароблены ў праваслаўную царкву Міхаіла Архангела. З 1920-х гг. Каталіцкі касцёл, з 1962 г. і да сярэдзіны 1990-х — планетарый. Цяпер зноў праваслаўная царква — *Л. Л.*

[6] У 1805 г. пробашчам і дэканам лідскім ксяндзом Вінцэнтам Нарбутам у цэнтры могілак пабудаваная драўляная капліца св. Барбары.

[7] Бібула — прамакатка. Другі сэнс слова — «нелегальная літаратура». Юзаф Пілсудскі пісаў: *«Бібулай на рэвалюцыйным жаргоне называюць кожны нелегальны друк, які не быў адзначаны сакраментальнай формулай: „дозволено цензурою". Колькасць такой бібулы з кожным годам узрастае, усё больш пранікаючы ў людскія масы і ахопліваючы ўсе большыя колы. Гэта прызнаў нават урад. Князь Імерэтынскі ў сваім значным мемарандуме зазначае, што нелегальная кніжка пранікла нават пад сялянскія стрэхі і падахвочвае антыўрадавыя настроі з боку сялян. Аднак не трэба думаць, што бібула ў падрасійскай Польшчы заўсёды ме-*

но з усіх налітых келіхаў. Гульня гэтая называлася «мушка». Зусім п'яных Азік укладаў спаць у асобым алькове і адтуль выдаваў мужоў іхнім жонкам.

Калі ў Лідзе панавала п'янства, паміж піякамі быў распаўсюджаны спеў «Гімн перад піццём гарэлкі»:

Вітай змест над крышталём!
Усе цябе хваляць.
Ты суцяшаеш у смутку.
Ты саграваеш у азнобу.
Цябе паны, цябе пані
За пасілак маюць ранні,
Табе цэлае людское племя,
Носам рыючы, б'е ў зямлю.
О радасць, о вяселле!
Поунай губай пейце смела!

Аўтар гэтага гімна пан Маркевіч, землямер, чалавек вельмі дасціпны, меўшы востры розум і язык, які зброяй сатыры хацеў уздзейнічаць на сваіх землякоў. Для Таварыства Трубна-Бібуларнага[8] ён злажыў статут, які складаўся з вельмі камічных прадпісанняў для сяброў. Сябе Маркевіч называў маршалкам гэтага таварыства. Аднойчы, вяртаючыся ўранку ад знаёмага, ён заехаў у касцёл на рараты[9] і, усеўшыся на лаўку, убачыў уваходзячага ў касцёл хісткім крокам мажнага, напалову п'янага мужчыну, які сеў на другую лаўку. Гэта быў гарлівы вызнаўца Бахуса граф Плятэр, дзедзіч Шайбакполя. Пасля набажэнства Маркевіч зайшоў да гвардыяна[10] францішканаў на гарэлачку. Знайшоў там і Плятэра з некалькімі іншымі суседзямі. Гвардыян пазнаёміў Маркевіча і Плятэра. Маркевіч, аддаўшы паклон, кажа Плятэру: «Пане граф! Міла мне ў асобе пана пазнаць мужа праўдзівай дас-

ла рэвалюцыйны змест. Расійскі ўрад настолькі абмяжоўвае грамадскае жыццё ў разнастайных абсягах, што бадай няма ніводнай партыі, якая б не выдавала сваіх публікацый нелегальна, без цэнзуры. Нават згоднікі, галоўныя праціўнікі нелегальнай работы, выдалі некалькі кніжак за мяжой, каб пасля, не горай ад рэвалюцыянераў, кантрабандай перавезці іх праз мяжу і распаўсюдзіць у грамадстве. Такім чынам, ёсць бібула клерыкальная, патрыятычная, сацыялістычная і нават згодніцкая. Сярод яе знаходзіцца мастацкая літаратура вялікай вартасці: творы Выспянскага ці Зыха; ёсць патрыятычна-клерыкальныя опусы, вялізныя тамы гістарычных даследаванняў і дробныя брашуркі розных палітычных партый, ёсць і звычайныя кніжкі для набажэнстваў, перыядычныя выданні, адозвы, абразкі, фатаграфіі, паштоўкі і іншыя рэчы. Усё гэта закідаецца праз мяжу рознымі шляхамі, разыходзіцца ўсюды, дзе людзі ўмеюць чытаць па-польску, і становіцца ўсё болей запатрабаваным усё ўзрастаючай масай людзей.» — цыт па: Агата Тушынска. Рускія ў Варшаве // ARCHE. 2010. №4. С. 68.

[8] Towarzystwa Rurowo-Bibularnego.

[9] Рараты — пачатак а 8-й раніцы. — *Заўвага перакладчыцы*.

[10] Гвардыян — у дадзеным выпадку эканом. — *Заўвага перакладчыцы*.

каналасці. Дагэтуль я быў маршалкам Таварыства Трубна-Бібуларнага і ўпіваўся звычайна каля 10 раніцы — першым за любога іншага сябра; сёння я пераканаўся, што нягодны гэтай пасады і аддаю яе ў больш прыстойныя рукі пана, што ўмее быць п'яным ужо на раратах. Прашу толькі адкрыць мне, як можна дайсці да такой дасканаласці». На што ўзрадаваны Плятэр адказаў: «Вельмі проста — не трэба наогул цверазець». Потым былі паціскканні рук, абдымкі і запрашэнне Маркевіча з суседзямі ў свой маёнтак, дзе Плятэр паіў усіх адборным віном тры дні.

У часы майго жыхарства ў Лідзе, г. зн. ад 1846 года, п'янства ўжо амаль не было, але шулерства існавала. Выбраны бурмістр шляхціц Ян Андрушкевіч[1], чалавек праўдзівы, энергічны і разважлівы, сваім уплывам на грамадзян, а таксама пробашч дэкан Хлявінскі[2] сваімі трапнымі прамовамі і навучаннямі паствы ў касцёле значна паўплывалі на падвышэнне маральнасці гарадской супольнасці. У 1848 годзе маршалак павятовы граф Путкамер[3] уваскрасіў даўнейшае казіно пад зменену назвай «рэсурсы», куды госці з павета запрашаліся асабіста і танчылі аж да ўпаду. Аднак кантракты, прыпадаючыя на свята святога Юр'я рымскага, штогод былі менш кольскасныя, і горад не мог узвысіцца да заможнейшага стану.

Найбольш значнымі ў гісторыі Ліды былі: побыт у ёй караля Аляксандра Ягелона падчас хваробы, ад якой ён памёр у Вільні; праезд цара расійскага Паўла I з сынамі Аляксандрам і Канстанцінам, падчас якога ён выдаў грошы з уласнай шкатулкі на будаўніцтва касцёла піяраў; у 1831 годзе сутычка

[1] Ян Андрушкевіч, ці «Иван Степанович Андрушкевич», (гл. Памятная книжка Виленской губернии на 1850 г. Вильно, 1850. С. 82.) Ян Марколін Андрушкевіч (1823–1868), бургамістр горада. Андрушкевічы валодалі на Лідчыне вялікай нерухомасцю і Ян Марколін нарадзіўся ў адным з бацькоўскіх маёнткаў. У 1845–1852 гг. ён быў начальнікам спачатку 2-га, а потым 4-га аддзела паліцыі ў Адэсе. Даслужыўся да звання «тытулярны саветнік». Пасля вяртання ў Ліду стаў бургамістрам горада, ажаніўся з Марцянай з Яселаў і меў з ёй 9 дзяцей. У пасаг ад жонкі атрымаў цукерню ў Лідзе. Гэта цукерня ў 1860-я гг. стала цэнтрам грамадскага жыцця ў горадзе і шматразова ўзгадвалася ў розных мемуарах.

[2] З 1846 па 1866 г. пробашчам і дэканам лідскім быў Дыянісій (Дыянізі) Хлявінскі (1793–1870) — адзіны ксёндз філамат. Пра яго гл: Лаўрэш Леанід. Ксёндз Дзіянісій Хлявінскі, філамат // Навагрудчына ў гістарычна-культурнай спадчыне Еўропы (да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы). 2010. С. 172–175; Лаўрэш Леанід. Лідскі дэкан — філамат, ксёндз Дзіянісі Хлявінскі // Лідскі Летапісец. 2018. №3 (83). С. 7–10.

[3] Ваўжынец Станіслаў Ян Путкамер (1794–1850). Уладальнік маёнтка Бальценікі, муж Марылі з Верашчакаў. Закончыў філасофска-матэматычны факультэт славутага Віленскага універсітэта, афіцэр арміі Напалеона. Ваўжынец і Марыля Путкамеры мелі трох дзяцей: сына Станіслава і дачок Зоф'ю (па мужу — Каліноўскую) і Караліну (па мужу — Рыхлевіч). Антоні Адынец пасля яго смерці напісаў «*Чачот сапраўды заўсёды мне гаварыў, што гэта самы сумленны, самы прыемны чалавек і што усе яго учынкі, на думку Адама (Міцкевіча — Л. Л.), характарызаваліся выключанай шляхетнасцю, якую сам Адам прызнаваў. Аднак, ніколі ён не мог бы з чужых слоў дапусціць, калі б не пазнаёміўся асабіста, што той „перахопнік Мырылі" быў сапраўды такі вельмі ідэальны*».

расіян з польскім аддзелам генерала Хлапоўскага і, напрыканцы, у 1863 годзе расстрэл с. п. Фалькоўскага[1], пробашча ішчалнскага за абвяшчэнне з амбона маніфеста Народнага Урада аб паўстанні.

Цяпер звыклую цішу прарываюць хіба што мясцовыя плёткі і раз на год 14 верасня на Узнясенне св. Крыжа 40-гадзіннае набажэнства ў фарным касцёле, на якое збіраліся з усяго павета жыхары і ксяндзы і некалькі дзён панаваў ажыўлены рух: прызначаліся ўзаемныя візіты, а часам у знятых папярэдне салонах, у найманых падчас набажэнства кватэрах і танчылі. У гадах 1847 і 1848 у Лідзе існавала больш агульнадаступная магчымасць для забаў. Усе чыноўнікі, нават нежанатыя, адзначалі дні сваіх імянін з музыкай і танцамі. Рэсурсы папаўняліся заўжды гасцямі, але асэнсаванае грамадскае жыццё заўжды ў горадзе спала. Моладзь, што працавала ва ўстановах, ігнаравала кніжкі, аддаючы перавагу гульні ў карты. З газетай у руцэ нават нязручна было сустрэцца з кім-небудзь.

Жыхарства горада Ліды захоўвае самую ўдзячную памяць аб с. п. Фабіяне Шукевіче, які з заможнага грамадзяніна з прычыны захаплення картачнай гульнёй дайшоў да таго, што быў вымушаны працаваць, здабываючы хлеб рознай юрыдычнай працай, асеў у Лідзе і, хоць меў вялікую радню, умеў заўсёды знайсці сродкі для паляпшэння гаротнага стану найбяднейшых жыхароў горада і таму заслужана насіў пахвальны тытул «Бацька ўбогіх».

Ржэвускі (аўтар «Лістапада») у творы «Апавяданні старца», выдадзенага ў Варшаве ў 1854 г., у томе II на с. 220 успамінае пра цуд, які зрабіў у Лідзе святы каплан-базыліянін Атаназ Галаўня ў часы голаду, які панаваў на Літве ў 1744 годзе. На гарадскім рынку сярод дня ён стос камянёў у стос боханаў знакам Святога Крыжа перамяніў, што пацверджана паказаннямі сведкаў: болей за тысячу сялян і некалькі дзясяткаў шляхты хлебам накормленых.

Лідскі павет меў каля 80000 жыхароў пераважна рыма-каталіцкага веравызнання: 21 парафія ў невялікай частцы па-над берагам Нёмана да мяжы Навагрудскага, Слонімскага, Ваўкавыскага і Гарадзенскага паветаў, 12 парафій даўняга ўніяцкага абраду (цяпер праваслаўная расійскага веравызнання) па некалькі сот душ, а таксама яўрэі і татары. Павет за польскім часам быў населены заможнай шляхтай — уладальнікамі зямлі, магнаты мелі тут вялікую маёмасць: графства Беліцкае, князь Караль Радзівіл — ваявода віленскі, званы Пане Каханку, цяпер уласнасць князя Вітгенштэйна[2]; графства Шчучынскае, Юзаф дэ Кампа Сцыпіён — староста лідскі[3]; графства Жалудоцкае, Тызенгаўз[4] — падскарбі літоўскі, і графства Гародненскае[5], граф Тышкевіч (цяпер уласнасць Маўрыцыя графа Патоцкага).

[1] Адам Фалькоўскі, пробашч Ішчалны, прачытаў паўстанцкі маніфест і заклікаў сялян да паўстання, быў арыштаваны і расстраляны ў Лідзе 24 (13) чэрвеня 1863.

[2] Ранейшая ўласнасць Радзівілаў, сканфіскаваная пасля вайны 1812 г.

У выніку падзелаў Краю, расходаў на свецкае жыццё, з уласных расходаў для патрэбаў Краю ці ўтрыманне партый на сеймiках вялікія маёнткі заможных сямействаў — Нарбутаў, Аляксандравічаў, Францкевічаў, Шушкевічаў, Ельцаў, Гінетаў, Шэмётаў, Длускіх, Скіндараў — прайшлі праз эксдывізіі[6], і таму з'явілася шмат новых дробных гаспадароў. А акрамя таго, ад даўнейшых часоў тут была густа расселеная засцянковая ваколічная шляхта і да сёння, нягледзячы на пераслед яе расійскім урадам, дастаткова вялікая. Дзякуючы гэтаму ў павеце ўсталявалася грамадзянская роўнасць і дух шляхецка-дэмакратычны, які існуе і да сёння. Цяжка знайсці ў Лідскім павеце двух жыхароў — уладальнікаў зямлі, якія б не ведалі адзін аднаго асабіста. Адсюль салідарнасць паміж шляхтай у пытаннях, датычных добрай будучыні краю, гэта салідарнасць тут была нават большай, чым у іншых паветах на Літве. У апошнія часы, з пункту гледжання распаўсюджання навуковай асветы і ўзроўню салоннай культуры, супольнасць лідзян стаіць невысока, але яны захоўвалі лепей, чым іншыя, шмат старапольскіх цнот і агульную пабожнасць, гасціннасць і гатоўнасць прысвяціць сябе Айчыне і суродзічам. У 1863 годзе тут найперш, чым у астатняй Літве, сабралася павятовая харугва, а імя яе кіраўніка — Людвіка Нарбута[7] — айчынная гісторыя запісала на сваіх старонках для пераказу наступным пакаленням.

У даўнейшыя часы шляхта лідская была ахвочая да шаблі на сеймiках і схільная да віна і келіха, але і таксама да абароны межаў Рэчы Паспалітай

[3] Род Сцыпіёнаў дэ Кампа італьянскага паходжання, гл.: Данскіх Сяргей. Шляхта італьянскага паходжання ў Лідскім павеце ВКЛ: пытанні рэцэпцыі і асіміляцыі // Герольд Litherland. 2006. №17. С. 57–68.

[4] У XVIII — першай палове XIX ст. мястэчка Жалудок — уласнасць старажытнага роду Тызенгаўзаў герба «Буйвал». Найбольш знакаміты з іх — Антоні Тызенгаўз (1733–1785), увайшоў у гісторыю як славуты падскарбі надворны літоўскі і адміністратар каралеўскі, магнат і палітык, пахаваны ў Жалудку.

[5] Гародна ў першай палове XVIII ст. было спадчыннай уласнасцю княгіні Саламеі Радзівіл з Сапегаў. У 1762 г. яна падаравала яго стрыечнаму ўнуку Людвіку Скумін-Тышкевічу (памёр у 1809 г.), жанатаму з княгіняй Канстанцыяй Панятоўскай (1759–1830). Пасля смерці Людвіка Скумін-Тышкевіча ўвесь гэты вялікі маёнтак атрымала ў спадчыну ягоная адзіная дачка Ганна (1779–1867). Яна была замужам за Аляксандрам Патоцкім, а потым за Станіславам Дуніным-Вансоўскім. Тастаментам ад 1867 г. перапісала Гародна сыну ад першага шлюбу М. Патоцкаму (1812–1879), пасля смерці якога ўсё перайшло ў спадчыну ў 1880 г. графу Аўгусту Патоцкаму. Напрыканцы XIX ст. А. Патоцкі прадаў Гародна рускаму генералу Асатураву, ад якога маёнтак перайшоў да графа Ігнацьева, ад яго — да генерала Кіпрыяна Кандратовіча. У той час маёнтак складаўся з 23 200 дзесяцін зямлі і 15 фальваркаў, але Кандратовічы купілі толькі ягоную частку разам з Гароднам.

[6] Эксдывія (exdywizye) — юрыдычны тэрмін, у Літве існаваў закон, па якім у выпадку неплацежаздольнасці даўжніка, яго маёмасць не прадавалася з аўкцыёну, але дзялілася на часткі адпаведна колькасці крэдытораў.

[7] Гл: Лаўрэш Леанід. Людвік Нарбут // АСОБА І ЧАС. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 6. Мінск, 2015. С. 74–105.

ад нашэсця ворагаў: у канфедэрацыі Барскай, у паўстанні Касцюшкі і ў пазнейшых баях з ворагамі прыніжанага Народа несла свае жыцці і маёмасць на ахвяру Краю. Павет Лідскі на сеймах меў прадстаўнікоў, якія гарліва адстойвалі межы Рэчы Паспалітай: гэта Тадэвуш Нарбут[1], падкаморы лідскі, пасол на сейм вальны 1776 г., які не падпісаў ратыфікацыю першага падзелу Рэчы Паспалітай і за гэта пераследаваўся ўладамі; меў потым пасла Войцеха Нарбута[2], шамбеляна[3] караля Станіслава Аўгуста, гарлівага працаўніка на варшаўскім сейме 1788 г., на якім адбылася без праліцця крыві агульная польская рэвалюцыя праз прыняцце векапомнай Канстытуцыі 3 Мая, якая дазволіла ўшляхціць цэлы народ, даць яму грамадзянскія свабоды, якімі дагэтуль карысталася выключна шляхта.

У часе апошняга падзелу Краю шляхта лідская яшчэ пратэставала супраць палітычнага гвалту над ужо безабаронным Народам. Такімі, як Тыматэвуш Боньча Вільканец, быў прыняты маніфест да жыхароў горада і павета, у якім на пазнейшыя пакаленні ўскладаўся абавязак вяртання адабранай маёмасці і грамадзянскіх свабодаў. Дух вольнасці так моцна прышчапіўся ў лідзян, што і па падзеле Краю, пры расійскай уладзе, лідскія сеймікі былі актыўныя: так, напрыклад, сеймік, які праводзіўся праз некалькі трохгадовых тэрмінаў у барацьбе за павятовае маршалкоўства паміж Каралем Лясковічам і Аляксандрам Нарбутам, з сутычак гэты апошні заўсёды выходзіў пераможцам, умеючы трапным выступам і папулярнасцю знайсці сімпатыі большасці шляхты. У 1812 годзе пры французах падпрэфектам лідскім быў выбраны (з маршалка) Ігнацы Скіндар[4] — дзедзіч маёнтка Лацк. Паслом лідскім на сейм варшаўскі генеральнай канфедэрацыі Каралеўства Польскага выбраны быў з 822 галасуючых 688 галасамі Войцех Нарбут. Кандыдатамі на пасольства былі: Нарбут — 688 галасоў «за», Караль Лясковіч — 522, Кастравіцкі — 200, Рассудоўскі — 50. Нават пры маёй памяці лідскія сеймікі заўсёды праходзілі у гарачай барацьбе партый. Так працягвалася аж да сеймікаў, канчаткова забароненых урадам пасля паўстання 1863 года на Літве і Русі.

Падчас уваходу ў 1812 годзе ў Літву французаў амаль уся тагачасная шляхецкая моладзь Лідчыны аб'ядналася пад айчыннымі харугвамі. Нека-

[1] Тадэвуш Нарбут (каля 1740 — ?) — падкаморы Лідскага павета і каралеўскі шамбелян, сын Казіміра Юзафа Нарбута (каля 1700 — ?). Ад першага шлюбу ў Тадэвуша Нарбута каля 1760 г. нарадзіліся тры дачкі: Канстанцыя, Аляксандра і Тэкля, ад другога шлюбу з Кацярынай Вяжэвіч — сын Войцех (1762–1837), каралеўскі шамбелян, посол сейма 1788 г. ад Лідскага павета, і дачка Ганна.

[2] Войцех Нарбут — сын Тадэвуша Нарбута.

[3] Шамбелян — тое самае, што і камергер, ад французскага слова *chambellan*.

[4] Падпрэфектам Лідскага павета ў 1812 г. быў Ігнацы Скіндар. Абавязкі падпрэфекта практычна нічым не адрозніваліся ад абавязкаў маршалка. Для дапамогі ў справах падпрэфект меў 2 павятовых радцаў, ён жа кіраваў павятовай паліцыяй. У 1819–1821 гг. Скіндар Ігнацы Міхайлавіч. Масон 3-й ст. гродненскай ложы «Сябры чалавецтва» («Przyjaciele Ludzkości»).

торыя вярнуліся пакрытыя ранамі, другія палеглі ў бітвах, а былі і такія, як Гаспар Длускі, якія падаліся потым у Амерыку і там біліся за свабоду. Длускі вярнуўся з Амерыкі паранены, стаў ксяндзом. Быў пробашчам у Наваградку, а ў 1831 годзе пакінуў месца пробашча і як каплан мясцовага аддзела паўстанцаў Кашыца[1] сеў на каня. Потым эміграваў з польскім войскам у Францыю. У 1855 годзе пасля амністыі вярнуўся ў Край і тут, у Наваградскім павеце, у вайсковага калегі Уладзіслава Брахоцкага, маршалка наваградскага, у Вераскаве, скончыў свой слынны жыццёвы шлях.

Лідзяне — людзі таварыскія, сардэчныя, гасцінныя ў доме, рэдка калі выязджалі за межы павета, а яшчэ радзей за межы Краю. Тут мала замежнага, усё сваё, роднае, ліцвінскае. Шануюцца тут прыгожыя даўнейшыя хатнія традыцыі, дзе ўсё пачыналася ад Бога і канчалася з Богам. Жаніліся па згодзе, дзеці шанавалі бацькоў, моладзь з належнай павагай ставілася да сівога веку, а жанчын лёгкіх і дрэнных паводзін ніколі я не бачыў. Выхаванне гарадской моладзі доўга было ў заняпадзе, абмяжоўвалася навучаннем сына ў гімназіі[2] альбо ў павятовай школе, а па заканчэнні гэтых устаноў адпраўлялі ў войска ці чыноўнікам у якую-небудзь установу. Сыны больш заможных бацькоў пасля заканчэння школ асядалі пры бацьках альбо асобна, і навучыўшыся іграць у прэферанс, гандляваць коньмі на кірмашах ці трохі паляваць, лічыліся сталымі людзьмі. Рэдкі лідзянін пасылаў сына ва ўніверсітэт. Толькі з 1855 года настаў больш шчаслівы час для набыцця адукацыі. Найперш засцянковая шляхта, а за ёй і ўсе астатнія гараджане пачалі выхоўваць сваіх дзяцей ва ўніверсітэтах і вышэйшых навуковых установах, а некаторыя вучылі нават на інжынераў ці тэхнікаў. Дзяўчаткі часцей выхоўваліся дома пад наглядам матак альбо ў прыватных пансіёнах у Вільні, і па сутнасці іх выхаванне было заўжды больш практычнае, чым у мужчын, над якімі яны часта стаялі вышэй з пункту гледжання маралі і розуму. З 1860 года, калі ў цэлым Краі пачаў абуджацца разумовы рух, актыўна клапаціліся аб заснаванні народных школ і лідзяне, а духавенства пашырала таварыства цвярозасці з вельмі паспяховым вынікам, так, што побыт лідзян значна палепшыўся, і ў 1862 годзе спаткаць п'янага лідзяніна было ўжо рэдкасцю.

[1] Юзаф Кашыц (1795— 1868) — удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Паходзіў з пінскай шляхты. У 1811 г. паступіў на матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта. На баку французаў, у складзе 17-га ўланскага палка, удзельнічаў у вайне 1812 г. У 1812–1815 гг. у эміграцыі, з 1815 г. асеў у Навагрудскім павеце. У 1830 г. абраны навагрудскім маршалкам. У час паўстання 1830–1831 гг. арганізатар выступленняў у Навагрудскім і Слонімскім паветах. У сваім маёнтку Ятра стварыў асобны атрад, які ў ліпені 1831 г. налічваў каля 1 тыс. чалавек. Меў шмат сутычак з расійскімі войскамі. Пасля аб'яднання з корпусам Г. Дэмбінскага атрад Ю. Кашыца перайшоў на тэрыторыю Польшчы. Прызнаны расійскім урадам дзяржаўным злачынцам 1-й катэгорыі, эміграваў у Францыю, яго маёнтак, у т. л. мястэчка Ятра, быў канфіскаваны і перададзены скарбу.

[2] Найбліжэйшай гімназіяй была ў Вільні.

* * *

У 1863 годзе павет з усёй гарлівасцю служыў справе Айчыны і даў ёй на ахвяру цэлы букет сваёй моладзі. Так у бітвах пад Кавалькамі[1] і Дубічамі[2] палеглі: Людвік Нарбут, Краінскі, Францішак і Аляксандр Бразоўскія, Уладзіслаў Навіцкі, Войцех Нарбут, Уладзімір Паплаўскі, Пакемпіновіч, Стэфан Губаровіч, Уладзіслаў Жукоўскі і іншыя. Расстраляны: Баляслаў Колышка, Ляснеўскі і Альберт Лясковіч, а таксама ксяндзы: вікарый жалудоцкі Ішора, пробашч ваверскі Зямацкі, пробашч ішчалнскі Фалькоўскі. Пакрытыя ранамі, высланыя да цяжкіх работ у Сібір: капітан Уладзіслаў Клімантовіч, рэктар Пясецкі, Войцех Мінскі, рэктар Струміла; на высылку — Баляслаў Нарбут, Андрэйкавіч, Ансельм Патрыкоўскі, Ян Жукоўскі і многія другія, а таксама ксёндз Ануфры Сурвід, пробашч васілішскі. У выгнанне: Адам Марачэўскі, Ксаверы Александровіч, Гжымала Фелікс, Браніслаў Нарбут, Яраслаў Табенскі, Тэадор Вільканец, Казімір Шалевіч, Адольф і Аляксандр Звяровічы, Людвік Геншаль, Томаш Шукевіч, Ян Рыхлевіч, Напалеон Пуляноўскі, Вінцэнт Захватовіч, Масальскі, двое Маргевічаў, Станіслаў Ржансніцкі, Ян Сямашка, трое Янковічаў, доктар Тышкевіч і іншыя; са шляхты засцянковай цэлая ваколіца Шчукаў з парафіі Дэмбраўскай, Стэфан Вільбік, Фелікс Сумарок з братам і многа асуджаных у салдаты. Лідскі і Троцкі паветы найболей пацярпелі ў часе паўстання. Троцкі павет амаль вылюднеў. Падаліся ў эміграцыю лідзяне: Францішак Нарбут, Юзаф Сумарок, Цыпрыян Табенскі, Тэадора Манчунская, Уладзіслаў Геншаль, Генрых Клімантовіч і інш. Дзве сястры Альжбета і Антаніна Табенскія прысуджаны да цяжкіх работ, на высылку Крыстыны Нарбут, Клюковіч і Масальская з роду Захватовічаў (памерла).

Рыма-каталіцкае духавенства Лідскага павета вылучалася сваёй адукаванасцю, адказнасцю ў выкананні сваіх абавязкаў і гарачай любоўю да Краю. Такія капланы, як кс. Ануфрый Сурвід, пробашч васілішскі, кс. Ішора, кс. Фалькоўскі — сапраўдны гонар Краю, кс. Дзіянісій Хлявінскі — дэкан лідскі, магістр тэалогіі, кс. Райцевіч — пробашч навадворскі, кс. Ясінскі — пробашч жалудоцкі, кс. Адам Зарэцкі, пробашч забалацкі і кс. Рыхлевіч, пробашч ражанкаўскі, мелі заслужаную павагу сваіх парафіян.

Лідскія татары Рамановічы, Сабалевічы, Талькоўскія і іншыя, такая ж засцянковая шляхта татарская, палюбілі сапраўдную Літву, дзе вялікія князі далі ім усе правы і свабоды, і заўсёды верна служылі Краю. У Лідскім павеце яны маюць сваю мячэць у Некрашунцах Нацкай парафіі.

Ваколічная[3] засцянковая шляхта пераважна жыла ў Эйшышскай, Лідскай, Ваверскай, Забалацкай і Радунскай парафіях, але няма ніводнай па-

[1] Бітва пад Кавалькамі 20 красавіка 1863 г. паміж паўстанцкім атрадам Людвіка Нарбута і рускімі войскамі.

[2] Бітва пад Дубічамі 5 траўня 1863 г., у гэтай бітве загінуў Людвік Нарбут.

[3] Ваколіца — пасяленне шляхты розных радоў, засценак — пасяленне шляхты аднаго роду (прозвішча), наогул шляхта жыла ў ваколіцах ці засценках, а не ў вёсках.

рафіі, дзе б ваколіц не было. Дагэтуль ваколічная шляхта захавала пачуццё старапольскасці, гонару, шляхетнасці і рыцарства.

Вясковы люд Лідскага павета дзеліцца ракой Пеляса, на ўласна Русь і Літву, гаворыць мовай беларускай і ¾ ёсць рыма-каталіцкага веравызнання, а на ¼ ёсць даўняга грэка-ўніяцкага веравызнання, цяпер праз урад прыпісаны да праваслаўя. За ракой Пелясой, пачынаючы ад Праважы аж да мяжы з Троцкім паветам, у парафіях Нацкай, Радунскай і Эйшышскай гавораць на летувіскай мове і ўсе без выключэння рыма-каталіцкай рэлігіі. Вясковае насельніцтва Лідскага павета мае глыбокую веру ў Бога і працавітасць, а інтэлігентнасцю перавышае вяскоўцаў, якія насяляюць занёманскія паветы Літвы. У часы апошняга паўстання 1863 года не толькі сімпатызавалі народнай справе, але нават сяляне скарбовыя ў многіх мясцовасцях станавіліся ў шэрагі, і многія з іх загінулі на полі славы ці былі высланыя на пасяленне ў Сібір. Я сам у Арэнбургу сустрэў дастаткова вялікую партыю сялян з парафій Эйшышскай, Нацкай і Радунскай, якіх гналі на пасяленне ў Башкірыю за ўдзел у паўстанні. Селянін Лідскага павета нават свайго роднага брата, які вяртаецца з войска дахаты, заўжды называе маскалём. Сяляне прывязаны да страхі айчыннага дому; дзяўчаты не цешацца выходзіць замуж у другія вёскі нават з гэтай самай парафіі, а тым болей у больш аддаленыя, кажучы: «Не хачу жыць у чужой старане!». Займаюцца гаспадаркай, часам рамяством і зусім не маюць ахвоты гандляваць, а таму ніколі гандлем не займаюцца. У падарожжа пускаюцца толькі да бліжэйшых мястэчак на кірмаш ці да цудоўных месцаў дзеля адпушчэння грахоў, а найдальшыя падарожжы — да Вільні ці да Гродна, калі селянін наймаецца дзеля перавозу на продаж якіх-небудзь прадуктаў. 2/3 вясковага насельніцтва ўмее чытаць па-польску або па-летувіску. Умеючых пісаць нямнога. У Лідскім павеце найчасцей сустракаюцца дваровыя людзі, якія і пасля атрымання волі не пакідаюць сваіх былых гаспадароў, служачы ім верна ўсё жыццё. Я і сам меў слуг з такіх вяскоўцаў, што былі мне сапраўднымі сябрамі.

Звычаі насельніцтва нічым не адрозніваюцца ад звычаяў у іншых мясцовасцях Літвы. Народныя танцы розныя і вясёлыя, як мяцеліца, скакуха, казак і інш. Спевы павольныя, сумныя і працяглыя. На Вельканач існуе выключны звычай, якога не сустрэнеш нідзе болей: паходы з віншаваннямі па дамах праз цэлую ноч. Грамада віншуючых складаецца з некалькіх маладых мужчын з падабранымі галасамі і скрыпкай, якія падходзяць пад акно і просяць дазволу на віншаванне. Атрымаўшы дазвол, адзін са старэйшых пачынае са слоў: «Хай будзе ўхвалёны Езус Хрыстус» — і звычайна завяршае зварот словамі: «Каб дачакаліся свята праз год з малымі грахамі і з вялікімі пацехамі, каб жыццё вечнае атрымалі!». Потым увесь хор спявае для гаспадароў дому песню: «Вясёлы настаў для нас сёння дзень». Для кавалераў і дзяўчат святочныя песні складаюцца асобна. Звычайна ў іх спяваецца пра ўдзячнасць той, каторую віншуюць, пажаданні добрага му-

жа «паніча, каралевіча», а на заканчэнне кожнай такога кшталту песні наступнае:

Жадаем пана дарам дарыці
Да віно ж, віно зеляно.
Дарам дарыці, нам заплаціці
Да віно ж, віно зеляно.
Сорак яек на полумісак
Да віно ж, віно зеляно.
Кілбаскаю акружыце
Да віно ж, віно зеляно.
Белым сырком заквяціце
Да віно ж, віно зеляно.
І пры тым чырвоны злоты
Да віно ж, віно зеляно.
Мужыку на боты
Да віно ж, віно зеляно.

Разагрэтыя гарэлкай і свянцоным, абдараныя пэўнай квотай грошаў, віншавальнікі, ці, як люд іх называе, галасоўшчыкі, рухаюцца далей да бліжэйшага двара або вёскі. Абход працягваецца ўсю ноч, а вярнуўшыся з начной вандроўкі, дзеляцца сабранымі грашамі і свянцоным.

Убранне сялян Лідскага павета ладнае. Мужчыны носяць белыя або сівыя сярмягі, шырокія скураныя пасы, называныя дзяга, доўгія боты і высокія суконныя шапкі, аздобленыя футрам шэрага барана. Замужнія жанчыны надзяваюць каляровыя гарсэты з паркалю або сукна, цёмна-сінія спадніцы, яскравыя фартухі, кашулі з белага паркалю, на галовах — белыя высокія шапкі або каляровыя каптуры з матэрыялу, з-пад якіх выглядае лістачка чапца, ці каляровыя хусткі, завязаныя з тылу без канцоў; на шыі пацеркі, а на грудзях скапуляры[1]. Дзявочы ўбор падобны да ўбору замужняй жанчыны з той розніцай, што носяць валасы, сплеценыя ў два вузлы з мноствам уставак, або таксама хустка на галаве са спушчаным на тыл доўгім канцом, болей каляровых пацерак на шыі і малы скапуляры.

Вёскі ў Лідскім павеце па большай частцы файна забудаваны, звычайна па адным баку вуліцы стаяць: хата, насупраць свіран, пасярэдзіне падворка студня з жоравам, за хатай садок або гародчык, а па другім баку: гумно, стайня, аборы для жывёлы, птушкі і іншыя гаспадарчыя забудовы. Падворкі агароджаны. Так і ідуць вельмі доўгімі радамі гаспадарчыя забудовы.

[1] Скапуляры, ці малы скапуляры, уяўляе з сябе два прастакутныя кавалкі тканіны ці іншага матэрыялу, на якія нанесеныя рэлігійныя выявы ці тэксты, змацаваныя паміж сабой шнурамі. Носіцца на целе пад адзеннем такім чынам, што адзін вобраз знаходзіцца на спіне, другі — на грудзях.

Люд дастаткова разважлівы, але ў яго легендах і казках заўсёды прысутнічае вера ў цуд і сапраўдная паэзія.

Лідскі павет меў людзей, якія займалі не апошняе месца ў дзеях айчыннай літаратуры: піяр Казімір Нарбут[1], абат парадыйскі, аўтар першай на польскай мове логікі, паэт Антон Гарэцкі[2], муж вялікай эрудыцыі, аўтар «Дзеяў Літоўскага народа» і іншых гістарычных прац Тэадор Нарбут[3], Юстын Нарбут — аўтара «Dziejow wewnetrznych Narodu Litewskiego» і Каміла Нарбут[4] — аўтарка некалькіх аповесцей. З мастакоў вызначыліся сваімі талентамі заўчасна памерлы сын Антона Гарэцкага, які пакінуў удаву Марыю, дачку нашага несмяротнага паэта Адама Міцкевіча. Помню, як нейкі час у Лідскім павеце жыў Тамаш Зан — заснавальнік Таварыства прамяністых, якое аб'ядноўвала выдатных лідзян: Ксаверыя Турскага, Ваўжынца Путкамера (мужа апяванай Міцкевічам Марылі), Тэадора Нарбута, Аляксандра Карловіча, Алаіза Бародзіча і інш.

Меў Лідскі павет і свайго вершаплёта — вандроўніка шляхціца Лабуха, які памятаў пра кожныя імяніны ў павеце. І кожны імяніннік або імянінніца мелі ад яго напісаныя ўласнаручна на файнай паперы прыгожыя віншаванні. За што ён звычайна атрымоўваў пэўны ганарар. Рэдкасны ў той час быў тып вандроўнага кантара касцельнага, але ў павеце ім быў шляхціц Саковіч. Ён з'яўляўся на кожным фэсце і ўрачыстым набажэнстве ў касцёле, браў апякунства над спяваючымі ружанец ці другія святыя песні і, як капельмайстар, дырыжыраваў спевам, выбіваючы такт. Летам вандраваў аж да віленскай Кальварыі і там служыў правадніком пабожным пры абходзе ў касцёле стацый Крыжовага шляху Збавіцеля.

---

[1] Казімір (Даніэль) Нарбут (1738–1807), мысляр-асветнік, прадстаўнік эклектычнага кірунку ў філасофіі эпохі Асветніцтва ў Вялікім Княстве Літоўскім. У 1769 г. выдаў у Вільні падручнік па логіцы («Логіка, або Навука разважання і меркавання пра прадметы навукі»). Аўтар курса «Эклектычнай філасофіі». Пераклаў з французскай мовы на польскую кнігу «Ваенная навука пруская караля для яго генералаў» (1771). Член Адукацыйнай камісіі, займаўся рэформай школьнага навучання. Пахаваны ва ўніяцкай царкве ў Радзівонішках на Лідчыне. Гл: Стасевіч — Ясюкова Ірэна. Казімір Нарбут (1738–1807). Варшава — Ліда. 2004.

[2] Антоні Гарэцкі (1787–1861) — паэт, удзельнік напалеонаўскіх войнаў і паўстання 1831 г., пасля чаго эміграваў у Парыж. Яго сын быў жанаты з дачкой Адама Міцкевіча. Гл: Лаўрэш Леанід. Антоні Гарэцкі — забыты паэт // Ад Лідскіх муроў №7. Ліда, 2011. С. 194–200.

[3] Гл: Лаўрэш Л. Л. Тэадор Нарбут: Навуковая і літаратурная дзейнасць, сям'я і сядзіба, яго час. Издательские решения, 2025.

[4] Юстын Нарбут (каля 1773 — 25.09.1845), гісторык, у 1818 г. у Гродне выйшла яго праца «Нарыс каранёў літоўскага народа», у якой прыведзены звесткі пра мясцовую гісторыю і міфалогію. У Вільні надрукавана яго праца «Унутраная гісторыя літоўскага народа з часоў Яна Сабескага і Аўгуста II...». Каміла Нарбут (каля 1800 — ?) — дачка гісторыка Юстына Нарбута, жыла ў маёнтку Юршышкі. Выступала ў перыядычных выданнях з рыфмаванымі і празаічнымі творамі. (Вільня, 1835). Гл: Лаўрэш Л. Л. Гісторык Юстын Нарбут. Яго навуковая дзейнасць, сям'я і сядзіба, яго дачка Каміла. Издательские решения, 2025.

Лідскі павет падзяляўся на пяць акруг ці ўчасткаў (станаў): Жырмунскі, Жалудоцкі, Шчучынскі, Васілішскі і Эйшышскі. У кожнай такой акрузе ёсць асэсар (станавы прыстаў), г. зн. ураднік выканаўча-адміністрацыйнай паліцыі. Павет меў 21 рыма-каталіцкую парафію, гэта: Лідская, Белагрудская, Нецецкая, Ельнінская, Жырмунская, Воранаўская, Беняконская, Асаўская, Эйшышская, Нацкая, Радунская, Забалацкая, Васілішская, Ваверская, Ішчалненская, Жалудоцкая, Лацкая, Навадворская, Шчучынская, Ражанкаўская і Дэмбраўская. Гэтыя парафіі належаць да двух дэканатаў: Лідскага з рэзідэнцыяй дэкана ў Лідзе і Радунскага з рэзідэнцыяй дэкана ў Беняконях. Найпрыгажэйшыя касцёлы: Шчучынскі, Жалудоцкі, Ражанкаўскі (з пункту гледжання архітэктуры) і Забалацкі з прыгожымі абразамі ў вялікім алтары — Пана Езуса на крыжы, а ў бакавых алтарах — Святой Сям'і і святой Ганны, вельмі добрага пэндзля. Найвялікшы касцёл — Эйшышскі. Царквы, даўней уніяцкія (цяпер расійскія), драўляныя, размешчаны: у Сабакінцах, Радзівонішках, Ганчарах, Зблянах, Астрыно, Орле, Ракавічах, Турэйску, Бабрах, Глыбокім і Беліцы; найвыдатнейшыя ў Дзікушках і Мураванцы (вельмі старажытная). У Беліцы ёсць драўляны кальвінскі касцёлік. Да 1835 г. існавалі наступныя кляштары: кармелітаў — у Лідзе і Жалудку; дамініканцаў — у Васілішках, фундацыі Ліманта і ў Ельні; францішканаў у Шайбакполі; піяраў у Шчучыне і Лідзе; базіліянаў — у Глушнях і сясцёр міласэрнасці[1] — у Шчучыне. У Радунскай парафіі быў філіяльны касцёл у Дубічах, пабудаваны ў лесе над возерам, дзе знаходзілася фігура Пана Езуса, слынная сваімі ласкамі. Сюды з розных, нават далёкіх краёў збіраліся людзі для атрымання адпушчэння граху. Цяпер на загад расійскага ўрада касцёл знесены, а фігура Збавіцеля перанесена да касцёла парафіяльнага ў Начы.

Праз Лідскі павет цякуць рэкі: Нёман, Дзітва, Пеляса, Котра, Лебяда, Нявіша і Лідзея; ёсць некалькі азёраў, найвялікшае — Дубіцкае і Дзявочае Вока. На выспе возера руіны замка каралевы Боны.

Лідскі павет мае прыгожыя і вялікія лясы, над ракой Дзітва вялікае мноства лугоў. З прадпрыемстваў на тэрыторыі павета размешчаны: шкляная гута каля Воранава, шорная фабрыка ў Беняконях, паперня ў Болцішках; у мястэчках дзейнічаюць невялікія яўрэйскія гарбарні. Гандаль збожжам з Каралеўцам праходзіць на Нёмане, а галоўны порт для рачных судоў і аптовыя крамы-склады былі ў Перакопе[2] і належалі маршалку лідскаму Юзафу Марачэўскаму.

Мястэчкі ў Лідскім павеце наступныя:

Шчучын Літоўскі — маёмасць князёў Любецкіх, з касцёлам піярскім і кляштарам сясцёр міласэрнасці, гімназію слынную на ўсю Літву перад

[1] Сёстры міласэрнасці св. Вікенція дэ Поля, вікенціянкі (Szarytki), шэрыя сёстры, каталіцкая жаночая кангрэгацыя, заснаваная ў 1633 г.

[2] Цапер вёска Мастоўскага раёна, раней тут праходзіў стары шлях з Вільні.

1830 г., утрыманую піярамі; чыстае і файна забудаванае, мае някепскія крамы, дом паштовы, аптэку; праходзяць кірмашы па продажы коней.

Эйшышкі — вялікае і дастаткова людnае, але бруднае мястэчка. Па канстытуцыі 3 Мая на кароткі час было сталіцай асобнага Эйшышскага павета; праводзіўся буйны гандаль збожжам, коньмі, свіннямі, хатняй жывёлай. Кожны чацвёрты чацвер адбываліся вялікія таргі. Гэтае мястэчка называецца Віленскім прадмесцем, бо перакупшчыкі з Вільні прыязджаюць сюды рабіць закупы разнастайных прадуктаў. Касцёл мураваны, пабудаваны часткова на грошы з квесты[1], часткова з фундушоў былога пробашча эйшышскага Каліноўскага.

Жалудок — маёмасць графа Урускага, чыстае і добраўпарадкаванае мястэчка, мае невялікія крамы і вінны шынок, зрэдку бываюць кірмашы па продажы коней; прыгожы парафіяльны касцёл.

Астрына не малое, але бедна забудаванае мястэчка. Насельніцтва яўрэйскае вельмі ўбогае.

Васілішкі — мястэчка людnае і гандлёвае, мае добрыя крамы і разнастайных рамеснікаў-яўрэяў; мураваны касцёл дамініканаў фундацыі маршалка лідскага Ліманта.

Воранава славіцца пончыкамі, якія там выпякаюць; мае драўляны касцёл.

Беліца — маёмасць князя Вітгенштэйна, каля Нёмана з царквой і Кальвінскім зборам.

Орля таксама над Нёманам з царквой.

Радунь — мястэчка малое і беднае.

Ражанка — маёмасць графа Паца (цяпер сканфіскаванае у казну) з касцёлам парафіяльным шыкоўнай архітэктуры, фундацыі Паца.

Становішча Лідскага павета раўніннае, узгоркі сустракаюцца рэдка. Грунты па большай частцы жытнія, пшаніцы сеюць меней. Сельскую гаспадарку праводзяць даўнейшым спосабам: трохполле. Жывёла звычайная. Авечак мерыносаў нямнога. Коні сустракаюцца часцей добрыя. Матэрыяльнае становішча насельніцтва павета больш заможнае, чым у суседніх паветах.

Яўрэі ў Лідскім павеце пераважна цёмныя і фанатычныя, але досыць працавітыя; акрамя гандлю займаюцца разнастайным рамяством і часта сустракаюцца вельмі добрыя цесляры. Прывязаныя да Краю; я нават ведаў некалькіх з іх гарачых патрыётаў.

Як сведкі гістарычных падзей, стаяць лідскія курганы каля Шайбакполя; у гэтым месцы адбылася вальная бітва ліцвінаў з татарамі, у якой Шайбак, брат хана Батыя, быў забіты[2]. З той пары гэтая мясцовасць атрымала назву Шайбакполя. У 1863 г. каля ваколіцы Вільканцаў у Эйшышскай парафіі

[1] Квеста — збор сродкаў.

зімовай парой некалькі дзясяткаў людзей бачылі бітву паветранага войска ў старажытнай вопратцы; пісаў пра гэта Тэадор Нарбут да тагачаснага губернатара гарадзенскага Допельмейра з просьбай прыслаць каго-небудзь са спецыяльных людзей дзеля дазнання: ці была гэта фата-маргана[3], ці метэор невядомай дагэтуль прыроды. Але замест астранома быў прысланы спраўнік, які забараніў пад страхам быць павешаным усім сведкам гаварыць пра тое, што бачылі, і на гэтым справа скончылася. У Шаўрах, маёнтку Тэадора Нарбута, знаходзілася многа археалагічных літоўскіх знаходак з розных раскопак у Лідскім павеце; некаторыя камяні з гэтых раскопак былі ўмураваныя ў браму на дарожцы да саду.

Шляхта ваколічная[4]

Шляхта засцянковая, альбо, як яе паўсюдна на Літве называюць, ваколічная, найвялікшая ў Лідскім павеце, у парафіях: Эйшышкі, Радунь, Ліда, Нача, Забалаць, а таксама і ў іншых ваколіцах; у вёсках, што цягнуцца на некалькі дзясяткаў дамоў, дзе жыве толькі сама шляхта часам і нават аднаго прозвішча, як, напрыклад, Ёдка, Чапля, Вільканец, Гервіланец, Болтуць, Сангін, Панятоўскі і інш.

Ваколіцы гэтыя маюць толькі невялікія адрозненні ад звычайных вёсак сялянскіх строем забудовы: з аднаго боку стаяць дамы пад жыллё, свіран, студня з жоравам, агароджаны падворак, пасярэдзіне вуліца, а на другім баку — гумно, стайні, аборы для жывёлы, птушкі хлеўнай. Розніца існуе толькі ў дамах.

Дом шляхціца мае сені, з якіх адны дзверы вядуць у гасцінны пакой — пакой з большымі вокнамі, з драўлянаю ці цаглянаю падлогай; сцены пабеленыя, а на іх абразы Збаўцы, Маткі Божай, святых патронаў, у некаторых партрэты Касцюшкі альбо князя Юзафа Панятоўскага. Ля сцен стаяць зэдлікі, накрытыя кілімкамі[5], альбо некалькі старасвецкай работы крэслаў, столікі простыя ці шліхтаваныя, а часам са стальніцай у краты для гульні ў шашкі; на століку можа быць калода старых зашмальцаваных картаў для гульні і некалькі кніжак для набажэнства, жыццеабрысы святых, зрэдку якая-небудзь іншая кніжка з тэкстам свецкім: Старажытная хроніка, альбо Марфей — разгадчык сноў, альбо Гісторыя пра Мелюзіну[6].

---

[2] Гэта міфічная гісторыя пра хана Шэйбака.

[3] Фата-маргана — рэдка сустраканая складаная аптычная з'ява ў атмасферы, якая складаецца з некалькіх формаў міражоў, пры гэтым аддаленыя аб'екты бачныя шмат разоў і з разнастайнымі скажэннямі.

[4] Miron-Bronisław Narbutt. Szlachta okoliczna // Ziemia Lidzka. 1997. №6 (28).

[5] Дыванамі без ворсу — *Заўвага перакладчыцы*.

За гасціным пакоем — другі пакой, званы альковам, дзе стаяць куфры з адзеннем, бялізнай. Адначасова алькоў з'яўляецца спальным пакоем для гаспадароў. Пад абразом Маткі Божай Вастрабрамскай старанна захоўваюцца завешаныя фіранкай старая карабэля[7] і пара пісталетаў ці флінта[8] — як памяткі пра прадзедаў.

З другой паловы сяней дзверы вядуць у вялікую хату, дзе месціцца чэлядзь, з малымі вокнамі, цагляным токам; печ без коміна, толькі з дымнікам, званым пякарняй. Хата гэта нічым не адрозніваецца ад звычайнай сялянскай хаты літоўскай.

Проста ад увахода ў сені бывае камора[9], дзе захоўваецца варанае і розныя гаспадарчыя прыпасы. Ва ўсіх шляхецкіх дварах захоўваецца аднолькавая планіроўка з розніцай толькі ў тым, што ў некаторых дамах замест алькова на адзін пакой болей. У дварах ёсць сады, дзе пад садовымі дрэвамі стаяць вуллі, а на градах квітнеюць камелі[10], кракосы[11], півоні, астры, зелянее рута, божае дрэўца[12], мята пярцовая.

У такіх дамках жыве грамадства шляхецкае: дзяды, бацька з дарослымі сынамі, дачка з малымі дзецьмі. Усе разам працуюць, уласнымі рукамі абрабляюць частку зямлі, перайшоўшую ім у спадчыну, што іх корміць і якую яны любяць. Рэдка шляхціц прадае сваю сялібу, хоць бы яму і добра абяцалі плаціць.

Вопратка засцянковага шляхціца розніцца кроем ад сялянскай сярмягі. Найчасцей носяць капоты[13] з даматканага альбо крамнага сукна ў фалды з тылу на манер тарататкі[14] альбо сурдут, доўгі за калена, камізэльку, каляровую хустку на шыі і боты. Шляхцянкі носяць сукенкі з рысавальнага паркалю альбо з воўны, чапцы і капелюшы. Паненкі галаву не пакрываюць. У часе работы нават на полі, а асабліва ў жніво, шляхцянка засцянковая заўсёды ўбрана ў сукенку, шырокаполы саламяны капялюш і ніцяныя пальчаткі.

---

[6] Мелюзіна — фея з кельцкіх і сярэднявечных легендаў, дух свежай вады ў святых крыніцах і рэках. Часта малявалася як жанчына-змяя ці жанчына-рыба (русалка). Выходзіць замуж за смяротнага, паставіўшы яму ўмовай, каб ён ніколі не бачыў яе ў звярыным абліччы. Калі ён застае яе ў такім выглядзе, кідае яго. Каля 1182 г. пра гэтую гісторыю згадвае Вальтэр Мап (Walter Map) у «Henno cum dentibus», каля 1200 г. — Эліян дэ Фруадмон (Hélinand de Froidmont), у 1211 г. Гервасі Тыльбэрыйскі (Gervase of Tilbury), у XIV ст. П'ер Б'ерсір (Pierre Bersuire), пра Мелюзіну пісалі Вальтэр Скот, Гётэ і т. д.

[7] Карабэля — парадная шабля ў XVI–XVIII стст., якую выкарыстоўвалі выключна для ўпрыгожван ня шляхецкага ўбору — *Заўвага перакладчыцы*.

[8] Флінта — старадаўняя крэмніевая стрэльба — *Заўвага перакладчыцы*.

[9] Камора — кладоўка — *Заўвага перакладчыцы*.

[10] Камелі — рамонкі — *Заўвага перакладчыцы*.

[11] Кракосы — календула — *Заўвага перакладчыцы*.

[12] Божае дрэўца — мірт — *Заўвага перакладчыцы*.

[13] Капота — кафтан — *Заўвага перакладчыцы*.

[14] Тарататка — кароткі кафтан — *Заўвага перакладчыцы*.

Уся сям'я з патрыярхальным укладам слухалася гаспадара. Раскоша для яе чужая, патрэбы абмежаваныя. Ужо некалькі гадоў вольная ад падаткаў шляхта не ведае бядноты. А старанны шляхціц меў добры запас грошай, што згодна са старадаўнім звычаем змяшчаў пад працэнты ў больш заможнага грамадзяніна, не даючы веры ашчаднаму банку і іншым крэдытным расійскім інстытутам. У такой шляхецкай сям'і заўсёды панавалі адзінства і пакой. Простая шчырая вера, пабожнасць і гасціннасць, любоў да айчыннай зямлі — гэта ва ўсе часы адметныя рысы засцянковага шляхціца.

Да касцёла моладзь найчасцей едзе конна, мужчыны сталага веку і жанчыны — у брычках. Калі шляхціцу надарыцца ісці пехатою, то боты нясе на кійку, набліжаючыся да мэты падарожжа, абувае іх, а робіць гэта дзеля замілавання навакольных. П'янства і разбэшчанасць рэдка сустракаецца між шляхтай, аднак часцей піяцтва, якое найбольш зацятых даводзіць да самагубства. Штодзённая ежа шляхецкая розніцца ад ежы сялянскай большай разнастайнасцю страў. На бяседах і памінках, вяселлях, хрысцінах, ушанаваннях і т. п. — вялікая колькасць ежы, багацце страў. На стале апроч гарэлкі і піва з'яўляецца мядок і кіслае віно з бліжэйшага мястэчка, а ў больш заможных — кава і гарбата. Танцы шляхты — гэта ўжо не скокі і матляханні, а паланэз, англес, вальс, галопада, часам мазурка і овертас. Апрача набожных песень, калі надыдзе вясёлая пара, з прыемнасцю можна паслухаць песні, што спяваюць мужчыны: «Курдэш над Курдэшамі»[1], «Сядзіць заяц пад мядзведзем» і іншыя, альбо паненка заспявае: «Выйдзі, выйдзі, прыгожая, з хаткі», «Тыя некалькі бяроз», «Чаго вочкі заплакала», «Страціўшы шчыгла» і да т. п., якія для патрыёта роднай зямлі з'яўляюцца ўзорам тэксту і мелодыі.

Шляхта засцянковая лідская заўжды пільнуецца дому і гаспадаркі, рэдка выязджае за межы павета, таму часта ў размовах з людзьмі карыстаецца досыць скажонай польскай мовай, якае мае ўдзельныя, толькі ёй уласцівыя правінцыяналізмы і звароты мовы. Напрыклад: «Мусі быць в тым лесе веверкі ест», «Як я в бабкі паньскей служыл і седзял в столе пшы вечежы», альбо на пытанне «Пане С., чы сон юж ксенжа в косцеле?» шляхціч адказаў: «Ту сон вшыстке народы, але не вшыстке обычае», гэта значыць: тут людзі розных заняткаў, але духавенства няма; альбо на пытанне адной грамадзянкі: «Пані Р., ці добра аддала дачку замуж і за каго?» шляхцянка адказала: «Ласне я пані не мувіла? За Мядовскего», — «Чы добже?» — «Ат добже, недобже, ды пшынаймней пільноваць не тшеба!».

Пасля дажынак, восенню па Усіх Святых, шляхта адпраўляе паміналь-ныя службы за душы памерлых родных. Гэтыя службы ў парафіях, населеных шляхтай, адпраўляюцца кожны дзень цэлы месяц і прыносяць немалы

[1] Курдэш — ад турэцкага слова karyndasz (брат, кампаньён), у старажытных ліцвінскіх святочных песнях гэтым словам завяршалася страфа.

даход пробашчу. Пасля службы госці звычайна запрашаюцца на цэлы дзень і пры чарцы ўспамінаюць пра годнасці і прыгоды памерлых, пра лепшыя часы, у якія тыя жылі.

У шляхты лідскай ёсць сімпатыі да Францыі і вера, што толькі з яе дапамогай Край уздыхне. Вера гэта глыбокая і паходзіць з памяці старэйшага пакалення, што помніць яшчэ Вялікую армію Напалеона, якая ў 1812 годзе ішла праз Літву да Расіі. Пры набліжэнні француза ніводнага маскаля на Літве не было. Помню, аднаго разу вярнуўся я з Вільні, зайшоў да мяне сусед, шляхціц засцянковы Буйко, па навіны з горада, і калі я яму распавёў, што выйшаў указ, каб сыны грамадзян, маючых сто душ, абавязкова служылі ў вайсковай альбо цывільнай службе, Буйко з вялікай упэўненасцю сказаў: «Калі так, то будзе вайна, даю пану слова!» Пытаюся: «Адкуль такая ўпэўненасць і чаму павінна быць вайна?» Адказаў: «Француз гэтага не сцерпіць». Я змаўчаў на гэткі пераканаўчы аргумент.

Пераслед і ўціск на засцянковую шляхту праводзіўся праз касаванне яе шляхецтва, запісам у аднаасобнікі і забіраннем у рэкруты. Зняверaная і абдзіраная чынавенствам, з памяццю ад дзядоў і бацькоў пра свае даўнейшыя свабоды і роўнасці грамадзянскія, калі шляхціц на нарадзе быў паважаны за роўнага з ваяводам, шляхта засцярожылася ў сабе і старанна захоўвала ў сваіх сэрцах ва ўсіх пакаленнях любоў да Айчыны і дух пасвячэння для яе, а ў звычаях хатніх — народныя традыцыі з даўніны. Калі б пісьменнікі гістарычных аповесцяў хацелі б праўдзіва намаляваць паспалітую шляхетнасць, то толькі і трэба, што змаляваць з натуры больш сталага па ўзросце прадстаўніка лідскай засцянковай шляхты.

Пасля заняпаду Рэчы Паспалітай і падзелу Краю шляхта лідская мала клапацілася аб навуцы і адукацыі сваіх сыноў. Зрэдку пасылала іх да школ піярскіх пры сваіх касцёлах, што фінансаваліся з розных прыватных фундушоў, пакуль тыя не былі забраныя ў скарб расейцамі; альбо аддавалі іх за паслужнікаў да ксяндзоў-прафесараў, альбо пры багацейшых панічах-студэнтах, з якімі разам вучыліся ў школах. Такія шляхецкія сыны па заканчэнні школ павятовых найчасцей мелі працу ў канцылярыі павета і не раз займалі высокія ступені ў чынавенскай іерархіі, не трацячы пры гэтым цалкам рысы народнага духу Рэчы Паспалітай. Другія паступалі ў семінарыі свецкіх ксяндзоў альбо да навіцыніятаў законных альбо арандавалі драбнейшыя маёнткі. Шляхцянкі ў кляштарах у законніц навучаліся работам і выходзілі да працы служанкамі і аптэкаркамі. Паўсюдна навука шляхціца і шляхцянкі засцянковай абмяжоўвалася веданнем катэхізіса, уменнем чытаць, пісаць і лічыць. Уменне набывалася ў шляхціца, што зімой кватараваў у доме, альбо ад мясцовага арганіста. Аднак значная частка шляхты наогул не ўмела пісаць.

Лідская шляхта давала на ўсю Літву аканомаў, намеснікаў, пісараў павятовых. З яе кола былі арганісты, садоўнікі, ключвойты[1]. Рамяством і

гандлем, як і даўней, шляхціц не займаўся. Да службы вайсковай расійскай таксама не ўступаў, хіба што прымусова, калі былі перароблены на аднаасобнікаў.

У апошнія часы, калі шляхта засцянковая лідская жыла лепей, чым звычайныя грамадзяне, г. зн. па-паўпанску, узнікла патрэба вучыць дзяцей навукам, і шляхта пасылала сваіх сыноў не толькі ў школы, але і ва ўніверсітэты, а дачок, найчасцей з сем'яў аканомаў, навучалі ў прыватных пансіёнах. Паненкі затым працавалі гувернанткамі, а некаторыя праз шлюб з заможным чалавекам, падымалі з упадку ўсю сваю збяднелую сям'ю.

У 1831 годзе і ў апошнім паўстанні 1863 года шляхта засцянковая пастаўляла найвялікшы кантынгент моладзі ў шэрагі народныя, несла апошні грош на ахвяру дзеля Краю, таму шляхта засцянковая цярпела найбольшы пераслед з боку ўрада. Спальваліся дамы і гаспадарчыя пабудовы, забіраліся маёнткі і цэлыя сем'і шляхецкія высылаліся этапам у Сібір альбо ўглыб Расіі, нават без аніякай прычыны, дастаткова было даносу першага жандара альбо паліцыянта, што захоўваецца зброя альбо што калісьці ў засценку ўкрывалі паўстанца. Так у Лідскім павеце ў Дэмбраўскай парафіі вынішчана цэлая ваколіца Шчукі і некалькі іншых.

На высылцы ў Расіі, наколькі я мог бачыць, шляхта засцянковая вызначалася працавітасцю, пачцівасцю, міласцю да веры дзядоў-прадзедаў сваіх і глыбокай верай у блізкае ўваскрашэнне і будучыню Айчыны.

Не зламаны пераследам дух неаднойчы ўзбуджаў пашану ў саміх маскалёў. На высылцы ў Расіі найчасцей шляхціц браўся за рамяство і нават займаўся дробным гандлем.

У вязні ў Вільні ў кляштары св. Пятра бачыў шляхціца засцянковага з-пад Ліды Стэфана Вільбіка. Ён набіраў добраахвотнікаў у аддзелы Людвіка Нарбута ў Лідскім павеце і дастаўляў жывёлу. Арыштаваны расейцамі з мандатам Урада Народнага, пасаджаны быў у вязню і адданы пад ваенны суд. Захоўваў поўны спакой, моцную волю і нікога не скампраметаваў. У калегі па вязніцы, які яго мне прадставіў, Вільбік пытаўся: «Скажы, пан, які можа мне быць дэкрэт?» «Могуць павесіць», — той адказаў. Задумаўся трошкі Вільбік, але праз хвіліну спытаў: «А ці я буду ў гісторыі?» — «Абавязкова: гісторыя пераказвае нашчадкам імёны ўсіх, хто заслужыў у Айчыны», — адказаў той. На што Вільбік з усёй энергіяй выказаў: «Хвала Богу — няхай вешаюць!» Потым яго выслалі на цяжкія работы ў Сібір.

[1] Ключвойт — выбраны прадстаўнік ад жыхароў ўсяго ключа. Ключ — вялікі двор, які дзяліўся на фальваркі ці засценкі. — *Заўвага перакладчыцы*.

Пан Юзаф Гружэўскі[1]

Знаў я аднаго з дэпутатаў былога сейма, жыхара Лідчыны Юзафа Гружэўскага[2], які меў ўжо болей за 80 гадоў, афіцэра яшчэ з часоў Касцюшкі, дэпутата былога Трыбунала Літоўскага і прэзідэнта межавага суда ў Лідзе. Быў гэта ветэран сеймаў і чалавек рэдкай дасціпнасці і яснасці думак (precense d'esprit), так, што нават такому дзікаму варвару, як тагачасны губернатар гарадзенскі Мураўёў, здолеў спадабацца і ўсё ад яго атрымаў. Нават калі потым губернатар стаў міністрам дзяржаўных маёмасцяў, ён дапамог Гружэўскаму выйграць судовы працэс і набыць маёнтак Кульбакі.

Апавядаў мне мой бацька пра яго некаторыя анекдоты. Напрыклад.

Гружэўскі, будучы яшчэ маладым кавалерам, любіў іграць у карты і жыць напаказ, многа гаварыў пра свой дастатак, а кішень не заўсёды была поўная. У Вільні, калі быў дэпутатам Трыбунала, неяк перад кабетамі пахваліўся, што нібыта каля горада набыў прыгожы вясковы фальварак. Жанчыны ўпрасілі, каб у гэтай набытай маёмасці зрабіў вясковы падвячорак з танцамі. Гружэўскі авансам запрасіў іх, паабяцаўшы прызначыць дзень і паказаць дарогу, па якой належыць ехаць, але, выйшаўшы, задумаўся, як выбрацца з гэтага клопату. Успомніў сабе, што мае паблізу Вільні даўнейшага знаёмага сваіх бацькоў, пана чашніка Лучку — гаспадара маёнтка ў вельмі прыгожым кутку. Прыязджае да яго і просіць дазволу на прыём дам у яго доме. Пасля доўгіх адказаў і размоў пра марнатраўства чашнік згадзіўся. Узрадаваны Гружэўскі вяртаецца ў Вільню, рыхтуе ўсё, што патрэбна да вечарыны, запрашае гасцей і прыязджае, каб пераканацца, што ўсё прыгатавана як належыць. Смутная трывога нараджаецца ў яго, калі на выгане ён бачыць нераспакаваныя фурманкі і дазнаецца, што чашнік перадумаў і не дазваляе ў сябе аніякіх гуляў! Просіць яго зноў, даводзіць яму, што ён кампраметуе Гружэўскага, але дарэмна. Нарэшце згаджаецца, што праект няўдалы і што ён неадкладна вышле да Вільні лісты з прабачэннямі і адменіць гасціну. Пасля гэтага выходзіць на выган і прыказвае служкам неадкладна заняцца неабходнымі прыгатаваннямі, а сам, дабыўшы з воза некалькі бутэлек віна, вяртаецца да чашніка і прапануе перакуліць разам з ім па-сяброўску бутэлечку. І пачынаюць піць! Калі пасля некалькіх бутэлек чашнік ужо добра даспеў, Гружэўскі прапанаваў яму, каб не пагаршаць справу, перайсці ў спальны пакой і там пры бяседзе прадоўжыць тосты.

[1] Miron-Bronisław Narbutt. Imc. W. Pan Józef Grużewski // Ziemia Lidzka. 1998. №1 (29).

[2] Юзаф Гружэўскі, капітан войск польскіх, суддзя мяжовы Лідскага павета і апошні прэзідэнт гродскі лідскі, нарадзіўся ў 1760 г., памёр у 1845 г., у 1826 г. набыў ад герцага дэ Біёль фальварак Кульбакі, 11 км ад Ліды (у 1826 г. вёска Кульбакі, дамоў 24, душ мужчынскіх 60, жаночых 54) і тут жыў да смерці. Меў жонку Казіміру, дачку Антонія Нарбута, лідскага маршалка — Заўвага М. Шымялевіча.

Праводзіць туды добра разамлеўшага чашніка, пераапранае яго ў шляфрок[1], чапец і ўгаворвае трошкі паспаць.

Той скора засынае. Гружэўскі замыкае яго на ключ, кажа зачыніць акно і ўжо свабодна кіруе падрыхтоўкай салону. З'язджаюцца госці, дамы хваляць прыгожую маёмасць і віншуюць з яе набыццём. Аднак калі пасля афіцыйнай часткі распачалася забава і танцы, чашнік прабудзіўся, бо спальны пакой яго быў каля салона, і пачаў галасіць, каб яго выпусцілі. Ствараецца агульнае замяшанне, Гружэўскі пачынае перапрашаць гасцей і расказвае, што мае сваяка дзядка, слабаватага на розум, які мае пункцік: пачувае сябе гаспадаром дому і лічыць, што з яго дому робяць карчму, таму ён, Гружэўскі, змушаны падчас прыёму гасцей у сябе закрываць дзядка. У гэты час адчыняюцца дзверы і паказваецца чашнік у неахайным туалеце, напалову п'яны. Прысаромлены, ён просіць адчыніць акно і вылазіць праз яго. Астатак ночы, пакуль не параз'яджаліся госці, праводзіць у доме прыслугі.

Пасля балу Гружэўскі папрасіў прабачэння, патлумачыўшы, што, прыціснуты абставінамі, быў вымушаны выставіць пана Лучку за вар'ята, неабходна ж было яму запэўніць кабет, што ён асабіста і ёсць уладальнік маёнтка. Наступіла згода і новая папойка.

Калісьці ў Варшаве Гружэўскі іграў у карты і не меў крэдыту. Удаўся слабым і папрасіў гаспадара дому, у якім жыў, прывесці да яго адваката для напісання тастамента. У тастаменце аб'яўляе, што ён бяздзетны і не мае блізкіх крэўных, таму значную частку свайго дабра на Літве адпісвае сваім прыяцелям: пералічвае фальваркі, запісвае кожны фальварак канкрэтнаму ўладару, а адзін фальварак (належны да скарбу) даруе гаспадару, якога просіць быць сведкам тастамента. Між тым наракае на недакладнасць свайго агента, які не прысылае яму грошы. Гаспадар пераканаўся, што Гружэўскі ёсць пан заможны, сам яму пазычыў сто дукатаў, з якімі хітрун патаемна выехаў з горада. Доўг гэты потым адаслаў.

На сейме ў часы Мураўева ўмеў дасціпнымі і трапнымі рэплікамі выправадзіць з зала сейма прысланага ад урада пракурора і застацца непакараным. Калі на іншым сейме адзін з грамадзян, жывучых на поўным пансіёне ў Гружэўскага, кінуў супраць яго чорную крэску (у вазон для галасавання, прагаласаваў супраць), Гружэўскі гэта запомніў і, вярнуўшыся дахаты падчас абеду, калі усе восем яго кватарантаў сабраліся разам, пачаў раздаваць суп з вазы — суповай місы. Перад тым палічыў асоб, паўтараючы, што ёсць памылка. Адзін з іх спытаўся, што гэта можа значыць, калі ў наяўнасці было восем каля стала. Адказаў: «Як да вазона, дык сем, як да вазы — дык восем, выразная памылка». Вінаваты моцна пачырванеў, а абед пайшоў далей аздоблены дасціпнай размовай Гружэўскага.

[1] Шляфрок — хатні халат. — *Заўвага перакладчыцы*.

У найбольш цяжкіх становішчах, у якія не раз трапляў, заўжды яго ратаваў трапны выраз, яснасць думкі і хуткі розум.

Селянін у летаргічным сне[1]

З-за мяжы паміж зямельнымі ўладаннямі Гружэўскі меў судовую справу з суседам. Суседа жадаў настрашыць і прымусіць да саступак і згоды, карыснай для сябе, таму ўжыў такога фортэля.

На спрэчным кавалку зямлі здарылася свара і бойка паміж сялянамі Гружэўскага і яго суседа, якая скончылася сінякамі — варожыя бакі ўзаемна ўзнагародзілі імі адзін аднаго. Сярод браўшых удзел у бойцы быў селянін Гружэўскага — Мацей, хударлявы мужчына з бледна-жоўтай скурай.

Пан паклікаў яго і ўгаварыў, каб сказаў, што моцна збіты. Гэтым часам хутка робяць труну і назаўтра рана, пусціўшы пагалоску, што Мацей памёр, вязуць труну за 10 вёрстаў у павятовы горад Ліду. Мацей і некалькі людзей з вёскі, некалькі кабет, ідучы пры труне, весела гамоняць, а Гружэўскі па дарозе гэты картэж падганяе. Наблізіўшыся да горада ён пачаставаў усіх гарэлкай, загадаў Мацею лажыцца ў труну і прыкінуцца памерлым, кабетам — плакаць і галасіць, пералічваючы даброты нябожчыка, згодна са звычаем літоўскіх сялян; а сам, як міністр цырымоніі, павольна паехаў за труной. Заехалі ў горад Ліду — бабы яшчэ галасней плачуць. Збіраецца на вуліцы купка зацікаўленых. І тут Гружэўскі кажа пахавальнаму картэжу спыніцца, а сам, адаслаўшы двух коней да карчмы, ідзе да павятовага доктара, каб з ім пагаварыць аб выдачы пасведчання, што Мацей на самай справе забіты, завяраючы яго, што гэтае пасведчанне ўраду перададзена не будзе. Сустракае доктара на вуліцы і пачынае пераказваць свой інтарэс. Доктар Замяцін быў маскаль, але здаўна жыў у Лідзе, жонку меў тутэйшую, любіў выпіць, але быў больш сумленным ад сваіх землякоў і знаў сваю навуку; добра ведаў Гружэўскага і здагадаўся, што ў гэтай справе ёсць нейкая містыфікацыя. Не дазволіўшы яму скончыць аповед, пытаецца: дзе цела памерлага? Гружэўскага адказвае, што картэж затрымаўся на вуліцы за некалькіх крокаў, і разам з доктарам ідзе аглядаць нябожчыка. Гружэўскі стараецца адвесці яго як найдалей ад труны, але яны сустракаюць па дарозе павятовага справавода. Доктар прапаноўвае разам з ім напісаць патрэбны акт. Гружэўскі не мае часу папярэдзіць справавода, чаго ён уласна хоча, бо яны ўжо падыходзяць да труны. Пакідае ён усё на волю выпадку. Замяцін набліжаецца да труны, загадвае яе адчыніць і, зірнуўшы на селяніна, з упэўненасцю гаворыць: «Забіты!» Гружэўскі рады і зараз жа дамагаецца

[1] Miron-Bronisław Narbutt. Imc. W. Pan Józef Grużewski // Ziemia Lidzka. 1998. №1 (29).

выдачы пасведчання, але доктар (разам з ім быў і цікаўны да ўсяго такога яго фельчар Маеўскі) удакладняе, што трэба зрабіць уздоўж цела разрэз, г. зн. ускрыць труп. Гружэўскі просіць адкласці такую рэч, але Замяцін патрабуе зрабіць гэта неадкладна і загадвае заехаць з памерлым на першы падворак і кажа фельчару: «Маевский, принеси инструменты!» Селянін ляжыць спакойна, бо, чуючы пра інструменты, думае, што будзе нейкая музыка. Гружэўскі, збянтэжаны, просіцца. Праз некаторы час прыносяць скрыню з хірургічнымі інструментамі. Доктар, дастаўшы скальпель, дае яго Маеўскаму і, падміргнуўшы, моцна крычыць: «Режь ему брюхо!» Мацей, пачуўшы такі вырак, падымаецца з труны. Настрашаны цікаўны люд разбягаецца ў розныя бакі, а нябожчык уцякае за плот. Доктар, справавод і фельчар смяюцца. Гружэўскі прыкідваецца аслупянелым ад здзіўлення.

Доктар наблізіўся да яго і гаворыць: «Пан Гружевский! Вы хотели старого доктора обмануть». Гружэўскі спакойна паўтарае: «Бедны Мацей быў у летаргічным сне!» Замяцін і справавод замаўчалі, потым пачалі зноў смяяцца, і ўся справа мела працяг пры бутэльцы і так пайшла ў нябыт. Мацей, вярнуўшыся дадому, ужо больш ніколі не ўдаваўся за памерлага.

Гружэўскі аддзячыў сялян, саступіў суседу ў справе аб мяжы, а гаворка пра гэты трагікамічны выпадак доўга кружыла ў павеце.

Юзаф Гружэўскі быў жанаты з Казімірай Нарбутоўнай — дачкой Антонія Нарбута — маршалка лідскага з лініі кобрынскай. Памёр бяздзетны. Маёнтак Кульбакі пасля яго смерці перайшоў да яго радні Вэндзігольцаў.

Дубічы[1]

У Лідскім павеце, у глыбіні лясоў, над вялікім возерам стаяў невялікі драўляны філіяльны касцёл у Дубічах, а ў ім у вялікім алтары — фігура Пана Езуса з цярновым вянком, падобная да фігуры, што знаходзіцца ў Вільні на Антокалі ў даўнейшым касцёле. Богу спадобілася гэтае месца асвяціць сваімі ласкамі.

На працягу года ў Дубічах было некалькі фэстаў. Прыбывалі асабістыя панскія павозкі, брычкі шляхецкія, вазкі ўсялякага роду з пабожнымі і шмат пешых пілігрымаў. Усялякіх класаў людзі спяшаліся на вігілію на ўрачыстыя нешпары[2]. Маленькая літоўская вёска з некалькіх дамоў пры касцёле, невялікі домік ксяндза і адзіная карчма былі не ў стане змясціць прыбываючых. Гумны і свіраны служылі паням за будуары і салон, а люд вясковы большай часткай адпачываў пад голым небам і пры першым свят-

[1] Miron-Bronisław Narbutt. Dubicze // Ziemia Lidzka. 1998. №2–3 (30–31).

[2] Нешпары — чытанні малітваў нараспеў. — *Заўвага перакладчыцы*.

ле спяшаўся да спавядальніц. Зранку ў дзень фэсту прыязджалі яўрэі-крамнікі, развешвалі ў прызначаных будах розныя тавары: рознакаляровыя пацеркі, яскравыя хустачкі, іголкі, напарсткі, разнастайныя ніткі, зіхоткі, усё гэта цешыла вока, і кожная пакупніца спяшалася што-небудзь набыць. У другім баку прадавалася палатно хатняга вырабу, сушаныя грыбы, шапкі і боты мужчынскія.

Перад касцёлам у два шэрагі сядзяць жабракі. Рознага кшталту калекі спяваюць разнастайныя святыя песні альбо, паўтараючы раз і назаўсёды завучаныя вершаваныя слупкі, заклікаюць да літасці тых, хто выходзіць з касцёла. І сыплюцца грошы да іх рук, а хлеб — да торбаў. Гоман ад размоваў, крыкаў і плачучых спеваў жабракоў, рознакаляровыя строі сялян, яўрэяў, шляхты і паноў — усё гэта ўяўляла з сябе абразок, годны пэндзля мастака фламандскай школы.

Ксяндзы спавядалі не толькі ў касцёле, але і на могілках пры касцёле. Ісці за працэсіяй можна было з цяжкасцю з-за людскіх тлумаў. Пасля св. імшы і нешпараў уся гэтая гурма людзей вярталася дадому, і на наступны дзень у Дубічах зноў панавала звычайная цішыня, аж да наступнага фэсту. Мясцовыя сяляне былі заможныя, богабаязныя і любілі Край, жылі з гаспадаркі і рыбалоўства.

У 1863 годзе, калі пачалося народнае паўстанне, лідскі аддзел пад кіраўніцтвам Людвіка Нарбута часта быў у Дубіцкіх лясах, і ў гэтых лясах у красавіку 1863 года адбылася бітва з расейцамі на чале з Цімафеевым, у якой цэлая партыя паўстанцаў здолела перайсці ў іншае месца, але яе кіраўнік з трынаццаццю ваярамі з блізкага атачэння лідскай шляхты палеглі. Салдаты маскоўскія абадралі трупы на полі бітвы і да Дубіч прывезлі іх нагія целы. Тагачасны генерал-губернатар віленскі Назімаў дазволіў ушанаваць памерлых пахаваннем у касцёле. Была сабраная патрэбная адзежа і зроблены труны. Целы гэтыя ляжалі тры дні ў бабінцы касцельным. Рыцарскі катафалк з дванаццаці простых трун паставілі ў касцёле, а слёзы люду віленскага і грамадства, енкі мацярок, сясцёр і сірот палеглых, быў найвыразнейшай мовай на іх пахаванні.

Усе прысутныя мелі за гонар несці гэтыя дарагія труны да месца іх вечнага спачыну і пакладзены яны ўсе былі ў адной агульный магіле пры касцёле, а людзі ўпрыгожылі гэтае месца найпрыгажэйшым помнікам, бо курган быў насыпаны уласнымі рукамі з роднай зямлі. Магіла абаронцаў Волі была страшнай для ворагаў: людзі збіраліся ля магілы і чыталі малітвы. Рускія знеслі касцёл і, не баючыся святакрадства, раскідалі курган, зруйнаваўшы яго з зямлёй. Аднак не згінула праз гэта памяць пра верных сыноў Краю, захоўваецца яна ў сэрцах усіх справядлівых і годных ліцвінаў і палякаў.

Шлюбныя войскі[1]

Часта і цяпер сярод лідзян старэйшага веку можна пачуць тытулы-мянушкі: «капітан войска Лясковіча», «маёр войска Валёвай» і т. п., якімі жартаўліва называлі людзей сямейных. А гісторыя з'яўлення такіх тытулаў наступная.

Быў у Лідскім павеце быў заможны стараста па прозвішчы Валь, уладар Ішчалны, Голдава і іншых вялікіх гаспадарак. Ён ужо у сталым веку ажаніўся з паннай з Шукевічаў і быў у яе так закаханы, што перад шлюбам апісаў на жонку ўсю сваю маёмасць. Пані Валёва была досыць энергічнай жанчынай і праз некаторы час самастойна кіравала не толькі маёнткам, але і асобай мужа, пра існаванне якога ўсе пачалі забывацца, бо ў размовах упаміналі толькі пра пані Валёву. Аднаго разу, калі ў маёнтку былі госці, Валь некалькі разоў паспрабаваў падтрымаць бяседу, аднак адна з госцяў цішком запыталася ў Валёвай: «Як завуць гэтага старога, напэўна гэта эканом пані?» І тая, пачырванеўшы, працадзіла праз зубы: «Гэта мой муж». Сястра ж пані Валёвай была замужам за Каралем Лясковічам. Лясковіч быў чалавек небагаты, але меў добрую галаву і моцную волю. Сваёй жонкай кіраваў дэспатычна. Прыкладна гэтак жа, як Валь у жонкі, яна не мела аніякага голасу ў мужа. Абедзве пары жылі разам, бо Лясковіч быў даверанай асобай Валёвай і займаўся яе гаспадарчымі справамі.

Кароль Нарбут, лідскі крайчы[2] і земскі пісар, будучы чалавекам вясёлага характару, падзяліў сваіх жанатых землякоў на два войскі: *«войска Валёвай»* і *«войска Лясковіча»*. Усе мужчыны, якія былі пад абцасам у жонак, і тыя, якія паслухмяна выконвалі жаночыя загады, адносіліся да афіцэраў войска Валёвай.

А ў залежнасці ад ступені заслуг — хто больш ці менш быў пакорны і падатлівы, атрымоўвалі патэнт на званні, ажно да генерала. І наадварот, мужы, якія трымалі сваіх жонак моцна, былі афіцэрамі войска Лясковіча.

Армія Валёвай мела ў сваіх шэрагах і капеланаў. Гэтымі капеланамі былі пробашчы, заваяваныя сваімі гаспадынямі.

Патэнты войска Валёвай гучалі прыблізна так:

«Мы, з яснавяльможнай ласкі, фельдмаршал войска Валёвай, абвяшчаем усім навокал і кожнаму асобна, каму аб гэтым ведаць патрэбна, што капітану NN прызначаецца (пералічваліся заслугі (падзеі), якія давалі права на ўзнагароду) званне маёра; пра гэта абвясцілі і даводзім: усім генералам, штаб- і обер-афіцэрам, усім шараговым вышэйназванага NN прызнаваць

[1] Miron-Bronisław Narbutt. Armije małżeńskie // Ziemia Lidzka. 2002. №1 (48).

[2] Крайчы — пасада пры княжацкім двары з XIII ст.: наразаць ежу пасля таго, як стольнік прынёс стравы на княжацкі стол

за маёра і належным чынам вайсковы гонар аддаваць. Выдадзена ў нашым галоўным штабе».

Подпіс фельдмаршала і начальніка штаба, а таксама пячатка на воску. На пячатцы быў вобраз тоўстай бабы, якая сядзела ў фатэлі з пугай, а перад ёй укленчаны муж. Вакол іх надпіс: «Пячатка войска Валёвай». На пячатцы войска Лясковіча быў мужчына які карае схіленую перад ім жанчыну і ўнізе надпіс: «Гэта я, служка пана майго». Вакол надпіс: «Пячатка войска Лясковіча». Калі ж хто-небудзь з афіцэраў войска Валёвай знаходзіў адвагу стаць самастойным у сям'і, яго пераводзілі ў войска Лясковіча; аднак гэта здаралася рэдка, і часцей афіцэры войска Лясковіча пераходзілі да Валёвай, бо нездарма Красіцкі напісаў: «Мы кіруем светам, а намі жанчыны».

У войску Валёвай быў асобны катэхізіс: былі абавязаны верыць, што адкупіла і асвяціла іх Яе Мосць. Як узнагароду за заслугі вышэйшыя афіцэры атрымоўвалі ад Яе Мосці права звацца адмысловым дрожджавым блінам, спечаным без агню і вады белай ручкай пані на марсавых іх палічках. Добры шляхецкі гумар выяўляўся ў гэтых жартах. Жартавалі ўзаемна, не крыўдуючы. Прылічалі сябе да найстаражытнейшых рыцараў, бо першы чалавек Адам ужо ў раі прыслугоўваў Еве. Гэтыя званні так увайшлі ў моду ў Лідскім павеце, што амаль кожны абывацель меў пэўны вайсковы чын і прыпіску да аднаго з войскаў.

Аднойчы на балі ў вёсцы Перапечыца Рапніна пазнаёмілі з крайчым Нарбутам. Падчас знаёмства Рапнін сказаў: *«Я з'яўляюся фельдмаршалам*[1] *расійскай арміі і меў бы задавальненне даведацца аб тым тытуле, які я мог бы мець у войску, створаным панам Нарбутам»*. На што Нарбут адказаў: «*Гэта будзе залежыць ад заслуг Вашай княскай светласці, заўважаных на адпаведным полі славы, прызначаным выключна для гэтых войскаў»*.

Праз нейкі час дамы намовілі княжну Рапніну падысці да мужа, які іграў у карты, і палашчыць яго па твары, што яна і зрабіла. Прайшло некалькі хвілін, і камердынер прынёс вялікі запячатаны пакет, які падаў князю. Рапнін неадкладна адкрыў пакет і знайшоў у ім патэнт на чын падхарунжага «войска Валёвай». Задаволены, ён, схаваўшы гэты патэнт, сказаў, што далучыць яго да іншых сваіх патэнтаў з вайсковымі тытуламі і ўзнагародамі[2].

Пераклад Галіны ЛАЎРЭШ, каментары Леаніда ЛАЎРЭША.

[1] Імператар Павел 18 лістапада 1796 г. прысвоіў 62-гадовому Рапніну чын генерал-фельдмаршала, а ў 1798 г. звольніў яго са службы. Гэта дазваляе датаваць падзеі ў Перапечыцы паміж 1796 і 1798 гг.

[2] Міхал Шымялевіч, закончыўшы друкаваць успаміны Мірона Браніслава Нарбута, даў кароткі каментар да тэксту «Шлюбныя войскі». Ён лічыў магчымым, што пад гумарыстычнымі «Шлюбнымі войскамі» хавалася сапраўдная арганізацыя, якая ў 1796 г. рыхтавала чарговае паўстанне. Улады напалі на след змоўшчыкаў, і таму для паратунку скампраметаваных асоб арганізацыя была прадстаўленая Рапніну як жарт. Для гэтага ў

«войскі» дадаваліся асобы, да якіх расійскі ўрад меў поўны давер. Таксама ён пісаў, што згодна з вуснай лідскай традыцыяй, фельдмаршал Рапнін быў злоўлены сваёй жонкай у маёнтку лідскага харунжага Юзафа Нарбута Перапечыца падчас «цалкам недвухсэнсавай сітуацыі» з удзелам лідскай харунжыны Ганны Нарбут з Гразмані (жонкі Юзафа Нарбута). У тым ліку і таму, каб неяк загладзіць правіну, гэтая сітуацыя ў Лідскім грамадстве была пададзеная як жарт. Для гэтага Рапніну быў публічна ўручаны дыплом падхарунжага «войска Валёвай». Адначасова змоўшчыкі зрабілі Рапніна як быццам саўдзельнікам змовы і такім чынам адвялі падазрэнні ад сябе. Гл: Лаўрэш Л. Л. Гісторык Юстын Нарбут. Яго навуковая дзейнасць, сям'я і сядзіба, яго дачка Каміла. С. 26–27.

Зоф'я Кавалеўская: Гісторыя Лідскага паўстання: успаміны пра Людвіка Нарбута[1]

«Колькі будуць Панары стаяць,
а воды Нёмана цячы і віраваць,
столькі наканавана дому Нарбутаў
на зямлі Лідскай славу збіраць!»

Раздзел I

Род Нарбутаў. Шаўры. Гісторык Літвы Тэадор Нарбут. Год 1812. У герцага Басано. Далейшыя прыгоды. Амністыя. Вяртанне ў Шаўры. Сужэнства з Крысцінай Садоўскай. Гаспадарства.

Так калісьці гаварылі пра старажытны род Нарбутаў і яго значэнне для Лідскай зямлі. Істотным было тое, што Остык-Нарбуты жылі ў Літве з незапамятных часоў і, шырока разгалінаваўшыся, стварылі заможны і ўплывовы род.

Знакаміты гісторык Літвы Тэадор Нарбут сваё паходжанне вёў ад Лідзейкі. Аднак насамрэч Нарбуты былі нашчадкамі Остыка, аднаго з літоўскіх князёў, імя якога Нарбуты насілі як прыдомак да свайго прозвішча. У 1413 годзе Нарбуты атрымалі права на герб Трубы. Гэты род заўсёды і пры кожнай патрэбе верна служыў свайму краю, набываючы з часам гонар і значнасць.

У XVI-м стагоддзі Нарбуты атрымалі пасапраўднаму каралеўскі дар — значная частка маёмасці была нададзена ім пасля Міхала Глінскага: вялікія зямельныя ўладанні ў Лідскім павеце, вялікія маёнткі ў Ашмянскім і Віленскім паветах, а таксама маёмасць на Жмудзі.

Адна з галін роду Нарбутаў асела ў Лідскім павеце ў маёнтку Шаўры, назва якога паходзіць ад літоўскага слова «сіеўрас», што азначае яшчарка.

У гэтых самых Шаўрах і прыйшоў на свет у 1784 годзе Тэадор Нарбут — даследчык Літвы, бацька Людвіка — кіраўніка паўстання 1863 года.

Ужо ў дзяцінстве Тэадор Нарбут вызначаўся незвычайным розумам. У падлеткавым узросце яго зацікавіла гісторыя паганскай Літвы: нават ба-

[1] Zofja Kowalewska. Dzieje powstania lidzkiego: wspomnienie o Ludwiku Narbucie. Wilno, 1934.

чыў сны пра Міндоўга і вайдэлотаў[1]. У 1803 годзе Тэадор скончыў курс навукі ў Віленскім універсітэце і апынуўся на вайсковай службе ў Пецярбургу. Як склаўся там лёс будучага даследчыка Літвы ўявіць цяжка.

Падчас адной з ваенных сутычак Расіі са Швецыяй Нарбут атрымаў кантузію і амаль зусім страціў слых. Па прычыне глухаты быў пераведзены ў штаб, дзе яго і напаткаў 1812 год.

Падзеі гэтага года ўзрушылі Нарбута так глыбока, што пакінулі ў яго памяці незабыўныя ўражанні да самай старасці.

Гарачы патрыёт роднага краю — Тэадор душыўся і мучыўся ў абціскаўшым яго расійскім мундзіры, чакаў вызваліцеля Напалеона і выказваў свае экзальтаваныя пачуцці ў паэзіі. У адным са сваіх тагачасных твораў ён апавядае пра сустрэчу на Замкавай гары ў Вільні з духам Лідзейкі. Першае, што робіць дух прыняўшы вобраз архікаплана ў такі важны для Літвы момант — знімае з галавы Тэадора трохкутны капялюш[2], ненавісны і непрыстойны для Нарбута. Гэты паэтычны твор доўгі час захоўваўся ў сям'і і загінуў пад час падзей 1863 года.

У 1812 годзе Тэадор Нарбут у складзе рускага штаба знаходзіцца ў Вільні, туды ў той самы час прыбывае Аляксандр I. З вокам павернутым на Захад, будучы гісторык Літвы разам з іншымі суайчыннікамі жывіўся надзеяй і чакаў збегу акалічнасцей. Як раз тады да яго зайшоў малады штабіст, князь Кацэбу[3] з весткай аб прызначаным на заўтрашні дзень адступленні расійскіх войск з Вільні.

— Што думаеш рабіць? — запытаў Кацэбу.

— Схавацца і застацца тут, — шчыра адказаў Нарбут. — Можа сваім на што-небудзь прыдамся.

Цар Аляксандр I пакінуў горад. Напалеон пераправіўся цераз Нёман і наблізіўся да сталіцы Гедыміна. Назаўтра, на світанку расейскія палкі пачалі выходзіць з Вільні, маршыруючы праз завулкі і вуліцы горада. Усе дзверы і вокны былі шчыльна зачынены і завешаны.

Нарбут схаваўся ў знаёмага купца. Падчас хаосу адступлення яго адсутнасць пры штабе не заўважылі. З першымі промнямі ўзыходзячага сонца ў Вільню ўвайшоў французскі авангард — аддзел польскіх уланаў князя Рад-

[1] Вайдэлоты (літ.: Vaidilos, лат.: Vaidelosi) — святары ў свяцілішчах агню старажытных прусаў і ліцвінаў, абавязкам якіх было прымаць ахвяры, даглядаць вогнішча, сачыць за каляндаром святаў, навучаць і даваць парады, а таксама апяваць на пахаваннях герояў-нябожчыкаў. — *заўвага перакладчыцы.*

[2] Трохвуголка — форменны капялюш рускай арміі. — *Л. Л.*

[3] Верагодна — Морыц Аўгуставіч Кацэбу (1789–1861) — генерал-лейтэнант, сенатар. Сын нямецкага пісьменніка Аўгуста фон Кацэбу. Кадэтам прыняў удзел у кругасветным плаванні 1803–1806 гадоў на фрэгаце «Надзея» пад камандаваннем Крузенштэрна. Потым паступіў на ваенную службу. Удзельнічаў у вайне 1812 года і быў узяты ў палон французамі і вызваліўся толькі ў 1814 годзе. — *Л. Л.*

зівіла. Умомант абудзіўся ад сну цэлы горад, адчыняліся дзверы, вокны і людскія сэрцы.

Шалёны энтузіязм ахапіў месцічаў. Пачуцці выбухнулі ў крыкі радасці. Жанчыны кідаліся да коней, лашчылі і нават цалавалі іх. Армія французаў уваходзіла ў горад.

Падхоплены на вуліцах людскімі хвалямі, Нарбут быў запхнуты ў нейкую невялічкую крамку, дзе зусім змучаны затрымаўся на хвілінку. На стале ляжалі пашарпаныя лісткі старога друку. Прыгледзеўся і закрычаў ад радасці. Гэта былі рэшткі Дыярыюша крыжацкіх дарог на Літве[1], Бог ведае, якім лёсам тут апынулася гэтакая каштоўнасць.

Думка пра гістарычную мінуўшчыну ўзяла верх над настроем тагачаснай хвіліны. Забыўшыся пра час, пра Напалеона, Тэадор занатоўваў словы старога друку. Не многа змог выкарыстаць з гэтых шматкоў будучы гісторык Літвы. І толькі пазней, асеўшы ў Шаўрах, ён грунтоўна выканаў даследніцкую працу.

Выбег з крамкі і, каб убачыць Напалеона, Нарбут накіраваўся да Зялёнага моста.

Імператар сядзеў на вялікіх бэльках і наглядаў за работай сапёраў, якія будавалі мост цераз Вілію — стары мост спалілі расейцы пакідаючы горад. За ракой, падпаленыя казакамі, гарэлі склады са збожжам, прадмесце Вільні і вёскі. Дым у паветры зацямняў яснасць раніцы.

Нарбут вырашыў адразу пайсці на службу да імператара Францыі. Каля Напалеона, аточанага цесным колам маршалаў і ад'ютантаў, стаяў тутэйшы настаяцель айцоў піяраў, ксёндз Гладоўскі. Непасрэдна да яго і звярнуўся Нарбут па пратэкцыю. Хацеў працаваць перакладчыкам, бо ведаў дзевяць еўрапейскіх моваў. Напалеон на хвіліну павярнуў галаву. Сталёвыя вочы ўважліва агледзелі постаць Нарбута.

Загадаў прыняць Нарбута ў канцылярыю міністра Басано[2] і не звяртаў болей увагі на просбіта. Нарбут атрымаў абмундзіраванне і грашовае забеспячэнне: дзесяць франкаў у дзень, сівую кабылу для раз'ездаў і грошы на яе ўтрыманне.

Большага Тэадор і не жадаў. Пачуваўся шчаслівa, але меў шмат работы.

Канцылярыя герцага Басано атрымоўвала палітычная і дыпламатычныя паперы большай або меншай важнасці, прыходзілі прыватныя петыцыі,

[1] Гэта не маглі быць лісткі старога друку, бо гэты тэкст быў выдадзены ў 6-ці тамах, з 1861 па 1874 гг. пад назвай «Scriptores rerum Prussicarum. Die Geschichtsquellen der preussischen Vorzeit bis zum Untergange der Ordensherrschaft». Малаверагодна, што Нарбут бачыў рукапіс гэтага найкаштоўнейшага дакумента. — *Л. Л.*

[2] Юг-Бернар Марэ (1763–1839) — французскі дыпламат, журналіст, адвакат, палітык і дзяржаўны дзеяч, у 1811–1813 гг. — міністр замежных спраў, у 1834 г. — прэм'ер-міністр. З 1809 г. насіў ганаровы (беззямельны) тытул герцага Басано. — *Л. Л.*

ішла прыватная карэспандэнцыя. Усё гэта патрэбна было прачытаць, зарэгістраваць у кнізе і перакласці.

Герцаг Басано часта нават уначы пастаянна меў нейкія пытанні і, паколькі Нарбут быў глухі, дык даваў яму пісьмовыя загады. Часта Нарбута пасылалі з важнымі заданнямі, якія ён выконваў сумленна, і таму здабыў давер князя і павагу калег.

Нарэшце надышоў эпілог гістарычнай драмы — трагічнае вяртанне з Масквы.

Нарбут не пакідаў Вільні і з вялікім непакоем назіраў за тым, як з галоўнага імператарскага штаба пачыналі наплываць туманныя загады і няясныя рапарты. Злавесныя весткі ішлі ў Вільню з хуткасцю тэлеграфа, якога яшчэ і не было. У канцылярыі герцага Басано нарастаў хаос. Напалеон з-пад Бярэзіны, едучы ў Парыж таемна прамчаўся праз Вільню, за ім імчалася смерць.

За Напалеонам з Вільні спешна рушыў увесь штаб. Урэшце пацягнуліся недабіткі Вялікай арміі, абазначаючы трупамі свой снежны шлях адыходу.

Ваенная эпапея заканчвалася. Год 1812 сыходзіў у бездань вякоў! Прайшоў, як ураган, як сон, поўны казачных прывідаў.

Разам з канцылярыяй Басано пацягнуўся за Нёман на сваёй Сіўцы і Нарбут. Але ўжо каля Аўгустова ён зразумеў, што не можа бадзяцца недзе на чужыне і вырашыў застацца на Радзіме. Павярнуў Сіўку і паехаў да свайго сваяка Прота Нарбута, які жыў тут недалёка. Прот — сын вядомага прыгажуна Нарбута, які быў аздобай салона на «чацвярговых абедах»[1] караля Станіслава Панятоўскага.

Спадар Прот і яго дачка Клемянціна прынялі Тэадора са стараліцвінскай гасціннасцю, і гісторык змог тут адпачыць ад перажытага. Час бавілі за размовамі пры каміне. Клямуся, займаючыся вышыўкай, уважліва слухала сваяка і выходзіла толькі каб у стайні папесціць Сіўку.

У Краі тым часам канала астатняе рэха той буры, якая яго страсянула. Кароткі сон мінуў. Тутэйшую грамадскасць будзіла цяжкая рэчаіснасць. Усе правінцыі атрымалі новую ўладу і новыя правы. Шукалі дэзерціраў. Чуйнае вушка Клямусі з непакоем прыслухоўвалася да ўсіх чутак. І аднойчы яна прыбегла з весткай пра набліжэнне казакаў.

[1] На «чацвярговых абедах» караля з найбліжэйшымі паплечнікамі, падданым падаваўся прыклад ашчаднасці і цвярозасці. На гэтых абедах укладаліся планы па ўратаванні Рэчы Паспалітай. «Абеды» ў 1770–77 гг. штотыдзень нават выдавалі свой неафіцыйны орган — часопіс «Забаўкі прыемныя і карысныя, сабраныя ад розных аўтараў», які прапагандаваў прынцыпы станіславаўскага класіцызму. Гэта першы літаратурны часопіс у РП, яго заснавальнік і рэдактар — Ю. Альбертрандзі, рэдактар з 1771 г. — А. Нарушэвіч. У «Забаўках...» дэбютавалі: І. Красіцкі, С. Тамбэцкі, Т. К. Венгерскі, Ю. Шыманоўскі. — *Л. Л.*

Сіўка стаяла каля ганка пад сядлом. Казакі ўжо ўязджалі праз браму, таму часу ў Тэадора амаль не было. Сіўка з вершнікам адным скокам пераскочыла цераз плот і пагнала. За ёй пусціліся казакі, але, не здолеўшы дагнаць, сыпанулі градам куль. Параненая раз і другі Сіўка яшчэ бегла. Урэшце яе дабіла трэцяя куля, і Сіўка звалілася каля зарослага густым чаротам возера. Тэадор схаваўся і перасядзеў тут да ночы, але яшчэ доўга разлятаўся тупат коней, доўга свісталі кулі над чаротам.

Калі ўсё сціхла, начны змрок ахінуў зямлю. Нарбут выйшаў з укрыцця і асцярожна скіраваўся да бліжэйшай плябаніі. Падалося, што ксёндз-пробашч чакаў яго. Ціха сам адчыніў яму дзверы і правёў ва ўнутр. Тут перапрануў парабкам і пасадзіў яго як вазніцу на вазок, загадаўшы як быццам везці ксендза да хворага. Узяў з касцёла св. Сакрамант.

Ксёндз у начной цемры падказваў дарогу. Праз некаторы час стаялі перад леснічоўкай.

Ксёндз паставіў св. Сакрамант на стале, паклікаў усю сям'ю лесніка і загадаў ім прысягнуць, што яны не здрадзяць таму, каго ён прывёз, не выдадуць расейцам, схаваюць і зберагуць у сябе. Прысягнулі ўсе.

У лясной глушы сярод сумленных людзей Нарбут адчуваў сябе ў бяспецы. Апека кузіны Клямусі і тут яму дапамагала.

Было дамоўлена, што калі Тэадор пойдзе кудысьці з хаты, а ў яе прыйдзе нехта чужы, дык на знак небяспекі будуць вывешаны белыя хусткі. Пасярод гэтай лясной цішы Нарбут пачаў працаваць над гісторыяй Літвы. Старанна збіраў усялякія легенды, байкі і паданні, будуючы на іх падставе гмах адважных высноў і карцін з дагістарычных, паганскіх часоў.

Час ад часу леснічоўку наведваў спадар Прот, а яго дачка ў казакаў выкупіла шкуру Сіўкі і загадала пашыць з яе доўгі дарожны куфэрак, у якім гістарыёграф Літвы праз усё жыццё захоўваў свой французскі мундзір, лісты герцага Басано, загады Напалеона і іншыя сувеніры тых часоў.

У наступным годзе цар Аляксандр абвясціў амністыю для ўсіх удзельнікаў ваеннай драмы. Амністыя была шчырай і выбачала ўсіх без наступстваў. Нарбут звярнуўся да ласкі манарха і атрымаў звальненне са службы і пагашаную за ўвесь час грашовую запазычанасць.

Нарэшце ён вярнуўся ў свае Шаўры і пачаў жыць пад сямейным дахам з набытым куфэркам і сваімі ўспамінамі.

Нарбута паглынула гістарычная праца. Збіраў і аб'ядноўваў матэрыялы, набываў каштоўныя дакументы. Расла яго бібліятэка. Перад першай краёвай бурай Тэадор Нарбут пабраўся шлюбам з Крысцінай Садоўскай[1], дачкой жаўнера Касцюшкі. Яны пазнаёміліся на касцельнай службе ў Бутры-

[1] Маецца на ўвазе паўстанне 1831 г. Але Тэадор Нарбут ажаніўся з Крысцінай каля 1840 г. — *Л. Л.*

манцах. Крысціна была маладая, вясёлая, чарнавокая прыгажуня і, хоць не мела добрай адукацыі, але, як тады казалі, мела прыроджаны розум і шляхетную душу, што кампенсавала ўсякія салонныя недахопы. Баць-коўскія традыцыі развілі ў ёй глыбокі патрыятызм, а дзейны і энергічны характар зрабіў з яе выключную дзяўчыну.

Звяз з беднай шляхцяначкай не падабаўся гордай сям'і Нарбутаў. Гэта ўспрымалася як мезальянс, які аслабіў сувязі са сваякамі, але прынёс Тэадору шчасце. Маладая жонка стала неацэнным скарбам і як кіраўнік гаспадаркі і як выхавацелька дзяцей.

Гісторык мог спакойна аддавацца сваёй літаратурнай працы. У 1835 і 1841 гадах у Вільні пабачыла свет яго вялікая праца ў 9-ці тамах, выдадзеная пад назвай «Гісторыя народу Літоўскага» («Dzieje starozytne narodu litewskiego»). Праца трохі грашыць перабольшанымі фантазіямі, бо абапіраецца на паданні, байкі і легенды. Прафесар Спасовіч[1] гаворыць пра працу Нарбута так: *«... гэта праца вялікая, арыгінальная, але некрытычная»*. Пры ўсім пры гэтым Нарбут заслугоўвае вялікай пашаны, як адзін з піянераў у даследаванні мінуўшчыны Літвы і тым, што сваім прыкладам заахвоціў іншых да далейшага вывучэння гісторыі краю. Тэадор Нарбут працаваў бесперапынна, і ў 1846 годзе выдаў «Помнікі гістарычных падзей літоўскіх» (Pomniki do dziejow litewskich... Wilno, 1846.), у 1847 годзе «Кароткі выклад гісторыі літоўскай» (Dzieje narodu litewskiego w krotkosci zebrane. Wilno, 1847.), у 1856 годзе «Нарысы гістарычныя...» (Pomniejsze pisma historyczne, szczegolnie do historii Litwy odnoszace sie. Wilno, 1856.) Некалькі прац Нарбута засталіся ў рукапісах.

Калі першы гістарыёграф Літвы сядзеў, паглыбіўшыся ў даследаванні мінулага, яго жонка ўзяла стырно ў доме ў свае рукі. Заняпалая гаспадарка пачала патрохі ўзнімацца, разгаліноўвацца. Перад усім заквітнелі хатнія рамёствы, задавальняючы ўсе патрэбы дома, як гэта было ў большасці тагачасных гаспадарак. Вельмі пашырылася вырошчванне ільну і канопель, адначасова да такой ступені развілося ткацтва, што ткацкія вырабы дому Нарбутаў мелі выключную славу.

Шаўры паволі ператвараліся ў мястэчка. Мелі піва і ўласную гарэлку, якая не абкладалася акцызам, а перараблялася на знакамітыя літоўскія старкі, вядомыя ў Краі і за яго межамі. Вуллі давалі мёд, які таксама перарабляўся на гаспадарцы: з яго выраблялі воцат і настойкі. Ураджаі хлеба на палях былі дастатковымі; лясы, амаль некранутыя, давалі будаўнічы матэрыял, паліва, дзёгаць і смалу; аборы і хлявы адзявалі і кармілі; сады славіліся садавінай, а ставы рыбай. Гэтыя Божыя дары патрабавалі таго толькі, каб прыстасаваць іх для хатняга ўжытку.

[1] Уладзімір Данілавіч Спасовіч (1829—1906) — беларускі, рускі і польскі юрыст, грамадскі дзеяч, публіцыст і крытык. — *Л. Л.*

Шаўры мелі цэлую арганізацыю ўласных рамеснікаў: цесляры, дахаўшчыкі, сталяры, гарбары, рымары, ткачы, краўцы. Кравец Кароль, які абшываў усю сям'ю Нарбутаў з тканін, выраблены ў гаспадарцы, быў сапраўдным майстрам сваёй справы. Ваколічныя модніцы замаўлялі ў яго свае ўборы. Кухар Юрак мог дагадзіць самым вытанчаным кулінарным густам, а яго «свянцонае» славілася на ўвесь Лідскі павет.

У тагачасным эканамічным жыцці грош не пакідаў кішэнь так лёгка, як сёння, і гэтак жа цяжка ў яе патрапляў, бо сельскагаспадарчыя прадукты былі вельмі танныя.

Дом у Шаўрах уяўляў сабой згасаючы тып стараліцвінскіх двароў. Ён яднаў вакол сябе вясковую моладзь, якая падчас вучобы рамёствам знаходзілася пад уплывам народных традыцый. Суадносіны з вёскай насілі характар партнёрскай інтымнасці. Тое, аб чым пішам, у тагачасныя «прыгонныя» часы выглядала ідыліяй, аднак акрамя пануючага паўсюдна ўціску вяскоўцаў, часта знаходзіліся двары падобныя да Шаўроў, дзе хаты падданых атачаліся бацькоўскай любоўю і клапатлівай апекай. Да такіх патрыярхальных двароў належалі і Горкі[1] Магнушэўскіх ў Наваградскім павеце.

Добразычлівыя адносіны, якія злучалі Нарбутаў з вёскай, перайшлі і ў наступныя пакаленні і не знікалі доўгі час пасля скасавання паншчыны. У 1863 годзе вёска Шаўры не заплямілa сябе аніводнай здрадай, а ні даносам. Наадварот, заўсёды жадала дапамагчы і паслужыць сваім «даўнейшым панам».

РАЗДЗЕЛ II

Сям'я Тэадора Нарбута. Нараджэнне Людвіка. Гады неспакою. Уплыў бягучых абставін. Дзятва ў Шаўрах. Герадоўскі. Атмасфера ў доме.

Нарбуты мелі многа дзяцей — пяць сыноў: Людвік, Аляксандр, Францішак, Баляслаў і Станіслаў, а таксама тры дачкі: Яна, пазнейшая Кунцавічова; Амелія, пазнейшая Стрыенская; і Тэадора, якая праз некалькі гадоў аўдавела па шлюбе з Манчунскім.

З усіх сыноў Тэадора на ўсю Літву праславіўся Людвік, памяці якога прысвечаны гэтыя старонкі.

Яго імя пакрытае славай як правадыра паўстанцаў 1863 года. Розгалас аб ім шырока разляцеўся па Краі і запісаны ў гісторыі тагачаснай барацьбы за Айчыну, як пра чалавека ідэі і знакамітага партызана.

З братоў Людвіка актыўны ўдзел у паўстанні бралі Баляслаў і Францішак. Апошні ваяваў у Каралеўстве ў шэрагах Лангевіча. Гарачай і актыўнай

[1] Горкі — былая маёмасць Магнушэўскіх, тут захаваўся прысядзібны парк XIX—XX ст. Зараз аграгарадок у Стаўпецкім раёне Менскай вобласці. — *Л. Л.*

патрыёткай была сястра Людвіка — Тэадора Манчунская, правая рука Людвіка. Яна служыла народнай справе з поўнай самааддачай.

Вяртаючыся да акалічнасцей, якія характарызавалі жыццё ў Шаўрах, разгледзім іх больш падрабязна, таму што менавіта сям'я ад самай калыскі ўплывала на фарміраванне душы Людвіка, на яго пазнейшыя думкі і памкненні.

Людвік Нарбут прыйшоў на свет у Шаўрах. Датай яго нараджэння паводле метрычных кніг у Начы быў верасень 31-га дня 1832 года. Аднак сямейная традыцыя гаворыць, што наш герой нарадзіўся ў 1831 годзе падчас найбуйнейшай завірухі ў Краі. Маці Людвіка, якая тады насіла яго ў сваім улонні, перажывала цэлую гаму пачуццяў: ад ап'янення радасцю і надзеяй пры поглядзе на аддзел Гелгуда, які праходзіў праз Шаўры, да пазнейшых балючых наступстваў. Такія ўзрушэнні не маглі не паўплываць на дзіцятка. З малаком маці ён усмоктваў потым горыч народнага болю. З яе грудзей чэрпаў міласць да Краю, якая пазней стала найважнейшай ідэяй яго жыцця. У маленстве яго калыхалі пад патрыятычныя песенькі, якая ціха напявала маці. У дзяцінстве чуў вакол людское шаптанне прозвішч Канарскі[1], Рэр[2], Валовіч[3] і іншых, звязаных з такімі выразамі, як *вязніца, застрэліць, шыбеніца, высылка на Сібір*.

Гэта былі амаль першыя выразы, якія моцна затрымаліся ў галаве дзіцяці, хаця іх значэнні яшчэ не ўсведамляліся. Чуў таксама шкадаванні і разважанні аб скасаванні уніі, аб подлай і здрадніцкай дзейнасці Сямашкі і г. д. Няня расказвала яму страшныя гісторыі пра гнюсны пераслед усіх тых, хто на «православие» перайсці не захацеў, пра збіццё іх нагайкамі, высылку ў Сібір, пра гвалтоўнае забіранне ўніяцкіх цэркваў.

Лідскі павет у тыя часы належаў да Гарадзенскай губерні, якой кіраваў знакаміты сваім зверствам Мураўёў, празваны за тое потым віленскім катам. Значным было супраціўленне тутэйшага насельніцтва, і таму ў Лідскім павеце пераслед быў большым, чым дзе-небудзь.

Неаднаразова званочкі кібіткі чуліся і ў Шаўрах, адсюль гвалтоўна забіралі бацьку Людвіка — Тэадора і везлі ў Вільню, дзе ён павінен быў тлумачыць свае артыкулы ў «Кур'еры» ці сваю даўнейшую прыналежнасць да

[1] Шыман (Сымон) Канарскі (1808—1839) — дзеяч нацыянальна-вызвольнага руху ў Польшчы, Літве і на Беларусі. Удзельнік паўстання 1830—1831 гадоў, быў у эміграцыі ў Францыі. У 1835 г. нелегальна вярнуўся з эміграцыі ў Расію і стварыў падпольную арганізацыю «Садружнасць польскага народа». Фактычна Шыман Канарскі рыхтаваў новае паўстанне. У траўні 1838 г. быў арыштаваны і ў 1839 г. расстраляны. — *Л. Л.*

[2] Ян Рэр (ці Ройр, Rohr, Roehr, Rer, Rher, 1816—1877). Закончыў гімназію ў Познані і Уроцлаўскі ўніверсітэт. З 1844 г. быў членам канспіратыўнай арганізацыі. У 1845 г. быў пасланы ў Літву для стварэння падпольнай арганізацыі. У 1847 г. арыштаваны і прысуджаны на 12 год катаргі. У Сібіры знаходзіўся да 1857 г. У 1863 г. далучыўся да паўстання ў Польшчы. — *Л. Л.*

[3] Міхал Валовіч (1833—1833) — рэвалюцыянер, удзельнік нацыянальна-вызвольнага паўстання (1830—1831). — *Л. Л.*

«Таварыства Шубраўцаў»[1] ці іншыя падобныя «злачынствы». Аднак, даючы зарабіць дзяржаўным мужам на «кашу і соль», гісторык Літвы заўсёды здымаў з сябе абвінавачванні і шчасліва вяртаўся дадому, дзе яго з вялікай радасцю вітала сям'я.

Год 1840 выцяў па Літве новым гвалтам. Указам ад 9 верасня ліквідавана старажытнае цывільнае права: Літоўскі Статут.

Дагэтуль цывільныя суды былі адкрытыя. Справы абаранялі адвакаты, дзяржаўных службоўцаў выбіралі, пастановы і судовыя акты пісалі па-польску. Цяпер уводзілася мова расійская і працэдуры закрытыя. З гэтым прыйшло хабарніцтва і дэмаралізацыя дзяржаўных службоўцаў.

Засмучэнне дарослых прыгнятала сэрцы дзіцяці. Не разумеў добра, што адбываецца, але адчуваў крыўду, хацеў абараніць, яго розум пастаянна аналізаваў і на яго дзіцячым твары Божая рука пакінула сляды ахвяраў і пакутаў.

У дзяцінстве найбольш вылучалася сваім яднаннем чацвёрка: Людвік, Баляслаў, Францішак і сястра Тэадора. Верхаводзіў у ёй Людвік, інтэлектуальна развіты вышэй за свой узрост.

Дзеці мелі дарослага прыяцеля: нейкага Гератоўскага, які ад 1831 года стала жыў у Шаўрах. Адкуль прыйшоў, кім быў, як уласна называўся, ніхто не ведаў. Таямніца засталася да самай яго смерці і з ім разам пайшла ў труну.

Гератоўскі трохі навучаў дзятву і апавядаў цікавыя рэчы з мінуўшчыны, асабліва пра 1831 год. Часта гістарычныя падзеі станавіліся тэмай дзіцячых гульняў у дальнім куце сада. Дзеці разам з Гератоўскім гулялі ў вайну. Людвік выступаў у ролі Касцюшкі. Баляслаў быў яго ад'ютантам, а сястра Тэадора — Плятароўнай[2]. Пасля гульні, дзеці, знясіленыя бегам, сядалі на вялікім камені і па-свойму вырашалі пытанні пакутніцтва і цярпення Краю і народа:

— А што было б, каб я вам здрадзіла? — спытала аднойчы Тэадора ў братоў.

— Адракліся б ад цябе, — сказаў Баляслаў.

— А я б цябе забіў уласнай рукой, — дадаў паважна Людвік.

Гісторык Літвы Тэадор Нарбут вельмі любіў сваіх дзяцей, песціў іх, а калі меў магчымасць адарвацца ад пяра, расказваў ім пра Напалеона, пра 1812 год і аб сваіх прыгодах. Моладзь гэтыя аповеды вельмі займалі.

З-пад страхі выцягваўся куфар са скуры Сіўкі, у якім стары прыхільнік Напалеона хаваў памятныя рэчы старых часоў, рэчы паважна вымаліся, і

[1] Шубраўцы — сябры літаратурна-грамадскага таварыства ліберальна-асветніцкага кірунку, якое існавала ў Вільні ў 1817—1822 гг. — *Л. Л.*

[2] Маецца на ўвазе гераіня паўстання 1831 г. Эмілія Плятэр. — *Л. Л.*

бацька ўзрушана, са слязьмі на вачах, як рэліквіі, раскладаў іх вакол сябе. Дзеці з вялікім хваляваннем пачціва маўчалі і слухалі бацьку, а потым нават падносілі да вуснаў гэтыя скарбы.

Найбольш хваляваў Тэадора стары мундзір, сукно паблякла, але бліскучыя эпалеты ўсё яшчэ будзілі ў ім прывіды 1812 года — часоў яго маладосці і надзеі.

«Старога прыяцеля», як называў ён свой мундзір, нават ушанаваў вершам, які пачынаўся гэтак:

Калі я ўсё страціў падчас краёвых бур,
Ты адзін са мной застаўся,
мой стары мундур!
Ты блішчаў на мне ў часы,
калі Край быў у патрэбе,
Я ж рызыкоўна падстаўляў
пад удары себя і цебя.
Зніклі мае прыгожыя дні,
як дым у начныя хвіліны,
Але ўсё ж шчаслівы той,
хто мае ўспаміны.

Тэадор Нарбут жыў гэтымі ўспамінамі і мацаваўся імі да позняй старасці, пры гэтым часта паўтараў: «О, лёс! Хто цябе бачыў у нашым Краі…»

Творы Міцкевіча, такія як «Пан Тадэвуш», «Дзяды» і іншыя хадзілі тады пераважна перапісаныя ад рукі, бо іх друк быў забаронены. Дзеці Нарбутаў ведалі цэлыя раздзелы на памяць, хапаючы на ляту тое, што ім уголас чыталі бацькі або дэкламаваў Гератоўскі.

Аднаго дня, калі маці дома не было, па дарозе за гародам цягнуўся расійскі эскадрон.

Дзеці вырашылі здзейсніць, як ім уяўлялася, геройскі ўчынак: голасна маніфеставаць свае патрыятычныя пачуцці. Забеглі ў кусты парэчак і агрэсту каля плоту пры дарозе і з усяе сілы свайго дзіцячага голасу запелі патрыятычную песню.

Яны былі ўпэўнены — іх павесяць, прыгатаваліся да пакутніцкай смерці, але эскадрон цягнуўся, не звяртаючы на спеў ніякай увагі, што вельмі збянтэжыла маладых патрыётаў.

Доўгімі вечарамі дамавая чэлядзь збіралася на супольныя спевы «гадзінак» ці на спевы калядных песняў. Часам маці, якая мела чысты і моцны голас, спявала з кухарам Каралем, які быў адораны шыкоўным басам, дуэт «Барацьба анёла з шатанам». Спадарыня Манчунская, якой мы абавязаны ўсімі падрабязнасці хатняга жыцця ў Шаўрах, гаворыць, што нават опера і

славутыя артысты, каторых яна чула ў сваім жыцці, не выклікалі ў яе такога моцнага ўражання, як сціплы дуэт дзіцячых гадоў у Шаўрах. Калі Людвік дарос да падлеткавага ўзросту, яго аддалі ў школу ў Лідзе[1]. Аднак вучоба не магла заглушыць яго патрыятычныя пачуцці. Калі прыязджаў дадому на святы ці вакацыі, гэтыя пачуцці станавіліся ўсё мацней. Стоячы перад маці, не раз дэкламаваў патрыятычныя вершы, а яна плакала, прыкрываючы вусны сына сваёй далонню і цалавала, тулячы да грудзей яго галаву.

Адзін раз Людвік ёй сказаў: «Буду, мама, ці вялікім чалавекам, ці бандытам». Маці хвалявалася і трывожылася за свайго ўлюбёнца, бо адчувала, што вісіць над ім нешта фатальнае, здольнае вырваць сына з матчыных рук.

РАДЗЕЛ III

Людвік Нарбут у Вільні. Рэха з захаду. Фермент школьнай моладзі. Арышт і следства. Вырак і выкананне. Пасівеўшая маці. Выгнанне Людвіка. Побыт на Каўказе. Удзел у партызанскай барацьбе. Вяртанне ў Край. Жаніцьба. Падрыхтоўчая праца.

У 1848 годзе Людвік Нарбут па заканчэнні школы ў Лідзе знаходзіўся ў так званым Шляхецкім інстытуце. Там яго наведвала маці, якая заўсёды сама займалася пытаннямі вучобы і жылля сыноў, дамовамі з прафесарамі і г. д. На рэдкасць адважная жанчына, яна мела практычны мужчынскі розум і са здаровым сэнсам падыходзіла да жыццёвых спраў, ва ўсім давала сабе рады. Паглыблены ў свае кнігі гістарыёграф Літвы заўсёды ахвотна дзяліўся хатнімі справамі з жонкай.

Як ў сямейным доме, так і ў школах Людвік аказваў на калег вялікі ўплыў.

Яго духоўная перавага заўсёды брала верх, і да яго хілілася моладзь. А ў яго сэрцы і галаве гартавалася адзіная думка: вызваленне Краю. Марыў пра вялікія, смелыя ўчынкі, прыслухоўваўся да рэха эміграцыі, якое наплывала з захаду, да розгаласу барацьбы народаў за незалежнасць. Гады 1846, 47 і 48 забяспечылі яго багатым матэрыялам і горача хвалявалі маладое ўяўленне.

У Краі з'яўляліся розныя эмісары, мелі распаўсюд рэвалюцыйныя брашуры і звароты, якія траплялі ў рукі моладзі і распалялі кроў у яе жылах.

Паўстанне ў Бадэне[2] і ўдзел у ім палякаў з Мірaслаўскім, Лютаўская рэвалюцыя, нарэшце вайна 1848 года ў Венгрыі[3] — усе гэтыя падзеі спарад-

[1] Людвік Нарбут вучыўся ў Лідскай павятовай вучэльні і, скончыўшы яе каля 1846 года, паступіў у Віленскую гімназію. — *Л. Л.*

[2] Пасля атрымання вестак пра лютаўскую рэвалюцыю 1848 года ў Францыі, у першых днях сакавіка ў розных дзяржавах Германіі — Бадэне, Вюртэмбергу, Баварыі, Гесэн-Дармштаце, Саксоніі і іншых — адбыліся хваляванні. У 1849 г. для абароны пастаноў парламен-

зілі ўздым патрыятычнага руху ў краі і ўзбудзілі дух моладзі амаль ва ўсіх установах адукацыі Літвы. Асабліва ўзрасло абурэнне ў Шляхецкім інстытуце. Паўсюдна ўтвараліся таварыствы і складаліся арганізацыі школьнай моладзі, якія камунікавалі паміж сабой. Вільня была запальнікам гэтага моладзевага руху. З Вільні, як павуцінне, цягнуліся ніці, якія ахоплівалі Менск і іншыя гарады.

Людвік, прыбыўшы ў Вільню, адразу трапіў у гэтую сетку — знайшоў выхад для свайго арганізацыйнага таленту. Хутка ён ужо быў у першых, найбольш адказных, шэрагах.

Калі прыязджаў з Вільні на вакацыі ў Шаўры, родныя заўважалі яго сталенне. З непакоем гледзячы на любага сына, гэтыя змены заўважала і маці. Апошнія дні вакацый у бацькоўскім доме былі насычаны незвычайным дзіўным сумам. Родныя глядзелі на Людвіка з трывогай, адчуваючы, як нешта вялікае і грознае выспявае ў яго сэрцы. Аднак ніхто не адважваўся аб гэтым запытаць.

Дні ішлі…

Напярэдадні ад'езду, калі, як і ў дзяцінстве, апынуліся разам у садзе, Людвік адкрыў сцізорык і ўторкнуў яго ў зямлю, потым паказваючы на затопленае ў пяску лязо, сказаў: «Можа і мне хутка вось так уваб'юць нож у сэрца».

Гэтыя загадкавыя словы дрыжыкамі жаху працялі родных. Людвік доўга блукаў па садзе засмучаны і задуманы, як бы развітваўся, вырэзваў на дрэвах даты, літары і розныя іерогліфы.

Калі ад'язджаў, дык туліўся даўжэй, чым звыкла, да грудзей бацькоў са слязьмі на вачах, быў моцна ўзрушаны. Забіраў разам з сабой малодшага брата Баляслава, якога пад яго апеку аддавалі бацькі, не маючы магчымасці гэтым разам самім адвезці сына ў школу.

У гэтым маўклівым расставанні быў такі балючы смутак, што пасля ад'езду Людвіка сям'ю ахапіў вялікі неспакой. У хуткім часе Шаўры атрымалі жорсткі ўдар. Найперш даведаліся аб бурленні моладзі ў школах, потым атрымалі паведамленне пра арышт Людвіка і тую жудасную кару, якая яму гразіла.

Патрыятычны моладзевы рух прыцягнуў увагу куратараў і адміністрацыйнай улады. Паколькі першыя з бацькоўскім паразуменнем трактавалі ўзбуджэнне сярод вучняў і хацелі надаць моладзевым эмацыйным выбухам характар аднаразовага свавольства і адпаведна яго пакараць, то другія ўчынілі вялікі алярм, надаўшы справе велізарнае палітычнае значэнне, хоць насамрэч гэта была канспірацыя нявінная і не мела пад сабой аніякіх важных эфектаў.

та ў Гайдэльбергу (Бадэн) адбыліся народныя паўстанні, але яны хутка былі задушаны пры дапамозе прускіх войскаў. — *Л. Л.*

[3] Маюцца на ўвазе падзеі рэвалюцыя 1848–1849 гадоў у Венгрыі. — *Л. Л.*

Генерал-губернатар Бібікаў загадаў прымяніць самыя цяжкія сродкі.

Пачаліся ператрусы, суровае следства, арышты.

Аднак знайшлі на дзіва мала: нязначныя абрыўкі занатовак, вершыкі, патрыятычныя песні. Вучняў прывозілі з Менска і іншых гарадоў у Вільню з мэтай расследавання і вочных ставак з калегамі. Легкадумна прыведзены ў моладзевую арганізацыю вучнем Паўлам Вейхнерам нейкі Плонскі збаяўся і замнога нагаварыў, пачаліся новыя арышты.

Людвік Нарбут, у якога знайшлі нейкія дробныя абрыўкі — занатоўкі, з некалькімі сваімі калегамі атрымаў сто «розаг» і «вечныя салдаты». Гэта была найвышэйшая мера пакарання.

Свой вырак прыняў з поўным спакоем.

Некалькі соцень іншых вучняў пакараны на 75 розаг і выключэнне, увесь час секлі на холадзе, падзяліўшы на 4 катэгорыі. Першая атрымала 100 розаг, другая — 75, трэцяя — 50, а чацвёртая — 25.

Цялеснае пакаранне практыкавалася тады ва ўсіх школах. Гэтыя экзекуцыі адбываліся ціха, пры дапамозе школьных вартаўнікоў, якія шкадавалі вінаватых, і таму пакаранне насіла хутчэй характар бацькоўскай кары. Аднак на гэты раз па судовай пастанове прымянілі хлысты «для маладых палітычных злачынцаў» і надалі гэтаму пакаранню паказальны характар. Так рабілася, каб паўплываць на грамадства і нанесці большае маральнае прыніжэнне асуджанаму.

Вучняў секлі розгамі публічна.

Прысутнічалі пры экзекуцыі прадстаўнікі адміністрацыйнай, судовай і школьнай улады, маршалкі і куратары. Вучні, якія не падлягалі пакаранню, стаялі ў шэрагах адзетыя ў школьныя мундзіры, і павінны былі глядзець на пакаранне гэтак жа, як бацькі і апекуны асуджаных.

На гэтую бацькоўскую Галгофу прыбылі з Шаўроў і Нарбуты, яны стаялі ў шэрагу з іншымі і глядзелі на мукі свайго сына. Многія маці млелі. Крысціна Нарбут стаяла, як каменная статуя з сухімі вачамі, якія палымнелі глыбокім болем. Людвік не выдаў ані аднаго енку. Пасля экзекуцыі схіліўся да ног бацькоў. І тады іх вусны прыпалі да збляднелага ілба сына, а дрыжачыя рукі складалі дабраслаўленне на гэтую ўлюбёную галаву.

Людвіку толькі ледзь споўнілася 17 гадоў, але яго твар меў выраз дарослага ўпэўненага ў сабе чалавека. Маці ганарылася сынам, хоць былая брунетка і вярнулася з Вільні сівой жанчынай. Вялікі смутак агарнуў Шаўры. Можа нават смерць не нанесла б сэрцу бацькоў такой вялікай раны, як гэтае выпадзенне з-пад бацькоўскіх крылаў, ссылка ў далёкую старану, да чужых людзей, ніжэйшых маральна і культурна, дзе чалавечая годнасць сына, яго пачуцці і амбіцыі павінны былі падвяргацца пастаяннаму прыніжэнню.

Паштовая сувязь працавала кепска. Доўгія месяцы і амаль што гады можна было чакаць ліст ад беднага салдата, вестачку ад сына і брата. І сын,

і брат, акружаны арэолам пакутніцтва, стаў для сям'і святым! Прыпаміналі яго словы, выказаныя ім думкі. Малодшае пакаленне брала яго за прыклад.

Час ішоў, праходзілі цяжкія дні, месяцы, гады. Людвік закінуты далёка ад роднага гнязда не здрадзіў сваім прынцыпам, сумленна выконваў вайсковую службу і цярпліва зносіў розныя прыніжэнні, супраць якіх працягвала бунтаваць яго чыстая і шляхетная натура.

Аднойчы, даведзены да адчаю, кінуўся з багнетам на афіцэра... аднак вайсковыя ўлады, улічваючы маральную перавагу ліцвінскіх асуджаных, дастаткова справядліва ацанілі яго дзёрзкі ўчынак. Адзіным пакараннем стаўся перавод Людвіка ў дзейную армію на Каўказ, дзе, як і ў арыштанскіх ротах, знайшлося многа суайчыннікаў, якіх у той час дэпартавалі пераважна не ў Сібір, а на Каўказ. Усе гэтыя краёўцы мелі ад вайсковага камандавання добрыя водгукі.

Былі заўважаны здольнасці Людвіка, яго паводзіны і погляды, ён карыстаўся павагай не толькі калег, але і афіцэраў. Афіцэры ахвотна дапамагалі яму ў вучобе на вайсковых курсах, якія Людвік з вялікім задавальненнем наведваў. І тое, што павінна было стаць пакараннем, прынесла яму ў будучыні многа карысці.

Тут, пасля цяжкіх выпрабаванняў на радзіме, ён мог вольна падумаць, асэнсаваць былыя падзеі і ўдасканаліцца. Яго адвага і прысутнасць духу, вытрымка ў барацьбе з горцамі-партызанамі рыхтавалі яго да будучыні.

Людвік удзельнічаў у некалькіх дзясятках бітваў і сутычак з чачэнцамі. Усе гэтыя падрабязнасці чэрпаем з рукапісу сястры Людвіка Тэадоры Манчунскай «Успаміны з дзяцінства».

За здабытыя непрыяцельскія сцягі, як салдат, Людвік атрымліваў 5 рублёў узнагароды, але атрымаў яшчэ нешта больш каштоўнае: досвед у партызанскай барацьбе і яе глыбокае веданне. Вывучаў вайсковую тактыку, думаў пра Край.

Пры захопе Карскіх фартоў Людвік быў першым на турэцкім рэдуце і, хоць паранены, але сваім учынкам дапамог здабыць умацаванні, за што атрымаў званне афіцэра і крыж св. Георгія.

Памёр цар Мікалая I, і на расійскі трон узышоў яго сын Аляксандр II.

Як вядома, пасля Крыскай вайны ўсталяваліся больш ліберальныя парадкі. Пакідаючы па сабе добрую памяць, сімпатыю з боку расійцаў, выгнанцы вярталіся ў свае родныя гнёзды.

Праз дзесяць год вярнуўся ў родны кут і Людвік Нарбут. Сталася гэта ў 1854 годзе. Вялікая радасць запанавала ў Шаўрах. Дзесяцігадовая адсутнасць пакінула свае сляды на тварах і жыццях родных, але ў іх сэрцах біліся тыя ж самыя пачуцці.

Людвік з маладзёна таксама ператварыўся ў дарослага чалавека. Ён быў невысокага росту, худы, трошкі лысаваты. Меў задуменны і меланхалічны твар. Мілы ў абыходжанні, разважны ў радах і дзеяннях, ахвочы

да паслугі і дапамогі іншым, ён хутка пакарыў сэрцы ўсіх знаёмых і суседзяў.

Неўзабаве ажаніўся з ўдавой Амеліяй Седлікоўскай з Кунцэвічаў, прыгожай жанчынай, якую горача пакахаў. Яна ўжо была маці двух сыноў, для якіх Людвік стаў добрым бацькам.

Адразу яны пасяліся ў Сербянішках, што каля Шаўроў, але хутка дзеля выхавання пасынкаў, а быць можа, каб наблізіцца да цэнтра народнага руху, які пачаў адраджацца, Людвік асеў з сям'ёй у Вільні.

Жонка Людвіка вылучалася сваёй інтэлігентнасцю і ўзвышалася над агульным разумовым узроўнем тагачасных жанчын. Мела розум цвярозы і халодны, што было ў кантрасце з характарам мужа. Людвік яе вельмі кахаў і заўсёды называў «даражэнькая». Мелі дачушку, але яна памерла ў маленстве. Праз каханне да жонкі расквітнела ў Людвіку вялікае і святое пачуццё да Айчыны.

Думкі аб Радзіме насіў на выгнанні, з імі ж вярнуўся ў Край і чакаў толькі адпаведнага моманту, каб пачаць дзейнічаць. У 1860 годзе з Захаду, з Варшавы пачалі даносіцца яшчэ невыразныя знакі і званочкі пра абуджэнне. Нарэшце, праз спевы і дэманстрацыі на іх адазвалася і Літва, яна таксама рыхтавалася да найважнейшай справы. Людвік Нарбут рупліва браў удзел у гэтым — няспынна працаваў над свядомасцю народа і гадаваў у ім добразычлівасць.

Слухаючы малельныя спевы, якія грымелі ў касцёлах, ён не без падставы верыў, што гэтыя грудзі, якія з такой сілай просяць дапамогі ў нябёсаў, стануць пры першым поклічы, як адзін, на барацьбу за Айчыну. Меркаваў аб людзях па сабе і верыў у трываласць гэтых распаленых пачуццяў.

Паволі пачалася арганізацыйная праца, у якой вызначыліся два цэнтры: адзін поўны легкадумнай экзальтацыі, другі — цвярозай развагі. Людзі знаёміліся паміж сабой, з'ядноўваліся і раіліся, скасоўваючы пры гэтым найбольш неадпаведныя заклікі і адозвы з цэнтра руху — з Варшавы.

У падрыхтоўчай працы вялікую дапамогу Людвік знайшоў у сваёй сястры Тэадоры Манчунскай. Яе не палохала небяспека. З рашучасцю і мужчынскай адвагай ішла ўсюды, дзе была патрэбна яе дапамога. Была знаёма з вялікай колькасцю моладзі і ведала канспірацыю. Хадзіла па хатах вяскоўцаў, разагравала простыя сэрцы і яднала іх дзеля будучай справы. На простых людзей спадзяваўся і Людвік — менавіта з імі звязваў свае надзеі.

РАЗДЗЕЛ IV

Нявыкананыя праекты. Народная справа. Згасанне ў 1846 годзе. Бальтазар Калясінскі. Пачатак 1863 года. Арганізацыя. Геншаль, Гажыц. Паляванне на кіраўніка ўзброеных сіл Нарбута. Ашмянская арганізацыя.

Ідэя аб праве выбарчага голасу для вяскоўцаў, аб скасаванні прыгону і паншчыны, аб наданні іншай формы адносінам паміж дваром і вёскай віравала, як вядома, здаўна сярод пэўных груп нашага насельніцтва, аднак не паспела распаўсюдзіцца на ўсё грамадства. Зрэдку да вышэйшай улады даходзілі розныя праекты землеўладальнікаў са шляхты з канкрэтнымі прапановамі, але ўсе яны з грозным папярэджаннем і патрабаваннем адмовіцца ад усялякага руху ў гэтым кірунку скасоўваліся.

Справы людзей цесна звязаны са справай Краю. Гэтая сувязь прайшла праз сэрца многіх асоб, якія моцна верылі, што толькі ідучы разам з народам, можна марыць аб перамозе народнага руху.

У 1846 годзе ў Лідскім павеце прыпынілася агітацыя, якая, як здавалася, заклікала да народнага паўстання з мэтай дабіцца пэўнай палёгкі і вольнасці.

Гэта адбывалася ў той час, калі па ўсёй Еўропе рух у бок свабоды пашыраўся. Яго адгалоскі павінны былі і ў нас выклікаць пэўнае ўзбуджэнне, якое непакоіла ўлады. Справа праводзілася ціха і патаемна, і сёння перад намі вырысоўваецца даволі цьмяна. Пасля 70 гадоў цяжка пранікнуць у яе глыбіню. Відочна, што яна мела сувязь са згасаннем актыўнасці сярод школьнай моладзі ва ўсім Краі.

Хто ў Лідскім павеце падняў агітацыю і да якой ступені яна распаўсюдзілася, сёння даведацца цяжка. Не абышлося, як заўсёды, і без ахвяр, сярод каторых быў лідскі землеўладальнік Бальтазар Калясінскі[1], які і стаўся адным з галоўных ініцыятараў руху. Гэта быў нязломны дзеяч, чалавек моцнай волі, які ўпарта імкнуўся да сваёй мэты.

Яго арыштавалі ў сваім маёнтку Сядзеймы[2], дзе ён жыў разам з жонкай, якая паходзіла з дому Більдзюкевічаў. Сваю жонку Бальтазар выкраў ад бацькоў. Маладзіца прынесла ў яго дом абраз Маці Божай Вострабрамскай, які знаходзіўся ў сям'і Більдзюкевічаў з незапамятных часоў і, паводле падання, ціхім звонам папярэджваў сям'ю пра блізкую бяду. У хвілю, калі жандары наблізіліся да маёнтка ў Сядзеймах, каб арыштаваць Бальтазара, абраз, які вісеў на сцяне, загучаў сам па сабе.

Як быццам маланка ўдарыла ў дом Калясінскага. Яго пасадзілі ў вязніцу і пасля доўгага следства вынеслі вырак: «Вечныя салдаты» са скасаваннем усіх правоў і шляхецкіх прывілеяў. Паводле тагачаснага звычаю, усё адбывалася з пэўным цырыманіялам — Бальтазара ўзвялі на эшафот і над яго галавой зламалі шпагу.

У 1848 годзе Бальтазар Калясінскі знаходзіўся на Каўказе[3] сярод іншых

[1] Бальтазар Калясінскім (30.12.1818 — 30.09.1888) — нарадзіўся ў Сядзеймах, сын Бальтазара і Тэклі з Луткевічаў, у 1864 г. сасланы ў Кастрамскую губерню. Потым вярнуўся ў Вільню і быў тут пахаваны на Бернардынскіх могілках. — *Л. Л.*

[2] Маёнтак Сядзеймы, Лідская парафія, каля р. Дзітвы, недалёка ад Заполля, Вострава, Янцавіч. — *Л. Л.*

мясцовых асуджаных, адбываў цяжкае пакаранне адначасова з Людвікам Нарбутам.

Пасля дзесяці гадоў, згодна з маніфестам цара Аляксандра II, Калясінскі быў вызвалены ад жаўнерскай службы і прызначаны камендантам[4] Арэнбургскіх стэпаў, якія былі пад камандаваннем губернатара Пяроўскага, бацькі Соф'і, пазней вядомай рэвалюцыянеркі.

Маральная, культурная і разумовая перавага нашых выгнанцаў нараджала павагу ў непрыяцеля і часта выносіла пасля заканчэння тэрміну пакаранага на высокія пасады ў Расіі. У 1860 годзе Бальтазар Калясінскі знаходзіўся на радзіме, дзе выспяваў новы выбух. Як стары баявы конь, пачуўшы гук трубы, якая грае пабудку, кідаецца ў шэрагі, так і Бальтазар Калясінскі, прасякнуты патрыятычнай атмасферай, ірваўся да дзеяння.

Пасля вяртання дадому Калясінскаму прапанавалі месца суддзі ў Лідзе, а пасля сялянскай рэформы — «міравога пасярэдніка». Гэта была вельмі адпаведная пасада для яго дзейнасці. Калясінскі мог зблізіцца з людзьмі і ўздзейнічаць на іх. У гэтым быў практычны сэнс, бо Бальтазар мог паўплываць на розум селяніна і выклікаць яго павагу. Трэба дадаць, што грунт, на якім ён працаваў, з'яўляўся больш жыватворным, чым дзе-небудзь у іншым месцы.

Лідскі павет быў заселены дастаткова вялікай колькасцю дробнай засцянковай шляхты, якая захоўвала даўнія традыцыі. Сяляне з паветаў літоўскіх і беларускіх моцна трымаліся веры сваіх бацькоў, тым больш, што ў Лідскім павеце жыло шмат нашчадкаў мазураў, якіх калісьці прывезлі за Віслы заможныя гаспадары для працы ў маёнтках, якія атрымалі за розныя заслугі перад краінай. Гэтыя мазуры ўжо абеларусіліся, хоць і насілі часта польскія прозвішчы, аднак па жылах цякла гарачая польская кроў[5]. Як Калясінскі, так і Нарбут бачылі ў людзях галоўную сілу для будучай і ўжо дастаткова блізкай барацьбы. І праўдападобна, не ведаючы адзін аднаго, падрыхтавалі адпаведны матэрыял, магчыма ідучы рознымі шляхамі, аднак да адной мэты.

Тым часам падзеі разварочваліся хутка. Год 1861 прынёс вядомыя маніфестацыі з крывавымі ахвярамі. 1862 год прагрымеў у спевах і расплыўся ў маніфестацыях. На іх была выдаткавана частка патрыятычнай і грамадзянскай энергіі. Кроў закіпала ў жылах, сляпіла вочы. З захаду наплывалі заклікі да барацьбы, абяцанні дапамогі з боку мацнейшых дзяржаў.

Французскі імператар Напалеон III, як і яго папярэднік ў 1812 годзе, заблытваў палякаў.

Дарэмна старэйшыя і памяркоўныя настаўлялі малодшых і гарачых быць разважлівымі.

---

[3] Калясінскі праходзіў службу ў Сярэдняй Азіі. — *Л. Л.*

[4] За гераічны ўчынак атрымаў ніжэйшы чынавенскі чын. — *Л. Л.*

[5] Інфармацыя пра мазураў не адпавядае рэальнасці. — *Л. Л.*

Патаемнае парушэнне правоў арыштаваных перапоўніла чашу цярплівасці і выклікала заўчасны выбух, у выніку чаго арганізацыйныя работы на землях даўнейшай Рэчы Паспалітай павінны былі паскорыцца, таксама неабходна было знайсці мясцовыя кадры для будучага кіраўніцтва паўстаннем.

Радыкальныя элементы масава далучаліся да руху, але знаходзіліся ў яго шэрагах і больш памяркоўныя людзі, яны і кіравалі арганізацыяй і ўсімі сіламі жадалі з мінімальнымі ахвярамі выратаваць Край ад небяспечнай згубы. У той час калі частка грамадства ў Вільні працягвала мітынгаваць, ў камяніцах на вузкіх віленскіх завулках ішла ціхая і карпатлівая арганізацыйная праца.

Людзі працавалі як краты.

Як толькі сфарміраваўся Цэнтральны камітэт Народнага ўрада ў Варшаве, на пачатку студзеня 1863 года з'явіўся яго аддзел у Вільні[1]. Віленскі аддзел павінен быў знаходзіцца ў пастаянным кантакце з Цэнтральным камітэтам, падпарадкоўвацца яго загадам і быць ў пэўнай ступені ад яго залежным.

Віленскі аддзел у сваю чаргу фарміраваў павятовыя структуры. Кіраўніком Лідскага павета стаўся Канстанцін Геншаль з Валдацішак — сын Людвіка і Стэфаніі з Пуцілоўскіх. Меў дваццаць з невялікім гадоў. Пасля заканчэння школы ў Вільні, вывучаў медыцыну ў Пецярбургу. Потым перавёўся на факультэт матэматыкі, пасля заканчэння навукі вярнуўся да бацькоў у Валдацішкі. Належаў да моладзі, якая прапагандавала народны рух. Выключныя здольнасці Геншаля былі ўлічаны Віленскім аддзелам Народнага ўрада пры яго прызначэнні на адпаведную пасаду. Ён павінен быў назіраць за паветам, апекавацца ўсялякімі патрэбамі паўстанцаў і падтрымліваць шчыльную сувязь з аддзелам Народнага ўрада ў Вільні.

Геншаль да апошняга выконваў свае абавязкі сумленна і разумна. Выключна праз цуда здолеў застацца жывым. Улада, напаўшы на яго след, правяла пкератрус у Валдацішках і арыштавала бацьку.

Геншаль у гэты час знаходзіўся ў Вільні, жыў у гатэлі Пазнаньскага (сёння гатэль не існуе). Выйшаў у горад, калі жандары атачылі гатэль і ператрасалі яго нумар. Атрымаўшы паведамленне ад сяброў, Геншаль адразу знік з віленскага гарызонту. Апынуўся ў Парыжы, куды шчасліва здолеў дабрацца. Там зноў вучыўся медыцыне і абараніў вучоную ступень доктара. У 1870 годзе браў удзел у франка-прускай вайне. Ажаніўся з французскай літаратараркай. Яе артыкулы аб польскіх падзеях часта сустракаліся ў парыжскіх часопісах.

[1] Тым, хто цікавіцца падрабязнасцямі, а таксама складам Віленскага аддзялення, можна звярнуцца да ўспамінаў Якуба Гейштара, выдадзеных у Вільні ў 1913 годзе.

Гаворачы пра Геншаля, мы трошкі аддаліліся ад тэмы. Вяртаемся да падзей і занатоўваем, што адразу пасля прызначэння Геншаля, Цэнтральны варшаўскі камітэт прыслаў у Вільню, таксама з намінацыяй на кіраўніка руху Лідскага павета, маладога 21-гадовага Вітольда Гажыца. Ён быў сынам Юр'я Гажыца, маршалка шляхты Брэст-Літоўскага павета і Канстанцыі з Якубоўскіх.

Пасля заканчэння школы вучыўся ў Пецярбургу, адкуль пераехаў у Парыж, дзе вучыўся ў Сарбоне. Ніякай іншай кваліфікацыі не меў. Даручэнне такога адказнага становішча недасведчанаму і блізка незнаёмага з Вільняй маладзёну, занепакоіла Віленскі аддзел. Аднак, зважаючы на прызначэнне ад Цэнтральнага камітэта, Гажыца пакінулі.

Засцярогі Віленскага аддзела не былі марнымі. Гажыца хутка арыштавалі. Падчас судовага следства ён выдаў некалькі імён. Быў высланы этапам у Расію і там памёр ад тыфу.

Віленскі аддзел Народнага ўрада надалей заставаўся перад выбарам кіраўніка ўзброеных сіл Лідскага павета. Мы амаль не мелі людзей з досведам ваеннай навукі. Іх належала шукаць сярод дэзерціраў ці звольненых афіцэраў. Нарэшце выбар выпаў на Уладзіслава Навіцкага, экс-вайскоўца. Людвік Нарбут прызначаўся толькі кіраўніком часткі павета. Аднак хутка справы змяніліся па невядомай нам прычыне.

Мажліва, узяўшы пад увагу веданне Людвікам Нарбутам тактыкі партызанскай вайны, аддзел віленскага Народнага ўрада прызначыў яго кіраўніком узброеных сіл усяго Лідскага павета. Уладзіслаў Навіцкі заставаўся яго ад'ютантам. Сваё прызначэнне Людвік прыняў з радасцю і гонарам за павагу братоў, бо яму было прыемна, што яго лічылі выпрабаваным чалавекам і сапраўдным афіцэрам, загартаваным у партызанскіх баях на Каўказе.

Зашумелі лідскія лясы і пушчы вітальным шумам. Ён глядзеў на іх з любоўю і надзеяй. Яны павінны былі замяніць яму горы і скалы Каўказа. У іх гушчары ўжо бачыў цвердзі, у непранікальных ценях — месцы засады.

З галавой поўнай планаў Людвік пачаў рыхтавацца да выправы.

У Шаўрах маці зноў хвалявалася за свайго каханага сына, якога нядаўна знайшла і зноўку магла страціць. Аднак найперш яна з'яўлялася грамадзянкай і толькі потым — маці, а таму была гатовая на ахвяру дзеля краіны.

Цывільным кіраўніком Віленскім аддзелам Народнага ўрада ў Ашмянскім павеце быў прызначаны Цэзары Нарбут, сын Казіміра і Юстыны з Мікульскіх, сваяк Нарбутаў з Шаўроў, які меў прыналежнасць да роду жмудскіх Нарбутаў. Пасля заканчэння вучобы ва ўніверсітэце Цэзары быў прыняты ў арганізацыю і арыштаваны напрыканцы 1863 года. Асуджаны на выгнанне і быў высланы ўглыб Пензенскай губерні. Па вяртанні на радзіму жыў у Мітаве, дзе і памёр. Яго сямейны маёнтак Юстыніянаў быў канфіскаваны, атрымаў яго генерал Рэненкампф.

Кіраўніком узброеных сіл у Ашмянскім павеце быў прызначаны Мінейка а потым Чаховіч. І ўрэшце аддзел віленскага Народнага ўрада прыслаў Аляксандра Парадоўскага — адважнага камандзіра, знанага пад псеўданімам «Астрога».

РАЗДЗЕЛ V

Сходы. Сесіі. Дэбаты. Вяртанне моладзі. Людвік Нарбут. План паўстання. Дзень 1 лютага. Першы рух на Літве. Маніфест. Ксёндз Гінтаўт. Ахвяры маніфеста і яго эфект. Сяляне ў Забалаці. Нястача зброі. Сімпатыя народа. Барталамей Кандрат. Высылка цэлых сямей на Сібір.

Ужо чутны быў шолах у каралеўстве, але Літва яшчэ не зрушылася. Яна збірала і арганізоўвала свае сілы. Пачатак бунту быў прызначаны на 1 красавіка. Між тым праходзілі з'езды і нарады як чальцоў арганізацыі, так і добраахвотнікаў.

Такія сходы часта адбываліся ў Бальтазара Калясінскага, які пераважна жыў у Лідзе. У гэтых сходах прымалі ўдзел Геншаль, Тышкевіч з Жырмун, Станіслаў Путкамер і многія іншыя. Падчас дэбатаў па-ранейшаму падымалася пытанне аб мажлівым ўдзеле ў паўстанні простых людзей.

Адусюль з вышэйшых вучэльняў вярталася да краю акадэмічная моладзь. Назапашвалася зброя і амуніцыя, вербаваліся добраахвотнікі, якіх звязвала прысяга.

Людвік Нарбут прымаў актыўны ўдзел ва ўсіх гэтых сходах як галоўны кіраўнік раёна. У той час Лідскі павет быў падзелены на парафіяльныя раёны, якія павінны былі паўстаць адначасова. Але калі раёны яшчэ не падавалі знакаў жыцця, дык Нарбут ужо быў гатовы да барацьбы. Атрымаўшы намінацыю кіраўніка ўзброеных сіл Лідскага павета, Людвік атрымаў шаблю, і, пацалаваўшы яе, прысягнуў ваяваць да апошняга дыхання.

Ён першым актывізаваў паўстанчы рух на Літве — 1-га лютага выйшаў з дому і распачаў сваю партызанскую дзейнасць.

Здавалася, прырода сама заахвочвала да дачаснага выбуху.

Цёплая бясснежная зіма 1863 года палегчыла ўмовы барацьбы, месцам правядзення якой павінны былі стаць пушчы і лясы Літвы. Нарбут хацеў пачаць раптоўна, не даць ворагу часу для сцягвання большай сілы. З мапай у раках ён акрэсліў сабе пэўны план дзеяння.

Неабсяжныя лясныя абшары, злучаныя паміж сабой пушчанскія ваколіцы Радуні, Гародна і іншыя, сталі адпаведным полем партызанскай барацьбы. Ён мог патаемна вырушыць да Вільні або рушыць у Гарадзенскую губерню. І, не чакаючы больш агульных адозваў, Нарбут 1-га лютага пакінуў Шаўры.

Акрамя яго маладога брата Баляслава, які ўзяўся за зброю нават не закончыўшы школу, Людвік вёў за сабой невялікую жменьку людзей: радца Душман і некалькі чалавек з вёскі і маёнтка. Адзетыя яны былі ў шэрыя сялянскія кажухі «світкі», перакінутыя праз плячо палатняныя торбы для прыпасаў і ежы. Пакуль не ўзняліся іншыя раёны, Нарбут хацеў выкарыстаць час для муштры сваёй жменькі людзей у ваеннай навуцы, прывучыць іх да дысцыпліны, каб потым мець здольных жаўнераў.

Пра апошні дзень Людвіка ў Шаўрах расказвае яго сястра Тэадора Манчунская: *«Усё ўжо было гатова. Людвік павінен быў пайсці з дому вечарам… аб гэтым ведала ўся сям'я, усіх гэта турбавала, але ўсе хавалі пачуцці, не мажліва было паводзіць сябе па-іншаму, немагчыма, каб гэты дзень чымсьці адрозніваўся ад іншых. Усё павінна было ісці сваім ходам, як і звычайна, а тым больш сняданак, абед… хоць кавалак не лез у горла. Уся сям'я сядзела пры стале да самай вячэры… трэба было пільнаваць словы, утойваць біццё сэрцаў. Каб хутчэй прайшоў бясконца доўгі дзень, чыталі ўголас „Карлінскага“ Сыракомлі»*[1].

Тэадора, перапоўненая пачуццямі, зрывалася да фартэпіяна і, нервова наносячы ўдары па клавішах, грала народныя гімны. Час ішоў і нарэшце надышла хвіліна расставання.

Людвік захоўваў абсалютны спакой, не праяўляў сваіх пачуццяў нават каля маладой жонкі, якую вельмі кахаў. Холадна даваў розныя распараджэнні для сястры Тэадоры, яго даверанай асобы і галоўнай памочніцы ў розных пытаннях.

У рукі Тэадоры аддаў ён Маніфест Народнага ўрада і наказваў перадаць яго заўтра пробашчу касцёла ў Начы для чытання перад вернікамі з амбона.

Хаваючы паперу, сястра жартаўліва спытала:

— А калі б пра мяне дазналіся, шкадаваў бы мяне?

— Не час думаць пра ружы, калі гараць лясы, — адказаў вытрымана Людвік.

Развітанне было кароткім. Людвік на хвіліну прыціснуўся да грудзей бацькі, ужо вельмі старога.

— Вазьміце Вільню, — шапнуў узрушаны стары, — і мяне — туды… да артылерыі… я — усё ж-такі інжынер!

Даўжэй Людвік затрымаўся ў абдымках маці, жонкі і сястры. Тэадора выбегла за ім да самай брамы, дзе ўжо стаяў на варце раней пастаўлены Людвікам малодшы брат Баляслаў з ружжом.

У вечаровых ценях замаячылі шэрыя світкі братоў і зніклі ў цемры.

Назаўтра 2-га лютага, у дзень Грамнічнай Маці Божай, Тэадора Манчунская выбралася ў Начу на сустрэчу з пробашчам Гінтаўтам. Яна везла з са-

[1] Маецца на ўвазе гістарычная драма У. Сыракомлі «Каспар Карлінскі» («Kasper Karlinski»). — *Л. Л.*

бой Маніфест Народнага ўрада і распараджэнне кіраўніка. Ксёндз збляднеў, хвіліну вагаўся, нарэшце прыняў Маніфест. Няпэўным крокам падняўся на амбон і пачаў чытаць. Чытаў кепска, невыразна, а калі скончыў, дадаў: «Назімаў». Хітры жмудзін гэтак сябе ўратаваў. Калі потым распачалося следства і пераслед тых, хто зачытаў людзям з амбона Маніфест, тутэйшыя сяляне прызналіся пад прысягай, што іх пробашч чытаў ім з амбона нейкае распараджэнне генерал-губернатара Назімава. Ксёндз Гінтаўт застаўся не пакараны, у той час як іншыя ксяндзы з Лідскага павета за зачытванне Маніфеста былі асуджаны на смерць загадам Мураўёва. Так загінулі: ксёндз Ішора — пробашч з Жалудка, расстраляны ў Вільні, ксёндз Фалькоўскі — пробашч з Ішчалны (стары паважнага веку, расстраляны ў Лідзе), ксёндз Зямацкі — пробашч з Ваверкі, расстраляны ў Вільні на Лукішках адначасова з маладым Альбертам Лясковічам, землеўладальнікам з Кір'янаўцаў. Як данеслі чуткі, Лясковіч быў арыштаваны за тое, што ў Наваельні папракаў ксяндза за адмову прачытаць Маніфест. Пра Альберта Лясковіча падрабязней пагаворым пазней.

Іншыя ксяндзы, над якімі таксама вісела «злачынства» чытання Маніфеста з амбона, цудам пазбеглі смяротнай кары. Адзін з іх: ксёндз Гарбачэўскі зачытаў Маніфест ужо прыгатаваўшы загадзя лясны кафтан, і проста з амбона пайшоў у лес. Сабраўшы некалькіх таварышаў, далучыўся да партыі Нарбута. Браў удзел ва ўсіх сутычках, а пасля смерці кіраўніка змог перайсці мяжу і ўратавацца.

Не менш шчасліва ўдалося выкруціцца ад адказнасці маладому землеўладальніку Станіславу Калясінскаму, стрыечнаму брату Бальтазара. Яму было даручана перадаць Маніфест для агалошвання пробашчам некалькіх парафій, аднак па дарозе Калясінскі сам зачытваў Маніфест па вёсках.

Уплыў Бальтазара Калясінскага на сялян, а таксама намаганні павятовага маршалка Стэфана Буткевіча, з якім Станіслаў меў сваяцтва па крыві, дапамаглі яму ўратавацца. Маршалак Стэфан Буткевіч спецыяльна арганізаваў паляванне для ваеннага начальніка Алхазава, дзе сярод паляўнічых быў і Станіслаў. Пасля палявання Алхазаў застаўся ў захапленні ад паляўнічых і разумовых здольнасцей Станіслава Калясінскага, хаця і падазраваў яго ў нелегальнай дзейнасці. Станіслаў заслужыў прыязнь Алхазава «на вякі вечныя» і пераслед спыніўся.

Рэха Маніфеста Народнага ўрада пранеслася ў Лідскім павеце. У некаторых мясцовасцях узрушыў ён зацвярдзелыя сялянскія душы. Можа абяцанне адмены чыншу і ў перспектыве бясплатнае атрыманне ва ўласнасць зямлі расчулілі сялян, хочацца аднак верыць, што прычынай былі іншыя, больш шляхетныя памкненні, а менавіта: памяць пра даўнія часы і вызнанне хрысціянскай веры.

У Забалацкай парафіі пасля праслухвання Маніфеста, зачытанага ксяндзом Зарэцкім, і гарачай прамовы капітана «Х» каля 300 сялян былі гатовы

павялічыць кадры паўстанцаў. Стаялі абозам пад касцёлам тры дні і чакалі зброю, якой не было, не хапала і энергічнай рукі, якая магла б прывесці новыя сілы ў шэрагі паўстанцаў.

Сімпатыя народа напачатку была на нашым баку. Падчас сваёй кампаніі Нарбут гэта адчуваў. Сяляне апекавалі яго аддзел, дапамагалі з ежай, давалі знаць пра рух непрыяцеля, часамі аддавалі падводы. Сялянскія жанчыны мылі паўстанцам адзенне.

Жыхары вёскі Паддубна, што недалёка ад Начы, аказвалі для аддзела Нарбута вялікія паслугі. Быў паміж імі і ўрадавы ляснік Барталамей Кандрат. У сваёй леснічоўцы на стайні, як быццам для догляду лесу, заўсёды трымаў запрэжанага каня. Насамрэч рабіў гэта, каб хутка папярэдзіць Нарбута аб руху непрыяцельскага войска. Хаця сам Кандрат непасрэдна ўдзелу ў паўстанні не прымаў, але з ўсяе душы служыў яму. Выдаў яго сусед з вёскі — Мацкевіч. Указаў маскалям на запрэжанага ў стайні каня, правёў іх па слядах колаў ад воза, на якім паўстанцам вазілі харчаванне. Кандрата арыштавалі, а вёску Паддубна аддалі на рабунак маскальскім жаўнерам. Выратавалі яе стрэлы, якія сталі чутны з боку вёскі Кавалькі. Гэта пачынаўся бой ў Лакштуцянскім лесе. Рота жаўнераў паспяшала на дапамогу сваім, і, дзякуючы гэтаму, Паддубна пазбегла лёсу вёскі Зубрава.

Мацкевіч, хоць яго здрада і выявілася, дажыў да старасці ў сваёй вёсцы. Кандрат быў высланы ў Кастрамскую губерню. Праз доўгія гады здолеў вярнуцца ў Паддубна, дзе пражыў да смерці.

Пра прыязныя адносіны людзей ў Лідскім павеце да паўстання красамоўна сведчаць цэлыя вёскі, сядзібы і шляхецкія засценкі, спаленыя і зруйнаваныя з зямлёй. Сведчаць вялікія дэпартацыі цэлых сямей як дробнай шляхты, гэтак і сялян з вёсак Леніцы, Кракшлі, Зубрава і іншых.

Толькі пазней, калі расійская ўлада пачала няслушна тлумачыць народу мэту паўстання, а праваслаўнае духавенства шаптала яму, што паны змагаюцца не за Айчыну, а толькі за паншчыну, цёмныя сялянскія масы адвярнуліся ад нас. Хутка пасля паразы паўстання, пасля таго як стала зразумелай наша слабасць, у сэрцах людзей пасялілася непрыязнае да нас пачуццё.

РАЗДЗЕЛ VI

Першыя разлікі. Казначэйства. Перабольшванні і парушэнні. Слабое ўзбраенне паўстанцаў. Гераічныя высілкі. Шляхта. Расійцы пра тактыку Нарбута. Першая засада. Павелічэнне атрада. Тэадора Манчунская. Дапамога і сімпатыя людзей. Галоўныя бітвы Нарбута. Догляд хворых паўстанцаў па вёсках.

Паўстане ў Лідскім павеце магло разлічваць на поспех, бо мела сімпатыі людзей, як мы ўжо гаварылі, пераважна сярод каталіцкага насельніцтва. Падавалася несумненным, што агітацыі за ўдзел у паўстанні сялян не прай-

шла дарма. Верыў у гэта і Нарбут, пачынаючы барацьбу. Заўчасны выбух не даў магчымасці адпаведным чынам падрыхтаваць людзей і зброю, недахоп якой стаўся адчувальны з першых хвілін і аказваў уплыў на шэраг сутычак аддзела з непрыяцелем.

Віленскі аддзел Народнага ўрада быў арганізаваны паспешна і з гэтай прычыны не мог прадухіліць многія недапрацоўкі, але раз за разам нагадваў Варшаве пра недахоп зброі. Высылаў дзеля яе закупкі значныя сумы грошай за мяжу, аднак зброя не прыходзіла. Складкі і ахвяраванні паступалі без перапынкаў, грошай у фондзе хапала, аднак дзесьці па дарозе яны прападалі бясследна. Толькі нязначная колькасць зброі была прывезена на Віленшчыну. Фінансавая справа ў тайнай арганізацыі паўсюдна знаходзілася ў напаўразбураным стане. Ніякія разлікі немагчыма было правесці па дакументах, таму што любы знойдзены квіток пагражаў стратай свабоды і нават жыцця. Справаздача аб абароце грошай не магла быць прадстаўлена публічна, а таму часта з'яўлялася розная інфармацыя. Распараджаліся грашыма найшляхетнейшыя людзі, але здаралася, што грошы траплялі ў рукі людзей легкадумных, якія не адчувалі поўнай адказнасці за свае абавязкі, альбо што яшчэ горш, станавіліся здабычай розных аферыстаў, кар'ерыстаў, якія жадалі палавіць рыбку ў мутнай вадзе для сябе. Рыцараў падобнага промыслу мела кожная правінцыя, кожны горад. Многія з іх былі раскрытыя, але многім удалося ўнікнуць кары і пакінуць патомству маёнткі, альбо камяніцы, праўда з плямай на прозвішчы. Знакамітым быў у той час нейкі Янчэўскі з Познані, які загадваў плаціць яму за адну і тую ж дастаўку зброі з Уроцлава па некалькі разоў.

Кожная такая справа, якая станавілася вядомай, давала журналістам варожых газет поле для іроніі і абсмейвання. Таму выкрытую праблему неабходна было ціха ўрэгуляваць дома. З-за нараканняў грамадства, каб адсочваць рух кожнага публічна выкарыстанага грошыка, восенню 1863 года Траўгут арганізаваў у Парыжы Палату аўдытараў. Але неадпаведна выбраныя чальцы Палаты сталі на шлях бюракратыі так непатрэбнай у такі час, і ініцыявалі спрэчкі з графам Дзялыньскім у Парыжы, спасылаючыся на Народны ўрад у Варшаве. А падмурак паўстання ў той час ўжо валіўся, ломячы ўсё: і Народны ўрад, і рахункі, што вяло да жудасных наступстваў для Краю[1].

З пазнейшых, не вельмі дакладных звестак, можна даведацца, што было закуплена поўнае ўзбраенне для 50 000 пяхоты і 4 000 кавалерыі. Аднак значную частку гэтага ўзбраення канфіскавалі ў Прусіі і Аўстрыі, а таксама на мяжы з Расіяй. З гэтага выходзіць, што на 3 закупленыя карабіны звычайна губляліся 2, тут улічваюцца і часта неабгрунтаваныя звесткі аб злоўжываннях пастаўшчыкоў зброі.

[1] Пра фінансавыя пытанні паўстання і злоўжыванні ў гэтай справе апавядае Пшыбароўскі ў «Астатніх гадах студзеньскага паўстання». Гэта ж адзначае Гейштар у сваіх мемуарах. — *Л. Л.*

Узбраенне ў Літву даходзіла з яшчэ большай цяжкасцю, чым у Каралеўства. Барацьба ў нашым краі распачыналася з той зброяй, якая была ў доме, па большай частцы з паляўнічым узбраеннем, вельмі далёкім ад тагачаснага ўзроўню ваеннай зброі. За выключэннем болей заможных асоб, уладальнікаў англійскіх ружжаў, бальшыня паўстанцаў мела на ўзбраенні простыя фузыі і дубальтоўкі, а найчасцей — пад'ядынкі (аднарулькі). Яны мелі драўляны шомпал, што абцяжарвала іх набіццё і зніжала тэмп стральбы. Шомпалы часта проста ламаліся ў дрыжачых руках. Было немагчыма зрабіць запас куль для такога рознакалібернага арсенала. Кожны сам павінен быў іх адліць адпаведна сваёй зброі. Даволі часта, калі не хапала сапраўдных куль, фузеі набівалі карцеччу ці нават шротам.

Порах і волава для куль куплялі ў яўрэяў, якія мелі добры запас гэтага матэрыялу і добра на гэтым зарабілі. Аднак пазней, ці то з разлікаў, ці, можа, з засцярогі, перасталі яго прадаваць, і недахоп амуніцыі сказаўся яшчэ выразней. Тайная перавозка ўзбраення станавілася больш небяспечнай і больш цяжкай.

Тамтэйшыя стрэльбы білі на невялікую адлегласць. Часта ружжы не стралялі больш чым на 100 крокаў, а з дубальтоўкі — больш, чым на 200. Маскоўскае войска ўжывала гладкарульныя штуцары з багнетамі, якія стралялі на 600 крокаў. Якія ж няроўныя ўмовы для бою стварала гэтая розніца ва ўзбраенні! Сёння нават удасканаленая паляўнічая зброя бывае шматзараднай. Унукі маюць лепшае ўзбраенне, калі палююць на зайца, чым мелі іх дзяды, калі ішлі ў смяротны бой. Вялікае пачуццё патрыятызму прыводзіла іх да звышчалавечых высілкаў. Гэта былі сапраўдныя героі! Не пакінулі па сабе высокіх помнікаў, многіх імён не захавала гісторыя, але памяць пра іх жыве ў сэрцы народа.

Недахоп зброі вымушаў шукаць дапамогі ў косах, якія насаджвалі на кій стырчаком. Такія работы выконваліся ў кузнях, а кузня і каваль былі ў кожным аддзеле. Часамі гэтая зброя магла адыграць вырашальную ролю ў бліжнім баі. Аднак стрэлы непрыяцельскіх штуцэраў адкідвалі аддзелы касінераў, і справа не даходзіла да рукапашнага бою.

Некаторыя паўстанцы мелі шаблі і пісталеты. Часам узбраенне дапаўнялі стылеты.

Вось у такіх умовах распачыналася барацьба 1863 года.

Калі разлік на ўдзел у паўстанні сялян не апраўдаўся нават у Лідскім павеце, дык увесь цяжар барацьбы звалiўся на плечы шляхты, і трэба сказаць, што ішла яна ў бой з самаадрачэннем, не шкадуючы крыві і жыцця. Здараліся выключэнні, калі адзінкі клапаціліся пра сябе і выходзілі з агульнага руху ці з'язджалі за мяжу, але гэта былі адзінкі.

Застаўся невыказны жаль з-за таго, што з-за гэтай партызаншчыны, лясных схронаў і сутычак засталося толькі рэха, утаймаваная трывога, ча-

канне віхуры новых трагедый. Лясныя тайны схавалі ад нас многія геройскія ўчынкі, вусны сведкаў закрыў пераслед уладаў: куля, вязніца, дэпартацыя. Толькі прыпомнім сабе часы Мураўёва. Хто ж мог што-небудзь пісаць або занатоўваць? Тое, што тады пісалася за мяжой, мела даволі вялікую долю зразумелай і справядлівай ў тую эпоху экзальтацыі.

Гісторыю тых часоў у нашым Краі тварыў толькі ціхі баязлівы шэпт мацярок, якія, як страшны сон, пераказвалі дзецям пра тое, што адбылося. Край доўга абуджаўся ў крыві і жалобе, гінулі і сціраліся з памяці даты і выпадкі, якім на разе не прыдавалася вялікага значэння, а сёння яны набываюць гістарычны сэнс. Значна пазней, з вяртаннем выгнанцаў, расшырыўся гістарычны гарызонт, але час аслабіў яго жывы каларыт. Параўнальна нядаўна, калі ўжо большая частка ветэранаў пайшла з жыцця, забраўшы з сабой у магілы таямніцы сваіх выпрабаванняў, пачалі прыбіраць паўвекавую павуціну з абразоў мінулага, аднаўляючы часта спрэчныя і незразумелыя выпадкі. Не захаваўся ніводзін ліст, напісаны рукой паўстанца ў часы лясной партызанкі, які мог бы кінуць святло на дзейнасць аддзелаў, на іх ваенныя сутычкі і трагічныя драмы.

Падобна існаваў нейкі дзённік Баляслава Свентаржэцкага з Багушэвічаў, вядомага дзеяча і арганізатара аднаго з буйнейшых аддзелаў Ігуменскага павета Менскай губерні. І хаця аддзелам кіраваў Ляскоўскі, назвалі яго аддзелам Свентаржэцкага[1]. Ваявалі ўмела, чым выклікалі пострах у ворага. Дзённік напэўна мог захоўваць каштоўныя і цікавыя рэчы, аднак быў спалены падчас пратрусу ў Вільні.

З тых крошак, якія мы маем перад сабой, вельмі цяжка ўявіць увесь рух у Лідскім павеце, а менавіта партызанскую барацьбу Нарбута. З-за недахопу інфармацыі і падрабязнасцей справы немажліва дакладна вызначыць нават працягласць паўстання. Нітка нашага аповяду пастаянна заблытваецца і рвецца. Таму прашу чытача з разуменнем ставіцца да памылак і недахопаў у ланцугу апісаных гістарычных падзей.

Пакінуўшы Шаўры, Людвік Нарбут скіраваўся ў Серпянішкі, дзе быў прызначаны пункт збору. Там да аддзела далучыліся некалькі новых таварышаў. Разам вырушылі да Салапацкага лесу, адтуль — да вёскі Паддубна.

Нарбут меў намер перахапіць па дарозе атрад жаўнераў, які суправаджаў рэкрутаў з-пад Аран. Засада не ўдалася. Частка рэкрутаў змагла ўцячы, але ні адзін не далучыўся да аддзела.

Аднак першыя стрэлы ў акрузе зрабілі розгалас пра пачатак паўстанчага руху. Сталі абуджацца суседнія парафіі, і да Нарбута прыбывалі ахвотнікі з розных сацыяльных класаў і палажэнняў. Сястра камандзіра, Тэадора Ман-

[1] Баляслаў Часлававіч Свентаржэцкі (1831, маёнтак Багушэвічы, Ігуменскі павет — 1888) — кіраўнік паўстання 1863 г. у Ігуменскім павеце Мінскай губерні. — *Л. Л.*

чунская, пасвечаная ва ўсе справы брата, накіроўвала іх да месца яго побыту, яна была злучнікам, які нітаваў пушчу і свет. Засцерагала атрад перад небяспекай, апекавалася яго рознымі патрэбамі і часта сама ў сялянскай вопратцы прыносіла харчаванне і інфармацыю. Не ваявала са зброяй у руках, але ўсёй душой брала ўдзел у паўстанні, станавілася, як калісьці ў дзіцячых гульнях, новай Эміліяй Плятэр, гатовай ахвяраваць жыццём дзеля Радзімы.

Нарбут глядзеў ў бок Вільні і таму нейкі час знаходзіўся ў лясах паміж Эйшышкамі і Начай. Аднаго разу яго аддзел высачылі і, каб папярэдзіць людзей пра небяспеку, Манчунская знайшла старога каваля, які, рызыкуючы жыццём, выратаваў сотню людзей ад смерці, бо сама дайсці да аддзела не магла, а іншыя знаёмыя людзі папросту баяліся.

— Пайду, — сказаў селянін падумаўшы. — Свет нічога не страціць, калі на аднаго каваля стане менеў.

Пайшоў, не загінуў, а аддзел уратаваў.

Падобную добразычлівасць і паслугі сялян Нарбут меў паўсюдна, аднак пры паглядзе на яго аддзел, сяляне гаварылі: «Лепш такі, паночку, арганізаваць тут ранейшае войска, таму што з гэтымі маладымі… цяжка будзе», — сніўся ім яшчэ 1831 год. Няісныя палкі да гэтага часу жылі ў іхнім уяўленні. Здаровы сялянскі сэнс верыў толькі ў моц рэгулярнага войска і ахвотна яго прызнаваў.

Аддзел Нарбута хутка вырас да ста з некалькімі дзясяткамі чалавек. Гэта лічба то павялічвала, то памяншалася. З такой невялікай жменькай людзей Нарбут тры месяцы аказваў супраціў вялікім атрадам непрыяцеля, і хаця ніводнай бітвы, ва ўласным значэнні гэтага слова, не выйграў, стамляў ворага неспадзяванымі нападамі, дапякаў засадамі, а ўдалай абаронай прыносіў ворагу значныя страты. Ваенныя здольнасці Нарбута праяўляліся ўсё больш яўна. Сярод расійскіх жаўнераў расла паніка, і нават само імя Нарбута выклікала іх хваляванне. Казалі, што мае моц чараўніка і ні адна куля яго не возьме, што ловіць яе, як мяч, і адкідваючы яе назад у ворага, кладзе мёртвымі дзясяткі жаўнераў. Падобных легенд віравала мноства.

Нарбут так разумна ўмеў расставіць сваіх людзей, што ў вачах непрыяцеля яны разрасталіся да тысяч жаўнераў. Аднак гэтыя пагалоскі шкодзілі паўстанцам, бо супраць іх канцэнтравалася войска, якое сцягвалі з розных месцаў. Ладзіліся аблавы, з якіх Нарбут павінен быў выслізгваць. Гэта руйнавала яго партызанскія планы. Прасіў сястру пярэчыць чуткам пра яго моц, а падтрымліваць чуткі пра жменьку паўстанцаў. Нарэшце, калі нават і вялікае войска не змагло перамагчы Нарбута, які хаваўся ў лясах, расійцы прызначылі цану за яго галаву. Здраднік за захоп Людвіка жывым павінен быў атрымаць тысячу рублёў.

Раёнам партызанскай дзейнасці аддзела Нарбута была галоўным чынам даліна ракі Котра, а таксама Ковенская, Ягелонская і Аранская пушчы, што

давала магчымым зрабіць пераход да Рудніцкай пушчы, а далей да пушчы Гарадзенскай. Гэтыя пушчы і багны з'яўляліся для паўстанцаў свайго роду ляснымі фартамі, дзе людзі маглі адпачыць бяспечна.

Да найбольш значных сутычак Нарбута, якія праславілі яго імя, належаць:

1. Бітва пад Руднікамі, 25 лютага паводле дадзеных ўрада;

2. Бітва, названая бітвай пад Дубічамі, ці інакш, бітва ў Паддубіцкіх лясах, ці бітва пад Старжынамі, 30 сакавіка;

3. Бітва пад Кавалькамі ў Лакштуцянскім лесе, 8 красавіка;

4. Апошняя бітва пад Дубічамі, у якой Нарбут загінуў, 22 красавіка.

Гэтыя дадзеныя маем з урадавых крыніц, бо сцерліся яны ўжо ў людской памяці, за выключэннем апошняй, крывавы фінал якой моцна ўразіў людскія сэрцы і розум.

Сяляне давалі схованкі параненым, а вясковыя жанчыны старанна іх апякалі. Пазней дзяржаўныя ўлады загадалі пад пагрозай суровай кары паведамляць пра такіх параненых. Гэтых нешчаслівых забіралі ў шпіталь, а пасля выздараўлення аддавалі пад суд.

Аднак літасць і добрыя сэрцы сялянак дазволілі схаваць параненых паўстанцаў і ўратаваць іх ад згубы. Але ўсё часцей аддзел павінен быў забіраць з сабой такіх інвалідаў і з-за бытавых нязручнасцяў многія з іх паміралі. Раслі ў лесе хутка насыпаныя магілы з крыжыкамі і прозвішчамі, выцятымі на кары дрэў.

З высяканнем лясоў сляды гэтых магіл страціліся назаўжды. Бывае толькі, што часамі араты, апусціўшы плуг глыбей у лясную глебу, падыме на паверхню людскія косці.

РАЗДЗЕЛ VII

Над Мерычанкай. Малы прырост сіл. Першая параза пад Руднікамі і Стажынамі. Урадавыя крыніцы. У пушчы пад Зубравым. Бітва пад Кавалькамі. Выхад з пасткі. Розгалас імя Нарбута і павелічэнне сіл аддзела. Нефартунная засада. Пройгрыш бітвы пад Дубічамі.

Затрымаўшыся на нейкі час у лясных ваколіцах Начы і Эйшышак, Нарбут са сваім ненамнога павялічаным аддзелам, выправіўся ў Руднікі, што ў бок Вільні, таму што спадзяваўся, што там да аддзела далучацца новыя людзі. І сапраўды, падчас пастою над Мерычанкай да лагера Нарбута далучыўся Андрыёлі са жменькай віленскай моладзі. Ён нарадзіўся ў 1837 годзе ў Вільні. Маці яго была полькай, а бацька грэкам, меў гарачы паўднёвы тэмперамент, яго палымяныя чорныя вочы выдавалі ўзвышаныя пачуцці. Маці выхавала ў сына глыбокую прывязанасць да Краю, дзе нарадзіўся і якому павінен быў верна служыць да смерці. У дзяцінстве Андрыёлі меў слабое здароўе і таму загартоўваў сябе праз спорт. Гэтыя заняткі

далі плён: ён развіў у сабе нязвыклую фізічную сілу і дасканаласць, што вельмі прыдалося ў будучым жыцці. Мог асядлаць любога каня, выдатна веславаў і плаваў, быў чэмпіёнам па фехтаванні. Пасля заканчэння школы ў Вільні вучыўся медыцыне ў Маскве, але хутка гэтыя заняткі кінуў, паступіў у школу малявання, адтуль быў залічаны ў Акадэмію Мастацтва ў Пецярбургу. Пасля заліку апошніх экзаменаў Андрыёлі выехаў у Рым, потым у Парыж, дзе прадоўжыў вывучэнне жывапісу. У 1862 годзе ён вярнуўся на радзіму, дзе ўжо ўсё кіпела і рыхтавалася да паўстання. Андрыёлі не застаўся пасіўным сведкам. Ён знайшоў кантакт з Нарбутам і далучыўся да яго шэрагаў.

Зламаная ў адпаведным месцы лесу сасонка была знакам, што тут будзе чакаць праваднік, які прывядзе ў лагер. Аднак замест правадніка Андрыёлі сустрэў маладую жанчыну. Ён незадаволена зморшчыў лоб і толькі даведаўшыся ад яе, што перад ім Тэадора Манчунская, весела павітаўся, адгукнуўшыся да таварышаў: «Панове! Шапкі ўгару! Сястра Галоўнага!»

Манчунская прынесла інфармацыю і кош з ядой для добраахвотнікаў. Не звяртаючы ўвагі на сур'ёзнасць хвіліны, з вуснаў моладзі зрываліся вясёлыя неасцярожныя словы. Андрыёлі абяцаў Манчунскай прынесці у якасці паска «стужку», сарваную з гвардзейца, яна абавязалася сама пашыць для яго канфедэратку. Рассталіся поўнымі веры ў будучыню. Праваднік, якога прывяла Манчунская, давёў добраахвотнікаў да лагера Нарбута. З гэтага часу Андрыёлі не пакідаў лагер да самай апошняй хвіліны.

Гэта яму мы абавязаны тым, што маем зарысаванае аблічча Галоўнага, бо Нарбут не любіў фатаграфавацца. Андрыёлі намаляваў вобраз Нарбута па памяці і па рысах падобнага на Людвіка малодшага брата Баляслава.

Гэта ён, Андрыёлі, пераказаў нашчадкам пра апошнія хвіліны Галоўнага і яго верных таварышаў, якія пад градам маскоўскіх куль выносілі параненага Людвіка ў бітве пад Дубічамі, намаляваўшы карціну пад назвай «Смерць Нарбута», якая цяпер знаходзіцца ў школе Бацінёл[1] прадмесця Парыжа.

25 лютага каля Руднікаў над Мерачанкай адбылася першая важная бітва аддзела Нарбута з маскоўскім войскам. Шалі поспеху напачатку схіліліся на бок паўстанцаў, якія давалі годны адпор расійскім ротам, а потым спрытна адступілі ў глыбокую пушчу.

Ва ўрадавых выданнях першы ўспамін аб знаходжанні аддзела Нарбута ў Эйшышскіх лясах з'явіўся толькі 19 лютага ў «Рускім Інвалідзе», адначасова з паведамленнем пра выбух паўстанчага руху пад кіраўніцтвам Рагінскага ў Мазырскім павеце Менскай губерні. Гэта былі дзве першыя знакавыя аб'явы пра рух на Літве.

[1] Школа Бацінёл (Szkola Batignolles) — польскі ліцэй паўстаў у 1842 г. у раёне Парыжа Бацінёл. — *Л. Л.*

Праз пару дзён «Інвалід» паведамляў: *«Дня 28-га лютага з Ліды была выслана 1 рота жаўнераў і палова эскадрона ўланаў, а з Вільні — рота лейб-гвардыі маскоўскага палка, 1 плутон*[1] *казакаў. Гэты атрад, рушыў з чыгуначнай станцыі Алькенікі ў бок Руднікаў каб далучыцца да галоўных сіл, якія выйшлі з Ліды і напаткаў банду паўстанцаў у Рудніцкім лесе. Пасля кароткай сутычкі, у якой былі паранены 3 жаўнеры і адзін казак, маскоўская рота і казакі рушылі ў лес і разагналі банду, якая разбеглася. У гэтай сутычцы здабылі 3 фузыі і косы, забіты 4 паўстанцы і конь камандзіра. Банда, рассыпаная па лесе, на другі дзень праследавалася палкоўнікам Вінбергам. З Вільні ў Руднікі высланы на падводах 2 роты лейб-гвардыі стралковага батальёна і рота лейб-гвардыі фінляндскага палка па чыгунцы з Алькенікаў для супольнага дзеяння.»*

Гэтая справаздача характарызуе тую занепакоенасць, якую выклікаў Нарбут і колькасць войскаў, якія сцягваліся супраць яго невялічкага аддзела, які паводле «Інваліда» адразу разбегся.

Памяць пра бітву пад Руднікамі захоўваецца сярод людзей да гэтага часу. Яшчэ жывуць старыя, што бачылі ўсё на ўласныя вочы. Гэтыя сведкі гавораць, што пад Руднікамі ваяваў не адзін Нарбут, а аб'яднаныя паміж сабой тры аддзелы: Віславуха, Парадоўскага і Нарбута. Аднак, здаецца, што тут закралася памылка: Парадоўскі, як вядома, прыняў кіраўніцтва значна пазней. Гэта мог быць ашмянскі аддзел, але на яго чале не мог стаяць Парадоўскі. Дарэчы, бітва адбылася 25-га лютага, калі акрамя Нарбута, які выклікаў самы ранні рух у Лідскім павеце, пра арганізацыю іншых паўстанчых аддзелаў у Віленскай губерні, наогул не было чуваць. Можа пад Руднікамі біліся тры аддзелы атрада Нарбута? Людское паданне гаворыць аб іншым. Указваюць на магілы палеглых і з даўняй сімпатыяй, узгадаванай яшчэ дзядамі ва ўнуках, гавораць пра Нарбута. Пад Руднікамі загінуў таксама і адзін афіцэр расійскай арміі. На яго магіле стаіць помнік з адпаведным надпісам.

Нарбут меў звычай: дзеля канспірацыі сваіх планаў раскідваць аддзел на дробныя пададдзелы — «дзясяткі», якія разыходзіліся і з'яўляліся тут і там, а потым збіраліся ў абумоўленым месцы. Пасля выступу маскалёў, Нарбут скарыстаўся хвілінай і перайшоў да Паддубіцкіх лясоў, а потым рушыў у Забалацкую пушчу. Праз час яго аддзел быў на краі Гарадзенскай пушчы. Навакольныя жыхары выказвалі паўстанцам вялікую сімпатыю і забяспечвалі аддзел правізіяй. Праз нядоўгі час Нарбут зноў рушыў у бок Дубічаў, і там спыніўся ў лясах непадалёк вёскі Старжыцы.

30 сакавіка пачалася новая бітва. Паўстанцы, седзячы ў засеках за драўлянай сцяной, густым агнём сеялі смерць сярод шэрагаў расійскіх жаўнераў. Затым Нарбут высунуўся з засекаў і манеўрам вывеў непрыяцеля ў ба-

[1] Плутон — ўзвод. — *заўвага перакладчыцы.*

лота пасярод лесу, і там, загразшага па калені ў балоце, пачаставаў новай порцыяй агню. Роты паламалі шэрагі і адступілі, пакідаючы за сабой многа забітых.

Пасля гэтага годнага адпору ворагу, Нарбут зноў павярнуў у пушчу, а слава яго пачала расці, пашырацца, ахопліваць сялянскія двары і шляхецкія засценкі, вёскі і мястэчкі. І той, і гэты бралі зброю і выходзілі з дому, каб папоўніць шэрагі паўстанцаў.

Маскоўскія дзяржаўныя выданні ў гэты час давалі даволі цьмяную інфармацыю. «Северная почта» 30 сакавіка пісала: *«Атрад Нарбута, якога пераследаваў капітан Цімафееў, разбіўся на дзясяткі, рушыў да вёскі Зубрава і зноў злучыўся за Новым Дваром. Для затрымання Нарбута з Гародні былі выслана тры роты і эскадрон уланаў пад кіраўніцтвам палкоўніка Вінберга»*.

Праз некалькі дзён «Кур'ер Віленскі» №38 пісаў: *«У Лідскі павет высланы 2 роты лейб-гвардыі Паўлаўскага палка і 50 казакаў пад кіраўніцтвам капітана Цімафеева. 30 сакавіка яны рушылі да вёскі Бершты, дзе на рацэ Котра знайшлі мост, разабраны паўстанцамі. Аддзел дайшоў да вёскі Пілаўцы, дзе даведаліся аб тым, што камандзір банды Нарбут і ксёндз Гарбачэўскі перайшлі лясамі пад Дубічы, куды і павярнуў капітан Цімафееў. Як толькі ланцуг жаўнераў уступіў на ўскраек лесу, паўстанцы спаткалі яго шчыльным агнём з засекаў. Ланцуг, падтрыманы рэзервам кінуўся на паўстанцаў, але паўстанцы пакінулі засекі і расцерушыліся па лесе. Ланцуг, часам ідучы па пояс у вадзе, пераследаваў іх у густым багністым лесе. Паўстанцы рассыпаліся ў розныя бакі і пакінуўшы свае рэчы, катлы і адну фурманку. Далейшы пераслед быў спынены з-за стомленасці коней. У вайскоўцаў забіта 2, паранена 6 чалавек. Параненых і забітых паўстанцаў бачылі каля 25-ці. У той жа час казакі захапілі жыхара ваколіцы Янкоўскага, які накіроўвася да паўстанцаў. У яго возе зайшлі зброю, волава і пуд пораху. Вайсковы аддзел, зрабіўшы ў гэты дзень па лесе пятлю ў 50 вёрст, прыбыў на начлег у маёнтак Новы Двор»*.

Падобна на тое, што і Нарбут праходзіў каля Новага Двара, кіруючыся да Забалацкай пушчы. У тых паданнях, што дайшлі да нас, часта прыпамінаецца бітва ў гэтым месцы. На самай справе там здарылася некалькі дробных нязначных сутычак. Некалькі паўстанцаў выбеглі з лесу, каб забраць пасылкі ў мястэчку, а калі яны ўжо вярталіся ў лес, на іх напаў дробны атрад жаўнераў. Пад час узаемнага абмену стрэламі быў забіты расійскі афіцэр. Маскоўскі атрад павярнуў у бок Эйшышак, а паўстанцы — спакойна пайшлі ў лагер.

Пасля бітвы пад Старжынамі ў Паддубіцкіх лясах аддзел Нарбута зноў адпачываў некалькі дзён у Гарадзенскай пушчы каля вёскі Зубрава, дзе меў верных сабе сялян. Пад час пастою да аддзела далучыліся некалькі чалавек. Сэрцы забіліся мацней, бо выросла вера ў поспех.

Нязломным пастаўшчыком добраахвотнікаў у аддзел быў Стэфан Вільбік, шляхціц — вясковец з Радунскага філіяла паўстанцаў. Як музыка са

скрыпачкай у руках граў на вячорках у ваколіцах Начы, Эйшышак і Радуні і паціху вербаваў людзей у аддзел. Заўсёды ведаў месцазнаходжанне лагера і раз-пораз прыводзіў новых паўстанцаў. Аднаго разу, калі Вільбік з невялікай жменькай людзей спяшаўся ў лагер, сяляне з вёскі Такароўшчына далі яму знаць, што Нарбут адышоў на некалькі міль далей. Не вагаючыся, Вільбік пусціўся са сваімі людзьмі ўслед. Былі ўжо даволі блізка, калі пачулі стрэлы. Рота жаўнераў абстрэльвала лес дзе знаходзіліся паўстанцы. Шалёная куля трапіла ў аднаго з добраахвотнікаў Вільбіка, селяніна Карчмаера, які забіты паваліўся на месцы. Вільбіку ўдалося з астатнімі людзьмі далучыцца да лагера, дзе ніхто з паўстанцаў не быў паранены або яшчэ як пашкоджаны.

З-пад Зубрава Нарбут перайшоў у Лакштуцянскія лясы, дзе паблізу вёскі Кавалькі ў праваднyю нядзелю — 8-га красавіка адбылася адна з найвялікшых сутычак якая пакрыла славай яго імя.

Ён меў 200—250 чалавек, калі ў Такштуцях яго аддзел акружылі з двух бакоў вялікія фарміраванні маскоўскага войска. Акрамя конніцы, для захопу былі высланы сем рот пяхоты і аддзел лёгкай артылерыі. Войска, якое месцілася ў Начы, раздзялілася на дзве часткі, адна павінна была атакаваць Нарбута з боку вёскі Кавалькі, другая — з вёскі Паддуб'е.

Першая частка, якая ішла проста, адразу наткнулася на паўстанцаў. Пачалася страляніна. Другая затрымалася у Паддуб'і, дзе сусед Кандрата селянін Мацкевіч здрадзіў яму, данёсшы маскалям, што Кандрат спрыяе Нарбуту і папярэджвае аб руху войска. Кандрата арыштавалі, а вёску прызначылі знішчыць. Аднак наперад маскоўскія жаўнеры хацелі пагуляць: пачалі есці, піць і рабаваць, і тады яны выразна пачулі стрэлы з-пад Кавалькаў. Афіцэры хутка адклікалі жаўнераў і пагналі іх пад Кавалькі. Гэта ўратавала паўстанцаў. Расійскі атрад, страціўшы многа часу ў Паддуб'і, не пайшоў згодна плану да вёскі Грыбошы, дзе павінен быў перакрыць паўстанцам мажлівасць для адступлення. Замест выканання плана атрад павярнуў да бліжэйшай дарогі. Менавіта гэтая акалічнасць дазволіла ацалець аддзелу Нарбута. Пасля некалькіх гадзін бітвы Нарбут зручным манеўрам вывеў свой аддзел з пасткі і правёў праз тыя самыя Грыбошы, якія ператварыліся ў адзіна свабодны праход. Прайшоўшы паўночным берагам возера Дэмбля, пераправіўся цераз раку Улу і паглыбіўся ў лясы Гарадзенскай пушчы. Там над ракой Котрай недалёка ад Зубрава, якое апекавалася атрадам і забяспечвала жыццёва важныя патрэбы, стаў лагерам.

За гэтую ўстойлівую павагу і падтрымку, расійцы пазней зруйнавалі вёску разам з зямлёй, а жыхароў выслалі на выгнанне ў Сібір.

Гераічная бітва пад Кавалькамі яшчэ раз паказала рэдкі вайсковы талент Нарбута, які з невялікім аддзелам зваяваў непрыяцеля большага па колькасці ў некалькі разоў і выслізнуў з яго рук. Гэта не была перамога, а толькі пераможны манеўр, які звярнуў увагу не толькі сваіх, але і замеж-

нікаў. Гэта бітва вядомая як Лакштуцянская, але павінна была называцца бітвай пад Кавалькамі, таму што назоў вёскі выразна пазначаны на ўсіх большых мапах, у той час як скарбовы лес у Лакштуцях не фігуруе на іх зусім. Кожны, хто праглядвае мапу Лідскага павета і знаходзіць на ёй Кавалькі, прыпамінае, што менавіта гэта месца было заліта нашай крывёй у 1863 годзе.

У №40 «Кур'ера віленскага» таго часу чытаем: *«Банда Нарбута, рассеяная капітанам Цімафеевым, 30 сакавіка вырушыла да вёскі Зубрава. 31 сакавіка ў пагоню з маёнтка Новы Двор да мястэчка Сабакінцы выйшаў аддзел Цімафеева. Па прычыне блытаных звестак было немажліва даведацца пра банду Нарбута. І толькі 3-га красавіка атрымалі дакладную інфармацыю: банда знаходзіцца зноў каля вёскі Дубічы за Новым Дваром, куды і вырушыў капітан Цімафееў.»*

З другога боку на Нарбута ішоў палкоўнік Алхазаў і палкоўнік Вернер, высланы з Гародні з 3-мя ротамі пяхоты.

«Кур'ер віленскі» ад 8-га красавіка надрукаваў пра бітву ў Лакштуцянах наступнае: *«... на след паўстанцаў патрапілі каля вёскі Руда ў лясных балотах, далей над возерам Дэмбля каля вёскі Кавалькі. Бітва доўжылася каля шасці гадзін. Вечарам каля васьмі паўстанцы кінуліся да вёскі Грыбошы і Бручаніцы. Узялі ў палон 4 зняволеных, згодна з іх паказаннямі ў атрадзе Нарбута было каля 600 добра ўзброеных людзей. Між іншымі забіты ад'ютант начальніка і ксёндз Гарбачэўскі».*

Падобна на тое, што справа пад Кавалькамі была гарачай і для расійцаў, як скора дзяржаўная прэса назвала яе шматгадзіннай бітвай. Аднак памылковай была звестка пра колькасць аддзела Нарбута, узбраенне і смерць ксяндза Гарбачэўскага. Насамрэч там быў забіты Уладзіслаў Навіцкі, якога Віленскі аддзел Народнага ўрада адразу хацеў паставіць начальнікам узброеных сіл Лідскага павета. У гэтай бітве былі забіты Міхалоўскі і малады Войцех Нарбут, сакратар павятовага суда ў Лідзе і крэўны камандзіра. Калі маскалі, абдзіраючыя адзенне з трупаў, знайшлі ў забітага воіна дакумент з прозвішчам Нарбут, дык моцным «Ура» віталі здабычу. Адразу вырашылі, што палеглы — кіраўнік атрада і вялікая радасць была у маскоўскай роты. Усіх забітых пахавалі разам пры касцёле ў Начы. Сярод забітых расійцаў быў і афіцэр.

Ксёндз Стэфан Гарбачэўскі — вікарый з Эйшышак атрымаў лёгкае раненне, але адпраўляў набажэнствы, асвячаў косы паўстанцам, даглядаў параненых, прычашчаў паміраючых. Ніколі не страляў. Калі падчас першай сутычкі з ворагам Нарбут хацеў, каб першы стрэл быў з рукі ксяндза, адхіліў яго прапанову, цвёрда прамовіўшы: *«Не прыстала мне служцы Божаму забіваць людзей. Страляйце самі. Я вам іншымі паслугамі дапамагаць буду».* І выконваў свае абяцанні да канца.

«Кур'ер Віленскі» ад 18-га красавіка пісаў наступнае: *«Аддзелы Алхазава, Цімафеева і Вернера аб'яднаўшыся разам, акружылі атрад Нарбута з трох*

бакоў, але Нарбут зручна выслізнуў з атачэння, заціраючы свае сляды адзеннем ці ідучы задам-наперад. Яго аддзел ішоў паўночным бокам возера Дэмблі і некалькі разоў перапраўляўся праз раку Улу. Загінула каля 30 паўстанцаў. Акрамя пары стрэльб і некалькіх вазоў з катламі другой здабычы не было».

«Кур'ер Віленскі» прыпамінае наступнае аб дробнай сутычцы над ракой Улай на ўскрайку леса паміж разасланымі выведвальнікамі і новай партыяй паўстанцаў пад кіраўніцтвам Чудоўскага. Напэўна гэта быў невялічкі аддзел Нарбута, высланы дзеля збіцця са шляху непрыяцеля. Бітва пад Кавалькамі становіцца адметнай кропкай у кампаніі Нарбута. Прыгожы, слаўны дзень Лідскага паўстання. Майстэрскі прарваўшы кола непрыяцеля, Нарбут паглыбіўся ў Гарадзенскую пушчу. Людзі глядзелі на правадыра, як на паўбога, і стваралі аб ім легенды. Яго імя было ва ўсіх на вуснах. Гэта віхура распаліла рух, які драмаў у Лідскім павеце. Да абозу Нарбута далучылася трохі свежых сіл, сярод якіх былі двое братоў Бразоўскіх, Губарэвіч, Паплаўскі і іншыя.

Аднойчы над распаленым вогнішчам пад вялікай сасной, зляцеў з яе чорны крук і пранізліва закаркаў над галовамі паўстанцаў. Многія палічылі гэта за злы знак.

Праз кароткі час абоз вырушыў да вёскі Ганэлькі, фальварка Маргевічаў, адкуль прыйшло паведамленне аб тым, што да пушчы высланы значныя маскоўскія сілы з мэтай выцясніць з яе паўстанцаў.

Нарбут, папярэджаны аб маршруце непрыяцеля, вырашыў зрабіць засаду каля Раманава. Аднак у тым накірунку каля Сабакінцаў, маёнтка Кіпрыяна Шалевіча, аказаўся маскоўскі атрад. Хтосьці прапанаваў павесіць тамтэйшага папа, які вызначаўся шпіянажам, але Нарбут не дазволіў, бо не жадаў перакладаць адказнасць на Шалевіча, годнага і высакароднага чалавека.

Так добра задуманая засада ў Раманове, якая магла кардынальна змяніць лёс лідскага паўстання, не ўдалася. Адзін з паўстанцаў, хоць і было яму сурова загадана трымацца ціха, падчас чысткі зброі неасцярожна стрэліў і насцярожыў ворага.

У той колькасці людзей, з якіх складаўся аддзел Нарбута, павінны былі мецца недысцыплінаваныя элементы, якія сваімі паводзінамі не раз псавалі добра задуманыя планы камандзіра. Пасля няўдалай засады неабходна было мяняць месца стаянкі і шукаць новы, больш бяспечны пункт. Нарбут накіраваўся да Дубічаў, але яшчэ нейкі час манеўраваў па лясах, каб заблытаць непрыяцеля.

Аднойчы здарылася так, што адзін з паўстанцаў па прозвішчы Раманоўскі, выйшаў з лесу і сустрэўся нос у нос з расійскім афіцэрам, які відочна шпегаваў за паўстанцамі і меў у суправаджэнні селяніна з Дубічаў. Абодва, сустрэўшыся, узаемна кінуліся ў процілеглыя бакі наўцёкі. Калі пра гэта даведаўся Нарбут, то з незадавальненнем сказаў: «Дарэмна носіш зброю, мог яе і ўжыць»[1].

У аддзеле тым часам некаторыя паўстанцы перашэптваліся: «Крук! Злы прадвеснік! няшчасце прадказвае!» Гэта непакоіла менавіта прастакоў, якія верылі ў забабоны.

І зноў Нарбут вырашыў спыніцца ў недаступным месцы. Дзеля гэтага выбраў лясісты ўзгорак паміж Забалаццю і Дубічамі пасярод непраходнай, як здавалася, багністай мясцовасці над возерам. Стаў там лагерам, маючы вузкі сухі пярэсмык да пушчы. Паблізу ўзносіўся стары дубіцкі касцёл і такая ж плябанія. Месца выглядала як бяспечнае і цяжкадаступнае. Аддзел налічваў у той час 13 дзясяткаў, або 130 чалавек.

Кіраўнік выслаў свайго брата Баляслава да Віславуха, камандзіра гарадзенскага атрада, ад якога спадзяваўся атрымаць дапамогу, якая б дала магчымасць пашырыць дзейнасць.

Раздзел VIII

Народны рух. Зацішша каля Ліды. Альберт Лясковіч. Прызнанне Бальтазара Калясінскага. Рэліз. Агульны ўздым. Публічная ахвярнасць. Петрыкоўскі і яго заступні.

Была ўжо палова красавіка, час які быў больш-менш вызначаны Віленскім Народным урадам як пачатак агульнага вызвольнага руху ва ўсіх ваяводствах і паветах. У большых або меншых памерах паўстанне пачалося паўсюдна, паўстанчы рух ахапіў Жмудзь.

У Лідскім павеце адзіным дзейным аддзелам было фарміраванне Нарбута, а вызвольны рух найбольш праявіўся пасля бітвы пад Кавалькамі. Бальтазар Калясінскі падбухторваў гміны, бо меў некалькі прыведзеных да прысягі войтаў. У ваколіцах пачалі з'яўляцца розныя карэты з такімі таямнічымі постацямі як ксёндз Робак[2]. Навіны аб поспехах Нарбута панавалі пад кожнай страхой, будзілі ад сну, заахвочвалі да дзеянняў. Моладзь шляхецкага паходжання аб'ядноўвалася і збліжалася з сялянамі. Былі распрацаваны праекты стварэння Лідскага атрада і яго далучэння да Нарбута. Цэнтрам руху была Ліда і яе ваколіцы, бракавала толькі галавы, якая б магла гэты рух скіраваць на практычную працу, і рукі, якая б моцна трымала стырно кіравання.

Арганізацыйны камітэт, які ўжо знаходзіўся пад пільным наглядам расійскай улады, дзейнічаў слаба. Пачаліся арышты. Пайшоў пад ключ і Бальтазар Калясінскі. І хоць яго хутка выпусціл, аднак больш працаваць сярод народа ён не мог.

З-за паказанняў маладога Альберта Лясковіча з Кір'янаўцаў былі арыштаваныя і іншыя землеўладальнікі. Лясковіча арыштавалі з-за нейкіх лег-

[1] Па словах Паплаўскага з атрада Нарбута.

[2] Ксёндз Робак (Яцак Сапліца) персанаж паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш». У паўстанні 1863 г. пад такой мянушкай дзейнічаў ксёндз з Ковенскага павета Антон Мацкевіч. Павешаны ў Коўне 16 снежня 1863 г. — *Л. Л.*

кадумных словаў у мястэчку Беніца; арыштоўваў яго афіцэр этаповай камендатуры Свінавухаў і тутэйшы ключвойт[1].

Выпадкова ў вязніцы Лясковіч апынуўся разам з нейкім Адамам Сасёнкам, які падгаворваў маладзёна да складання фальшывага прызнання і ўключэння ў яго як мага большай колькасці асоб, пераконваючы, што гэтак справа пойдзе лепш і хутчэй скончыцца нічым.

Сам гэты Сасёнка, сын тутэйшага землеўладальніка, з невядомых прычын агаварыў сябе, бацькоў і сястру ў распаўсюдзе Маніфеста Народнага ўрада, пастаўках зброі паўстанцам і г. д. Нудзячыся ў вязніцы, ён казаў Лясковічу, што калі больш знаёмых апынецца разам з імі ў астрозе, дык будзе весялей. Недасведчаны маладзён прыслухаўся да нашэптвання таварыша, і калі яго выклікалі на допыт, а ваенны начальнік павета Казаналі[2] падпаіў яго віном, скампраметаваў сябе і многіх іншых асоб. Начальніку павета толькі гэта і было патрэбна. Гэта быў годны паплечнік знакамітага Барэйшы, вайсковага начальніка Вілейскага павета.

У хуткім часе на суседскіх пасядзелках у Юліяна Лясковіча, старэйшага брата Альберта «міравога пасярэдніка», у яго маёнтку Чаплаёўшчына быў арыштаваны сам гаспадар і яго госці: Зыгмунт Гадачэўскі з Мінайлы і Вільгельм Грабоўскі з Семятоўшчыны, якая пасля перайшла ў чужыя рукі. Адначасова былі арыштаваны Караль Тышкевіч з Жырмунаў і Браніслаў Нарбут з Нікадзімава, які ў той час знаходзіўся ў Наваградку па пасадзе сакратара З'езду міравых пасярэднікаў. Ён быў зусім недатычны да палітычных спраў і стаў ахвярай нейкага фальшывага даносу.

У Лідзе арыштавалі Бальтазара Калясінскага. Улада даўно ўжо мела на яго вока, але не спяшалася з арыштам, бо Калясінскі меў вялікую павагу сярод сялян і такі крок мог выклікаць вялікае хваляванне, адпор або якія-небудзь іншыя праблемы. Хітры ваенны начальнік павета вырашыў узяць яго падманам.

Некалькімі днямі раней ад апісаных падзей, калі ў Калясінскага сабралася кола знаёмых, Казаналі прыслаў капітана Баранава з патрабаваннем неадкладна прыбыць у канцылярыю. Бальтазар Калясінскі адмовіўся і патлумачыў гэта тым, што ў яго госці. Аднак, калі афіцэр дастаткова настырна паўтарыў загад, Калясінскі страціў цярпенне і буркнуў: «Пану Казаналі дарога да мяне такая ж роўная, як і мне да яго». Афіцэр пайшоў, а Казаналі вырашыў дзейнічаць па-іншаму. Ён паведаміў арыштаванаму Юльяну Лясковічу, што той будзе хутка высланы ў Расію, аднак, калі хоча, то можа паклікаць каго-небудзь са знаёмых у Лідзе, напрыклад Калясінскага, і перадаць яму пад апеку сваю сям'ю і інтарэсы.

Хуткая, бяспраўная дэпартацыя, такая частая ў тыя часы, не здзіўляла

[1] Ключвойт — выбраны прадстаўнік ад жыхароў ўсяго ключа. Ключ — вялікі двор, які дзяліўся на фальваркі ці засценкі. — заўвага перакладчыцы.

[2] Ці Казаўлі, вайсковы начальнік Ваўкавыскага і Лідскага паветаў, палкоўнік. — *Л. Л.*

ўжо нікога. Таму вестачка, прысланая з вязніцы, не здзівіла Калясінскага і, прыгнечаны лёсам Лясковіча, ён тут жа пайшоў да яго, пакінуўшы дом і гасцей на свайго крэўнага Станіслава Калясінскага. Як толькі Бальтазар пераступіў парог вязніцы, яго атачылі ахоўнікі і замкнулі на ключ у камеры.

Занепакоены доўгай адсутнасцю родзіча Станіслаў Калясінскі выбег у горад, каб даведацца, што здарылася. Усе ўжо ведалі пра арышт Бальтазара. У любую хвіліну мог пачацца пратрус у яго доме. Там маглі быць дакументы, якія кампраметавалі іншых, нейкія сведчанні пра сувязь з камітэтам у Парыжы, грошы на патрэбы паўстання.

Знерваваны Станіслаў Калясінскі амаль што з боем дабіўся аўдыенцыі ў Казаналі, які не хацеў яго адразу прыняць. Калясінскі прасіў дазвол на сустрэчу са стрыечным братам. Казаналі яму адмовіў, і толькі пасля таго, як Калясінскі давёў, што ў кузена, як у міравога пасярэдніка могуць захоўвацца дзяржаўныя грошы, і што яны могуць страціцца падчас пратрусу, за што Казаналі будзе асабіста адказваць, пан вайсковы начальнік змякчэў і, выклікаўшы афіцэра, загадаў суправаджаць Станіслава Калясінскага да вязніцы і прысутнічаць пры размове братоў.

«Казённые деньги» заўсёды давалі шанец на поспех сярод чыноўнікаў. Калі па дарозе да турмы ў казармах, дзе сядзеў Бальтазар Калясінскі, міналі рэстаран Андрушкевіча[1], Станіслаў прапанаваў афіцэру, які ішоў разам, невялікі сняданак.

За кілішкам шчыра разгаварыліся. Афіцэр вярнуўся з Каўказа і сімпатызаваў тутэйшым, з якімі там пазнаёміўся. Ён дазволіў братам спатканне сам-на-сам, без сведак. Потым Станіслаў змог зайсці ў кватэру брата і прагледзець паперы. Яго эскорт трымаўся каля дзвярэй, на адлегласці. Станіслаў забраў усё, што трэба, і выехаў з Ліды. Вольна ўздыхнуў толькі за горадам.

У хуткім часе Казаналі выслаў усіх арыштаваных у Вільню, дзе яшчэ кіраваў Назімаў. У палітычнай атмасферы яшчэ адчуваліся лагодныя плыні. Старшынём следчай камісіі ў той час быў Вісяліцкі, чалавек адносна добры. Судовае следства пра неабачлівыя словы Альберта Лясковіча цягнулася даволі доўга, потым Альберт адмовіўся ад іх, быў апраўданы і выйшаў на волю[2].

Бальтазар Калясінскі вярнуўся ў Ліду і зноў энергічна ўзяўся за працу. Яго арышт разарваў многія ніці ў папярэдне старанна сплеценай павуціне,

[1] Знакамітая цукерня Андрушкевіча знаходзілася на рагу вуліц Віленскай і Каменскай. — *Л. Л.*

[2] Паводле тагачасных аповедаў атрымаць волю арыштаваным дапамог такі выпадак: сярод членаў следчай камісіі быў генерал Беклямішаў, знаёмы Бальтазара Калясінскага з часоў яго выгнання і службы ў «вечных салдатах». У тыя часы ён быў маёрам і начальнікам Бальтазара. Падчас бою за Ацкмячэць куля адарвала Беклямішаву нагу, і ён загінуў бы, каб не Бальтазар, які, узваліўшы камандзіра на плечы, вынес яго пад градам куль у бяспечнае месца. Калі арыштаваныя сталі перад следчай камісіяй, Беклямішаў пазнаў Бальтазара, сардэчна яго прывітаў і прадставіў Вісяліцкаму як свайго выратавальніка, чым дапамог

аднак паводзіны Нарбута ўздымалі ў людзей што раз то большую сімпатыю і ўмацоўвалі веру ў будучыню, хаця бальшыня сялян паводзіла сябе пасіўна. Даўнія грахі шляхты, цемната сялян, адсутнасць нацыянальнай свядомасці і яшчэ свежая памяць пра цяжкую паншчыну не маглі выклікаць іншыя пачуцці сярод народных мас, таксама трэба асабліва ўлічваць актыўныя дзеянні царскага ўрада, які будзіў нянавісць да землеўладальнікаў у сялянскіх сэрцах і галовах. Заставалася яшчэ рэлігійная струна, на якую народ рэагаваў найбольш уразліва і на якой удавалася граць лягчэй.

У Дакудаўскай гміне войт Кохан меў напагатове некалькі соцень людзей, пераважна праваслаўных з даўнейшых уніятаў. Чакалі толькі выкліку.

У Тарноўскай гміне, дзе праца Калясінскага пакінула глыбокі след, прыведзены пад прысягу войт Марцін Якубоўскі стварыў першую сярод сялян арганізацыю і нават падрыхтаваў трошкі зброі. Планавалася, што сяляне паўстануць тады, калі падымецца Ліда. Народу заўсёды імпануе сіла. Калі б насельніцтва разгледзела яе ў паўстанні, дык напэўна падтрымала б яго.

Тым часам у ваколіцах Ліды ішла гарачая агітацыйная праца, ствараліся ўсё новыя праекты, іншым разам зусім фантастычныя. Думалі нават пра захоп казарм і пра арышт камандавання лідскай залогі і г. д. Больш цвярозымі былі думкі пра арганізацыю лідскага аддзела, які б мог злучыцца з Нарбутам. Гэтую работу даверылі некалькім актыўным і разумным маладым людзям, у тым ліку і Станіславу Калясінскаму. Вярбоўка ішла лёгка, ахвяраванні і складкі сыпаліся неспадзявана шчодра, некаторыя ўдовы нават ахвяравалі амаль апошнія грашы.

Калі Нарбут падышоў да Дубічаў, глеба была прыгатаваная. Агульны запал у Лідзе і ваколіцах узняла прамова Баляслава Колышкі, які падаўся ў аддзел Серакоўскага, дзе потым стаў памочнікам. Колышка паходзіў з дробнай шляхты Лідскага павета. Адразу служыў у павятовым судзе ў Лідзе. Пры першым рэху рэвалюцыі падаўся ў Грэцыю[3] і паступіў у Вайсковую Акадэмію ў Кунеа[4]. Меў намер там застацца. Аднак, атрымаўшы весткі пра пачатак вызвольнага руху на радзіме, тут жа вярнуўся. Ён спяшаўся ў аддзел Серакоўскага. Аднак затрымаўся ў Лідзе, каб пабачыцца з роднымі. Пані Табенская[5], якая ўтрымоўвала жаноцкі пансіянат і жыла ў Лідзе, арганізавала Колышку ўрачысты прыём, за які потым была арыштавана і выслана на Сібір[6].

За кароткі час каса Петрыкоўскага напоўнілася 18-цю тысячамі рублёў, а публічная ахвярнасць і рух, які распачаўся ў ваколіцах Ліды, даваў надзею

Бальтазару і яго таварышам.

[3] Насамрэч, у Італію. — *Л. Л.*

[4] Вайсковай школа паўстанцаў, мела лагер у італьянскім горадзе Кунеа. — *Л. Л.*

[5] Альжбета Табенская, аўтарка ўспамінаў «З долі і няволі», старэйшая сястра знакамітай Антаніны Табенскай. — *Рэд.*

[6] Паводле ўспамінаў Альжбеты Табенскай, яе за гэтую акцыю толькі выслалі з Ліды да бацькі, а пансіянат закрылі. Сібір — пазней. — *Рэд.*

на хуткае фармаванне атрада. Петрыкоўскі з пэўнай сумай грошай вырушыў пад Дубічы ў лагер Нарбута, каб павітаць правадыра, папоўніць яго касу і паінфармаваць аб стане рэчаў. Петрыкоўскі меў намер застацца ў лагеры паўстанцаў і дачакацца прыбыцця лідскага атрада і перадаць яго пад кіраўніцтва Нарбута.

Гарачы патрыёт і сумленны чалавек, Петрыкоўскі меркаваў пра людзей па сабе, сваёй меркай. Пакідаючы Ліду, ён даручыў збор грашовых ахвяраванняў аднаму з месцічаў — пану Каліноўскаму, нават прозвішча якога выклікала пэўны давер, але не ўзяў пад увагу слабы характар гэтага чалавека і вялікі ўплыў на яго жонкі, якая мела яўрэйскае паходжанне.

Петрыкоўскі, выязджаючы з Ліды, наказваў свайму намесніку не выпісваць ахвярадаўцам на мэты паўстання ніякіх квітанцый. Адзіным доказам свайго паўнамоцтва на збіранне грошай можна было паказаць дакумент Народнага Урада, які быў схаваны пад бэлькай на столі. Гэта ўсё стварала нераадольную, схільную да граху спакусу. І сталася рэч ганебная. Публічныя грошы зніклі бясследна. Як тады перадавалася з вуснаў у вусны — прагная жанчына, як другая Ева, падгаварыла да граху Адама.

Паводле пазнейшых падлікаў, у касу не патрапіла каля 30 000 рублёў, што можа даць уяўленне аб памеры ахвяраванняў у Лідскім павеце. Уся гэта мутная справа пры іншых абставінах магла быць толькі простай растратай, аднак, у той час аказала вялікі ўплыў на лёс лідскага паўстання.

Раздзел IX

Чаканне над Дзітвой. Станіслаў Калясінскі. Фальшывая трывога. Расцярушванне лідскага атрада. Крадзеж зброі. Ніколка. Надмагільная пліта. Нападзенне на ксяндза. Пакаранне. Канцэнтрацыя войска. Перасцярога афіцэра ў Лідзе. Запозна

Тым часам ва ўсіх ваколіцах Лідскага павета пачалі фарміравацца малыя і большыя паўстанчыя аддзелы, якія павінны былі сабрацца 11 красавіка на зборным пункце ў вёсцы Аўсядава, якая належала Зянкевічу (некалькі вёрст на поўнач ад Ліды).

Там яны павінны былі атрымаць зброю, амуніцыю, правіянт, нават некаторае абмундзіраванне, грошы і, злучыўшыся ў адно цэлае, як лідскі аддзел, рушыць у Дубічы пад камандаванне Нарбута. Усё было старанна прадумана і разлічана.

У Крупаўскім лесе аддзел чакаў тутэйшы землеўладальнік Тамаш Шукевіч, адзін з найбольш уплывовых людзей, які пры Геншалі выконваў абавязкі цывільна-прававога памочніка кіраўніка павета. Разам з адважным Вільбікам, тагачасным сувязным-музыкам, які дастаўляў добраахвотнікаў у лагер паўстанцаў Нарбута, яны пачалі розныя прыгатаванні.

У Гейштаўтах і Гудэлях над ракой Дзітвой паўстанцаў чакалі 60 лодак для пераправы. Меліся запасы зброі, жыўнасці і амуніцыі. Станіслаў Калясінскі завербаваў 60 чалавек, пераважна са службоўцаў, рамеснікаў і засцянковай шляхты. Зброі было нават болей, чым было неабходна аддзелу. Да таго, як прагучыць сігнал збору ў Аўсядаве, усю яе неабходна было сабраць разам. Калясінскі знайшоў добрага памочніка, шчыра адданага справе чалавека: Андрэя Буткевіча (родам са Жмудзі), які вельмі палегчыў выкананне гэтага задання.

Добраахвотнікі мелі сабрацца ў маёнтку Клепцаўшчына[1], якім ў той час валодалі Калясінскія і адкуль потым павінны былі выправіцца ў Перапецкі лес. Там, сфарміраваўшы шэрагі з яшчэ недысцыплінаваных элементаў, Калясінскі павёў іх праз Раслякі, млын у Пастаўшчыне, каля фальварка Адамовіча ў Малэйкаўшчыну (фальварак сёння знаходзіцца ў чужых руках). Па дарозе сустрэлі семярых казакаў і, каб яны не нарабілі алярму ў ваколіцах, вырашылі іх застрэліць. Але казакі павярнулі ў другі бок.

Калі ў маёнтку сабраліся аддзелы з Ашмянскага, Наваградскага і Лідскага паветаў, агульным лікам некалькі соцень чалавек, як пярун з яснага неба, звалiўся з Ліды Ігнат Каліноўскі (той самы, у руках якога, як потым высветліцца, растварыліся грошы сабраныя ў Лідскім павеце на патрэбы паўстання) і ўзняў трывогу, што як быццам у Аўсядава выправіліся вялікія сілы маскоўскага войска. Гаспадара абвінавацiў у здрадзе, крычаў, што той хоча свядома ўсіх загубіць, пасля чаго незаўважна знік. Тым часам уражаныя прастачкі пачалі разбягацца, і нават іх лідары, людзі разумныя, разгубіліся і скамянелі. Становішча было страшнае.

Нарбут, падвергнуўшы сваіх людзей небяспецы, наўмысна даўжэй затрымаўся пад Дубічамі і чакаў гэтае папаўненне. Калясінскі, каб праясніць сітуацыю, пакінуў свой аддзел у лесе пад апеку Дарашкевіча і накіраваўся ў Ліду. У горадзе было ціха і спакойна. Ніхто не чуў пра блізкае маскоўскае войска. Ніхто не разумеў, з якой мэтай Каліноўскі нярвуе людзей сваімі расказамі. Хутка справа стала праясняцца. Гэты Каліноўскі па навучанні жонкі, такім чынам хацеў скарыстацца з хаосу і схаваць сляды зніклых грошай, якія павінен быў атрымаць лідскі аддзел. Боль, ганьба, гнеў апанавалі людскія сэрцы. Лідары аддзелаў рвалі валасы на галовах, што так лёгка далі сябе ашукаць!

Тагачасныя палітычныя абставіны прымушалі людзей да маўчання, і толькі нямая пагарда сталася выразам агульнага абурэння. Ганебны факт не страціўся ў людской памяці. Гэтая авантура знішчыла гэткую цяжкую, мазольную арганізацыю лідскага і іншых аддзелаў і тым самым нанесла страшэнны ўдар па тутэйшым паўстанні.

[1] Фальварак каля в. Перапечыца — *Л. Л.*

Аднак аўсядаўская гісторыі паказала і вялікую ахвярнасць. Юльян Кашыц[1] з Новага Ольжава — рэспектабельны чалавек з бездакорнай рэпутацыяй — даслаў значную колькасць бельгійскіх штуцараў, імпартаваных за мяжы. Іншыя двары давалі на патрэбы паўстання, што толькі мелі: дарагія дзядоўскія памяткі — аздобленыя золатам і срэбрам пісталеты, карабіны і г. д.

Пасля сумнага здарэння ў Аўсядаве Станіслаў Калясінскі загадаў свайму памочніку Дарашкевічу прывезці зброю ў Клепцаўшчыну. Аднак Дарашкевіч ужо не знайшоў у лесе самай каштоўнай зброі. Яна знікла разам з вопраткай, канфедэраткамі і іншым. У хуткім часе даведаліся, што яе скраў завербаваны ў аддзел праваслаўны шавец з Ліды па прозвішчы Ніколка, які ў Аўсядаве першым пачаў хваляванне і пабудзіў да ўцёкаў іншых. Неўзабаве Ніколка пачаў прадаваць яўрэям скрадзеныя прадметы, выдзіраючы золата, срэбра і іншую каштоўную аздобу.

Часы былі такія, што ўсялякія падобныя злачынствы заставаліся без пакарання. Але праз некалькі тыдняў Ніколка раптоўна звар'яцеў. Гэта зрабіла пэўнае ўражанне на ніжэйшыя пласты насельніцтва. «Боская кара, — шапталіся — Абмінуў руку людскую, але не пазбег рукі Божай».

Каятан Дарашкевіч памёр праз некалькі гадоў і пакінуў пасля сябе памяць як пра чалавека годнага, сумленнага і з пачуццём гонару. Пазней Станіслаў Калясінскі паставіў на яго магіле на могілках у Лідзе невялікі надмагільны камень з надпісам: «Каятану Дарашкевічу, вахмістру народнага войска». Гэты помнічак захаваўся і па сёння.

Як мы ўжо гаварылі раней, непадалёк ад лагера Нарбута пад Дубічамі стаяў стары касцёлік, у плябаніі якога жыў ксёндз Савіцкі — вядомы тады прапаведнік.

У касцёліку захоўваўся цудадзейны абраз Хрыста. Шчодрыя ахвяраванні складаліся на алтары і хадзіла пагалоска, што сабраўся ўжо неблагі капітал, які ксёндз Савіцкі трымае ў плябаніі.

Неаднаразова хто-небудзь з паўстанцаў патаемна забягаў у плябанію. Ксёндз Савіцкі кожнага прымаў з прыязнасцю і дапамагаў ежай, тытунём і ўсім іншым. Аднойчы ўначы на плябанію напалі нейкія бандыты з патрабаваннем выдаць ім грошы, а калі ксёндз адмовіўся, кажучы што не мае грошай, яму заткнулі рот кляпам, збілі і вывалаклі ў адной бялізне ў лес.

[1] Сын Юзафа Кашыца (1795—1868), які на баку французаў, у складзе 17-га ўланскага палка, удзельнічаў у вайне 1812 года. У 1812—1815 гг. у эміграцыі, з 1815 г. асеў у Навагрудскім павеце. У 1830 г. абраны навагрудскім маршалкам, удзельнік паўстання 1830—1831 гадоў. Брат Канстанціна Кашыца (1828—1881), які валодаў Тарновам з фальваркамі. Менавіта на зямлі Канстанціна Кашыца быў устаноўлены помнік (крыжы) загінулым у баі паўстанцам. З вясны 1863 г. цывільны паўстанцкі начальнік Навагрудскага павета. 25.5.1866 вымушаны быў «добраахвотна» падпісаць акт продажу маёнтка Тарнова разам з фальваркамі генералу Маўрасу. — *Л. Л.*

Потым вярнуліся да плябаніі, дзе ператрэслі ўсе куты і каморы, дарэмна шукаючы схаваныя грошы.

Перапалоханыя служкі не адважваліся нават падаваць знакі жыцця, і ксёндз, напэўна, замёрз бы пад дрэвам, каб да плябаніі не прыехалі нейкія парафіяне, якія прывезлі пахрысціць дзіця. Толькі тады гаспадыня (жанчына, якая гатавала ксяндзу ежу) ударылася ў плач і расказала пра начное здарэнне. У адным з нападнікаў служкі апазналі паўстанца, які часта бываў у ксяндза. Узнялася трывога. Распачаліся пошукі ксяндза. Паінфармавалі аб здарэнні Нарбута. Праз кароткі час напаўжывога ксяндза знайшлі пад дрэвам. Выкрылася, што напад здзейсніў паўстанец Рыла з яшчэ адным шарагоўцам.

Нарбут быў страшна разгневаны і абодвух пакараў смерцю. Гэты выпадак выклікаў вялікі розгалас сярод ваколічнага люду і розныя домыслы. Адны сцвярджалі, што камандзір загадаў закапаць Рылу жыўцом, другія — што засячы палкамі. Словам, на гэтым фоне нараджаліся розныя міфы, якія жывуць і па сённяшні дзень. Нарбут насуперак сваёй звычайнай практыцы затрымаўся на адным месцы даўжэй, можа чакаў пад Дубічамі аддзел з Ліды, можа падмогу з Ашмян ад Парадоўскага, ці Віславуха з Гарадзеншчыны, да якога выслаў свайго брата Баляслава.

Маскоўскія войскі сцягваліся да Ліды з Гародні, Шчучына і Трок. Капітан Цімафееў з некалькімі ротамі стаяў у Дубічах, аднак не рабіў ніякіх крокаў. Яго дзеянні нагадвалі хутчэй род аблавы, ці нават жаданне даць Нарбуту час паглыбіцца ў пушчу.

Лідар пастаянна меў звесткі аб рухах маскалёў і цяпер атрымаў паведамленне пра тое, што Цімафееў пасля некалькіх дзён пастою ў Дубічах пакінуў іх і павярнуў у Ліду.

Выкарыстоўваючы момант, Нарбут хацеў папоўніць запас правіянту ў ваколіцах і толькі потым паглыбіцца ў пушчу. Не ведаў ён аднак аб тым, што калі Цімафееў павярнуў да Ліды на сёмай вярсце яго дагнаў стражнік урадавых лясоў, тутэйшы селянін Базыль Карповіч, званы ў народзе «Базылюк», і паабяцаў правесці маскоўскае войска праз балоты да лагера Нарбута. Ён добра ведаў усе мажлівыя пераходы, бо не раз разам з іншымі сялянамі прыносіў паўстанцам хлеб. Здраднік спакусіўся на абяцаную за галаву Нарбута ўзнагароду ў суме адна тысяча рублёў.

Як гаварылі людзі, Цімафееў успрыняў селяніна з пагардай і доўга вагаўся, але потым павярнуў да Дубічаў і адначасова паведаміў у Ліду, каб дасылалі дапамогу для акружэння Нарбута.

Вечарам 21 красавіка жыхары Ліды заўважылі пэўны рух сярод маскоўскага войска. Адзін з афіцэраў, затрымаўшы на вуліцы Станіслава Калясінскага, завёў яго ў цукерню Андрушкевіча і там пад закуску, нібыта выпадкова, абмовіўся пра тое, што рыхтуецца аблава на Нарбута. Калясінскі зразумеў, што афіцэр, як чалавек добры і сумленны, хоча папярэдзіць пра

пагрозу і небяспеку паўстанцам. Асядлаў сваю адважную выпрабаваную кабылу і пагнаў у Дубічы. Ужо світала, калі праехаўшы некалькі міль, амаль на апошняй вярсце пачуў стрэлы.

Прыехаў запозна!...

Прыгнечаны павярнуў да Плашак, урадавай фермы, якую арандаваў адзін з Краінскіх. Другі брат быў у лагеры Нарбута. Знясіленая кабыла Калясінскага пала каля ганка. У двары з-за стрэлаў пачыналі абуджацца. Задыханы малады чалавек уварваўся ў пакой.

У маўчанні, якое перапынялася шэптам ружанца і ўздыхамі, сям'я разам з Калясінскім у роспачы чакала звестак з поля бітвы. Хвіліны здаваліся гадзінамі...

Раздзел X

У Шаўрах. Паход Манчунскай у лагер. Апошнія хвіліны Нарбута. Разгром пад Дубічамі.

У Шаўрах жылі надзеяй! Стары Тэадор Нарбут, даследчык Літвы, знаходзіўся ў Вільні ў жонкі Людвіка, куды яго адвезла сям'я, каб пазбегнуць збыт моцных для 80-ці гадовага старога хваляванняў, а таксама таму, што яго адсутнасць дазваляла больш свабодна і актыўна прымаць удзел у паўстанчым руху.

Сувязь паміж дваром у Шаўрах і пушчай была пастаяннай. Людвік Нарбут высылаў з лагера да сястры Манчунскай розныя каманды і загады, якія яна выконвала дакладна, без аглядкі на розную небяспеку. Яна таемна перадавала ў лагер сакрэтныя дакументы і інфармацыю, ежу і адзенне, а калі і амуніцыю. Мела на вёсках адданых справе людзей, мела сваіх шпіёнаў і засакрэчаных сувязных, паслугамі якіх карысталася ў выпадках, калі сама не магла дайсці.

З мужчынскай адвагай, па-рознаму апранутая, Тэадора Манчунская не раз падвяргала сябе вялікай небяспецы, але заўсёды шчасліва абмінала пагрозу. Напярэдадні бітвы пад Дубічамі выбралася ў лагер да брата. Павінна была прайсці некалькі міль прасторы ноччу, але яе гэта ўвогуле не палохала.

Пра гэты паход пані Манчунская расказвала так: *«... Дзень 21 красавіка ўжо скончыўся. Было ціха, вясновая ноч поўная таямнічага шуму і шолаху... У леснічоўцы перад хатай лесніка Баняшкі, старога слугі Нарбута, стаяў вазок, нагружаны бялізнай, адзеннем, ежай... была там і чамарка для камандзіра, падбітая аўчынай, і шаўковая кашуля, пашытая суседскімі дзяўчатамі для маладзенькага Баляслава Нарбута і шапачка, абяцаная Андрыёлі».*

Везла яна таксама розныя лекі, а таксама сігары і ліст ад жонкі Людвіка. Найважнейшымі з'яўляліся паперы з Вільні — танюсенькія лісты, абрыўкі якіх можна было лёгка схаваць, і трошкі залатых манет. Гэта былі першыя

грошы, якія Народны ўрад перасылаў Людвіку. Да гэтага часу паўстанне фінансавалася ўласнымі сіламі: праз зборы і ахвяраванні, якія праходзілі праз рукі Манчунскай. Яна іх адсылала ці адвозіла ў лагер, у сваю чаргу атрымлівала квітанцыі, завівала іх у алавяную паперу і ў бутэльках закопвала ў шаўроўскім садзе. На патрэбы паўстання пані Манчунская выдала ўвесь свой пасаг, што складаў дзве тысячы дукатаў, і грашовую дапамогу, якую атрымала пасля смерці мужа.

«Вазок стаіць гатовы. Начныя цені атулілі зямлю. Са сваім скарбам я рушу ў Дубічы да незнаёмага лесу, кіруючыся адзіна падказкамі пачцівага Баняшкі.

Каштанка не мела падкоў, і колы не былі акутыя, таму можна было ехаць ціха…

Перажагналася і, прамаўляючы любімую бацькам даўнішнюю малітву «Бог — наша прыстанішча і сіла…» выправілася ў дарогу», — расказвала сястра Людвіка.

«Пазбягаючы шырокіх шляхоў, выбірала вузкія сцяжыны. І хоць я была адна, не адчувала ніякага страху. Думка аб паслузе брату і народу, якую я рабіла, напаўняла сэрца хутчэй радасцю і весялосцю. Па пясках, лясным моху і верасе ціха рушыў наперад мой вазок. Старанна абмінала паселішчы, бо паўсюдна па вёсках стаялі загародкі — шлагбаумы.

Вось у начных ценях замаячыла перада мной вялікая вёска, з аднаго боку балота, з другога бездарожны выган, так як амаль ва ўсіх нашых вёсках. Абмінуць цяжка.

Вырашыла ехаць дарогай па сярэдзіне вёскі… ціха адчыніла першую браму, другую, зачыненую плеценым вянком… цішыня паўсюдная, не абудзіўся ніхто, ні адзін сабака не забрахаў. Пацягнула лейцамі Каштанку і… мінула ўжо апошнюю браму… у рагатак нікога.

Перада мной у начной цемры ўжо вырысоўваюцца контуры старой плябаніі ў Дубічах.

Паўсюль ціха і цёмна, але каля брамы мяне чакае мой праваднік — каваль. Без слоў узяў каня, навязаў, кінуў яму сена, падсунуў вядро з вадой. Забраў больш цяжкія пакункі з воза, мне аддаў драбнейшыя… подбегам мы дабраліся да лесу. Тут ужо было бяспечна. Лес! Гэта апякун! Сябар! Атуляе і абараняе!

Адзін паўстанцкі пікет, другі …, прамаўляю пароль. Ужо бачу Людвіка …, ён сядзіць абапёршыся аб сасну, двое паўстанцаў са зброяй стаяць каля яго. Хвіліна — і я падаю да яго ў абдымкі, найперш аддаю танюсенькія паперкі і манеты з Вільні, затым ліст ад жонкі і сігары. Раздае таварышам. Потым пры вогнішчы прачытаў паперы, пералічыў грошы. Было дзвесце штук залатовак. Усміхнуўся і сказаў мяне: «За маю галаву болей дадуць. Гэтыя панове пільнуюць мяне дабраахвотна, змяняючыся што гадзіну.»

З удзячнасцю паціснула далоні незнаёмцаў. Пачалі збірацца старшыні: двое Краінскіх і некалькі іншых.

— Гэта звяз маёй будучай кавалерыі, — адазваўся Людвік. — Нядаўна двое з іх конна падманулі цэлы эскадрон расейскіх драгунаў. А гэта браты Бразоўскія, твае танцоры, — прадстаўляў тых хто падыходзіў, — а вось і Андрыёлі, якога ты нядаўна з іншымі вільнянамі прывяла ў лагер.

Мы пачалі свабодна размаўляць і жартаваць. Андрыёлі непрызвычаены да лясного жыцця уздыхаў:

— Ах! Выпіць бы гарбаткі пад дахам, седзячы ўтульна пры стале….

Атрымаў бы катар, як Душман[1], які выспаўся аднаго разу пад дахам, — прамовіў Людвік. — Мы прызвычаеныя да лесу, і здароўе нам служыць.

У лясной глыбіні запалілі невялікі пучок агню для мяне і лідара. Спытала Людвіка:

— Хто найбольш баявы?

Яго адказ магла данесці жонкам, сёстрам і паненкам у ваколіцы, бо ведала што многа паўстанцаў было з нашай стараны. Людвік хвіліну памаўчаў:

— Трыцкевіч, Пілецкі і брат наш Болесь. Заўсёды рвуцца наперад, засланяюць мяне ў сутычках.

Расказвала Людвіку, што пра яго гавораць. Станавіўся легендарным.

— Найгорш — сказаў — тое, што кажуць пра тысячы маіх байцоў. Непрыяцель сцягвае што раз большыя сілы. Апошні раз нас трымала ў аблозе ажно шэсць тысяч з гарматамі. Трэба пусціць пагалоску, што у нас вельмі мала людзей.

Тым часам маю ўвагу прыцягнуў незвычайны цырыманіял. Уначы на фоне лесу сярод зялёных карунак галін ксёндз Гарбачэўскі ў белай комжы і арнаце свянціў касу. Гледзішча было насамрэч цікавае!..

Мне прыпомніўся кафтан са скуры лася на ксяндзы, у якім ён з амбона адразу пайшоў ў лес пасля агалашэння Народнага Маніфеста. Ці носіць яго пад комжай?…

На развітанне Людвік нічога не гаварыў мне пра свае намеры, толькі сказаў:

— Не даю табе ніякіх загадаў, вяртайся той жа дарогай. Мы пасунемся бліжэй да Дубічаў. Там нам прыгатуюць хлеб, можа пойдзем на Гародню. З Дубічаў атрымаеш вестачку, а гэтыя пячоначнікі[2] — дадаў, падаючы мне букет кветак, — завязі жонцы і бацьку.

Мы развіталіся…

Краінскія перадалі мне лісты да жонак, напісаныя алоўкам на кары.

— Першы дзясятак правядзе маю сястру праз пікеты, — загадаў Людвік.

Выступіла жменька маладых людзей, сярод якіх быў Андрыёлі, Пілецкі і некалькі лідзян. На развітанне акінула лагер вокам. Усе твары былі спакойныя, але каля пікетаў адчуваўся нейкі насцярожаны парадак. Пароль: «Толя». Спыніліся перад глыбокім ровам поўным вады.

---

[1] Невядомая асоба. — *Л. Л.*

[2] Кветкі Hepatica — *заўвага перакладчыцы.*

— Зрабіць насілкі, — выкрыкнуў нехта. — Перанясём пані.

Але каваль, які ўжо чакаў, падхапіў мяне на рукі і так перайшоў роў.

— Ну што вы, панічы? — пракрычаў з іроніяй.

Пачуўся сігнал: свісток. «Панічы» заспяшаліся ў лес. Каваль хапіў мяне за руку і пацягнуў, шэпчучы:

— Хутчэй, хутчэй з лесу, ужо світае.

Беглі. Можа праз чвэрць гадзіны пачуліся грымоты, штосьці падобнае на гром. Каваль уздрыгнуў і пабег яшчэ шпарчэй. Зноў… нібы трэск дрэва, нібы грукат возу на мосце з бярвення… каваль здрыгануўся і прыспешыў хаду… Мне ўжо не хапала дыхання, не магла зразумець, што гэта ўсё азначае… пытаць не асмельвалася. Прыйшоў на памяць доктар Рэніер[1] *— ахвяра часоў Канарскага, які меў звычку казаць:*

— Не пытацца пра лішняе, не больш за тое, што неабходна. Прозвішчы, даты вырываць з памяці, таму што, калі цябе схопяць, ты можаш у сне, у стане гарачкі выдаць.

Болей не пыталася. Падобна на тое, што каваль вызнаваў такія ж прынцыпы, таму не прамовіў ні воднага слова. Мы дабеглі да нашага вазка, моўчкі каваль упарадкаваў сядзенне і запрог каня — вырушылі.

Пачынаўся белы ясны вясновы дзень. На дарозе нас сустрэла нейкая незнаёмая паненка… мела ўстрывожаныя вочы і валасы не ў парадку. Затрымалася прамовіўшы:

— Не пушчу пані адну, паеду з паняй…

Я ўжо звыклася з тагачаснай экзальтацыяй жанчын і шанаваннем майго брата, таму адазвалася спакойна:

— Не час на чуллівасць, але калі пані мае дабрату, дык прасіла бы перадаць Краінскім, у гэты двор, направа, лісты, якія вязу з лагера, гэта мне вельмі скароціць час.

Паненка паглядзела на мяне непрытомным позіркам…

— Няхай пані ідзе напрасткі, — дадала. — Тут дарога робіць вялікі круг…

Узяла лісты, хацела штосьці сказаць, але павярнулася і памчала як страла.

Паглядзела ёй услед і паехала далей. Вярталася простай шырокай дарогай. Адчувала сябе ў бяспецы, таму што пры сабе не мела нічога кампраметуючага… Конь жвава бег дадому. Яшчэ некалькі бродаў, адна горка, другая і ўжо наш лясок. Перад хатай стаіць ляснік Баняшка, увесь заліты слязьмі!.. Што здарылася?! Ускочыла ў хатку… там… Болесь! … абарваны, акрываўлены…

[1] Генадзь Кісялёў пісаў: «Рэніер Мамерт — доктар, сябар беларускага рэвалюцыянера і паэта Ф. Савіча. У 40-я гады разам з братам Аніцэтам абвінавачваўся ў сувязях з эміграцыяй і рэвалюцыйнай прапагандзе. Пісаў па-беларуску». Гл: Пачынальнікі: З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Укл. Г. В. Кісялёў. Мінск: Навука і тэхніка, 1977. С. 236. — *Л. Л.*

— Людвік забіты, — выбухнуў здушаным голасам. Свет пацямнеў, вочы перасталі бачыць! Я толькі што з ім была! Але ж гэтыя грымоты… гэты трэск… нарэшце я зразумела. Павольна вярталася памяць, а з ёй… Маці!…

Кінулася да дзвярэй, спяшаючыся да свайго двара. Да яго было каля палову вярсты… белы… ціхі!…

Прабегла сені і сталовую з партрэтамі Нарбутаў.

Здавалася, што глядзяць на мяне са сцяне здзіўленым позіркам. Спынілася на парозе матчынага пакою… і скамянела… Страшная вестка дабегла сюды хутчэй за мяне!

Маці глядзела на мяне выцвілымі вачыма, твар мела бледны, сівыя валасы распушчаныя… Скочыла да мяне і адразу з крыкам падалася назад… Мне падалося — яна звар'яцела.

Стаяла на парозе як прыкутая… праз некаторы час маці наблізілася да мяне, дакранулася сваёй рукой майго твару… свядомасць вярталася, у вачах ужо быў толькі бязмерны сум і незвычайная пяшчота.

Кінулася да яе ў абдымкі. Ціхі плач прынёс нам невялікую палёгку. Маці, ведаючы, што я паехала ў лагер, была ўпэўнена, што я загінула разам з Людвікам. Пабачыўшы маю постаць вырашыла, што гэта толькі мой прывід… аплаквала дваіх дзяцей.

— Ах! Якое шчасце, — паўтарала маці, нібы шукаючы ў гэтым уцехі. — Ты засталася жывая, і Людвіка не ўзялі жывым.

— Пайду шукаць яго цела, — сказала я і зноў запяшалася ў Дубічы.

Раздзел XI

Смерць лідара і яго дванаццаці таварышаў. Базыль і Цімафееў. У Палашках.

У папярэднім раздзеле амаль даслоўна было прыведзена апавяданне пані Манчунскай, відавочцы апошняй ночы ў лагеры Нарбута перад бітвай пад Дубічамі. Ён не быў у стане апатыі, за каторую яго ў той час асуджалі, але меў дрэннае прадчуванне, бо гаварыў сястры пра новы загад, які яна яму прывезла:

— Не дадуць мне яго выканаць, крук ужо заклекатаў над маёй галавой.

Гэтыя словы, перавернутыя на жарт, не выклікалі трывогі на фоне агульнага даволі спакойнага і добрага настрою. Развітаўшыся з сястрой. Нарбут выйшаў на ўскраек лесу і сеў пад дрэвам. Яго ад'ютанты і асабліва Краінскі, як бы прадчуваючы няшчасце, хацелі перавесці лідара ў больш бяспечнае месца. Аднак Нарбут не пагадзіўся і застаўся ў суме і задуменні. Можа ў думках бег да каханай жонкі і сямейнага вогнішча, а можа апанаваў яго перадсмяротны сум, як гэта часта бывае з некаторымі людзьмі перад сконам.

Увогуле ён не ведаў пра тое, што Базыль павярнуў Цімафеева з дарогі, калі той адступаў ад Дубічаў, не ведаў пра яго здраду, пры тым што той знаў усе пераходы паміж багнамі да лагера паўстанцаў.

Ужо потым расказвалі, што на возеры бачылі лодку і двух чалавек. Падобна на тое, што гэта былі Цімафееў з Базылём, які паказваў ваколіцы і даступныя дарогі. Хтосьці з паўстанцаў хацеў па іх стрэліць, але Нарбут забараніў, бо думаў, што гэта могуць быць тутэйшыя сяляне-рыбакі.

Здаля ў перадсвітальным змроку сярод балот замаячылі цені, падобныя на постаці людзей.

Андрыёлі першы звярнуў на гэта ўвагу.

— Сяляне нясуць хлеб, — спакойна нехта пракаментаваў.

— Замнога чалавек! — заўважыў Андрыёлі.

Камандзір падняў да вачэй бінокль.

— Спадарства, гэта ўзброеныя людзі, — выгукнуў ён. — Але яшчэ не страляць!

У лесе раздаліся нягучныя сінгалы, атрад займаў баявую пазіцыю. З ранняй імглы вынырвалі чалавечыя постаці адзетыя як бы ў сялянскія сярмягі…

— Жаўнеры ў шынялях!, — крыкнуў нехта.

Нарбут, як расказваў сведка Паплаўскі, яшчэ стаяў з біноклем, калі з боку ракі, са стараны, з якой зусім не чакалі небяспекі, выгукнулі стрэлы. І адразу другі залп з іншага боку — патрапілі ў засаду, яны былі акружаны… пачалася паніка.

— Спадарства, халаднакроўна адстрэльвацца і адыходзіць назад, — скамандаваў Нарбут. — У рассыпную! — дадаў яшчэ, але яго голас заглушыў гул бітвы. Раптам камандзір захістаўся… і ўпаў. Андрыёлі і Пілецкі кінуліся яму на дапамогу, але атрымалі раненні і вымушаны былі саступіць сваё месца іншым, якія ўчатырох падхапілі Нарбута, каб вынесці яго з лініі агню ў больш бяспечнае месца.

Частка аддзела разбеглася па лесе, а тыя, хто нёс камандзіра — Пакемпіновіч, Леан Краінскі, Аляксандр Бразоўскі і Стэфан Губарэвіч, упалі на зямлю мёртвымі.

У імгненне вока, тых, хто паваліўся на зямлю, змянілі чатыры іншых таварышы: Францішак Бразоўскі — брат Аляксандра, Уладзімір Паплаўскі, Уладзіслаў Жаброўскі і Станіслаў Ёдка.

Гэта ім сказаў Нарбут:

— Пакіньце мяне, панове, ратуйце ўласнае жыццё.

Але кулі забівалі іх па чарзе. З бязмежнай адданасцю, месца забітых займалі іншыя паўстанцы. Паспелі аднесці Нарбута толькі на невялікую адлегласць і новая куля трапіла яму ў шыю. Стрэл быў смяротным. Камандзір змог толькі прамовіць:

— Паміраю за Айчыну! — … і сканаў…

Гэта былі яго апошнія словы. Разам з ім загінула і тая трэцяя чацвёрка маладых людзей, якая коштам свайго жыцця ратавалі камандзіра. Гэта быў цвет моладзі з землеўладальнікаў Лідскага павета, верных да апошняга дыхання ідэі, за якую змагаліся, і лідару, які іх вёў.

Вось іх імёны:

1. Леан Краінскі з Грачанішак Лідскага павета;
2. Стэфан Губарэвіч, сын Станіслава з Галавічполя;
3. Уладзіслаў Жукоўскі з Ляцка;
4. Аляксандр Бразоўскі і
5. Францішак Бжазоўскі — сыны Аляксандры з Бейнаровічаў і Францішка, жыхары Гурнафеля; старэйшы Аляксандр скончыў медычную навуку, а малодшы вывучаў яе на другім курсе;
6. Скірмунт з Піншчыны;
7. Лукашэвіч з Міцкунцаў;
8. Юзаф Пакемпіновіч, студэнт з Кракава;
9. Уладзімір Паплаўскі;
10. Пётр Янкоўскі;
11. Генша з Міцкунцаў;
12. Станіслаў Ёдка з Петрашанцаў.

Пра апошняга апавядалі, што перад тым як пайсці з дому ў паўстанцкі атрад, ён быў на пахаванні ў Палашках у Адольфа Краінскага. Там, адна з паненак разгледзела на яго адзенні чырвоную пляму на грудзях, і паказала гэта іншым. Некалькі асоб гэтую пляму таксама разгледзелі. Пляма знікала, калі набліжаліся да Ёдкі, і выразна бачылася на адлегласці. Каб не ствараць дрэннага ўражання, яму пра гэта ніхто не сказаў, але тыя, што разгледзелі злавесны знак, зрабілі сумныя высновы пра яго лёс. Цяжка паранены пад Дубічамі Станіслаў Ёдка, звярнуўся да аднаго з таварышаў: «Маю пры сабе трошкі грошай, вазьміце, каб не трапілі ў рукі маскалёў...» Не дакончыў... расійскі багнет ударыў яму грудзі. Калі на полі бітвы былі знойдзены парэшткі Станіслава Ёдкі, дык на яго грудзях убачылі глыбокую рану, якраз у тым самым месцы, дзе раней бачылі яе выяву.

Параненыя і захопленыя ў палон былі:

1. Уладзіслаў Клімантовіч;
2. Нікалаі, былы капітан[1] расійскіх войск;
3. Кіпрыян Пясецкі — доктар, і іншыя.

[1] Нікалаі Уладзіслаў, насамрэч былы падпаручнік Нарваўскага палка, шляхціц Віленскай губерні, паранены ў бітве пад Дубічамі, трапіў у палон, 13 верасня 1863 г. расстраляны ў Вільні на Лукішскім пляцы. — *Л. Л.*

У пагроме ацалелі: Геншаль, Тэадора Манчунская, ксёндз Гарбачэўскі, Францкевіч, Пётр Паплаўскі, Андрыёлі.

Адразу ж па заканчэнні бітвы маскоўскія жаўнеры, як шакалы, кінуліся абдзіраць дагала параненых і забітых. Яны яшчэ не былі ўпэўнены ў тым, што забілі самога Нарбута, але ўжо гучала радаснае «Ура!» Крыкі салдат мяшаліся з краканнем варон і крукоў, якія зляцеліся на жор.

Лес прыцішыўся і як бы знямеў ад жаху. Дробныя птушкі адляцелі, пакінуўшы свае вясновыя гнёзды. Сонца на хвіліну абліло апошнімі прамянямі лясную паляну на якой скончыўся бой, адлюстраваўшыся ў вялікіх лужынах крыві і зноў схавалася за аблокі. Потым неба над беднай гаротнай зямлёй і над яе вернымі сынамі заплакала вялікімі кроплямі дажджу. Гэтак закончылася 22 красавіка (4 траўня) трохмесячная партызанка Людвіка Нарбута. Ён скончыў сваё пакутніцкае жыццё, прысвечанае ідэі вольнасці. Герой Літвы, гонар Ліды, адзін з самых адважных кіраўнікоў паўстання, найвысакароднейшы з людзей і лепшы сын нашага Краю.

Па заканчэнні бітвы здраднік Базыль у якасці узнагароды за галаву Нарбута пачаў дамагацца ў капітана расійскіх войскаў Цімафеева абяцаную тысячу рублёў. Афіцэр з агідай, як сабаку, кінуў яму трохрублёўку, сказаўшы: «Не успеешь и этого пропить, мерзавец».

Цімафееў разумеў, што чакала здрадніка. Хутка пасля паразы пад Дубічамі ў Лідскім павеце, як пярун, з'явіўся Парадоўскі (псеўданім «Астрога»), павесіў Базыля Карповіча на шыбеніцы.

У Палашкі, дзе ў Краінскіх[1] чакаў вестак з поля бітвы Станіслаў Калясінскі, яе рэха дабегла з хуткасцю маланкі. Хтосьці ціха пастукаў у вакно, і нечыя збляднелыя вусны расказалі пра разгром. У доме Краінскіх запанавала жалоба. Безнадзейная роспач ахапіла сэрцы, таму што ў смерці Нарбута ўсе ўбачылі паразу Лідскага паўстання.

Раздзел XII

На полі бою. Ахвяры з Дубічаў. Пахаванне. Пані Табенская. Жалоба ў народзе. Пані Бразоўская. Нечуваныя абвінавачванні. Песні і легенды пра Нарбута.

Звяртаемся ізноў да апавядання спадарыні Манчунскай пра бітву пад Дубічамі.

«Пасля ранішняй паездкі гнала да Дубіч па другім разе. Па конях! Па конях! У вёсках паўсюдна адкрывалі мне брамы і рагаткі. Жанчыны плакалі і прыгаворвалі: «Забіты! Забіты!...» Бліжэй да Дубіч усё часцей трапляліся

[1] Краінскія паходзілі з Галіцыі. Іх дзед — Тадэвуш Дунін Краінскі асеў у Літве ў палове XVIII ст. Леан, загінуўшы пад Дубічамі, пакінуў жонку Юзэфу са Шчукаў і некалькі дзяцей. Яго маёнтак Грачанішкі ацалеў амаль што цудам. Яго Брат — Адольф з Палашак, быў зняволены і высланы ў Варонеж, дзе і памёр.

атрады расійскага войска… конныя і пешыя, а на вуліцы ад касцёліка да кладкі над Котрай, якая вяла проста ў лес, сабраўся такі тлум жаўнераў, што ехаць стала немагчыма. Сцяна жаўнераў перагарадзіла мне дарогу. Моцна закрычала: «Сястра Нарбута! Шукаю яго цела. Хачу яго пахаваць!» …

Нехта голасна спытаў: «Что она говорит?» Да мяне падышоў Цімафееў. «Сястра Нарбута, — паўтарыла. — Шукаю брата». Прылажыў, салютуючы, руку да галавы: «Мы брата Вашего уважаем как настоящего солдата… Расступиться!»… — крыкнуў жаўнерам. Падаў знак рукой. Шэраг раздзяліўся, і я ўбачыла палянку і голыя абкрываўленыя целы! У маёй галаве пранеслася: «Укленчу перад першым лепшым трупам… скажу што гэта Нарбут. Можа ён жывы, то няхай яго не шукаюць». Але ўжо бачыла Людвіка. Меў рану на шыі. Упала на калені. Сэрца напоўнілася невыносным жалем… Вакол мяне таўкліся жаўнеры, чуліся крыкі: «Нарбут! Нарбут!»

Да гэтага часу яны не былі ўпэўнены, што забілі яго, і толькі цяпер узняўся крык: «Это я его убил. Нет, это я доколол!» Гэтак яны спрачаліся і што раз шчыльней атачалі мяне. Мне здавалася, што прыйшла мая апошняя хвіліна. І тут пачулася каманда — паміж мной і жаўнерамі праціснуліся багнеты… Уздыхнула. Афіцэры сталі каля мяне, а войска атачыла труп навокал.

Праз шэрагі войска з плачам праціскаліся сялянкі з грубымі самаробнымі кашулямі, каб прыкрыць аголеныя целы. «Не плачце пры ворагу!» — закрычала я, трацячы розум ад болю.

На маё шчасце паявілася Тоня Табенская[1]*, якая на той момант знаходзілася ў Шаўрах. — «Ціха… ціха… Адсочваюць цябе, запісваюць кожнае тваё слова!… Я ўсім займуся!»*

«И вы тоже ищете брата?» — іранічна спытаў Табенскую нейкі афіцэр.

«Яны ўсе мае браты!» — адказала горда.

Ёй дазволілі заняцца пахаваннем забітых, але найперш было загадана тэлеграфаваць да Назімава, каб атрымаць яго дазвол на пахаванне.

Назімаў дазволіў.

Войска выходзіла з Дубічаў.

На вазах, высланых свежай саломай, вывозілі ў плябанію параненых з абодвух бакоў.

За мной пайшоў нейкі афіцэр і пачаў распытваць: «Это Ваша записка была найдена при нём? А деньги — это его деньги?»… і г. д.

[1] Антаніна Табенская, сястра Альжбеты. Абедзве з'яўляліся актыўнымі ўдзельніцамі паўстанчага руху і былі высланыя на Сібір. Антаніна знаходзілася ў Іркуцку, дзе выйшла замуж за Эдварда Лазоўскага. Альжбета працавала настаўніцай у Енісейску. У 1876 годзе вярнулася і пасялілася ў Варшаве. Антаніна потым працавала настаўніцай у Смаленскай губерні, пасля чаго зноў пераехала ў Варшаву. Скончыла свае дні ў прытулку для настаўнікаў. Бацька Табенскіх памёр у турме.

Адчувала, што ад болю і роспачы трачу над сабой кантроль. Кінулася да яго як раз'ятраная ільвіца… афіцэр выйшаў за дзверы… і толькі тады я апрытомнела…

Прыехала пані Краінская шукаць свайго мужа. Затым на пошукі парэшткаў сваіх сыноў прыехала пані Бразоўская. Яна хоць і была зламана асабістай стратай, казала маёй маці: «Такія як мае яшчэ знойдуцца… але хто заменіць сына спадарыні?…» Любоў да Айчыны ў тыя часы верхаводзіла над усім, прыглушала боль страшнай асабістай страты.

Цімафееў дазволіў перанесці на ноч целы забітых у бабінец касцёліка ў Дубічах».

На гэтым перарываюцца ўспаміны спадарыні Манчунскай і далейшыя падрабязнасці чэрпаем з успамінаў спадарыні Табенскай «З долі і няволі»:

«З трупаў лілося столькі крыві, што здавалася яны плаваюць у крывавым патоку.

Касцельныя бабкі абмылі трупы ад крыві, вясковыя жанчыны, з плачам, як па ўласных сынах, накрылі іх сваёй грубай бялізнай і прасцінамі.

Ранкам прыбылі некалькі пань і паноў з суседніх гаспадарак. Прывезлі бялізну і адзенне для забітых, посцілкі і бандажы для параненых.»

Адзін з іх — Уладзіслаў Нікалаі, афіцэр штаба, потым быў расстраляны ў Вільні. Дарма ён уратаваў жыццё. Другі — доктар Кіпрыян Пясецкі, атрымаў выгнанне ў Сібір і памёр у Табольску, пакінуў косці ў чужой зямлі. Пётр Янкоўскі атрымаў вырак на цяжкія работы. Іншых прозвішч пані Табенская не прыпамінае.

«Змрочная сур'ёзнасць ляжала на галовах усіх, хто прыбываў на гэты балючы людскі рытуал… З вялікай роспаччу глядзелі на тое, як палягла моладзь, з якой яны звязвалі так многа надзей, ляжыць, як скошаная трава, на бабінцы касцёла. Тут ляжалі найлепшыя і найшляхетнейшыя сыны Лідскай зямлі, яе будучыня, а можа, і слава.

Ляжаў і ён, камандзір — Людвік Нарбут, у каторым не толькі Ліда, але і ўся Літва страціла свайго самага слаўнага ваяра за вольнасць.

З прыбыўшых на пахаванне спадарынь найбольшую дапамогу аказалі: Тараевічава з Салтанішак і Юзэфа Вісмант — настаўніца.

Нарэшце ўсё падрыхтавана.

Дванаццаць белых нефарбаваных трун былі пастаўлены ў касцёле без катафалку, проста на зямлі і ўтварылі піраміду, верхам якой была абабітая чорным аксамітам труна камандзіра.

Развітаўшыся з нягодамі і цяжкасцямі свайго кароткага жыцця, прысвечанага Краю, якое налічвала крыху болей за 31 гады, спаў ужо ў гэтай труне вечным сном Людвік Нарбут, над дванаццаццю сваімі вернымі таварышамі, а людзі, углядваючыся ў яго дамавіну як у святыню, выціралі заплаканыя вочы і паўтаралі: «Зусім як Хрыстос з дванаццаццю апосталамі».

24 красавіка (6 траўня) з вялікай урачыстасцю адбылося пахаванне ахвяр, палеглых пад Дубічамі.

Прыбылі чатырнаццаць ксяндзоў і каля 200 асоб з тутэйшых землеўладальнікаў.

Тлумы людзей перапаўнялі касцёл, звонку атачаючы яго вялікай рухомай хваляй.

Усе сюды прышлі, каб аддаць пасмяротную даніну пашаны ўлюбёнаму лідару і яго таварышам. Людзі галасілі ўголас, а з грудзей матак, жонак, сясцёр і нарачоных вырываліся раз за разам балесныя ўздыхі і здушаны енк.

Спадарыня Бразоўская, заліваючыся слязьмі, паўтарала: «Вельмі шкадую сваіх дзетак, але яшчэ болей — Нарбута. З ім уся Літва сваю надзею на вольнасць кладзе ў магілу».

Вялікая, загадзя падрыхтаваная магіла, чакала палеглых за вольнасць ваяроў. Усе труны былі пастаўлены ў дол у адзін рад. Лідская зямля прыгарнула сваіх верных сыноў, прымаючы іх у сваё лона на вечны адпачынак.

З пяску, насыпанага жменямі вырас высокі капец, які закідалі вясновымі кветкамі.

Яшчэ не высахлі слёзы ў сем'ях, як гэты курган казакі зруйнавалі капытамі сваіх коней.

Паражэнне пад Дубічамі было сумным фіналам трохмесячнай партызанкі Нарбута. Праходзіла яна ў незвычайна цяжкіх умовах: нястача добрай цывільнай арганізацыі па-за лагерам, непадпарадкаванне аддзелаў і іх слабая падрыхтоўка з-за працяглых маршаў, неабходных каб дэзарыентаваць ворага, нястача зброі і амуніцыі. Атрад Людвіка Нарбута налічваў максімальна да 400 чалавек. Акрамя страт у сутычках, здаралася дэзерцірства сярод маладушных, асабліва пасля абвяшчэння ўрадавага маніфеста, які абяцаў памілаванне ўсім тым, хто са зброяй у руках, або без яе, дабраахвотна выдасць сябе ўладам.

Партызанка ў такіх умовах была свядомым геройскім учынкам, і трэба браць пад увагу яшчэ і тое, што камандзір працяглы час даваў адпор значна больш колькаснаму непрыяцелю і ўдала выслізгваў з яго рук. Сапраўды, расійскае войска дрыжала толькі пры адным упамінанні імя Нарбута. Аднак сілы для барацьбы былі вельмі няроўныя.

У сярэднім аддзел Нарбута стала налічваў 150—180 чалавек. І з гэтай невялікай жменькай людзей ён не мог сам напасці на значна больш колькаснае рэгулярнае маскоўскае войска, лепш узброенае і здольнае ў любую хвіліну ўзмацніцца.

Памяць пра дзеі Нарбута для вольнасці Айчыны, якую ён так горача любіў з самага дзяцінства, застанецца ў людскіх сэрцах навечна і будзе абуджаць вялікую павагу да гэтага чалавека. Боль і горыч ад расчаравання ў

грамадстве з-за няспраўджаных надзей былі прычынамі згасання паўстанцкага руху. Нарбута падазравалі ў тым, што пад Дубічамі паддаўся апатыі і абыякавасці. Вусны прасякнутыя жалем, асуджалі яго за брак энергіі і ўпадак духу.

Гэта былі недарэчныя і беспадстаўныя абвінавачванні. Пра супрацьлеглае сведчыць тое, што Нарбут даслаў Віславуху праз свайго брата Баляслава загад падрыхтаваць харчаванне. Планы і праекты, дасланыя праз сястру Манчунскую ў тую памятную ноч за некалькі гадзін перад апошняй бітвай, у якіх ішла гаворка пра неабходнасць сыходзіць у лясы пад Гародню; нарэшце, напісаны за тры дні да смерці ліст да сваёй жонкі, поўны надзеі на будучыню.

Гэты ліст, захаваны ў «Таварыстве сяброў навукі» ў Вільні і прыводзім яго тут даслоўна:

«Мая найдаражэйшая каштоўнасць!

Дзякую табе за памяць пра мяне. Ліст з-пад тваёй каханай ручкі, напісаны Толем (-) дайшоў да мяне і вялікай радасцю напоўніў маё прагнае сэрца навінамі пра маю наймілейшую котачку. Я ўжо засумняваўся, што ты мяне кахаеш, але Толя запэўніў, што памятаеш пра мяне і перадаеш, што кахаеш яшчэ мацней. Гэта мяне вельмі цешыць і дадае сілы выносіць пакуты дзеля Айчыны і цябе, мая Амелія! Бясконца рады, што тваё здароўе, мая маленькая, паляпшаецца. Я таксама не магу наракаць. Як там Пятрушак і Уладзюшак (—) і іх прыяцелька Жалігоўская — (словы нечытэльныя), айцу Серафіну, сп. Сафіі, сп. Карнэлю перасылаю найлепшыя пажаданні. Цалую дзетак, а цябе мая наймілейшая, найдаражэйшая, цалую мільён разоў і моцна абдымаю. Часта думаю, мару і сумую па табе. Бог ласкавы, Маці Яго Святая, што апякуецца над нашай Літвой, можа дазволяць яны дачакацца той шчаслівай хвіліны, калі зноў будзем разам і будзем буркаваць і любіць адзін аднаго, дзякаваць Тварцу Найвышэйшаму за ласкі Яго святыя.

Сумна мне, што павінен перарваць мае крамзолі, таму што маю толькі лічаныя хвіліны.

Твой моцна кахаючы і сардэчна прывязаны да сваёй найдаражэйшай
ЛЮДВІК.
1 траўня (19 красавіка).
(-) Тэадора Манчунская
(—) пасынкі Людвіка Нарбута.»

Людзі ў Лідскім павеце яшчэ доўгі час не хацелі верыць у смерць Людвіка Нарбута і спадзяваліся на яго вяртанне. Гэтыя надзеі з'явіліся на падставе розных легенд, якія апявалі чарадзейскую сілу Нарбута, для якога няма нічога немагчымага. Многія з гэтых легенд забыліся або страцілі свой першасны змест. Перакажу адну, якая з'явілася праз некалькі гадоў пасля смерці Нарбута, імя якога народ не мог забыць і звязваў з розны-

мі датычнымі да яго з'явамі. Легенда гэтая захавалася да цяперашніх часоў і гучыць так:

«Скульптур Хрыста было тры. Адна — у Вільні на Антокалі, другая — у Дубічах, у касцёле, трэцяя — недзе ў свеце, невядома дзе зараз валадарыць. Нарбут не загінуў, але пайшоў у свет шукаць каралеўства трэцяга Хрыста, а як знойдзе, дык прыдзе разам з ім адпомсціць за ўсе крыўды і забярэ тады з Начы[1] *фігуру другога Хрыста».*

Праўдападобна гэтая легенда з'явілася ў 1869 годзе, і яна патрабуе пэўнага тлумачэння. У 1869 годзе быў разабраны моцна знішчаны пад час паўстання стары касцёлік у Дубічах, а фігуру Хрыста, якая лічылася цудадзейнай, ксёндз Гінтаўт перанёс да касцёла ў Начы.

Гэта быў балесны ўдар для тамтэйшых людзей, таму што трацілі яны адразу і свой стары малітоўны дом і свайго Хрыста, каля стоп якога ад дзядоў і прадзедаў пакорна схілялі галовы, шукаючы дапамогі і суцяшэння ў кожнай бядзе і смутку.

Смерць Нарбута, разбурэнне касцёла ў Дубічах, перанос так горача шанаванай фігуры Хрыста, злучыліся ў людскім уяўленні ў адзінае цэлае, на фоне якога склалася легенда, прыведзеная вышэй, поўная ціхага болю і яшчэ нязгаснай надзеі.

Мноства песень і вершаваных твораў пра Нарбута курсіравала тады ў Лідскім павеце, але на жаль бальшыня з іх згубілася з людской памяці і страчана незваротна. Гэтыя паэмы і песні склаліся ў людскіх сэрцах і ў пэўнай ступені яны характарызавалі тагачасную эпоху і тагачасныя падзеі. Нічога з таго, што дайшло да нас і што зараз маем пад рукой, не падлягае друку.

Таксама адразу пасля паразы пад Дубічамі быў напісаны гімн у гонар Нарбута. Самаробныя вершаваныя радкі, не заўсёды гладкія, з журботай апявалі гераічную смерць яго і іншых палеглых, пералічвалі ўсіх пайменна і характарызавалі кожнага. Гэта быў плач над магілай камандзіра і над усёй Лідскай зямлёй. Праўдападобна, твор нарадзіўся ў шляхецкім доме і з піетэтам захаваўся да сёння.

Палова веку ўцякло з тых часоў!... І хоць рэха падзей прыгасла, адзываецца яшчэ калі-нікалі не толькі ў сядзібных дамах, але і ў сялянскіх хатах. Трэба яго толькі ўмець выклікаць.

Раздзел XIII

Жменька выжыўшых. Напад пад Ганелькамі. Чароўнае ўратаванне Паплаўскага. Прызначэнне Парадоўскага — «Астрогі». Пакаранне здраднікаў, розныя версіі. Астрога або Віславух. Андрыёлі.

[1] Пасля разбурэння ў 1869 г. касцёла ў Дубічах, фігура Хрыста захоўвалася ў Нацкім касцёле. — *Л. Л.*

Пасля паразы пад Дубічамі частка рассеяных паўстанцаў зноў сабралася пад Ганелькамі і не ведала, што рабіць далей. Аднак раптоўна напаўшы маскоўскі атрад, зноў рассеяў паўстанцаў. У гэтай сутычцы між іншымі загінуў і Тарашкевіч, практыкант Лідскай аптэкі, а паранены ў нагу Пётр Паплаўскі, які жадаў патрапіць у двор Забалаці быў акружаны жаўнерамі сярод балота. Уцякаць не мог, таму, не доўга раздумваючы, стрэліў у бліжэйшага афіцэра. Раззлаваныя жаўнеры кінуліся на Паплаўскага і закалолі яго штыкамі, але не забілі. Вада была за некалькі крокаў ад яго, ён бачыў яе, але сілы да яе дацягнуцца ўжо не было. У страшэнных пакутах чакаў смерці.

Каб пахаваць целы забітых з бліжэйшай вёскі пад вечар прыйшлі сяляне з рыдлёўкамі. Знайшлі Паплаўскага і злітасцівіліся над ім — прыцягнулі воз з саломай і палажылі на яго параненага, але са страху, што ўлады прымуць гэта за знак спачування нават не накрылі голае акрываўленае цела і гэтак везлі яго да Сабакінцаў — уласнасці Шалевіча.

У гэты самы час там знаходзіўся расійскі ваенны начальнік павета Алхазаў. Сяляне, якія везлі Паплаўскага якраз трапілі ў той момант, калі Алхазаў ад'язджаў і развітваючыся з Шалевічам казаў, дзякуючы за гасціннасць: «Чем же я Вам за всё отплачу?» «Аддайце мне гэтага паўстанца, — адказаў Шалевіч. — Вылечу яго або пахаваю», — і паказаў на воз, што стаяў непадалёк на дзядзінцы.

Алзахаў хвіліну павагаўся, аднак кінуўшы вокам на акрываўленае цела, якое ляжала на саломе, ахвотна пагадзіўся, бо меркаваў, што аддае труп, з якім сам меў бы дастаткова клопату. Гэты выпадак уратаваў Паплаўскаму жыццё, бо, дзякуючы намаганням і той увазе, якімі яго атачылі ў доме Шалевіча, змог ён загаіць цяжкія раны і паволі вярнуць здароўе. Хварэў досыць доўга, за гэты час змяніліся расійскія чыноўнікі, і пра яго забыліся. Гэтак шчасліва пазбавіўся далейшага пераследу. Змог дажыць да спакойнага часу, але насіў на сабе памятку аб маскоўскіх штыках: шаснаццаць вялікіх плям.

Другім выжыўшым з аддзела Людвіка Нарбута быў Андрыёлі, гісторыя яго таксама вельмі цікавая. У часе бітвы пад Дубічамі, калі ратаваў параненага камандзіра, атрымаў рану ў руку. Нарбута падхапілі іншыя таварышы, а ён, адчуўшы, што не здольны больш ваяваць, шчасліва выйшаў з-пад агню і трапіў у бяспечнае месца, дзе яго хутка агарнула наша знакамітая клапатлівасць якая ратавала ўсіх выжыўшых.

Хутка пасля пахавання сына Крыстына Нарбут сама адвезла пераапранутага Андрыёлі да бацькоў у Вільню. Калі вылечыўся, дык яго адправілі ў мундзіры марскога афіцэра ў Пецярбург, разлічваючы, што над Нявой будзе бяспечней, чым у Вільні, дзе ён лёгка мог быць апазнаны. Была надзея, што з Пецярбурга Андрыёлі зможа перайсці морам мяжу.

Але шанец здрадзіў. У дарозе да сталіцы нейкі марак убачыў недакладнасць ва імправізаванай форме Андрыёлі і даў знаць пра гэта ўладам. Ён

быў арыштаваны і вернуты ў Вільню ў часы страшэннага мураўёўскага тэрору, пранізаўшага ўсю Літву.

Пачаліся цяжкія допыты следчай камісіі, судовыя паседжанні. Андрыёлі абвінавачвалі ў дзейным удзеле ў паўстанні, прыналежнасці да банды Нарбута, і нават у тым, што ён часова замяняў камандзіра! Быў прысуджаны на смерць, але перад гэтым паўстанца выслалі ў Наваградак на вочную стаўку з другім вязнем. У наваградскай турме, убачыўшы на свае вочы мноства смярцей, Андрыёлі вырашыў паставіць усё на адну карту і паспрабаваць уратаваць жыццё праз уцёкі з турмы.

Знайшоў паразуменне яшчэ з двума такімі ж арыштантамі і чакаў адпаведнага моманту. Аднаго дня ў поўдзень, пад час агульнай прагулкі пад наглядам варты, трое арыштантаў раптоўна ўскочылі на мур, якім быў абнесены падворак турмы. Невялікі спрытны Андрыёлі быў далёка за мурам, калі двое другіх яшчэ пералазілі праз плот. Узнялася вялікая трывога, замяшанне, і гэта дало Андрыёлі час, каб адбегчы ад турмы на значную адлегласць. Калі ахоўнікі кінуліся за ўцекачом, Андрыёлі быў ужо даволі далёка і бег з усяе сілы праз вуліцы горада.

Была зіма, на двары пачыналася завіруха, яна дапамагла арыштанту ўцячы.

Ніводзін з мінакоў не затрымаў уцекача, хаця яны і бачылі жаўнераў, якія беглі за паўстанцам. За горадам завіруха сцірала сляды. Андрыёлі скінуў з сябе цяжкае адзенне арыштанта і ў адной бялізне паімчаўся да бліжэйшага лесу, дзе нарэшце вольна ўздыхнуў.

Ахоўнікі страцілі след уцекача і вярнуліся ў горад. Андрыёлі, каб не замерзнуць, пачаў шукаць сабе схованку. Знайшоў стог сена і глыбока закапаўся ў сярэдзіну. Так правёў ноч, а на досвітку, адчуваючы, што замярзае, зноў пабег. Праз нядоўгі час убачыў фальварак і змучаны, рызыкуючы ўсім, але без роздуму увайшоў у дом чэлядзі. Там быў толькі стары парабак, заняты нейкай работай. Прасякнуты літасцю, ён не выгнаў Андрыёлі а зняў з сябе кажух і загадаў яму адзець, потым даў кавалак хлеба і кубак вады, бо адчуваў голад і смагу ўцекача.

Андрыёлі толькі ў цяпле пачаў адчуваць здранцвелыя канечнасці, але на парозе ўжо стаялі жаўнеры з пытаннем пра беглага арыштанта, якога шукаюць з учарашняга дня.

Селянін, не перарываючы штосьці габляваць, флегматычна адказаў, што ніякага арыштанта тут не было і ніхто яго не бачыў.

— А это кто? — спыталі, паказваючы на Андрыёлі.

— Хворы, — прамармытаў селянін — Трасе яго трасца.

Жаўнеры задаволіліся адказам і выйшлі. Гэтак дзякуючы добраму чалавеку, Андрыёлі быў выратаваны. Потым селянін адвёз Андрыёлі з адмарожанымі рукамі і нагамі ў Вільню да бацькоў, і так гэта зручна і асцярожна зрабіў, што ахова нідзе не звярнула на іх увагу.

У Вільні ў часы страшнага тэрору знаходзіцца параненаму было небяспечна. Здрада і шпіянаж, які добра аплачваўся, запаўзалі ў кожны кут. Бедныя бацькі Андрыёлі вымушаны былі замураваць сына ў каміне, куды праз дзверцы падавалі яму ежу і лекі. Гэта быў не першы такі выпадак у нашым Краі.

Жаданне выратаваць сваіх блізкіх нараджала дзіўныя месцы схованак для тых, хто аказаўся пад перасследам. Дзякуючы гэтаму ацалелі многія, каму наканавана была непазбежная згуба.

Як толькі Андрыёлі стаў мацнейшы і здаравейшы, ён, адзеты як «кацап» (г. зн. як старавер — гэтак мясцовы люд называў каланістаў з Волгі, якіх насадзіла тут яшчэ Кацярына II), з возам льну выехаў у Рыгу. Стараверы пераважна гандлявалі льном, які ў вялікай колькасці выраблялі ў нашай старане.

«Кацап», які вёз цалюткі воз гэтага тавару не выклікаў у дарозе ніякага падазрэння і шчасліва даехаў да Рыгі. Там Андрыёлі ўдалося праслізнуць на карабель. Дабраўся да Капенгагена, а адтуль праз Англію пераехаў у Парыж, дзе ўжо змог спакойна адпачыць. У Парыжы Андрыёлі сустрэў шмат знаёмых і сяброў, між іншымі і сястру камандзіра — спадарыню Тэадору Манчунскую, якая на радзіме знаходзілася пад часовым арыштам, але змагла шчасліва ўцячы за мяжу.

У кароткія часы побыту ў Парыжы, трымаючы ў памяці свежы вобраз крывавай сцэны ў полі бітвы пад Дубічамі, Андрыёлі перанёс яе на палатно пад назвай «Смерць Нарбута» і захаваў нам такім чынам рысы загінуўшага камандзіра, твары яго таварышаў і свае чорныя прамяністыя вочы. Арыгінал гэтай карціны знаходзіцца ў Бацінёльскай школе ў Парыжы.

Грошы Андрыёлі пераважна зарабляў малюнкамі для ілюстраваных парыжскіх часопісаў. Аднак моцна сумаваў па Айчыне. Таму скарыстаўся з першага ж маніфеста, па якім для эмігрантаў, якія вярталіся ў край, гарантавалася адносная бяспека, і паспяшаў вярнуцца на айчынную зямлю. Праз нядоўгі час адбыўся паўторны суд, праз які павінны былі прайсці ўсе паўстанцы. Суд пакараў Андрыёлі ўжо не смерцю, а пажыццёвай высылкай на Сібір.

Быў вымушаны падарожнічаць зноў, але цяпер ужо на поўнач. Пасяліўся ў Іркуцку, дзе было шмат выгнаннікаў. Хутка знайшоў там сяброў і шмат настаўніцкай і афарміцельскай працы. Губернатар запрасіў Андрыёлі займацца малюнкам з яго дочкамі. Цэрквы давалі замовы на маляванне розных «ікон». Хлеба хапала. Аднак шчаслівым адчуў сябе толькі вярнуўшыся нарэшце на радзіму. Далейшы яго лёс вядомы хіба ўсім. Пасяліўся ў Варшаве. Ажаніўся. Супрацоўнічаў з часопісамі, запаўняючы іх сваімі малюнкамі. Вёў жыццё, якое трошкі адпавядала стылю жыцця землеўладальніка. На вялікі жаль, заўчасна памёр ад раку.

Расцярушванне апошняй жменькі паўстанцаў пад Дубічамі зусім супакоіла маскоўскую ўладу. Дзякуючы гэтаму, адважны Аляксандр Парадоўскі, знакаміты пад мянушкай «Астрога», змог незаўважна вярнуцца ў Лідскі павет.

Віленскі аддзел Народнага ўрада паслаў яго, як намесніка Людвіка Нарбута, мяркуючы, што паўстанне ў Лідскім павеце ўдасца падтрымаць і пасля смерці лідара. Парадоўскі меў заданне сабраць рэшткі разбітых пад Дубічамі і знайсці новых паўстанцаў, стварыўшы такім чынам новы аддзел.

Парадоўскі паходзіў з Беразянаў у Галіцыі і прыбыў на Літву па закліку Народнага ўрада, каб узначаліць у Ашмянскім павеце пакуль што малаколькасны паўстанцкі аддзел. Хутка праявіў сябе як здольны арганізатар. Умеў адважна ваяваць і належаў да тых, якія трымаліся як даўжэй і змагаліся да позняй восені.

Высланы на замену забітаму Нарбуту, Парадоўскі павінен быў узняць згасаючы агонь паўстання і падняць народны дух. Заданне было цяжкае. Смерць Нарбута, любімага ва ўсіх пластах грамадства, пасля першых выбухаў болю, як бы замарозіла пачуцці бальшыні, забіла веру ў поспех справы.

Калі Парадоўскі прыбыў з невялікім аддзелам у Лідскі павет, дык адрадзіць нанова паўстанне ўжо было немагчыма. Першымі справамі Астрогі было пакаранне здраднікаў. У Начы ён павесіў пісара гміны Даўнаровіча, хоць, як потым гаварылі, быў не надта і вінен, і Базыля Карповіча, які нават у хвіліну смерці, зласловіў на адрас паўстанцаў, і так з праклёнамі павіс на браме ўласнага двара.

Без весткі прапаў і селянін Талочка, якога падазравалі ў супрацоўніцтве і здрадзе.

Потым Парадоўскі заняўся збіраннем ацалелых пад Дубічамі, з якімі меў намер пайсці ў Гарадзенскую губерню. Не ведаючы ні людзей, ні ваколіц, Астрога безвынікова блукаў сярод лясоў, аж пакуль у нататцы пра асобы, якія маглі б даць яму патрэбную інфармацыю, не знайшоў прозвішча Манчунскай. Змог таемна з ёй сустрэцца. Даведаўся, што пэўная частка ацалелых паўстанцаў хаваецца ў лясах каля Шаўроў пад апекай двара Нарбутаў. Хутка яна звяла яго з братам забітага камандзіра Баляславам Нарбутам, якога выслалі з нейкім заданнем да Віславуха, і ён вярнуўся ўжо пасля пагрому пад Дубічамі. Аднак Баляслаў прабыў у аддзеле нядоўга, таму што быў слабы і нездаровы, вымушаны быў выйсці са справы паўстання.

Тэадора Манчунская дастаўляла аддзелу Парадоўскага ежу і адзенне. Аднойчы яна прыйшла ў лагер Парадоўскага ў той самы час, калі паўстанцаў выкрылі і па іх следу ўжо ішло маскоўскага войска. Аддзел адходзіў у Гарадзенскую губерню. З Манчунскай быў Гажыц, якога прыслалі з Вільні ад Народнага ўрада, каб на месцы спраўдзіць сітуацыю. Вяртаючыся з лагера ў Шаўры, Манчунская і Гажыц ледзь здолелі размінуцца з ворагам.

Парадоўскі, аддзел якога павялічыўся, правёў некалькі вялікіх сутычак, як напрыклад, паміж Доцішкамі і Каркунянамі недалёка ад Шумнай, дзе 24 чэрвеня ваяваў з дзвюма ротамі Паўлаўскага палка пад кіраўніцтвам палкоўніка Уласава і адной ротай Інгермандланцкага палка. З гэтай сутычкі Астрога выйшаў пераможцам. 23 ліпеня Парадоўскі разам з аддзелам Лянкевіча атакаваны маскоўскім войскам каля Азёр у Гарадзенскай губерні. Паўстанцы вымушаны былі адступіць, страціўшы семярых людзей.

У Аўгустове 21 жніўня Парадоўскі разам з аддзеламі Сэндака, Любіча і Лянкевіча браў удзел у бітве пад Мазурышкамі. Астрога трымаў там рэзерв і, толькі дзякуючы яго гераічнай барацьбе і прысутнасці духу, аб'яднаныя аддзелы паўстанцаў былі ўратаваныя.

Хутка пасля гэтага Парадоўскі з'яднаўся з аддзелам Глеба, які паходзіў з Аўгустова. Разам аддзелы налічвалі 230 чалавек. 19 верасня пад Доўгай Вёскай і Мазуркамі каля Сейнаў былі раптоўна атакаваныя дзвюма ротамі пяхоты, 50-ю казакамі і 60 «аб'ездчыкамі» пад камандваннем Нікіціна. Паўстанцы пад кіраўніцтвам «Астрогі» ваявалі, як ільвы. Маскалі панеслі адчувальныя страты. Былі забітыя 2 афіцэры і 20 жаўнераў. Паўстанцы мелі некалькі забітых і параненых. Забітых пахавалі на могілках у Рынгалішках. Аднак потым пад Шлявятамі, 9-га кастрычніка злучаныя аддзелы Астрогі і Глеба былі так моцна прыціснуты князем Баратынскім, што расцярушыліся, каб выжыць.

Парадоўскі здолеў потым уцячы за мяжу. Жыў у Парыжы, дзе ажаніўся з французскай пісьменніцай, якая публікавала ў парыжскіх часопісах цікавыя артыкулы на тэмы французска-польскіх адносін.

Аддзел Парадоўскага — Астрогі ў Лідскім павеце пасля смерці Нарбута называлі аддзелам Віславуха. Магчыма, што падставай для гэтага была распаўсюджаная вестка аб просьбе Нарбута да Віслаўха пра харчаванне.

Раздзел XIV

Ператрус у Шаўрах. Лёс бібліятэкі Нарбута. Уцёкі Манчунскай. Яе наступныя дзеянні. Граф Пшаздзецкі. На Чорным Востраве.

Пасля смерці Людвіка Нарбута пад пераслед улады трапіла яго сям'я ў Шаўрах. Асабліва гэта было адчувальна пасля таго, як у Вільню прыбыў Мураўёў.

Паводле загаду «вялікадзяржаўцы» Літвы за «бандытызм» Людвіка і Баляслава адказваць павінна была ўся сям'я Нарбутаў. Ператрусы раз за разам страсалі жыццё цэлага дома. У той час там жыла толькі Крыстына Нарбут з дачкой Тэадорай Манчунскай і самым малодшым сынам Станіславам, яшчэ зусім малым хлопчыкам, які аднак вельмі перажываў за падзеі на радзіме і ў сям'і, і які ў меру сваіх дзіцячых магчымасцяў аказваў родным розныя паслугі. Не раз, падняўшыся на страху, падаваў сігналы пра блізкую небяс-

пеку. Падчас бесперапынных ператрусаў, смела круціўся сярод жаўнераў і ўмеў зручна прыхаваць прадметы, якія маглі выклікаць падазрэнне.

Стары гісторык Літвы Тэадор Нарбут жыў у Вільні ва ўдавы сына Людвіка ці ў дачі Кунцэвіч, якая таксама жыла ў гэтым горадзе. Адразу сям'я хацела забраць з Шаўроў і маці, каб зберагчы яе ад бясконцых нягодаў і шоку, але энергічная жанчына мужна перажывала розныя беды і была вельмі карысная, калі яе дачцэ Тэадоры трэба было схавацца.

Падчас ператрусаў у Шаўрах варварскаму знішчэнню падверглася каштоўная бібліятэка Тэадора Нарбута і ўсе яго старанна сабраныя за многія гады зборы. У пошуках кампрамату былі парваны і знішчаны многія старыя друкі, рукапісы і рэдкія дакументы. Іх таксама забіралі ў Вільню, каб больш старанна вывучыць. З-за нястачы адпаведных ёмістасцяў усю бібліятэку ўціснулі ў бочкі з-пад квашанай капусты, а тое, што выходзіла за берагі бочак, абсякалі сякерай. Сыпаліся ў бочкі жмуты з найкаштоўнейшых артэфактаў і зборы найкаштоўнейшых гістарычных дакументаў! Сістэма пераследу дапускала такі дзікунскі вандалізм.

Пасля разгляду ў Вільні кнігазбору Нарбута, кнігі адаслалі ў Маскву, дзе патанула бальшыня падобных скарбаў гісторыі і навукі нашага Краю. На шчасце гісторык Літвы не ведаў пра руйнаванне працы свайго жыцця, бо гэта магло стацца прычынай яго смерці. Кватэра жонкі Людвіка Нарбута гэтак жа трапіла пад ператрус, як і ўсе патрыятычныя дамы і кватэры. Але як і ў Шаўрах, гэтак і ў Вільні, не было знойдзена нічога, што кампраметавала сям'ю.

Тэадор Нарбут стаў такім слабым, што амаль увесь час праводзіў у ложку. Мураўёў, у якасці помсты за дзеянні сыноў, загадаў вывезці старога і слабога Нарбута ў Расею. Такія адміністратыўныя загады былі раўнасільныя пастановам суда і практыкаваліся вельмі часта.

Мураўёву данеслі, што Нарбут такі стары і хворы, што хіба разам з ложкам яго можна пасадзіць у кібітку. Увайшоўшы ў запал, Мураўёў загадаў паставіць старога перад сабой. Нарбута амаль што прынеслі на руках. Мураўёў абрынуў на развітанне паток брудных ілжывых слоў, якія зусім глухі стары ўспрыняў абыякава, хаця мог чытаць па губах.

— А знаешь, подлец, — закрычаў напрыканцы Мураўёў, — твой сын убит! Вон! Вон!

І падаў знак вывесці Нарбута.

Гэтае здарэнне яшчэ больш падарвала сілы старога. Праз няпоўны год гісторык Літвы ўжо не жыў. Пераслед з поўнай сілай абрынуўся на сястру Людвіка Нарбута Тэадору Манчунскую. Быў выданы загад на яе арышт. У Шаўры прыбыў ваенны начальнік Алзахаў з атрадам жаўнераў пад кіраўніцтвам двух маладых афіцэраў.

Тэадора ўжо не магла болей хавацца. Маці з дачкой прынялі вайскоўцаў гасцінна. Адзінае, аб чым прасілі: даць магчымасць пераначаваць яшчэ ад-

ну ноч дома. Алзахаў выдаў загады і паехаў, а маладыя афіцэры, змучаныя маршам, ахвотна пагадзіліся на начлег. Дом атачылі казакі і жаўнеры, якіх сыта накармілі і напаілі.

Ахова, сытая і задаволеная, заняла варту пры кожным акне і дзвярах. Пасля багатай вячэры афіцэры выправіліся на адпачынак. Калі ўсё заціхла, Тэадора Манчунская, заўсёды адважная і рызыкоўная (можа верыла ў сваю шчаслівую зорку, якая яе дагэтуль берагла), вырашыла ўцякаць, аб чым папярэдне дамовілася з маці.

Ціхенька адчыніла дзверы, якія вялі ў сад, уважліва прыглядзелася да ахоўнікаў… Жаўнеры спалі стоячы, абапёршыся на свае карабіны. Ніводзін не варухнуўся… У мужчынскім адзенні Манчунская ціха, як цень, збегла з ганку і схавалася за кустом язміну. Ахова спала… Пабегла далей, спынілася каля другога куста. Хвіліну пачакала… Ахова не абудзілася. Тады з усяе сілы маладых ног прыпусціла ўздоўж парэчкавай алеі ў канец сада, пералезла праз стары струхнелы плот і адразу за садам звалілася ў капальні вапны. Вось нарэшце і азёрны чарот над ставам, і далей, далей у лес знаёмай сцяжынай да хаты Баняшкі… Знікла…

На досвітку маці ўзняла страшны крык. Збляднелая, з распушчанымі валасамі пабудзіла афіцэраў воклічам:

— Дзе мая дачка?… дзе дачка? Што вы з ёй зрабілі?…

Афіцэры падхапіліся… Страшэнная мітусня ўзнялася ў доме. Старая Нарбут удала выказвала роспач і крычала:

— Вы яе выкралі, можа забілі або ўтапілі… Аддайце мне дачку!

Сканфужаныя афіцэры кінуліся на пошукі, ператрасаючы ўсе будынкі і ўсе куты… шукалі ў ставе… закідвалі невад.

— Напэўна патанула! — енчыла маці. — Шукайце! Аддайце дачку!…

Шукалі… аднак дарма. Прапала без следу. Гэта затрымала пагоню і дало Манчунскай час для далейшых уцёкаў. Мела тысячы прыгод, спаткала мноства добрых людзей, пераапраналася па дарозе ці то селянінам, ці то сялянкай, ці то заможнай дамай, настаўніцай ці служанкай, гэтак дабралася да Гародні.

Аднаго разу, калі Тэадора была ў мужчынскім адзенні, а яе праваднік падняўся на ўзгорак, каб упэўніцца, што ваколіца вольная ад жаўнераў, падышоў да яе нейкі селянін і, уважліва прыглядаючыся, спытаў: «Часам ці не Нарбут Вы, паніч?» А калі Тэадора запэўніла яго, што Нарбут забіты, пакруціў галавой з недаверам і, уздыхнуўшы, прамовіў: «Гэтак гавораць, але мы ведаем, што ён жывы. Вы да яго моцна падобныя». Калі ў вачах Манчунскай заблішчэлі слёзы, селянін, перажагнаўшы яе, з пачуццём прамовіў: «Няхай Бог дабраславіць Вас, паніч! … Мы ведаем, што Нарбут жывы». Вялікую дапамогу пры ўцёках Манчунскай зрабіла сям'я Боландзяў і шмат іншых асоб, якія перахоўвалі і перадавалі адны другім Тэадору. Усё гэта рабілася ў вялікай таямніцы пад пагрозай страшнай адказнасці. Грамадзян-

скія ўстановы не працавалі, вельмі цяжка было знайсці пашпарт, які б палегчыў уцёкі... Многа разоў Манчунская знаходзілася ў стане роспачы... Здавалася, што ёй ніколі не ўдасца перайсці мяжу.

Пасля многіх неверагодна цяжкіх дзён, яна аказалася на тым баку Нёмана, а потым дасягнула Дрэздана, дзе знаходзілася мноства ліцвінаў, у большыні сваёй эмігранты, якія з вялікімі цяжкасцямі здолелі ўцячы за мяжу. Была вайна! З Дрэздана перабралася ў Парыж, дзе павінна была знайсці сабе які-небудзь прытулак.

Там жыла графіня Пуслоўская — сваячніца па бацьку з дома Нарбутаў. Гэтая пані мела на радзіме славу апякункі над тымі, хто пацярпеў. Сама дзяцей не мела, была досыць заможная, сваю апеку распаўсюдзіла на ўвесь род Нарбутаў і аплачвала са сваіх грошай адукацыю для бяднейшых з маладых Нарбутаў. Яшчэ перад паўстаннем заснавала ў сябе ў гістарычным Воўчыне школку для бедных сваякоў, потым другую ў Мітаве, фінансавала выдаткі на адпаведных настаўнікаў, падтрымоўвала моладзь і выводзіла яе ў свет.

Да каго ж, як не да гэтай сваячніцы, магла падацца Манчунская?... Аднак гэтая пані не прыняла Манчунскую. У расейскай амбасадзе, куды звярнулася пра звесткі аб Манчунскай, не сама, а праз французанку, якая жыла з ёй як кампаньёнка, адказалі: «Гэта — не эмігрант, гэта — паўстанка». Гэтага было дастаткова!... Графіня Пуслоўская ў страсе перад амбасадарам замкнула дзверы свайго дома перад Манчунскай, матывуючы гэтак адказ: «Хіба ты хочаш, каб канфіскавалі мае маёнткі на Літве?»...

Такім чынам Манчунская засталася ў чужым горадзе без падтрымкі. Аднак хутка перад маладой жанчынай адчыніліся дзверы гатэлю Ламбэр — прытулку нашых эмігрантаў. Манчунская аказалася пад апекай графа Чартарыйскага. У Парыжы сустрэла шмат знаёмых па лідскім паўстанні: Геншаля, Парадоўскага («Астрогу»), ксяндза Гарбачэўскага, які жыў з таго, што адпраўляў св. Імшу і намашчаў памерлых, а потым выехаў у Амерыку. Геншаль вывучаў медыцыну і практыкаваў як лекар. У 1870 годзе браў удзел у франка-прускай вайне.

Праз нейкі час, пасля таго як Манчунская апынулася ў гатэлі Ламбэр, яна пазнаёмілася з ксяндзом Ялавіцкім, які актыўна настойваў на тым, каб Манчунская стала манашкай-законніцай. І выстаяла яна толькі дзякуючы апецы княгіні Чартарыйскай з Сапегаў (жонка кн. Адама Чартарыйскага) і графіні Пшаздзецкай (жонка Караля Пшаздзецкага), з якой пазнаёмілася ў гатэлі.

Графіня прапанавала маладой вандроўніцы застацца пры яе маленькіх дочках выхавацелькай. Сродкі Манчунскай былі ўжо амаль вычарпаны і, не жадаючы надалей злоўжываць гасціннасцю князёў Чартарыйскіх, яна ахвотна прыняла прапанову графіні Пшаздзецкай, якая моцна і сардэчна абняла яе і сказала: «Прысягаю, што буду табе сястрой». Пад гэтай прыся-

гай была 37 гадоў. Не разлучаліся аніколі, да дня смерці графіні, якая перад сконам пакінула сваёй названай сястры і шматгадовай кампаньёнцы фінансавае забеспячэнне далейшага існавання.

Граф Караль Пшаздзецкі быў нашчадкам вядомага ў свой час палкоўніка Пшаздзецкага, слаўнага ў 1831 годзе гаспадара Смаргоні (маёмасць канфіскаваная за ўдзел у паўстанні). Яго жонка была дачкой генерала Лахмана, які паводле, Пузырэўскага[1], браў удзел у бітве за Варшаву 1831 г. Яе маці Пашкоўская з Валыні, выхоўвала дачок у польскім духу. Абедзве былі каталічкі. Ян Лахман, праз кароткі час развёўся і ажаніўся паўторна з спадарыняй Бадэн з дому Патоцкіх. Дачка ад гэтага сужэнства была непаўторнай прыгажосці, яна выйшла замуж за Роджэра Рачынскага. Графіня Пшаздзецкая, жонка Караля, таксама вылучалася прыгажосцю і добрым характарам. Была зоркай пры манаршым двары каралевы Яўгеніі. Жыла ў атачэнні найвыбітнейшых людзей свайго часу. Аднак высокае становішча не зруйнавала яе польскі дух. Памерла ў Чорным Востраве на Падоллі, там і была пахавана.

Маёмасць перайшла да Пшаздзецкіх па кудзелі, а праз нейкі час трапіла ў чужыя рукі.

Сярод сямейных партрэтаў у Чорным Востраве Манчунская бачыла партрэт жанчыны з наступным надпісам: *«Народжаная Пшаздзецкая, дачка Радзівіла, унучка Агінскага, праўнучка Вішнявецкага, жонка Чартарыйскага»*.

Тэадора Манчунская пасля смерці графіні не захацела заставацца ў Краі. Заглянула толькі ў Шаўры, дзе была пахавана яе маці, і асела ў Кракаве. Там была аточана людской павагай і мела кола знакамітых сяброў і знаёмых.

Раздзел XV

Арышт і высылка Крысціны Нарбут. Смерць Тэадора Нарбута, гісторыка Літвы. Вяртанне і смерць яго жонкі. Пахаванне ў Шаўрах. Смерць жонкі Людвіка Нарбута.

Уцёкі Манчунскай пасля паўстання не прайшлі беспакарана для яе маці. На немаладую жанчыну наваліліся новыя беды. Любую іншую такія няшчасці бясспрэчна зламалі б, але яе энергічная натура супрацьстаяла ўдарам лёсу.

Аднойчы ўначы яе раптоўна выцягнулі з ложка, не далі нават адзецца належным чынам, і босую без панчох пацягнулі ў лідскую вязніцу. Аказалася, што нехта даў знаць уладам, што ў Шаўрах захоўваецца закапаная ў зямлю невялікая гармата і значная колькасць пораху, пра што Нарбутова

[1] Пузыревский А. К. Польско-русская война 1831 г. С-Петербург. 1886. — *Л. Л.*

нават і не чула. Пасля смерці Людвіка, калі агульная непрыязь пачала ўплываць і на даўнейшыя добрыя, амаль сямейныя стасункі паміж дваром і вёскай у Шаўрах, стасункі гэтыя пачалі паступова псавацца. Дэзінфармацыя пра гармату паходзіла ад сялян.

У турме Крысціну Нарбут падверглі самым суровым допытам. Выклікалі ноччу на допыты перад следчай камісіяй, раптоўна ўрываліся ў камеру і задавалі розныя пытанні, лавілі на слове, прыгняталі страхам і рознымі спосабамі прымушалі пакутаваць. Яе дачка Яна (Кунцэвіч), якая прыехала з Вільні, знайшла сваю моцна хворую маці ў шпіталі.

Крысціна Нарбут вытрымала ўсё. Не вымавіла ніводнага неасцярожнага слова, не выдала нікога, не выдала ніводнага сакрэту. Разгневаны следчы закрычаў: «Павесіць яе, гэтую матку бунтаўшчыкоў! Відаць па яе вачах, што нічога не скажа… Ну, старая, рыхтуйся да смерці!»…

Жанчыну, якая слабела і траціла прытомнасць, адвялі ў камеру, дзе яе ледзь удалося вярнуць да жыцця і зусім слабую вывезці ў Вільню. Аднак ёй для адпачынку далі толькі некалькі дзён пабыць разам з мужам і нявесткай. Пасля цяжкіх выпрабаванняў падчас следства Крысціна Нарбут была асуджана на высылку ў Чанхар Пермскай губерні.

Страшнай была хвіліна расставання немаладых сужэнцаў!…

Мураўёў выбраў удар у самае сэрца, разрываючы гэтую адзіную да труны сівую, як галубы, пару, якая ўсё жыццё пражыла разам…

Развітваліся назаўжды, ведаючы, што ў гэтым жыцці болей ніколі не сустрэнуцца!…

Пасля дэпартацыі жонкі Тэадор Нарбут апынуўся ў стане меланхоліі і згасаў на вачах. Перад самай смерцю дрыжачай рукой яшчэ здолеў напісаць апошні верш:

Ах! Яе ўжо няма, а я знямог, хварэю,
Зраненае сэрца замірае…
Плачу дзень і ноч, ціха слёзы праліваю
Сэнс жыцця журбота адбірае!..
Няма прычыны далей жыць,
Быць адзінокім і самотным.
Найлепей успаміны адпусціць
І супакой знайсці ў магіле!…[1]

Прыгнечаны смуткам, думаючы толькі пра жонку, Тэадор Нарбут ціха згас у Вільні 13 лістапада 1864 года на руках сваёй старэйшай дачкі Яны Кунцэвіч, на Скапоўцы ў доме №5.

[1] Ach! juz jej niema, a ja boleje Serce zranione zamiera… Dzien i noc placze, ciche lzy leje Bolesc mi zmysly odbiera!… Po co mi zyc dluzej z bolu cierniami Samotnym bedac w tej dobie! Mnie znekanemu przypomnieniami Spokoj jedyny juz w grobie!…

Пасля жалобнага набажэнства ў касцёле св. Яна труну з целам гісторыка Літвы перавезлі ў Шаўры і пахавалі на могілках пры касцёле ў Начы. Крысціна Нарбут перажыла мужа на 35 гадоў. Пасля ўсіх балючых і цяжкіх страт на радзіме, яна цягнула сваю самотную долю ў выгнанні. Смерць мужа, непакой аб дзецях... Не зламалі яе ні фізічныя нягоды выгнання, ні небяспечнае падарожжа і нястачы.

З вялікімі цяжкасцямі графіня Пшаздзецкая праз пасярэдніцтва Мезінцава, пазнейшага шэфа жандармерыі, дабілася для беднай ссыльнай скасавання тэрміну. Нарбутовай было дазволена выехаць у Варшаву, куды, каб даглядаць маці, вярнулася і яе дачка Тэадора Манчунская.

У Варшаве яны сустрэлі многа родных і знаёмых з Літвы...

З-над Віслы ўжо было лягчэй перабрацца ў родны кут. І праз некаторы час Крысціна апынулася нарэшце ва ўлюбёных Шаўрах, поўных для яе ўспамінамі пра мінулае. Там 16 ліпеня 1899 года ва ўзросце 100 гадоў спакойна адышла з гэтага свету Крысціна Нарбутова. Праз трыццаць з невялікім гадоў, перад самай смерцю маці, прыехала ў Шаўры і Тэадора Манчунская. Паміраючы, маці дабраславіла яе словамі: «Няхай Бог так цябе любіць, як я люблю цябе».

Пахаваць нябожчыцу каля мужа на могілках у Начы, як яна таго хацела, было забаронена. Улада баялася дэманстрацыі, ксяндзу нават было не дазволена суправаджаць труну з целам.

Сяляне зрабілі гэта, паводле традыцыі: з крыжам і свянцонай вадой, як для сваіх памёрлых... Ксёндз праводзіў труну да брамы, а адтуль сяляне на сваіх плячах панеслі яе на вясковыя могілкі, дзе ўжо спачываў сын памёрлай Баляслаў.

На сціплым надмагіллі маці Манчунская заказала выбіць такія ж простыя словы: *«Маці сыноў. Мела 100 гадоў. Памерла дня 16 ліпеня 1899 года»*.

Нябожчыца Крысціна Нарбут мела звычку гаварыць: «Сыны — гэта мой гонар! Дочкі змяняюць прозвішча».

Жонка лідара паўстанцаў Людвіка Нарбута памерла ў Вільні хутка пасля смерці мужа. Маладзенькі ад'ютант загінуўшага камандзіра паўстання, яго брат Баляслаў, быў, як мы ведаем, пасланы да Віславуха і вярнуўся пасля разгрому пад Дубічамі. З таго крывавага поля, узрушаны да глыбіні душы, вычарпаны і зламаны, аказаўся ў хаце Баняшкі, дзе, як мы ведаем, знайшла яго сястра, якая вярталася з лагера вакольнай дарогай і з яго вуснаў пачула першыя весткі пра смерць Людвіка.

Апека сям'і атачыла маладзёна і іншых пацярпелых і расцярушаных па шаўраўскіх лясах паўстанцаў.

Двор падвяргаўся бясконцым ператрусам і пераследу...

Малады рыцар, нягледзячы на слабыя сілы, надалей рваўся да барацьбы, і як толькі з'явіўся Парадоўскі, адразу ж далучыўся да яго невялікага атрада. Нястача сілы не дазволіла Баляславу суправаджаць атрад да Гарад-

зенскай губерні, куды пасля нядоўгага побыту ў Лідскім павеце, накіраваў сваіх паўстанцаў «Астрога».

У гэты час кузіна Нарбутаў, пані Альшэўская, каб яму было зручней пераехаць за мяжу, вывезла Баляслава ў Друскенікі. Пераслед у Краі нарастаў. Каб палепшыць здароўе, па вечарах Баляслаў веславаў на Нёмане. Удзень гэта было немагчыма, бо яму прыходзілася старанна хавацца.

Падчас аднаго з такіх падарожжаў Баляслава злавілі, збілі, адабралі грошы і кінулі ў вязніцу. Як аказалася: нейкі дапытлівы паручнік (маскаль), прозвішча якога сцерлася з памяці, здаўна пільнаваў Баляслава Нарбута, і, знайшоўшы яго на рацэ, абышоўся з тыгрынай жорсткасцю. Звязанага кінуў яго ў нейкую халупу, дзе той праляжаў, як куль, цэлую ноч. Назаўтра галоднага і слабага, Баляслава пагналі ў Гародню.

Там у турме, у цеснай перапоўненай камеры, прасякнутай выдыхамі і дымам тытуню, аслабелы маладзён страціў прытомнасць. Калегі па няшчасці кінуліся яму на дапамогу, паднеслі да акенца, каб змог дыхнуць свежым паветрам. Фатальныя ўмовы ў вязніцы забілі б вымучанага Баляслава, каб яго не ўратаваў шчаслівы выпадак.

Князь Баратынскі наведваў турму ў Гародні. Увайшоўшы ў камеру, дзе сядзеў Баляслаў Нарбут, адразу адхіліўся назад да парогу, збіты страшным паветрам з камеры.

Загадаў прывесці да яго Баляслава, пра знаходжанне якога ў турме ведаў.

Убачыўшы збляднелага вязня, слабога ў нагах, яго падтрымоўвалі пад рукі жаўнеры, князь Баратынскі падняўся і падсунуў яму крэсла. Сеў пры ім і пачаў распытваць пра ўсё, прасіў не таіцца і гаварыць праўду.

Баляслаў шчыра прызнаўся, што быў ад'ютантам у свайго брата Людвіка, а пасля яго смерці хацеў пераправіцца за мяжу і таму меў пры сабе дастатковую суму грошай, якія адабраў афіцэр пры яго арышце. Расказаў таксама пра брутальнасць затрымання, пра цесную камеру, дзе ўжо месціліся дваццаць другіх вязняў. Вынікам гэтай размовы была значная палёгка для ўсіх арыштаваных.

Князь Баратынскі шчыра заняўся лёсам Баляслава, забяспечыў даволі зносныя ўмовы існавання і ўратаваў ад пятлі, якая гразіла хлопцу.

Баляслаў Нарбут быў асуджаны на выгнанне ў Краснаярск.

На дэпартацыю была асуджана і пані Альшэўская, якая апекавалася ім у Друскеніках.

У Маскву Нарбута прывезлі чыгункай, далейшую дарогу, як і ўсе ссыльныя, ён павінен быў прайсці пешшу па этапе. У Маскве партыя ссыльных, сярод якіх быў Баляслаў, затрымалася даўжэй. І гэта дало магчымасць атрымаць спачуванне ад дачкі турэмнага наглядчыка, якая часта наведвала «бедных палякаў», прысылала ім бялізну, віно, белы хлеб і іншыя рэчы. Урэшце паненка так прывязалася да маладога вязня, што хацела ехаць з ім

у Сібір. Па дарозе каля Табольска Баляслаў напаткаў афіцэра, які яго арыштаваў. Аказалася, што ён быў асуджаны князем Баратынскім, паніжаны ў званні і таксама высланы на Сібір.

Цяжкая дарога, маральная і фізічная стома зусім зруйнавалі здароўе Баляслава.

У Краснаярску ён не мог заняцца аніякай працай, бо пухлі рукі.

І хаця яму і вярнулі грошы, адабраныя пры арышце, запас іх вычарпаўся, а трэба было жыць. Нарбут заняўся дробным гандлем, які даваў такі-сякі даход для жыцця.

Графіня Пшаздзецкая пры пасярэдніцтве князя Арлова, расійскага амбасадара ў Парыжы, атрымала для Баляслава дазвол на вяртанне ў Край. Баляслаў вярнуўся ў цудам не канфіскаваныя Шаўры. Там ажаніўся са сваёй кузінай Габрыэляй Нарбут, дачкой Валерыя Нарбута, уладальніка Капыля.

Памёр ад сухотаў у 1889 годзе, пакінуўшы двух сыноў: Зыгмунта ды Тадэвуша і адну дачку.

Раздзел XVI

Мураўёў. Узнаўленне закрытых спраў. Новыя арышты. Прысуды і пакаранні смерцю. Ксёндз Ішора. Першая ахвяра. Расстрэл ксяндза Фалькоўскага ў Лідзе. Смерць Альберта Лясковіча і ксяндза Зямацкага ў Вільні. Выгнанне. Бальтазар Калясінскі. Падзеі ў лідскім касцёле. Вынішчэнне вёсак і засценкаў.

14 траўня 1863 года ў Вільню прыехаў Мураўёў. Аддзел Віленскага Народнага Урада яшчэ нібыта дзейнічаў.

Першым быў арыштаваным Гажыц, паступова, па-чарзе вылавілі астатніх членаў арганізацыі.

Новы «вялікадзяржаўца» Літвы некалькі дзён у цішы прыглядаўся да сітуацыі.

Перад яго палацам прайшла нейкая легкадумная, але ўжо апошняя працэсія са спевам народнага гімна. Слухаў яго з балкона, але не даваў каманды на разгон. І трошкі пазней са знакамітай лютасцю прыступіў да работы.

Пачаўся страшны пераслед, следствы, прысуды і смяротныя пакаранні. Падымаліся дакументы ўжо скончаных спраў, і следства па іх зноў аднаўлялася. Падлягалі арышту раней вызваленыя ад пакарання, у Вільню вярталі з Расіі асуджаных, каб пакараць больш сурова.

Першай ахвярай Мураўёва ў Вільні 26 траўня стаўся ксёндз Станіслаў Ішора, пробашч з мястэчка Жалудок, асуджаны на смерць за зачытванне ў касцёле Маніфеста Народнага Урада.

Расстрэл ксяндза зрабіў на жыхароў Вільні вельмі прыгнятальнае ўражанне.

Яшчэ больш цяжкае ўражанне мела правінцыйная Ліда, калі 10 чэрвеня каля 10-й гадзіны раніцы смерць ад кулі прыняў ксёндз Адам Фалькоўскі,

пробашч з Ішчалны, які зачытаў з амбона Маніфест. Ён нават не дапускаў за гэта такога страшнага пакарання.

Калі ксяндза пад ахоўвай як вялікага злачынцу прывезлі ў Ліду, ён яшчэ не разумеў, што можа пагражаць смерць. Упэўніўся ў гэтым толькі тады, калі ў турму ў апошнюю хвіліну прыйшоў мясцовы пробашч ксёндз Свірскі, каб спавядаць Фалькоўскага перад смерцю.

З каменным спакоем каплан шасцідзесяці з некалькім гадоў ішоў да месца пакарання на выгане за горадам, дзе пасвіліся яўрэйскія козы. Ішоў сам, нягледзячы на значную адлегласць, і толькі раз у яго падкасіліся калені. Камандаваў атрадам жаўнераў Перасвет-Солтан, афіцэр прапанаваў вязню сесці на вазок, які ехаў за імі. Асуджаны адмовіўся. Хацеў як Хрыстос данесці свой крыж да канца. Збляднелымі вуснамі шаптаў пацеры… а калі голас яму здраджваў і ламаўся, прадоўжыць малітву дапамагаў ксёндз Свірскі, які суправаджаў Фалькоўскага.

Каля слупа быў ужо выкапаны дол. Тлум з простага народу атачаў месца пакарання[1].

Ксёндз Фалькоўскі штосьці прамовіў каля слупа, але барабаны заглушылі яго словы…

Прагучала каманда і выбухнуў залп.

Цела, якое яшчэ торгалася, скацілася ў дол.

У горадзе зараз жа пачалі біць касцельныя званы, і ва ўсіх касцёлах пачалася жалобная імша.

Магілу, насыпаную на месцы пакарання, казакі зруйнавалі з зямлёй капытамі коней.

Жаўнеры штыкамі разганялі тлум людзей, якія ціснуліся да магілы, каб узяць пясок, прасякнуты крывёй расстралянага ксяндза.

Ліда віравала болем і жахам.

Зноў былі арыштаваны Бальтазар Калясінскі, Юльян Лясковіч, Зыгмунд Гадачэўскі, Вільгельм Грабоўскі, Яраслаў Табенскі, Браніслаў Нарбут. Пачалося новае следства. Такі ж лёс напаткаў і Альберта Лясковіча, які знаходзіўся пад арыштам і быў асуджаны на два гады арыштанцкіх рот.

Гэты вырак яшчэ не быў падпісаны Назімавым. Мураўёў скарыстаўся з гэтага і, шукаючы новую ахвяру, прысудзіў амаль нявіннага Лясковіча да смерці. Гэтае самавольства «вялікадзяржаўца» абурыла ўсе пласты грамадства, бо акрамя легкадумнай гаварлівасці за Альбертам Лясковічам не было болей ніякага палітычнага злачынства.

Другі раз Лідскі павет гнуўся пад цяжкай рукой Мураўёва. Першы раз — калі ён быў губернатарам у Гародні, а Лідскі павет уваходзіў у склад Гарадзенскай губерні, і другі — калі сатрап запанаваў над усёй Літвой. Страшэн-

[1] Адам Фалькоўскі нарадзіўся ў 1812 г., то бок у 1863 г. меў каля 50 гадоў — *заўвага перакладчыцы.*

ны боль раздзіраў сэрцы лідзян, бо дзве новыя ахвяры з іх зямлі палі ў Вільні.

На Лукішках у самым росквіце быў расстраляны сын землеўладальніка Альберт Лясковіч і ксёндз Зямацкі, пробашч з Вавёркі, асуджаны за чытанне Народнага Маніфеста перад людзьмі.

Паўторна пад новым следствам у турме апынуліся Б. Калясінскі, Ю. Лясковіч, З. Гадачэўскі, В. Грабоўскі і Бр. Нарбут, потым іх дэпартавалі ў глыб Расіі. Табенскі памёр у турме падчас следства. Адначасова ў асуджаных канфіскоўвалі маёмасць, з чаго, як заўсёды і паўсюдна, карысталіся яўрэі.

Браніслаў Нарбут, вярнуўшыся праз некалькі гадоў выгнання, страціў сваю спадчынную маёмасць Нікадзімава. Яму забаранялася жыць у Літве, і рэшту жыцця правёў, туляючыся ў пошуках працы па розных месцах. Дзяржаўныя пасады для мясцовых былі забаронены, а прыватным бізнесам заняцца было надзвычай цяжка.

Многія з эмігрантаў, для якіх жыццё ў Айчыне было забаронена, паміралі з голаду ў Варшаве, Рызе і іншых гарадах, не маючы сродкаў да існавання і працы. Былі і тыя, хто не знаходзячы хлеба на Айчыне сярод сваіх, паўторна вяртаўся ў Расію. Тагачасныя ўмовы жыцця нараджалі часта страшна трагічныя сітуацыі.

З народных актывістаў, якія разам з Бальтазарам Калясінскім працавалі над свядомасцю людзей і займаліся іх арганізацыяй падчас перад паўстаннем быў і старшыня (войт) Кохан з Дакудаўскай гміны, ён здолеў пазбегнуць пераследу. У той час, як другі старшыня, Марцін Якубоўскі з Тарноўскай гміны, быў асуджаны з-за занадта шчырага прызнання Кашыца.

У Якубоўскага захоўваліся розныя дакументы, зброя і грошы. Аднак ён меў талент, узгадніўшы ўсё з калегамі, зручна ўхіліцца ад падазрэнняў, бо меў неабмежаваны ўплыў на людзей. Калі паліцыя прыбыла для арышту Якубоўскага, ён не страціў розум і здолеў спаліць усе дакументы, аднак схаваць зброю яму не хапіла часу. Пад час следства не здрадзіў і нікога не выдаў. З усёй сям'ёй быў высланы ў Табольскую губерню, дзе ў выгнанні і памёр у 1873 годзе. Ледзь заплюшчыў вочы, як прыйшоў дазвол на вяртанне ў край. Сям'я сумавала па Айчыне і скарысталася з гэтага дазволу. Сыны памерлага Якубоўскага — Юзаф і Ігнат былі абавязаны пісьмова пацвердзіць, што ніколі не будуць мець прэтэнзій да спадчыннай зямлі бацькі, якая была адабрана за ўдзел у паўстанні.

Маладых Якубоўскіх як леснікоў прыняла ахоўваць свае лясы пані Красіцкая і, маючы жаданне хоць неяк кампенсаваць нанесеную ім крыўду, падаравала 30 моргаў зямлі.

Бальтазар Калясінскі праз шмат гадоў ссылкі, атрымаў права вярнуцца з умовай пражывання ў Варшаве. Едучы праз Пскоў, выпадкова сустрэўся з Жамчужнікавым, тагачасным пскоўскім саноўнікам, які ў часы, калі Калясінскі займаў даволі значную пасаду ў Арэнбургскіх стэпах, быў дробным

клеркам і яго падначаленым. Жамчужнікаў захаваў да Бальтазара добрыя пачуцці і, калі даведаўся, што вяртанне ў Варшаву не радуе Калясінскага, прапанаваў яму даволі добрую пасаду ў Пскове, а калі быў прызначаны на пасаду губернатара Вільні[1], зрабіў магчымым вяртанне Бальтазара ў Ліду. Дзякуючы гэтаму, двойчы ссыльны здолеў нарэшце ўдыхнуць паветра радзімы і мець магчымасць злажыць свае косці ў зямлі бацькоў.

Аднак сямейныя адносіны Калясінскага праз усе нягоды былі парушаны. Сваё жыццё ён скончыў у самоце. З жонкай амаль не сустракаўся. Меў адну дачку, якая выйшла замуж за Нарымскага, і адзіную ўнучку, у замужстве — спадарыню Умястоўскую. Бальтазар Калясінскі памёр у Вільні, дзе пасля жыццёвых прац спачыў на Бернардынскіх могілках.

Гэта быў адзін з выбітных людзей свайго часу. Чалавек ідэі і глыбокага патрыятычнага духу.

Цудадзейны абраз Маці Божай, які зазвінеў у хвіліну першага арышту Бальтазара, жонка аддала ў лідскі касцёл. Паводле тагачаснага падання, гэты абраз забраў у сваё жытло ксёндз Карповіч. Аднак абраз не ўпадабаў новае месца і без перапынку звінеў над галавой ксяндза. Карповіч вымушаны быў яго зняць. Легенда гаварыла, што абраз быў знішчаны. Людзі перасталі хадзіць у касцёл, верачы, што сваім звонам абраз папярэджваў пра небяспеку.

І насамрэч, хаця касцёл і захаваўся, але Карповіч, які выконваў у той час абавязкі лідскага дэкана, першы пачаў служыць па-расійску, заспяваўшы каля алтара: «Господи помилуй». Людзі з гневам і абурэннем тлумамі пакінулі святыню і занялі настолькі ўпартую пазіцыю, што падобная спроба болей ніколі не паўтарылася.

Мураўёў моцна тачыў зубы на Геншаля, цывільнага начальніка Лідскага павета. Аднак яму пашанцавала выслізнуць за мяжу. Хутка арыштавалі Стэфана Вільбіка, вярбоўшчыка добраахвотнікаў у лагер паўстанцаў, і шмат іншых падазраваных у зносінах з Нарбутам або ва ўдзеле ў паўстанні асоб з Лідскага павета, між іншымі і Ансельма Пятрыкоўскага.

Трагічныя драмы разыграліся ў некаторых вёсках і шляхецкіх ваколіцах, спаленых і вынішчаных датла. Так згінулі вёскі Зубрава, Кракшлі і многа іншых. Цэлыя сем'і вывезены ў Сібір.

Хто ў той час чуў тыя енкі жанчын, плач дзяцей, той да смерці гэта не забудзе.

Мясцовых людзей звольнілі з усіх дзяржаўных пасад, а на іх месца, як лавіна, звaліліся чыноўнікі з Расіі, якія не ведалі стану і ўмоваў тутэйшага жыцця. Сюды пераважна завабліваліся сацыяльную свалату, якая кіравалася

[1] Жамчужнікаў А. М. ніколі не быў віленскім губернатарам. Аднак ён стаў пскоўскім віцагубернатарам і, верагодна, маючы гэтую пасаду, дапамог Калясінскаму — *Л. Л.*

не палітычнымі поглядамі, а жаданнем кар'ернага росту і асабістага абагачэння.

Каб дагадзіць Мураўёву, яны перасследавалі мясцовых людзей з усіх сацыяльных слаёў грамадства, пад страхам даносу вымушалі даваць ім хабар і г. д. Пасярод гэтых маскоўскіх адкідаў былі і людзі больш-менш культурныя і шляхетныя, аднак яны танулі ў агульнай плыні.

Усё гэта аслабляла народны арганізм, а повязь рускіх чыноўнікаў з яўрэямі высмоктвала апошнія сілы. Яўрэі заўсёды ўмелі выкарыстаць часы блытаніны, болю і эканамічнага руйнавання для ўласнага інтарэсу.

Раздзел XVII

Францішак Нарбут. Яго жыццё. Смерць у Венгрыі. Пераслед на радзіме. Пакаранне за наведванне магілы Нарбута. Продаж Шаўроў.

Наймалодшы брат Людвіка Францішак быў самым вялікім патрыётам у сям'і. Спакойны, маўклівы, ён хаваў у сэрцы агонь патрыятычных пачуццяў. Ужо ў дзяцінстве не выносіў ваеннай музыкі, якая часамі чулася ў Шаўрах, уцякаў калі гралі, затыкаў вушы або крычаў. Уздрыгваў ад віду гімназічнага мундзіра, а калі падрос і неабходна было яго адзець, жадаў уцячы са школы. Аднак розум перамагаў пачуцці.

Калі прыязджаў дадому на святы або вакацыі, прывозіў розныя забароненыя вершы і песні, хаваўся ад маці і дэкламаваў або з запалам спяваў у садзе перад братамі і сёстрамі. Гульні ў вайну былі наймілейшай забавай. Стараўся загартоўвацца і прызвычайвацца да дыскамфорту, быць цягавітым.

Калі Людвіка арыштавалі ў Вільні, Францішак вучыўся ў школе. Частка кампраметуючых дакументаў захоўвалася ў ложку Францішка пад сеннікам. Уначы, пад час ператрусу, хлопца раптоўна разбудзілі, бо лічылі, што ён, яшчэ не цалкам абудзіўшыся ад сну, зможа нешта выдаць. Аднак ён застаўся абсалютна спакойны і так удала выглядаў сонным, які ні пра што не ведае, што жандары пакінулі яго і пайшлі.

Калі Людвік вярнуўся з Каўказа, Францішак скончыў універсітэт у Пецярбургу, дзе вывучаў права. Рэвалюцыйная моладзь, рыхтуючыся да будучай барацьбы, арганізавала таварыства і таемна выдавала невялікі часопіс «Жаўрук» («Skowronek»).

Манчунская мела кантакт з моладдзю і таксама друкавала ў часопісе некаторыя свае творы. Гэта непакоіла і раздражняла яе мужа Альберта Манчунскага, які служыў на ўрадавай пасадзе і быў настроены больш спакойна і лаяльна. Для студэнтаў яго дом быў зачынены.

Аднойчы, калі муж быў на працы ў бюро, на парозе дома перад сястрой раптоўна з'явіўся Францішак. У Пецярбургу паліцыя выйшла на след арганізацыі. Многіх яе сяброў арыштавалі, некаторыя былі ўжо высланы ў Расію.

Францішак прасіў сястру, каб праз мужа дапамагла яму атрымаць пашпарт і так званую «падарожную», якая дазваляла ехаць поштай, а таксама дапамагчы грашыма. Прасіў, каб дазволілі на некалькі дзён схавацца, бо з гэтым было найцяжэй. Дворнік ставіўся да студэнтаў непрыхільна, але пакаёўка была верная сваёй маладой пані і ўдала адаслала дворніка, чым дала Манчунскай магчымасць схаваць брата.

Тэадора прызначыла Францішку сустрэчу ў касцёле св. Яна, а сама пайшла да мужа. Ніколі раней яна не была ў мужа на працы. Таму пабачыўшы яе, Альберт адразу зразумеў, што здарылася нешта надзвычайнае. Калі даведаўся, пра што ідзе гаворка, адказаў: «Дзеля цябе зраблю, што заўгодна. Але гэта згуба, гэта мая смерць!»

Зрабіў усё, пра што яна прасіла, дазволіў сустрэцца з баратам у касцёле св. Яна.

Знайшла Францішка ў лаўцы, дзе калісьці сядзела разам з маці. Незаўважна перадала яму дакументы і грошы, і, нібыта молячыся, паразмаўлялі паміж сабой і развіталіся.

Францішак Нарбут найперш паехаў у Брусель, адтуль пераехаў у Жэневу, а потым запісаўся ў вайсковую польскую школу ў Генуі. Выбух паўстання ў Польшчы прывёў Францішка ў шэрагі Лангевіча[1], дзе ён адразу служыў у пяхоце ў рангу капітана, вызначаючыся мужнасцю і доблесцю, потым браў удзел у фарміраванні коннага аддзела. Калі паўстанне згасла і трэба было думаць пра паратунак ад няволі і смерці, Францішак Нарбут перад уцёкам за мяжу, давёў справаздачу аб усіх сваіх грашовых высілках начальніку павета Замойскаму.

Падаю ніжэй копіі з арыгінальных дакументаў, якія меў Францішак.

П а с в е д ч а н н е
Начальніка павета Замойскага

«Матэрыяльныя каштоўнасці, якія належаць коннаму аддзелу Грубешава[2], пячатку таго ж аддзела і карту ад капітана Францішка Нарбута — прыняў. Рахункі з узятых на патрэбы фарміравання аддзела злотых польскіх 304 і грошаў 20 — прыняў.

Начальнік павета Замойскі».

(Унізе — пячатка Люблінскага ваяводства)

Акрамя вышэй пададзенага сведчання Францішак Нарбут атрымаў наступнае пасведчанне. Копія з арыгінала.

№22

[1] Мар'ян Лянгевіч (1827—1887), адзін з кіраўнікоў паўстання ў Польшчы.

[2] Грубешаў (Hrubieszow) — горад у Люблінскім ваяводстве, цэнтр павета.

П а с в е д ч а н н е

Грамадзянін Нарбут Францішак, капітан пяхоты, у наступным добраахвотнік у конным паўстанчым войску, студэнт аддзялення права ва ўніверсітэце Пецярбурга, а потым вучань вайсковай польскай школы ў Генуі.

Р а д а в о д

Нарадзіўся 2 красавіка 1842 года ў Шаўрах Лідскага павета Гарадзенскага ваяводства ў сям'і Крысціны з Садоўскіх і Тэадора Нарбута.

Яшчэ раз Францішку пашанцавала перайсці мяжу. Цяпер ён аказаўся на парыжскім бруку без сродкаў да жыцця. Яшчэ не ведаў, што сястра Тэадора Манчунская таксама знаходзіцца ў Парыжы ў гатэлі Ламбэр. Яму казалі пра нейкую Нарбутоўну, але ён не спадзяваўся адшукаць сястру пад такім прозвішчам.

Аднойчы, ідучы па вуліцы, галодны і прыгнечаны, уголас прагаварыў праклён па-польску. Парыж у той час быў поўны эмігрантаў, розных нешчаслівых уцекачоў разбітага паўстання. На гукі гэтай мовы да Францішка наблізіліся двое незнаёмых і запыталі, чаму ён так заўзята кляне. З размовы з імі даведаўся, што ў гатэлі Ламбэр знаходзіцца нейкая пані, уцякачка з Краю пад прозвішчам Нарбутоўна. Павярнуў да гатэля і з радасцю ўбачыў родную сястру, а калі запытаў яе, чаму яна карыстаецца дзявочым прозвішчам, тая растлумачыла, што яно болей вядомае ў колах эміграцыі. Дзякуючы дапамозе сястры, Францішак Нарбут хутка знайшоў магутных фаварытаў у асобе князя Чартарыйскага і графа Дзялынскага. Дарэчы, апошні вельмі сардэчна адносіўся да маладзёна.

Праз адпаведны час навучання ў Бельгіі Францішак стаў дыпламаваным інжынерам і ў гэтай жа дзяржаве атрымаў працу. Аднак Дзялынскі пераправіў яго ў Галіцыю і горача рэкамендаваў князю Адаму Сапегу і Уладзіславу Чартарыйскаму.

Пісьмо адрасаванае князю Адаму Сапегу (спісана з арыгінала)

Дарагі Адась!

У Вашу старану, у Перамышль выязджае дыпламаваны інжынер пан Нарбут у якасці чыноўніка чыгункі данцынгска-венгерскага напрамку, покуль на трохмесячнае выпрабаванне, але мы ўсе, хто яго ведае, перакананы, што назаўжды, бо не дапускаю, што захочуць адпусціць у іншую частку Польшчы такога шляхетнага і разумнага маладога чалавека. Рэкамендую Табе асабіста пераканацца ў яго высакароднасці і руплівасці. Спадзяюся, што Ты зможаш выкарыстаць былога вучня, а цяпер добрага інжынера ў розных годных мэтах.

Карыстаюся з нагоды, каб яшчэ раз перадаць Табе самыя сардэчныя вітанні і пажадаць найлепшых поспехаў у працы.

Твой брат і слуга Дзялынскі.

Парыж. Гатэль Ламбэр.
22 сакавіка 1880 г.

Францішак Нарбут з гэтага часу ніколі не пакідаў Аўстра-Венгрыі. Служыў на Малдаўскай чыгунцы, на пасадзе старшага інжынера на будоўлі чыгункі ў Венгрыі, дзе бальшыня мастоў, якія заслугоўваюць увагі, была вынікам яго праектаў. Вывучыў малдаўскую і венгерскую мовы, пазнаёміўся з прыгажуняй венгеркай Ізай Сэйляр і ажаніўся з ёй. Аднак, яго з'ядала хвароба, выбух якой прыспешыў такі выпадак.

Дзеля маёмасных інтарэсаў жонкі Нарбут павінен быў прыняць венгерскае грамадзянства. Найперш з гэтым пагадзіўся, аднак, калі патрэбныя дакументы былі ўпарадкаваны, сям'я жонкі на ўрачыстасці неспадзявана выбухнула тостам: «За новага венгра!», Францішак несвядома атрымаў нервовы зрыў, сарваўся з крыкам: «Не! Я — не венгр! Я — паляк ад дзеда і прадзеда!»...

Біў сябе ў грудзі, паўтараючы: «Я — паляк! Я — паляк!"...[1]

Гэта думка не адпускала яго да смерці. Заспакойваўся толькі тады, калі жонка чытала яму па-польску, хоць і не разумела прамаўляных слоў. Памёр у 1892 годзе ў Венгрыі. Пахаваны ў Торначы[2] (прэфектура Нітра).

На помніку Нарбута венгры выбілі надпіс, які ў перакладзе гучыць гэтак:

«Остык — Нарбут Францішак.
Польскі паўстанец 1863 года.
Старшы інжынер Імператарскай аўстра-венгерскай чыгункі.
Хвала памяці Яго!
Нарадзіўся на Літве ў Шаўрах, 1841 г.
Адышоў да Бога ў Торначы, 1892 г., кастрычніка, 7 дня.
У шчаслівым сужэнстве — 14 гадоў.
Жыццё яго было працавітым.
Гонар маці.
Сум па Айчыне разарваў яго найшляхетнейшае сэрца.
І таму ўжо не мог тут жыць бедны выгнанец.
Прыйшоў памірaць сярод братэрскага народа, на яго вольную зямлю».

Сястра памерлага Тэадора Манчунская дадала да венгерскага надпісу такія словы па-польску:

[1] Кавалеўская паказвае Франацішка занадта нервовым для інжынера, тым больш будаўніка мастоў, чалавекам. — *Л. Л.*
[2] Зараз горад у Славакіі. Па-славацку — Trnovec nad Vahom, па-венгерску — Tornoc. — *Л. Л.*

«Тут ляжыць Францішак Остык-Нарбут
Сын Тэадора і брат Людвіка Нарбутаў.
Хто ведае, кім яны былі,
Схілі галаву перад гэтым каменем!
Падумай, уздыхні і памаліся
За ўсіх трох разам!»

За выключэннем Францішка Нарбута, усе чальцы сям'і Нарбутаў знайшлі спачынак у айчыннай зямлі, якую гэтак горача любілі.

Магіла Людвіка Нарбута яшчэ доўгі час пасля паўстання пільна назіралася ўладамі, асабліва ў часы кіравання ў Лідскім павеце ваеннага начальніка Алхазава. Не дазвалялася нікому а ні стаць на калена перад ёй, а ні згаварыць пацеры за памерлых і палеглых. Адганяліся нават сяляне, якія напачатку часта прыходзілі на магілу свайго ўлюбёнага камандзіра і яго таварышаў. Немажліва было ані пакланіцца памяці, ані памаліцца за «бунтовщиков».

У 1864 годзе ў гадавіну бітвы пад Дубічамі да магілы прыйшло пэўнае таварыства з пані Геншаль, сястрой былога сябра арганізацыі. Іх адразу ж атачылі жаўнеры і пагналі ў Ліду. Не дапамаглі ніякія просьбы і тлумачэнні.

— Раз моліцеся на магіле Нарбута, то вы такія самыя бунтаўшчыкі, як і ён.

Яўрэі ў Лідзе, якія звычайна выбіраюць бок мацнейшага і ліслівяць уладзе, не пускалі на начлег «палітычных», якія прыбылі пад канвоем, ні ў якую карчму. Усе дзверы перад імі былі зачынены, так бы і стаялі пад дажджом цэлую ноч, калі б жаўнеры не прамоклі таксама, і не адчынілі дзверы карчмы штыкамі.

Ранкам вязняў прывялі да спраўніка Чартова.

— Что это за поляки? — запытаў, а даведаўшыся аб злачынстве, адаслаў да ваеннага начальніка. Алхазаў прыйшоў у гнеў, амаль ашалеў… тупаў нагамі, біў кулакамі ў стол, лаяўся і крычаў.

Пасля гэтай разыгранай для страшання сцэны, выбег з пакоя, … арыштанты стаялі доўгія гадзіны, не ведаючы што рабіць, чаго чакаць. Нарэшце зноў з'явіўся Алхазаў і ўжо спакайней сказаў, што калі не заплацяць па 25 рублёў штрафу, то пойдуць у турму.

— Иначе в острог! — дадаў гучней[1].

Такіх грошай з сабой ніхто не меў, але паводле беларускай прымаўкі «калі бяда, дык грошы будуць», дасталі неабходную суму і аддалі Алзахаву, тады на сваіх нагах спакойна вярнуліся дамоў.

Падобныя выпадкі паўтараліся шмат разоў. Гэтак маскоўскія клеркі збіралі сабе капітал, але адначасова заціралі сляды паўстання.

[1] І насамрэч, Алказаў, які потым стаў генералам, на Лідчыне праславіўся сваім хабарніцтвам. — *Л. Л.*

Пасля згасання ваяўнічага народнага духу, аглушаны Лідскі павет, знямелы ад болю, глядзеў на сваіх сыноў, якіх гналі ў Сібір альбо на смерць, глядзеў на сваю парваную зямлю, на руіны адвечных гнёздаў, на насаджэнне новых, чужых гаспадароў.

Страх і роспач прыгіналі ўсіх да зямлі. Людзі жылі, як у гарачцы, чакалі найгоршага, бо што раз новыя загады былі больш цяжкімі, а пераслед больш жорсткім. Не здзіўляла ўжо нішто, хіба толькі тое, што яшчэ жывуць на радзіме і над галовамі ёсць дах. Вечарам жагналіся з надзеяй, каб хоць ноч праспаць і ў неспакойным сне з трывогай шапталі пацеры, каб надыходзячы дзень не прынёс новай бяды[1].

Маліліся за пакараных, а за тых, якія яшчэ жывуць на свабодзе, проста забыліся. Жалобная цішыня запанавала ў дварах, падворках, загродах[2] і засценках. Яны панеслі найбольшыя ахвяры і найцяжэйшыя ўдары прыйшліся таксама па іх. У кожным доме ціха аплаквалі забітых, высланых, або зачыненых у турмах. Доўгая і суровая зіма пакрыла снегам руіны спаленых вёсак і загродаў... зрэдку забягаў на іх які-небудзь гаспадарскі сабака і жаласна выў, а зграі крумкачоў дзяўблі штосьці ў снезе.

Невялікія збройныя аддзелы, разбітыя ворагам, ужо зніклі з лясоў ці былі пералоўлены. Дзе-нідзе туляўся занядбаны падранак, але і ён стараўся схавацца ў бяспечнай хаце, падлячыць раны або падсілкавацца і пайсці, калі будзе шчасце, за мяжу. У маўклівых барах і пушчах насіліся толькі крывавыя прывіды ўспамінаў.

Чужынскія ворагі ўсё болей уплывалі на мясцовы люд, адварочвалі яго ад нас.

Са зменамі эканамічнага жыцця змянілася структура насельніцтва павета. Яўрэйскай сякерай высякаліся лясы і пушчы, якія не раз ратавалі айчынную зямлю — уласнікі былі вымушаны іх прадаваць. У павучыных сетках маскалёў і ёселяў драбнеў стан землеўладальнікаў, а некаторыя з іх знікалі зусім. З'яўлялася напружанасць, павялічылася няволя, змяняліся людзі... Але дух мінулага выжыў, абуджаючы сонных і пранікаючы ў сэрцы маладога пакалення.

У юбілейную гадавіну паўстання, у 1913 годзе, якая святочна адзначалася ва Львове, з'явілася новая карціна Юзафа Беркмана[3], якая прадстаўляла смерць Нарбута пад Дубічамі. Як вядома, падобную карціну пакінуў Анд-

[1] Гэтая пачуцці цалкам адпавядаюць тым, якія адчувалі мае бацькі ў апошнія гады Сталіна, гэтакія расказы я чуў у дзяцінстве. — *Л. Л.*

[2] Загрода — шляхецкі двор па-за межамі буйнога населенага пункта. Загродкавая — простая, нярэдка зусім бедная шляхта. Вядома прымаўка, якая цвердзіла пра роўнасць беднай шляхты і магнатаў: «Шляхціц на загродзе роўны ваяводзе». — *Л. Л.*

[3] Юзаф Беркман (1838, Валожын — 1919, Варшава) — мастак, публіцыст. Падчас паўстання 1863—64 г.г. ваяваў на Ашмяншчыне і Лідчыне, у тым ліку ў аддзеле Зыгмунта Мінейкі. 12.10.1863 г. у баі каля в. Рудзішкі паранены і трапіў у палон. Асуджаны на 4 гады катаргі,

рыёлі. Праз паўвеку з'явілася новая карціна на гэтую ж тэму, яна таксама складае даніну памяці лідару паўстання.

На львоўскіх урачыстасцях ушанавалі і сястру героя пані Манчунскую.

У 1863 годзе Шаўры падлягалі канфіскацыі. Два тагачасныя маскоўскія дзеячы Станскі[4] і Шпэйер вастрылі зубы на смачны кавалак і канкуравалі паміж сабой. Кожны з іх адцягваў прыняцце апошняга рашэння, пакуль яны не дачакаліся маніфеста, які выбіў з рук драпежнікаў чаканую здабычу. Такім чынам Шаўры ацалелі, і праз многа гадоў пазней, пасля смерці Баляслава Нарбута, удава Баляслава прадала маёнтак на карысць дзяцей.

Праз многія гады пасля смерці кіраўніка Лідскага паўстання Людвіка Нарбута яго постаць бачыцца нам праз імглу мінулага ў прамяністым арэоле, і наша сэрца б'ецца ад гэтага мацней.

Яго дзейнасць у пэўнай ступені перадае характар той эпохі і шмат скажа будучаму гісторыку, які напіша пра падзеі Лідскага паўстання маладому пакаленню, нагадаўшы такім чынам пра ўжо далёкую даўніну.

Народ, які не ведае і не шануе сваёй гісторыі, не можа называцца народам.

Пераклад і каментары Галіны Лаўрэш. Рэдагаванне і каментары Леаніда Лаўрэша.

якую адбываў у Нерчынску на сярэбраных капальнях. За спробу ўцячы тэрмін катаргі быў падоўжаны на 4 гады. — *Л. Л.*

[4] Станскі атрымаў маёнтак Геншаляў у Волдацішках. — *Л. Л.*

Успаміны Івана Любарскага[1]

У мяцежным краі

Любарский Іван Васільевіч (1832–1901), закончыў медыцынскі факультэт Харкаўскага універсітэта, ваенны лекар, гісторык, журналіст, у Лідзе служыў палкавым лекарам.

З падручніка геаграфіі засталося ў мяне такое ўражанне, што нашы заходнія губерні да самай мяжы царства Польскага — суцэльна рускія. […] Меў жа я вялікае расчараванне, калі ў 1860 г. апынуўся ў Паўночна-Заходнім краі. […] Насельніцтва — і праваслаўнае, і каталіцкае — размаўляе беларускім прыслоўем рускай мовы, але навучаецца польскай грамаце, і ўсякі мужык, як толькі высунуўся з сялянскага становішча, наровіць размаўляць па-польску і апранае канфедэратку. Паўсюль багата ўпрыгожаныя касцёлы велічнай архітэктуры, і рэдка-рэдка трапляліся драўляныя, трухлявыя цэрквы з падпоркамі і латамі, падобныя больш на адрыны, чым на храмы пануючай рэлігіі. Праваслаўнае духавенства знаходзілася ў поўным загоне, яно было прыніжана сваёю беднасцю. Знаёмячыся з мясцовымі святарамі і імкнучыся ўразумець сабе ўмовы іх побыту, я заўважаў агульную ім усім характэрную рысу нейкай вінаватасці ў тым, што яны жывуць у «чужым краю». […]

Трапляліся паміж святарамі і такія, якія проста дзівілі сваім цынічным стаўленнем да царквы і рэлігіі. Гэта былі дажываўшыя свой век апошнія магікане уніі 1839 г. Яны ўплывалі вельмі разбэшчана на сваю паству, прыводзячы яе паступова да поўнай рэлігійнай абыякавасці. З адным такім тыповым уніятам […] пад святарскай маскай я выпадкова сустрэўся ў Лідскім павеце Віленскай губерні. Спатрэбілася мне з'ездзіць у роту нашага палка, нядаўна размешчаную ў вялікай праваслаўнай вёсцы Дакудава з прыходскай царквой. Ротны камандзір і абодва субалтэрны[2] ў гэтай роце былі палякі[3].

Ледзь я размясціўся на кватэры капітана, як да нас ўляцеў суб'ект ў падрасніку, з вадкімі рэшткамі валасоў на галаве, з падстрыжанымі вусамі і барадой.

---

[1] И. В. Любарский. В мятежном крае. (Из воспоминаний). // Исторический вестник. Март, 1895. С.813—816.

[2] Субалтэрн — малодшы афіцэр у роце.

[3] Для Любарскага — аўтара гэтых мемуараў усе выхадцы з Беларусі, не гледзячы нават на іх веравызнанне — палякі.

— Поп тутэйшай парафіі[1] (так у тэксце, святар размаўляе пераважна па-беларуску — *Л. Л.*), — адрэкамендаваўся ён... падаючы мне руку. Гэта быў сухі маленькі чалавек, рухомы і гаманкі, які захаваў нейкую дзіцячую наіўнасць, не гледзячы на свой стары век, рускай мовы ён не ведаў. За тое, што я не мог размаўляць з гэтым дзіўным святаром на яго мове, ён адразу, без цырымоніі, абразіў мяне «заўзятым маскалём».

Вось, пане, абрэвізуйце яго роту памацней, — сказаў святар, паказваючы на капітана, — ды прайміце яго добра за тое, што напужаў мяне, калі прыйшоў сюды з ротай. Уявіце, у нас па вёсцы пайшоў слых, што ідзе ў Дакудава з ротай архіправаслаўны камандзір. Прыпляліся сюды яны як раз пры канцы тыдня. Я на другі дзень, досвіткам, давай званіць спачатку ў адзін звон, потым ва ўсе, думаю сабе: «Каб не прынесла яго нялёгкая ў такую рань», — а сам сяджу ў алтары ды выглядваю, таму што боязна было. А калі б прыйшоў, я пачаў бы казаць: «Госпадзі памілуй». Мінула гэтак з палову гадзіны, нікога з маскалёў няма. Ну, значыць, спіць пудзіла, задраўшы ногі, і стараннасці маёй не чуе, замкнуў я царкву і пайшоў каву піць. А потым дазнаўся, што ён такі ж «д'ябал» як і я.

— Чаго жа Вы, ойча, так баяліся?

— Як чаго? А калі б ён і на самай справе аказаўся б «благо-на-ме-ренный», ды паслаў куды патрэбна цыдулку, што дакудаўскі поп імшу не спраўляе, то ізноў прыйшлося бы ў манастыр ісці на пакуту.

— Дык чаму ж Вы не служыце? — спытаў я, вельмі здзіўлены.

— Вельмі проста, пане каханы, па-вашаму не ўмею, а па-нашаму нельга. Вось пахрысціць, павянчаць, пахаваць — гэта я з поўным задавальненнем, інакш папу з дочкамі не было б чаго есці. І ў нядзелю царква мая заўсёды адчыненая, прыйдуць, памоляцца, паспяваюць нашы хлопцы, і даволі з іх. Ды Вы не думайце, зрэшты, што я такі ўжо адшчапенец, у царскі дзень рэдка калі набажэнства не «адкатаю». Вось толькі з кадзілам не магу зладзіць. Сапраўдны поп спрытна так «фуркае» ім наперад і назад, а ў мяне не выходзіць.

— Я дзіўлюся, што Вам цяжка служыць па-праваслаўнаму, — заўважыў я. Наколькі мне вядома, па ўмовах Берасцейскай царкоўнай дамовы, уся абраднасць павінна быць тая ж, што і ў праваслаўных.

— Калі гэта было! — запярэчыў ён. У той час, калі я стаў уніяцкім святаром, у нас былі арганы, ружанцы, гадзінкі, «здровась Марыя», «анёл Пан-

[1] Верагодна гэта былы уніяцкі святар Ян Сцяпура. У 1835 г. дакудаўскія вернікі разам са святаром Язафатам Александровічам *«аказалі супраціў зменам у інтэр'еры свайго храма»*. Пасля адмовы прыняць маскоўскі служэбнік, Александровіча замянілі Янам Сцяпурам, жонка якога з чатырма дочкамі нарабіла клопату мясцовым уладам тым, што да ліквідацыі ўніі паспела перайсці у рыма-каталіцтва і не жадала «вярнуцца» ў праваслаўе — веру, у якой заканадаўствам імперыі прадпісвалася быць спаведнікам знішчанай уніі. Ян Сцяпура лічыўся недабранадзейным, ў 1839 г. яго дзеля пакарання выклікалі ў Жыровіцы і пакаралі.

скі», званочкі. А зараз што: «Госпадзі, памілуй, ды падай, Госпадзі». Адзін раз, усё ж, паплаціўся я за сваё няўменне. Прыязджае неяк праваслаўны біскуп такі важны, увесь у чорным, на галаве каўпак з шлейфам. Адслужы, кажа, а я пагляджу. Я ні жывы, ні мёртвы, пачаў плесці абедню і ўсё пазіраю на страшнага аргуса. Ён як быццам бы і нічога, прымасціўся ў кутку алтара, ды ўсе паклоны робіць. Мая старанная праца, можа і сышла бы, калі б не гэтая фатальная экценія. Тут ужо я зусім заблытаўся і пачаў мармытаць імёны, якія толькі прыйшлі ў галаву. Па заканчэнні ўсяго, біскуп праняў мяне да дзясятага поту і, падзякаваўшы, з'ехаў, а потым піша: дакудаўскі «ксёндз ніцма не розуме», паслаць яго ў навуку на два месяцы ў кляштар. А якая мне навука? Адлежаўся я тамака, … а потым такім жа вярнуўся ў Дакудава, якім і быў.

— Чаму бы Вам, «баценька», не павучыцца служыць, як належыць, — параіў я, — гэта зусім не цяжкая справа. Глядзіце ў трэбнік, і ўсё выйдзе добра.

— Позна мне вучыцца, ды і няма сэнсу. Бо палякі выхваляюцца, што адваюць сабе ўсю Літву. Тады мы ўжо не ў унію, а прама ў каталіцтва пойдзем…»[1].

Расія ўяўляла ў сабе прыкметы поўнай расхлябанымі з прычыны злачыннага абыякавасці нашых кіруючых класаў да інтарэсаў айчыны і рэлігіі. Ніколі не забуду маёй размовы з адным палякам, падпалкоўнікам генеральнага штаба, на пасадзе начальніка штаба пяхотнай дывізіі, размешчанай у Царстве польскім. Калі ў пачатку «паўстання» вядомы Серакоўскі, капітан генеральнага штаба, збег «да лясу»[2] і на чале банды стаў ваяваць супраць рускіх войскаў, я выказаў сваё абурэнне, што чалавек, які атрымаў вышэйшую адукацыю (спачатку ў універсітэце, потым у ваеннай акадэміі) на рускія грошы, што ездзіў на казённы кошт за мяжу і ва ўсім быў ашчасліўлены урадам, так подла адплаціў яму. На гэта начальнік штаба злосна запярэчыў: «такому… ураду інакш і плаціць нельга». Падобныя людзі запар і ўсюды займалі тады адказныя месцы (калі па ходу падзей стала ясна, што польскай справа прайграная беспаваротна, тады згаданы штаб-афіцэр, каб адцягнуць ад сябе ўсялякія падазрэн-

[1] Пасля скасавання уніі, людзі зразумелі, што неяк «ураставацца» можна толькі ў рыма-каталіцтве. Пасля рэвалюцыі 1905—1906 гг. і так званага «Кастрычніцкага маніфеста», г. зн. практычна канстытуцыі Расейскай імперыі, сярод іншых, была дазволена і свабода сумлення. Цар падпісаў знакаміты ўказ аб рэлігійнай талеранцыі, бо да гэтага ўказу адыход ад праваслаўя лічыўся крымінальным злачынствам. Паводле ўказу, праваслаўе заставалася пануючай рэлігіяй у імперыі, але цяпер можна было законна перайсці ў іншае веравызнанне. І нават праз 70 гадоў пасля скасавання уніі, па ўсім краі людзі пачалі пераходзіць у каталіцтва. Верагодна, рэкорд паставілі жыхары мястэчка Сапоцкін і навакольных вёсак, якія ў поўным складзе перайшлі ў каталіцтва. Па усёй Беларусі ў 1905—1909 гг. у каталіцтва перайшло 232 705 вернікаў.

[2] «Да лясу» — так у тэксту па-руску.

ні і ўмацаваць кар'еру, прыняў праваслаўе. Пасля, ужо ў чыне генерала, ён быў забіты пры штурме Плеўны …).

Рускія людзі ў цывільнай адміністрацыі края сустракаліся вельмі рэдка, большай часткай толькі ў губернскіх гарадах, у павятовых рускі чалавек уяўляў сабой выключную з'яву. Прытым тутэйшы рускі службовы люд быў зусім адмысловага гатунку. Карэнных выхадцаў з Расіі заносіла сюды якая-небудзь выпадковасць, у бальшыні ж рускія службоўцы былі рускімі толькі па сваёй афіцыйнай прыналежнасці да праваслаўнай рэлігіі, але нарадзіліся ў краі ад змешаных шлюбаў і першыя ўражанні дзяцінства ўспрынялі ад маці. Такія назіранні я вынес з вельмі многіх гарадоў Паўночна-Заходняга Края, куды мяне кідаў лёс. Усяго даўжэй мне прыйшлося пражыць з батальёнам нашага палка ў горадзе Лідзе, Віленскай губерні. Тут у цывільнай адміністрацыі, пачынаючы з гараднічага, усе былі тутэйшыя. Праўда, знайшоўся адзіны рускі, наглядчык павятовай вучэльні, званы па польскай тэрміналогіі «панам прэфектам», ды і той быў горкі п'яніца[1]. Гэта быў карэнны русак, але ў маральных адносінах зусім безасабовы. Відаць, яго схавалі ў гэтую глухмень за п'янства. Да сваёй вучэльні ён амаль не меў дачынення, і настаўнікі выкладалі так, як хацелі, без усякага кантролю; балазе ў той час яшчэ не была ўсталявана, як зараз, сістэматычная рэвізія выкладання з боку акруговых начальнікаў. У «присутственных» месцах паперы пісаліся па-руску з перакручанай граматыкай, але ў паветры канцылярый не насілася ніводнага рускага слова. У нашым палку з 60 афіцэраў роўна палову складалі палякі, другая палова была рускімі, літоўскімі татарамі і немцамі. Польская гаворка да такой ступені ўкаранілася ў афіцэрскім ужытку, што нават калі выпадкова сыходзіліся два-тры рускія афіцэры, то па засвоенай звычцы гаварылі паміж сабой па-польску. Афіцэры-палякі, з юнкераў, да таго дрэнна валодалі рускай гаворкай, што ў зваротах сваіх да ніжніх чыноў неміласэрна ламалі мову. Памятаю, як адзін субалтэрн, выходзячы са звязам на палкавое вучэнне, сустрэўся са знаёмым і, спыніўшыся, загаварыў з ім, а салдатам загадаў: «Ідзі, ідзі, другі ўзвод, я це даганю», — выйшла ні па-руску, ні па-польску».

У той час польскія абшарнікі і службоўцы не толькі не чужыліся рускіх людзей, але імкнуліся зблізіцца з імі і ўсталяваць добрыя адносіны; таму запрашалі рускіх у свае сямействы і аказвалі ім самую вялікую ўвагу. Я, напрыклад, зусім яшчэ юны і халасты чалавек, быў проста збянтэжаны тым, што да мяне першым прыехаў з візітам прадвадзіцель дваранства (маршалак)[2] — асоба, якая карысталася вялікай вагой у мясцовым грамадстве.

[1] Наглядчыкам 3-х класнай павятовай дваранскай вучэльні ў Лідзе ў 1860 г. быў надворны саветнік Аляксандр Аляксеевіч Шахаў (гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1860 г. Вильно, 1860. С. 39.), з 1861 г. пасаду заняў калежскі асэсар Людвіг Людвігавіч Ігнатовіч. (гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. ч. 1. С. 59.)

Сталася так, што для збліжэння з афіцэрамі польскае дваранства падрыхтоўвала раскошны баль, і з гэтай мэтай заводзіліся знаёмствы нават з тымі з вайскоўцаў, хто па недахопе сродкаў трымаўся ўбаку ад павятовага грамадства. Я ўстрымаўся ад знаёмстваў бо, не ведаў па-польску, а палякі ў той час па прынцыпе па-іншаму не размаўлялі; таму загаварыць ў іх таварыстве на рускай ці на якім ні будзь замежнай мове значыла б унесці непрыемны дысананс у агульную гармонію. На дваранскі баль былі запрошаны ўсе афіцэры, нават так званыя «бурбоны» (з ніжніх чыноў мужыцкага звання), якіх тады яшчэ было не мала ў палках, хоць гэтыя кавалеры зусім не вызначаліся ведамі свецкіх далікатнасцяў. Баль выйшаў на славу, грацыёзныя шляхцянкі ўвесь час выбіралі для мазуркі вайскоўцаў, аддаючы ім відавочную перавагу перад цывільнымі кавалерамі, а за агульнай вячэрай з морам шампанскага, ласкавыя гаспадары раз-пораз выгуквалі тэндэнцыйныя тосты «за братэрство, едносць, вспульную працу, на ніве славянскага прагрэсу, за шляхетных рускіх афіцэраў і т. д. і т.п.», прычым з чоканнем і абдымкамі. Потым стала, вядома, да чаго хіліліся гэтыя заляцанні, але ў той час ніхто з нас яшчэ не здагадваўся пра палітычныя задумы нашых мілых сабутэльнікаў, мы прымалі ўсе гэтыя ласкі «за чистую манету», як праявы вытанчанай… адукаванасці, і прыемна бавілі свой час. Асабліва спадабалася вайсковай моладзі чароўнае стаўленне да яе прыгожых паненак, і хоць сур'ёзнае заляцанне некаторых зухаў з матрыманіяльнымі мэтамі за багатымі нявестамі атрымала фіяска, тым не менш, афіцэрства плыло ў задавальненні безуважлівага жыцця і было ў захапленні ад непараўнальнага грамадства. Са свайго боку, у якасці рэваншу, афіцэры адказалі «затей-

[2] Прадвадзіцель дваранства ў Лідзе 1861 г. — Стэфан Буткевіч (19.02.1815–30.03.1896), у той час калежскі асэсар. Далей гэты чалавек неаднаразова ўзгадваецца у кнізе. Стэпан Буткевіч, сын Дамініка і Эміліі з Шукевічаў, меў жонку Эмілію з Адамовічаў. Валодаў маёнткам Косаўшчына з фальваркам Качанава і вёскамі Косаўшчына, Болтуці, Цвермы, Татарцы, Навіцкія, Былінская — усяго 1363 дзесяціны і 150 душ. Пасля смерці маці ўспадкаваў маёнтак Мінойты з вёскай (570 дзесяцін, 52 душы). Таксама маршалак шляхты меў у горадзе два вялікіх дома. Адукацыю атрымаў у Шчучынскай павятовай вучэльні. У 1853 г. тытулярны саветнік Буткевіч запісаны сярод «попечителей сельских запасных магазинов». Службовыя абавязкі маршалка шляхты выконваў з 12 кастрычніка 1855 г. Амаль што адразу быў узнагароджаны медалём у памяць вайны 1853—1856 гг., потым ордэнам св. Станіслава 3 ст. і знакам за 15 год службы. На сваёй пасадзе ён заставаўся да 1875 г. — роўна 20 гадоў. У запісцы віленскаму генерал-губернатару А. Л. Патапаву ў сакавіку 1868 г., Буткевіч пісаў, што заробку ад казны ён не атрымліваў і выкананне сваіх службовых абавязкаў каштавала яму двух маёнткаў, якія ён прадаў каб пакрыць расходы па гэтай пасадзе прадвадзіцеля дваранства. Пасля адстаўкі з пасады маршалка, надворны саветнік Буткевіч амаль што да канца жыцця абіраецца галосным Лідскай гарадской Думы. Менавіта з галосным Лідскай гарадской Думы Стэфанам Буткевічам быў асабіста з'наёмы Францішак Багушэвіч, паэт узгадваў яго у сваіх газетных артыкулах. Пахаваны на старых лідскіх могілках разам з жонкай Эміліяй Буткевіч з Адамовічаў (1813–1879).

ливым» пікніком, на які з'ехаліся абшарніцкія сямействы ледзь не з усяго павету. У маляўнічым лесе недалёка ад горада была ўладкавана платформа пад падстрэшкам для танцаў і расстаўлены намёты для буфетаў і прыбіральняў. Дастаўлены вялікі транспарт ласункаў, закусак і вінаў, гульбішча асвятлялася рознакаляровымі ліхтарамі, штохвілінна ўзляталі ракеты, трашчалі і іскрыліся феерверкі, палкавая музыка агалошвала паветра на вялікую прастору. … пад канец балю, … разгарачаныя танцамі і багатым узліваннем абшарнікі, службоўцы і афіцэры навідавоку ва ўсіх бесперашкодна чокаліся куфлямі, абдымаліся і цалаваліся, выкрыкваючы звычайнае пры гэтым kochajmy się (будзем кахаць адзін аднаго) і кляліся ўзаемна ў вечным і нязменным сяброўстве, не гледзячы ні на якія акалічнасці, ні на якія выпадковасці. […]

Па-за сямейнымі дамамі, грамадскае жыццё, па ўсталяваным звычаі, канцэнтравалася ў цукерні (кандытарскай), якая служыла прыцягальным цэнтрам для ўсёй Лідскай інтэлігенцыі. Тут можна было не толькі напіцца гарбаты ці кавы, але падсілкавацца гарэлкай з закускамі, а ў суседнім памяшканні, якое злучалася з цукерняй ўнутранымі дзвярыма, адпускаліся «гаспадарчыя абеды». Клуба ў гэтым горадзе не было, але кандытарская цалкам яго замяняла, тым больш, што тут да паслуг гасцей былі два більярды, некалькі шахматных дошак і ў бакавым пакоі нават карты. Аматары чытання знаходзілі тут некалькі польскіх газет і адну французскую; рускай не было ні адной, хоць афіцэры былі пастаяннымі гасцямі кандытарскай. Грамадзяне як халастыя, так і сямейныя, лічылі сваім абавязкам штодня пабываць тут; чыноўнікі забягалі ў гэтае месца, ідучы на службу, каб выпіць гарбаты і прачытаць тэлеграмы, а са службы — перакуліць чарку гарэлкі. Калі трэба было пабачыцца з кімсьці, дык ісці на кватэру было не варта; значна прасцей было сустрэць неабходнага чалавека ў цукерні, асабліва ў вячэрнія гадзіны. Тут абмяркоўваліся ўсе навіны і адбываліся бясконцыя і гарачыя спрэчкі з нагоды падзей у Італіі. Усе напружана сачылі за кожным крокам Гарыбальдзі, які для вызвалення Італіі ад дробных уладароў з сваёю бясстрашныя тысячай з'яўляўся на Апенінскім паўвостраве то тут, то там. Напалеон III, які абвясціў прынцып аб'яднання народаў, маляваўся ў паняццях тутэйшай шляхты ледзь не паўбогам. Гэтая напалеонаўская ідэя казытала іх пачуццё; з ёю яны злучалаліся ў сваіх надзеях. У нястрымных марах патрыётаў, іх народ, пры дапамозе Напалеона, аддалялася ад Расіі, Прусіі і Аўстрыі і гуртуюцца ў незалежнае і моцную дзяржаву. Але што б да пары да часу не парушаць добрых адносін з афіцэрамі рускай службы, палякі яшчэ не вырашаліся прагаварыцца, што яны задумваюць падняць супраць нас зброю, наадварот, яны перад афіцэрамі выказвалі толькі цьмяную здагадку, што Расія ў імя вялікага нацыянальнага прынцыпу, для ажыццяўлення летуценнай польскай дзяржавы, добраахвотна адмовіцца ад правінцый, населеных іх народнасцю — такімі лічыліся ўсе губерні, дзе па-

між пераважным рускім сялянствам самотна размясцілася польская шляхта ў якасці землеўладальнікаў і арандатараў[1].

Тым часам нашы шчырыя сябры і добразычліўцы спаквaля імкнуліся ўносіць ідэі ў розум афіцэраў, прадстаўляючы становішча ў такім выглядзе, што нашы народы — натуральныя браты, але што ўрад над абодвума — нямецкі або знаходзіцца пад уплывам немцаў, іх мэта — душыць славян, не даваць ім грамадзянскай свабоды і не дапускаць ніякага ў іх разумовага развіцця. Такім чынам, маўляў, паміж намі і вамі існуе самая цесная агульнасць інтарэсаў, і мы аб'яднанымі сіламі павінны імкнуцца да свайго самазахавання, насуперак шкоднаму ўрадаваму рэжыму. Асабліва гарачым прапагандыстам падобных ідэй паміж афіцэрствам выступаў ў цукерні Колышка[2], той самы, які пасля (у 1863 годзе) камандаваў спачатку самастойна, а потым разам з Серакоўскім і разам з ім быў узяты ў палон пасля паразы паўстання. Колышка быў малады чалавек гадоў 25-ці, невялікага росту, мажны, з круглым і румяным тварам. Якая была яго прафесія ў Лідзе, я не цікавіўся; здаецца, ён быў сынам забяспечанага абшарніка[3]. Гэта быў гарачы патрыёт і цытаваў цэлыя маналогі з Міцкевіча. Ён увесь час даставаў аднекуль памфлеты Герцана і даваў іх афіцэрам, захоплена адклікаўся пра нібыта незвычайна светлыя і здаровыя меркаванні рэвалюцыйных лісткоў адносна палітычнай будучыні Расіі і Польшчы. Вядома, што гэтыя лонданскія выданні проста прапаведавалі скасаванне Рускай дзяржавы шляхам раздзялення яе на дробныя вобласці пад маркай федэрацыі, пры чым Герцэн заклікаў да гэтай разбуральнай працы ўсіх рускіх да мужыка уключна з сякерай у руках. «Свежо предание а верится с трудом!» Гэтыя злачынныя планы, неслі смерць Расіі, як палітычнай адзінкі але спачувальна ўспрымаліся моладдзю нашага палка, як дабравест прагрэсу і дабрабыту. Дзіўны гэта быў час агульнага ашаламлення, глыбокага разбэшчвання духу, адсутнасці сумлення і доўгу, нават простага нацыянальнага інстынкту, які павінен быў абуджаць пачуццё самазахавання! Ніякіх маральных асноў у большасці маладога пакалення шасцідзясятых гадоў не было. З вар'яцкім самаашуканствам і туманнымі надзеямі на нявызначаную будучыню яно падала па нахільнай плоскасці, не асэнсовываючы гэтага і

[1] Аўтар, як звычайна, запісвае ў «рускія» усіх беларусаў і ўкраінцаў.

[2] Баляслаў Вікенцьевіч Калышка (7.VIII.1837–9.VI.1863) нарадзіўся ў фальварку Карманішкі Лідскага павета. З 1860 г. вучыўся ў Маскоўскім універсітэце, адзін з кіраўнікоў рэвалюцыйнага студэнцтва, прапагандаваў ідэі рэвалюцыйнага саюзу народаў у барацьбе з самадзяржаўем, у 1861 г. вёў агітацыю ў Лідзе, потым удзельнічаў у студэнцкіх хваляваннях, сутыкненнях студэнтаў з паліцыяй. Ратуючыся ад пакарання, выехаў за мяжу, наведваў ваенную школу эмігрантаў у Італіі. У сакавіку 1863 г. сфарміраваў паўстанцкі атрад у Ковенскім павеце, меў некалькі паспяховых сутычак з царскімі войскамі. Пасля разгрому паўстанцаў, узяты ў палон і павешаны ў Вільні на плошчы Лукішкі.

[3] Паходзіў з небагатай шляхты.

не даючы сабе справаздачы, не падазраючы што, у рэшце-рэшт, і само яно загіне. Праўда, паміж маладымі аднапалчанамі маімі было некалькі асоб якія падазрона і з недаверам ставіліся да прапаганды, але яны складалі меншасць і не рашаліся выступаць з апазіцыяй супраць пануючага нахабства, быць можа, баючыся наклікаць на сябе рэпутацыю адсталасці ад прагрэсіўнай плыні, што лічылася ў той час самым ганебным таўром. Старэйшыя нашы афіцэры ў больш вялікіх чынах не саромеліся выказваць сваё абурэнне супраць разбуральных ідэй, якія зыходзілі як з рускага, так і польскага лагера, але гэтым усё і скончылася; ніякіх мер процідзеяння палітычнаму разбэшчванню не прымалася ні знізу, ні зверху.

Таму прамовы Калышкі не мелі ні меры ні межаў. Ён карыстаўся ўсякай сустрэчай з афіцэрамі ў цукерне, збіраў іх ўкруг сябе пад выглядам паведамлення якой-небудзь навіны і прапаведаваў варожасць да ўрада. Падшэўка гэтай пропаведзі была вельмі дзіўная. Як я сказаў вышэй, тактыка, якой стараўся прытрымлівацца нават заўзяты Калышка, была ў тым, каб да часу не крыўдзіць рускага нацыянальнага пачуцця і заставацца з намі, для віду, у прыязных адносінах. Таму Калышка увесь час паўтараў: «Прашу вас, спадары, не змешваць палітычных паняццяў. Рускі народ гэта адно, а рускі ўрад — другое. Гэты апошні — наш агульны непрымірымы вораг. Абавязак кожнага патрыёта сваёй краіны змагацца з ім аслабляць яго, каб зрынуць тыранію, інакш Расія ніколі не вызваліцца ад унутраных кайданоў рабства. І ў гэтых адносінах рускія могуць смела разлічваць на нашу братэрскую і энергічную дапамогу».

Наступствы паказалі, як горка памыліліся агітатары ў сваіх разліках на афіцэраў рускай арміі. З боку здавалася, што розум цалкам разбэшчаны і што руская дзяржаўная арганізацыя пры першым штуршку гатовая развалiцца. Але варта было толькі ім раскрыць свае карты і відавочна падняць сцяг бунту супраць нашай дзяржаўнай цэласці, як у масе прайшоў псіхічны пераварот і наступіла працвераженне. Рускія афіцэры пачалі дзейнічаць па загаду доўга, а афіцэры-палякі, за малымі выключэннямі, засталіся вернымі прысязе часткова з-за ўнутранага імпульсу, часткова з-за воінскай дысцыпліны, якою былі скаваныя, і таму і гэтыя апошнія воляй-няволяй ішлі змагацца супраць паўстанцкіх банд. Можа быць, многіх з іх стрымлівала ад фатальнага кроку і тое перакананне, што калі б хто пры сутыкненні з мяцежнікамі выявіў здраду, то з такім жыва расправіліся б на месцы самі салдаты. Збольшага ненадзейны элемент у афіцэрскім складзе быў аслаблены тым, што калі ўжо можна было прадбачыць паўстанне і будучае падаўленне яго ўзброенай сілай, тады гуманны наш урад, шкадуючы натуральнае пачуццё тутэйшых афіцэраў, якім трэба было б ісці са зброяй супраць брата, сына ці бацькі, прапанавала ім перавесціся ў войскі, размешчаныя ўнутры імперыі, і гэтым... скарысталася шмат чалавек. У сілу ўсіх гэтых прычын, калі ўспыхнула паўстанне, то «до лясу» сышло самае нязначнае лік афіц-

эраў, ды і то толькі на пачатку палітычнай сумятні, калі галовы былі яшчэ распаленыя і надзея пігмеяў на пераадоленне калоса прывабна малявалася ў туманным будучыні. Здраднікі-афіцэры, амаль усе былі палякі, кажу амаль, таму што, колькі мне вядома, у паўстанцкіх бандах апынуліся і два рускіх афіцэра, адзін — малады прапаршчык пяхотнага палка, які здрадзіў свайму абавязку ў запалу вар'яцкай любові да полькі бо тая патрабавала ад яго гэтай ахвяры, а другі — казачы сотнік, вечна п'яны, быў захоплены ў мяцеж пад уплывам вінных пароў якія атуманілі яго свядомасць да такой ступені, што ён не аддаваў справаздачы ў тым, што робіць. Абодва няшчасныя заплацілі жыццём за сваё злачынную легкадумнасць.

У Лідзе, якая налічвала ў той час дзве з невялікім тысячы жыхароў, былі тры велічэзныя мураваныя касцёлы выдатнай архітэктуры, якія высока і ганарліва ўздымалі да неба свае прыгожыя шпіцы. Адзін з іх стаяў пусты, за непатрэбнасцю, бо вернікаў на ўсе касцёлы бракавала[1]. Не шмат б спатрэбілася пераробак, што б звярнуць пусты касцёл у праваслаўны храм[2]; але тады, пры панаванні... каталіцтва, няма каму было падумаць пра гэта. Вышэйшая ўлада ў Вільні несвядома ішла на буксіры польскай справы, а ў адносінах да рускіх інтарэсаў ў краі спакойна драмала. Як вядома, генерал-губернатар таго часу Уладзімір Іванавіч Назімаў быў чалавек найвысакародных прынцыпаў, у вышэйшай ступені гуманны, лагодны і абыходлівы. Як адміністратар, ён цалкам задавальняў сваёй эпосе, але для таго што б распачаць капітальную перабудову палітычнага будынка, не было ў яго ні пачыну, ні энергіі, ні стваральнай ідэі, а сігналу з Пецярбурга быць не магло, бо там больш цікавіліся агульначалавечымі пытаннямі, чым справамі сваёй бацькаўшчыны і былі вельмі раўнівымі да сваёй бездакорнай рэпутацыі ў вачах адукаванай Еўропы. Ды што Еўропы? Баяліся нават, як бы не стаць «дрэнным» для Герцэна, а гэты рускі эмігрант, здаваўся ў вачах некаторых уладных нашых слупоў шостаю вялікаю дзяржавай, якая магутным почыркам свайго пяра абвясціла ўвесь наш Заходні край польскім і каталіцкім, а незабыўнага віленскага мітрапаліта Іосіфа Сямашку, які вынес на сваіх плячах ўз'яднанне уніятаў з праваслаўнай царквой у 1839 г., затаўраваў піяўкай і разбойнікам. Вось да якіх сігналаў прыслухоўваліся! Па праўдзе Назімава нельга было і вінаваціць за яго абыякавасць да арганізацыйных задач па аднаўленню парушанай рускай народнасці: ён плыў у хвалях агульных плыняў. Што тычыцца пытання рэлігіі, то займацца гэтым было ў ягоных вачах у тыя шасцідзясятыя гады прыкметай адсталасці і абскурантызму. Што сказаць, тады яшчэ не разумелі ўсёй велічэзнай важнасці, якую ўяўляюць веравызнавальныя адрозненні ў краі; не разумелі

[1] Пустымі стаялі два з трох касцёлаў: кляштара піяраў — пасля пажару 1842 г. і кармеліцкага кляштара, зачынены яшчэ пасля паўстання 1831 г. і перададзены спачатку ўніятам, а пасля ліквідацыі уніі, стаўшы праваслаўным

[2] Пасля 1863 г. касцёл і кляштар піяраў быў перадзены праваслаўным.

таго, што, у сілу асаблівых шляхоў гістарычнага развіцця, рэлігія там вызначае нацыянальнасць. Насельніцтва гаворыць адным і тым жа рускім прыслоўям[1], адрозніваецца аднолькавым агульным вонкавым тыпам і характарам, аднолькава апранаецца і вядзе аднолькавы ў агульных рысах лад жыцця. Але хто праваслаўны, той лічыць сябе рускім, а хто каталік, прылічае сябе да палякаў. І не толькі просты народ засвоіў сабе такія паняцці, яшчэ мацней трымалася іх польская шляхта, таму што гэта трэба было для польскі мэт. Толькі пачынаючы з Міхаіла Мікалаевіча Мураўёва прасвятлелі погляды на жыццёвы пытанне Заходняга краю, і з таго часу сярод сродкаў для распалячвання Заходне-Рускага края, рэлігійны бок, як вядома, заняў не апошняе месца.

Праваслаўная царква ў Лідзе была ў несамавітай, драўлянай, бедна абстаўленай хаце з нізкай столлю[2]. У царкве адначасова магло маліцца не болей за 50 багамольцаў, таму салдаты прыходзілі ў храм Божы па чарзе камандамі. Служыў святар без дыякана, а спявалі на клірасе салдаты, як ім Бог «положил на душу». Гэта быў цэнтр, куды збіраліся такія людзі, у якіх яшчэ не была вытраўлена руская душа. Адсутнасць панікадзіла ў храме, бляшаныя пагнутыя падсвечнікі, чорныя абразы на сцяне, падраныя рызы на святары — усё гэта так не падобна было на звыклыя ўражанні праваслаўнага чалавека, і мімаволі глыбокая нуда ахоплівала душу. І калі сярод гэтай шчымлівай абстаноўкі раздаваліся святыя гукі, дарагія з самага дзяцінства, то яшчэ больш балюча было ўсведамляць адчужэнне ад роднага свету, яшчэ тужлівей адчувалася адзінота ў нязвыклым асяроддзі з яе іншымі імкненнямі і інтарэсамі. Асабліва прыкметны быў такі настрой у шэрай салдацкай масе. Простыя людзі, замілавана жагналіся шырокім крыжам, няспынна рабілі зямныя паклоны з цяжкасцю знаходзячы для гэтага месца і не шкадавалі собскіх крэўных грошаў, каб зацепліць перад святымі абразамі сваю шчырую ахвяру.

Зайшоў я адзін раз у касцёл[3] і патрапіў у такі цесны натоўп, што нельга было паварушыцца. Быў несвяточны нядзельны дзень, калі касцёл звычайна напаўняецца толькі на палову, а тут прысутнічаў літаральна ўвесь горад, нібы на адпуст (храмавае свята). Не могучы растлумачыць сабе гэтую з'яву, я адчуваў, што бесперапынна прыбываюць усё новыя і новыя багамольцы і ўтвараюць суцэльную масу, якая ціснула з усіх бакоў. Тым не менш, я цярпліва пераносіў ціск і задуху, сочачы з цікаўнасцю за ходам імшы, каб параўнаць яе з праваслаўнай. Пры канцы на высокай кафедры на бакавой сцяне з'явіўся невядомы прапаведнік у сутане капуцы-

[1] Так аўтар называе беларускую мову.

[2] Найверагодней, ролю праваслаўнай царквы да асвячэння былога касцёла піяраў (Свята-Міхайлаўскага храма) ў 1863 г. выконвалі ці былы ўніяцкі шпіталь, ці былая ўніяцкая плябанія, ці былая пякарня ўніяцкай плябаніі.

[3] Фарны касцёл.

на і адразу прыкаваў да сябе агульную ўвагу. Капуцынскага кляштара ні ў горадзе, ні ў суседстве не было; такім чынам, новы твар з'явіўся здалёку. Гэта быў чалавек гадоў пад трыццаць, з паголенай па-манаску галавой, высокі і сухарлявы, апрануты ў тоўстае цёмна-шэрае сукно і падперазаны вяроўкай; на левым запясці — буйныя пацеркі, у выглядзе ланцуга, з вялікім крыжам. Даўгаваты твар, рэзкая зморшчына паміж бровамі, нос гарбінкай, тонкія стуленыя вусны і глыбокія, іскрыстыя вочы, абведзеныя сіняватымі кругамі, — усе гэтыя рысы выяўлялі ў капуцыне розум, энергію, рашучасць. Ён схіліўся над кафедрай як бы ў нямой малітве, потым выпрастаўся на ўвесь рост, абвёў фасфарычным поглядам прысутных, падняў уверх правую руку і загаварыў. Гаворка яго, спачатку ціхая і спакойная, паступовае прымала гарачае адценне, часам прыпадабнялася бурнай хвалі і кідала на слухачоў грамы заклікаў. Ксёндз прамаўляў пра Радзіму і да такой ступені меў магнетычны уплыў на людзей, што натоўп, здавалася, гатовы быў рынуцца туды, куды ён пакажа. Дастаткова сказаць, што я, старонні і выпадковы слухач, мімаволі адчуваў нервовую дрыготку ва ўсім целе, а з масы слухачоў няспынна вырываліся гучныя ўздыхі, і сотні кулакоў шчыра стукалі ў замілаваныя грудзі. Сцісла гэтае палітычнае казанне можна прыблізна фармуляваць так: «Бог пасылае выпрабаванні нават сваім абраным народам. Мы, ... заўсёды вызнавалі праўдзівую каталіцкую веру, тую веру, па-за якой няма выратавання чалавечым душам, і тым не менш Богу заўгодна было выпрабаваць свой ўпадабаны люд, дазволіць каб яго заняволіла варварская і ерэтычная ўлада, якая адняла грамадзянскія правы і свабоду сумлення, усё, што складае самы дарагі і святы здабытак чалавека на зямлі. Мы бясконца доўга і цярпліва пераносілі свае пакуты, і Выратавальнік свету зараз пераканаўся ў непахіснай пэўнасці свайго народа Яго святым запаветам. Слухайце!.. Ад імя Усемагутнага Бога ўзвяшчаю вам, што надышоў канец вашага катавання. Набліжаецца хвіліна, калі Бог разаб'е вашы кайданы і даруе нам згубленае зямное шчасце. Збавіцель ідзе да нас, і блажэнны той муж, якога ён сустрэне падрыхтаваным. Будзьце ж гатовыя прынесці ўсякія ахвяры на алтар Айчыны; ахвяруйце ўсім, хто чым валодае, нясіце давераным людзям грошы, рэчы, увесь здабытак, а калі прыйдзе час — жыццё. У імя святога нашага касцёла і дарагой Айчыны бацькі павінны на час адмовіцца ад сваіх сямействаў, мужы ад жонак, мацярэй і дзяцей, нявесты ад жаніхоў, падначаленыя ад свайго начальства і дружна выступіць на справу вызвалення Бацькаўшчыны. Але гора таму, хто з-за абыякавасці ці ад страху застанецца ўбаку ад усеагульнага руху. На іх абрынецца з неба гром і ўразіць на смерць без пакаяння, зніч ператворыць у попел усю іх маёмасць, а на тым свеце чакае здраднікаў вечная пякельная пакута. Маліцеся, ды хай Ісус Хрыстос і Маці Божая асвятляюць сэрцы вашыя і накіроўваюць вас на богадагодныя вычыны... На калені!.

Усе адразу укленчылі, абвясціўшы паветра стогнамі і плачам. Гараднічым[1] і ўсе павятовыя ўлады без ваганняў выканалі каманду. Засталіся на нагах толькі я і адзін з паліцэйскіх, які стаяў наперадзе мяне. Капуцын бліснуў вачамі і ўладна прагаварыў: «Я бачу, што тут, у гэтым святым храме, прысутнічаюць іншаверцы; але ўсё роўна, замаўляю і іх злучыцца ў агульнай малітве, інакш яны адразу панясуць кару Божую». Становішча крытычнае. Паліцыянт пачаў уладкоўвацца на калені, а я, скарыстаўшыся гэтай паўзай, прасунуўся за шырокую калону, каля якой стаяў. Ксёндз супакоіўся і зноў працягваў сваю блюзнерскую і абуральную прамову, пратрымаўшы на каленях пакорлівую паству з чвэрць гадзіны". Пры канцы, капуцын выйшаў з алтара „з выразам смутку і стомы на твары і, сціпла патупіўшы вочы, стаў прабірацца праз натоўп з велізарным падносам на руках. Яго суправаджаў павятовы суддзя[2] з запасным падносам, апушчаным уніз. З усіх бакоў цягнуліся рукі, і ахвяраванні багатым дажджом пасыпаліся на паднос прапаведніка: медзякі, срэбра, асігнацыі, нават вельмі буйныя, кашалькі і партманетка з усім змесцівам, бранзалеты, завушніцы, гадзіннікі, адразу ўтварылі такую кучу, што класці больш не было куды. Напоўнены паднос змяняўся запасным з рук суддзі, які адносіў усё сабранае ў алтар і зноў спяшаўся да капуцына з пустым падносам. Чым усё гэта скончылася, я не бачыў, таму што паспяшаўся прыбрацца па-добраму, але чуваць было, што, па заканчэнні набажэнства, у першы раз у Лідзе праспявалі ў касцёле нейкія новыя песні быццам бы рэлігійныя, але ў сутнасці рэвалюцыйнага зместу.

З таго часу я зарокся больш заходзіць у касцёл і цэлы дзень адчуваў такое нервовае засмучэнне, што ніяк не мог супакоіцца. А калі ўвечары расказаў усё, выпадкова убачанае і пачутае аднаму нашаму старому маёру, які больш за іншых у палку абураўся антырасейскімі праявамі, то дасведчаны служака заўважыў: «пачакайце, яшчэ не тое ўбачым пры гэтакім злачынным папушчальніцтве ўладаў. Гараднічы павінен бы арыштаваць нягодніка, а ён, балюе зараз з ксяндзамі, ды дапамагае ім „офяры" (ахвяраванні) лічыць. А што зробіш? Войскам загадана не ўмешвацца ў такія справы».

Аказалася, што шматлікае зборышча ў касцёле было не выпадковым, людзі прыйшлі туды па позве мясцовых ксяндзоў; ў іншым касцёле знарок не было службы ў тую нядзелю. З тых часоў капуцын больш не паказваўся ў нашым мястэчку. Пазней я даведаўся, што гэта быў адзін з самых фанатычных эмісарам польскага «жонда». Ён бесперашкодна пераязджаў з горада ў горад, з мястэчка ў мястэчка, усюды казаў свае па-

[1] Гараднічы ў Лідзе 1861 г., падпалкоўнік Балонін. Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. ч. 1. С. 110.

[2] Павятовы суддзя ў Лідзе 1861 г., калежскі асэсар Фама Іванавіч Шукевіч. (Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1861 г. Вильно, 1861. ч. 1. С. 111.), Тамаш Шукевіч — адзін з кіраўнікоў паўстання на Лідчыне, павятовы камісар.

лымяныя пропаведзі і збіраў багатыя «офяры»[1]. Калі ж выбухнула паўстанне, тады гэты «слуга алтара» апынуўся ў шайцы Лялевеля[2], натхняў паўстанцаў з крыжам у руках і, нарэшце, у адной сутычцы быў забіты[3].

Па меры таго, як падрыхтоўка да паўстання больш і больш набірала моц, рускае значэнне ў краі паступова змяншалася. Выходзіла так, як быццам бы гаспадарамі становішча былі яны, а часовымі гасцямі, прышэльцамі ці, мабыць нават паразітамі на чужым целе з'яўляліся мы.

Разам з тым у мясцовых розумах ўсё мацней ўкараняюцца надзеі на аддзяленне ад Расеі. Сталі выяўляцца і некаторыя прыкметы такога самападману. Так, павятовы прадвадзіцель дваранства аднойчы звярнуўся да нашага палкавому доктара, які набыў рэпутацыю добрага хірурга, з такой прапановай:

— Скажыце, коханы консільяжу (ласкавы доктар), спадзяюся, Вы застанецеся ў нас, калі Літва адыдзе ад Расіі?

— Як гэта адыдзе ад Расіі? — спытаў збянтэжаны доктар, — я штосьці не ясна сабе ўяўляю.

---

[1] Параўнай, у той жа час у Брэсце: *«Напачатку 1862 г. я быў дома. Першае што я тут пачуў, гэта пропаведзі нейкага капуцына, які сваёй патрыятычнай і займальнай гаворкай збіраў народ у касцёл з розных паветаў. Гэты капуцын малады, высокі, прыгожага выгляду, пасля, знаходзячыся ў Лелевяля, быў забіты ў адной з сутычак. На наступны ж дзень я пайшоў паслухаць гэтага прапаведніка, хоць і не думаў, што ўражанне будзе вялікім, асабліва пасля таго, што чуў раней. Народа было шмат. Не толькі касцёл, але і каля касцёла усе было перапоўнена. Ксёндз капуцын, увайшоўшы на амбон, пачаў сваю пропаведзь. Народ то валіўся, заломліваючы рукі, на калены, то зноў уставаў рыдаючы. Сапраўды, прамова яго, дыхаўшая нянавісцю да ўрада, малявала становішча… такімі змрочнымі фарбамі, малявала такія пакуты айчыны, што, здаецца, калі б ён сказаў: „бярыце нажы і прыступайце да справы“, я першы пайшоў бы за ім. Калі служба скончылася і капуцын выходзіў з касцёла, дык жанчыны і мужчыны кідаліся цалаваць яго руку, а некаторыя абрывалі яго верхнюю сутану, так што трэбр было пашыць яму новую. І тут таксама, як і ў Варшаве, абшарнікі, мяшчане і ў рэдкіх выпадках сяляне спявалі гімны і насілі жалобу»*. — Воспоминания польского повстанца 1863 года // Исторический вестник, 1892, Т. 49, №9, С. 583–584.

[2] Лелявель — мянушка Марціна Мацея Барэлоўскага (1829–1863), палітычнага і ваеннага дзеяча, палкоўніка ў паўстанні 1863 г.

[3] Капуцын — ксёндз Бжоска. Як пісаў П. Францаў «*адзін з самых фанатычных эмісараў польскага „жонду“. Ён бесперашкодна пераязджаў з горада ў горад, з мястэчка ў мястэчка, усюды прамаўляў свае казанні і збіраў багатыя ахвяраванні. Калі ж успыхнула паўстанне, дык гэта … (ён) апынуўся ў атрадзе Лелявеля, натхняў паўстанцаў з крыжам у руках і, нарэшце, у адной сутычцы быў забіты*» (Гл: Брянцев П. Д. Польский мятеж 1863. Вильна, 1891. С.79.). Бжоска вучыўся ў Янашскай семінарыі (Люблінская губерня), у 1857 г. яго высвяцілі ў ксяндзы і прызначалі вікарыем у Саколку, потым у Луцк (Сядлецкай губерні). У 1862 г. ён сышоў да паўстанцаў, увесь час выступаў перад насельніцтвам. У 1863 г. быў у атрадзе Левандоўскага, а потым у Лелевеля, пасля разгрому атрада Лелявеля сам узначаліў атрад паўстанцаў. Арыштаваны толькі 17 красавіка 1865 г. і 11 траўня пакараны смерцю ў Саколцы.

— Вельмі проста; адлучыліся ж ад Аўстрыі Ламбардыя і Венецыя і ўвайшлі ў склад Італьянскай дзяржавы. Чаму ж мы не можам утварыць незалежнай дзяржавы ў межах сваёй народнасці? Зараз да таго ідзе ўся еўрапейская палітыка.

— Але Расія — не Аўстрыя, — заўважыў доктар, зачэплены за жывое, — і паменшыць яе будзе пацяжэй, чым рознамасную імперыю Габсбургаў.

— Вядома, — спахапіўся маршалак, — я і кажу гэта. Але могуць быць розныя палітычныя кампрамісы для аб'яднання народнасцяў. Відаць, час такі надышоў. Ды не пра гэта ўласна гаворка. Я толькі жадаў сказаць, што Вы, ласкавы доктар, карыстаецеся такім заслужаным даверам у нашым грамадстве, што пажадана, каб вы засталіся ў нас, якія б ні адбыліся палітычныя змены.

— Вельмі удзячны за ўвагу, але, прызнаюся, я б не застаўся.

— Чаму ж? — здзівіўся суразмоўца, — для адукаванага чалавека жыць у краіне з ліберальнымі ўстановамі, якой будзе наша незалежная дзяржава, і працаваць у культурным грамадстве павінна быць прывабна.

— Ды па-просту хоць бы таму, што я, як праваслаўны, быў бы не зусім свой паміж вамі, і польскай мовы добра не ведаю, а быць абмежаваным у выказванні сваіх думак непрыемна.

— Э, глупства; варта Вам жаніцца на кімсьці з нашых прыгажунь, і адрозненне ў веравызнанні згладзіцца, а мовай Вы авалодаеце. Я ведаў афіцэра, які прыбыў у Вільню з глыбіні Расіі і не разумеў аніводнага слова, а праз некалькі гадоў пісаў у альбомы такія выдатныя вершы, што, права, пад імі самімі Вікенці Поль падпісаўся б».

Гэтая размова, запісаны даслоўна[1], досыць характарызуе упэўненасць палякаў ў поспеху сваіх задум яшчэ задоўга да паўстання і ў дыпламатычным заступніцтву за іх некаторых еўрапейскіх кабінетаў. А што шляхта замышляла ў сваіх планах узброены мяцеж, у гэтым я меў выпадак пераканацца па наступным акалічнасці. За некалькі вёрстаў ад горада жыў у сваёй сядзібе адстаўны капітан З-скі, ён быў тутэйшым, я аказаў яму некаторыя паслугі і праз гэта зблізіўся з ім. Падчас службы ў адной з унутраных губерняў ён ажаніўся па каханню на рускай дзяўчыне, а па выхадзе ў адстаўку засеў гаспадарыць у маленькім сваім фальварку. Ён не перашкаджаў жонцы выхоўваць дзяцей у духу праваслаўнай веры, у палітыку не ўмешваўся і таму не меў сяброў сярод сваіх «родакаў».

Аднак, на яго, як на былога ваеннага, яны мелі віды: «І вось, — расказвае ён мне па сакрэту, — прыязджае раз у фальварак невядомы маладзён і,

[1] Любарскі, у гэты час вайсковы палкавы лекар і добры хірург запісаў тут сваю размову з лідскім прадвадзіцелем дваранства Буткевічам. Сябе Любарскі тут называе ў трэцяй асобе доктарам. Прадвадзіцель дваранства (маршалак шляхты) Буткевіч не будзе удзельнічаць у паўстанні. У гісторыі горада ён застанецца як чалавек, які ў 1878 г. прапанаваў генерал-губернатару разабраць замак Гедзіміна на будаўнічыя матэрыялы.

заяўляе, што мае да мяне важную справу, пайшоў са мной у асобны пакой. Тут ён развёў такую матэрыю, што пад стаць хоць бы самому Пальмерстону[1]. Паўстанне, маўляў, цалкам падрыхтавана, ва ўсіх... землях па Днепр, і поспех яго забяспечаны. Сабрана 100 мільёнаў злотых, чаго на першы раз больш, чым досыць, затым будуць захоплены велізарныя сумы ў розных казначэйствах; зброя ўвесь час падвозіцца з-за мяжы, і ўжо ўтвораны вялікія і надзейныя склады. Ва ўсё Расіі таксама чакаецца ўзброенае паўстанне, якое развяжа рукі. Рэвалюцыйная сетка там, як і ў нас, арганізавана надзейнымі людзьмі і распасціраецца нават за Волгу. Ва ўсіх нашых ваяводствах адразу стане пад стрэльбу 100 тысяч адборнай моладзі, і акрамя таго, у межы царства Польскага ўварвуцца два вялікія польскія войскі — адно з Галіцыі генерала Лангевіча, другое з Познані з фельдмаршалам Мераслаўскім; чакаецца і Гарыбальдзі з атрадам італьянцаў. А як толькі мы паднімем зброю, Напалеон[2] адразу абвесціць вайну Расіі; гэта гэтак жа дакладна, як Бог на небе. Англія ўжо рыхтуе свой флот і адцягне да прыморскіх гарадоў масу рускіх войскаў. Вось нашы шанцы, — выклікнуў „зялёны“ вяршыцель лёсу Расіі, — і толькі ў адным мы маем праблему, — знайсці неабходную колькасць дасведчаных у ваеннай справе камандзіраў. Таму „жонд нарадовы“ камандзіраваў мяне заявіць Вам, што, мае да Вашых ваенных талентаў і Вашага патрыятызму асаблівы давер, рыхтуе Вам намінацыю у палкоўнікі[3] і даручае камандаваць палком Віленскага ваяводства, пра што, калі надыдзе час, будзе адмысловае распараджэнне. Прызнаюся, — сказаў капітан, — я зусім разгубіўся ад гэтай нечаканасці, але сказаў эмісару „жонда“ напрасткі, што такія фантазіі, якія я цяпер выслухаў, выбачальныя ў маладой і гарачай галаве, але ў адносінах да людзей, дасведчаных у ваеннай справе, якія глядзяць цвяроза на рэчы, проста недарэчныя. У рэчаіснасці, Вы можаце набраць невялікія партыі людзей хоць рашучых, але зусім недасведчаных, з якіх большасць нават страляць не умее. А ці ведаеце Вы, што значыць бязладны натоўп супраць арганізаванага войска? Я, як вайсковец, ведаю гэта, і таму менавіта мне і сумленне і патрыятызм не дазваляюць весці сваіх братоў на дакладную смерць. Эмісар велікадушна даў мне час адумацца і, для настаўленьня на розум прыгразіў смяротным прысудам ваеннага суда пасля чаго паспешліва уехаў на пары коней у нетычанке[4] з суседняга панскага маёнтка. Па-сапраўднаму, — дадаў капітан, — варта было б затрымаць „героя“, ды я падумаў, што такіх агітатараў цяпер знойдуцца, можа быць, сотні, і я толькі б пагоршыў сваё становішча, а законныя ўлады хіба ж абароняць мяне, калі яны і для сваёй абароны нічога не робяць?».

[1] Пальмерстон Генры Джон Тэмпл — прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі ў 1855—65 гг.

[2] Напалеон III.

[3] Палкоўнікам потым стаў Людвіг Нарбут.

[4] Нетычанка — аднаколка з плеценым кузавам.

Шаноўны З-скі скончыў свой аповяд тым, што ён не ўсё пераказаў жонцы пасля аўдыенцыі сваёй з госцем каб заўчасна не палохаць сям'ю, але сам з тых часоў знаходзіцца ў трывозе і хоць прыняў на ўсялякі выпадак некаторыя меры, але ўсведамляе небяспеку у якой знаходзіцца, таму што ў глушы фальварка, пры трох работніках, цяжка змагацца з разбойнікамі якія нападуць знянацку. Цікавячыся лёсам свайго знаёмца, я пасля даведаўся, што як толькі ўспыхнуў мяцеж але яшчэ не распаўсюдзіўся на Літву, З-скі выратаваў сваё жыццё тым, што з'ехаў з сямействам да родных жонкі ў Цвярскую губерню. Там ён афіцыйна паведаміў, каму трэба было, пра пагрозах. Тым не менш, фальварак яго быў разрабаваны паўстанцамі, і ўсе пабудовы спаленыя дашчэнту[1].

Улетку 1861 года ўсякія забавы, як грамадскія, так і ў прыватных хатах, раптам спыніліся. Нават замоўкла музыка на фартэпіяна, граліся адны толькі навучальныя гамы. Усе дамы апрануліся ў глыбокую жалобу, дэспатычны ўплыў якой адбіваўся і на нешматлікіх рускіх прадстаўніцах чароўнага полу, жонках афіцэраў, бо паказвацца ў каляровых гарнітурах, пры агульным панаванні чорных, значыла прыцягваць да сябе ўвагу[2]. Пасля было растлумачана, што «жонд» наклаў «на ўсе падуладныя яму вобласці» народную жалобу з нагоды падзей, якія адбыліся ў Варшаве. Справа ў тым, што палякі там 25 і 27 лютага (1861 г.) дзёрзка выступілі супраць урада і зладзілі шматлюдныя вулічныя дэманстрацыі; першыя абышліся добра, але супакоіць другой мірных сродкаў не хапіла. Натоўп шпурляў ў войскі камяні і кідаўся на салдат ўрукапашную, прычым быў пашкоджаны крыж у руках у ксяндза. Не засталося нічога рабіць, як пусціць у ход агнястрэльную зброю, і ў выніку былі забітыя і параненыя. Пайшлі глухія размовы пра зневажанне хрысціянскіх святынь рускімі. На жаль, у нас не было звестак пра падзеі з афіцыйных крыніц і таму давялося нехаця адмоўчвацца.

У 1862 г. нас перакінулі ў Берасце. Па дарозе наш батальён выпадкова набыў фурманку са зброяй для паўстанцаў. У адным мястэчку, дзе мы спыніліся на начлег, батальённаму камандзіру, зразумела, адвялі самую лепшую кватэру ў заезджым двары. Там пад падстрэшкам ужо стаяла фура з нейкай паклажай, пакрытай рагожамі і шчыльна ўвязанаю вяроўкамі. Увечары дзяншчык, не ўбачыў каля фуры гаспадара і запусціў туды руку, вера-

[1] Дарэчы «капітан З-скі», не гледзячы на некаторыя недакладнасці (напрыклад; «капітан» замест «падпалкоўнік»), мог быць Юзафам Залескім, дзедам будучага міністра абароны БНР Кіпрыяна Кандратавіча. Трэба заўважыць, што песімісты, як паказала практыка, як мінімум рэальна ставіліся да вайсковага аспекту паўстання.

[2] Так званая, «маральная рэвалюцыя» набывала форму кампаніі грамадзянскага непадпарадкавання і ставіла ў тупік прадстаўнікоў імперскай адміністрацыі, якія ніколі не сутыкаліся з такімі формамі палітычнага жыцця. Жанчыны ў памяць аб красавіцкіх ахвярах нязменна насілі жалобную адзежу. Тыя, хто не насіў жалобы, падвяргаліся на вуліцах маральнаму ўціску.

годна, меркаваў нечым пажывіцца. Раптам намацаў стрэльбу. Зразумеўшы, у чым справа, дзяншчык далажыў пра сваю знаходку маёру. Пачалі шукаць уладальніка фуры, але ён знік. Яўрэй, гаспадар заезнага двара, на допыце паказаў, што перад нашым прыходам пакарміць коней да яго заехаў невядомы спадар у шэрым сукмане і высокіх ботах. Распрогшы коней, ён увайшоў у залу і запатрабаваў сабе яечню, а тут з'явіліся «панове» з войскам. Гаспадар, замітусіўся і не заўважыў, калі і куды падзеўся ягоны госць. У возе было больш за 200 стрэльбаў, некалькі дзясяткаў шабель, багнетаў, шашак і пісталетаў рознага калібру. Далі ведаць мясцовай паліцыі, але пан у сукмане так і не быў знойдзены. Было жаданне перадаць знаходку бургамістру мястэчка, але потым агульнай радай разважылі, што такім шляхам зброя зноў патрапіць да будучых паўстанцаў, і вырашылі ўзяць фуру з коньмі з сабой, для прад'яўлення начальству вышэй.

На паходзе быў яшчэ адзін маленькі эпізод, які напрошваецца пад пяро. У губернскім горадзе Гродна мы мелі днёўку і наша афіцэрства валам паваліла ў адну немудрагелістую карчму — хто паабедаць, хто пагуляць у більярд, а хто проста пацягацца за дачкой карчмаркі, прыгожай паненкай, якая стаяла за прылаўкам, распараджалася гарэлкай і закускамі і перадавала замовы гасцей прыслузе. Афіцэрства рассыпалася на польскай мове ў ласках, на якія какетлівая дзяўчына адказвала направа і налева з прывабнай добразычлівасцю. Адзін толькі бязвусы прапаршчык, нядаўна выпушчаны з корпуса, не мог прымаць удзелы ў вясёлых гутарках, таму што зусім не ведаў па-польску. Ён сціпла падышоў да паненкі і сказаў, каб яму падалі абед, але тая не адказала яму звычайным: «У тэн момант, пане». Прачакаўшы беспаспяхова з паўгадзіны, офіцэрык ізноў падыходзіць да панны з гэтай жа замовай, але яна застаецца нямая і не рухаецца з месца. Здзіўлены маўчаннем, прапаршчык спытаў: ці яна не разумее рускай мовы? На гэта паненка з пагардай працадзіла: «Я гэтай сабачай мовы не жадаю разумець». «Як вы смееце абражаць мяне, — зычна ўскрыкнуў малады афіцэр, стукнуўшы кулаком па прылаўку, наліваючыся крывёй, — Ды я вас так абражу, што ўсё жыццё памятаць будзеце». Паненка пабляднела і паваліласяся на крэсла ў істэрычных рыданнях. Але прапаршчык не сцішаўся і гучна заявіў, што ідзе да губернатара каб асабіста прынесці скаргу. Сцэна выйшла цяжкая, асабліва калі бледную, як смерць, паненку выносілі ў поўнай непрытомнасці. Нарэшце ў справу ўмяшаліся афіцэры і з вялікай цяжкасцю ўгаварылі таварыша пакінуць без наступстваў «дурную выхадку», за якую жанчына магла б адчувальна паплаціцца. А вось другі гарадзенскі інцыдэнт з афіцэрам у той жа дзень. У грамадскім садзе, ён убачыў трох цывільных маладзёнаў які ішлі насустрач яму і спляліся рукамі каб заняць усю шырыню алеі. Наблізіўшыся да афіцэра, яны ў адзін голас крыкнулі: «Прэч з нашай зямлі». Апынуўшыся тварам да твару з нахабнікамі, афіцэр

пасля хвіліннай нерашучасці сышоў у бок, як растлумачыў ён, каб не ўздымаць скандалу, а можа быць, і таму, што сам быў тутэйшы і не жадаў падвяргаць непрыемнасці сваіх «родаков»[1].

[...]

Рэвалюцыйны энтузіязм моцна падаграваўся касцёлам. Пасля кожнай імшы, замест усталяванай малітвы за царскі дом, усё станавіліся на калені і, пры ўдзеле ксяндзоў, зацягвалі патрыятычны гімн, які пачынаецца словамі: «Божа, Ты гэтулькі стагоддзяў атачаў нас арэолам магутнасці і славы, вярні нам Айчыну і волю»[2]. Гэтая песня-малітва аб аднаўленні незалежнай каралеўства, была так папулярная, што яе спявалі на вуліцах пры кожнай працэсіі. Мала таго, матыў яе можна было чуць з расчыненых вокнаў кожнага дома, дзе было фартэпіяна. Бывала, збяруцца пані на прэферанс, засядуць за зялёны стол і, перакідаючыся картамі, у той жа час спяваюць заклік да Бога аб Польшчы. Не менш папулярная была іншая песня, якая пачынаецца словамі: «З дымам пажараў...».

[1] Параўнай, у той жа час Вільні: *«У сафійскім палку адной з намі 1-й дывізіі быў праведзены з Каўказа паручнік Вернер, родам прусак... аднойчы даволі позна ўвечар... ён прыняў мяне..., галава яго была павязана акраваўленай белай хусткай. Я увечар шпацыраваў па саду..., маладыя людзі ..., праходзячы міма мяне... адпускалі у мой бок абразлівыя насмешкі. ... Пры браме мяне ўжо чакаў натоўп... пачуліся абразы ..., ... у мяне кінулі камень... Тады я выхапіў шаблю... камусьці з тых, хто стаяў бліжэй, шабля патрапіла па галаве, ён упаў, натоўп расступіўся...”.* (Гл.: Межецкий М. П. Воспоминания из беспокойного времени на Литве 1861—1863 годах // Исторический вестник. 1898, Т. 73, №9, с. 830.)

[2] Гімн «Boże, Coś Polskę» быў перакладзены на беларускую, літоўскаю, яўрэйскую і ўкраінскую мовы і стаў вельмі папулярным.

Успаміны Мітрафана Мяжэцкага[1]

Успаміны з неспакойнага часу на Літве ў 1861—1863 гадах

Мяжэцкі Мітрафан Парфіравіч, афіцэр расейскага Нараўскага пяхотнага палка, потым судовы следчы.

Ранняй вясной 1861 г. Нараўскі пяхотны полк, у якім я быў тады палкавым ад'ютантам, выступіў у паход з Курляндыі, дзе ён перад тым кватараваў, у Ліду Віленскай губерні. Выступленне гэтае вызначалася некаторай паспешнасцю: нам не далі нават дачакацца на месцы Светлага свята, і гэты Вялікі дзень прыйшлося сустрэць у паходзе. Пярэдадзень свята захапіў нас у брудным яўрэйскім мястэчку ў адным пераходзе ад Шаўлёў. На пляцы паставілі аналой, прастору вакол яго абгарадзілі ўваткнутымі ў зямлю елкамі, і ў гэтым імправізаваным храме, пад адкрытым небам, наш палкавы святар адслужыў велікодную ютрань; вядома, хроснага ходу не было — вакол чаго ж было хадзіць?.. Памятаю, ноч была ціхая, але цёмная, пахмурная і сырая: ішоў то снег шматкамі, то дробная намаразь. Ніколі, ні перш, ні пасля, мне не даводзілася так сумна, у такім стане, сустракаць дзень Светлага Хрыстова Ўваскрасення.

Пра г. Ліду, у якім мы пражылі цэлы год, існуе ў Літве прымаўка: «Не бачыўшы Ліду, не пазнаеш бяду». Гэта невялікі літоўскі горад, населены пераважна яўрэямі і размешчаны ў невясёлай мясцовасці; у ім быў адзін польскі касцёл і праваслаўная царква, змешчаная ў нізенькай, драўлянай, несамавітага выгляду хатцы. У горадзе не знайшлося нават хоць колькі-небудзь зручнай кватэры для сямейства палкавога камандзіра, які таму вымушаны быў пасяліцца ў абшарніцкай сядзібе, вёрстаў за дзесяць ад горада. Але ў той час хваляванні яшчэ не мелі вострага характару, і падобнае размяшчэнне палкавога камандзіра было небяспечным. Яшчэ не раздаваліся знакамітыя гімны «Boże, Coś Polskę» і «Z dymem pożarów», пакуль усё абмяжоўвалася ўзмоцненымі сходамі адзін у аднаго абшарнікаў і з'яўленнем іх, хоць і рэдка, у нацыянальным строі — канфедэратцы і чамарцы. Прайшло толькі некалькі месяцаў з дня маніфеста аб вызваленні сялян, і ў абшарнікаў пачаліся з імі розныя непаразуменні, якія

[1] Межецкий М. П. Воспоминания из беспокойного времени на Литве в 1861—1863 годах. Исторический вестник, 1898, т. 73, №9, с. 825—827.

ўвесь час патрабавалі ўмяшання вайсковай сілы, здаецца, гэта і было прычынай паспешнага выкліку нашага палка з Курляндыі ў Літву. Падчас кватаравання ў Лідскім павеце полк, што называецца, быў у разгоне: роты, па адной і па дзве, знаходзіліся амаль у бесперапынным перасоўванні, здзяйсняючы пераходы з аднаго паселішча ў другое, для ўціхамірвання, па патрабаванню мясцовых улад, якія складаліся выключна з палякаў, усякіх сялянскіх бунтаў, уціхамірванні гэтыя суправаджаліся, як водзіцца, розгамі, аднак не было чутак, каб падчас гэтай эпідэміі бунтаў з боку сялян супраць каго-небудзь быў ўжыты гвалт. Казалі пасля, што гэтыя бунты ствараліся штучна, і іх уціхамірванне вайсковай сілай уваходзіла ў праграму падрыхтоўчых да рокашу мер, з мэтай узбудзіць у сялянскім насельніцтве нянавісць да маскалёў.

Афіцэрства наша жыло замкнёна ў сваёй палкавой сям'і і з абшарнікамі не збліжалася, прынамсі, так было з афіцэрамі рускага паходжання, афіцэры ж з палякаў і ліцвінаў, якіх было даволі шмат у палку, вядома, знаёміліся з шляхтай-землеўладальнікамі, наведвалі іх і прымалі ў сябе. Таму і нам, рускім, здаралася сустракацца з гэтымі абшарнікамі, часам у нашых таварышаў, а часцей у адзіным у Лідзе шынку, ці як звалі гэтую ўстанову, «цукерні», нейкага шляхціца пана Андрушкевіча, куды паны заходзілі са сваімі знаёмымі афіцэрамі-палякамі. Пры гэтых сустрэчах абшарнікі спачатку бывалі вельмі стрыманыя ў зносінах з намі, рускімі, але калі віно развязвала языкі, пачыналіся гарачыя запэўненні ў неабходнасці збліжэння двух роднасных народаў, усхваляліся старопольские парадкі, ганіліся «маскоўскія», як яны звалі, і выказваліся скаргі на прыгнёт Польшчы. Мы пілі, спрачаліся, у нечым згаджаліся, але разыходзіліся неяк не пераканаыя ў шчырасці па-сяброўску — братэрскіх выказванняў гэтых аднапляменнікаў, якім, трэба сказаць, так і не ўдалося набыць паміж намі прыхільнікаў іх палітычных поглядаў і дамаганняў. Наогул, гадавое знаходжанне палка ў Лідзе і павеце нічым асаблівым не адзначылася, і ўвесну 1862 г. мы з задавальненнем рассталіся з гэтай глухаманню асабліва з погляду на тое, што змянялі яе на Вільню, куды полк атрымаў прызначэнне.

З успамінаў Вандаліна Шукевіча[1]

Голас з Рудніцкай пушчы. Адзін з эпілогаў паўстання.

Дзякуючы Юзафу Шукевічу — пляменніку Вандаліна Шукевіча, мы атрымалі магчымасць надрукаваць фрагмент тэксту аб падзеях паўстання 1863 г., напісаны праз гады Вандалінам Шукеічам на падставе ўласных успамінаў дзяцінства. (Рэд. Віленскага Кур'ера).

У памятным для кожнага мясцовага чалавека студзені 1863-га года амаль што не было зімы. Толькі трохі закранула яна сваім снежным крылом нашу краіну і ўмацавалася дзесь далёка за Дзвіной і Дняпром, пакінуўшы зямлю голай і бруднай, але не замарожанай, а загорнутай у шэрыя туманы, якія час ад часу разрывала яркае сонца, якое дасылала зямлі свае гарачыя пацалункі. Старэйшыя людзі не памяталі такога цяпла ў гэтую пару і прыпісвалі такую з'яву ласцы Пана Бога, які злітаваўся над тымі, хто пакінуў свае сямейныя агмені і самае дарагое ў жыцці, хто туляўся па лясах і ваяваў на баку святла пры гэтым цэлымі тыднямі не меў даху над галавой.

У красавіку вясна была ўжо ў самым росквіце, яна рассявала па зямлі, якая ўжо прачнулася ад зімовага сну, свае чарадзейныя дары і напаўняла людскія сэрцы надзеяй.

Надзея! Хто тады не меў яе ў нашым краі? Каму не мроіліся вялікія планы адбудовы сваёй дзяржавы? Бо, хто не марыў — той не меў веры…

«*Гэтая труна, якая стаіць падпёртая рукой гіганцкага ката, разломіцца*»[2]. Хто не чакаў уваскрашэння! Але іншыя былі планы Ўсявышняга! Гром праходзіў за громам, героі гінулі за ідэю і пакідалі пасля сабе пустату, якую нельга было запоўніць. Нягледзячы на вялізныя высілкі герояў, Святая справа не перамагла.

Адна з першых сцэн гэтай гістарычнай трагедыі разыгралася ў Лідскім павеце. Галоўным акцёрам драмы быў Людвік Нарбут, сын Тэадора, знанага гісторыка Літвы. І трэба сказаць, што Людвік выканаў даручаную яму ролю па-майстэрску. Згодна з меркаваннямі спецыялістаў, ягоная тактыка вайны была настолькі дасканалай, што яе потым вывучалі ў вайсковых

[1] Kurjer Wilenski №22 (2912) 24 stycznia 1934.

[2] «Że grób ten pęknie, co stoi wśród świata przyparty ręką olbrzymiego kata» — радок Зыгмунта Красінскага (Zygmunt Krasinski).

школах як узор партызанкі. Быў ён тут майстрам, загартаваўся ў агні вайны на Каўказе, куды быў сасланы з віленскай гімназіі ў 1848 г. і 11 гадоў служыў шараговым жаўнерам, удзельнічаў у больш, чым у 90 сутычках і вялікіх бітвах. Вярнуўся дамоў, бо кроўю заслужыў афіцэрскі чын. Ледзь паспеў адпачыць ад небяспечных вайсковых спраў і прызвычаіцца да цяпла хатняга агменя, як Айчына, якая пачала ўставаць з труны, паклікала яго да зброі. Прызначаны кіраваць збройным паўстаннем на Лідчыне ён збірае людзей і на Грамніцы, выконваючы свой абавязак, выступае з групай байцоў. Але я не маю намер пісаць гісторыю партызанскага руху, якім на працягу больш двух месяцаў кіраваў Нарбут. Хацеў бы толькі дзеля памяці нашага героя і яго сяброў падаць некалькі ўспамінаў з тых бурлівых дзён, якія засталіся нават у маёй дзіцячай памяці.

Людская памяць ненадзейная. Асабліва ў памяці дзіцячых гадоў часта нават дробныя дэталі могуць мець вялікую вагу, заціраючы больш значныя эпізоды і такім чынам ствараць невыразнае хаатычнае цэлае з якога час ад часу ўсплываюць розныя факты і фактыкі. У маёй памяці, перад усім, захавалася адчуванне напружанасці, якое ахоплівала мяне, калі я здалёк бачыў жаўнерскую масу якая сунулася па дарозе ад чыгункі[1]. Гэтая жаўнерская маса рабіла ўражанне гіганцкай змяі, у якой зіхацяць на сонцы жалезныя шыпы — багнеты.

Я ведаў, што гэтая змяя паўзе, каб знішчыць нас, і страх ахопліваў маю дзіцячую душу, як быццам я бачыў постаць самой смерці! І дзіўная рэчы — не думалася пра пагрозу сябе асабіста, хоць пагроза не раз была вельмі блізка бо паўстанцы не абміналі наш дом. Але я адчуваў што шэрая маса на дарозе — гэта смерць нашых братоў, а бляск багнетаў гэта маланкі накіраваныя ў нашых герояў, якія змагаліся за волю. Далей памятаю агідныя ўражанні выкліканыя гукам стрэлаў бітвы ў Лакштунцах[2], потым глухія весткі пра паразу і рассеянне паўстанцаў, пра смерць Нарбута пад Дубічамі і нарэшце пра пахаванне ахвяр, енкі роспачы ўсіх дарослых.

---

[1] У 1860—1862 гадах праз паўночна-заходні ўчастак Лідскага павета была праложана чыгуначная лінія Санкт-Пецярбург-Варшава праз Вільню, на якой былі пабудаваны станцыі Вільня, Ландвараў, Руднікі, Алькенікі, Араны, Марцінканцы, Парэчча і Гародня. Гэтая чыгунка актыўна выкарыстоўвалася ўладамі для перавозкі войск.

[2] Ва ўрочышчы Лакштунцы адбываліся фінальныя падзеі бітвы пад Кавалькамі 20 красавіка 1863 г. Удзельнік паўстання Міхал Эльвіра Андрыёлі пісаў пра гэта: *«Акружаныя і заціснутыя маскалямі, якія мелі за справу гонару разбіццё аднаго аддзела, што меў славу на Літве, цэлую ноч адступалі без дарог, змучаныя, галодныя, замёрзлыя. Ксёндз Гарбачэўскі, Краінскі, Нарбут і праваднік са свечкаю ў руках шукаюць дарогі па пушчы. Мы парамі, хістаючыся ад стомы і сплючы на маршы, чапляючыся за калоды і выватні, сунемся следам за агеньчыкам. Бываюць хвіліны, што нашы праваднікі губляюцца ў вялізарнай пушчы, кажуць аддзелам спыніцца, а самі разыходзяцца шукаць слядоў дарогі: тады адны стоячы, другія прысеўшы, іншыя абапёршыся зноў засынаюць чуткім сном. Зноў каманда: „Руш“, — і цягнецца сонная, змучаная дружына. Пад раніцу, пераканаўшыся, што кружым вакол, кідаем асцярожнасць і галодныя спыняемся недалёка ад хаты лесніка ва ўрочышчы Лакштунцы. Пра выбар*

пазіцыі няма гаворкі. Бо мы думаем, што маскалі, збітыя нашым начным бадзяннем, пакінуць нас у спакоі. Затрымаліся ў сярэдзіне вялізнага лесу, маючы за сабой балота, а перад вачамі невялікую прасеку, цераз якую вілася сцежка да лесніка. Сонца пачынае прыпякаць, пад адзінаццаць раніцы становіцца горача. Кожны размясціўся, як мог, захоўваючы, аднак, баявую лінію, павернутую фронтам да прасекі. Адны спяць, другія ядуць, іншыя выграваюцца на сонцы, некаторыя чытаюць кніжкі альбо лісты. Каля другой пазіцыі ад паўдня зменены пікеты, цішыня ў лагеры нечуваная, чуцён піск мух і камароў. Нарбут на хвіліну адышоў за зараснік, звыклая пільнасць на гэты раз аслабла, цяпло і стома апанавалі ўсімі. Раптам стрэл здалёку, а за ім два іншыя: „За зброю, за зброю!“. Нарбут ужо паміж намі. Забурліла, як у катле, падхопліваюцца задрамаўшыя… пытанні, неспакой, замяшанне. Толькі начальнік спакойны, гаворыць пасунуцца наперад на 300 крокаў і заняць баявую лінію па трое ўздоўж краю лесу і прасекі. Пераканаліся тады, што можа халодная адвага аднаго чалавека. Усе, хвіліну назад трывожныя, неспакойныя, гатовыя ўцякаць, зараз прытомныя, зручна пазаймалі прызначанае сабе месца. Касінеры з афіцэрам у баявой калоне залеглі праз 200 крокаў за стралкамі. Тыя ж, хаваючыся за пнямі і ў кустах, галавой наперад з руляй перад сабой і пальцам на спуску, чакалі каманды да стральбы, а здалёку ўжо гралі маскоўскія трубы баявы сігнал: „Рассыпались молодцы! За камни, за кусты, по два в ряд!“ Знаёмы той сігнал дагэтуль гучыць у вушах. У лесе, дзе кожны куст, кожнае дрэва хавае засаду, дзе ніколі нельга палічыць непрыяцеля, дзе кожнаму здаецца, што толькі ён і некалькі бліжэйшых яшчэ бароняцца, а рэшта ўжо ўцякла, дзе рэха сто разоў паўтарае стрэлы і рык маскалёў, а небяспека, здаецца, атачае з усіх бакоў — вайсковая труба робіць немалое ўражанне. „Пане Пілецкі, — гукае Нарбут, — вазьмі 10 чалавек і руш на рэкагнасцыроўку, — а праз хвіліну: — Калі ласка, не рызыкуй“. Пілецкі, былы студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта, смелы, талковы, разважлівы, а прытым ветлівы і далікатны хлопец, быў улюбёнцам усяго аддзела. Яму то Нарбут давяраў найрызыкоўнейшыя справы, пэўны ў тым, што той з іх смела і разважліва выйдзе. Пасля адходу Пілецкага наступіла ціша, якой нават маскоўская труба не прарывала. Толькі сэрцы біліся хутчэй. Нарбут перабягае ўздоўж усёй лініі з шашкай у адной і шапкай у другой руцэ, спыняецца, слухае і зноў выглядае, ці ўсе на месцы. Страшную цішу неспадзявана разрываюць гукі некалькіх стрэлаў, загралі трубы, і даляцела: „Ура-Ура“, якое лес падхапіў і на тысячу таноў паўтарыў. Зашамацелі кусты, і з стрэльбамі, якія яшчэ дыміліся, выскачылі нашы рэкагнасцыроўшыкі. Твары белыя, дыханне прыспешанае: „Пане начальнік! Ідуць шасцёркамі, лінія велізарная, займаюць крылы!“ — „Добра! На месца! Ціха… ніякіх галасоў! Хто крыкне — расстраляю! Страляць прыцэльна! Чакаць, пакуль не загадаю! Каб мне ніхто не піскнуў!“ А ад стрэлаў маскоўскіх здавалася, што ломіць лес, кулі капаюць зямлю. Ужо сям-там чуваць: „Езус, Марыя! Правядзіце мяне на воз!“ Але загадана не страляць. І кожны сэрцам, што гучна б'ецца, з стрэльбай наперад чакае, пакуль яму пакажацца маскаль. Гулка грыміць лес. Стрэлы і крыкі ў 100 раз гусцейшыя і бліжэйшыя, ломяцца галіны, чуваць рух цяжкай масы. Праз хвіліну ўбачым маскоўцаў, а перад намі прасека, ціхая, аблітая сонцам. Замігалі шэрыя шынялі, бліснула зброя і белыя акруглыя аблочкі на фоне лесу. Маскалі займаюць супрацьлеглы край прасекі. Хаваюцца за дрэвы, але наперад, нягледзячы на загады афіцэраў, не рухаюцца. Відаць, іх непакоіць ціш з нашага боку. Нарэшце з трэскам і стрэламі рухаюцца шасцёркамі. Была то хвіліна збавення, сэрцы біліся гвалтоўна, яшчэ 40 крокаў і вытнуць у штыкі, але раздаўся знаёмы нам моцны голас: „Агонь, хлопцы, усёй лініяй!“ І ад канца да канца праляцеў выбух больш сотні стрэлаў, а потым ціша і дым. Не граюць трубы, маўчыць „Ура!“. — Добра, добра, спраўна, набіць зброю, востра, хлопцы! — гукае расчырванелы Нарбут, абабягаючы ўсю лінію. Зноўку граюць трубы, і чуваць маскоўская каманда, зноўку грымяць стрэлы і: „Ура, вперёд, ребята!“. Ломяцца кусты. Прымушаныя, гнаныя сілай паслушэнства, кідаюцца маскалі галавою ўніз з штыкамі наперад. Ужо, ужо сядзяць нам на карку. Яшчэ хвіліна — і ўсе кінемся наўцёкі. Але на выгук: „Агонь, прыцэльна!“ запаляюцца 150 стрэльбаў на нашай лініі. Воблака дыму закрывае ўсё, уціхае трэск, чуваць толькі енкі параненых і канаючых з абодвух бакоў. Але не доўга трывае цішыня, падходзіць падмога. Зноў заенчыў лес, стрэлы, крыкі, паніка…

Страчана надзея, цемра без променю агню, пекла.

Гэтыя ўспаміны мінулага, нібы пералётныя птушкі, абселі мой розум. За ўвесь час не забылася гора аб забітых Злом, гэтым горам жылі старэйшыя пакаленні, гора, таму што столькі сіл і энергіі, столькі гераізму пайшло марна! Бо колькі было неабходна гераізму, каб пайсці на смяротную справу, не маючы надзеі, што нават асабістая смерць створыць умовы для жыцця наступных пакаленняў. Такой надзеі Нарбут не мог мець, бо як прафесійны вайсковец добра ведаў моц абодвух бакоў. Бачыў, што паўстанне не толькі не пашыраецца, але нават наадварот — гасне з кожным днём, што сілы з кожным днём змяншаюцца, а дапамога, якую чакалі, не прыходзіць. Але пры гэтым не падаў духам, змагаўся да апошняй кроплі крыві і аддаў сваё жыццё за Бацькаўшчыну. Сутычка ў Лакштунцах, гукі якой так адбіліся ў маёй дзіцячай душы, была адносна паспяховай. Бо толькі не ўтрымаліся і адступілі перад рэгулярным войскамі, якія значна пераважалі, мелі нават гармату. Але ваявалі спраўна і значна прарэдзілі шэрагі рускіх. Таму іх не праследавалі, і паўстанцы маглі адступіць ў балоты рэк Котры і Пелясы на поўдзень ад Дубічаў. Тут Нарбут, адчуваючы сябе ў адноснай небяспецы, дазволіў трохі адпачнуць пасля доўгіх і цяжкіх пераходаў, чакаў папаўнення з Троцкага павета. Не дачакаўся, бо 4 траўня выбухнула другая бітва, апошняя ў яго жыцці. Бітву пад Дубічамі добра не памятаю, ведаю толькі, што палкоўнік Цімафееў, высланы супраць Нарбута на чале аддзелаў гвардыі, стаяў каля Начы, а потым пайшоў у Дубічы, дзе ён нейкі час затрымаўся перад ударам па паўстанцах, якія атабарыліся паміж рэкамі і балотамі. Гэта прамаруджанне тлумачылася па-рознаму: адны даводзілі, што яго трымаў страх няўдачы, бо не ведаў, якія сілы мае Нарбут і чакаў дапамогі, іншыя тлумачылі прамаруджанне міралюбнасцю Цімафеева, які не жадаў дарэмна ліць кроў сваіх жаўнераў і таму цягнуў час, каб даць Нарбуту час адступіць у бяспечнае месца Гарадзенскай пушчы. За апошнюю версію кажа факт, з якога пачаўся бой: пасля трох ці чатырох дзён бяздзеяння некалькі афіцэраў, лічачы, што паўстанцы далёка, выбраліся на лодках на паляванне і праз некалькі вёрст уніз па рацэ неспадзявана наткнуліся на паўстанца. Той выстраліў і пабег да сваіх, а афіцэры як хутчэй вярнуліся ў Дубічы[3]. Адразу пасля гэтага рускае войска выйшла з Дубіч шукаць паўстанцаў. Пры пераправе це-

Даём агню некалькі разоў, яшчэ трымаемся. Раптам пабегла левае крыло, зламанае націскам маскалёў, стараемся ўтрымацца, але ўжо позна. Кідаемся направа, за малое балотца, дзе ўсё фармуецца вакол начальніка. … Агонь аддаляецца, чуваць толькі адзіночныя стрэлы, галасы ціхнуць, лес замаўкае, ціша, але як яна адрозніваецца ад ранейшай. Бітва скончылася. Пунцовае сонца села за лесам. Здалёк даходзіць да нас глухі шум размоў, водгалас трубы і ад часу да часу далёкі стрэл. Ноч…» — Цыт. па Суднік Станіслаў. Людвік Нарбут // Наша слова №37 (1084) 12 верасня 2012 г.

[3] Па іншай версіі, для пошуку паўстанцаў, быў пасланы на другі бераг выведнік. Вярнуў-

раз раку каля Дубіч па вузкай кладцы ім ніхто не перашкаджаў. Жаўнераў праводзіў знаёмымі сцежкамі сярод балот селянін Базыль[4] (павешаны потым паўстанцамі з атрада Віславуха)[5]. Так салдаты дайшлі да паўстанцкага лагера. Бой быў кароткім. Пасля першых стрэлаў Нарбут быў паранены ў нагу. Паплечнікі згрудзіліся каля яго і спрабавалі вынесці з прастрэльванага месца. На гэта звярнуў увагу непрыяцель і менавіта на гэтай групе сканцэнтраваўся агонь салдатаў, амаль што ўсе паплечнікі Нарбута былі забітыя (менавіта гэты момант намаляваны ў Андрыёлі)[6]. Загінуў Нарбут, якога неслі на руках, загінулі Леан Краінскі з Грышанішак, Францішак і Аляксандр Бразоўскія з Гурнофеля, што пад Васілішкамі, Уладзіслаў Жукоўскі з Лацка, Губарэвіч, Пётр Янкоўскі, Пакемпіновіч, Скірмунт з Пінщчыны, Ёдка з Петрашунцаў, Лукашэвіч з ваколіцы Меканцы, селянін Грэмза з вёскі Ліпканцы і іншыя[7]. Рэшта паўстанцаў рассеялася па лясах і часткова патрапіла ў рукі ворага, часткова памерла ад ран і голаду, част-

шыся, ён расказаў, што за ракой ёсць пікет паўстанцаў. Выведніку з мясцовых не асабліва давяралі, і таму штабс-капітан Рэнвальд, камандзір 1-й стралковай роты, вызваўся праверыць гэтае данясенне. Пераапрануты паляўнічым, ён ўзяў з сабой стрэльбу і сабаку і, сеўшы ў човен, загадаў двум веслярам, таксама ўзброеным стрэльбамі, плыць уніз па рацэ. Пад'ехаўшы да таго месца, дзе першы выведнік бачыў пікет, афіцэр выйшаў з лодкі і пачаў аглядаць процілеглы бераг, быццам бы адшукваючы дзічыну, і неўзабаве ўбачыў пікет інсургентаў. Складзеныя ў сошкі стрэльбы з развешанай на іх бялізнай даказвалі, што паўстанцы не чакалі з'яўлення выведніка. Аднак вартавы заўважыў Рэнвальда і прыцэліўся ў яго, тады афіцэр хутка знік з берага, дабег да чоўна і паплыў да сваіх. — Гл: па История Лейб-гвардии Павловского полка. СПб., 1890. С. 418.

[4] Па іншай версіі — Адам Карповіч. Менавіта з дапамогай падкупленых сялян Адама Карповіча і Антона Талікоўскага (ці Талочкі), былі знойдзены сляды інсургентаў і потым здраднік Адам Карповіч ад сялян дазнаўся, што аддзел Нарбута знаходзіцца ў Дубіцкай пушчы каля возера Пеляса і данёс Цімафееву — Гл. Karbowski W. Ludwik Narbutt. Życiorys wodza w powstaniu styczniowem na Litwie. 1935. S. 111–119.

[5] 1 чэрвеня па прысудзе Нацыянальнага Ўраду ў вёсцы Мантаты быў павешаны Адам Карповіч. Потым былі запісаны апошнія словы Карповіча, і мы ведаем на якой мове паўстанцы размаўлялі паміж сабой. Калі інсургенты шукалі вяроўку, каб павесіць здрадніка, ён сказаў ім літаральна наступнае: *«Паны, нашто шукаеце вяроўку, я маю дзяжку, тай павесьце»*, у польскім тэксце кнігі за гэтымі словамі, запісанымі лацінкай, ідзе пераклад на польскую мову. Здраднік вісеў два тыдні перад хатай Баневіча ў Мантатах, пакуль яго не знялі рускія салдаты. — Гл. Karbowski W. Ludwik Narbutt. … S. 128–130.

[6] Вакол Нарбута сабралася групка самых верных байцоў. Яны адыходзілі, падтрымліваючы камандзіра і адстрэльваючыся. На гэтую групку быў накіраваны агонь большай часткі салдатаў. Амаль што ўсе, хто быў разам з Нарбутам, былі забіты. Апошнімі да палкоўніка падбеглі Уладзіслаў Клімантовіч і Севярын Якубоўскі, яны і пачулі яго апошнія словы: *«Dulce est pro patria mori»* (*«Салодка памерці за Радзіму»*).

[7] Паўстанцы, загінуўшыя пад Дубічамі: 1. Нарбут Людвік, 32 гады; 2. Бразоўскі Аляксандр, 32 гады, лекар з Гурнофеля; 3. Бразоўскі Францішак, 35 гадоў, жыхар Гурнофеля; 4. Грэмза Казімір, 25 гадоў, селянін з Ліпкунцаў; 5. Губарэвіч Стэфан, 35 гадоў, жыхар Галавічполя; 6. Ёдка Станіслаў Ян, 22 гады, жыхар Петрашунцаў; 7. Краінскі Леан, 35 гадоў, жыхар Гры-

кова далучалася да іншых паўстанцкіх аддзелаў. Але аддзел Нарбута перастаў існаваць.

Пасля разгрому паўстанцаў, палкоўнік Цімафееў вярнуўся ў Дубічы і даў дазвол пахаваць палеглых з набажэнствам. Гэты, для таго часу, людскі ўчынак прынёс яму сімпатыю. Па лесе былі падабраныя трупы паўстанцаў, перанесеныя да мясцовага касцёла і зложаныя ў бабінцы.

Страшны, грозны, а таксама балючы быў выгляд пакутнікаў за свабоду, распранутых да кашуляў і ляжаўшых ў рад, нібы зжатыя смерцю снапы. Такая невымерная павага, такая веліч адчувалася ў гэтых постацях, што мы глядзелі на іх, як на святых, як на найлепшую частку нашага народа, якую страцілі назаўжды і з якой назаўжды будуць пахаваныя нашы надзеі і самыя прыгожыя мары.

Вестка пра дазвол пахаваць герояў разышлася хутка і кожны паспяшыў да касцёла, і кожны прывёз усё неабходнае для цырымоніі пахавання. Людзей было так шмат, што яны запоўнілі не толькі касцёл, але і ўсе могілкі, і адусюль да нябёс уздымаліся малітвы. Чуліся енкі і крыкі роспачы, гэтыя гукі плылі па хвалях блізкага возера, шумелі бурай у блізкай пушчы і агромністай скаргай уздымаліся да скляпення нябёсаў, клічучы да помсты і ратунку народа, які гінуў. Усе ціснуліся ў натоўпе, каб хоць здалёк пабачыць чорную панурую піраміду з нябожчыкаў, якая танула ў зелені, затопленая плынямі святла і дыму ад кадзільніц. Кожны стараўся назаўжды запомніць бледныя і змярцвелыя дарагія рысы, якія яшчэ зусім нядаўна жылі з запалам і любоўю да Айчыны. І прыняла іх парэшткі маці-зямля, якую яны так любілі, а людзі сваімі далонямі засыпалі іх вялікі, як народная крыўда, дол. Толькі скончыўся балючы абрад, толькі раз'ехаліся апошнія ўдзельнікі пахавання, як прыйшоў іншы вайсковы аддзел з казакамі, каб разагнаць сабраўшыхся тутэйшых. Але спазніліся і таму, каб сцерці з паверхні зямлі след «бунтовщиков», толькі зруйнавалі курган над магілай. Некаторыя з мясцовага люду апавядалі яшчэ горшыя рэчы, а менавіта, што ўначы труны былі выкапаныя і кінутыя пасярод возера. Зараз месца, дзе магіла герояў, адзначана доўгай упадзінай з каменем, на якім надпіс «*Леон Краінскі, 1863*», пасярэдзіне[8]. Пуста і глуха зараз у гэтым закінутым кутку нашай Радзімы, нічога не напамінае

шанішак; 8. Пакемпіновіч Юзаф, 22 гады, студэнт Кракаўскага ўніверсітэта; 9. Паплаўскі Уладзімір, 28 гадоў, жыхар Капцюхі; 10. Скірмунт Тамаш, 30 гадоў, з Піншчыны. 11. Тарашкевіч Ігнат, 38 гадоў, фельчар з Ліды; 12. Жукоўскі Уладзіслаў Вандалін, 27 гадоў, жыхар Лацка. 13. Адам, прозвішча невядомае, сябар Нарбута.

[8] Успаміны напісаны да 1914 г. 70 гадоў магіла паўстанцаў выдзялялася толькі адным каменем з надпісам «Леон Краінскі, 1863», які ўсталявала сям'я аднаго з 13 пахаваных тут паўстанцаў. У 1933 г., па ініцыятыве жаўнераў і афіцэраў 76-га Лідскага палка пяхоты ў Дубічах паставілі помнік памяці Людвіка Нарбута і палеглых паўстанцаў. Сродкі на яго пабудову былі сабраны спецыяльным Камітэтам Лідчыны, на чале якога стаяў генерал Эдвард Рыдз-Сміглы. Праект помніка выканаў Фердынанд Рушчыц. У падножжа помніка закапаны пастамент помніка Мураўёву-Вешальніку, які быў пастаўлены расейскімі ўладамі ў

трагедыі, якая тут адбылася раней, і нават людская памяць гэтыя светлыя вобразы нашай гісторыі захавала ў выцвілых барвах…

Ці былі высілкі герояў марнымі?

Для паўнаты разумення падзей у Лідскім павеце, дазволю сабе дадаць яшчэ адзін эпізод, які адбыўся пры канцы бою пад Дубічамі. Адзін з удзельнікаў быў паранены ў нагу, страціў шмат крыві, і перамагаючы боль краўся ў бок мястэчка Забалаць. Паўстанец прылёг у лесе, каб набрацца сіл і пабачыў вайсковы аддзел з афіцэрам на чале, які ішоў у яго бок. Ні хвіліны не марудзячы, не думаючы пра наступствы, ён выстраліў у афіцэра з пісталета і забіў яго. Жаўнеры кінуліся да паўстанца і літаральна ўзнялі яго на багнеты, пасля чаго вырашылі, што герой загінуў і таму пакінулі ў лесе, а цела афіцэра панеслі з сабой. Аднак, атрымаўшы шаснаццаць ран, паўстанец не памёр, яго знайшлі і перанеслі ў бліжні маёнтак. Ён выжыў, цалкам выздаравеў і зараз ранамі, якія пакрываюць яго цела, можа засведчыць праўдзівасць сваёй гісторыі[9]. Гэта адзін з шматлікіх фактаў, якія паказваюць баявы дух, што жыў у мужных сэрцах нашых ваяроў за свабоду і ўздымаў іх да вышыняў сапраўднага гераізму. Наша павага ім за пралітую кроў, за ахвяры якія яны панеслі дзеля Бацькаўшчыны. Павага да пакутнікаў якія загінулі з-за любві да свабоды. Хай памяць пра іх застанецца ў наступных пакаленнях, а пралітая кроў, нібы вясеннія плыні, хай угноіць глебу нашага духу, якая страціла ўрадлівасць пад цяжарам няволі і падрыхтуе яе да прыняцця божага пасеву.

Вільні ў 1888 г. да 25 угодкаў задушэння паўстання. Сам помнік быў вывезены з Вільні расейцамі ў 1915 годзе перад наступленнем нямецкіх войскаў, а пастамент тырчаў на пляцы Напалеона ў Вільні да 1933 года.

[9] Верагодна, гаворка ідзе пра Пятра Паплаўскага, пра яго — у наступных мемуарах.

Успаміны Юльяна Гжымайлы-Прыбыткі[1]

З успамінаў аб 1863 г.

Ад перакладчыка: *Юльян Гжымайла-Прыбытка на пачатку XX ст. закончыў Рыжскую палітэхніку, да 1914 г. працаваў на пасадах чыноўніка рознага ўзроўню ў Лідскім павеце. У 1920–1930 гг. — суддзя. Ягоны брат — Антон Гжымайла-Прыбытка, неаднаразова выбіраўся ў Гарадскую раду, быў лаўнікам Магістрата і выдатным лідскім краязнаўцам.*

Міхал Шымялевіч пісаў у рукапісе пра высяленне лідзян у Казахстан у 1940 г.: «Вёска Краснапяроўка (у Казахстане). (Сярод ссыльных — Л. Л.) Прыбытка Анна (1905 г.н.) з дачкой Данутай (1925 г.н.) і Ванда (?). (Анна) жонка (пэўна, другая жонка — Л.Л.) уладальніка маёнтка Кажамякі гміны Новы Двор, сына генерал-маёра Аляксандра Прыбыткі, Прыбыткі Юльяна, 1883 г.н., віца-старшыні Лідскага аддзела Віленскага акруговага суда. Быў арыштаваны ў 1939 г. і хутка памёр у турме…»[2].

> *Друкуем вельмі цікавыя ўспаміны аб студзеньскім паўстанні ў Лідскім павеце, напісаныя прэзідэнтам Юбілейнага камітэта па ўшанаванні памяці Людвіка Нарбута, суддзём Юльянам Прыбыткам (Тэкст рэдактара «Лідскай зямлі» Абрамовіча — Л. Л.).*

Маё «сельскае-анёльскае» дзяцінства прыпала на эпоху, калі яшчэ ўспаміны з 1863 г. жылі ў памяці сваякоў, жыў рамантызм безнадзейнага змагання і высокае натхненне. Тыя падзеі былі грунтам, на якім мы, малыя слухачы ўспамінаў старэйшых людзей, выхоўвалі свае пачуцці і свой патрыятызм

Памятаю тыя цікавыя хвіліны, калі я са сваім братам, с. п[3]. Эмілем зімовым вечарам слухалі аповяды нашай бабкі с. п. Стэфаніі Паплаўскай з Шалевічаў, удавы па Юльяне Паплаўскім, уладальніку Кажамякаў, Ваўчынак і Капцюхоў у Лідскім павеце і чальцы Паўстанцкага камітэта Лідчыны, а таксама с. п. Паплаўскага Пятра, сябра маладых гадоў майго дзеда

[1] Julian Grzymala-Przybytko. Ze wspomnień o 1863 // Ziemia Lidzka. 1938. №5—6. S. 59–60.

[2] Michał Szymielewicz. Wysiedlenie do Kazachstanu w r. 1940 znacznej części mieszkańców powiatu lidzkiego // Fundacja-Zakład narodowy im. Ossolńskich. Katalog Rękopisów akcesyjnych Akc. 26/56. S. 60.

[3] Святой памяці.

Юльяна, ветэрана паўстання 1863 г. Карбоўскі[1] ў сваёй працы пра Нарбута памылкова называе Уладзіміра Паплаўскага сябрам Камітэта — Уладзімір Паплаўскі (герба Дрэвіца) быў братам Пятра і, думаю, не быў чальцом Камітэта, а быў (ведаю гэта пэўна), дзясятнікам у аддзеле Людвіка Нарбута — казаў мне пра гэта яго брат Пётр, а спалучэнне гэтых дзвюх функцый было немагчыма.

Уладзімір паходзіў з фальварка Крэвін Сабакінскай гміны, меў маці з Гофманаў і, калі не памыляюся, пераважна жыў у Капцюхах, дзе дапамагаў па гаспадарцы свайму сябру і аднакашніку Юльяну Паплаўскаму (герба Траска), які нават не быў яго сваяком. Менавіта з Капцюхоў Уладзімір Паплаўскі і пайшоў у паўстанне. Верагодна, таму Карбоўскі і палічыў яго ўладальнікам Капцюхоў і чальцом Паўстанцкага камітэта. Уладзімір Паплаўскі загінуў пад Дубічамі, а Пятра, закатаванага самым гвалтоўным чынам маскалямі пад Ганэлькамі, ледзь не засыпалі ў агульнай магіле з палеглымі паўстанцамі, але сяляне, якім даручылі гэтую справу, заўважылі, што паўстанец жывы і адвезлі ў блізкія Сабакінцы, да ягонага крэўнага Цыпрыяна Шалевіча, дзе ў сховішчы ён неяк залячыў свае раны. Сасланы быў потым на Каўказ, дзякуючы старанням маёй бабкі, пасля маніфеста вярнуўся дахаты. С. п. Пётр Паплаўскі быў чалавекам небывалага гарту: не раз, пасля маіх просьбаў (я быў дзевяцігадовым хлопцам), паказваў мне свае шнары ад ранаў, а меў іх 17, бо жаўнеры, раз'юшаныя ягоным адпорам, некалькі разоў падкідвалі яго на багнетах[2]. Адна куля патрапіла яму ў нагу, рана зажыла і бядак хадзіў з гэтай куляй, нават не надта яе адчуваючы. Толькі падчас непагоды давалася гэта куля яму ў знакі.

Мая маці апавядала, што ў яе дзяцінстве аднойчы «Пан Пётр» (так звыкла яго называла) не прыйшоў у прызначаны час на абед, і таму наша бабуля накіравала яе ў афіцыну[3], у якой «Пан Пётр» жыў, каб паклікаць яго да стала. Дарэмна мая маці грукала ў дзверы — у хаце было ціха. Калі ж яна заглянула ў акно пакоя паўстанца, дык убачыла наступнае: «Пан Пётр» сядзеў на лаве з аголенай нагой і заўзята калупаў сцізорыкам ў тым месцы, дзе была куля. На падлозе стаяла мядніца[4] з крывёю і кубак з вадой, а каля яго ляжаў кавалак чыстай тканіны. «Пан Пётр» папрасіў, каб абед прынеслі да яго, і вынікова скончыў аперацыю — праз хвіліну здабыў кулю і забінтаваў нагу. «Пан Пётр» трыумфаваў, кажучы, што ён — сам для сябе самы лепшы хірург. Такія гэта былі людзі.

Мой дзед, Юльян Паплаўскі, як чалец Камітэта, забяспечваў паўстанцкі аддзел. Бабуля мне расказвала, што ён неяк загадаў, каб яна разам з паннамі і дзяўчатамі-служкамі, якім можна давяраць, пашыла 200 кашуль для

[1] Karbowski W. Ludwik Narbutt. Życiorys wodza w powstaniu styczniowem na Litwie. 1935.

[2] Верагодна, менавіта Пятра Паплаўскага ўзгадваў Вандалін Шукевіч у сваіх мемуарах.

[3] Флігель.

[4] Медны таз.

паўстанцаў. З-за перасцярогі праца кіпела пераважна ўначы, Праз некалькі дзён мой дзед вярнуўся з тайнага паседжання Камітэта і запытаў бабулю аб кашулях.

— Ужо адаслала, — кажа яна. — І каб нашы дарагія ваяры бачылі, каму яны павінны быць удзячныя за такія якасныя кашулі, унізе кожнай з іх вышыты твае ініцыялы.

Дзед схапіўся за галаву.

— Але ж, Стэфця, калі пасля бітвы на палеглых ці параненых знойдуць кашулі з маімі ініцыяламі, стане вядома, хто іх шыў, што я сябар Камітэта і падтрымліваю паўстанцаў.

Мая збянтэжаная бабуля, зразумеўшы сваю памылку, адразу выслала да паўстанцаў служку з ножыкам. Служка дагнаў воз, які вёз прыпасы і кашулі для паўстанцаў ужо на самым ускрайку Гарадзенскай пушчы. Ён зрэзаў ініцыялы майго дзеда з кашуль. Аднак гэта не дапамагло, і праз некалькі месяцаў чуйны прыстаў з Васілішак[1] арыштаваў майго дзеда. Пад экскортам казакоў яго выслалі да Вільні і пасадзілі ў турму, якая месцілася ў пакляшторных мурах пры касцёле св. Пятра і Паўла. Мая бабуля, ведаючы пра важкасць «мамоны» для чыноўнікаў тых часоў, адусюль здабыла грошы, узяла з сабой усе сямейныя ўпрыгожванні і паехала ў Вільню. А быў гэта цяжкі шлях, трэба было з Капцюхоў, дзе жылі мае дзяды, праз Ліду коньмі ехаць у Вільню — 120 вёрст[2]. Бабуля Паплаўская наведала ў Лідзе ваеннага начальніка павета, узяла неабходныя паперы і паехала з імі ў Вільню. Яе затрымлівалі шматлікія пасты, на якіх па загаду

[1] Васілішскі прыстаў у той час — адстаўны шт.-капітан Карл Станіслававіч Вітунскі — Гл.: Памятная книжка Виленскай губернии. Вильно, 1863. С.122.

[2] У краі было ваеннае становішча і вандраваць тут было вельмі цяжка і нават небяспечна. Гэта сітуацыя добра адлюстравана ў прашэнні адстаўнога рускага падпаручніка Міхаіла Васільевіча Страескі на імя Мураўёва ад 29 лістапада 1863 г., якое збераглося ў паперах былога набліжанага да Мураўёва ў Вільні афіцэра Чарэвіна (у час задушэння паўстання 1863 г. Пётр Чарэвін палкоўнік, потым генерал-лейтэнант, таварыш міністра ўнутраных спраў і шэфа жандараў, набліжаны імператара Аляксандра III). Страеска ехаў з Бесарабіі ў Пецярбург праз Беларусь і зазнаў шмат грубасцяў і здзекаў — спачатку ў Пінску, а пасля ў Лідзе — ад вайсковых начальнікаў Ліды і Пінска і п'яных рускіх жаўнераў. Адстаўны падпаручнік спачатку быў упэўнены, што рэжым, які ён бачыў на сваёй дарозе, усталяваны без ведама генерал-губернатара і парушае законы, таму, як чалавек чэсны і які жадае дабра Расіі, ён напісаў рапарт да генерал-губернатара. Пра тое, што бачыў на Лідчыне, Страеска пісаў: *«Калі сп. Алхазаў* (лідскі ваенны начальнік — *Л. Л.) абыходзіўся са мною так, … непалякам, маючы перад вачыма 5—6 дакументаў — сведчанняў пра маю асобу, то чаго пасля гэтага можна чакаць ад яго няшчаснаму паляку? Панове Алхазавы […] прымусяць іх кінуць усё і шукаць выратавання «do lasu». … Паверце, Ваша Высокаправасхадзіцельства,* — піша далей Страеска, — *што ў войсках губерняў нельга ўгледзець прастадушнага, заўжды рахманага рускага салдата; грубасцю і жорсткасцю яны пераўзышлі там, мабыць, дзікія татарскія орды, што лютавалі некалі на Св. Русі. Калі б да Вас маглі даходзіць стогны і скаргі прыгнечаных варварствам нашага хрысталюбнага воінства, Вы, напэўна, з жахам адмовіліся б ад такіх паплечнікаў».* Цыт. па: Чарэвін Пётр. Паўночна-Заходні край» (Успаміны) // Спадчына. 1998. №3. С. 31–64.

ўладаў дзяжурылі сяляне з жаўнерамі, але яна пераадолела ўсе перашкоды і нарэшце прыехала ў Вільню. Каб пабачыцца з мужам, кожны дзень узыходзіла на ўзгорак каля касцёла св. Пятра і Паўла і там чакала да часу, пакуль яе не ўбачыць муж. З гэтага ўзгорка мая бабуля «на мігі» дамаўлялася з дзедам. Адзін раз гэтыя нямыя размовы заўважыў ахоўнік, прыбег на ўзгорак і так моцна выцяў бядачку прыкладам свайго карабіна, што тая ўпала і пакацілася з узгорка. Можна сабе ўявіць боль і крыўду мужа, які бачыў гэтую сцэну, бо акрамя ўсяго іншага, бабуля была цяжарная. Гэта ўбачыў адзін расійскі генерал з балкона дома (зараз, калі не памыляюся, гэта дом Кукеля), ён абурыўся, прыбег да бабулі, падняў яе і папрасіў прабачэння за такія паводзіны. Вось у такіх умовах мая бабуля ратавала мужа.

Раздала яна не толькі ўсе наяўныя грошы, але і усе ўпрыгожванні. Дапамагаў ёй ваенны начальнік нашага павета палкоўнік Алхазаў[1], які, аднак, дапамагаў не з-за рыцарскіх пачуццяў, а таму, што вельмі любіў грошы і ўвесь час патрабаваў усё новыя сумы (пра гэта таксама піша і Зоф'я Кавалеўская ў сваіх «Успамінах»). Уся судовая перапіска і доказы па справе Юльяна Паплаўскага былі арганізаваныя такім чынам, што знаходзіліся ў руках Алхазава. Мая бабуля была ім выклікана ў Ліду і поўны галантнасці Алхазаў на яе вачах ўсе доказы віны дзеда і ягоныя лісты кінуў у агонь каміна. Гэтым тлумачыцца скупая інфармацыя ў архівах аб «преступной деятельности» у 1863 г. майго дзеда па кудзелі, с. п. Юльяна Крулевіч-Паплаўскага. І дзіўная рэч — праз некалькі дзясяткаў гадоў мая бабуля атры-

[1] Якаў Кайхосравіч Алхазаў (Алхазішвілі, 1826–1896). Пасля заканчэння курса ў 2-м кадэцкім корпусе, Алхазаў 10 жніўня 1844 г. атрымаў чын прапаршчыка лейб-гвардыі Фінляндскага палка, 10 красавіка 1848 г. — падпаручніка. У тым жа годзе ўдзельнічаў у задушэнні паўстання ў Венгрыі. 6 снежня 1853 г. атрымаў чын штабс-капітана. Падчас Крымскай вайны знаходзіўся ў складзе войскаў, якія ахоўвалі ўзбярэжжы Пецярбургскай і Выбаргскім губерняў ад высадак саюзнага англа-французскага дэсанту. У мірныя час, ў 1856 г. атрымаў ордэн св. Станіслава 3-й ступені, у 1859 — ордэн св. Ганны 3-й ступені і ў 1861 — ордэн св. Станіслава 2-й ступені. 30 жніўня 1860 г. атрымаў чын капітана. 19 лютага 1863 г. стаў палкоўнікам, удзельнічаў у задушэнні паўстання 1863 г., быў вайсковым начальнікам Лідскага павета. У памяці лідзян застаўся жорсткім дэспатам і хабарнікам. За гэта ўзнагароджаны ордэнамі св. Уладзіміра 4-й ступені з мячамі і бантам, св. Ганны 2-й ступені з мячамі і імператарскай каронай і св. Уладзіміра 3-й ступені. 12 траўня 1864 г. Алхазаў быў прызначаны камандзірам 4-га пяхотнага Капорскага палка, 30 жніўня 1873 г. узведзены ў генерал-маёры і прызначаны камандзірам 2-й брыгады 19-й пяхотнай дывізіі на Каўказ. У 1876 г. атрымаў ордэн св. Станіслава 1-й ступені. У руска-турэцкую вайну 1877—1878 гг. Алхазаў спачатку быў прызначаны начальнікам Кутаіскага атрада (12 красавіка 1877 г.), а потым злучаных Кутаіскага, Сухумскага, Інгурскага і Гурыйскага атрадаў, з якімі ўціхамірыў хваляванні сярод абхазцаў і прымусіў адступіць турэцкі дэсант; за гэта быў узнагароджаны ордэнам св. Георгія 4-й ступені. 13 снежня 1878 г. Алхазаў быў прызначаны начальнікам 41-й пяхотнай дывізіі, 27 лютага 1883 г. атрымаў у камандаванне Каўказскую грэнадзерскую дывізію, 6 ліпеня 1885 — 3-ці армейскі корпус і 30 жніўня 1891 г. стаў генералам ад інфантэрыі. 19 кастрычніка 1894 г. ён быў прызначаны членам Ваеннага савета. Памёр 3 лістапада 1896 г.

мала з Парыжа ананімную пасылку, у якой знаходзілася частка ўсунутых ёю «ў лапу» ўпрыгожванняў. Багаты залаты гадзіннік, старажытны, вельмі дарагі пярсцёнак з вялікім дыяментам (памяць пра падкаморага Томаша Паплаўскага) і г. д. Да пасылкі быў далучаны ліст, дзе тлумачылася, што каштоўнасці прызначаюцца таму, каго бабуля ў тыя цяжкія часы насіла ў сваім улонні (с. п. Юзафа Паплаўскага, брата маёй нябожчыцы маці). Ратуючы дзеда, бабуля не памятала, каму перадала гэтыя каштоўнасці, бо шмат чаго рабіла праз пасрэднікаў.

У гэтых аповедах, якія так глыбока ўвайшлі ў нашу свядомасць, словы *прыстаў, жандар, казак* — мелі такі прысмак, што калі прыстаў ці жандар прыязджаў у дом нават з нейкай нейтральнай мэтай, нас апаноўвала дзіўнае пачуццё ці то страху, ці то нейкай глыбіннай агіды, і таму мы, дзеці, не маглі заставацца ў пакоі, дзе яны знаходзіліся і таму аглядалі іх са схованкі і рэзка высмейвалі «ворага», пачынаючы ад ботаў і канчаючы барадой ці «кудламі» на галаве. Калі мой бацька[1], які з-за яго чыну павінен быў прымаць ў сваім доме губернатара ці вышэйшых чыноўнікаў і вайскоўцаў, гэта не абыходзілася без прыліву апазіцыйнасці ў маіх настроях.

Аднаго разу ў салоне элегантны і добра выхаваны казацкі есавул, каб пацалаваць «славного мальчика», злавіў мяне і пасадзіў на калені. Я па шырокіх шараварах і лампасах на іх зразумеў, што гэта казак і з незвычайнай энергіяй стаў бараніцца ад «ворага», чырвоны як рак з абурэннем і гвалтам вырваўся з ягоных рук і ўцёк з салона.

А постаць Людвіка Нарбута выросла ў нашых вачах да легендарных памераў. Нарбут — герой, якога дзядуля, бабуля і «Пан Пётр» так добра ведалі, вельмі шмат для нас значыў.

— Бабуля, мамуся, «Пан Пётр», раскажыце пра Людвіка Нарбута!

І гэтак было без канца.

Успаміны Караля Ёдкі[2]

[1] Бацька — генерал-майор Аляксандр Тэлесфор Антон Пжыбытка (сын Паўла), з 1891 г. у адстаўцы — Гл.: Malewski Czeslaw. Rody szlacheckie na Litwie w XIX wieku. Powiat Lidzki. Wilno, 2005. S. 203.

[2] Jodko Karol. Psie lata // Ziemia Lidzka. 1937. №10. S. 113–114.; 1937. №12. S. 138–139.

Сабачыя гады. Успаміны лідзяніна 50-гадовай даўніны

Ад перакладчыцы: *Пра Караля Ёдку нічога не вядома. Даваенная «Лідская зямля» ў двух нумарах надрукавала ягоныя мемуары і нічога не паведаміла пра аўтара. Даведацца пра яго мы можам толькі з ягоных мемуараў. З іх бачна, што аўтар скончыў Лідскую павятовую вучэльню — сапраўдны вырай знакамітых лідзян таго часу. Дастаткова сказаць, што вучэльню скончылі такія людзі, як Людвік Нарбут, генерал і міністр абароны БНР Кіпрыян Кандратовіч, найлепшы знаўца гісторыі Лідчыны ў XX ст. Міхал Шымялевіч і дзясяткі іншых людзей, пакінуўшых свой след у гісторыі Лідчыны і ўсяго краю. Верагодна, Караль Ёдка праз вучобу ў павятовай вучэльні быў добра знаёмы з Міхалам Шымялевічам і менавіта Шымялевіч спрыяў друкаванню яго ўспамінаў.*

Мемуары Караля Ёдкі праўдзіва апісваюць жыццё шараговых лідзян пры канцы XIX ст. і таму надзвычай цікавыя для ўсіх неабыякавых да гісторыі людзей.

I

Калісьці быў звычай: кожны губернскі камітэт статыстыкі штогод выдаваў так званыя «Памятныя кніжкі» — штосьці падобнае на адрасныя календары. На пачатку такой кніжкі быў размешчаны каляндар, далей ішлі спісы ўстаноў, губернскіх і павятовых службоўцаў, спісы асоб, якія выконвалі розныя публічныя і дзяржаўныя функцыі: чыноўнікаў, духавенства, земскіх начальнікаў, валасных пісараў, адвакатаў, вайскоўцаў, лекараў і г. д. Падаваліся ў такіх кніжках расклады руху цягнікоў, параходаў, работы пошты, спісы аптэк, адміністрацыйны падзел губерні і паветаў на паліцэйскія участкі, судовыя, лекарскія, акцызныя і іншыя акругі. Змяшчаліся новыя статыстычныя дадзеныя, губернскія хронікі. Вельмі цікавыя арыгінальныя звесткі з археалогіі, гісторыі, манаграфіі гарадоў і мястэчак і г. д. Гэтыя кніжкі былі сапраўднымі адлюстраваннямі стану губерні, вельмі багатым і надзвычай цікавым зборам розных звестак з гісторыі, статыстыкі, эканомікі і першасным інфармацыйным даведнікам.

У спісах падаваўся стан чыноўнікаў: імя, імя па бацьку, прозвішча, чын, пасада, узнагароды і іншыя адзнакі, узровень адукацыі, час знаходжання на пасадзе і хатні адрас. Калісьці былі спробы паведамляць і аб сямейным стане кожнага чыноўніка, аднак гэтыя спробы па зразумелых прычынах не ўтрымаліся.

Калекцыя гэтых кніжак па Віленскай губерні складае 65 тамоў ад 1850 да 1915 года ўключна[1]. Божа мой, якая гэта цікавая калекцыя! А колькі ў ім даследчык знойдзе ідыліі і падману, крыві і жалеза, вернасці і здрады, радасці і смутку! Калі перагортваеш аркушы такога штогадовіка памерам 500–600 старонак, дык успамінаюцца імёны, усплываюць у памяці малюнкі страшных падзей нядаўняга мінулага.

Чытаючы спісы чыноўнікаў, дзе-нідзе можна даведацца пра ўзровень адукацыі канкрэтных асоб, якія калісьці займалі важныя пасады ва ўрадавай іерархіі, напрыклад: «хатняе выхаванне» альбо «хатняя адукацыя», гэта азначае, што гэты чыноўнік не скончыў аніякай школы. Зразумела, што хатняе выхаванне альбо адукацыя, напрыклад, губернскага маршалка шляхты, канюшага царскага двара, графа Адама де Броель-Плятара, поўнага кавалера ордэнаў св. Ганны і св. Станіслава (у кніжцы 1878 г.), адрозніваецца ад хатняй адукацыі і выхавання, якую атрымаў які-небудзь паштовы чыноўнік VI, які паходзіў з бедных сялян ці месцічаў — напрыклад, сын нейкага вартаўніка!

Мінімальная адукацыя для атрымання першага цывільнага чыну — калежскага рэгістратара — 2-класная павятовая школа. Хто меў пасведчанне аб заканчэнні такой школы, мог смела лічыць, што носіць у ранцы маршальскую булаву. Так, нядаўна памерлы ў Гародне (Лідскага павета) генерал ад інфатэрыі Кіпрыян Кандратовіч, былы намеснік камандуючага Туркестанскай акругі, былы камандзір грэнадзёрскага корпуса на Каўказе і г. д., як і шмат хто з іншых штаб- і обер-афіцэраў розных радоў войск, меў за пачатковую кропку адліку павятовую школу ў Лідзе[2]. А Мікалай Львоў, сапраўдны стацкі саветнік, намеснік дырэктара маёмаснай дырэкцыі Віленскай і Ковенскай губерняў, як і шмат хто з іншых цывільных чыноўнікаў, скончыўшы павятовую вучэльню, адчыніў для сябе дзверы ў чыноўніцкую службу, атрымліваў ордэны, грошы і пенсіі. Павятовая школа штогод выпускала некалькі дзясяткаў выпускнікоў, але пасведчанне нашай школы для большасці «белых каўнерыкаў» было недасяжнай марай.

Святой памяці графіня Зоф'я Красінская[3] (уладальніца маёнтка Вялікі Ольжаў) на хатнюю адукацыю свайго адзінага сына выдаткавала, як калісь-

[1] Кніжкі пачалі выдаваць як мінімум у 1845 г. першапачаткова, з 1845 г., кніжка ўяўляла з сябе адрас-каляндар, г. зн. спіс чыноўнікаў губерні, а пачынаючы з 1850 г. звесткі пачалі істотна дапаўняцца матэрыяламі навуковага характару, прадстаўленымі карэспандэнтамі Віленскага статыстычнага камітэта з ліку мясцовай інтэлігенцыі.

[2] Генерал Кіпрыян Кандратовіч (1859–1932) — міністр абароны БНР, пасля лідскай павятовай вучэльні скончыў 2-ю Канстанцінаўскую вайсковую вучэльню і Акадэмію генеральнага штаба.

[3] Графіня Зоф'я Красіцкая з дома Кашыц (28.02.1852–25.01.1933). Нарадзілася ў Тарнова, дачка Канстанціна Кашыца (1828–1881) і Юліі з Нясілоўскіх (1830–?). Муж — Раман Станіслаў Красіцкі (1844–1878). Мела сына Алексы Яна Мар'яна (1878–1935). Памерла ў Лідзе, пахавана на Росах ў Вільні.

ці яна сама гаварыла, сто тысяч рублёў — палову мільёна злотых! Мая ж «хатняя адукацыя» каштавала маім бацькам, далібог, добра, калі пяцьдзясят капеек.

II

Мой бацька, святі Пан яго душу, Юзаф Ёдка паходзіў з ваколіцы Ёдкі, што пад Лідай, дзе меў худую спадчыну — чацвёртую ці нават пятую частку з 3-гектарнай нерухомасці, раскіданай на 54 кавалкі — вузкія шнурочкі неўрадлівай зямлі і марнага лугу. Жыць было не з чаго, ажаніўся, узяў у пасаг карову, прадаў братам сваю частку за 50 рублёў і пайшоў у свет. Завандраваў далёка, ажно за дзве мілі ад Ліды, у Левашы, і ўладкаваўся работнікам на млыне. Праз некалькі гадоў перайшоў на такую самую працу на млын у Лідзе.

Калісьці ў Лідзе, па вуліцы Гражыны[1], насупраць вуліцы Гарыстай, стаяў млын горада Ліда. А па другой старане быў зарослы балоцісты стаў, аточаны хмызам, аерам і альшынай. За некалькі гадоў да Сусветнай вайны млын быў зачынены, а возера спушчана. У 1915 г. будынак млына спалены адступаючымі расійскімі войскамі. Каля 50 гадоў гэтым млынам кіраваў бласлаўёнай памяці Гірш Палячак, шляхетны чалавек, бацька вялікай сям'і, у якога мой бацька знайшоў працу за 30 рублёў заробку і 30 пудоў мукі штогод з памяшканнем для жытла, якое мела такое-сякое асвятленне і абагрэў. Маці мая штосьці зарабляла тым, што прала на калаўроце і мыла бялізну для лепшых дамоў. І на гэтыя сродкі неяк жылі. Сям'я наша была дастаткова вялікая: бацька, маці, старшы брат Тамаш, сёстры Эмілія і Міхаліна, я і малодшы брацік Герусь, які памёр яшчэ малым.

Здаўна славіцца ў Лідзе кірмаш 40-гадзіннага набажэнства, які называецца звычайна «чтэрдзестова» і прывязаны да 14 верасня. Калі ў Лідзе яшчэ не было чыгункі, з'язджаліся на кірмаш фурманкамі ажно з-пад Вільні «галантарэйнікі», а з Смаргоні — пекары з смаргонскімі абаранкамі. «Галантарэйнікі» ставілі свае палатняныя буды на могілках пры касцельнай агароджы, развешвалі ружанцы, скапуляры, белыя паскі кутасамі, раскладвалі кніжкі для набажэнства, абразы і абразкі святых і розныя зіхоткія золатам, серабром ці дыяментамі рэчы, пеўняў з волава, гусіныя трубкі з сядзячымі на іх хлопчыкам і г. д. Усё гэта зіхацела, грала, трубіла, зазывала і вабіла, але, халера, нядоўга. Ужо на другі дзень усё гэта псавалася. На гэтыя кірмашы збіраліся тысячы людзей са сваёй ці суседніх парафій. Касцёл і касцельныя могілкі шчыльна запаўняліся «публікай» — зразумела, болей «пра цікавасць» і «дзеля знаёмства», чым «для малітвы». Усе людзі пхаліся каля радоў «галантарэйнікаў», гаманілі або прыслухоўваліся да спеваў, гукаў ліраў, скрыпак ці гармонікаў ста калматых дзядоў і

[1] Такая назва вуліцы з'явілася ў 1920-я гг. Пры канцы XIX ст. раён горада Вісманты.

баб, якія тут сядзелі на ўласных вазах з дзецьмі, сабакамі, баранамі і нават парасятамі.

У тыя часы Ліда была малым ціхім і невялікім павятовым горадам, у якім не было ні адной кніжнай крамкі, а паперу для пісьма можна было адшукаць толькі ў некалькіх гандэлках, а фарбы да малявання — толькі ў аптэцы Эпштэйна[1]. Вучні некалькіх школ, якія тады меліся ў Лідзе, набывалі патрэбныя кніжкі ў самой школе. Між тым падручнікі, такія як «Детский мир», «Родное слово», заўжды выкарыстоўваліся на працягу некалькіх гадоў і служылі ажно да поўнага знішчэння некалькім пакаленням вучняў, пераходзячы ад старэйшага брата да малодшага або да малодшага школьнага сябра.

У кожнай установе, у кожным школьным класе на сцяне вісеў партрэт цара Аляксандра III і таблічка з надпісам тоўстымі літарамі: «Говорить по-польски строго воспрещается». Ксёндз у касцёле зрэдку зачытваў якінебудзь царскі маніфест па-руску, штогод па-руску даваў прысягу рэкрутам-католікам, у школах па-руску вучыў рэлігіі. Аніводнай польскай кніжкі, ані календара, ані буквара ў Лідзе дастаць было нельга. Ані за якія грошы! Толькі раз у год «галантарэйнікі» з Вільні прывозілі «Афіцыйкі» ці «Службы Божыя». Календары і буквары польскія мелі жніво! Іх хапалі і неслі дахаты. Не ведаю, ці быў продаж легальным ці «з-пад крыса», але навучанне чытання па-польску «чужих детей» было забароненае пад страхам суровай кары. За такую «забарону» св. пам. Міхала Ёдку, далёкага сваяка майго бацькі, генерал-губернатар віленскі Каханаў[2] у 1886 г. без суду, толькі з прычыны тайнага даносу ў паліцыю выслалі ў Сібір на вечныя часы. З гэтым, браце, не цацкаліся!

Будучы на набажэнстве ў касцёле, нябожчыца матуля, не ведаю — яўна ці патаемна, купіла за 3 капейкі ў «галантарэйніка» танюсенькі «Буквар польскі», надрукаваны ў друкарні Блюмовіча ў Вільні[3] (як сёння, бачу перад сваімі вачамі, як пад хусткай, бо ішоў дождж, прынесла яго ў нашу цёмную хатку пры млыне). Маці мая была жанчына «вучоная»: магла знайсці патрэбную малітву паводле рэестру, бо ведала лічбы і ўмела лічыць да тысячы! Таму навучыла ўсіх нас па буквары і па рэлігійным кніжкам чытаць і знаходзіць у кніжцы неабходныя рэчы паводле нумарацыі старонак са зместу.

III

У нашым атачэнні дзіцячая навука пачынаецца праз некалькі месяцаў пасля прыходу дзіцяці ў свет. Маці карміць дзіцятка грудзьмі год, а то і два

[1] Аптэка Эпштэйна Кейля Хаімавіча знаходзілася на вуліцы Віленскай.

[2] Каханаў Іван Сямёнавіч (1825–1909), генерал ад артылерыі, з 1884 г. віленскі, ковенскі і гродзенскі генерал-губернатар, член Дзяржаўнага савета.

[3] У друкарні Блюмовіча ў 1907 г. нейкі час друкавалася «Наша Ніва».

гады. Калісьці я меў сябра, які выбягаў з дому на поле, адшукваў там працуючую маці і, азіраючыся вакол, каб хто-небудзь не высмеяў, патайкам звяртаўся да маці:

— Мамы, дай цыцы…

Чуў аповед, што нейкая маці карміла так хлопца да сямі гадоў.

Першая практычная і прыдатная ў дзіцячым жыцці навука — гэта ўменне трымаць скарынку хлеба. Маці ўтыкае яму да кулачка скарынку і накіроўвае руку дзіцяці да вуснаў, каб смактала і не плакала. Дзіцятка спярша спрабуе торкнуць скарынку ў вочкі, носік. А потым нарэшце патрапляе да вуснаў і тады, ужо задаволены, есць. Смяецца, укладае гэтую ж скарынку ў вока маці і скача на яе каленях. Пасля такой практыкі дзіцятка вучыцца браць скарынку адразу са стала. Першапачаткова ручка яго непаслухмяная і цягнецца не туды, дзе ляжыць скарынка. Спатрэбяцца немалыя высілкі, часам і са стогнам, каб дасягнуць мэты і ўзяць скарынку ў ручкі. Падобныя рэчы адбываюцца і з драўлянаю лыжкай, але ж колькі гэта прыносіць радасці і шчасце ўсім, хто знаходзіцца за сталом, калі такі «жук» ужо трымае лыжку ў руцэ і, узняўшы яе дагары, пхне разам з дарослымі да агульнай місы. Якая ж пацеха напаўняе ўсіх, калі такі малы стукне гэтай лыжкай камусьці па ілбе.

Навука сяброўства для дзіцяці пачынаецца з уменння падаваць руку. Зусім малыя дзяўчаткі вучацца звычайна так званай фігі. Калі бацька альбо старэйшы брацік просіць падаць ручку, дык маці вучыць яе:

— Дай яму фігу.

Дачурка, не ўмеючы яшчэ злажыць пальчыкі ані ў якую фігуру, выстаўляе толькі кулачок.

Уважліва сочаць, каб усе дзеянні выконваліся правай ручкай, а толькі фігі дазваляецца паказваць «з дзвюх рук».

Дзеці найчасцей спяць разам з матуляй у адным ложку. Трое, а калі і чацвёра дзяцей аблягаюць маці. Доўжыцца такое некалькі гадоў. Калі ў ложку зробіцца зусім цесна, тады старэйшым дзецям пераносяць пасцель на печ. Па меры падрастання ўсе дзеці пачынаюць спаць на печы.

Дзіця трохгадовага ўзросту, седзячы побач з маці з ручкамі, зложанымі для малітвы, вучыцца прамаўляць:

— Ацю Божанька.

Потым вучыцца жагнацца, а потым прамаўляць пацеры: «Ойча наш», «Верую ў Бога Айца» і «Дзесяць прыказань». Звычайна маці павольна дэкламуе кожны выраз малітвы, а дзіцятка паўтарае за ёй. Тое самае адбываецца і раніцай, калі дзеці прачынаюцца, і гэтак нязменна, дзень за днём, ажно пакуль дзіцятка не вывучыць пацеры на памяць. Зрэдку ў гэтым нудным раскладзе маці замяняе бацька ці хто-небудзь з сям'і: дзед, бабуля і г. д.

Пяцігадовыя дзеці ўжо ведаюць на памяць ружанец. Іншыя малітвы і спевы пабожныя пазнаюць потым — на пахаваннях, у касцёле і г. д. Аднак

я ведаў многа такіх, якія не ведалі цалкам малітвы на ружанцы, а толькі невялікую частку.

— Маці не навучыла, — так тлумачылі прычыну свайго няведання.

Такія, больш-менш, пачаткі хатняга выхавання атрымаў я і мае родныя. Пачуваліся мы не горш за іншых на Зарэччы[1]. Мелі дасыта чорнага хлеба, штогод садзілі пад гной некалькі загонаў бульбы, трымалі карову і свінню. Як кажуць, ва млыне і шчуры сытыя. Бацька на гадавую выплату за работу на млыне купляў сабе боты ці кажух, штаны для брата Тамаша і для маці боцікі. Маці за грошы, зароблены прадзеннем кужэлі і мыццём бялізны, купляла сабе блузку, хустачку на галаву, а для дзяцей брала тканіну на сукенкі. Кашулі насілі мы з хатняга, грубага палатна, а сукенкі — з крамнага мультану[2].

Брат Тамаш меў ужо 12 гадоў і ва ўсім памагаў бацьку. Заўжды стругаў з цвёрдага белага грабу «кулакі» для млынарскіх колаў і ляскі для шасцерняў. Каменні «вастрыў» сталёвым молатам сам бацька. Мае сёстры ўжо ўмелі чытаць, адна па «Залатым алтарыку»[3], другая па больш малой кнізе для набажэнства. Я ж ведаў на памяць цэлы ружанец. Меў тады 5 гадоў. Мы, дзеці, спалі тады ўтрох на печы. На ёй кожную раніцу і ўвечары гаварылі ружанец. Спаць на печы было ўтульна і цёпла. Толькі перашкаджалі нам у сне мноства блох, якія гняздзіліся ў швах сцен, уначы тысячамі поўзалі па нашых дробных целах і смакталі кроў. Аднак на іх не звярталі ўвагі. Горай было з вошамі, бо яны любяць гнездавацца ў палатняных кашулях і праз тыдзень вырастаюць да памераў жытняга зерня. Вошы грызуць і ўдзень, і ўночы і прымушаюць да нястаннага чмохання.

Кашулі змяняюцца раз на тыдзень, у нядзелю рана. Час ад часу кожнаму з нас маці рабіла пошукі ў галаве. Летам да маці прыходзіла адна з суседак, каб потым выйсці разам пад стадолу на сонца і распачаць паляванне. Адна лажыла галаву з распушчанымі валасамі на калены другой, і тая, перабіраючы валасы на галаве, лавіла «жывёлін». Потым першая рабіла тое самае для другой.

Дзень і ноч узімку і ўлетку шумела вада на млынарскіх колах, гучалі агромністыя каменныя жарнавы і ўвесь млын дрыжаў, як жывы. Знутры млына заўсёды вісеў туман з белага пылу. Стары Гірш Палячак, сын яго Ёсель — вазніца, мой бацька і наш Тамаш заўсёды мелі акураныя белым шапкі, твары, вопратку і нават боты. Жыхары блізшых і дальшых ваколіц штодня прывозілі жыта на памол. Калі вады ў ставе было многа, а завоз жыта невялікі, заказчыкі звычайна праз некалькі гадзін ладавалі на вазы свае мяхі з мукой і ехалі дахаты. Калі ж здаралася так, што вады ў ставе бы-

[1] Зарэчча — раён горада за ракой Лідзеяй.

[2] Мультан — тканіна з бавоўны.

[3] Верагодна, маецца на ўвазе малітоўнік «Złoty ołtarzyk, drukarnia Zawadzkiego. Wilno, 1896».

ло мала, а завоз выпадаў вялікі, ствараласа чарга. Коней выпрагалі, ставілі пры вазах каля млына ці ў стадоле каля дзвярэй нашага дома. Усе сяляне сходзіліся тады да нас. Звычайна ўсе разам сядалі на лаву і сталёвым крэсівам высякалі са скалкі агонь для люлькі, якая смачна пахла дымам, смалілі свае люлькі са смярдзючым тытунём уласнай гадоўлі і доўга вялі гаворкі. Часам некаторы з іх драмаў і хроп, а калі-некалі падпускаў яшчэ горшы смурод, чым ягоная файка.

Да нас, дзяцей, прыбягалі суседскія дзеці. Мы, хлопчыкі, седзячы на печы, майстравалі з лучынак млыны ветраныя і водныя, пільшчыкаў з уваткнутай за пас пілой і наколатай на другі канец бульбінай, акрабатаў, бурчалак з малых костак прыгатаванай для засольванне свіной нагі і іншыя цацкі. Дзяўчаткі скручвалі лялькі з лапікаў тканіны ці лахманоў, калыхалі іх, як сапраўдныя маці, і прыпявалі:

— Люлі, люлі, прыляцелі куры, селі на варотах у чароўных ботах.

Ці так:

— Пайшоў каток па ляску ў зялёным паяску, пайшоў каток пад масток, злавіў рыбку за хвасток[1].

А потым пачыналі клясці:

— Ах ты, бурыла, ужо засцалася.

Дзяўчынкі кармілі лялькі малаком з ражка, як бы з лыжачкі, і вялі бяседу паміж сабой, нібы дарослыя:

— А твая ж курачка, куманька, нясецца?..

— Не, мая рыбанька, не нясецца, калі ж пятушок штось не грае[2].

Улетку кожнага з нас, як толькі пачыналі хадзіць на ўласных нагах, запрагалі да працы. Пільнаваць градкі ў гародчыку ад курэй пані Красоткавай, а таксама самых кур з куранятамі ад халерных варонаў. Збіралі зелянізну каля платоў для парсючка і каровы, пасвілі яе на горцы зарачанскай і ў замку, заганялі на пашу нашу карову Маргулю, а вечарам, калі яна вяртала ся з малаком, сустракалі.

Адным словам, чалавек ад дзяцінства прывыкаў да пацераў, кармлення вошаў сваёю крывёю, розных пахаў і да чорнай, няўдзячнай, але непазбежнай для бедняка работы.

Доўгімі восеньскімі вечарамі да нас часам на падвячорак прыходзіла старая пані Красоткава. Прыйдзе, пасядзіць, нагаворыць казак і пойдзе. Насамрэч умела баяць байкі пра мядзведзяў, ваўкоў і іншых жывёлаў. А потым уначы сніліся нам тыя смешныя ці страшныя гісторыі.

Улетку, калі здаралася, што праз нас праходзіла жалобная працэсія[3], сёстры хваталі мяне за рукі і мы ўсе разам выбягалі на могілкі за нябожчыкам, каб паглядзець, як хаваюць людзей у зямлю. На могілках галосна за-

[1] У польскім тэксце гэтыя дзіцячыя спевы запісаны па-беларуску.

[2] Гэтыя словы таксама па-беларуску.

[3] Каля млына ішоў шлях да гарадскіх могілак.

водзілі бабы. Дзеці часамі таксама плакалі і нават некаторыя скакалі ў дол, да труны. Так моцна плакалі, што было іх шкада, вядома ж — страчвалі маці ці бацьку і заставаліся сіротамі.

Бегалі і да касцёла. Тут каля самых дзвярэй трэба было кленчыць, жагнацца, біць у грудзі і паводзіць сябе ціха, без слоў. У касцёле было хораша, але разам з тым страшна. З крыжа ў вялікім алтары звісаў у страшных пакутах, распрануты, пакалечаны Пан Езус, а чырвоная кроў лілася з яго ілба, ног і бока. На іншым алтары св. Станіслаў выклікаў з труны худога, страшнага мерцвяка, а на сцяне, збоку, быў стары, ужо невыразны абраз святога з убітай яму ў галаву сякерай і з тварам, залітым крывёй. Навокал кроў і смерць, кроў і смерць…

Маці нам тлумачыла, што ў касцёле так страшна, каб людзі не гнявілі Божаньку.

Пераклад Галіны Лаўрэш

Успаміны Тэадоры Манчунскай з Нарбутаў

Успаміны, якія распавяла сп. Тэадора Манчунская, родная сястра Людвіка, а запісала Хэлена Салтысова[1].

Сын гісторыка Літвы Тэадора Нарбута і Крысціны з Садоўскіх (дачкі жаўнера Касцюшкі), нарадзіўся ў памятным для нас 1831 г.[2] калі адбыліся нязвыклыя падзеі. На дзядзінец Нарбутаў прыйшла значная колькасць жаўнераў з аддзела Гелгуда і маладая маці, убачыўшы іх праз акно, радасна запляскала ў далоні і закрычала: «Якія яны прыгожыя! Якія ўсе маладыя!» У гэты момант яна як раз карміла немаўлятка і, можа, гэтак яму перадаўся геройскі дух паўстанцаў.

Падрастаючы хлопец меў адкуль чэрпаць любоў да Бацькаўшчыны. Яго стары бацька быў замілаваны ў гісторыю гэтай зямлі, і менавіта ён раздзьмуў прыгожы агонь у маладых грудзях. Ён быў жаўнерам Касцюшкі[3] і з вялікай павагай прамаўляў пры дзецях імя свайго камандзіра, са слязамі ў вачах цалаваў свой мундзір, і тады навокал яго станавілася ціха, як у касцёле.

Калі ў 1849 г., пасля заканчэння школы ў Лідзе Людвік працягнуў адукацыю ў Вільні, думкі і пачуцці яго ўжо былі сфармаваны дамашнім выхаваннем. У Вільні ён адразу патрапіў у вір гарачай моладзі, якая ірвалася да вольнасці, стварала тайныя таварыствы, спявала патрыятычныя песні і малявала Арлы ды Пагоні. Ён быў першым сярод іх.

Але надышла цёмная ноч, у якой малады чалавек быў схоплены і пасаджаны ў гнілую вязніцу, а потым асуджаны. Меў ледзь 18 гадоў і таму атрымаў толькі 50 розгаў і быў навечна сасланы ў жаўнеры арыштанцкіх рот.

Бацькоў прывезлі быць сведкамі гэтага пакарання, а яго калегі ў парадных мундзірах былі прымушаны глядзець на ўсё гэта. Пасля кары Людвік упаў у ногі сваім бацькам і прасіў аб апошнім дабраслаўленні. Ніжэй схілілася спіна старога бацькі, а маці, якая да гэтага была прыгожай брунеткай, вярнулася дадому сівой старой.

Людвік быў высланы на Каўказ і каля дзесяці гадоў ваяваў з тамтэйшымі плямёнамі, якія баранілі сваю зямлю ад царскай акупацыі. Браў удзел у 90 баях, быў 4 разы паранены, з-за чаго да канца жыцця хадзіў, нахіліў-

[1] Sołtysowa H. Ludwik Narbutt // W 40 rocznicę powstania styczniowego. Lwów, 1903. S. 433—437.
[2] Насамрэч, у 1832 г.
[3] Аўтарка памыляецца, Тэадор Нарбут не быў «жаўнерам Касцюшкі».

шыся наперад. Там ён вызначыўся сваёй незвычайнай мужнасцю, асабістай адвагай і халаднакроўем, чым заслужыў найвышэйшую павагу ад маскалёў. Праз 10 гадоў, пасля ўступлення на трон цара Аляксандра II, неспадзявана вярнуўся на радзіму ў чыне афіцэра. Але адпачываў нядоўга. Прыйшоў 1863 год, год вялікай надзеі, найвялікшых ахвяр і незмарнелай веры.

Як вайсковы начальнік Лідскага павета, адным з першых у Літве, Людвік Нарбут пайшоў у бой. Першымі яго байцамі былі таварышы і прыяцелі маладых гадоў і сяляне роднай вёскі. Хутка, са сваімі людзьмі, да яго далучыўся ксёндз-патрыёт Гарбачэўскі, а з Вільні байцоў прывёў Андрыёлі, які стаў потым вядомым мастаком. Ад'ютантам у Людвіка быў яго малодшы брат Баляслаў, які, нягледзячы на маладыя гады, адзначыўся вялікай адвагай у баях. Колькасць аддзела даходзіла да 1000 чалавек. Яны былі апрануты ў шэрыя світкі, на плячах мелі палатняныя торбы — у лютым 1863 г. менавіта гэтак апранутая гарачая моладзь ішла ў цёмныя літоўскія бары.

Літоўскія пушчы напоўніліся галасамі. Здавалася, што ў лясах пасяліліся духі: у адным месцы ішлі калоны войск, у другім адбілі палонных, у трэцім здабылі зброю і амуніцыю. І пачалі складацца легенды: маскалі з забабоннай трывогай расказвалі, што кулі не бяруць Нарбута, але ў адказ яго кожная куля забівае. З неахвотай і страхам ішлі яны супраць аддзелаў Нарбута, бо бачылі, што гэта не прагулка, і таму прызначылі высокую цану за яго галаву.

І тое, што не зрабіла шматтысячнае маскоўскае войска, якое нават ўжывала супраць паўстанцаў гарматы, тое зрабіла здрада. Імя здрадніка невядома бо ён, падобна, і не павінен быў мець імя[1]. У Лідскім павеце ёсць рэчка Котра, каля возера ў Дубічах стары касцёлік, за возерам непралазныя лясы і ў лясах руіны старога замка. У гэтай пушчы стаў на пастой Нарбут каб атрымаць правіянт з Дубічаў. Стаянка была адносна бяспечнай — за ёй рассцілалася непралазная пушча, перад ёй — возера, вакол — дрыгва, прайсці можна толькі адной дарогай цераз кладку на рэчцы. Менавіта па гэтай дарозе павінны былі прывезці хлеб. Чакаючы хлеб, камандзір стаяў у атачэнні свайго брата Баляслава, Андрыёлі і некалькіх блізкіх сяброў. Андрыёлі сказаў: «Нешта, зашмат сялян ідзе». «Заняць пазіцыю!» — загадаў камандзір на ўсялякі выпадак, але ён не адчуваў яшчэ здрады, бо наперадзе ішоў знаёмы чалавек.

Кладку перайшлі хутка, а некаторыя нават і ўброд. Той, хто ішоў наперадзе, як Юда наблізіўся да камандзіра, паказаў на яго пальцам і сказаў: «Гэта Нарбут!» Жаўнеры выхапілі карабіны, і паранены ў грудзі і твар Людвік упаў на зямлю. Таварышы падхапілі яго і панеслі ў небяспечнае

[1] Здраднікам быў селянін Адам Карповіч.

месца, але кожны з іх таксама атрымаў смяротныя раны і застаўся ляжаць. Людвік казаў ім: «З годнасцю, панове!» — але хутка быў яшчэ раз паранены, пасля чаго быў пакладзены на лясны мох. Памёр ён са словамі: «Як соладка памерці за Радзіму!» Цяжка паранены малодшы брат патрапіў у палон і доўгія гады правёў у Сібіры.

За паўгадзіны да бітвы лагер пакінула сястра Нарбута Тэадора, якая прывозіла лісты Народнага жонда. Была ўжо на адлегласці, калі пачула за сабой стрэлы, але яна мела ад брата загад ісці наперад. Па дарозе, у доме лесніка сустрэла цяжка параненага брата Баляслава які вітаў яе словамі: «Людвік забіты!» Маладая кабета не страціла прытомнасць ад гэтай весткі бо ведала, што павінна сама сказаць пра гэта сваім сівым бацькам.

Аднак жалобная вестка сама знайшла сабе дарогу, і калі Тэадора прыйшла да бацькоў, маці ўжо ведала, што яе перашароднага сына ўжо няма, і думала, што разам з ім страціла і дачку. Таму, калі маладая жанчына з'явілася на яе парозе, забітая горам маці выцягнула перад сабой рукі і з крыкам пачала адпіхваць ад сябе дачку, бо вырашыла, што гэта здань з таго свету.

Маскалі дазволілі пахаваць палеглых каля касцёла ў Дубічах. Перад тым з забітых яны абадралі ўсю вопратку. Сялянкі абмылі голыя целы і апранулі іх у кашулі, простыя труны былі пастаўлены адна каля другой і засыпаны ў высокай магіле. Зямля пакрыла целы пакутнікаў, душы іх адляцелі ў іншы сусвет, і з гэтага моманту пачала ствараца легенда.

Пайшлі чуткі, што Нарбут не загінуў, і людзі са зброяй пакідалі свае хаты і шукалі камандзіра. Па загаду Мураўёва жаўнеры крукамі парушылі касцёл[1] і зраўнялі магілу з зямлёй.

На тым месцы ў вышыню старога касцёла выраслі бярозы, і мясцовыя людзі лічаць гэта цудам, які адбыўся над магілай пакутнікаў.

Бацьку Людвіка Мураўёў загадаў вывезці ў Сібір. «Хіба што яго труну пакладзём у кібітку», — адказалі яму тыя, хто бачыў старца.

Мураўёў загадаў выклікаць старога патрыярха да сябе і сказаў яму:

— Ведаеш, стары, твой сын ужо не жыве.

— Маю яшчэ сыноў, — адказаў нязломны стары.

— Вон адсюль, стары сабака! — закрычаў вешальнік.

Пад помсту ўладаў патрапіла маці Людвіка. Забраная з ложка, без неабходнай вопраткі, пад пагрозай нагаек была прывезена на няправедны суд, у судзе трымалася горда, але страціла прытомнасць, пасля суда была вывезена ў Сібір, адкуль вярнулася амаль што стагадовай старой і памерла на радзіме.

[1] Касцёл у Дубічах існаваў да 1869 г. і быў зачынены, бо, як быццам, мог паваліцца ад старасці. Яго можна было адрамантаваць, але зрабіць гэтага не дазволілі ўлады. Замест рамонту, касцёл быў зачынены і разабраны, а касцельную зямлю, *«урад аддаў папам у Лідзе»*, — пісаў Вандалін Шукевіч.

На сваім надмагіллі загадала дзецям выбіць кароткі надпіс: *«Маці Сыноў»*[1].

Вялікі бацька памёр праз год пасля гібелі сына Людвіка, і жонка пасля вяртання з Сібіры паклала на яго магілу сціплы камень з надпісам: *«Тут ляжыць Тэадор Нарбут, гісторык Літвы»*.

Сястра (Тэадора Манчунская — *Л. Л.*) уцякла з аточанага жаўнерамі двара і доўгія, доўгія гады туляецца за мяжой.

Вось гісторыя адной з паўстанцкіх сямей. Усё тое, што было народам лягло, як сжатыя каласы ў полі, пасля чаго ўсталявалася ціша, як на пахаванні. А калі дажджы змылі крывавыя сляды з нашай зямлі, вецер асушыў салёныя слёзы і прыглушыў енкі, нам не стала лягчэй ад гэтага тузання ланцуга няволі.

[1] Улады забаранілі хаваць яе разам з мужам каля касцёла ў Начы

Успаміны Камілы Юрэвіч з Нарбутаў пра гісторыка Тэадора Нарбута[1]

Сваячка і суседка Тэадора Нарбута — Каміла Юрэвіч з Нарбутаў, напісала гэтыя ўспаміны недзе ў 1870-я гг. Відочна, што пісала яна іх для перыядычнага выдання, але, верагодна, гэтыя ўспаміны, напісаныя вельмі разборлівым, жаночым почыркам, не былі прыняты да друку. На жаль, замест таго, каб напісаць пра Тэадора Нарбута як пра добра вядомага ёй чалавека, яна напісала непатрэбную апалагетыку гісторыка і пераказала агульнавядомыя факты з яго біяграфіі. І толькі ў канцы ўспамінаў ёсць каштоўныя бо асабістыя радкі. Трэба адзначыць словы Камілы, пра тэчку з лістамі Тэадора Нарбута. Верагодна, маецца на ўвазе перапіска Тэадора з бацькам Камілы Яўхімам Нарбутам, а потым, пасля смерці яе бацькі, і з самой Камілай. На жаль, гэтыя лісты ніколі не друкаваліся і, калі яны недзе захаваліся, дык, здаецца, яшчэ не знойдзены.

Біяграфія дачкі Юстына Нарбута — Камілы Нарбут у нас яшчэ мала даследавалася, але ў суседзяў ужо выйшла кніга пра яе[2].

Тэадор Остык Нарбут герба Трубы, аўтар «Дзеяў народу літоўскага» ў 9-ці тамах (1841) і вялікай колькасці іншых гістарычных прац, прыйшоў на свет у 1784 г. у дзедзічным маёнтку[3] сваіх продкаў Шаўры, які знаходзіцца ў Лідскім павеце Віленскай губерні. Бацька — старшыня земскага суда Яўхім Нарбут[4], маці — Ізабела з Наневічаў. Памёр у 1864 г., парэшткі гісторыка спачываюць каля яго парафіяльнага касцёла. Магілу і калыску вялікага гісторыка аддзяляюць толькі некалькі вёрст.

Як ліцвінка і крэўная с. п. Нарбута, я наведала не толькі гэтыя два месцы, асвечаная памяццю чалавека, які з большай, чым у яго папярэднікаў,

---

[1] ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 11. Спр. 4. Арк. 103 — 105 адв.

[2] Пра яе гл: Лаўрэш Л. Л. Гісторык Юстын Нарбут. Яго навуковая дзейнасць, сям'я і сядзіба, яго дачка Каміла. Издательские решения, 2025; Reda Griškaitė. Moteris ir istorija: Kamilės Narbutaitės patirtys. Lietuvos istorijos institutas. 2024.

[3] Для Тэадора Нарбута Шаўры былі дзедзічным маёнткам па маці, бацька Тэадора, паручнік літоўскай гвардыі Яўхім Нарбут (?1760–1813) маёнтак Шаўры атрымаў як пасаг за жонку, якая ў сваю чаргу ўспадкавала яго ад свайго дзядзькі Бранеўскага, гл: Нарбут А. Н. Нарбуты Гродненской губернии. Москва, 1998. С. 15.

[4] Інфармацыя пра пасаду старшыні земскага суда не пацвярджаецца сучаснымі даследаваннямі. Гл: Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. Pod redakcją Andrzeja Rachuby. Warszawa, 2004. S. 372–375.

руплівасцю займаўся даследаваннямі гісторыі роднага краю і здабыццём з забытых архіваў імён землякоў, якія вызначыліся некалі сваёй шляхетнасцю, мужнасцю і ахвярнасцю ў справе агульнага дабра для радзімы. Гэта годная і цяжкая праца рабілася дзеля нашага незвычайнага народа, які, нягледзячы на сваю маральную цемру з-за няведання ў XIV ст. па-сапраўднаму святой рэлігіі і цывілізацыі, нягледзячы на няведання германа-крыжацкага вайсковага мастацтва і пісаных законаў, якія мелі немцы і палякі, здолеў сярод дасведчаных суседзяў не толькі ўтрымаць сваю дзяржаву, але і пашырыць яе межы і абараніцца і ад дзікіх татараў, і ад цывілізаваных народаў, якія мелі металічны крыжацкі панцыр, якія, як быццам, збіраліся навярнуць нас у хрысціянскую веру — веру праўды, міласэрнасці і міру, але насамрэч неслі смерць, агонь і рабунак. Як усім вядома, злучэнне ліцвінаў з палякамі не было вынікам перавагі моцы гэтых апошніх, але добрай воляй народаў, накіраванай да пазнання рэлігіі, якую аб'явіў сапраўдны Бог. Таму пасля заснавання Вільні яна была часткова заселена людзьмі, якія прыехалі сюды з цывілізаваных краёў, чым у выніку і зацьміла бляск паганскага Зніча. Немагчыма не прызнаць, што сапраўдная асвета пашырыла і асвятліла думкі ліцвінаў, тая самая сіла духу, якая была выразна бачная яшчэ ў прабацьках, у нашчадках перайшла на поле больш глыбокіх думак і пакінула моцны адбітак у пазнейшым часе — у розных напрамках сур'ёзнай літаратуры, у творах мастакоў (Гуцэвіч, Смуглевіч, Чаховіч) і пісьменнікаў, імёны якіх сталі ў адзін шэраг з самымі слыннымі еўрапейскімі пісьменнікамі (Нарушэвіч, Нямцэвіч, Міцкевіч, Адынец, Кандратовіч).

Да гэтага народа адносіўся і Тэадор Нарбут, чалавек, які напісаў яго гісторыю. Пасля таго, як ён на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў апрацоўваў архівы Інфлянтаў, тайны архіў Караляўца і іншыя, пасля раскопак мноства старажытных магіл, пасля адкрыцця вялікай колькасці дагістарычных сядзіб, Нарбут зрабіў працу, за якую да яго ніхто нават не мог і ўзяцца.

Звычайным чынам, праца Нарбута атрымала шмат рэцэнзій.

Рознае было да яе стаўленне — і станоўчае і адмоўнае. З некаторымі з гэтых, апошніх, цяжка спрачацца. Можа, і слушным былі закіды ў празмерным замілаванні да вусных, часта непраўдападобных паданняў ці ў браку аналізу і крытыкі. Але несправядлівымі былі абвінавачванні ў прыдумванні фактаў таго, чаго не было. Без крытычнага разбору, ён часамі паўтараў тое, што недзе пачуў ці прачытаў, але як чалавек праўдзівы, сам нічога не выдумляў[1]. Знайшліся і такія рэцэнзенты, якія з гэтай нагоды адмаўлялі яму ў званні гісторыка і называлі хранікёрам. Хай будзе так, аднак гэтая Хроніка Нарбута ёсць вялікая і бессмяротная справа, яна сён-

[1] На жаль, Нарбут і насамрэч некаторыя свае літаратурныя творы друкаваў як сапраўдныя гістарычныя хронікі.

ня і ў будучыні застанецца невычарпальнай крыніцай усіх, хто піша пра Літву. Тыя самыя, якія абвінавачвалі Нарбута ў памылках, чытаюць і часта цытуюць яго працу. Наша павага і ўдзячнасць працаўніку, які з пылу і цвілі ўратаваў каштоўныя краёвыя помнікі і памёр з пяром у руцэ і думкай пра родны край, бо смерць напаткала яго, калі Нарбут правіў сваю Літоўскую міфалогію. <…>

У сваёй маладосці Тэадор Нарбут служыў у войску інжынерам, а да гэтага некалькі гадоў вывучаў у Віленскім універсітэце курс матэматычных навук, цывільную і вайсковую архітэктуру, якую праз некалькі гадоў сам выкладаў у 2-гім кадэцкім корпусе Пецярбурга[1]. У 1807 г. пад Астраленкай[2] быў паранены багнетам, а пад Тыльшамі[3] атрымаў рану ў руку. Падчас вайны ў Фінляндыі, у 1808 г. пад Аба, быў моцна кантужаны ў галаву, што потым прывяло да поўнай страты слыху. Падчас гэтай вайны, калі эскадра Балтыйскага флоту была закрыта на сваёй базе, для яе абароны ён ставіў батарэі на выспе Боген.

Па загадзе ўраду ў 1810–1811 гг. знайшоў месца для пабудовы Бабруйскай фартэцы і ўдасканаліў яе праект. На пачатку 1812 г. пакінуў вайсковую службу і пасяліўся ў сваім маёнтку Шаўры[4], дзе прысвяціў свой час працы гісторыка, выязджаў у Каралявец і іншыя гарады, дзе мог знайсці патрэбныя яму дакументы.

Нягледзячы на прыкрае калецтва, наш гісторык любіў жыццё, часта сустракаў у сваім доме гасцей і сам у час адпачынку ад цяжкай працы, наведваў родных і суседзяў. Вольны ад усялякай фанабэрыстасці, з людзьмі ён заўсёды паводзіў сябе далікатна і сціпла. Пісаў ладныя лісты, значная колькасць якіх захоўваецца у маёй тэчцы. Меў добры настрой і неяк ў старым веку ўзяў удзел у свавольстве і забавах сваіх маладых сваякоў. Любіў паэзію, зрабіў шмат даслоўных перакладаў, у якіх, па-праўдзе, не было паэтычнага таленту.

Перакладаў оды Гарацыя і іншае, быў знаўцам нашых паэтаў і меў у сваёй бібліятэцы шмат іхніх твораў. З нейкай наіўнай прыемнасцю часамі размаўляў пра надпрыродныя рэчы. Калі-нікалі яго думкі блукалі ў краіне духаў, ён дапускаў іх існаванне і стасункі з нашым светам. Меў сапраўднае сэрца і душу ліцвіна. Меў і знешнасць ліцвіна: светлы бландзін з вялікімі блакітнымі вачыма і лагодным выразам твару. Ад прыроды меў моцнае цела і спадзяваўся дажыць да 100 гадоў, але цяжкія перажыванні пасля смерці некалькіх членаў сям'і аслабілі яго моцны арганізм і паскорылі смерць,

[1] 2-гі кадэцкі корпус імя імператара Пятра — ваенная навучальная ўстанова Расійскай імперыі, якая размяшчалася ў Санкт-Пецярбургу.

[2] Астраленка — горад на паўночным усходзе сучаснай Польшчы.

[3] Тыльшы, Тыльзіт, сёння Савецк Калінінградскай вобласці.

[4] Ёсць і іншыя версіі біяграфіі Нарбута ў 1812 г., гл. вышэй.

якая надышла без папярэдняй цяжкай хваробы. Як добры хрысціянін выконваў усе касцельныя законы і пайшоў з жыцця пасля споведзі і св. сакрамантаў. Размаўляючы са мной, ён некалькі разоў паўтараў, што самая вялікая, матэматычная праўда — гэта існаванне Бога і Яго святой мудрасці.

Больш за 10 гадоў таму маёнтак Шаўры меў выгляд мілай, вясковай, добра ўпарадкаванай сядзібы. Тэадор Нарбут — матэматык, добра абазнаны ў фізіцы, трымаў гаспадарку ў добрым стане і лічыўся заможным землеўладальнікам. Зараз гэтае месца мае сумны выгляд знішчэння і пусткі. У прасторным жылым доме, у якім мелася грунтоўная бібліятэка і вялікая калекцыя археалагічных старажытнасцяў, цяпер пануе страшэнная пустэча. Няма ўжо запоўненых кніжных шафаў, няма бронзавага літоўскага бога вайны Каваса, якім так ганарыўся наш гісторык.

Знікла і зброя старажытнага літоўскага рыцара разам з фетышам і каменнай багіняй кахання Мілдай. Няма нават слязніцаў — засталася толькі адна вялікая урна ці гліняная попельніца, як сімвал сучаснага стану рэчаў і надмагільны помнік незваротнага мінулага.

Успаміны Альжбеты Табенскай[1]

Сям'і, сябрам, суайчыннікам
і ўсім сваім вучням і вучаніцам,
а таксама ўнукам і ўнучкам
прысвячае
бабуня А. Табенская.

Не заўсёды бяжыць жыцце,
Роўненька прастуе,
Не заўжды яго дзясніца
Шчасце нам рыхтуе.
Для адных — дык светла, ціха,
Слодыч успамінаў,
Для другіх — нядоля, ліха,
Быццам Бог іх кінуў.
А ўсё ж з дзённіка выгнанкі
Шмат для павучання
З чорных ночаў, шэрых ранкаў
Возьмеш пры жаданні.
Нават сёння з тых цярпенняў
І шляхоў нядолі
Возьмем новым пакаленям
Моц для новых ролляў.
Мала думаць, мала марыць,
Справы, справы трэба:
Мужных чынаў, цяжкай працы…
Рэшту дасць нам неба.

J. S.

Да чытачоў

Толькі той, хто правёў доўгія гады на выгнанні, далёка ад Бацькаўшчыны — сям'і і суайчынікаў — у болі і тузе, толькі той здалее зразумець, якім

[1] Пераклад з польскай мовы Станіслава Судніка. Паводле «З долі і няволі. Успаміны выгнанкі». Кракаў, 1897.

шчасцем ёсць вяртанне на радзімую зямлю!

Бо каго зычлівасць родных, прыяцеляў, знаёмых і нават незнаёмых суайчыннікаў прывітае так цёпла і сардэчна, а спагада высакародных людзей сваёй апекай так аточыць, як мяне — выгнанку, якая вярталася на Бацькаўшчыну, атачыла, той забудзе пра боль мінулага. Дабраславенна для Бацькаўшчыны жыць, працаваць і цярпець, дабраславенна вярнуцца на яе лона, каб пры гаснуўшым ужо жыцці пачувацца блізка да сэрца Маці і засынаць з той думкай, што спачынеш сярод сваіх — на лоне радзімай зямліцы.

Вільня — мая радзімая! Кракаў і Варшава ў абдымкі свае мяне прынялі!... Загаіліся тут крывавыя язвы, і раны сэрца супакоіліся ад болю... Варшава на працягу дванаццаці гадоў дала мне ўсё, што патрэбна для душы і цела. Маю тут да канца жыцця прытулак, і плямяннікам маім, сіротам па бацьку-выгнанцу ў прыстасаванні да працы дапамагаю. І Кракаў тых кроўных маіх абдорвае. Вільня, сама ў нядолі, хоць не можа дапамагчы, памяццю сваёй і зычлівасцю суцяшае і абдорвае.

Кроўныя мае, плямяннікі, унукі і ўнучкі, прыяцелі, вучні і вучаніцы, старэйшыя, малодшыя і дзеці з захапленнем і спачуваннем слухалі мае апавяданні, а паколькі я не магла ўсіх сабраць і ўсім, хто хацеў мяне пачуць, распавесці, абяцала, што некалі пра долю маю і нядолю напішу.

Жыццё кацілася цяжкім колам, і акалічнасці не складваліся спрыяльна, таму абяцанне маё не магло ажыццявіцца раней. Думкі той, аднак, я не пакінула і прагнула з маіх успамінаў аснаваць змест беднай, але праўдзівай гісторыі жыцця. Дзеці любяць чытаць цікавыя, поўныя казачных і выдуманых здарэнняў аповесці — чытаюць столькі, чаму ж бы не мелі прачытаць некалі і тое, што было праўдай і пераплялося не ружамі, а цернем.

Няздарнае гэтае маё пісанне сёння, можа, з ні адной крытыкай не спаткаецца. Можа, таксама, ні адно халоднае сэрца не зразумее і не ўспрыме той думкі, якая мной кіравала. Знойдуцца аднак і такія, якія прачытаўшы ўспаміны выгнанкі, параўнаюць сённяшняе жыццё з днямі мінулага і зразумеюць, што нават такой дробяззю, такой пясчынкай, як мае ўспаміны, пагарджаць не трэба, бо і са спаеных пясчынак паўстаюць горы, а з жыцця адзінак сплятаецца жыццё народа.

Не вымагайце ад гэтай маёй працы дасканаласці, калі сонца заходзіць — цемра распасцірае навокал свае крылы. Калі жыццё дагарае, цямнее ўжо розум, гасне зрок, тупее слых, пяро дрыжыць у руцэ, і думка не мае крылаў для палёту. Сэрца, адно сэрца б'ецца аднолькава, адной любоўю да Бацькаўшчыны гарыць, адным няктарам нязломнай веры напіваецца. Гэта сэрца не ўцішанае, ні супакоенае, гэта сэрца яшчэ і цяпер у змроку гадоў сівой старасці прагне дзейнасці, і яно прагне падаць унукам з шэрых успамінаў тоненькую тканку.

Прыміце ад мяне тое, што вам магу сказаць: «Чым хата багата — тым рада».

І будзьце перакананыя, што да апошняй хвілі жыцця вас кроўных — далёкіх і блізкіх — і ўвесь мой народ, усю Бацькаўшчыну любіла і люблю горача і шчыра.

Бо да вас, малодшых, да моладзі звяртаюся з сардэчнай просьбай: «Любіце Бога, святую веру, Бацькаўшчыну і цноты! Шануйце час, як рэч найдаражэйшую, бо за кожную хвіляй маем здаць справаздачу перад Богам, і з кожнай хвіляй жыццё наша праходзіць, а чалавек ёсць панам толькі гэтай хвілі. Хвіля, якая прыйдзе, — няпэўная, а якая прайшла — не вернецца. Будзьце паслушнымі бацькам і старшым, бо непаслушэнства, з якога звычайна паходзяць кепскія ўчынкі, засмучаюць іх і аддаляюць ад вашага дома Божае дабраславенства!»

Пасля майго вяртання ў край я са смуткам заўважыла, што цяпер наступілі вялікія змены ў паводзінах дзяцей адносна старэйшых. У мае часы дзеці мусілі слухаць старэйшых і ісці за воляй дасведчаных людзей. Сёння бацькі стараюцца ўгадваць думкі сваіх дзяцей, дагаджаць ім, і старэйшыя паддаюцца, каб імі кіравалі капрызы дзяцей.

Страх Божы, які ёсць пачаткам усялякай мудрасці, быў прышчэплены нам змоладу. Сёння шырыцца ігнараванне рэчаў святых і вялікіх, а моладзь мае сэрцы, перапоўненыя самалюбствам. Гультайства і фанабэрыя ўзялі верх над прастатой і працавітасцю. Ідэалы сёння высмеяны, матэрыялізм пастаўлены на першае месца. Жыццё сёння не сягае ў глыбіню духу — у думку і сэрца, не шукае праўдаў — ахвяраў і вялікіх чынаў, а задавальняецца тым, што лёгкае, зручнае і выгаднае. Вы, хто ёсць будучыняй народа, глядзіце ўважліва, каб з пустатой у сэрцы і душы не ісці да таго заўтра, пра якое ніхто не ведае, якім яно быць можа.

Некалькі гэтых думак маіх няхай будуць вам перасцярогай і развітаннем. Маё сонца нахілілася да захаду, неўзабаве згасне, ваша няхай узыдзе высока і азалоціць праменямі цноты — любові і веры — вас і любую Бацькаўшчыну.

Развітваюся з вамі ўсімі, даючы невялічкі падарунак і дабраславенства, накрэсленая дрыжачай рукой. Любіўшая вас да апошняй хвілі жыцця цётка і бабка

А. Табенская.

9 чэрвеня 1897 г.

І

Бацькі мае, Тэкля з Навіцкіх і Міхал Табенскі мелі малую вёску Рудаў у Віленскай губерні, Лідскім павеце, Васілішскай парафіі. Вёска тая была за 4 вярсты ад касцёла, у які мы ездзілі разам з бацькамі ў нядзелі і святы. Ад вёскі вяла дарога да прыгожага ляску, які называўся барком, барок гэты, малы абшарам, меў выдатныя сосны са ствалами такімі тоўстымі, што нас чацвёра дзяцей, узяўшыся за рукі, абняць іх не маглі. Праз барок праходзіў

шырокі гасцінец з парафіяльнага мястэчка Васілішкі на Забалаць. У барку, які быў для нас наўлюбёнейшым месцам забаваў, сядаліся мы летняй парой з бацькам, і ён нам у той час апавядаў шмат прыгожых і цікавых рэчаў.

Бацькі нашы, сумленныя і працавітыя людзі, якія карысталіся павагай навакольных жыхароў, дзяцей сваіх выхоўвалі сурова; грымасы, капрызы, непаслухмянасць бацькоўскім кодэксам былі нам забароненыя, а няхай бы толькі бацечка на нечым падобным нас злавіў, адразу была ў рабоце розга, бо па-першае: «Розгай Дух Святы дзетачак біць раіць!» Наколькі памятаю, было нас у той час у доме чацвёра дзяцей: найстарэйшая сястра Віцуся, жывая, смяшлівая, вясёлая, але, нажаль, слабая на розум. Бедная сястрычка, маючы ледзве чатыры гады, упала два разы са стала на галоўку і так нешчаслівa, што адразу анямела. Толькі праз некаторы час мова пачала вяртацца, але ўжо нейкая невыразная: розум відочна аслаб, бо бедалага паняцця ні пра што не мела, і не можна было яе навучыць ані чытаць, ані пісаць, ані нават лічыць да дзесяці. Другая сястра Амілька была добрым дзіцяткам і свааёй мілай знешнасцю латва да сябе сэрцы прыцягвала. Была яна фаварыткай нашай маці і кузінаў, якія нас адведвалі летам. Потым па чарзе ішла я, а за мной Костусь, вельмі растаропны і добры хлапчына. Найстарэйшага брата Аляксандра ў гэтую эпоху я не памятаю, быў ён у кузіна нашай маці Фрыдэрыка Нарбута, дзе яму было не вельмі добра. Алесь вярнуўся дадому вялікім ужо хлопцам, з якім мы, дзеці, баяліся прывітацца. Праз нейкі час прыбыў нам яшчэ адзін брацік, якому на святым хрышчэнні далі імя Цыпрыян. Дзядзіна наша, прысутная на хрысцінах, сказала маёй маці, што возьме мяне на выхаванне; я не разумела яшчэ значэнне гэтага выразу, але з падказкі маці за абяцанне падзякавала. З гэтага часу я пачала вучыцца чытаць, навука ішла някепска, а калі яшчэ знаёмы пан Бернатовіч падараваў мне малюткую святую гісторыю з малюнкамі, радасць мая не мела межаў. З цікаўнасці да значэння малюнкаў я ўчытвалася, хоць з цяжкасцю, у маю кніжачку, шкадавала Авеля, аплаквала яго смерць, гневалася на Каіна, цешылася, што Ісак пазбег ахвярнай смерці, а потым з нецярпеннем чакала прыходу бацькі на абед, каб яму распавесці, што ў маёй кніжцы вычытала.

Бацька наш быў вельмі заняты сельскай гаспадаркай, аднак у вольныя хвіліны, калі мы з Костусем падбягалі да яго, тлумачыў нам сельскую працу, вучыў, як называецца начынне і для чаго служыць; як зерне сеецца і якія стадыі праходзіць, пакуль не ператворыцца ў смачны хлеб. Гаварыў нам бацька пра дрэвы і кветкі, плады, грыбы і ягады, а я, даведаўшыся, што ўвесь гэты свет, такі прыгожы, створаны рукою Бога, набралася ўяўлення пра дабрыню і ўсемагутнасць божую; пастанавіла любіць таго добрага Творцу, старанна вучыцца і навучаць іншых, як мяне мой бацька навучаў. Маючы пяць гадоў, я ўмела ўжо чытаць, таму дарагая маці мая вырашыла, што я павінна вучыцца працы. Першая праца

была работа на двух прутках, патлумачаная маці і бацькам, які яе сам так добра ўмеў, што і мяне вельмі хутка навучыў. З таго часу што дзень давалі мне пэўнае заданне, па сканчэнні якога я магла рабіць, што захачу. Таму я з любімым брацікам Костусем гуляла і размаўляла; сёстры Віцуся і Амілька любілі займацца гаспадаркай, наймілейшая для нас усіх аднак забава была вясной і летам у агародзе. Быў там велізарны дуб, разложысты, з пнём, спарахнелым унізе. З дапамогай пастушка нашага Юзафа Лапешы і габрэя Мендалька, чые бацькі ў нашага бацькі арандавалі карчму, якая знайходзілася пры гасцінцы, ачысцілі дуб унутры і зрабілі канапку з дзёрну. У тым салоне мы гулялі ў госці, наносілі сабе візіты, спраўлялі прыёмы, на якіх фігуравалі моркаўка і рэпка, парэзаныя на танюткія кружочкі, што замянялі цукеркі; кавалак дошкі служыў за паднос, а ліпавыя і іншыя лісты — за сподкі; дадаваць не трэба, што нажы і відэльцы мелі натуральныя. Часам мы мелі больш пышныя прыёмы, калі любімы наш дзядуня, Алойзы Табенскі, прыносіў нам сапраўдных абаранкаў; дзядуня быў госцем нашым наймільшым, у дадатак да прыемнай постаці такі добры, лагодны, ніколі не бачыла, каб ён гневаўся. Не было для нас больш прыемнай гасціны, як ва Укольніках у дзядуні і дачкі яго Матыльды, якая з мужам і двумя дзецьмі: Юзем і Зосяй жыла пры дзядулі.

І зноў неўзабаве адбылася ў нас новая змена. Пан Бог даў нам маленькага браціка Мечыслава, цяпер ужо ў добрым веку ксендза каноніка, які жыве ў Рызе. Да хрышчэння яго трымалі Аўгустын і яго жонка Навіцкія, вельмі сумленыя людзі і шанаваныя нашымі бацькамі, Францішак Якімовіч і яшчэ адна кума, чыё прозвішча не памятаю. З гэтай урачыстасці адна акалічнасць асабліва ўрэзалася мне ў памяць: неяк перад хрышчэннем ніхто не падумаў пра выбар для браціка патрона — калі пры цырымоніі ксёндз запытаў, якое імя будзе мець дзіця, хрышчоныя бацькі, не падрыхтаваныя, адразу не адказалі, я ведаючы ўжо трохі польскую гісторыю і палюбіўшы Мечыслава I за ўвядзенне святой веры ў наш край, з усёй сілы закрычала:

— Мечыслаў!

Тады ксёндз зрабіў заўвагу, што яшчэ павінны абраць другога, больш вядомага святасцю патрона — я зноў адазвалася:

— Францішак, — бо гэта было адно з імён хрышчоных бацькоў, пана Якімовіча.

На хрышчэнні браціка Меці прысутнічаў кс. Дамінік Бурачэўскі, апошні з аа. дамініканцаў васілішскага кляштара, які даўней належаў аа. францішканцам.

(У тым кляштары жыве цяпер нейкі бацюшка са сваёй сям'ёй. Васілішскі касцёл аддадзены пад царкву, так выслужыўся кс. Сільвестр Шмігер, тамтэйшы пробашч. Бо мог абараніць васілішскі касцёл ад забрання, калі прымусілі да вырашэння таго, які касцёл мусіць быць ператвораны ў царк-

ву — ці гэты дамініканскі, абдараны ад святой сталіцы многімі ласкамі і святамі, які меў цудоўныя абразы Маці Божай у вялікім алтары і святых панскіх з двух названых ордэнаў — ці той малы, стары касцёлік, прылеглы да плябані і аддалены ад мястэчка Васілішкі за вярсту? Пробашч, нягледзячы на моцныя просьбы і ўгаворы васілішскіх жыхароў, нягледзячы на тое, што хочучы захаваць касцёл сабралі складкі ў памеры 2000 рас. руб. для спраўніка, які таксама хацеў гэты касцёл уратаваць, пробашч той, ад якога залежала выказванне просьбы, згадзіўся, нажаль, аддаць васілішскі касцёл! І бедалага за ўчынак свой пры жыцці ўжо пакутуе! Жыццё сваё праводзіць у апошняй нястачы, не маючы нават за што купіць папяросаў, так што толькі недакуркі па падлозе збірае! Такія дзіўныя, але справядлівыя дзеі Боскія.)

Ад часу, калі нам прыбыў наймалодшы брацік, найбольшай уцехай Костуся і маёй было сядзець пры ім, прыглядваць за ім і марыць, кім гэта ён будзе, як вырасце. Аднаго разу, прыйшоўшы на звыклае наша паседжанне, мы засталі маці моцна плакаўшай; на від яе смутку і мы пачалі плакаць, а маці нам сказала з болем:

— Няма ўжо дзядзевай нашай, памерла! Малыя яе сыночкі сіротамі засталіся.

Мы прасілі нашую матухну, каб супакоілася, а калі гэта не дапамагло, пабеглі да бацькі, які, апавешчаны пра няшчасце, ішоў якраз дадому. Расказалі яму пра смутак маці і прасілі распавесці нам, чаму дзядзіна памерла, што з ёй цяпер будзе, што значыць быць сіротамі? Бацька ў кароткіх словах нам тое вытлумачыў, за што мы яму былі ўдзячныя, бо ў нашым узросце (я мела 8 гадоў, а Костусь — 5) нашыя паняцці ў другі свет яшчэ не сягалі. Неўзабаве за гэтым прыехаў да нас дзядзька Навіцкі, смутны, бледны. Маці наша прывітала яго не з радасцю, як звыкла, а са слязамі. Пасля прывітання дзядзька сказаў:

— Жонка мая абяцала табе, сястра, узяць на выхаванне Альжуню тваю. Бог у мяне жонку забраў да сябе, а без яе не магу выхоўваць дзяўчынку. Хачу, аднак, выканаць тое яе пажаданне, таму прашу: дайце мне на выхаванне Костуся. Я буду мець пры маіх хлопцах прыстойнага старога француза, які будзе заўсёды з дзецьмі; Марыся — добрая кабета, кухарка, жонка Міхала будзе іхняй нянькай, я буду старацца і маці ім замяніць.

Дзядзька і наша маці пачалі плакаць абое, сардэчна абдымаючыся, маці падзякавала дзядзьку, гаворачы аднак, што не ведае, ці бацька згодзіцца. Мы не ведалі, ці з таго цешыцца, ці смуткаваць, але тое, што бацька наш можа праект не дазволіць, вельмі нас зацікавіла. Маці наша даручыла нам знайсці бацьку і папрасіць яго, каб прыйшоў дадому пабачыцца з дзядзькам. Мы заўважылі, што бацька зрабіў гэта неахвотна; маўчаў, калі мы расказвалі пра тое, што дзядзька сказаў маці, а прыйшоўшы не прывітаў дзядзьку з прыязню. Дзядзька адразу ж абазваўся:

— Ведаеш, пане Міхале, пра маё няшчасце?

— Няхай вас пан Бог суцешыць, пане Тадэвушу.

— Я прыехаў да вас з тым, каб узяць вашага Костуся на выхаванне; здольнае гэта і да навукі ахвотнае дзіця, дам яму адукацыю, разам з маімі сынамі выхаваю, і, дасць Бог, выйдзе на чалавека.

— Гэта добра, — адказаў бацька, — але мне хацелася б, каб я мог сам вывесці яго на чалавека; гэта маё любімае дзіця, здольнае, разумнае, да навукі ахвотнае! Хацеў бы, каб атрымаў адукацыю, але не ў стане даць яму яе, а ласкі ад нікога прыняць не хачу! Няхай гэтае дзіця застанецца пры мне, няхай я лёсам яго пакірую, я бедны, няхай і ён будзе бедны. Навучыўшыся панскага побыту, можа б старым бацькам пагарджаў бы! Будзь здароў, пане Тадэвушу, не дам пану Костуся!

І выйшаў без развітання вельмі ўзбуджаны. Дзядзька ад таго амаль змяртвеў, маці яшчэ больш. Мы чулі потым, як бацькі размаўлялі паміж сабой павышанымі галасамі, як бацька закрычаў з абурэннем:

— Брацік твой — пан, а я — шляхціц, я не хачу яго ласкі, няхай аддасць твой пасаг, і я дам Костусю адукацыю.

Скончылася, аднак, на тым, што аддаў Костуся да дзядзькі, сказаўшы маці:

— Вязі сама Костуся, я да браціка твайго не паеду, скажы яму, што нага мая ў дом яго ніколі не ступіць!

Праз пару дзён дарагая матуля, забраўшы Костуся і мяне, паехала ў Валэйшы, маёнтак дзядзькі. Не спадабаўся мне яго дом; быў непараўнальна большы за наш, але неяк цёмна ў ім было і не так весела, як у нас. Сынкі дзядзечкі то былі прыгожыя, далікатныя хлопчыкі; Костусь быў на многа мацнейшы, меў не такія прыгожыя і далікатныя рысы твару, цела цёмнае і рукі цёмныя, што пры Уладзю і Эмануэльку тым больш было відно. Абедалі ў дзядзькі; пасля яго затрымаліся яшчэ на хвіліначку; надышла нарэшце хвіля ад'езду, мы развіталіся з Костусем, які, уражлівы з натуры, з вялікім жалем з намі расставаўся, і адны ўжо вярнуліся дадому

Некалькі тыдняў прамінула, а я браціка майго любімага не бачыла! Я займалася цяпер больш работай; навучылася абрабляць хустачкі для носа, рабіць на пяці прутках усю панчоху — занятая моцна працай часу не мела на нуду. Праз некалькі тыдняў мы ўбачылі прыехаўшага дзядзьку з трыма хлопчыкамі, аднолькава прыбранымі. Што за радасць была для нас і для Костуся! Нацешыцца не мог, калі бачыў бацькоў і нас усіх; абдымаў нас цалаваў, хацеў расказаць адразу, чаму навучыўся, колькі ад дзядзькі чуў розных рэчаў, розных апавяданняў і аповесцяў. Пастаянна быў пры бацьку, дэкламаваў яму вершыкі, апавядаў, што бачыў чуў. Нарэшце задаў пытанне:

— Бацечка, я ведаю, што гэты дом, гэты барок, гэтыя пчолы — гэта наша, але няхай мне татусь скажа, чаму я ў дзядзькі? Ці мяне бацькі дзядзьку прадалі ці падарылі?

— Не, мой любімы, — адказаў бацька з перажываннем, — ані мы цябе падарылі, ані прадалі, толькі далі мы цябе дзядзьку на выхаванне, каб вучыўся і быў разумны — і бачыш, што ў такі кароткі час многім ужо скарыстаўся, а цяпер, як будзеш добра ўмець чытаць, як дзядзька возьме адукаванага настаўніка, які цябе ўсяму навучыць!

Пацалаваў яго бацька, абняў, як найчулей і не гневаўся ўжо на дзядзьку, бачачы, як Костусю ў яго карысна.

Дзядзечка сказаў бацькам, што не можа пасля смерці жонкі жыць у Валэйшах, што яму невыносна смутна, а вырашыў і даў слова ўміраўшай жонцы, што сам будзе клапаціцца над выхаваннем сваіх сыноў. Не могучы тыя дзве рэчы прымірыць, прадае Валэйшы і мае намер узяць маёнтак Любар у арэнду ад князя Юзафа Любэцкага, які жыве ў Шчучыне, парафіяльным мястэчку, якое з'яўляецца яго ўласнасцю. Была там некалі слаўная школа аа. піяраў, дзе вучыліся наш дзядзька і амаль усе жыхары нашага павета, з якіх, падобна, ужо ніхто не жыве. Бацькі мае прызналі слушным, што дзядзька зменіць Валэйшы на Любар, бо першыя прыгняталі яго балючымі ўспамінамі, а другі прыпамінаў яму любы школьны час. Дзядзька пакінуў сваіх хлопчыкаў у нас, а сам паехаў у Шчучын для заключэння дамовы з князем Юзафам Любэцкім. Мы вельмі абрадаваліся, што брацікі засталіся з намі, забаўляліся весела, і ніколі нам для забаваў тэм не забракла. Праз некалькі дзён дзядзька вярнуўся і сказаў, што ўмова ўжо заключана і што ён неўзабаве выедзе ў Любар. Выезд той неўзабаве наступіў; забраў дзядзька і нашага Костуся, з якім мы ад таго часу бачыліся толькі на ўрачыстыя святы, у час якіх дзядзька разам з сынкамі і брацікам нашым звык нас адведваць.

Мы ж пачалі патроху вучыцца. Маці наша старалася даць нам нейкае такое выхаванне, каб мы пры заможных нашых сваяках не выдзяляліся невуцтвам.

У Шчучыне быў кляштар Сясцёр Міласэрнасці, фундацыі графіні Сцыпіён, бабкі князёў Юзафа і Аляксандра Друцкіх-Любэцкіх. Манахіні мелі ў тым кляштары школы: адна называлася «Клас польскі», другая — «Клас французскі». З гэтага кляштара маці прывезла маладую, прыгожую і ветлівую паненку, якая мела быць у нас на канікулах, а пазней выехаць на ўмоўленую пасаду. Паненка тая нам падабалася, але не было ад яе ніякай карысці; маладзенькая, сама не ведала, што мела з намі рабіць; пазней была другая, старэйшая за яе, тая вучыла нас патроху, але несумленна, нядбала, больш была занята ўласнай работай, на нас зусім не звяртала ўвагі, мы рабілі, што нам падабалася. Бацькі з даверам уручылі ёй нас, не дапускаючы нават думкі, каб беручы аплату, можна было быць такой несумленнай. Не лепшай была і трэцяя настаўніца, якая выкладала французскую мову і музыку. Настаўніца тая няўдачна сапсавала сабе рэпутацыю падчас побыту ў апошнім сваім месцы; жыла потым у сваіх знаёмых, якія раілі ёй

канешне, каб прыняла месца ў нас, пакуль якой лепшай пасады не знойдзе. Настаўніца на гэта згадзілася, маці старалася даць ёй усялякія выгоды, сабе і нам іх адмаўляючы; і так, напрыклад, мы не пілі ніколі гарбаты, для пані Марыі знайшлася яна як раніцай, так і вечарам. Дзіўныя гэта былі ўрокі з той паняй Марыяй — ніколі нам нічога не расказвала, не тлумачыла; задавала нам звычайна па 10 радкоў ці з катэхізму, ці са святой гісторыі, ці з геаграфіі, гісторыі, што выпадала ў штодзённым раскладзе ўрокаў. Потым ішла ў сад трохі пашпацыраваць, а мы павінны былі за той час урокі падрыхтаваць. Вярнуўшыся з прагулкі пыталася: «Вывучылі ўрокі?» «Вывучылі», — адказвалі мы. «Ну, то добра, назаўтра вывучыце 10 радкоў далей, якія вам пазначу алоўкам». Вось такім спосабам адбываліся ўрокі на працягу некалькіх тыдняў.

У той час дзядзька прыслаў нам малое фартэпіяна. Таму пані Марыя вучыла нас патроху музыцы, сама грала шмат і прыгожа, што рабіла нам вялікую прыемнасць. Шкада мне сваю дарагую паню Марыю, нудзілася яна ў нас, бо ніхто тут не бываў, таму што ўсе былі заняты гаспадаркай у полі.

Праз некалькі месяцаў прыехаў дзядзька з дзецьмі: радасці было — не апісаць. Настаўніца, папярэджаная пра прыезд дзядзькі, пачала нас вучыць паклонам; трэба было зрабіць тры крокі ад дзвярэй, а потым прыгожы рэверанс. Мне гэта давалася з вялікай цяжкасцю, бо я была вельмі нясмелай; таму таксама, як дзядзька прыехаў, жагналася са страху перад выхадам для прывітання. Выйшла нарэшце, а калі дзядзька паглядзеў на мяне, так жудасна змяшалася, што, забыўшы пра вывучаныя крокі і пра рэверанс, пацалавала толькі руку дзядзькі, абняла братоў і ўцякла ў другі пакой, плачучы, што ў мяне так не атрымалася.

На другі дзень папрасіў дзядзька, каб пані Марыя Каменская дазволіла яго хлопчыкам праэкзаменаваць нас з таго, чаму мы навучыліся. Пані Марыя згадзілася на гэта; мы паказалі брацікам нашы кніжкі, але былі вельмі прысаромлены, бо нічога нават пачаць не ўмелі; бедны Костусь за нас чырванеў, а Уладзя і Эмануэлак смяяліся, што не веды, а чарот ці капуста расце ў нашых галовах. Костусь і кузіны паўгода мелі вельмі добрага і сумленнага настаўніка; быў гэта студэнт былога Віленскага ўніверсітэта, 10 гадоў назад, у 1825 годзе, скасаванага царом Мікалаем I, нейкі пан Ян Мысліцкі, плямяннік шляхціца Міхала Мысліцкага, які жыў блізка ад Рудава. Вельмі разважлівы, ветлівы, настаўнік па прызванні, быў цалкам адданы сваім вучням: вучыў іх у час прагулак і пры гульні ў садзе, апавядаў ім, як які дзядуня, размаітыя, займальныя і карысныя рэчы. Кузіны нашы і Костусь за гэты кароткі час многае ўжо спасціглі, мы ж нічога наогул.

Спыніліся ў канцы на тым, што па парадзе дзядзькі неўзабаве маці адвезла мяне і Амільку ў Шчучын, бо пані Марыя атрымала вельмі добрую пасаду настаўніцы ў пані падкаморыхі Марачэўскай ва Уніхоўшчыне.

Мяне маці пасяліла ў пані Пелагеі Гурыновіч, а Амільку хацела яшчэ забраць дадому, маючы на ўвазе яе вельмі малады ўзрост. Аднак атрымалася іначай. Мы пайшлі з маці ў кляштар для дамовы са старшай паняй Ганнай Задэйкай пра ўмовы майго прыняцця; тая непараўнальна добрая кабета амаль нічога ад маіх ведаў не вымагала, а, гледзячы на Амільку, спытала ў маці, што з ёю думае рабіць. На адказ, што думае забраць дадому, бо яшчэ малая, пагладзіла Амільку па твары, гаворачы: пакінь яе пані ў нас, маем яшчэ меншую за яе. Маці з удзячнасцю прыняла гэтую прапанову, і з'явілася наступная дамова: за мяне маці нічога за вучобу не плаціла, а за Амільку, якая памяшчалася там на ўсім гатовым, маці была абавязана заплаціць збожжам, бочку жыта і гароху. Так мы пачалі вучыцца сістэматычна, дзякуючы той слаўнай манашцы. Мне добра было ў пані Гурыновіч, а Амілька мела не асабліва добраё жыццё і жыллё.

Дзіўнае ўражанне зрабіў на мяне кляштар, манашкі і іхняя прыгожая капліца, у якой мы штодзень слухалі святыя імшы. Капліца тая падалася мне як нешта надзямное, манашкі — як святыя, здзіўлялі іх пабожныя манеры, канцэтрацыя духу ў час святой імшы, прыняцце святой камуніі, усе паводзіны ў касцёле і класе. Палюбіла іх усёй душой і дагэтуль не трачу найвышшай павагі да духоўных асоб.

Амілька была ва ўступным класе, я паступіла ў першы. У адной вялізнай зале быў польскі клас, дзе шмат дзяцей і вялікіх паненак, вучылася самым розным работам. У канцы той залы вісеў абраз вялікага памеру. Пан Езус дабраслаўляў дзяцей з подпісам: «Дазвольце дзеткам прыйсці да мяне». У другім класе, які называўся французскім, насупраць уваходных дзвярэй быў павешаны абраз Маці Божай, якая пакрывала сваім плашчом грамадку дзяцей. Акрамя манашак, якія займаліся ўрокамі, настаўніцкі калектыў у Шчучыне складаўся з ксендза-бернардынца, які выкладаў катэхізм, пана Шпакоўскага, які вучыў геаграфіі, і пана Крэдыта — арыфметыка і расейская мова. Былі таксама дзве настаўніцы: пані Станкевіч, якая выкладала французскую мову, і пані Араноўская, асоба з вельмі сімпатычнай знешнасцю. Расклад дня ў нашым пансіянаце быў наступны: мы ўставалі а пятай, а палове сёмай ішлі на святую імшу ў капліцу. Перад тым аднак, сабраўшыся ў адным з класаў, мы станавіліся парамі; дзве манашкі праходзілі каля шэрагу, пытаючыся кожную з нас нешта з катэхізму, пасля чаго ў строгім парадку, парамі мы ішлі на святую імшу і ўкленчыўшы маліліся: вучаніцы французскага класа з правага, а польскага класа з левага боку. Нельга было аглядацца, размаўляць, а толькі мець увагу звернутую на алтар. Па святой імшы адна з сясцёр, містрыня 1-га класа, прамаўляла ўголас літанне да святога Вінцэнтага а Паўло, у пятніцу да Пана Езуса, а ў суботу да Маці Божай. Потым выходзілі ў парадку — пансіянаткі ішлі ў рэфектаж (трапезную), а прыходныя дадому на сняданне. Урокі пачыналіся а восьмай і ішлі да паўдня без адпачынку, а пасля абеду — ад другой да пятай. Навука мне да-

валася добра, я мела да яе ахвоту, пры тым мела добрую памяць і паняцце. Амільцы таксама няцяжка было, але яна хацела працы і часта ў час урокаў маленькая і міленькая хавалася паміж старэйшых і большых каляжанак, каб рабіць шыдэлкам карункі, за якія ад заможнейшых паненак атрымоўвала нешта з яды. На святы мы заўсёды ездзілі дадому, і так час ляцеў у любімым кляштары, дзе мы з Амількай прабылі два гады. Пад канец другога года нашага там побыту, перад вакацыямі, увайшла аднойчы ў наш клас начальніца, Старшая Панна, як яе ўсе называлі. Мы паўставалі, як звыкла, на яе прывітанне, а яна сказала нам са смуткам:

— Мае дзеткі, пасля вакацый вы ўжо не можаце быць у мяне! Цар Мікалай не дазваляе, каб мы займаліся вашай адукацыяй, такая, відаць, воля Божая! Напішыце вашым маці, каб прыехалі вас забраць.

Мы пачалі плакаць, а Старшая Панна сказала:

— Не плачце, любыя дзеткі, пойдзем у капліцу памаліцца і папрасіць пра апеку над намі.

Мы пайшлі ў тую ж хвілю, а з намі Старшая Панна. Наша сястра-містрыня ўголас прамовіла тры «Ойча наш», тры «Здровась Марыя» і тры «Слава Айцу», потым псалом «Хто ў апецы» і літанне да Маці Божай; пасля выхаду з капліцы мы ўпалі на калені перад выходзіўшай Старшай Паннай, 80-гадовай бабуляй, цалуючы ёй рукі і ногі, яна ўжо нічога не гаварыла і ў маўчанні пайшла да сябе.

Неўзабаве прыехала наша бедная маці: паклікалі нас да яе, у пакой, суседні з пакоем Старшай Панны. Маці нашая плакала, начальніца была сумная: улады дазволілі застацца вучаніцам яшчэ на два ці тры тыдні пасля св. Пятра, потым усіх мелі разабраць. У кляштары засталіся рэзідэнткі ці асірацелыя бабулькі, якія мелі пэўны фундуш (сродкі на ўтрыманне) і хацелі закончыць жыццё пад апекай сясцёр міласэрнасці; застаўся яшчэ польскі клас і шпіталь.

Надышоў неўзабаве час развітацца назаўсёды з мілым Шчучынам, шаноўнай Старшай Паннай і іншымі манашкамі, высакароднай паняй Гурыновіч. Шмат слёз каштавала мне гэтае развітанне. Я выехала з найпалымянейшым жаданнем закончыць адукацыю, Амілька — з ахвотай, абы ўжо больш не вучыцца. Так сталася; праз пяць ці шэсць гадоў споўніліся мае мары, аддалі мяне ў Вільню ў пансіянат для заканчэння адукацыі; у тым самым годзе Амілька выйшла замуж за геаметра (землямера) Зыгмунта Урублеўскага. Абое ўжо памерлі, і найменшая іхняя дачка Ядвіга Шмерт памерла, пакінуўшы двухгадовую сіротку Марыхну, якую маю ў думках, пішучы гэты аповед; бо 10-гадовая мая ўнучка старанна вучыцца і вельмі любіць чытаць цікавыя і добрыя рэчы.

Вярнуўшыся са Шчучына, мы былі ў доме нашых бацькоў, у тым часе Пан Бог даў нам сястрычку Антосю, на 14 гадоў малодшую за мяне. Займаліся мы пераважна работкамі, на цюлі гафтавалі ўстаўкі для падшывак;

калі работа была скончана, паехала маці з намі да сваёй прыяцелькі пані Рахелі Знанецкай, якая жыла ў Хадзялоні. Пры пані Рахелі знайходзіліся яе дзве плямянніцы — Аміля і Юстына Шукевіч, дарослыя ўжо паненкі. Там вельмі часта бывалі госці, таму была арганізавана латарэя, на якой наша работка была разыграна. Усе хвалілі нашую працавітасць, старэйшыя паненкі былі незадаволеныя, бо ім цётка пры гасцях ставіла нас у прыклад.

За грошы, атрыманыя ад латарэі, справіла нам маці паркалёвыя салопкі на ваце; дасканала памятаю іх дасюль, так мне падабаліся, што думала, што ніхто падобных не мае. Канешне, ніхто не меў такіх салопак, як нашы; быў гэта, як ужо сказала, паркалік — на чорным фоне блакітныя і жоўтыя досыць вялікія кветкі; пры гэтым пашытыя былі не надта добрым краўцом Лейбкам, які меў аднак тую перавагу, што за работу браў танна, а шыў моцна, што доўга нічога не паролася.

У той час, калі мы так працавалі ў Рудаве, дзядзька Навіцкі доўга ў нас не паказваўся. Ён рабіў старанні, каб памясціць Костуся ў Берасцейскі корпус на скарбовы кошт, а сваіх сынкоў — у школу інжынераў у Пецярбург. Непрыязнь бацькі да дзядзькі ў той час яшчэ больш павялічылася — азнаёміў нарэшце дзядзька бацькоў пра свой намер; паехала маці развітацца з Костусем, а пазней бацька. Хацеў бацька забраць Костуся для развітання з дзядулем Алойзым Табенскім, але дзядзька на гэта не згадзіўся.

Пры ад'ездзе бацькі адбылася прыкрая сцэна; бедны Костусь са слязамі кінуўся да ног бацькі і крычаў з плачам:

— Ойча, забяры мяне з сабой, я хачу з дзядунем развітацца.

Бацька яго падняў і выгукнуў:

— Я не маю права гэтага зрабіць; дзядзька ёсць тваім бацькам, дабрадзеем і ўсім, а я — нічым, я нічога не магу зрабіць!

Акалічнасці склаліся так нешчаслівa, што дзядзька не мог выканаць пажаданняў нашага бацькі; быў гэта балезненны ўдар, нанесены беднаму Костусю, невылечная рана, зародак маральных боляў яго сэрца. Адчуваў ён з той хвілі крыўду на маці, што аддала яго дзядзьку, крыўду на дзядзьку, непрыязнь да яго сыноў, якія не адчувалі і не ўмелі падзяліць яго пачуццяў; яго апанавала неператадольная агіда да корпуса, да вайсковай службы, адно ў ім толькі засталося любоў да навукі і любоў да Бацькаўшчыны. Пісаў бацькам сваім у лістах, каб сыноў сваіх малодшых не песцілі, бо ім цяжка будзе прывыкаць да жыцця паміж чужымі. Меў у той час гадоў 9, калі першы ліст з корпуса напісаў. Потым з войска ўжо пісаў да маці: «Я, як расліна, перанесеная на чужую зямлю, невядома мне чуласць мацярынскага сэрца, невядома пяшчота маці!» Костусь заўсёды добра вучыўся і ў 14 гадоў быў першым па вучобе кадэтам. Аднаго разу, калі сталі на муштру ў шэрагі, дяжурны афіцэр зрабіў яму суровую вымову, што мае гузікі на мундзіры кепска пачышчаныя, і, паказваючы на апошняга ў вучобе кадэта, сказаў: «Вось, бяры прыклад з яго!» Костусь на гэта засмяяўся — афіцэр паскардзіў-

ся на яго перад генералам, і брат быў пакараны пазбаўленнем заслуг (меў званне сяржанта) і, наколькі сабе прыпамінаю, на дэградацыю з першага вучня на апошняга. Костусь гэта моцна перажываў, асабліва, калі заўважыў, што калегі пачалі трымацца ад яго наводдаль і як бы пагарджаць ім пачалі.

Пісаў тады да дзядзькі, просячы яго забраць з корпуса, што не хоча ўжо служыць у войску, а будзе ксендзам. Выцерпеў шмат, аж нарэшце супакоіўся. З корпуса кадэтаў у Берасці выслалі вучняў на два гады ў Пецярбург, у так званы Дваранскі полк, для заканчэння вучобы. Костусь пісаў бацькам, просячы іх з усіх сіл, каб прыехалі ў Ліду пабачыцца з ім у час пераезду. Ліст прыйшоў запозна! Іншыя бацькі прыехалі, ён сваіх дарэмна выглядаў, і яго чуллівае сэрца атрымала новую рану.

Калі ўжо закончыў вучобу ў Пецярбургу, перад экзаменамі было паслана са школы запытанне, ці бацькі ў стане забяспечыць сына пры выхадзе ў афіцэры гвардыі, што было першай за вучобу ўзнагародай. Папера тая праляжала на стале маршалка, не адасланая бацькам; ад іншых прыйшлі адказы. Канстанціну адказалі маўчаннем. Таму сказалі яму здаваць экзамен у артылерыю, ужо быў на палове тых з адзнакай здаваных экзаменаў, калі раптам невядома чаму перастаў на іх хадзіць. Не прыпомню, дзе ён у той час быў, дастаткова, што прыехаў да яго пасланы афіцэр даведацца, што такое сталася. Канстанцін, запытаны пра прычыну сваёй адсутнасці, адказаў, што мае парваныя боты і, не маючы за што новых купіць, на экзамен ісці не можа. Афіцэр ветліва з ім пагаварыў, ахвяраваў яму 50 рублёў, просячы па прыяцельску іх прыняць і закончыць экзамены. Паслухаў брат добрай рады, здаў экзамены, стаў афіцэрам і адразу пайшоў на Севастопальскую вайну, там настроены на смерць у любую хвіліну, атрыманае жалаванне адразу адсылаў бацькам, да якіх яго сэрца заўсёды рвалася. Мы ж у той час працавалі з Амількай, каб нешта сабраць на нашую вопратку. Я сумавала па вучобе і паўтарала штодзень патроху тое, чаму навучылася ў Шчучыне; для чытання нічога не мела, толькі кніжкі, па якіх вучылася, да гэтага яшчэ нейкія дзве кніжкі: «Пілігрымка ў Дабрамілю» і «Гісторыю Польшчы», апавяданні дзядзькі плямяннікам, знайшлася таксама аповесць Камілы Нарбут «Мечыслаў і Стэфанія», пакінутая напэўна некаторай з былых настаўніц. Я пастаянна марыла пра тое, каб быць у Вільні ў пансіянаце — бацькі, аднак, не былі ў стане гэтага зрабіць, бо ім бракавала патрэбнага фундушу.

II

У 1847 годзе я з цёткай Нарбутовай (Нарбут), роднай сястрой маёй маці, выехала ў пансіянат у Вільню. Маці, занятая домам і дзецьмі, не магла ад іх ад'ехаць, даручыла мяне цётцы, якая ехала ў той бок. Падарожнічала з намі пані Гелена Замятынаўна, старая панна, касавокая і нягжэчная. Па дарозе заехалі да брата мужа цёткі Нарбутовай, і ў яго маёнтку Ракунцах затры-

маліся на ноч. Змучаная падарожжам з болем галавы з радасцю прытулілася да падушкі, а смачна праспаўшы цэлую ноч, была гатова назаўтра да далейшага падарожжа. Пасля абеду мы вырушылі з Ракунцаў — на від Вільні сэрца маё дрыжала з радасці; не памятаю, дзе мы з цёткай затрымаліся, досыць, што цётка пераапранулася, і мы адразу падаліся да Германаў. Пан Герман выслухаў аповед цёткі пра незаможнасць маіх бацькоў і згадзіўся прыняць мяне з аплатай 1000 злотых (150 рас. рублёў), уключыўшы ў гэта і музыку. Была прынятая ў тую ж хвілю, трэба было яшчэ справіць мундзірчык, які цётка абавязалася выстарацца. Пан Герман паслаў па адну са сваіх вучаніц, просячы даць узор матэрыялу на сукенку. Панна Гундзісоўна з выгляду сімпатычная і гжэчная паненка, любімая вучаніца пана Германа, распавяла, дзе купіць матэрыял, па чым і каму даць пашыць. Потым, гжэчна пакланіўшыся, адышла. Пан Герман запытаў мяне, чаму я вучылася і да якога класа падрыхтаваная — адказала, што да трэцяга; адвёў мяне адразу ў той клас і прадставіў некалькім паненкам як новую каляжанку. Быў гэта пачатак школьнага года, вучаніцы яшчэ не паз'язджаліся, і ўрокі не пачаліся, таму мела трохі часу, каб разгледзецца ў маім новым становішчы. Паміж паненкамі, якіх ужо застала, была Антаніна Слепсіноўна, вучаніца чацвёртага класа, вельмі вясёлая і мілая паненка, якая пачала мной апекавацца. На другі дзень я пайшла з цёткай да краўца, потым, адведзеная ў пансіянат, развіталася з цёткай, папрасіла, каб падзякавала яшчэ раз маім бацькам за спаўненне маіх мараў і каб ім сказала, што я шчаслівая.

На трэці дзень пасля майго прыбыцця ў пансіянат пачаліся ўрокі. Класы што раз больш напаўняліся, а наш быў найбольш шматлікі. Прадметы ніякай цяжкасці мне не ўяўлялі, перажывала толькі над тым, што цяпер мне няма чаму вучыцца, а на наступны год ужо вярнуцца сюды, напэўна, не змагу. Слепсіноўна, даведаўшыся пра гэта, абяцала мне дапамагчы і парадзіла прасіць пана Германа пра перавод мяне ў чацвёрты клас. Вечарам мы падышлі пад дзверы кабінета пана Германа — адвагі мне не хапала, каб туды ўвайсці, стаю, жагнаюся, але ні кроку не раблю.

— Ідзі, ідзі хутчэй, — гукае таварышка.

— Зараз, зараз, баюся.

— Не бойся, — сказала і моцна папхнула мяне ў дзверы. Не агледзелася, як аказалася перад панам Германам, здзіўленым такім маім уваходам. Расказала яму пра маё жаданне закончыць адукацыю, што, напэўна, на другі год з-за недахопу фундушу вярнуцца не змагу, што мне вучоба ў трэцім класе ідзе за лёгка, і я пачуваюся ў сілах да вучобы ў чацвёртым класе, што толькі бяда з нямецкай, якой я не вучыла. Пан Герман дадаў мне ўпэўненасці, заахвоціў да працы.

— Рабем, што можам, — сказаў, — аддаючы будучыню ў рукі Бога.

З вялікім запалам узялася я за навуку; мы мелі ў той час 10 настаўнікаў, а з іх усіх найвысакароднейшым, найшляхетнейшым, найідэальнейшым

чалавекам падаўся мне выкладчык усеагульнай гісторыі і польскай літаратуры пан Аляксандр Здановіч. Ад першага ўрока я была захоплена яго да нас прамовай і бацькоўскім прывітаннем.

— Я маю намер даць паням спазнаць важнасць і вялікасць значэння жанчыны ў грамадстве, яе місію; буду вам гаварыць пра прызванне і абавязак настаўніц, пра цяжкую барацьбу з перашкодамі ў выхаванні дзяцей, вам даверaных, пра працу над уласным удасканаленнем у навуцы, пра пастаянны канроль над сабой. Кожная з вас няхай уважае сябе сама за істоту, даверaную вам Богам, пра якую вы павінны клапаціцца, удасканальваць і дарогай цноты весці да вечнага жыцця. Ваш прыклад павінен ім заўсёды святліць, вучачы іх любові да Бога, Бацькаўшчыны і бліжняга. У сэрцы іхнія засявайце зерне цнот, а навукай удасканальвайце і ўзбагачайце мысленне — шануйце пры тым заўсёды здароўе, час і зароблены грош.

Заплакаў, закончыўшы сваю прамову, і з усяго класа адазваліся галасы падзякі і ацэнкі яго добрых жаданняў і абяцанні, што словы яго захаваем заўсёды ў сэрцы і памяці. Які быў пачатак, такі быў і кожны ўрок А. Здановіча; прыносілі яны карысць для нашых сэрцаў і думак. Я вучылася заўзята, мела па ўсіх прадметах годныя балы апрача нямецкай, якая прыносіла мне ў дар тройкі. З дапамогай добрых каляжанак і гэта ішло неяк так, магла гэтай мове прысвяціць больш часу і працы, бо іншыя прадметы ўспрымала з лёгкасцю. Аднак часта галаўныя болі абцяжарвалі вучобу і кепска адбіваліся на маім здароўі. Патрыятызм у нашым пансіянаце быў моцна развіты; сам с. п. Ян Герман, хаця і гаварыў ломанай пальшчызнай, быў усёй душой палякам, займаўся нашымі палітычнымі справамі, а калі даведваўся нешта новае і важнае, дзяліўся тымі весткамі з вучаніцамі IV класа. Дачка яго Аўрэлія, надзвычай таленавітая, энтузіястка, пры тым патрыётка ў найвышэйшай ступені, была аточана людзьмі мастацтва і моладдзю, пранікнутая святым запалам любові да Маці-Айчыны, запал той удзяляўся і вучаніцам, развіваў іхнюю думку і ўдасканальваў сэрцы. Адна з вучаніц Анеля Бакшанская, пісала дзённік, у якім выказвала думкі і пачуцці свае і атрыманыя ўражанні ад таго, што чула з вуснаў пані Аўрэліі і ксяндза Васыньскага.

Быў гэта 1848 год. У папярэдні год выехала тая вучаніца на канікулы да сваіх бацькоў, сельскіх жыхароў. Быў таксама і яе брат, які закончыў вучобу ў Віленскай гімназіі. Падчас канікулаў прыехала паліцыя для правядзення ператрусу, арыштавалі яе брата, забралі яго паперы, паміж якімі аказаўся і той дзённік. У выніку гэтага захісталася існаванне нашага пансіяната: справа цягнулася доўга, адбывалася ўсё больш арыштаў, і віленская цытадэль запоўнілася вязнямі, якімі былі пераважна вучні гімназій, бо Віленскі ўніверсітэт быў скасаваны ўжо ад 1825 года, а на яго месцы быў закладзены Дваранскі інстытут, у якім моладзь выхоўвалася дзяржаўнымі настаўнікамі, умела шулерстваваць і п'янстваваць, але не адчуваць і думаць як шля-

хетная моладзь Віленскага ўніверсітэта. Г. Васыньскага, слыннага прамоўцу і прапаведніка, выслалі ў Вятку; Галер, тагачасны дырэктар Віленскага інстытута, паехаў у той час, як казалі, за кошт Германа ў Пецярбург для апраўдання яго ад падазрэнняў і абвінавачванняў, але дзейнічаў, падобна, у супрацьлеглым кірунку. Так усхваляваны быў увесь наш пансіянат, аж тут прыходзіць шаноўны пан Герман і так да нас звяртаецца;

— Развітваюся з вамі, любімыя мае вучаніцы, загадана мне вас пакінуць, цар Мікалай бярэ вас пад апеку, я з вамі развітваюся, будзьце здаровыя, мае дзеці!

Як бы выцятыя перуном з енкам і плачам кінуліся мы цалаваць і паціскаць рукі высакароднага старога — плач быў жудасны.

— Такая воля Бога, будзьце здаровыя, мае любімыя паненкі, — гукнуў яшчэ раз бедны стары і знік з нашых вачэй.

Прыйшла потым пані Аўрэлія, і падобная сцэна паўтарылася; кожны з настаўнікаў на апошнім уроку развітваўся з намі, бо не дапускалася, каб каторы з іх мог застацца надалей.

Ці ж трэба гаварыць, што з кожным развітваліся мы з жалем, а што ўжо казаць пра любімага намі прафесара Здановіча! Так раптам усё сталася, што мы не ведалі, што з сабой рабіць; большая частка маіх каляжанак выехала да бацькоў на святы, я, не могучы так хутка звязацца, засталася ў пансіянаце. Прыйшла пазней адна з настаўніц сказаць нам ад імя пана Германа, які захварэў, каб мы заставаліся на месцы, бо пансіянат будзе функцыянаваць, толькі пад іншым кіраўніцтвам. Я занялася перапісваннем польскай і французскай літаратуры, усеагульнай гісторыі, граматыкі польскай, французскай і нямецкай; не траціла ні хвілі часу, бо ў вольныя ад заняткаў хвіліны сядзела пры адной з хворых настаўніц, былой вучаніцы пана Германа. Аднаго дня перад святамі прыйшла да пана Германа нейкая пані з дырэктарам Гелерам, потым наведала памяшканні і дайшла да пакоя, дзе мы знаходзіліся з хворай. Убачыўшы нас, пачала выпытваць, хто мы, адкуль і г.д., і сказала да хворай:

— Будзь, пані, спакойнай, я пастараюся пра ўсё, што толькі будзе ў маёй магчымасці, будзе пані мець доктара, лякарствы і выгоды да выздараўлення.

Потым звярнуўшыся да мяне сказала:

— Будзьце, калі ласка, спакойныя! — і, прыняўшы нашыя падзякі, пайшла.

Была гэта пані Главацкая, прызначаная ўладамі начальніцай пансіяната. Бацька яе Шэраль эміграваў з Францыі ў Расію; жыў у Адэсе, дзе маладзенькая 13-гадовая яго дачка выйшла замуж за графа д'Густа, які займаўся спачатку яе адукацыяй, а потым адсунуў кніжкі і забаўкі і ўзяў за жонку. Пасля смерці мужа жыла ў Адэсе разам з дачкой графіняй д'Густ, потым выйшла замуж за аднаго з настаўнікаў гімназіі, Главацкага, і неўзабаве была прызначана начальніцай нашага пансіяната.

Па святах распачаліся ўрокі; той самы, што даўней, парадак, расклад урокаў і гадзін, тыя самыя выкладчыкі, нічога не змянілася; пані Главацкая набыла ад пана Германа ўсё, што было для набыцця: фартэпіяна, мэблю, мапы, глобусы, кніжкі і г. д. Пан Герман стараўся яшчэ добрым учынкам закончыць сваю працу над выхаваннем сваіх вучаніц. Паколькі пані Главацкая сказала, што пакіне небагатых вучаніц на такіх умовах, на якіх былі прынятыя панам Германам, шаноўны стары, памятаючы пра маю вялікую просьбу аб заканчэнні навук, падаў, што за мяне плачана 75 рас. руб. у год з музыкай, таму другія 75 руб. ужо за будучы год былі заплачаны.

Вучоба пайшла ў мяне добра, здала экзамен, магла атрымаць патэнт, але пані Главацкая, бачачы маю любоў да навукі, сказала прыбыўшай па мяне маці, што хацела б, каб я яшчэ на год на тых самых умовах засталася. Так і выйшла. З той жа пільнасцю вучылася, канешне, многа ўзяла і закончыла пансіянат з першай узнагародай, якая была ў той час упісаннем на чырвонай табліцы залатымі літарамі імені і прозвішча вучаніцы, а таксама прыгожа апраўленая кніжка.

Як пасля скасавання Віленскага ўніверсітэта ўлады ўстанавілі Дваранскі інстытут, так пасля скасавання першаразраднага пансіяната Германаў утвораны ўладамі жаночы пансіянат насіў назву «Пансіянат для паненак шляхецкага паходжаня» і даваў першаразрадным вучаніцам права заснавання свайго пансіяната.

Пры заканчэнні экзаменаў мы прасілі любімага нашага настаўніка А. Здановіча, з якім са слязамі развітваліся, напісаць нам якую-небудзь сваю думку на памяць. Кожная з нас паслала аркушык паперы са сваім прозвішчам, і мы атрымалі ў адказ агульны ліст да ўсіх, і на аркушыку кожная знайшла нейкую думку або параду з любімага прафесарам паэта Казіміра Брадзінскага. Я атрымала на памяць такі верш:

«Рабі кожны ў сваім коле,
што кажа Дух Божы,
А цэласць сам Бог зложыць!»

Гэта я ўзяла за дэвіз майго жыцця, пачынанняў маіх, і гэтую вось сціплую працу маю ў канцы жыцця з гэтай думкай раблю.

З жалем пакінула я пансіянат, начальніцу, настаўнікаў і каляжанак і вярнулася ў дом дарагіх маіх бацькоў. Неўзабаве адбыўся шлюб маёй сястры Амількі з Зыгмунтам Урублеўскім; некалькі чалавек з кола сваякоў было ў Рудаве на вяселлі; праз пару тыдняў пасля гэтага прыехаў да нас капітан Мікалай Глаголеў з Вільні, жанаты з Людмілай Доўгердаўнай (Доўгерд), нашай сваячкай па бацьку і прапанаваў, каб прыняла ў іх абавязкі настаўніцы і аплату 150 рас. руб. у год, на што я вельмі ахвотна згадзілася. Была гэта сям'я праваслаўная, бо ён быў расейцам, а яна, дачка кальвіністкі, пры

шлюбе прыняла каталіцтва і ўсім сэрцам палюбіла гэтую веру. Вялікім болем для яе было, што дзеці мусілі выхоўвацца ў праваслаўі; залівалася слязамі, калі яны ішлі са мной або бацькам у царкву. Пані Глаголева была надзвычай добрай, лагоднай і цярплівай асобай, нажаль, заўсёды хворай; пры канцы першага года майго побыту ў іх раптоўна памерла ў дзень Зялёных святаў.

Прымаючы абавязкі настаўніцы ў Глаголевых, выгаварыла ў іх прыняць маю кузіну Зосю Руткоўскую, бо хацела выканаць абяцанне, дадзенае ў дзяцінстве яшчэ любімай цётцы Матыльдзе Руткоўскай, што калі стану настаўніцай, то дапамагу яе дачцэ з адукацыяй. Панства Глаголевых згадзілася на гэта, але што выцерпела бедная Зося ад дзяцей. Моцна ёй дакучалі, а я не ўмела даць сабе з імі рады і яе абараніць. Неапісальна цяжкай была для мяне тая першая мая настаўніцкая праца: хлопцаў я вучыла толькі французскай і нямецкай мовам, старэйшую дзяўчынку рыхтавала ў другі клас пансіяната, малодшую пачала вучыць самым пачаткам. З Зосяй займалася толькі ад 7.30 да 8.00 з раніцы і ад 10.00 да 10.30 вечарам. Раніцай задавала ёй урокі, вечарам выслухвала яе, а яна заўсёды ўмела ўсё без памылак. Хоць ва ўзросце была паміж намі досыць значная розніца, бо я была на 8 гадоў старэйшая за яе, Зося не раз раіла мне, як з жыццём уладзіцца, як з дзецьмі паступаць. Я была надзвычай нясмелая, няўпэўненая ў сабе, прызвычаеная з дзяцінства не мець сваёй волі, а прыстасоўвацца да іншых; уплывала на гэта і выхаванне дарагой маці, залежнае жыццё ўжо ў дзяцінстве, характар з натуры нясмелы і нарэшце пранікнутасць парадамі пані Гофман, у кніжцы якой прачытала: *«Быць другой у супольнасці, не вышукваць новых шляхоў, а ісці ўжо ўбітым, выконваць волю іншага і да т. п. — вось гэта ёсць сэнсам паклікання жанчыны»*. Цяпер, калі ўсё залежала ад мяне, калі трэба было дзейнічаць самой без нічыёй парады, я не магла, не ўмела спраўляцца. Калі б усе дзеці роўна рухаліся ў вучобе і каб тая вучоба магла адбывацца папольску, лягчэй мне было б. Тут, аднак, усё ішло на расейскай мове, і хоць яе я пільна вучыла і добры бал па ёй мела, калі мне давялося на ёй выкладаць, рота не адважвалася адкрыць. А 11 гадзіне перад абедам дзеці мелі паўгадзіны адпачынку; вось тады выйшаўшы з імі і седзячы на лавачцы на Замкавай гары, дзе мы жылі, і маючы перад сабой найпрыгажэйшы від Вільні і гуляўшых дзяцей, аддавалася думкам пра абавязкі настаўніцы, на чым яны грунтуюцца, спасцігала, што не на вывучэнні чужых моваў, спеваў або музыкі, не вучоба мае вышэйшае прызначэнне, што настаўніца не павінна атрымоўваць аплату за такое пробнае навучанне, а павінна працаваць бясплатна, даходзіла да найвышэйшай экзальтацыі і фантазій — не вызначала межаў абавязкаў настаўніцы так далёка, што лічыла за абавязак суправаджаць дзяцей у царкву, не смеючы хадзіць у касцёл, на малітву нават не мела часу! Добрая пані Глаголева аказвала мне вялікую прыхільнасць; пасля 8 вечара пасля заканчэння ўрокаў і гарбаты мы сядаліся з ёю ў салоне на размо-

вы. Пан Глаголеў бываў звычайна на гарбаце ў свайго начальніка, з якім пазней прыходзіў дадому. Да 10 цягнуліся гэтыя пасядзелкі, ад удзелу ў якіх я не адважвалася адмовіцца. Пан Глаголеў меў звычай сядзець у тым жа салоніку раніцай ад 8 гадзін, калі я ў прылеглым пакоі, дзверы якога былі адчынены, пачынала ўрокі з дзецьмі. Можа пан Глаголеў не меў таго на думцы зусім, але мне здавалася, што слухае маё выкладанне, пачувалася прысаромленай, жудасна мяшалася і рабіла памылкі ў выказваннях па-расейску. Пасля чатырох месяцаў такога напружання пайшла раз у касцёл да споведзі ў час, калі пан Глаголеў з дзецьмі пайшоў у царкву, бо гэта было расейскае свята. Спавядаў мяне адзін з ксяндзоў-пралатаў, здаецца, ксёндз Мяшкоўскі, моцна мной зацікавіўся і ўдзяліў святых парад. Даручыў мне ісці да доктара Абіхта, прафесара былога ўніверсітэта, які ў раннія гадзіны даваў парады бясплатна. Д-р Абіхт выэкзаменаваў, даследаваў мяне старанна і прапісаў пігулкі, пасля прыёму якіх мяне пакінуў смутак, праца падалася мне лягчэйшай. Перад урачыстасцю Божага Нараджэння я напісала доўгі ліст да А. Здановіча, віншуючы яго са святамі і выказваючы маю ўдзячнасць яму за дабрачыннасць навукі, удзеленай нам, за ўклад у нас пачуцця абавязкаў жанчыны і настаўніцы — гаворачы, як пачуваюся няздольнай да такіх абавязкаў, як мала я заслугоўваю імя настаўніцы. Мне гаварылі, што высакародны гэты прафесар чытаў са слязамі мой ліст сваім вучаніцам у пансіянаце пані Андрэйкавічавай.

Перад Зялёнымі Святамі прыехала сястра пані Глаголевай пані Ірэна Седлікоўская; зрабіла нам сваім прыездам вялікую прыемнасць.

Забылася сказаць, што два месяцы назад павялічылася сям'я Глаголевых, прыйшла на свет дачушка. З-за той слабасці пані Глаголевай, выказвала яна мне некалькі разоў апасенне за сваё жыццё, абавязваючы мяне, каб у выпадку яе смерці не пакінула сірот, а была іхняй апякункай. Я не дапускала думкі, каб у тым хутка наступіла патрэба, і для заспакаення хворай дала жаданае слова. А цяпер вяртаюся да свят. Першы іх дзень мы правялі вельмі прыемна, пад вечар я пайшла з дзецьмі на шпацыр у Батанічны сад, маці сама іх прыбірала, пасля вяртання мы весела размаўлялі пра супольных знаёмых у родных краях, потым а гадзіне 11-й мы пайшлі на спачын, а а 4-й раніцы ўскаквае да мяне мамка, гаворачы:

— Пані памерла!

Уражаная, я апранулася, чым найхутчэй і пабегла ў пакой пані Глаголевай. Убачыла яе сціскаўшай нагу малога дзіцяткі ў стаяўшай каля ложка калысцы! Апранулі нябожчыцу; я, даручыўшы дзяцей іхняй цётцы Седлікоўскай; пайшла да пані Главацкай, у якой мела быць настаўніцай у пансіянаце ад канікулаў, распавяла ёй пра здарыўшаеся няшчасце, а таксама, што мушу застацца пры асірацелых дзецях. Адказала мне пані Главацкая, каб я адразу той дом пакінула, што і на суткі ў ім застацца не павінна, бо не пры-

стала б мне паводле грамадскай думкі заставацца ў маладога чалавека. Я гэтага не разумела:

— Як гэта я маю пакінуць сіротаў, калі паміраўшай маці дала слова, што пры іх застануся?! Гэтага зрабіць не магу, Пан Бог пакараў бы мяне за гэта. Пані ведае, як я прагну быць пад яе апекай, як мне прыкра не трымаць дадзенага ёй слова, але сірот пакінуць не магу, пакуль я ім патрэбная!

— Павінна, аднак, гэта зрабіць, ідзі да твайго спаведніка па параду, калі табе маёй не дастаткова, раскажы яму ўсё, як ёсць, і пераканаешся, што 24 гадзіны ў доме маладога расейца застацца табе не дазволіць.

Без адкладу сказала, што зраблю так і пайду да майго спаведніка, якім быў ксёндз місіянер Фелікс Рашкоўскі, вікарый у дамініканскім касцёле. Як вырашыла, так і зрабіла. Але ўжо падходзячы да касцёла пачала траціць адвагу, самыя розныя думкі праходзілі праз паю галаву: ксёндз Рашкоўскі мяне не ведае асабіста, падумае, што пані Главацкая лепей мяне можа ведаць, як былую сваю вучаніцу, што, відаць, палічыць мой характар за слабы для такога выпрабавання... То зноў: перш за ўсё ксёндз будзе мець літасць да сіротаў, — з майго боку было б гэта злачынствам!... З тымі думкамі ўвайшла ў сакрыстыю, просячы сакрыстыяна, каб далажыў ксендзу, што адна пані просіць яго на хвіліну з нагоды пільнага інтарэсу.

— А які інтарэс?

— Не магу сказаць, але важны, ідзі папрасі як найхутчэй.

— Ксёндз не мае часу, а як пані называецца?

— Ідзі, пан, як найхутчэй!

Пайшоў, а я пачала думаць, што маю сказаць ксендзу, адвага мяне ўжо пакінула. Уваходзіць ксёндз Рашкоўскі, пытаецца, хто я, чаго хачу? З цяжкасцю, з плачам выказваю, што сталася, што пані Главацкая прыслала мяне да ксендза па параду.

— Для мяне гэтая рэч вельмі цяжкая, — гаворыць ксёндз, — я не ведаю таго пана, пані сама павінна тое добра падумаць, тое толькі скажу, што недатрыманне слова, неразважна дадзенага, не ёсць грахом.

— А ці не ёсць грахом пакінуць няшчасных сірот без апекі?

— Не, пані, той пан знойдзе апякунку для дзяцей паміж расейцамі, раю пані, наколькі можна, скараціць яе побыт у таго пана Глаголева і ў любым выпадку папрасіць, каб узяў якую добрую гаспадыню, бо пані сама ўсяго не падолее.

Развіталася з ксендзам, падзякавала за параду, але не магла надзівіцца, што ксёндз так мала клапоціцца пра сірот!

Адбылося пахаванне пані Глаголевай, пані Седлікоўская выехала. Пасля пахавання пан Глаголеў падаўся проста да пані Главацкай зрабіць ёй вымову за тое, што яна хоча прыняць удзел у павелічэнні яго нядолі, не дазваляючы, каб я засталася пры бедных сіратах; даў ёй слова гонару, што не да-

пусціць утраты мною добрай рэпутацыі і што пасля канікулаў папросіць яе прыняць старэйшую дачку ў пансіянат.

Так я засталася пры дзецях з найвышэйшага жадання, каб не даць ім адчуць сіроцтва: размясцілася на ложку памерлай, і хоць баялася і ў вачах мне не раз уставала нябожчыца, я вытрымала размяшчэнне пры асірацелым маленстве, якое разам з мамкай спала пры мне. Я займалася ўсім: расчэсвала дзяўчатак, дапамагала ім апранацца, падавала снеданне і г.д., мардавалася без літасці над сабой, а тут дзеці капрызнічаць пачалі ва ўсім, асабліва ў ядзе, а малы Паўлуша закрычаў раз, калі пададзенае малако было не зусім добрае:

— Без мамы хоча нас атруціць!

Выходзіла з дзецьмі на шпацыр, а калі я, хочучы ім дагадзіць, спытала, куды б хацелі пайсці, у які бок, то кожнае з іх цягнула ў які-небудзь розны бок, а я млела ад такой іхняй нязгоды, не разумеючы, што сама была таму прычынай.

Маці мая, як толькі даведалася ад пані Седлікоўскай пра смерць Глаголевай, неспакойная за мяне адразу прыехала ў Вільню і цвёрда зажадала ад пана Глаголева, каб узяў для вядзення дома даўнюю яго знаёмую, а маю цётку Руткоўскую. Так і зрабілі. Пасля канікулаў, на якія я ўжо дадому не ездзіла, заняла я ў пансіянаце пані Глагоўскай пасаду старшай настаўніцы. Мая старэйшая вучаніца Ліза Глаголева была прынята ў пансіянат, у II клас, малодшая Маша наведвала, як прыходзіўшая, іншы пансіянат, а хлопцы Мікалай і Павел былі аддадзены ў корпус. Зося Руткоўская пайшла ў пансіянат да пані Радзівіловіч у III клас, а я з братам яе Юзафам пансіянат за яе аплачвалі. На другі год пані Радзівіловіч пакінула яе на тых умовах, што як стане настаўніцай, то ёй доўг заплаціць. І, канешне, пасля заканчэння пансіяната Зося атрымала месца ў Гародні на 180 рас. рублёў, дзе на другі год атрымоўвала ўжо 300 рублёў. Разважная, добра складзеная, вельмі здольная да музыкі, пры тым паненка з тактам і ўпэўненая ў сабе, яе ўсюды добра прымалі і любілі. Брат яе Юзаф, які пасля заканчэння гімназіі ў Гародні атрымаў нейкую пасаду ў Вільні, у 1863 годзе быў прысуджаны да цяжкіх работ і высланы на Байкал, дзе моцна нявінна пацярпеў за «забайкальскую справу»[1]. Пасля вяртання ў Край без здароўя і без грошай праз нейкі час атрымаў пасаду на чыгунцы ў Лібаве, дзе некалькі год працаваў пры маці і сястры. Пасля смерці маці прыехаў з сястрой у Кракаў і дагэтуль тут жыве.

III

Пасля двухгадовага майго побыту ў пансіянаце пані Главацкай, падчас якога я мела пры сабе наймалодшую сястрычку Антаніну (цяперашнюю

[1] Забайкальская справа — паўстанне ссыльных 1863 года на будоўлі Калябайкальскай дарогі. *Заўв. перакл.*

ўдаву Лазоўскую), выехала я з Вільні на вёску для папраўкі здароўя па парадзе доктара. Паўгода была ў паноў Ніласлаўскіх у Ёчвах на Белай Русі, у Віцебскай губерні. Праз 6 месяцаў паны Ніласлаўскія выехалі на жыхарства ў Вільню, а я з Антосяй, якая цяпер была пры мне, паехала да паноў маршалкоўства Марачэўскіх, дзе затрымалася на паўгода, бо пастаянна сумавала па бацьках. Я вырашыла пасяліцца на вёсцы пры іх і заняцца выхаваннем абывацельскіх дачок. Я распавяла пані Марачэўскай мае паняцці пра выхаванне польскіх дзяцей. пра неабходнасць прыбраць ад іх усё, што ў навуцы і маральным удасканаленні можа перашкаджаць, і атачыць усім, што гэтаму спрыяе. Таму, лічачы, што ўплыў ураду скоўвае свабоду думкі і чыну, а ўплыў свету перашкаджае ў набыцці грамадзянскіх цнотаў, у замілаванні да ўсяго, што ўзнёслае і светлае, задумала пасяліцца ў вясковым зацішку пад апекай маіх бацькоў, дзе знайду ўсё, што спрыяе ў дасягненні мэты маіх імкненняў, у спаўненні таго, што кажа Дух Божы, пані Марачэўская пахваліла гэтую маю задуму, сардэчна абняла мяне, жадаючы Божага дабраславення ў маіх намерах і абяцаючы падтрымку гэтага прадпрыемства праз заахвочванне знаёмых і суседак да аддання да мяне іхніх дачок. Вось так я выехала ад паноў Марачэўскіх з Уніхоўшчыны да маіх бацькоў у Рудаў у 1856 годзе.

Верачы ў Божую міласэрнасць, апеку Маці Найсвяцейшай і дапамогу маіх шаноўных бацькоў я была пяць гадоў самай шчалівай і паспяховай. Усё спрыяла маім памкненням — звярталася па дапамогу да настаўніц, але тыя хацелі практыкавацца бясплатна; першай такой настаўніцай была Юзэфа Араноўская, сястра згаданых Ганны і Зофіі Араноўскіх з Шумкаўшчыны, маладзенькая асоба, якая якраз у гэтым годзе скончыла навучанне, вельмі здольная ў спевах і музыцы; потым яе малодшая сястра Міхаліна, наступнай, не памятаю ўжо, як тое сталася, прыбыла да мяне французанка Графцяўкс, просячы, каб прыняла яе 15-гадовую вучаніцу Юлію Патэ і навучыла б яе прадметам, якія ў мяне выкладаліся, а за гэта мае вучаніцы карысталіся б з французкай мовы Юліі. Я згадзілася на гэта, а паненка тая, выхаваная сваёй пабожнай цёткай, была для таварышак сваіх узорам усіх цнотаў, усяго добрага і заставалася пры мне аж да канца.

Па прыкладзе сясцёр міласэрнасці ў Шчучыне я брала вельмі малую аплату за дзяцей і то ў большай частцы правізіяй, каб было можна пражыць. Харчаванне ў пансіянаце было смачнае і здаровае, не хацела б нічога іншага і ў канцы жыцця. Мы ўсе працавалі не для матэрыяльнай карысці, але для ідэі, і Божае дабраславенства было нашай узнагародай.

Цётка Яноўская падаравала мне старое пасажнае сваё фартэпіяна, а я за грошы, пазычаныя ад цётчынага брата E. N. зафундавала сваім вучням яшчэ новае піяніна. Высакародны прафесар Аляксандр Здановіч даваў мне дабрачынныя парады ў навучанні дзяцей паводле задумы Божай, указваў творы найпатрэбнейшыя для чытання; ксёндз Ануфры Сырвід, васілішскі

пробашч, разам з вікарыем прыязджалі да мяне на перадвакацыйны экзамен, дабраслаўлялі і заахвочвалі да вытрымкі і працы. І так спакойна праходзілі мне тыя гады, прысвечаныя працы на славу Бога: перасследу і непрыяцеляў не мела, страху і непрыязні не знала, была аточана павагай і шанаваннем, была шчаслівая. Першымі кадэткамі маімі былі: выхаванка пані Марачэўскай, 15-гадовая сірата, з якой пазнаёмілася і якую палюбіла ва Уніхоўшчыне, плямянніца кс. Чачота, пробашча ў Асаве ў Лідскім павеце, прыгожая і добрая паненка, другая была Юлія Жукоўская, дачка заможных мяшчан з Ражанкі, а потым іншыя; ад самага пачатку мела адразу некалькі вучаніц са свайго павета, пазней прыбывалі і са Слонімскага, больш за дзесяць аднак не прымала. Зофія Лукашэвіч са Слонімскага павета прыбыла да мяне, маючы ўжо 17-ты год; здольная і пільная вучаніца пасля паўтарагадовай падрыхтоўкі ў мяне паехала ў Вільню ў пансіянат, паступіла ў IV клас, а праз год здала там экзамен на настаўніцу. Сястра мая Антося вучылася чатыры гады ў Рудаве, паехала потым у Вільню здаць экзамен і вярнулася да мяне, каб быць найпрацавіцейшай, найлепшай, найвысакароднейшай, дзеючай па адной думцы са мой памочніцай.

Усё ішло ў нас удачна, калі, нажаль, навесну 1860 года бедная маці мая пачала хварэць і нарэшце памерла. Разам з яе жыццём скончылася мая ўдача, і распачалася нядоля. І нічога ў тым дзіўнага, калі рука маці кіруе дзіцем, ніколі яна яго на кепскі шлях не завядзе, калі яе апека распасцірaецца над ім, нічога ніколі бракаваць яму не будзе, бо сэрца маці гэта ёсць такая бездань любові, падтрымкі, ахвярнасці, такая моц сілы і вытрымкі, на якія толькі маці можа быць здольнай.

Маёй маці, гэтаму анёлу-ахоўніку майго жыцця, хачу ў гэтай працы прысвяціць пару слоў.

Дзед наш, Ян Навіцкі, жанаты з Юзэфай Губарэвіч, жыў у вёсцы Валейшы, ад якой быў дэпутатам. Поўны высакароднасці характару і прытым разумны быў любімы і шанаваны ў сваім павеце, бабка наша памерла ў маладым веку, пакінуўшы двое сірот: сынка Тадэвуша (дзядзьку нашага) і дачушку Тэклю (маю дарагую маці). Змаркочаны дзед пасля страты каханай жонкі, не могучы пакінуць любімай пасады і сваіх сіротак, пастараўся знайсці для іх апякунку, жаніўся з паннай Катажынай Турскай, роднай сястрой Ксаверыя Турскага, шаноўнага грамадзяніна ў нашым павеце. Мачыха не любіла малых сірот. Выдзяляла ад сваіх дзяцей, крыўдзіла ва ўсім, таму бедныя сіроты ўнікалі яе вачэй, хаваючыся летам у двары. а зімой у якім-небудзь куточку паміж слугамі. Дзеці мачыхі былі заўсёды добра апрануты, своечасова пачалі вучыцца. ездзілі ўсюды з маці, у нядзелю брычкаю да касцёла, у той час як наша маці і дзядзька, кепска апранутыя, падчас мусілі ісці за імі пеша. Выязджаючы на некалькі дзён да сваякоў. мачыха забірала сваіх дзяцей з сабой, пакідаючы сіротак пад

апекай слуг, даючы ім хлеб і малако, якім аблівалі зелле, пасыпанае мукой і падрыхтаванае для кармлення індыкаў. Слугі, хоць самі мелі невялікі штомесячны заробак, дзяліліся з сіротамі тым, што мелі. Прыпамінаю сабе, як маці казала нам заўсёды маліцца за душу Стэфана, быў гэта шаноўны фурман, які, выязджаючы куды-небудзь з панствам у госці, пакідаў дзецям нябожчыцы пані кавалак свайго хлеба, а вяртаючыся прывозіў ім заўсёды гасцінец. Сіроткі, што праўда, сядаліся з усёй сям'ёй за стол, але заліваліся слязамі, слухаючы, як мачыха несправядліва абгаворвае іх перад бацькам, які заміраў і маўчаў, не хочучы выклікаць прыкрых сцэн, а ў канцы зусім стаў абыякавым да дзяцей. Бедныя сіроткі не мелі ані настаўніка, ані ў школу не хадзілі. Толькі прыязджаўшыя кузінкі навучылі маці маю чытаць, пісаць, лічыць, розным добрым работам, а маці, сама добра не ўмеючы, дзялілася сваімі ведамі з братам. Дзядзька меў у той час гадоў дзесяць. Не раз сядалася гэтая сямейка ў якім куточку і радзілася, як бы гэта ім беднае іхняе жыццё палепшыць. Спыніліся нарэшце на тым, што Тадэвушык вырушыць у свет. Пры дапамозе Стэфана, узяўшы кавалак хлеба ў торбачку і чула развітаўшыся з сястрычкай, падаўся Тадзік з фурманкамі, што везлі на продаж збожжа, у Вільню. Прыбыўшы туды, бедны хлапчына сеў на вуліцы і прасіў праходзіўшых паноў, каб хто ўзяў яго на службу; адны на яго просьбу нічога не адказвалі, іншыя пыталіся з літасцю: «А што ж бы ты рабіў. мой хлопчык, такі яшчэ малы?» «Чысціў бы пану боты», — адказваў бедны са слязамі. Не знайшоў аднак у нікога ў Вільні спачування. Але не спасціжныя выракі Божыя. Усё гэта сталася яму на дабро. Тым часам разышлася вестка па ўсёй Забалацкай парафіі, што згінуў Тадэвушык Навіцкі, шукалі, але без выніку. Нарэшце нехта даў знаць дзеду Губарэвічу, што ў яго вёсцы Касьляны ёсць нейкі малы хлопчык, ціхі і добры, які вучыць вясковых дзяцей. Дзядзька загадаў прывесці яго ў двор, і аказалася, што быў гэта шуканы Тадэвушык Навіцкі. Пастанавілі тады крыўды сірот і іх ратаванне прызнаць за абавязак грамадзянскі; дзядзька з трыма суседзямі падаліся з Тадэвушкам у Валэйшы і вымаглі ад пана дэпутата, каб як найхутчэй аддаў сына свайго ў навуку да ксяндзоў піяраў у Шчучыне. Дзякуючы ўдзелу тых шаноўных грамадзян заблішчала ад гэтага часу шчасце для Тадэвушка. Маці наша пастаянна знаходзілася ў Валэйшах, час ад часу выязджаючы ў Нікадэмава да кузінаў Нарбутаў. Там пазнаёмілася з нашым бацькам. Калі яна напісала да дзеда Навіцкага, свайго бацькі, пра пасаг, бо ёй застаўся даволі вялікі пасаг па нябожчыцы маці, бацька ёй так адпісаў: «Маеш тры паркалёвыя сукенкі і тры кашулі, гэтага павінна табе выстарчыць: я ў тваім веку смачней спаў без падушкі і на цвёрдай пасцелі, чым сёння на пухавіках, таму не павінна маці вымагаць больш за тое, што мае». Уплыў мачахі быў тут аж занадта відавочны, але што ж было рабіць? Маці выйшла за Міхала Табенскага, не дапамінаючыся нічога ў сваіх бацькоў. Дзядзьку

пашанцавала ў свеце, калі памёр дзед Навіцкі, запісаўшы жонцы сваёй пажыццёва Валэйшы, дзядзька Тадэвуш нахіліў мачаху да таго, што зраклася таго пажыццёвага, а ўзамен атрымала фальварак Перахобы, дзе дзядзька абавязаўся пабудаваць дом, прывесці ў парадак усе гаспадарчыя пабудовы і забяспечыць інвентаром. У той час ажаніўся дзядзька з паннай Крыстынай Сяклюцкай, дачкой абывацеляў, меўшых вялікае значэнне і значныя маёнткі ў Лідскім павеце. Як сваяк, грамадзянін, сусед і чалавек разумны, практычны, не падлеглы ніякім уплывам, дзядзька быў так любімы і шанаваны, што не здарылася мне напаткаць, падобнага на яго чалавека. Да маці нашай захаваў глыбокую прывязанасць; таму таксама надзвычай балесным было непаразуменне бацькі з дзядзькам, якое вынікла з наступнай нагоды: дзед Навіцкі, будучы натуральна пад уплывам сваёй жонкі, пакрыўдзіў нашу маці, запісаўшы ёй 10 000 зал. р., але на вэксалях, так, што, хочучы нешта ўзяць, з кожным даўжніком трэба было судзіцца, уводзіла гэта ў пэўныя страты, бо некаторыя крэдыторы, хоць бы і хацелі аддаць, не былі ў стане. Паслухаўшы парады дзядзькі, маці скончыла справу кампрамісам, і хоць у тастаменце было сказана, што калі каторы з крэдытораў усяго не заплаціць, то дзядзька змушаны будзе даплаціць, паколькі ж справа скончылася кампрамісам, то ўжо з дзядзькі маці не магла зыскваць, бо дзядзька не прызнаваў абавязковым даплачваць сястры, што бракавала. Нягледзячы на гэта, на кожнае яе патрабаванне спяшаўся з дапамогай. Бацьку гэта вельмі не падабалася, і ён меў да дзядзькі пастаянныя прэтэнзіі. Нягледзячы на тыя, не вельмі прыязныя стасункі з бацькам, дзядзька аказваў нам аднолькавую зычлівасць, а, апавешчаны пра смерць маці, прыехаў адразу, дамогся ад бацькі, каб той дазволіў яму самому заняцца пахаваннем і прыняць усе выдаткі на сябе. Выпытваў у мяне пра кожнае яе перадсмертнае слова, ці пра яго маці не гаварыла, ці сказаць чаго не даручала. Бо маці наша таксама была кабетай вялікіх цнотаў і непараўнальных заслугаў. Без вялікай адукацыі, бо ледзве чытаць, пісаць і лічыць умела, але мудрая розумам Божым, рэлігійная і цнатлівая ў малітве чэрпала веды жыцця. Свяціла мне прыкладам жыцця свайго на зямлі, апякуецца мной з высокага неба, а памяць і ўдзячнасць да той маці-полькі ў магілу са мной пойдзе.

Пасля смерці маці я працавала яшчэ год пры любімым бацьку, але надышлі падзеі, якія змусілі мяне выехаць у Ліду. Пажар стайні і вазоўні пазбавіў нас вупражы і брычкі. Хваробы вучаніц: круп у адной і тыф у другой, значная адлегласць да доктара і аптэкі, усё гэта зрабіла немагчымым далейшае знаходжанне ў Рудаве. Выкліканая і падахвочаная маршалкам Стэфанам Буткевічам, я выбралася ў Ліду. Прыбыў у той час з-за граніцы брат мой Канстанцін, капітан у адстаўцы, і заняўся чынна і зычліва маім пераездам. Я не мела ні найменшых сродкаў пры выездзе з Рудава: Кан-

станцін усё залатвіў уласным коштам, наняў памяшканне ў Лідзе, з Вільні даставіў мэблю, а сам, маючы сціплыя сродкі, для змяншэння выдаткаў і хочучы, каб пад яго наглядам у цэласці дайшла да Ліды, ішоў пехатой пры нанятых фурманках. Цэлы год жыў у Лідзе, дапамагаючы мне ў вядзенні гаспадаркі і ў кіраўніцтве навучальным працэсам. Вёў рахункі, старанна і ўмела, выкладаў арыфметыку і польскую гісторыю ад Касцюшкі да найноўшых часоў, падмацоўваючыся ў тым скарочаным перакладам з нямецкай, які сам зрабіў. Ксёндз К. вучыў рэлігіі, настаўнікі школы для хлопцаў Штаск і Голуб — іншым прадметам, былі яшчэ мая сястра Антаніна, Юлія Патэ і абедзве Араноўскія, чатыры нястомныя працаўніцы. Таму вучоба ішла ўдала, і колькасць вучаніц што раз узрастала. Пасля заканчэння школьнага года і разлікаў са мной Канстанцін выехаў у Вільню і з запалам аддаўся нацыянальнай справе.

Браты мае, Цыпрыян і Мечыслаў, не ведалі пра смерць маці, едучы на вакацыі дадому. Цыпрыян ехаў на Пецярбург, каб пабачыцца з братам Мечыславам і, відаць, для паразумення са студэнтамі пецярбургскага ўніверсітэта. Сам ён у гэтым годзе скончыў універсітэт у Маскве на факультэце прыродазнаўчых навук са ступенню кандыдата. Ксёндз Мечыслаў пасля заканчэння семінарыі ў Вільні ў тым жа годзе перад вакацыямі быў высвечаны на ксяндза і запрасіўшы аднаго ксендза-прафесара і адзінаццаць калег-клерыкаў, ехаўшых у Вільню, на сваю прыміцыю ў Васілішкі, прыбываў у Рудаў. Цыпрыян даручыў паведаміць пра гэта бацькам. Было гэта на другі дзень пасля пахавання маці. Мы паехалі з сястрой у Васілішкі і, як звыкла, маліліся перад вялікім алтаром. Цыпрыян. прыехаўшы ў Васілішкі, бачачы касцёл адчыненым, увайшоў, думаючы, што знойдзе маці на сваім звычайным месцы, заўважыў нас, але, не хочучы перапыняць нам малітвы, чакаў, пакуль мы яе не скончым. Калі мы паднялiся з калень, і Цыпрыян з-пад доўгай вопраткі ўбачыў жалобу, здагадаўся, што маці ўжо няма і пайшоў шукаць свежую магілу. Тут мы яго плакаўшага і засталі... Пасля сумнага прывітання паехаў брат адразу па важнай справе да некага з суседзяў, забыўшы паведаміць нам пра прыезд кс. Мечыслава. Мы з сястрой паехалі да нашай сваячкі п. Юліі П., аж тут прыбывае ганец ад нашага бацькі, што паслязаўтра будзе прыміцыя кс. Мечыслава ў Васілішках, пасля чаго ён са сваімі гасцямі будзе ў Рудаве на абедзе. Мая мэбля і кухоннае начынне былі ўжо ў Лідзе. Што рабіць? Добрая пані Юлія супакоіла нас, гаворачы, што ўсім зойметца, таму мы вярнуліся дадому, адкуль выслалі лісты да сваякоў, запрашаючы на той дзень на імшу ў Васілішкі і на абед у Рудаў. Пані Юлія прыслала ўсё: мэблю, прадукты на абед, кухара, лакея, самавары, словам: усё і ўсіх. На другі дзень мы паехалі ў Васілішкі, дзе сабраліся ўсе сваякі. Што за ўрачысты, а таксама і балесны быў гэты дзень для нас! Бедны кс. Мечыслаў! Якія пачуцці напаўнялі сэрца яго, як яму не хапала маці ў гэты ўрачысты дзень...

Некалькі тыдняў правёў ксёндз у Рудаве; мы ездзілі разам на св. імшу ў Забалаць, там малады апостал праўды і дабра першы раз засядаў у канфесіянале, былі ў Дубічах, дзе пазней паляжа ў бітве Нарбут з таварышамі па зброі. Пасля вакацый кс. Мечыслаў быў прызначаны ў Беласток. Цыпрыян выехаў у Кобрынскі павет, я — у Ліду з сястрой Антанінай. У Лідзе я працавала, як ужо згадвала, з задавальненнем. Пачаліся дэманстрацыі, провады Баляслава Колышкі, наладжаныя падчас вакацый у маім доме, выклікалі пераслед; мне загадалі з Ліды выехаць.

Нарбут якраз прыняў галоўнае камандаванне над грамадкай паўстанцаў. Мужнасць і запал ад правадыра пераходзілі на ўсіх жаўнераў; змагаліся, верачы ў сваю добрую справу, жадаючы памерці або перамагчы. Але ж чаму ж трэба на гэтым свеце, каб столькі справаў і ўчынкаў узнёслых, ледзьве распачатых, гінула і да буйнага росквіту дайсці не магло! Чаму ж і паміж тых абаронцаў святой нацыянальнай справы знайшоўся здраднік, які столькі сваіх братоў аддаў на смерць ворагам? А аднак жа так было. Адзін са стральцоў Гарадзенскай пушчы Базыль паказаў месца знаходжання Нарбута і яго таварышаў. Ужо цэлы тыдзень палкоўнік Цімафееў са сваім войскам праследаваў Нарбута, які, не маючы адпаведных сіл, каб даць бітву, умела і лоўка адступаў да добра знаёмай мясцовасці ў ваколіцах Дубічаў. Калі нарэшце палкоўнік адвёў змучанае свае войска да Ліды і на сем вёрст ужо адышоў, дагнаў яго стралец Базыль і сказаў, што правядзе войска туды, дзе знайходзіцца шуканы Нарбут. Цімафееў даў яму рубля за здраду і хоць, як казалі, неахвотна пайшоў за здраднікам да вёскі Кавалькі, размешчанай паблізу Дубічаў. Нарбут пасля адходу расійскага войска лічыў сябе ў поўнай бяспецы і змучаны да найвышэйшай ступені затрымаў партыю і ўсеўся над берагам возера з мэтай адпачынку. Малады ад'ютант яго, Адольф Краінскі, сказаў: «Начальнік, пойдзем далей, маю кепскае прадчуванне». «Не магу, — адказаў, — змучаны, не маю сілаў». Праз хвілю Краінскі паўтарыў сваю просьбу. Нарбут, які валіўся з ног ад стомы, рушыць з месца не хацеў. Тады бачаць нашы двух чалавек, якія плылі з другога берага. «Трэба адкрываць агонь, начальнік». — закрычаў Краінскі. «Гэта нашыя стральцы», — адказаў Нарбут. Быў гэта нягоднік Базыль, які паказваў дарогу палкоўніку Цімафееву. У тую ж хвілю раздаліся выстралы, і некалькі куль выцялі ў грудзі Нарбута. Чатыры паўстанцы: Юзаф Пакампіновіч, студэнт з Кракаўскага ўніверсітэта, Адольф Краінскі, абывацель Лідскага павета (асірацію маладую жонку і дзяцей), Аляксандр Бржазоўскі, абывацель таго ж павета і маладзенькі Стэфан Губарэвіч, сын Станіслава, абывацеля Лідскага павета, схапілі любімага правадыра, каб аднесці яго ў больш бяспечнае месца, але нагнаныя кулямі ўпалі з дарагой ношай. Чатыры іншыя занялі іхняе месца: Францішак Бржазоўскі, брат Аляксандра, Уладзімір Паплаўскі, сын абывацеля з Лідскага павета, маладзенькі вучань гімназіі, сын абывацеля Уладзіслаў Жукоўскі і яшчэ адзін з маладых абарон-

цаў, прозвішча якога не памятаю. Ім ужо паміраўшы Нарбут сказаў: «Пакіньце мяне, ужо паміраю — ратуйцеся ўцёкамі». Не паспелі адказаць правадыру, кулі ў іх трапілі; чацвёра іншых Нарбута панеслі, і гэтыя неўзабаве леглі смерцю храбрых, пацвяджаўшай іхнюю прывязанасць да Айчыны і правадыра. З гадзіну, як кажуць, трывала бітва. Стралянінy было чуваць на пяць міль наўкола; перапалох і кепскія прадчуванні агарнулі ўсіх, але не хацелася верыць, што Нарбут забіты. Ніхто не мог адважыцца падацца на месца бітвы і пра яе вынікі даведацца. Калі ані ўпрасіць, ані наняць нікога нельга было, сястра мая, 19-ці гадовая Антаніна, якая пару месяцаў знаходзілася ў Шаўрах, маёнтку Тодара Нарбута, бацькі палеглага правадыра, конна сама падалася ў Дубічы. Прыбыўшы на месца і сустрэўшы рускія пікеты, сказала, што хоча бачыцца з палкоўнікам Цімафеевым. Калі яе прапусцілі, ідучы да яго ўбачыла са страхам кучу целаў, залітых крывёю на адным месцы, а наводдаль цела Людвіка Нарбута пад аховай чатырох узброеных салдатаў. Наблізіўшыся да палкоўніка, прасіла яго дазволіць пахаваць тыя целы паводле абрадаў, якія касцёл наш пры пахаванні загінулых ужывае. «Ці пані мае брата паміж палеглымі?» — спытаў Цімафееў. «Яны — усе мае браты, бо я полька!» — адказала. Атрымаўшы дазвол, разаслала пасланцаў ва ўсе бакі, просячы дапамогі ў доглядзе параненых і пахавані забітых. Што за боль праймаў сэрцы на выгляд той моладзі, палеглай ў росквіце маладосці, бо найстарэйшы з іх Нарбут меў ледзве 31 год; некалькі дзён назад такой поўнай запалу, так рваўшайся да дзейнасці, а цяпер халоднай, без пачуццяў, мёртвай!... Паводле дазволу Цімафеева, усе целы былі ўнесены на ноч у прысценак касцёла, які на Літве завецца бабінцам; кроў з іх так лілася, што сляды ў яе струменях заставаліся. Назаўтра ранютка прыбыло некалькі пань, паненак і сялянак. Прывезлі бялізну і вопратку для 12 мёртвых, бялізну, корпію, бінты, лекі і прадукты для 15 параненых. Адным з іх быў Уладзіслаў Нікалаі, афіцэр дзейнай службы, які пасля выздараўлення быў у Вільні расстраляны. Доктар Цыпрыян Пясецкі, як усе іншыя, асланы ў Сібір, пахаваны ў Табольску, Пётр Янкоўскі прыгавораны да катаргі, а іншых прозвішчаў не памятаю. З пань, якія адразу прыбылі з чыннай дапамогай для параненых, вядомая мне толькі пані Тараевіч з Салтанішак, сапраўдная патрыётка і панна Юзэфа Вісмант, настаўніца. Іншыя пані, панны і вясковыя дзяўчаты пад іх кіраўніцтвам абмылі, так скажу, слязамі сваімі, і найстаранней перавязалі раны пакалечаных і накармілі іх. Касцельныя бабкі і іншыя бабулькі з суседняй вёскі, жаласна лямантуючы, як бы ўласных сыноў аплакваючы, абмылі і апранулі целы забітых. Цела яшчэ аднаго паўстанца, знойдзенае пасля бітвы ў лесе, было разам пахавана. Дванаццаць нефарбаваных трунаў, а трынаццатая абабітая чорным паўаксамітам, былі без катафалкаў у касцёле пастаўлены: пад нізам — шэсць трунаў, на іх — чатыры, далей — дзве, а на версе адна труна Нарбута завяршала тую піраміду. На трэці дзень ад самага рання з'ехаліся на пахаванне палеглых бацькі, браты, сёстры, крэўныя, прыяцелі, хто толькі мог.

Было з дзвесці чалавек, ксяндзоў — 14. Які боль сэрцы напаўняў, які там быў плач і енк, таго апісаць немагчыма. Не было мужчыны, які б не плакаў. Пані Бржазоўская з Гурнофеля, гледзячы са слязамі на труны сваіх двух сыноў, выгукнула: «Шкадую сваіх дзяцей, але яшчэ больш Нарбута! Уся няшчаснвя Літва з ім надзею на свабоду ў магілу кладзе!» Пасля набажэнства ўсе труны былі памешчаны ў адной магіле, у рад, адна пры адной пастаўленыя, і ўсю тую вялізную магілу засыпалі кветкамі. Усе дзякавалі маёй сястры за арганізацыю пахавання, вечную ўдзячнасць ёй абяцаючы, бо такое ўрачыстае пахаванне любімага правадыра і яго таварышаў усім асірацелым вялікую палёгку ў болі прынесла.

…

Пасля пахавання палкоўнік забраў 15 параненых, якія шкадавалі, што засталіся жывымі, што разам з правадыром і таварышамі не палеглі, і пайшоў з войскам у Вільню. Наступнікам Нарбута стаў Аляксандр Парадоўскі, якога звалі Астрогай; сястра мая неўзабаве пасля пахавання Нарбута, едучы да партыі паўстанцаў пад камандаваннем Астрогі, што знаходзілася ў Гарадзенскай пушчы, праз здраду заміж вернага нашай справе стральца была заведзена на месца, дзе стаяў аддзел расейскага войска; там яе арыштавалі і праз два дні знаходжання ў вёсцы Кракшлі адвезлі ў Вільню. Самыя розныя, жудасныя весткі, для застрашвання іншых, непрыяцелямі паўстання лжыва распаўсюджваныя, былі прычынай найвялікшага для бацькі і для мяне смутку. Я вырашыла даведацца на месцы арышту, што з Антосяй сталася. Бедны, шаноўны мой бацька не хацеў мне гэтага дазволіць, гаворачы: «Не маю ўжо двух сыноў і Антосі; ты пры мне застанься, я тваю будучыню забяспечу, дом асобны для цябе выбудую, не адпушчу цябе ад сябе, будзе нам усяго досыць».

Не паслухала майго найлепшага бацькі. Пастаянным моцным наляганнем дамаглася ад бацькі, які ніколі не меў сілы мне ў чым-небудзь адмовіць, што даў мне коней, і я паехала да Маргевічаў. Была гэта шаноўная шляхецкая сям’я, якая складалася з трох братоў, добрых патрыётаў. Старшы Ігнацы быў жанаты з Квінтоўнай; Пётр нежанаты і ўсёй душой адданы справе паўстання, абодва былі на выгнанні ў Табольскай губерні, малодшы Людвік. найсумленнейшы хлопец, але пад пагрозай павешання па загадзе ўладаў выдаў маю сястру, аддаў яе ў рукі маскалёў. Фальварак Маргевічаў Ганелькі ляжаў на дарозе да Кракшляў, таму я найперш падалася да іх. Тут я знайшла каня майго бацькі і калымажку, на якой Антося з сумленным селянінам нашым Юзафам Ляпешам даехала да непрыяцельскага войска. Каня таго і калымажку падарылі Людвіку Маргевічу, таму ён мне іх аддаў. Не падазравала Людвіка ў здзейсненай адносна маёй сястры віне, здзівіла мяне аднак няпэўнасць яго, неахвотныя, як бы пад прымусам адказы на шматлікія пра маю сястру пытанні, так што неўзабаве праўда адкрылася. Расказалі мне там пра смутнае становішча паўстанцаў пад кіраўніцтвам

Астрогі; прасіў ён дапамагчы з прадуктамі, якіх ужо тры дні яго аддзел не меў, паказалі мне падрыхтаваны транспарт правізіі, гаворачы, што ўсё марнуецца, бо да аддзела ніхто даехаць не можа таму, што моцна яго пільнавалі. Я доўга не раздумвала, сказала, што я давязу. Адправіла чалавека з коньмі дадому, сама ж забраўшы прадукты ў калымажку, запрэжаную нашым канём і, развітаўшыся з Маргевічамі, пусцілася ў тое небяспечнае падарожжа, не зважаючы на іх перасцярогі, што ў пушчы кружаць аддзелы казакаў, а тыя, спаткаўшы мяне з запасам прадуктаў, дадумаюцца, куды еду, і нагайкамі могуць мяне забіць.

IV

Даручыла сябе Божай апецы, прамаўляла «Пад Тваёй абаронай» ды «Хто пад апекай» і ехала, першы раз у жыцці сама кіруючы возам. Стралец, прысланы Астрогам, ішоў наводдаль, баючыся, каб яго разам са мной не схапілі казакі. Добры конь ішоў як найспакойней па знаёмай яму дарозе, бо мая бедная сястра ўжо не раз па ёй ездзіла. Я пра сябе прадумвала, як тлумачыцца пры спатканні з казакам, як выцерпець іхняе біццё, каб не выдаць ніякай таямніцы… Вырашыла гаварыць, што патрэбны грошы на аплату работніка (было гэта ў пачатку жніўня), таму вязу вяндліны, хлеб і ўсё, што маю ў сваім свірне, на продаж войску, бо ведаю, што добра плацяць за такія рэчы. Праваднік, набліжаючыся сяды-тады да мяне папярэджваў пра месцы больш цяжкія для праезду — даехалі нарэшце да двух дарог, тады падбег праваднік, каб мне паказаць, якой мушу пільнавацца пры вяртанні, бо ён не зможа мяне правесці, таму шко начальнік А. загадаў яму быць на світанні ў іншым месцы. Сказаў мне, што адна дарога вядзе на Кракшлі, а другая — на Ганулькі. Ехала яшчэ нейкія паўгадзіны; праваднік загадаў мне затрымацца, а сам пабег у аддзел. Праз чвэрць гадзіны, не больш, пачуліся крокі некалькіх чалавек па вадзе, бо была гэта, як у многіх месцах пушчы, даліна пакрытая балотнай травой, урочышча. З’явіліся перада мной тры паўстанцы, узброеныя фузіямі і пісталетамі, прывіталі мяне выказваннем пашаны па-вайсковаму; здавалася мне, што бачу ў іх пасланцоў з неба для вызвалення Бацькаўшчыны, герояў гатовых ахвяраваць сваё жыццё за братоў. Начальнік, а гэта быў ён з двума ад’ютантамі, наблізіўся да мяне, ішоўшай яму насустрач, падзякаваў за маю адданасць і распавёў пра сваё найсмутнейшае становішча: ён меў загад Нацыянальнага ўрада заставацца на месцы, а ніхто не хоча дапамагаць яму ўтрымліваць аддзел, што, відаць, хочуць замарыць паўстанцаў голадам, што няшчасныя абарванцы, без абутку, з палкамі заміж зброі чакаюць наступлення непрыяцельскага войска, сказаў, што на яго загады, некалькі разоў паўтораныя, пра дастаўку патрэбнага харчавання парафіяльны ўрад ніякага адказу не дае, (парафіяльны ўрад, цывільны ўрад, які атрымоўваў загады начальніка і павінен быў дастаўляць харчаванне), даў мне даручэнне да двух парафіяльных урадаў,

далей распавёў па-французску пра ўпадак духу няшчасных паўстанцаў, якіх ён толькі суровасцю і пагрозай смяротнай кары ўтрымовае ў лесе. Са слязамі, развітаўшыся з няшчаснымі, паехала. Праваднік яшчэ раз паўтарыў перасцярогі, каб трымалася, зробленых ім адносна дарогі, указанняў і падаўся ў іншы бок выконваць загад начальніка. На самай справе той апошні казаў яму яшчэ далей мяне правесці, але я не настойвала на тым, баючыся, каб ён на азначаны час не спазніўся. Пагружаная ў найсмутнейшыя думкі, адпусціла цуглі, даверыўшыся вернаму каню, які вёз мяне ўважліва па вядомай яму дарозе, але ў адным месцы мне падалося, што ён мыляецца, і я павярнула яго ў іншы бок. Пасля гэтага я ехала доўга, вельмі доўга, аж пакуль не зразумела да вялікага майго ўражання, што блуджу! Конь ішоў з апушчанай галавой, як бы журботны, як бы выгаворваў мне, што звярнула яго з добрай дарогі. Ехала без малейшай надзеі выбрацца з пушчы, у досыць цёмнай начы, уяўляючы самыя жудасныя малюнкі ў сябе перад вачыма.

Нарэшце пачало світаць. Выехала на нейкі лужок у лесе, дарога вяла на мост — новы, незакончаны, без ніякага падмашчэння; бедны конь ускарабкаўся на вышыню, адкуль мусіў скакаць уніз. Я за шчаслівае пераадоленне гэтай небяспекі дзякавала Богу і была ўдзячная вернаму каню. Густы туман пакрываў луг, я не магла нічога бачыць за пару крокаў; раптам убачыла перад сабой другі мост, а далей нейкі бляск сталі, зброі! Ведаючы, што паўстанцы зброі не мелі, была ўпэўнена, што гэта непрыяцельскае войска. Ад'язджаць назад ці ехаць далей, было не да разумення. Спыніла разумную жывёліну і пачала горача маліцца да Бога аб паратунку і міласэрнасцю над маёй душой, не мела ўжо надзеі пазбегнуць лютай смерці. Начная імгла пачала распаўзацца, світанне станавілася ўсё больш выразным, пачалі адрознівацца прадметы, і я ўбачыла, што тую зброю ўдавалі косы добрых гаспадароў з вёскі Кракшлі. О, што за шчасце гэта для мяне было! Яны таксама мяне згледзелі і са здзіўленнем наблізіўшыся і на майго каня паглядзеўшы, сказалі, што яго яны ведаюць. Я не разумела іхняй мовы, бо размаўлялі паміж сабой па-літоўску, але была далёкая ад усялякага страху, бо спачуванне і дабрата выяўляліся на іхніх тварах. Знайшліся паміж імі і такія. якія ўмелі па-польску; гэтыя мне распавялі. што сюды на гэтым кані прыязджала маладая паненка, якую маскалі, што стаялі ў вёсцы, забралі; абяцалі завесці мяне ў хату, дзе яна бедная два дні была, пакуль яе не адвезлі ў Вільню. Потым, выпрагшы каня, каламажку перанеслі на другі бок, мне для пераходу зрабілі кладку і вельмі дзівіліся, як я магла пераехаць цераз незакончаны мост. Патлумачылі мне, што гэта новая дарога для руху расейскага войска да чыгункі, якая будавалася паблізу.

Калі мы прыбылі ў вёску, сабраліся натоўпам кабеты і з вялікім спачуваннем і плачам пачалі апавядаць пра прыгоды маёй сястры, паказваючы месца, дзе яе ўзялі, дзе сядзела, як на яе крычалі, як фурмана білі нагайкамі, а яна ад гэтага плакала, як нарэшце з войскам, якое ішло праз два дні ў

Вільню, яе вывезлі. Так горка плакалі тыя кабеты, як бы гэта здарылася з іхняй найбліжэйшай крэўнай. Мужчыны каня майго накармілі, напаілі, мяне кабеты паклікалі паесці, далі гарачага малака, яечні, а потым на чыстай пасцелі спаць мяне паклалі. Ціха было ў хаце, бо ўсе пайшлі на працу, засталася толькі адна, якая гатавала есці. Я доўга не магла заснуць, але ў канцы такі моцны сон мяне ўзяў, што не чула, як сабраліся на абед, прачнулася толькі, калі мужчыны выходзілі. Папрасіла, каб каня адразу запрэглі і нягледзячы на моцныя іхні наляганні, каб даўжэй адпачыла, рушыла ў дарогу пры шчырых развітаннях і абсыпаная дабраславенствамі. Прыехаўшы шчасліва да занепакоеных пп. Маргевічаў і, папасвіўшы там каня, познім ужо вечарам вярнулася да чакаўшага з нецярпеннем бацькі. Плакаў мой добры бацька, слухаючы маё апавяданне пра прыгоды Антосі, а потым пра мае ўласныя. Праз некалькі дзён, у нядзелю, паехаў бацька ў Васілішкі на набажэнства, вярнуўся чамусьці ў кепскім гуморы, маўклівы, паабедаў, сказаў мне, што мусіць ехаць у Васілішкі да асэсара, што вернецца пад вечар. Праз пару гадзін вярнуліся коні, але бацькі не было. Я паехала ў Васілішкі даведацца, што з ім стала, там яго ўжо не знайшла, вывезлі яго ў Ліду. Адразу назаўтра падалася ў Ліду, бачыла любімага бацьку ў вязніцы. 75-гадовы стары быў вясёлы, ні чым не трывожыўся, нават рады быў з таго, што нягледзячы на старасць трапіў пад агульны пераслед. Сардэчна мяне абдымаў, радаваўся мне, пра ніякія справы не гаварыў, бо ўсё даручаў Богу, на яго ўсклаў усю надзею. Я мела надзею, што бацька неўзабаве будзе вызвалены, і не засталася пры ім. Сёння для мяне гэта вялікі боль, і мучаць мяне згрызоты сумлення.

Паколькі зняволенне маёй сястры ўразіла ўсіх кабет так, што страцілі адвагу, я вырашыла паказаць, што нельга нам спыняцца на дарозе пасвячэння, што надышла для полек хвіля, калі ў працы, адданасці і адвазе мы павінны зраўняцца з мужчынамі, што ўласна такім спосабам павінна пачацца нашая эмансіпацыя. Таму я найчынней занялася выкананнем даручэнняў і загадаў начальніка — была пару разоў у Вільні, а бацька мой бедны дарэмна ў натоўпе людзей, якія атачалі вязніцу пры вывазе яго ў Вільню, смутным позіркам дачку сваю вышукваў, якая ў такую хвілю ля ног яго быць павінна была. Распавядалі мне потым, як на звароты да яго не адказваў, не чуў, мяне адну толькі бачыць прагнуў, а мяне там не было. Трымаў пад пахай падушку, якую дала яму на час побыту ў Лідзе мая даўняя служанка, і думаў, што яна ад мяне, аддаць яе не хацеў, на просьбы служанкі не зважаючы.

Па суседстве ды і па ўсім павеце ішлі арышты, шмат абывацеляў, шмат паўстанцаў зняволілі; ведаючы пра тое, што і я магу быць неўзабаве арыштавана, па парадзе некалькіх чалавек надумала прадаць інвентар, збожжа, рухомасць бацькі і пакінуць сабраныя грошы ў пэўных руках у Вільні для ўручэння бацьку, калі яго выпусцяць з вязніцы. Аднак знайсці добрых

купцоў не магла; таму, баючыся, каб усё гэта не было змарнавана, раскрадзена, прадала за бясцэнак. Коні — па 15 руб., каровы — па 3 руб., бочка жыта (18—20 пудоў) — па 3 руб. Палажыла тыя грошы ў панны Э.О., маёй прыяцелькі ў Вільні, і яны былі пазней найсумленней бацьку майму аддадзены. З тых сабраных грошай пакінула для сябе 50 руб. і для зняволенай сястры на руках згаданай асобы — 30 руб. Пакідаючы гэтыя квоты для сябе, цешылася надзеяй, што яшчэ праз нейкі час буду жыць у Вільні, што забяспечу бацьку патрэбнай вопраткай, не думала, што мяне так хутка схопяць.

Каб атрымаць якія-небудзь весткі пра майго бацьку і сястру, ужо некалькі месяцаў зняволеных, паехала ў Вільню, маючы пры тым даручэнне ад начальніка партыі паўстанцаў да нашай вышэйшай улады. Узяла ў ключвойта ў Васілішках нейкае там пасведчанне, паперку, якая нічога не значыла і якую паказвала па дарозе, у вёсках і на гасцінцы, затрымліваўшым мяне вартавым, дабралася да Вільні і адтуль вярнулася шчасліва. Прыбыўшы на месца, першую ноч перабыла ў высакародных, добрых маіх знаёмых, сям'і палкоўніка Бжазінскага. Назаўтра, памаліўшыся ў Вострай браме, цэлы дзень хадзіла, каб залатвіць справы і выканаць даручэнні; ні з бацькам, ані з сястрой пабачыцца не магла, хадзіла толькі пад вокнамі вязніцы св. Пятра, дзе дарагі мой бацька знаходзіўся, думкамі прабіваючы тыя муры, якія мяне ад яго аддзялілі, ля ног яго пачувалася, каб іх абліць слязамі і дабраславення папрасіць. Такое ж развітанне было з Антосяй, зняволенай некалькі месяцаў назад у цытадэлі, бо і з ёй пабачыцца не магла. Такую толькі мела пацеху, што даведалася, што жывыя, здаровыя і ніякіх здзекаў і цяжкіх пакаранняў не пераносяць, пра якія фальшыва кружылі жудасныя весткі. Радзілі мне, каб як найкарацей была ў Вільні, бо ўжо вядома было, што мяне шукаюць, таму ў пп. Бжазінскіх на другую ноч ужо застацца не магла, не хочучы іх падвесці пад якія-небудзь непрыемнасці, а пераначавала ў пані Марыі Путкамер, той незабыўнай Марылі песняра Адама. Пані Марыя, ведаючы, што хаваюся, што за прыём мяне ў сваім доме можа адказваць, нягледзячы ні на што, так прыветліва, так па-прыяцельску мяне прыняла, так да мацярынскага сэрца прытуліла, усякімі выгодамі атачыла, а прыпыніўшыся над тым, што мяне чакае, пры развітанні такой парадай падтрымала:

— Вер Богу, Ён цябе не пакіне; падтрыманая яго ласкай, усё вынесці патрафіш, і шчасліва выйдзеш з грозных няшчасцяў, сама церпячы, іншых не выдасі, у сабе самой ніякай не шукай веры, бо толькі чалавек, ласкай Божай падтрыманы, можа не ўпасці.

Я была ўражаная тымі словамі, бо моцна пастанавіла: лепш памерці ў засценках, чым іншых падвесці пад пераслед — не дапускала нават, каб магло быць іначай; пазней пераканалася, што словы любай Марылі і побыт у яе перад тым, што мяне чакала быў адным з праяваў найбольшай міласць-

эрнасці Божай. Я палюбіла яе, яшчэ яе не ведаючы і пра знаёмства не марачы, цяпер найнеспадзяваней аказалася ў яе доме і з вуснаў яе пачула тыя выратавальныя словы! Праніклі яны мне глыбока ў памяць і назаўсёды засталіся ратункам ад роспачы, святлом з неба, якое сярод цемры, атачаўшай мяне, раз'яснялася над пропасцю.

З паняй Путкамер мы былі ў лідскага маршалка пана Стэфана Буткевіча, які пасля адбыўшагася нападу на Дамейку быў у вялікай трывозе. Выехала пад вечар у маёнтак пані Путкамер Бальцэнікі, дзе, забяспечаная яе лістом да служанкі, найспакойней і найвыгодней пераначавала. У Рудаў вярнулася без ніякіх дрэнных прыгод, аднак у найсмутнейшым настроі, ведаючы, што гэтае дарагое, святое для мяне месца, дзе я так спакойна, шчасліва, хоць і бедна жыла, шчасця мне не верне. Сустрэлі мяне з тым, што шаноўны дзяржавец Рудава шляхціц Шумковіч атрымаў ад васілішскага асэсара загад, каб пра мой прыезд яму паведаміў, таму я вымушана была адразу выехаць. Укленчыла ў месцы, дзе два гады назад паміраўшая маці нас усіх чацвярых сясцёр, укленчыўшых ля яе ног, дабраславіла, запавядаючы, каб мы адна другую любілі і адна другую ў патрэбе падтрымлівалі, прамовіла за яе душу «Анёл анскі» і «Пад тваю абарону», пацалавала тую дарагую для мяне зямлю, заглянула ва ўсе куткі дома, укленчыла перад апусцеўшым ложкам майго бацькі, зычліва развіталася са слугамі, паспешна села ў брычку і, заліваючыся гаручымі слязамі, паехала да жыўшай за 10 вёрст ад Рудава с. п. маёй малодшай сястры Эмілії Урублеўскай. Малы той фальварачак у Ішчалнскай парафіі, які швагер трымаў у арэндзе ад п. Люцыяна Кастравіцкага, называўся Устронь. Прыехаўшы ва Устронь, не заязджаючы на дзядзінец, я адправіла чалавека з коньмі, сама пайшла каля плоту, аж тут сустрэла швагра, с. п. Зыгмунта, які мяне папярэдзіў, каб не заходзіла да іх у дом, бо шукаюць мяне і маю служанку Аляксандру Ёч, і трэба, каб пра мой побыт у іх ніхто не ведаў. Правёў мяне праз агарод у малы свіран, там знаходзілася два тыдні, мяне адведвалі і кармілі найлепшая сястра і швагер, ніхто з дзяцей або слуг пра маю прысутнасць не ведаў. У адным месцы падлогі падымалася дошка і там я мела схавацца ў выпадку небяспекі. У адну з начэй, як мне здаецца, з суботы на нядзелю я запаліла свечку, трохі чытала, і тое святло мяне выдала. У нядзелю сястра Эмілія паехала да касцёла ў Ішчалну, швагер па справах — у Васілішкі, я малілася ў сваёй схованцы, вялікі смутак агарнуў мяне, запрагнула пабачыць дзяцей і маю старэйшую сястру Вінцэнту. Таму выйшла са свірна і пайшла да іх. Сустрэлі мяне ўсе дзеці з радасцю, крычаць пачалі: «Цёця, цёця! Адкуль цёця, а дзе коні?» Пасля найчулівейшага прывітання сястра і старэйшыя дзеці: дванаццацігадовая Марыня і дзесяцігадовы Казя пачалі круціцца, чым бы мяне прыняць. Нічога мне не хацелася, цешылася іхнім выглядам: падалі самавар, выпіла толькі шклянку гарбаты, аж убачыла, што свіран акружаны казакамі і ўвесь падворак напоўнены жаўнерамі. Гляджу, аж тут усоўваецца

ў пакой асэсар з афіцэрам і пачынаюць шукаць нешта па ўсіх кутках. Падышоў нарэшце асэсар да мяне са страху як бы прыкутай да канапы і запытаў:

— Ці пані ведае, дзе знаходзіцца Ёчаўна (Ёч)?

— Не ведаю нічога пра яе, — адказала.

— Дзе сястра пані?

— Паехала ў Ішчалну.

— А муж пані?

— Швагер мой паехаў у Васілішкі.

Асэсар выйшаў з пакоя, а спаткаўшы ў сенях пяцігадовага Уладзю, майго хрышчонага сына і пляменніка, спытаў у яго:

— Ці гэта твая мама?

— Не, гэта цёця Альжбета.

Вяртаецца асэсар у пакой і пытаецца мяне:

— Ці пані ёсць Альжбета Табенская?

— Так.

— Чаму ж мне пані гэтага адразу не сказала, я так даўно пані шукаю.

— Не ведала, што мяне пан шукае.

— Няхай пані будзе ласкава збірацца, бо пані паедзе са мной.

— Добра.

Пайшлі ў свіран, напоўнены жаўнерамі, якія адрывалі ад сцен паліцы з салам і вяндлінамі, папрасіла іх, каб выйшлі, змяніла хутчэй бялізну, апранулася, надзела капялюш і прыйшла развітацца з дзецьмі. Што за плач быў, што за крыкі роспачы:

— Цёця, цёця! Што з цёцяй будзе?

Не была ў стане сягнуць думкай у будучыню, не прадчувала, як далёка прастора часу і месца ад любімых істот і мясцін мяне аддзеліць, колькі нядолі трэба будзе перажыць нам усім, перажывала, але тых перажыванняў апісаць не патрафлю. Мусіла нарэшце развітацца з сястрой і тымі мілымі дзеткамі, з якіх наймалодшая Таклюня ледзве пачынала хадзіць, і сесці ў брычку з асэсарам і афіцэрам. Ад'ехаўшы з той ганаровай, як бы пахавальнай вартай, так, можа, з вярсту дарогі, убачыла вяртаўшуюся з касцёла сястру Эмілію. Прайшло гадоў 30 ад той хвілі, а я вобраз болю маёй найчулліўшай сястры бачу і цяпер так выразна перад вачыма, як бы на яе гляджу, хоць яна ўжо шмат гадоў спачывае на Бернардынскіх могілках. Калі мы абедзве з брычак выйшлі, Эмілія да ног маіх упала, балесным крыкам роспачы ўсіх працінаючы, трымала мяне ў сваіх абдымках, адыходзіць не хацела. Мне загадалі ехаць; села, і павезлі мяне ў Васілішкі, з шэсць вёрст ад Устроня; ледзьве туды даехалі, а ўжо сястра са шваграм прыбылі. Мы ўсе трохі супакоіліся, заблішчала смутным святлом надзея майго вызвалення. Трэба, аднак, было ехаць далей, люд натоўпам сабраўся каля дома асэсара, шмат было зычлівых паміж імі, агульны галосны плач разлягаўся:

— За што? За што?

Гэта была першая ў тых краях вывазка. Асэсар загадаў гнаць коней галопам, пакуль не знікнуць мне з вачэй любімая сястра, швагер і Васілішкі.

Была, можа, гадзіна сёмая, як мяне вывезлі з Васілішак. Ехаў са мной малады афіцэр фінляндскага палка і два жаўнеры. Мы ехалі цэлую ноч і на світанні прыехалі ў Ліду; прывялі мяне да начальніка павета палкоўніка Алхазава; досыць доўга чакала ў сенях, дзе была сялянка з-пад Дубіч, якая плакала і праклінала паўстанцаў за тое, што яе мужа павесілі за здраду. Была гэта жонка стральца Базыля, які паказаў маскалям месца знаходжання Нарбута. Калі пасля смерці таго Астрога прыняў камандаванне паўстанцамі, Нацыянальны ўрад загадаў яму рушыць у Дубічы і здрадніка Базыля павесіць. Калі паўстанцы прыйшлі ў яго хату з апавяшчэннем выраку смерці, без здзіўлення прыняў тую весту, просячы толькі, каб яго на тонкім паску павесілі, і вось жонка Базыля плакала і заклікала да помсты за смерць мужа. Алхазаў суцяшаў яе, гаворачы, што муж яе памёр за цара, за Айчыну, але яна крычаць не пераставала і паказваючы на двух ці трох прыведзеных вязняў, лямантавала:

— Вот он моего мужа повесил! Он! Этот самый!

Палкоўнік загадаў выправадзіць вязняў. а потым павярнуўся да мяне з іскрыстымі ад гневу, вялізнымі чорнымі вачамі, лаяў на розныя лады і закончыў так:

— Повесят вас, повесят, вы первая мятежница!

І загадаў адвесці мяне на гаўптвахту. Дайшла туды ў суправаджэнні жаўнераў, радая, што яшчэ рана, што апрача некалькіх яўрэяў ніхто мяне не бачыў, толькі пры ўваходзе ў гаўптвахту здарыўся прыкры эпізод, калі стары Ёч па загадзе жаўнера ўстаў са сваёй пасцелі на саломе, каб мне месца вызваліць, а сам некуды іначай пайшоў. Быў гэта бацька Аляксандры, прысланай да мяне на нейкі час для выканання даручэнняў нашага ўрада, а хутчэй паўстанцкай партыі. Бацька, які не падзяляў яе пераканаяў, гневаўся на яе, сварыўся. Жудаснае ўражанне зрабіла на мяне тая роспач няшчаснага старога, які ўсё жыццё правёў спакойна, шаноўна, а сёння яго як злачынца жаўнеры пераводзілі з вязніцы ў вязніцу. Аляксандра Ёч, маладая, здаровая, адважная, растаропная, пераапранутая ў жабрачку, шматкратна прыбягала з папярэджаннямі, каб данесці да партыі Астрогі пра набліжэнне непрыяцельскіх войскаў, або давезці якія-небудзь прадукты. Колькі разоў, схопленая жаўнерамі. лоўка ад іх выслізвала, пачынаючы якую-небудзь вылазку, бясстрашная Аляксандра, прыбраная ў старую сярмягу жабрачкі, з галавой, абвязанай хусткамі, з торбамі за плячыма, падала на калені перад абразом Маці Божай Вастрабрамскай, прамовіўшы «Пад Тваю абарону», са слязамі ў вачах, але з верай і адвагай у сэрцы, бегла туды, куды яе задума вяла. Бацька яе, прызнаны за невінаватага, быў неўзабаве вызвалены.

Журботныя падзеі ўчарашняга дня, бяссонная ноч і тое, што ў Лідзе даведалася, найжудасней мяне прыгнялі. Перасследаваная прыкрымі думкамі

хадзіла ўздоўж па пакоі, аж раптам дзверы адчыніліся і ўляцеў са злосцю ваенны начальнік Лідскага павета Чартоў, пачаў мяне выпытваць пра знаёмых мне людзей, дзе яны ёсць? Але нічога не даведаўшыся, стукнуў дзвярыма, крыкнуў:

— Повесят вас, повесят! — і пайшоў, адкуль прыйшоў. Добрыя, ласкавыя знаёмыя прыслалі мне гарбаты, пячэння, падушку і коўдру; якім вялікім дабрадзействам для мяне была іхняя памяць, распавесці цяжка. Шаноўны лідскі тракціршчык п. Андрушкевіч прыслаў мне абед, пад вечар пані прэзідэнтша — фруктаў, соку, канфецюр. О, Божа, узнагародзь іх усіх за тую дабрыню да мяне! Я ўвесь час хадзіла па пакоі, адчуваючы то гарачку. то дрыжыкі, нарэшце прыйшла ноч. Спала я неспакойна, перарывістым сном, пад раніцу прачынаюся, а тут жаўнер, які пільнаваў мяне, падышоў ціхенька да канапы, на якой я спала і падсунуў руку пад падушку.

— Што гэта значыць? — крыкнула

— Нічога, нічога, я шукаў у вас папяросы.

Назаўтра мне зноў прыслалі гарбату і пячэнне. А 10-й прыйшоў Алхазаў і без злосці пачаў мяне пераконваць, каб ва ўсім прызналася, каб сказала, дзе быў і дзе цяпер знаходзіцца Вітольд Гажыц; што яму ўсё пра мяне вядома; але што ўласным прызнаннем магу атрымаць палёгку. Адказала яму на гэта:

— Пан палкоўнік сказаў мне, што маю быць павешанай; верачы словам яго, я занятая толькі падрыхтоўкай да смерці, ні пра што іншае не думаю, нічога не скажу; аднаго прагну — памерці шчасліва. Прашу мяне ні пра што не пытаць.

Разгневаны, ляснуў дзвярыма і выйшаў. Бачыла праз акно ішоўшага пад вартай п. Рыхлевіча, суседа з прылеглага пакоя, якога напэўна вялі на допыт. Прыехала ў Ліду бедная сястра Эмілія; хадзіла каля гаўптвахты, хацела са мной пабачыцца — мы глядзелі адна на адну, але прыблізіцца жаўнеры нікому не дазволілі. Я гаварыла да яе праз акно, але натуральна, голасу майго не чула. Апошні раз тады бачыла тую сваю любімую сястру, найдарожшую таварышку маіх дзіцячых гадоў! Бачыла праз акно нямала праходзіўшых знаёмых і прыязных людзей; паглядалі на мяне зычліва, але ўкрадкам, ніхто не падышоў паразмаўляць са мной, каб не выклікаць да сябе падазрэння. Пані прэзідэнтша Шукевіч, пані доктарша Горская, старая пані Петрушкевіч і іншыя добрыя пані прысылалі мне яду і розныя прысмакі, але я нічога есці не магла, губы мела спечаныя ад гарачкі, жаўнеры за мяне ўсё з'ядалі і ўзнікла ўражанне, што я хачу замарыць сябе голадам, у выніку чаго паспяшаліся з адпраўкай мяне ў Вільню. Паставілі жаўнера на варце ў маім пакоі, і ад той яго прысутнасці я не магла ні на хвілю вызваліцца ні днём, ні ноччу, вялікія нязручнасці мела; ужо сам смурод дзёгцю, якім свае боты чысцілі, невыносны мне быў і боль галавы выклікаў; а гэтая змена варты кожныя тры гадзіны, што мне ўначы неспа-

кою дадавала. Пры кожнай змене жаўнер падходзіў да мяне, каб пераканацца, ці жывая.

Пан Баляслаў Жукоўскі, які быў пад хатнім арыштам у Лідзе, не зважаючы на ўглядаўшыхся жаўнераў, прайшоў блізенька ад акна маёй вязніцы і, гледзячы ў другі бок, як бы сам да сябе голасна выгукнуў:

— Faites venir le medecin, vous etes malade! Eutendey-vous? Faites venir le medecin, l`officier de service ne vous le refusera pas!

Была гэта дапамога праз яго з неба пасланая! Сказала жаўнеру, што я хворая і прашу дзяжурнага афіцэра прыслаць мне доктара; жаўнер прынёс мне адказ, што доктар заўтра прыйдзе. Назаўтра рана, падкупіўшы, напэўна, жаўнераў, увайшоў да мяне капелан лідскай школкі кс. Ян Свірскі, мой зычлівы знаёмы. Мімавольна сагнуліся ў мяне перад ім калені, прасіла яго пра дабраславенства, гаворачы, што слабая, упала духам і баюся, каб каго не выдаць. Ксёндз ані слова да мяне не прамовіў, пражагнаў і паспешна выйшаў. Праз гадзіну можа ўвайшоў вядомы доктар п. Горскі, карыстаючыся з хвілі, пакуль уваходзячы за ім дзяжурны афіцэр затрымаўся ў дзвярах, нешта гаворачы жаўнеру.

— Усё ведаюць, ці маю прызнацца? — запытала.

— Барані Божа, — а бачачы, што афіцэр набліжаецца, — што ў пані баліць, — запытаў і пачаў цярпліва даследаваць. Потым, напісаўшы рэцэпт, аддаў яго афіцэру, і абодва выйшлі. Я, падмацаваная духоўна дабраславенствам каплана і парадай доктара, дзякавала Богу за гэтую дапамогу, бо ўжо не ведала, што рабіць. Не памятаю, колькі дзён была ў Лідзе, ведаю толькі, што не доўга; заходзіў да мяне Чартоў і Алхазаў, нарэшце сказалі мне, каб збіралася ў дарогу. Прынеслі мне з горада абед, памятаю, былі смачныя калдуны, пакаштавала іх, але не ела. Пасля ранняга абеду, які прыслалі шаноўныя пані, паведамленыя пра мой выезд, вывезлі мяне з Ліды; стаяла чацвёрка паштовых коней, запрэжаных у брычку, у якой сядзеў афіцэр і два жаўнеры, адзін на козлах з паштальёнам, другі на пярэднім сядзенні брычкі, а афіцэр са мной ззаду. Сабраўся натоўп людзей, маса яўрэяў — плач, лямант разлягаліся; па загадзе афіцэра паштальён выцяў коней, я кіўком галавы развіталася з сабранымі, пражагналася і паўтараючы толькі словы: «Божа. злітуйся нада мной!», горка плакала. Цэлы дзень надвор'е нам спрыяла; едучы, напружвала зрок, каб наглядзецца на такія прыгожыя мясціны любімай Літвы і насыціць вочы іхнім выглядам. Пры змене коней на пошце хацела трохі пахадзіць, але прыемным гэта не было, бо жаўнер са зброяй у руках ступаў за мной крок у крок, ад яго нагляду і на хвілю вызваліцца не магла.

V

Прыехалі ў Вільню ноччу, не магла пазнац горада, зразумець, куды мяне вязуць; муры падаваліся мне дзіўнай вышыні, нейкія фантастычныя дамы,

пастаянна бачыла перад сабой падзямеллі і шыбеніцы. Спыніліся нарэшце ў цытадэлі. Паглядзелі мне там у вочы, афіцэр нешта сказаў, і праз некалькі хвілін пасадзілі мяне ў тую самую брычку і зноў праз незнаёмыя, нейкім страшным мурам апаясаныя вуліцы павезлі мяне недзе далей. Запытала нарэшце афіцэра, ці збіраюцца мяне вешаць? Адказаў на гэта:

— Вздор, женщин не вешают! (Глупства, жанчын не вешаюць!)

Прывезлі мяне, як я пазней даведалася ў місіянерскі кляштар; правялі найперш у турэмны надзор, а адтуль жандар і служка адвялі мяне ў прызначаны 25 нумар. Жандарм выйшаў, служка сказала мне распрануцца, перагледзела старанна кожны элемент маёй вопраткі і, нічога не знайшоўшы, пайшла. У тую ж хвілю ўвайшоў жаўнер, няпрошаны і неадступны мой таварыш да выхаду з вязніцы. Пры святле тускла гарэўшай і высока павешанай лямпы я агледзела мой пакой, келлю некалі аднаго з набожных капланаў. Не было ўжо толькі ні крыжа, ні абраза. Вокны закратаваны жалезам, ложка з саламяным сянніком і такая ж падушка, з чорнай з простага сукна, тоўстай прастынёй падшытая і на саван падобная коўдра; з другога боку стаяў столік і крэселка; была таксама і печ, а насупраць яе фрамуга, у якой сядзеў мой шаноўны вартаўнік. Папрасіла жаўнера, каб выйшаў на хвілінку, адказаў мне:

— Нельзя (Нельга).

Упала на калені, уручаючы маю долю Айцу Нябеснаму, і легла на ложка. Хадзенне жаўнераў па калідоры, змена варты ноччу, адмыканне дзвярэй у прылеглыя нумары, усё гэта мяне кранала. Назаўтра вязні, па калідоры ходзячы і бачачы, што новы нумар ужо заняты, пачалі заглядваць у акенца ў дзвярах. Я хутка ўскочыла з ложка і наблізіўшыся да акенца на пытанне, хто я, назвала сваё прозвішча, у адказ пачула:

— Звяровіч.

Тыя пытанні і адказы паўтараліся што хвілю. Пачула тут прозвішчы: Пётр Янкоўскі, Ксаверы Александровіч, Томаш Шукевіч і яшчэ некалькі, якіх не памятаю. Ад жаўнераў даведалася. што ў суседнім 24 нумары знаходзіцца маладая і прыгожая ўдава п. Касакоўская, а з другога боку — шэсць ксяндзоў. На другі дзень выклікалі мяне ў камісію. Два ці тры былі там генералы, дапытвалі яны мяне, не выказваючы ніякай зласлівасці, абыякава, і з іх пытанняў я зразумела, што маюць пра мяне фальшывыя звесткі. Быццам бы шкадавалі мяне, што ўлезла ў тыя кампраментаваўшыя мяне перад урадам і ганебныя для жанчыны справы, што яшчэ магла б выйсці замуж, шануючы сябе і да т. п. Адказвала, што ніколі ў жыцці не зганьбілася ніякім кепскім учынкам, што паехала ў Кракшлі, вёску, размешчаную за некалькі міль ад Дубічаў, каб даведацца, што сталася з сястрой маёй Антанінай, арыштаванай і зняволенай у ваколіцах той вёскі, а заблудзіўшыся ў лесе выпадкова напаткала паўстанцаў, якія паказалі мне дарогу. Прыйшла ў сваю вязніцу моцна прыгнечаная тым першым у жыцці нападам

на мае погляды. Была гэта можа гадзіна 10 раніцы; прынеслі мне гарбату. Шклянка са сподкам, два імбрыкі, адзін з гарачай вадой. другі з запаранай гарбатай, некалькі кавалкаў цукру, добрае печыва, усё пры тым чысцютка падана, так што з прыемнасцю паела першы раз ад часу зняволення. У параўнанні з тым, што мяне дагэтуль спатыкала, становішча маё падалося мне на шмат лепшым, а таварышы па вязніцы, якія зычліва мной цікавіліся, вялікую палёгку мне прыносілі. П. Звяровіч і п. Шукевіч дапытваліся, ці не трэба мне чаго, але я толькі дзякавала ім за ўсё. Пан Пётр Янкоўскі і іншыя таварышы хацелі ведаць пра дэталі і прычыны майго арышту. Маючы пакінутую мне служкай кніжку для набажэнства, выдрала з я яе 1-шы аркуш і шпількай ад валасоў напісаўшы на ёй пару фраз падала аднаму з паноў праз акенца так, каб жаўнер не бачыў. Абодва жаўнеры, адзін перад дзвярыма, а другі, які стаяў у маім пакоі, атрымоўвалі ад вязняў папяросы і дазвалялі прамовіць пару слоў. Нельга было прачытаць майго пісання шпількай; адзін з паноў, падаючы мне праз акенца дзве папяросы, сказаў, што трэба абавязкова, каб я курыць навучылася, што гэта будзе мне прыемным. З яго мовы я зразумела, што тыя пяпяросы маюць нейкае іншае значэнне. Жаўнер пастаянна хадзіў ад дзвярэй да акна; я седзячы пры століку і трымаючы кніжку для набажэнства разгорнутай, удавала, што малюся, а сама, прыглядваючыся да папяросаў, убачыла, што заміж тытуню ў адной была цыдулка ад тых спадароў, а ў другой кавалак чыстай паперы і аловак. Прасілі мяне, каб ім што-небудзь пра сябе напісала і як раней праз акно падала. Бо з той цыдулкі яны нічога не даведаліся. Баючыся звярнуць на сябе ўвагу жаўнера, які пастаянна хадзіў па пакоі, прыкідвалася, што малюся, калі паварочваўся да мяне, пісала хутка на лісціку, калі аддаляўся.

Такім спосабам я распавяла таварышам па няволі пра арышт Антосі, бацькі і нарэшце пра мой. Яны пісалі і гаварылі вельмі шмат пра маю сястру, якую ўсе называлі Антосяй; падтрымлівалі мой дух і для заахвочвання для вытрымкі цяжкіх выпрабаванняў пры допытах, праходзячы каля майго нумара, паўтаралі: «О, стойкая Антося, стойкая, добра трымаецца!» Антося была вясёлая, поўная энергіі і надзеі на лепшую будучыню; а я смутная, пастаянна ў слязах, бачачы подступ ва ўсім і невясёлую будучыню для Бацькаўшчыны і сям'і, а для сябе шыбеніцу. Да таго ж жаўнеры, якія мяне пільнавалі, стараліся мяне «ўцешыць», апавядалі пра прайшоўшыя экзекуцыі і пра ўвядзенне смяротнай кары для жанчын. Не магу распавесці таго, што адчувала, што ў маёй душы рабілася! Была гэта агонія з тысячай уразлівых зданяў, бяздонных пропасцяў, выяў мардаванай моладзі і шляхты, а паміж імі і маёй любімай сям'і. Чула галасы роспачы, енкі болю, а найменшай палёгкі чакаць не магла! Падала нарэшце на калені і, заліваючыся слязамі, доўга клікала: «Божа, злітуйся над намі!»

Праз нейкі час дзверы адчыніліся, і ўвайшоў жандар з выклікам мяне ў камісію. Сабралася як найхутчэй і пайшла за ім. Сэрца ў мяне білася, у ва-

чах у мяне цямнела. Увайшоўшы ў залу следчай камісіі, застала сядзеўшых за сталом чатырох генералаў, якія і мяне запрасілі сесці. Пачаліся пытанні: адкуль родам, кім працую і да т.п., адказы мае запісвалі ў пратаколе. Потым выказалі мне вялікія спачуванні, што так моцна правінілася, што мяне за гэта строгі суд чакае і з тым мяне адпусцілі. Вярнулася пасля таго допыту яшчэ больш прыгнечанай, ужо без найменшай надзеі на вызваленне. Адразу пачаліся стукі ў акенца з пытаннямі, пра што мяне пыталіся, што адказвала, і з парадай не падаць духам. Не памятаю, колькі часу сплыло ад таго допыту; бадай, ці не праз два тыдні паклікалі мяне зноў у следства. У той самай, што раней зале, застала зноў некалькі генералаў, якія сядзелі за сталом, пры якім і мне паказалі месца, сказалі, што прыйдуць сведкі, якія пра ўсё, што рабіла, у вочы мне скажуць. Праз хвілю сталі перада мной тры няшчасныя маладзёны з выразам смутку і нібы перапуду на тварах, бо яны дзеля вызвалення ад смерці лгарствам мяне мелі абвіняць. Два сыны абываценяў Лідскага павета, мае суседзі: Антоні Клімантовіч, малады драгунскі афіцэр з Васілішскай парафіі, Другі Аляксандр Янкоўсекі з Навадворскай парафіі і трэці Караль Кюхлер са Слонімскага павета. Усе тры паведамілі, што я дастаўляла правізію і зброю ў партыі Любіча, Віславуха і Астрогі. Клімантовіч абвініў мяне яшчэ ў тым, што падгаварыла яго да паўстання. Сказала ім, што гэта абман! Спытала Клімантовіча, дзе б з ім магла размаўляць, калі зусім не мела стасункаў з яго родзічамі і нідзе яго ў таварыстве не сустракала? Ён мне на гэта смела адказваў, што яго намовіла на цвінтары пад касцёлам у Васілішках, нібыта пагражаючы яму, што калі мяне не пачуе, то ўсе ім не толькі пагарджаць будуць, але яшчэ дом маці яго спаляць, уся гаспадарка, усе пабудовы будуць паўстанцамі знішчаны. На што, звяртаючыся да чальцоў камісіі, дадаў са слязамі: «Бачыце, паны генералы, такая была пераканаўчая! Як пачала мяне намаўляць, дык не быў у стане супраціўляцца ўгаворам!» А мне, карыстаючыся тым, што адышоў найбліжэй сядзеўшы генерал, сказаў:

— Нічога табе, пані, не сталася б, каб у тым прызналася, а мяне вызваліла б ад смерці.

— Шкадую, што таго прадбачыць не магла, — адказала.

Сказалі выйсці тым сведкам. У той час адзін з генералаў наблізіўся да мяне, гаворачы:

— Загубіла пані таго чалавека ў росквіце веку. Ён будзе пакараны смерцю, бо падобна, што быў нават часовым начальнікам нейкай партыі.

— Я яго намаўляла да паўстання, — сказала, — але што ён не быў начальнікам партыі, то ведаю добра, бо калі я ехала ў вёску Кракшлі, каб даведацца, што сталася з сястрой, то сустрэла некалькі паўстанцаў, блукаўшых па лесе, і паміж імі Клімантовіча, які ішоў з думкай, каб здацца паліцыі.

Можа, тое маё прызнанне, як нібыта непрыязнай асобы для абвінавачанага, паслужыла на змякчэнне выраку, бо выслалі яго на катаржныя работы

на 20 гадоў, а быў прысуджаны на смерць праз расстрэл. Памёр, аднак, у дарозе ад воднай пухліны пасля тыфу. На пытанне генерала, чаму гэтыя маладыя людзі так згодна гавораць мне ў вочы, што ведаюць, і чаму я прызнацца не хачу. Адказвала, што баязнь смерці, якою ім пагражаюць, калі не будуць гаварыць так, як ім паны кажуць, да таго іх давяла. Праз некалькі месяцаў пасля таго допыту ўвайшоў да мяне жандар з азнаямленнем, што заўтра павінна быць дастаўлена для выслухвання майго выраку, а потым буду выслана на месца прызначэння. Паўтарыла мне тое самае жанчына, якая мяне абслугоўвала. Прасіла іх на прамілы Бог пра залатвенне спаткання з сястрой, а за зробленае мне абяцанне абдарыла іх, чым магла з маёй вопраткі; ведаючы, што сястра мая спіць без падушкі, прасіла аддаць ёй маю, але нікчэмныя ашукалі мяне! Цэлую ноч не спала, дарэмна чакаючы прыходу сястры.

Назаўтра а 8-й гадзіне паклікалі мяне да наглядчыка, загадаўшы апрануцца на выезд; пасля ў суправаджэнні двух жандараў правялі мяне праз калідор. Праходзячы міма пакоя, у якім жыла Антося, я крыкнула: «Антося! Бывай!» Яна высунула руку праз прыадчыненыя дзверы, але жандары пацягнулі мяне за сабой, не даючы нам абмяняцца развітальным поціскам рук! Увялі мяне да наглядчыка, прасіла літасці, дазволіць мне развітацца з сястрой — дарэмна! Як раней жандармы, так цяпер ён адказваў: «Нельга!» У роспачы з плачам гаварыла:

— Дабра зрабіць, то і ваш усемагутны цар не мае ўлады, але зло то і самы ліхі наглядчычак можа! Слёзы нашы, кроў наша клічуць аб помсце да Бога! Прыдзе час кары на вас за здзекі вашыя над намі!

Плакала ўголас, так прыгаворваючы.

— Аддайце мне грошы мае, што адабралі ў мяне пасля прыбыцця ў вязніцу!

Але наглядчык, нічога не адказаўшы, выйшаў у другі пакой, жандармы выправадзілі мяне і, усадзіўшы ў дрожкі, завезлі ў цытадэль для выслухвання выраку. Сплаканая, змучаная, я ўвайшла ў велізарную залу; вакол стаяць жаўнеры з суровым выразам твару, як статуі, з паднятай зброяй у руках. Перад жаўнерамі — некалькі генералаў, і цішыня ў зале магільная. Праз хвілю, як Люцыфер, выходзіць наперад пракурор з паперай у руках, грозным тонам пачынае чытаць вырак. Была пэўная, што прыгавораць мяне да павешання, таму слухала. Спачатку пералічвалі ўсе мае злачынствы, а потым «праз невыказную ласкавасць найяснейшага гасудара паслаблены вырак на пасяленне ў Томскай губерні з пазбаўленнем усялякіх правоў: шляхецтва, спадчыны і да т. п. цяпер і ў будучыні». Такім быў вырак цара ўсёй Расіі, шчасліва!? пануючага Аляксандра II, так ласкава прыгаворваючы на Сібір мяне, «няверную падданую, якая брала ўдзел у бунце супраць яго, наладжвала стасункі з мяцежнікамі» і да т. п. Пасля выслухвання выраку адвялі мяне ў залу, дзе апраналі вязняў, прыгавораных на падарожжа ў Сібір.

Сказалі мне там зняць маю вопратку і апрануць арыштанцкую; сярмягу з шэрага сукна з жоўтай латкай на плячах і страшны каптур з таго ж сукна на галаву. У хвілю, калі мяне так апраналі, увайшоў доктар Шымон Станкевіч, таксама з місіянерскай вязніцы. Змяніўся быў да непазнання, бо з галавы і твару зніклі аздабляўшыя яго валасы, мускулы на твары яго дрыжалі, прытым апрануты быў таксама ў страшную сярмягу. Бачачы маё здзіўленнне, сказаў: «Абяцалі перад тым выпусціць мяне, зусім не прадбачыў, што так сурова буду асуджаны, высылаюць мяне на катаржныя работы». Чакалі досыць доўга ў тым месцы, нарэшце сказалі нам апрануць кажухі. Так здарылася, што нейкі яўрэй, вязень, замяніў свой кажух на мой, а паколькі вялікая была паміж намі розніца ў росце, то хоць для мужчын давалі кароткія кажухі, яго быў для мяне зацяжкі і задоўгі і цягнуўся па гразі, калі нас з цытадэлі вялі ў астрог на Лукішкі. Потым вывелі нас на падворак, дзе іншыя вязні на нас чакалі. Было гэта ў лістападзе, гразюка была страшэнная, я не магла справіцца з маім доўгім кажухом, а прунелевыя боцікі, якіх мне зняць не загадалі, прамоклі зусім. Таварыства наша складалася з 60 мужчын і мяне адной жанчыны. Казакі на конях нас суправаджалі і пастаянна да хутчэйшага маршу падганялі. Я не магла паспець за таварышамі, падала ад знямогі. Убачыўшы праходзіўшую міма мяне нейкую паненку, крыкнула: «Я — Табенская!», а казак на гэта закрычаў, падымаючы нагайку:

— Я тебе сейчас покажу! Научу тебя молчать!

Нарэшце мы прыбылі ў астрог на Лукішках, і мяне памясцілі ў аддзел для жанчын- крымінальніц. Ад выгляду іхніх жудасных постацяў страх мяне праняў; многія рэчы перабачыла, але ніколі не думала, што акажуся ў падобнай кампаніі. Не мела адвагі наблізіцца да каторай з іх, траціла прытомнасць. Уселася на зямлю пасярод пакоя, гразь сцякала з кажуха, а тут уваходзіць нейкая добрая пані з прыслугі, прыносіць шмат рознай вопраткі, бялізны, некалькі цёплых хустак, некалькі рублёў. Крымінальніцы пасля яе адыходу атачылі мяне, уселіся вакол мяне і з цікавасцю прыглядаліся да прынесеных рэчаў. Неспадзявана паказаўся дзяжурны афіцэр і, падышоўшы да мяне, спытаў прозвішча, а потым, ці не сястра я Аляксандра Табенскага, які быў у войску яго таварышам? На сцвярджальны адказ выказаў вялікія да мяне спачуванні і па-прыяцельску радзіў, каб рэчы не брала з сабой, бо была б вымушана несці іх на сабе, ідучы ў Сібір пеша. Паверыла яго словам і параздавала ўсё жанчынам, якія сядзелі вакол мяне. Далі мне знаць, што нехта прыйшоў пабачыцца са мной. Пайшла спешна за жаўнерам, які вёў мяне да частаколу, што ўтвараў агароджу вязніцы, і з вялікай радасцю ўбачыла там с. п. Паўліну Кандратовіч з двум сынкамі Казем і Людвісем. Заплакалі высакародныя хлопцы на від маёй нядолі. Маючы прамоченыя ногі, я то адну то другую падымала для сугрэву; холад мяне працінаў; пакінулі мяне неўзабаве мілыя госці, і я вярнулся ў астрог. Не памятаю, як я тую ноч у астрозе правяла, здаецца мне, што седзячы на сярэдзіне пакоя і

пільнуючы мае рэчы, г. зн. кажух і клунак. Назаўтра рана прыйшоў ксёндз з Панам Богам да адной хворай з цывільных злачынцаў, а калі перад удзяленнем святой камуніі сказаў: «Ото — баранак Божы!» — упала яму да ног і прасіла пра дабраславенства на дарогу і жыццё ў Сібіры. Ксёндз быў вельмі ўзрушаны, не мог ні мяне адапхнуць, ні ісці далей; падышла тады адна сястра міласэрнасці, анёл Божы на зямлі, і лагодна прамаўляючы вызваліла з абдымкаў ногі ксендза, які, трымаючы камунікат, слова вымавіць не мог, бо я непрытомна крычала: «Ойча, дабраславі мяне няшчасную, дабраславі!» Назаўтра, не памятаю ўжо, у якую пару дня, вывелі нас на падворак для адпраўкі на чыгунку. Пры выхадзе з астрогу ўбачыла п. Эвяліну Асціловіч, найлепшую, сапраўдную сяброўку сваю з іншымі нейкімі панямі, якія развіталіся са мной са слязамі ў хвілю пакідання роднага краю, са сваіх нікога не было. Не маю слоў, каб абмаляваць мае пачуцці пры вывазцы мяне з Вільні. Боль і жудасны страх мной авалодалі. Такія пачуцці вядомы хіба толькі перад хвіляй смерці тым, хто да яе прыгавораны! Любімы, найлепшы мой бацька, 75-гадовы стары, застаўся ў вязніцы; сястра Антаніна — у вязніцы; слабая на галаву Вінцэнта — без апекі; братоў маіх дарагіх не ведала нават дзе думкай шукаць; увесь край у нядолі і жалобе; у кожнай сям'і забракла некага з найбліжэйшых; вязніцы перапоўнены; сястра мая Эмілія з малымі дзеткамі найнешчасліўшая; яна пазней закончыла жыццё галоднай смерцю.

Пасадзілі нас у арыштанцкі вагон, закратаваны жалезам; так нас там было поўна, што не толькі рухацца, але і дыхаць было цяжка. Я была адна сярод мужчын, пачатак падарожжа, якое мела трываць год, быў жудасны. Пры пасадцы на цягнік у Вільні знік яўрэйчык, які замяніў мой кажух. Кінуліся за ім, але ён абмануў пагоню; цягнік рушыў, і мы паехалі. У Пецярбургу завялі нас у залу III класа, дзе мы пілі гарбату; з першым цягніком выправілі нас у Маскву. Тут я была памешчана ў астрогу з жанчынамі простага люду; было там некалькі сямей заградовай шляхты з ваколіц Ібяны на Жмудзі. Адна з іх з малюткім дзіцем, бо на трэці дзень пасля родаў была выслана, бедная кабета была моцна аслабленая, а мела яшчэ двое дзетак, якім было па некалькі гадоў. Калі нас прывезлі ў Маскву, пані, не пазбаўленыя шляхецкіх правоў, былі лепш размешчаны, а іншыя так, як я, у астрозе. Было там вельмі людна, але яшчэ лепей, чым пазней на этапах, дзе мужчын размяшчалі разам з жанчынамі. Адных дзяцей, па большай частцы малюткіх, было ў нашай камеры сорак. Плакалі яны ноччу; паветра было кепскае, душнае; пад ранак, калі дзеці заціхалі, то іх маці пачыналі спяваць гадзінкі; мілыя гэта Богу і людзям спевы, але не тады, калі спаць пасля мучэнняў хацелася. Папярок камеры ад адной сцяны да акна месца для сну, нары (від ложка з дошак накшталт збітага моста, пракладзенага ад сцяны да сцяны, агульнае ложка для мужчын і жанчын). Працягнуты быў шнур тут жа пры пе-

чы, і тут сушылася брудная, нямыта, самая розная бялізна. Вечарам лічылі нас, выкліквaючы па прозвішчах і запісвалі, колькі «штук». Пасля запісу, які меў месца а 8-ай вечара, засоўвалі на засаўку і замыкалі дзверы вязніцы; а 8-ай раніцы адчынялі і дазвалялі мужчынам увайсці ў жаночую камеру. Пазней прыносілі ў катле ежу для ўсіх, якой я не спрабавала, бо, дзякуючы шаноўным віленцам, мела цукар, гарбату і грошы на булкі. Гаспадарлівыя жанчыны распальвалі агонь у печы, а пасля выпальвання, згарнуўшы жар далей, ставілі свае гаршчкі, спачатку радамі — адзін каля другога, потым на двух гаршчках сподніх — адзін зверху, і так далей, аж пакуль печ не запоўняць; у тыя гаршчкі ўкладвалі ўсё, што мела стаць ежай, хто што меў і што хто хацеў улажыць, і потым засоўвалі печ жалезнай засланкай. У катле пры печы была гарачая вада. таму можна было заварыць гарбату, памыць посуд і бялізну. Я доўгі час жывілася адной гарбатай, бо да печы не магла б даступіцца, а зрэшты не мела найменшага апетыту. Смутак напаўняў мне душу; недахоп паветра, пастаянны рух і гоман кепска ўплывалі на маё здароўе; упала сіламі і атрымала кружэнне галавы. Аднаго дня пасля нашага прыбыцця ў астрог, у поўдзень, прыйшоў у вязніцу нейкі генерал, высакароднай паставы, ужо сівы, у суправаджэнні двух ураднікаў. Агледзеў камеру, праходзячы з аднаго канца ў другі, і пытаўся, ці каму з нас чаго трэба. Жанчыны з Ібян прасілі затрымаць іх у Маскве да прыбыцця мужоў, іншыя прасілі паведаміць, дзе іхнія мужы. Адзін з тых ураднікаў запісваў указанні генерала, а другі запісваў просьбы. Пасля выхаду генерала я даведалася, што гэта быў князь Абаленскі, цывільны губернатар Масквы, добры чалавек, які стараўся аблегчыць кожнаму цяжкую долю. Тады прыйшла мне думка таксама папрасіць князя пра некаторыя рэчы. Дастала кавалак паперы. чарніла і пяро і на простай, трохі памятай, паперы напісала па-французску роспачлівы ліст, выказваючы тую думку, што калі б ведала, што князь такі ж зверскі, як Мураўёў у Вільні, то прасіла б яго пра пазбаўленне мяне жыцця, для скарачэнне жудаснай нядолі, але ведаючы, што князь зусім іншы, прашу яго пакінуць мяне ў Маскве да прыезду маёй сястры, якая, як думаю, будзе неўзабаве выслана з Вільні; далей прасіла пра памяшчэнне мяне ў шпіталь, бо я хворая, і пра вызваленне маіх грошай, затрыманых наглядчыкам турмы ў Вільні. Падала тую просьбу на рукі ўрадніка, якога прыслаў князь, каб забраць нашыя просьбы; быў гэта чыноўнік для спецыяльных даручэнняў пры князі-губернатары. Назаўтра, здаецца а 9-й раніцы пачалі выклікаць тых, хто запісаўся ў бальніцу. Пасля іншых выклікалі і мяне і сказалі ісці ў канцылярыю шпіталя; прыйшоўшы туды пад эскортам жаўнера са зброяй, застала 12 крымінальніц у кайданах, я была трынаццатая. На від такой кампаніі я моцна перапужалася і пачала плакаць. Тады падышоў да мяне нейкі пан, пачаў мяне супакойваць і прасіць, каб не плакала.

Быў гэта француз, некалькі гадоў назад зняволены ў Маскве і няслушна падазраваны ў забойстве ўласнай жонкі. Сказаў мне, што таксама спачатку быў у роспачы, але гэта на нішто не прыдалося, цяпер у гэтай самай жудаснай вязніцы са спакоем і пакорай чакае свайго вызвалення. Прасіў мяне настойліва, каб супакоілася і не паддавалася роспачы. Не доўга чакала ў канцылярыі; можа, праз паўгадзіны адвялі мяне ў шпіталь, які ў параўнанні з астрожнай турмой зрабіў на мяне прыемнае ўражанне; нацёрты паркет, узорная чысціня пасцелі на ложках, ветлівыя наглядчыцы — толькі непрыемныя фізіяноміі жанчын, каля якіх мне ложка паказалі, рабілі мне прыкрасць. Адразу даведалася, што ў тым шпіталі ёсць і полькі, пасля таго, як перапранулася ў шпітальную вопратку, чаго вымагалі наглядчыцы, пайшла ў суседнюю палату, якая называлася камерай. Вельмі абрадавалася сустрэўшы там паню Станкевіч, маладую жанчыну, якая ехала з маладым мужам і малым дзіцем. Сустрэла гэтае панства ў Маскве і палюбіла, бо былі да мяне дабразычлівыя і ветлівыя; паколькі акрамя слабасці і прыгнечанасці я не мела іншых хвароб, таму не клалася ў ложка, а сядзела пры пані Станкевіч, даглядаючы яе патроху. У другой палаце знайшла яшчэ адну польку — Чарняўскую, ужо не маладую асобу і вельмі хворую. на трэці дзень майго ў шпіталі побыту здарыўся вельмі прыкры для мяне выпадак; рыхтавалі шпітальную бялізну для прання, а калі яе перад адданнем прачцы пералічвалі, забракла адной простыні; не могучы яе знайсці, мяне ў крадзяжы абвінавацілі. Наглядчыца, якую называлі нянечкай, напала на мяне вельмі разгневаная, загадваючы неадкладна аддаць скрадзеную прасцыню і грозячы суровай караю за зладзейства ў выпадку, калі не аддам, гаварыла з гневам, што я адна хаджу па палатах, таму ніхто іншы толькі я «прыўлашчыла» (сцягнула) тую простыню. Не маючы сродкаў для апраўдання, была ў вялікім страху, пад канец пры моцных росшуках страта знайшлася. Назаўтра прыйшоў у шпіталь князь Абаленскі і, наблізіўшыся да мяне спытаў па-французску, ці мне тут добра, сказаў, што ўсё, пра што я яго прасіла, будзе зроблена, і што, калі папраўлюся, буду мець лепшае памяшканне, хоць пра гэта не прасіла. Падзякавала. Віленская губернатарша Патапава, з дому Абаленская, прывезла ў Вільню памілаванне для прыгаворанага на смерць ксендза Ануфрыя Сурвіда, а калі нястомная ў сваіх дабрадзействах да няшчасных віленцаў памерла, то ўвесь горад яе аплакваў, і яшчэ сёння, хоць ужо з таго часу 40 год сплыло, удзячныя віленцы яе імя ўспамінаюць. Пасля выйсця князя Абаленскага наглядчыца з вялікай цікавасцю спытала, што князь гаварыў мне і што я яму адказвала. Была задаволеная, што я на яе не скардзілася і таму была да мяне вельмі ўважлівая. Праз два дні чыноўнік, які мой ліст, напісаны ў астрозе, уручыў князю Абаленскаму, прынёс мне 25 рублёў; я была пэўная, што гэта з Вільні мне іх прыслалі, але ён мне сказаў, што

гэта князь прыслаў гэтую квоту, пакуль не прыйшлі забраныя ў Вільні мае грошы, і прасіў распіску ў атрыманні, што я адразу і зрабіла…

З дазволу князя адведала мяне ў шпіталі знаёмая мне яшчэ ў дзяцінстве п. Эмілія Шукевіч, пляменніца с. п. Знанецкай, прыяцелькі маёй нябожчыцы маці.

Пані Эмілія была настаўніцай недалёка ад Масквы і прыехала ў горад, каб пабачыцца з нейкім знаёмым сваім у вязніцы, а даведаўшыся пра мяне ў астрозе, прыйшла мяне адведаць. Яна паведаміла пра мой побыт у Маскве майму шаноўнаму дзядзьку с. п. Тадэвушу Навіцкаму, а той высакародны дзядзька прыслаў мне на яе адрас 25 рублёў. Паведамленая пра тое, што мне з Вільні не аддадуць маіх грошай, прасіла князя Абаленскага прыняць прысланыя мне дзядзькам 25 рублёў. Праз некалькі дзён да хворай полькі Чарняўскай выклікалі ксяндза дзеля Пана Бога. Ад думкі, што хворая памрэ на чужой зямлі, авалодалі мной жудасныя пачуцці. Упала на калені перад дзвярыма палаты, у якой ксёндз спавядаў хворую, і забыўшыся на ўсё, што мяне атачала, уголас, заходзячыся ад плачу, звярталася да Пана Езуса, каб злітаваўся над намі, каб не даў нам памерці на зямлі непрыяцеляў нашых, каб успомніў пра заслугі продкаў нашых, каралёў і князёў нашых, якія ў Яго гонар у Вільні і ва ўсім краі ўзносілі цудоўныя святыні, сёння на цэрквы, казармы ці нейкія там склады перарамененыя, каб вярнуў нам свабоду і не дапусціў, каб косці нашыя былі ў паняверцы на непрыяцельскую зямлю кінутыя, а спачылі на родных нівах. Крычала ў роспачы:

— О, Езу! Езу! Божа, так шанаваны Пястамі і Ягелонамі, злітуйся, злітуйся над намі!

Боль раздзіраў сэрца пры той роспачлівай малітве, якую ніхто не перапыняў. Апамяталася ад голасу званка, які даў пачуць знак, што можам увайсці да хворай. Апомнілася ў той жа час і ўбачыла сакрыстыяна, залітага слязамі, які ўкленчыў каля мяне, і плакаўшую Станкевічыху. Адышоў пад канец слуга Божы. Пасля прыходу нябеснага Пана настала ціша. пакуты хворай палягчалі, але мяне боль не адпусціў. І сёння, як тады, сэрца маё разрываецца на від нядолі краю, пераследу ўраду, адсутнасці братняй, касцюшкаўскай любові паміж намі; на від таго пераследу і крыўд удоў і сірот, устае мне перад вачыма шэраг ахвяр, палеглых у паўстанні, павешаных, расстраляных, памерлых у вязніцах і на выгнанні, а Бацькаўшчына ўсё нясе свае цяжкія кайданы!

А цяпер вяртаюся ў шпіталь у Маскве. Маючы грошы, прысланыя дзядзькам, і агонь, распалены ў печы нашай палаты, прасіла жанчыну, якая прыслужвала хворым, купіць малака, цыкорыю і булак; прыгатавала цыкорыю на малаку без вады і разам з п. Станкевіч пачаставаліся той кавай, якая была нам вельмі смачная. Але вечарам таварышка мая адчула сябе ня-

добра, а ноччу вельмі захварэла. Калі пакліканая прыбегла да яе, застала яе крычаўшай:

— Паміраю, паміраю! Ратуйце, ратуйце!

Уражаная, я ўбегла ў пакой наглядчыцы з крыкам пра ратунак і доктара для хворай.

— Помилуйте, это невозможно звать доктора ночью в острожную больницу. (Злітуйся, пані, гэта немагчыма клікаць ноччу доктара ў астрожны шпіталь).

— Малю паню аб тым, — запрычытала, — ці ж можна пакінуць без ратунку, даць памерці маладой жанчыне, беднай польцы! Доктара! На праміласць Божую, доктара! Князь Абаленскі пахваліць пані за такі клопат!

Праз чвэрць гадзіны прыйшоў галоўны доктар са сваім памочнікам. Пасля распытвання хворай пастанавіў, што ёй зашкодзіла цыкорыя і што пасля прыняцця прапісанага лякарства паправіцца. Так і сталася; дзякуй Богу, наглядчыцы і пану доктару, які зусім не загневаўся, што яго выклікалі ноччу, хворая хутка выздаравела.

VI

Праз некалькі дзён мяне адвезлі ў Сушчэўскую частку (паліцэйскі ўчастак), дзе я застала дзвюх полек: пані Дызманьскую і панну Браніславу Вечаркоўскую. Першая — маладая ўдава і, падобна, заможная кабета, другая — нешчаслівая, хворая на галаву, якая жыла ў пп. феліцыянак у Варшаве, у альтанцы, у садзіку на першым паверсе, а на другім паверсе быў пакойчык, дзе жыла пані Тэкля Траханоўская, таварышка далейшага майго падарожжа з Масквы ў Томск. Траханоўская, не зважаючы на настойлівыя просьбы пп. феліцыянак, каб не ўлазіла ў справы, якія маглі б скампраментаваць яе перад урадам, і ў якія ім, манашкам, умешвацца было нельга, бо толькі на такіх умовах далі ёй у іх жыллё. Траханоўская кпіла з манашак і са слова ім дадзенага і выконвала без іх ведама нейкія даручэнні. У выніку гэтага прыйшлі раз жандары з паліцыяй для правядзення ператрусу, салдаты атачылі альтанку, а тут з акна выпаў гаршчок кветак з нейкай пад ім схаванай паперай Нацыянальнага ўрада, здаецца, з нейкім мандатам. Каля ног салдата, які стаяў унізе, аказалася гэтая папера, а паколькі гэта адбылося пад акном п. Вечаркоўскай, абвінавацілі яе ў стасунках з Траханоўскай і пасля допытаў і турмы выслалі на жыхарства ў Арэнбургскую губерню. П. Вечаркоўская баялася маёй кампаніі, са страхам глядзела на маю арыштанцкую вопратку і прыдумала сабе, што яе высылаюць па волі ксендза Дунаеўскага, пазней ксяндза-біскупа і кардынала кракаўскага. Пісала яна князю Абаленскаму лісты па-французску і высокім стылем апавядала пра свой без віны пераслед і маліла адаслаць яе ў Край. Князь узяў тую справу да сэрца і, выклікаўшы мяне ў другі пакой, запытаў, ці сапраўды ўсё так, як п. Вечаркоўская гаворыць? Я адказала, што нявінная п. Вечар-

коўская ў справе, у якой не толькі найменшага ўдзелу не брала, але нават пра яе не ведала, гэта праўда, але праўда ёсць таксама і тое, што хворая на галаву, і выказванні, якія робіць пра кс. Дунаеўскага, пра феліцыянак і пра мяне, ёсць ураенні хворай думкі. Князь дазволіў п. Вечаркоўскай паехаць у Цітаўскія казармы, каб пабачыцца з Траханоўскай і пагаварыць з ёй пра тую справу, бо ў камісіі гаварылі, што Траханоўская прызналася ў стасунках і знаёмстве з ёй. Не ведаю, што пазней з п. Вечаркоўскай сталася, узбуджала яна ў мяне літасць сваімі паводзінамі. Нейкі вязень, расеец, якога высылалі ў Арэнбургскую губерню за нейкае злачынства і які бегла гаварыў па-французску, моцна яе апякаў, і яна яму моцна давярала. Праз тыдзень выехалі мае таварышкі з Сушчэўскай часткі, а мяне перавезлі Цітаўскія казармы, дзе князь Абаленскі дазволіў мне застацца да прыезду сястры. Знайшла тут вялікую кампанію палітычных вязняў і паміж імі с. п. Вітольда Гажыца. Тут я пазнаёмілася з Тэкляй Траханоўскай, да якой прыязджала п. Вечаркоўская.

З Цітаўскіх казармаў дазволілі мне паехаць да касцёла, дзе мела шчасце выслухаць святую імшу, спавядацца і прыняць Пана Езуса (прычасціцца, *рэд.*). Таварыства знаёмых і знаёмства з п. Траханоўскай добра на мяне ўплывала. Я паважала яе як старэйшую векам, вышэйшую розумам, як тую, якая не паддаецца роспачы, а пры тым мае здароўе слабейшае, чым у мяне. Прыходзіў да нас часта Гажыц, быў да мяне вельмі дабразычлівы, мы з ім гаварылі адкрыта пра многія рэчы; быў бедалага прыгнечаны духам, спазнаўшы шмат інтрыг, пры тым яго асуджалі за здраду нашай справе, за тое што выдаў некалькі абывацеляў Лідскага павета, дзе быў цывільным начальнікам. Я не верыла таму, бо на няшчасце дапускаліся розныя падазрэнні і паклёпы, чым няшчасныя самахоць сваю нядолю павялічвалі. Гажыц быў праваслаўны, маці, падобна, — з уніятаў, аднак ён сваёй веры не любіў і ў наступнае жыццё не верыў.

Вельмі зычлівай да мяне была пані Ляшчынская, удава, добрая, лагодная і хворая кабета, а таксама яе знаёмая — вясёлая і энергічная асоба, прозвішча якой сёння не памятаю. У Цітаўскіх казармах быў адзін малады, шаноўны хлопец па імені Станіслаў, кухар па прафесіі. Ён прапанаваў мне, каб з яго дапамогай я занялася прыгатаваннем абедаў для таварышаў па падарожжы, я згадзілася на гэта, і ў час побыту нашага ў той вязніцы і пазней яшчэ ў дарозе аж да месца прызначэння Станіслава ў арыштанцкія роты некаторыя з нашых таварышаў мелі добрыя, здаровыя і не дарагія абеды, бо ішлося нам не пра заробак, а пра нейкі занятак і дапамогу таварышам. Станіслаў умела ўзяўся за працу, пакупка патрэбных прадуктаў ніякай цяжкасці не ўяўляла, бо мяса, масла, рыбу розных гатункаў, словам, усё, што толькі патрэбна было, мы мелі ад перакупшчыкаў, якія сядзелі пад брамай вязніцы. Станіслаў гатаваў і выдаваў абеды. Я вяла рахункі і распараджалася грашыма.

Мы жылі разам, п. Траханоўская і я, і хоць абедзве былі ўжо не маладыя, бо я мела 35 гадоў, а яна яшчэ на 10 гадоў старэйшая за мяне, прытым праўдамоўная і патрабавальная, гарнуліся да нас маладыя людзі, якія адчувалі недахоп сямейнай зычлівасці дамашняга агменя. Кожны з іх меў за сабой балючую мінуўшчыну, а што за будучыня іх чакала? Марнавалася велізарная колькасць моладзі: так, напрыклад, два браты Левандоўскія — Канстанцін і Мечыслаў, студэнты ўніверсітэта — на месцы ссылкі працавалі ў шынку; п. Юзаф Сільванд, студэнт апошняга курса ўніверсітэта ў Пецярбургу — нейкі час працаваў на вёсцы ў мужыка, потым недзе ў іншым месцы за вучэнне дзяцей далі яму жыллё ў кухні і нейкую спажыву, але і ў тым яму хутка адмовілі, бо ім здалося, што занадта мала для іх умеў. І так многія з той прыгожай, добрай моладзі, якая магла б сабе светлую будучыню наваражыць, мусілі здольнасці свае закопваць у неадпаведнай іх прызванню працы. Калі сёстры-віленкі даведаліся, што я займаюся кухняй і што мне не хапае вопраткі, прыслалі для мяне адпаведныя рэчы: былі там фартухі, ватовая алжырка з дамашняга сукна, у белыя паскі з блакітным, трохі бялізны, спаднічку з кафтанікам, гарусавы каптурык на галаву, вялікі парасон ад дажджу, кніжкі для набажэнства: «Вастрабрамскі алтарык», «Прыклад Пана Езуса» і да т. п. Я не магла даведацца прозвішчы асоб, якія мне гэта прыслалі, але былі яны тыя самыя, якія бралі чынны ўдзел у вітанні мяне, калі вярталася. Якая я ўдзячная тым шаноўным віленкам за памяць пра мяне, пра майго бацьку, які цярпеў у вязніцы, пра маю сястру Антаніну, якая, бедалага, прабыла 15 месяцаў у турме. Найперш чатыры месяцы ў цытадэлі, у вільготай, цёмнай камеры, без змены вопраткі, і так, як была апранута пры арышце летам, так чатыры месяцы прабыла, потым трапіла ў яшчэ горшую Дамініканскую турму, а потым яшчэ на некалькі месяцаў яе замкнулі ў сакрэтную. Ад тых высакародных віленак мелая яна толькі за Божую ласку апеку. Няхай іх за гэта неба ўзнагародзіць. Князь Абаленскі быў нястомны ў сваёй апецы над намі, падчас, калі іншыя ўрадоўцы высокага рангу часта карысталіся паслугамі сваіх падуладных, ён сам заўсёды кожны дзень у розны час прыходзіў да нас, заўсёды прыносячы нам магчымыя палёгкі. Прыходзіла да нас часта пані Ганчарова, якую мы памылкова называлі паняй генеральшай, залатвіла яна пакупку рэчаў, патрэбных для вопраткі, таму і я, даючы ёй 7 рублёў, прасіла купіць якое-небудзь цёплае футарка і галёшы. Купіла мне салопку на футры з шэрага зайца з чорным кацiным каўняром і цёплыя галёшы, магла я ўжо неяк так, нібы трошкі лепей прыадзецца і кажухом не карыстацца. Пасля гэтага ўсяго роспач мая пачала ўступаць месца хрысціянскай пакоры, а думка пабачыць сястру пры пераездзе, а можа і злучэння з ёй на далейшае падарожжа была маёй наймілейшай марай. Не раз у сне выгуквала: «Антося! Антося!», — з-за чаго разбуджаная пані Тэкля адразу назаўтра мяне пытала, якога гэта я Антося

клікала. Дакучала яна мне не раз нейкімі падазрэннямі, не верыла або не хацела верыць, што я пра тое, як казала, глупства для сябе ніколі не думала, маючы пакліканне настаўніцы, як капланкі, дадзенае мне ад Бога. Бо калі б і мела калі нейкія мары выйсці замуж, ці ж на гэта тады быў час і становішча, мне так збалелай, нешчаслівай, так нядоляй сям'і маёй і Бацькаўшчыны прыгнечанай у такія пустыя мары ўдавацца? Але немагчыма было паню Тэклю пераканаць, маўчанне мусіла быць адзінай абаронай. Тым часам найнеспадзяваней дайшла да нас вестка, што нам усім: мужчынам, жанчынам і дзецям загадана выехаць. І гэта быў загад нашага тагачаснага апекуна князя Абаленскага. Трое таварышаў нашых уцяклі, і ў выніку гэтага ўсіх іншых загадалі выслаць. Кожны лёгка адгадае мае і пані Тэклі страхі, калі пра гэта даведаліся. У Маскве мы былі ад паловы лістапада да 5 сакавіка 1864 года. Нельга і так было б вымагаць даўжэйшага побыту ў Маскве; калі б не гэты выпадак, пачакалі б, можа, яшчэ пару тыдняў да паляпшэння дарогі, цяпер аднак трэба было пагадзіцца з лёсам і паўтарыць у думках: «Такі лёс выпаў нам, сёння — тут, заўтра — там». Песенька, якую нашыя таварышы хорам па дарозе і пры выездзе з этапаў спявалі. Выязджаючы з Цітаўскіх казармаў развіталіся са шчырым жалем з п. Ляшчынскай і іншымі таварышамі. прыгаворанымі на пасяленне ў еўрапейскай Расіі, і падаліся з п. Тэкляй на ўказаныя нам вазы. Таварыства наша складалася з маладых людзей, апранутых у кажухі і брадзяхі з каляровымі латкамі на плячах. Былі яны прыгавораны да пасялення ў Сібіры з пазбаўленнем усякіх правоў, да катаржных работ або ў арыштанцкія роты. Смутны вобраз узнік перада мной пры выездзе з Цітаўскіх казармаў, але не было часу на роздум, трэба было хутка сядацца на высокі воз, наладаваны рэчамі, і добра трымацца, каб не зляцець, што пры фатальнай дарозе і вялікіх выбоінах магло лёгка здарыцца. Везлі нас хутка, каб не спазніцца на адыходзячы цягнік; кабеты крычалі, калі сані правальваліся ў глыбокія выбоіны, дзеці плакалі; даехалі мы аднак да вакзала без ніякага здарэння, але страшна абляпаныя граззю. На чыгунцы афіцэр, які з намі прыехаў, выказваў літасць да жанчын, размяшчаў іх як мага найлепей, а п. Тэклю і мяне размясціў у вагоне, прызначаным для яго і салдатаў; даў мне на падсцілку сваё футра і падушку, то я неўзабаве, заснуўшы смачна, некалькі гадзін праспала. А першай гадзіне ночы спыніліся ва Уладзіміры на Клязьме, дзе цягнік затрымаўся на тры чвэрці гадзіны, пасля чаго паехалі ў Ніжні Ноўгарад. З чыгуначнага вакзала адвезлі нас у астрожную турму, якая называлася «Перасыльнай»; адтуль этапным шляхам высылалі вязняў у далейшае падарожжа на Сібір. Каб дабрацца да вязніцы, трэба было перапраўіцца цераз раку, дзе ўжо ў многіх месцах вада стаяла на лёдзе. Караван наш быў велізарны; жанчыны і слабейшыя мужчыны ехалі на вазах, мацнейшыя разам з жаўнерамі ішлі пеша. Кацап, які вёз пані Тэклю і мяне, апавядаў нам, як уласна ў гэтым

месцы ўтанула нядаўна некалькі чалавек; таму страх быў агульны, дзякуй Богу — цераз раку шчасліва перабраліся. Нарэшце прыязджаем мы на этап, але паколькі перад выездам нашым з Масквы не прыйшло сюды ніякага распараджэння, мы мусілі доўга чакаць на санях, пакуль нас упусцяць, і так таго першага, так нас даўней пужаўшага этапа мы чакалі цяпер з нецярпеннем, і калі ўжо дзверы ў яго адчыніліся, то, хто мог, бег, каб чым найхутчэй размясціцца, кожны пачуваўся змучаным і патрабаваў адпачынку, асабліва тыя, якія прамоклі, пеша ідучы цераз Волгу. Пра нас ніхто не думаў, і нічога дзіўнага, кожны з нас пачаў тое, страшнае самім аповедам, этапнае жыццё, тое жыццё, у якім кожны быў асобна адарванай адзінкай і мусіў думаць толькі пра сябе і не зважаць на іншых. Гэта звычайна называецца эгаізмам і ёсць дзіцем крайняй нядолі і вынікаўшай з яе маральнай галечы. Нехта нарэшце дапамог пані Тэклі залезці на нары, я, здаецца мне, сама на іх узабралася; п. Тэкля размясцілася ў куточку пры сцяне, далей я, а за мной п. Пётр Янкоўскі, з якім я пазнаёмілася ў Місіянерскай турме ў Вільні. П. Пётр Янкоўскі, хочучы дачакацца аднаго з калегаў, які заставаўся яшчэ ў кскс. місінераў у Вільні, застаўся ў Ніжнім Ноўгарадзе. Нары і этапы незвычайны стрэс у мяне абуджалі, таму я вырашыла ехаць на месца майго прызначэння без затрымкі ў дарозе. Гэтыя нязносныя этапы і нары пасля заваявання Сібіры былі пабудаваны для расійскіх цывільных і палітычных злачынцаў; ад часоў царыцы Кацярыны пачалі там размяшчаць і няшчасных палякаў, як у месцах адпачынку, пастаўленых па дарозе.

П. Тэкля намагалася застацца ў Ніжнім Ноўгарадзе; шмат жанчын з простага люду таксама хацела чакаць на мужоў. Прыкра мне было адной ехаць, але мусіла. Напіўшыся гарбаты, прыгатаванай адным з таварышаў, развіталася з усімі і пайшла сядацца на воз.

Чакаючы некалькі гадзін на вывазку нас на другі этап, бачачы, што аказалася адна сярод мужчын зусім незнаёмых і чужых, паддалася смутным думкам, поўнаму сумненню. Бо зніклі падманныя надзеі вызвалення Бацькаўшчыны з няволі, паўставалі мне перад вачыма ўсялякія пераследы, уся нядоля нашага Краю пасля паўстання, прыгавор для 300 000 чалавек з розных сфер нашай супольнасці на змарнаванне па турмах, этапах і ў Сібіры. Любімы мой бацька, пакінуты ў турме, уся сям'я, поспех якой быў маім шчасцем, зруйнавана, і маё ўласнае становішча ахвоты да жыцця не дадавала. Пагружаная ў такія думкі, найнеспадзяваней убачыла некалькі жанчын з простага люду і п. Тэклю, якіх вялі на выезд, бо старанні іхнія застацца ў Ніжнім Ноўгарадзе аказаліся бевыніковыя. Уцешылася іхнім відам і шкадавала, што аддавалася непатрэбнаму смутку, забыўшы, што воля Бога ўсім кіруе, што Бог пасля непрыемнасцяў суцяшэнне пасылае і што ніколі не пакідае тых, хто ў яго веру мае. Ад Ноўгарада сунуліся далей і далей амаль без ніякіх змен,

заўсёды ў адным парадку, робячы па 20 вёрст у дзень і адпачываючы на этапах.

Звычайна перад выездам з этапа будзілі нас вельмі рана, перад усходам сонца, а потым па некалькі гадзін на возе чакаць загадвалі. На этапах заўсёды тыя самыя нязручнасці; голаду толькі не было, бо маючы гарбату, ад часу да часу малако, яйкі і мяса, выжыць можна было. Пасля прыбыцця на этап адразу парадкавалі сабе месца для сну. Часта здаралася, што афіцэр уступаў нам свой пакой на этапе, дзе мы з п. Тэкляй размяшчаліся, даючы яшчэ месца некалькім мужчынам. Афіцэр праводзіў ноч паблізу ў сваіх знаёмых ці падначаленых. П. Тэкля, як варшавянка, не была пазбаўлена сваёй вопраткі, пры тым мела пасцель у валізцы, з чым зручней было ёй падарожнічаць. Прыбыўшы на этап, даставала з валізкі дыванок, на які клала пярыну і падушкі і пасля малога падсілкавання забіралася на спачын. Драўляная скрынка і валізка былі маім ложкам; прысланая мне віленкамі падушка з вялікай хусткай і бурка былі добрай пасцеллю, на якой, калі толькі не было насякомых, спала выдатна.

На пятым па чарзе этапе, дзе мы мелі двухдзённы адпачынак, пабудзіла мяне ў першую ноч моцнае, колькікратнае пастукванне ў маёй скрынцы; мала зважаючы на тое, заснула неўзабаве нанава. На другую ноч былі такія моцныя ў скрынку ўдары, што аж ложка пані Тэклі затрэслася; прачнулася п. Тэкля і спаўшыя ў тым пакоі паны і запалілі свечку, аказалася, што аднаго з паноў схапілі канвульсіі, перапужаныя таварышы ўбачылі яго з тварам, уткнутым у падушку; малады гэта быў і моцны мужчына, з цяжкасцю ўдалося яго падняць, уся падушка была заліта крывёю, мог бы задушыцца, каб яго яшчэ на некалькі хвілін так пакінулі.

Мы з паняй Тэкляй не заўсёды разам ехалі, пры кепскай дарозе асобна было нам выгадней, тым больш. што п. Тэкля часта патрабавала мужчынскай дапамогі — прызвычаеная да выгодаў, старэйшая ўжо векам і слабога здароўя з цяжкасцю пераносіла такое падарожжа на Сібір. Са мной нейкі час ехаў пан Юльян Дзядзюль, малады, добры чалавек, у дарозе распавядаў мне пра сваю маладую жонку, з якой мусіў расстацца, падтрымліваў воз, каб не перавярнуўся і мяне, каб не вылецела, ва ўсім зычліва мне дапамагаў. Зычлівымі таксама для мяне былі паны Ігнацы і Пётр з нашага павета, лідзяне; п. Напалеон Враноўскі, малады і прыстойны маладзён з Каралеўства Польскага, які доўгі час складаў у дарозе кампанію п. Тэклі, а ехаў у Табольскую губерню, прыгавораны да пасялення з пазбаўленнем шляхецтва. На сёмы дзень нашага падарожжа мы спыніліся ў Васілііі-Шурскім, павятовым горадзе Ніжне-Наўгародскай губерні, тут мы мелі днёўку. Спраўнік быў такі ветлівы, што дазволіў мужчынам прабыць той дзень у горадзе, у тамтэйшых жыхароў, а нам з п. Тэкляй не толькі свае два пакоі саступіў, але яшчэ даў каня для перавозкі нашых рэчаў. Такі адпачынак у выгадным. чыстым памяшканні быў для нас вялікім дабрадзействам;

не на зямлі седзячы, як звыкла, а за столікам у кампаніі паноў Маргевічаў і Н. Враноўскага пілі гарбату. Дзве ночы мы там прабылі, пазней нас павезлі далей. Дарога была кепская, этапы агідныя. Пераехалі мяжу Ніжне-Наўгародскай і Казанскай губерняў, дзе слуп з гербам Казані (алень з бронзы) тую мяжу паказваў. Дагэтуль везлі нас чарамісы, люд, які адрозніваўся ад расейцаў вопраткай і мовай. Прымушаныя адступнікам Юзафам Сямашкам прыняць праваслаўе за часы цара Мікалая I, чарамісы кепска гавораць парасійску, жанчыны апранаюцца, як мужчыны, носяць кашулі, спушчаныя на шаравары; наверх апранаюць капоты, гладкія спераду і фальдованыя ззаду. Спадніц зусім не носяць, а доўгія боты і нязграбна завязаная на галаве хустка дапаўняюць строй. Жанчыны, як і мужчыны, зусім не грашаць прыгажосцю.

Далей мы мелі вёску чувашоў, тыя самі не ведаюць, якой яны веры, гавораць, што вераць у рускага Бога, моляцца ў рускай царкве, а святкуюць пятніцы. Чувашы яшчэ брыдчэйшыя за чарамісаў. Жанчыны носяць шапкі на галовах, у вопратцы не адрозніваюцца ад мужчын, толькі што на шыі вешаюць металічныя манеты заміж пацеркаў. Усе нас шкадавалі, называючы невінаватымі і няшчаснымі. У Васілііі-Шурскім я хадзіла гатаваць есці да адной кабеты: маленькі пакойчык з перагародкай, чысцютка і ўзорна трыманы, усё кухоннае начынне як найстаранней памыта, уладальніца ветлівая, гасцінная, гаварыла, што мае да палякаў вялікае спачуванне, дапытвалася пра прычыны нашай высылкі і расплакалася, слухаючы маё апавяданне. Была гэта ўдава з чацвёркай дзяцей, бедная, але працавітая і парадачная жанчына; прыйшоўшы першы раз да яе застала яе піўшай гарбату з разынкамі заміж цукру, чым і мяне адразу пачаставала.

Пазней мы мелі два дні вельмі кепскай дарогі і гаротнае жыццё ў этапных памяшканнях. Нарэшце спыніліся ў мястэчку Чабаксары Казанскай губерні. З-за кепскай навесну дарогі і разліву рэк трэба было на нейкі час заставацца ў Чабаксарах. Мы атрымалі пакой у нейкага адстаўнога салдата з грубаватым абыходжаннем, размясціліся неяк так з паняй Тэкляй, я была два дні хворая на горла; жонка салдата, была трохі больш гжэчная за яго, прыслужвала нам, падавала самавар, хоць мы адмаўляліся ад таго, але яе настойлівасці мусілі ўступіць, на кепска нам гэта выйшла, бо пры выездзе ўсе дні былі палічаны і за ўсё заплаціць сказана, што нас амаль зруйнавала. У дзень Звеставанння Н. П. Марыі глыбокі смутак мяне агарнуў: летась у сваім краі з любімай сям'ёй гэтае свята адзначала — сёлета дзе я ёсць, а праз год дзе буду?

Наша мужчынскае таварыства было памешчана ў этапе, частаколам абгароджным. Ажывілася тут наша моладзь, хадзілі па падворку, спявалі польскія песні, развесяліла іх вясновае сонца і тое, што за частакол часам па двое — па трое з салдатам ім выйсці дазвалялі. Мы нудзіліся і моцна сумавалі, асабліва я, бо ніякай работы мець не магла. У Чабаксарах нічога ку-

піць нельга было, нічога для чытання мы не мелі, адзіным заняткам маім было гатаванне нейкай яды, пра якую я ніколькі не клапацілася, бо найменшага апетыту не адчувала. Непакоілі мяне ўспаміны пра бацьку, пакінутага ў вязніцы, пра ўсю сям'ю, сэрца рвалася да іх, мучылі згрызоты сумлення, што бацьку свайго пакінула, будучыня ўяўлялася як пропасць для ўсяго народа нашага як для выгнанцаў, так і для тых, хто застаўся ў Айчыне пад уладай Мураўёва і яму падобных. Сны мае, у якіх, як у люстэрку, адбіваліся дзённыя перажыванні, былі таксама жудасным спадарожнікам з нядоляй і з роспаччу, што з яе вынікала.

Даведаліся нарэшце, што маем пакінуць Чабаксары. Фурманкі, якія тут называюцца падводамі, стаялі ўжо другі дзень да нашага вывазу падрыхтаваныя; брацці нашыя пастанавілі патрабаваць і прасіць улады ў Казані, каб прызначылі больш як чатыры капейкі штодзень на пражыццё, і не хацелі выязджаць без задавальнення іхняй просьбы, гаворачы, што пры такім ліхім жыцці сіл не маюць для далейшага падарожжа. Этапны начальнік, афіцэр, які нас суправаджаў, і начальнік інваліднай каманды ўжывалі ўсялякія спосабы, каб нахіліць іх да выхаду, але нашы пастанавілі трымацца на сваім. Правадыр нашай партыі, якога называлі старастам, п. Сломскі агульнае жаданне выказаў. Назвалі яго за гэта зачыншчыкам і гразілі кайданамі, калі будзе ўпарціцца. Два разы тэлеграфавалі ў Казань, адказу не было. Этапны і інвалідны начальнікі даставілі для страху кайданы і роту ўзброеных салдат; сышлося многа люду, хацеўшага паглядзець на сцэну, якая мела адбыцца з палякамі. Калі б у той час каторы з нас адазваўся не гжэчна, або гнеўна павысіў голас, без сумнення быў бы закуты ў кайданы, але ўсе найспакойней, найгжэчней і аднадушна адказвалі, што не збіраюцца бунтаваць і таму толькі выйсці не могуць, што сіл няма. Начальнікі адказалі, што гэта «дваране» ва ўсім вінаваты, бо просты люд не бунтуе, таму дваране будуць за гэта пакараны. Вербную нядзелю і вялікі панядзелак мы прабылі ў Чабаксарах у грунтоўнай падрыхтоўцы да падарожжа. Нарэшце пасля трохтыднёвага там побыту, у вялікі аўторак мы выехалі ў далейшае падарожжа, маючы абяцанне чыноўнікаў, што ўлада зробіць усё, што зможа, каб мы мелі большыя кармавыя. Надвор'е вясенняе, не кепскае, вазок не трасецца, таварыш мой п. Дзядзюль у добрым гуморы, таму ехалі шпарка і не заўважылі, што зноў этап наблізіўся. На этапе, дзе не палілі, было вельмі холадна; галава і зубы ў мяне разбалеліся, мела гарачку і не магла спаць. Назаўтра адбылася нейкая замінка з фурманкамі, мы доўга іх чакалі, затое потым без адпачынку праехалі дзве станцыі 19 і 30 вёрст і познім вечарам спыніліся на начлег. Вялікі чацвер, вялікую пятніцу і вялікую суботу мы былі ў дарозе, у якой спазналі розных прыгод і прыкрасцяў. Плылі Волгай сем вёрст, надвор'е было ціхае і мілае, калі б у іншым месцы і ў іншых акалічнасцях, у такім шаноўным таварыстве было б прыемна, цяпер жа ні на што не зважалі, усе да ўсяго былі абыякавыя. Стараста

маёй партыі п. Рытвінскі паставіў самаварчык і пані Тэклю, мяне, а таксама некалькі калегаў частаваў гарбатай. Аказаліся нарэшце на беразе, на высокай гары павятовы горад Свяжск падаўся нам прыгожым; два паны ўзвялі мяне на гэтую стромую гару, але так была змучаная, што ледзве магла аддыхацца. Тут чакалі нас дзве роты салдат, прысланых для супакаення нашай партыі, і два ці тры афіцэры. Капітан Пузына, добры чалавек, дазволіў перад выездам пані Тэклі і мне зайсці ў рэстаран на снеданне, і так быў пры гэтым памяркоўны, што не даў нам жаўнераў для нямілага таварыства, але сам іх замяніў. Выйшаўшы ў горад, купіла ўсяго, што мне магло быць патрэбным для пячэння, якое я збіралася спячы ў Казані для таварышаў падарожжа. Тым часам у Казань мы дабрацца не маглі, бо Волга разлілася на некалькі вёрст. Са Свяжска мы выехалі а 9-й раніцы, ішоў моцны дождж. Мы прыбылі на халодны этап, дзе прамоклыя да ніткі нават абсушыцца не маглі, і так, зусім не распранаючыся, мы з паняй Тэкляй леглі спаць. Была так моцна стомленая, што не магла спячы да гарбаты нейкага пячэння, каб несумненна таварышам зрабіць прыемнасць. Прыйшло мне ў галаву, як летась праводзіла гэтае свята ў доме майго бацькі з сёстрамі і дамашнімі. Мы былі на разарэкцыі ў васілішкім касцёле, і ўжо там усіх агарнуў смутак, што ўжо не было паміж намі шаноўнага кс. пробашча Сырвіда. Ён заўсёды ў гэты дзень адпраўляў набажэнства, прамаўляў казанне падчас сумы і складаў любячым яго парафіянам свае найлепшыя зычэнні, а потым запрашаў на свянцонае. У гэтым годзе быў ксёндз-пробашч у вязніцы, у руках Мураўёва, а таварышы яго, калегі Станіслаў Ішора з Жалудоцкай парафіі, Рамуальд Зямацкі — ваверскі пробашч і Адам Фалькоўскі — пробашч з Ішчалны былі расстраляны. (Ксёндз Станіслаў Ішора малады, не меў і 30 гадоў, пасля прачытання Маніфеста Нацыянальнага ўрада выехаў быў з дому, але калі праз некалькі дзён ксёндз-пробашч быў арыштаваны, у той жа час вярнуўся аб'явіць, што без ведама і волі пробашча гэта зрабіў. Ксёндз Зямацкі і ксёндз Фалькоўскі самі прачыталі маніфест, за што першы ў Вільні, другі ў Лідзе былі расстраляны. Ксёндз Ануфры Сырвід памёр у Спаску ў Тамбоўскай губерні.) Прыпомніла сабе, як у мінулым годзе пасля набажэнства падышла да мяне п. Стэфанія Юльянава П. і дрыготкім ад страху голасам прамовіла: «Ці ведаеш, што наш абаронца, вызваліцель Людвік Нарбут разбіты пад Новым Дваром! Ян Францкевіч быў у Новым Двары, чуў стралянінy і гэтую сумную вестку нам прынёс!» Лёгка ўявіць, як хутка гэтая вестка ўсіх дасягнула і ўсіх уразіла. Не чакаючы на бацьку і сясцёр я вярнулася дадому каламажкай, на якой бацька да касцёла прыехаў, і адразу падалася на вёску шукаць шаноўнага і нашай справе адданага Юзафа Ляпешу і з ім разам падацца на месца бітвы і спраўдзіць вестку пра яе вынікі. Не застаўшы аднак Ляпешы дома, вярнулася да сябе, падрыхтавала свянцонае для сям'і і для службы, а з касцёла над'ехаў бацька разам з сёстрамі. Зрабіў мне бацька вымову, што яму нічога не сказала пра мой ад'езд; заня-

ты пошукамі мяне па касцёле не даведаўся нават пра дайшоўшую да ўсіх сумную вестку. Пры дзяленні свянцоным яйкам са слязамі віншавалі мы самі сябе з тымі святамі, маючы на думцы такую грозную і няпэўную будучыню, якая нас чакала. Пасля свянцонага і кавы бацька пайшоў спачыць у свой пакой, а мы з сястрой Антосяй паехалі з яго дазволу да суседзяў Араноўскіх. Але тое непераадольнае жаданне даведацца пра лёс Нарбута і яго таварышаў папхнула нас у Новы Двор. аддалены ад нас на дзве з паловай мілі.

Там ад ксяндза пробашча Райцэвіча, які нас ветліва і ласкава прыняў, даведаліся пра ўдалы вынік бітвы і паспяшаліся дадому падзяліцца з бацькам той жаданай ведамасцю. Уцешыўся стары тым, што ад нас пачуў, і не гневаўся, што мы яго на так доўга аднаго пакінулі. А цяпер што за свята! Бацька мой і сястра ў вязніцы, я ў падарожжы на Сібір, у абрыдзелым этапе. Занятая такімі думкамі, доўга не магла заснуць. На досвітку калегі заспявалі Алялюя. Не маю слоў, каб выказаць тое, што ў гэтую хвілю адчула. Плакала горка, маючы перад вачыма мінуўшчыну, цяпершчыну і будучыню. О, колькі ж многа чалавек перажыць і перанесці можа!... Потым прыйшлі калегі павіншаваць нас са святам, з тых 30 чалавек, якіх я сталавала ў Чабаксарах, з'явіўся толькі адзін малады хлопец, Антоні Урбасевіч, студэнт Маскоўскага ўніверсітэта, вельмі пачцівы і высакародны, з якім шмат размаўлялі пра яго сям'ю; паказаў нам фатаграфію сваёй сям'і і кніжку для набажэнства, якую заўсёды насіў у паперу абгорнутую і трымаў у вялікім шанаванні. Іншыя яго калегі пасаромеліся прыйсці, не маючы іншай ад дарожнай вопраткі. П. Тэкля зрабіла мне вымову, што спраўдзіліся яе перасцярогі, што тыя панове не цанілі зусім маёй працы; можа быць, але я заставалася на тым, чаго шукала, г. зн., каб у працы мець забаву і асалоду ад прыкрага жыцця. Не я адна была ў той дзень сумная, у многіх мужчын ад думак пра сям'ю, прыяцеляў і сваякоў балючая сляза ўпала. Пан Рытвінскі з балесным уздыхам паведаміў: «У мінулым годзе меў маці, цяпер яе не маю». Правялі з паняй Тэкляй той дзень за гарбатай з добрымі вяршкамі і калачамі; на другі дзень, маючы мяса і ўсё, што трэба для печыва, занялася з дапамогай шаноўнага кухара Станіслава прыгатаваннем абеду на 30 чалавек. Аднак вялікія прыкрасці спазнала ў даставанні дроў і патрэбнага начыння, бо ва ўрачыстае свята ўсе жыхары былі п'яныя. Паўдня ў кухні прабыла, галава мне разбалелася, а таварышы былі незадаволеныя, бо з абедам спазнілася.

На другі дзень, не маючы ўжо патрэбных прадуктаў і жадаючы заняцца рамонтам зношаных рэчаў, апавясціла таварышаў, што абедам заняцца не магу. Скончыўшы свае заняткі, чытала трохі гісторыю Бантка, якую мне пазычыў п. Урбасевіч.

Назаўтра мы паплылі параходам у Казань; дзень быў пагодны. Волга шырокая і паўнаводная, кампанія выдатная. Не мелі аднак яе берагі і яна

сама такой для нас прыгажосці, як нашы любімыя рэкі. Лясы зеленню яшчэ не пакрытыя, вёскі смутныя, без садзікаў рабілі на нас прыкрае ўражанне. Калі мы прыбылі ў Казань, наглядчык, нейкі падпалкоўнік, сустрэў нас з суровай, грознай мінай і выказаўся такім чынам:

— На бунты ёсць у мяне кайданы і розгі.

П. Тэклю і мяне загадаў замкнуць асобна; праз нейкі час афіцэр, які суправаджаў нашую партыю і таму называўся намі парцыённым, прыйшоў да нас і выклі-каў мяне да наглядчыка, які стаяў за некалькі дзясяткаў крокаў ад яго. Не хочучы быць яму паслушнай, сказала, што хворая і прашу, каб палкоўнік сам паклапаціўся да мяне падысці. Падышоў і гнеўна сказаў:

— Ступать сейчас же и не разговаривать! (Ісці цяпер жа і не размаўляць).

Разгневаная на яго, сказала, што прыйду, калі рэчы збяру. Калі я прыйшла на месца выкліку, з'явіўся праз хвілю палкоўнік і, звяртаючыся да мяне, сказаў, што ведае ад парцыённага афіцэра, што добра сябе паводзіла і што адукаваная, а на п. Тэклю, звярнуўшы строгі погляд, закрычаў, што гэта яна ўсю партыю бунтавала ў Чабаксарах, што я магу выходзіць на дзядзінец, а ёй нельга, і паўтарыў грозна пра кайданы, розгі і нейкія чаравікі. Бедная п. Тэкля так перапужалася, што аж прыхварэла.

VII

У Казані мы знайшлі трыццаць шэсць браццяў-варшавякаў з ліку тых, што ў Варшаве за ўдзел у арганізацыі публічным судом былі прысуджаны ў войска, але за тое, што не хацелі прынесці прысягі цару, былі прысланы пад вайсковы суд у Казань. Тут, прыгавораныя на два месяцы на хлеб і ваду, сядзелі ўжо некалькі месяцаў у Казані, заўсёды цвёрдыя ў сваім пастанаўленні, прымусілі ўлады моцным супрацівам і энергічнымі выступленнямі да стварэння ім патрэбных умоваў; выламалі дзверы турмы, збілі аднаго з прыгнятальнікаў, аблаялі астатніх. З тога часу дазволілі аднаму з вязняў выходзіць штодзень у горад для залатвення патрэбных пакупак. Жывуць яны вельмі ашчадна; для захавання свабоды думак і разнастаення часу вынайшлі сабе забавы і працу. Арганізавалі гімнастыку, вучаць мовы, словам не бяздзейнічаюць, а такім спосабам перамагаюць нуду. З уладамі трымаюцца адважна, з годнасцю, так што паважаюць іх і наглядчыкі. Спраўныя гэта, энергічныя і шляхетныя маладзёны. Пасля нашага прыбыцця адразу пазнаёміліся з намі, атачылі нас увагай і дапамагалі ў залатвенні нашых патрэбаў. Падзівіліся мы з паняй Тэкляй на іх развазлівасць і шляхетнасць характару. Як толькі мы прыехалі, адзін з іх пан Віткоўскі паставіў самавар і сам яго нам прынёс; другі раз зрабіў такі ветлівы ўчынак п. Антоні Цішэўскі. П. Тэкля знайшла ў іх зычлівых братоў, то таксама выступала перад імі, як перад старымі прыяцелямі, апавядала пра прыкрасці, якія ў няшчасным падарожжы ад таварышаў і ад уладаў

спазнала; акрыяла бедалага трохі духоўна. Раптам нам паведамілі, што маем выязджаць. Я, не прадчуваючы такога раптоўнага выезду, рыхтавала сабе абед і ўласна, калі павернутая да агню ў нашым пакоі смажыла кавалак мяса, пачула нейкі нязвыклы рух і незнаёмыя галасы, кінула свой занятак і ўбачыла салдатаў са зброяй, крычаўшых:

— Ступайте сейчас же! Убирайтесь прочь! (Выходзьце зараз жа! Вон!)

Як найхутчэй сабралася на выхад, праз некалькі хвілін мы былі ўжо ўсе на дварэ і ўбачылі ўзброеных салдатаў з нейкім лысым афіцэрам, сапраўдным д'яблам, на чале. Быў гэта экспедытар. З ім то і пайшлі жаўнеры ў другі дом для адпраўкі пазасталых з нашай партыі. Там знайшлі моцны супраціў, шаноўныя варшавякі з запалам баранілі сваіх братоў, а калі адзін з жаўнераў ударыў прыкладам вязня, атрымаў за тое ў зубы, дайшло да бойкі. Удары жаўнераў не былі моцныя, загадалі ім, напэўна, толькі настрашыць вязняў; ніхто не быў ні забіты, ні паранены. Для супакаення вязняў выклікалі губернатара; ён сам не прыйшоў, але прыслаў свайго ад'ютанта; нашы браты падалі яму скаргу, што ўжо тры дні не даюць нам кармавых і да т. п. Пан Ілініч, малады хлопец, выступіў ад імя ўсіх, просячы меру справядлівасці, якой не знае маскоўскі ўрад; калегі ацанілі яго добрае жаданне, але прамовай яго не былі задаволеныя. Лысы экспедытар быў вельмі перапужаны і не мог схаваць свайго страху. Ад'ютант як бы не разумеў, што яму гавораць, намагаўся выйсці, але яму заступілі дарогу. Пры ім пан Карызна аблаяў экспедытара, і скончылася на тым, што выпусцілі двух арыштантаў: ліцвіна і караняжа, для якіх розгі ўжо былі падрыхтаваны. Пры адходзе афіцэра высунуўся недарэчы адзін з маладых людзей з падзякаю, іншыя яе паўтарылі, пра што потым усе шкадавалі.

Мы выехалі з Казані а 6-й вечарам. Горад вельмі прыгожы, мае прыгожае размяшчэнне, парк і прыгожыя дамы, усё, што мы праездам угледзець маглі, зрабіла на нас прыемнае ўражанне, а калі заўважылі наш каталіцкі касцёлік, узрадавалася душа нашая, мужчыны знялі шапкі, каб ушанаваць Бога ў найсвяцейшым сакраманце, мы з п. Тэкляй заплакалі. Убачыўшы могілкі, прамовілі «Анёл Панскі» за душы, спачываўшых на іх нашых суродзічаў. Я не прадчувала тады, што буду некалі ў Казані і спазнаю шчасце ўбачыць сястру маю Антаніну. Але пра тое потым. Падарожжа з Казані было досыць прыемнае, на этап мы прыбылі а 1-й ночы. З пачаткам вясны падарожжа па этапах стала больш зносным; за некалькі гадзін прыкрага знаходжання на этапе ўзнагароджвала нас выдатная, прыбраная ў захапляльныя шаты прырода. Што раз прыгажэйшыя лясы, велізарныя абшары прыгожых лугоў і шырокі гасцінец, з абодвух бакоў абсаджаны дрэвамі. нагадваў нам нашыя паштовыя тракты, заўважала не раз у найпрыгажэйшых мясцовасцях падабенства да нашых родных мясцін. дзякавала Пану Богу за сонца, якое мне і суродзічам маім свяціла,

за паветра, якое ўсіх і ўсё на зямлі ажыўляе, але калі ў думках аказвалася каля бацькі, сёстраў, братоў, то ўжо слёз утрымаць не магла і гаручымі слязамі плакала. Раз, памятаю, калі ў нядзелю сядзела на парозе не ведаю ўжо якога этапа, пагружаная ў падобныя думкі, заўважыла воддаль плакаўшую сялянку-жмудзінку, якая, углядаючыся ў даль, нейкую песню ці малітву нудна цягнула; я не магла зразумець, што сялянка тая да мяне прамовіла, тады падышоў п. Францішак Рапцэвіч, малады хлопец, які мне часта ў падарожжы складаў кампанію і патлумачыў мне яе словы. Кабета гэтая, молячыся сёння, прыпамінае сабе парафіяльны касцёл, набажэнсты ў ім, малітвы люду, спевы капланаў, святыя абразы, тыя дарогі і сцежкі, якімі да касцёла хадзіла, і плача. Сказала яму:

— Мы, жанчыны, без зброі, сілай схопленыя, нічога дзіўнага, што знаходзімся там, куды нас вязуць, але вы — моцныя, узброеныя і маладыя, чаму вы тут? Лепей было б, каб наш жоўты пясок вочы вам прысыпаў і магіла ваша была аброшана слязамі суродзічаў.

Няшчасная гэтая ўдава ў адным з баёў страціла адзінага сына, дачка памерла яшчэ перад паўстаннем; выслана разам з іншымі жанчынамі з ваколіцы Ібян, далучылася да адной з тамтэйшых сямей і з ёй свой лёс з'яднала.

Не раз здаралася, што афіцэр дазваляў нам прайсціся трохі наводдаль ад этапа. Аднойчы, шпацыруючы з адной малой дзяўчынкай — Міхалевічаўнай, прайшла вярсты з тры. Мы мовілі пацеры і забылі пра нашае становішча. добра было нам на душы. Тады мы сустрэлі нейкую кабету, арыгінальна апранутую; ішла яна, трымаючы малога хлопчыка за ручку, і абое дзіка неяк на нас глядзелі. Бачачы, што ў фартуху несла яйкі, я спытала, ці б мне такіх не прадала; перапужаная кабета адказала мне: «Бельмель», што значыць «Не разумею» і схавалася, чым найхутчэй разам з хлопчыкам у стаяўшую наводдаль хатку. Ні ў той хатцы, ні каля яе нікога не было, а тое жыллё і тая жанчына вельмі мяне заінтрыгавалі. Вярнуўшыся на этап распавяла таварышам, якое мела спатканне, і адразу салдаты расказалі, што гэта татарская люднасць. Маюць яны непераможны недавер да сваіх захопнікаў хрысціян, усю сваю маёмасць хаваюць ад іх, у дамках амаль пуста, бо яны хаваюцца ў схованках, калі згледзядзь мінакоў або салдатаў.

1 (13) траўня мы мелі днёўку ў павятовым горадзе Малмыжы. Здалёк заўважылі велізарны белы мураваны дом, так як і ў малых гарадках, найлепей выглядаў астрог, які знаменаваў панаванне Расіі ў краі, ёй захопленым. На трэці дзень мы выехалі з Малмыжа а 9-й гадзіне раніцы, пакідаючы ў астрозе 68 нашых брацця ў, найбольш мазураў з простага люду, засуджаных у арыштанцкія роты ў Вятку. З імі застаўся шаноўны кухар Станіслаў Кушчык, які нам у Маскве і Чабаксарах рыхтаваў абеды і быў вялікай для нас дапамогай. Заплакаў бядак, развітваючыся з намі, мы ўсе так яго шкадавалі; п. Рытвінскі, наш стараста, сабраў для пазасталых бедакоў малую

складку, бо выпала толькі па 2 зл і 7 грошаў на кожнага. Бедныя тыя людзі не мелі нічога больш, акрамя атрымоўваных 4 кап штодзённа, т. зв. «кармавых». Голадна і холадна ім было, бо ўжо ў Казані адабралі ў іх кажухі, хаця паветра нічога агульнага з цяплом не мела.

Сем вёрст ехалі паштовым гасцінцам, дарога была дасканалая, потым дванаццаць вёрст плылі на барках, таму ўсім нам тое падарожжа было прыемнае. Угаварылі Пясляка, які меў самавар, каб арганізаваў гарбату, а так кожны, маючы нейкі запасік хлеба, масла вяндліны, меў у цэлым якепскі падмацунак. Ад ракі да этапа правезлі мяне з п. Тэкляй на малым тарантасіку, а паколькі этап быў вельмі малы, размясцілі нас на вёсцы.

5 траўня мы былі на этапе Вялікі Кільмеш. Потым ехалі ўвесь час праз вялікі лес; са мной ехаў пан Рапцэвіч і апавядаў пра сваю сям'ю і пра сваю радзімую старонку, пра прыгоды свайго дзяцінага і юнацкага веку, а мне зноў прыпаміналіся нядаўнія часы, любімая мая радня, якая весела праводзіла час, і як заўсёды, пасля такіх успамінаў зрабілася мне смутна; на думку пра другога брата Цыпрыяна, якога ўжо не мела ўбачыць на зямлі, нічога тады яшчэ не прадчуваючы, сардэчна аднак плакала.

Даехалі мы да Сямсюла. Далі нам добры, чысты пакойчык на вёсцы. Я запрасіла да нас хворага п. Васілеўскага, зрабіла яму гарбату з цытрынай, а калі трохі паляжаў, лепей яму стала, мусіў аднак уступіць месца п. Тэклі, якая была вельмі незадаволена, што яе дазволу на прыём п. Васілеўскага не спытала. Калі мы пілі гарбату, прыйшоў адведаць нас пан Маргевіч, размаўлялі трохі пра яго сям'ю; казаў, што нейкі час хварэў, а прычынай яго нездароўя быў неспакой за жонку і дзяцей. Ад часу выезду з Казані мелі мы з паняй Тэкляй службу; называўся Ясь Рагеліс, працавіты жмудзін, вельмі пачцівы хлопец, прыслужвае нам ахвотна, а ў вольную хвілю шые сабе кашулі. Служыў у войску гадоў 15, вярнуўся дадому з белым білетам, не меў з чаго жыць, калі завязалася паўстанне, пайшоў служыць святой справе, за што быў высланы ў Табольскую губерню на пасяленне. Бачачы яго працаваўшым, не раз думала: «Хто ж будзе залатвіваць патрэбы яго старога бацькі, хто падумае пра яго!» У Сямсюле першы раз пачула спеў салаўя, выспеўваў так прыгожа, як у нашым краі. Прыпомнілася мне, як адной прыгожай травенскай ноччу ў нашым садзе з братам Цыпрыянам і сястрой Антанінай слухалі падобны спеў. Ах, я не ўмела дзякаваць тады Богу за ўсё, што мне прызначаў і цешыцца ў дадзеную хвілю спазнаным шчасцем!

Ноччу цёплы дождж асвяжыў усю прыроду, а калі засвяціла сонца, уся мясцовасць, як бы прыбраная ў свежыя шаты зелені, прадставіла вачам цудоўны від. Прыбыў на той этап з Малмыжскага шпіталя пан Вярбіцкі, на працягу месяца хварэў на тыф, і цяпер быў яшчэ вельмі аслаблены і бледны. Апавядаў, што ў тым шпіталі пра лячэнне хворых зусім не думаюць, лекар ніякіх парад не дае, дазваляе есці такую ежу, якая хво-

рым шкодзіць, таму за сваё вяртанне да здароўя ўдзячны пан Вярбіцкі толькі Божай дапамозе, а не іншай якой. З Сямсюла мы вельмі хутка прыехалі ў Кажыль. Памясцілі нас у пісара, жонка якога, полька, была досыць сімпатычнай кабетай, але хцівая і на грошы лакамая. Я даведалася, што ў іх нейкі час знаходзілася манашка, сястра міласэрнасці з Вільні Ганна Дамброўская, 70-гадовая бабулька, пазбаўленая ўсіх правоў, з манашскай сукні вынятая і пераадзетая ў брадзяжную. Трапіла яна ў вязніцу наступным чынам: да адной з сясцёр таго ж ордэна і таго ж дому, у якім была сястра Дамброўская, да сястры Ганны Гаеўскай прыйшоў аднойчы нейкі мужчына, прадставіўся яе сваяком, назваў прозвішчы родных сясцёр, з якімі яна пасля паступлення ў кляштар не падтрымлівала ніякіх стасункаў, але якія сапраўды былі яе роднымі, сказаў, што яго перасследуе паліцыя, і просіць схаваць яго ў кляштары. Сястра Ганна Гаеўская паверыла мнімаму сваяку і пагаварыла пра тое з п. Дамброўскай; не прадчуваючы ніякай здрады, прынялі шпіёна як найбольш гасцінна, накармілі яго, дапамаглі вопраткай і трохі грашыма і паказалі ў горадзе знаёмых, у якіх у выпадку патрэбы знайшоў бы патрэбную дапамогу. Неўзабаве з'явіўся гэты здраднік з паліцыяй, паказаў на абедзвюх сясцёр, гаворачы ім у вочы, пра што з ім гаварылі, паказвае месца, дзе мелі схаванае нейкае кампраментуючае іх перад урадам пісьмяцо, і вось вынік той здрады: манашкі аказаліся высланымі з Краю; сястра Гаеўская — у адну з губерняў еўрапейскай Расіі, здаецца, у Тамбоўскую; сястра Дамброўская, як больш вінаватая — на Сібір, у Томскую губерню.

Я пазнаёмілася з імі абедзвюма ў дарозе; першая малодшая, мацнейшая і лягчэй асуджаная, несла цяжкі крыж нядолі, бо мукі і згрызоты сумлення, што міма волі сталася нагодай няшчасця вельмі ёй шанаванай манашкі — ужо старой і да таго ж вельмі хваравітай; а другая ў Нарыме была вялікім дабрадзействам для няшчасных выгнанцаў.

Выязджаючы з Томска, у якім не захацелі ёй дазволіць асесці, купіла лекаў і розных зёлак, якімі лячыла потым не толькі сваіх, але і тамашніх жыхароў. У нядзелі і святочныя дні збіраліся да яе католікі на супольную малітву і пабожныя чытанні. На Куццю арганізоўвала яна вячэру, дзялілася з выгнанцамі аплаткамі, якія ўмела пячы; на Вялікдзень рыхтавала свянцонае, на якое ўсе складаліся. Сціплыя і бедныя былі тыя пачастункі, але тое паяднанне пад Божым дахам на выгнанні, тая супольная малітва, харавыя спевы пабожых песняў і чытанне слова Божага былі для бедалаг сапраўдным дабраславенствам. Пазней быў туды сасланы нейкі ксёндз, а потым, яшчэ праз паўтара гады ці болей, знаходзіўся шаноўны рэктар семінарыі ў Варнях на Жмудзі кс. Юзаф Давідовіч, адзін з хрысціянскіх светачаў за часы жудаснага Мураўёва, гэтага Нярона нашай зямлі. Не ведаю, што сталася з сястрой Дамброўскай, бо пасля 6-гадовага знаходжання ў Томску я выехала ва Усходнюю Сібір і не магла атрымаць карэспанд-

энцыі ад знаёмых. Здзіўляла толькі заўсёды такая вялікая міласэрнасць Божая і апека над ёй, што ў веку ўжо падхадзяшчым, прытым слабаватая, магла перанесці цяжкае і знясільвальнае падарожжа па этапах у Сібір.

Дабрадзеем яе быў афіцэр, які суправаджаў партыю і заўсёды саступаў ёй сваё месца, а Бог удзяляў ёй сілаў і здароўя для перадолення ўсякіх невыгод і цяжкасцяў.

У Кажулі, у шпіталі памерла з тыфознай гарачкі 8 нашых браццяў. Этапавы начальнік, паляк, католік дазволіў пахаваць іх на астрожных могілках, дзе спачывала некалькі яго дзяцей. Год назад ні адзін з тых васьмі не думаў, што такой смерцю ў тым месцы закончыць жыццё. Сумняваюся, ці звесткі пра памёрлых і рэчы, якія пасля іх засталіся, пераслалі асірацелым сваякам, бо адрасоў не было.

Пан Антоні Урбасевіч, пра якога я ўжо не раз успамінала, пасля доўгіх старанняў дабіўся нарэшце свайго. Скарбовыя грошы, якія зваліся кармавымі, давалі шляхце па 15 капеек, а вязням з простага люду па 4 капейкі, ад гэтага часу дзялілі пораўну. Ён таксама арганізаваў тое, што пачалі вучыць непісьменных, а таксама праводзілі павучальныя гутаркі.

Мы выехалі з Кажуля, маючы аднаго хворага на тыф; тры дні ён быў зусім непрытомны; пры хворым ехалі два таварышы, адзін цалкам здаровы, другі ўжо хворы; абодва не заўважылі, як ім у дарозе згас таварыш, без братняй малітвы, без каплана і свечкі. Быў гэта каваль з простага люду, Францішак Масілоўскі; двух сыноў адправіў у паўстанне, а сам памёр на чужбіне. Пан Рытвінскі прасіў «парцыённага» афіцэра дазволіць пахаваць памерлага перад выхадам нашай партыі; пасля доўгіх угавораў афіцэр згадзіўся і дазволіў 19 калегам заняцца пахаваннем нябожчыка. Месца яго спачыну называецца Жузі, за сялом Дэбеса. І так мы патроху траціліі таварышаў падарожжа; у Чабаксарах, Казанскай губерні, пахавалі маладога, якога любілі ўсе калегі, Франкоўскага, тут вось Масілоўскага, а мелі з сабой 25 хворых на тыф. Енчылі бедакі, едучы на траскіх вазах, пазбаўленыя клопату сваякоў і ўсякіх выгод, свежае паветра было іхнім адзіным лякарствам. Паны Рапцэвіч, Гроцкі і Бесякерскі былі найбольш клапатлівыя каля хворых; астатнія сыноўскай апекай атачалі хворага пана Сымпліцыя Пяткевіча, а клопат Божы быў над усімі.

На свежым вясеннім паветры падарожжа нашае ў лёгкіх тарантасах было нават прыемным; толькі начлегі і днёўкі ў цесных этапах, багатых на рознага роду паразітаў, або размяшчэнне ў вясковых хатах, дзе для прыгатавання абеду печы распалялі да немагчымага. былі для нас нязносныя. На этапе Даброўскае мы з п. Тэкляй былі ветліва прыняты жонкай этапнага начальніка ў ахайным і чысцюткім памяшканні, якога ад часу зняволення не бачылі.

Прырода, прыбраная ў маёвую зеляніну, захапляла нас сваім выглядам, падсалоджвала нашыя маральныя мукі так, што нейкі спакой уступіў мне ў

сэрца. Непакоіла нас аднак маўчанне газет адносна нашай справы, мы не ведалі, што робіцца на Бацькаўшчыне, што з браццямі паўстанцамі.

Пакінуўшы Даброўскае, мы праехалі добрай дарогай 26 вёрст і спынілі-ся ў Аханьску а 11-й гадзіне раніцы. Насупраць этапа ўбачылі шпіталь, з якога выглядала некалькі нашых браццяў; я падышла спытаць пра іхняе здароўе і якія маюць умовы? Адказалі, што ў кожным шпіталі на этапнай дарозе ніякіх лекарскіх клопатаў не адчуваюць і ніякіх умоваў не маюць. У той жа час пачуўся крык на этапе; афіцэр загадаў набіваць зброю, бо этап быў настолькі малы, што ледзьве палова вязняў магла памясціцца ў ім, таму нашы ў той этап заходзіць не хацелі, што было названа бунтам, і на нашую ветлівую просьбу пра размяшчэнне ў некалькіх сялянскіх хатах, што некаторыя з афіцэраў дазвалялі, адказалі нам грубасцю і пагрозамі. Мы з п. Тэкляй доўга сядзелі на сонцы, нарэшце далі нам памяшканне ў сутарэнні з салдатамі; былі там яшчэ тры кабеты, жмудзінкі, хворыя на гарачку. У шпіталі каля нашага памяшкання я сустрэла няшчасную п. Гувальд з Вільні, прыгавораную да катаржных работ на 4 гады, бо знайшлі ў яе шафы перапоўненыя абуткам і вопраткай для паўстанцаў. Арыштавалі яе спачатку ў выніку даносу, а потым двое яе дробных дзетак, пачастункам цукеркамі і пяшчотаю ашуканыя, на пытанне, што робіць мамуся, адказалі, што шые з цёцяй вопратку, і паказалі месца, дзе тую вопратку хавае. Да якіх падступстваў даходзілі подлыя маскоўскі шпегі!

У тым сутарэнні апанавалі нас раямі насякомыя, нельга было ад іх абараніцца, змена бялізны таксама нічога не давала, так што трэба было выйсці і цэлую ноч праседзець на дварэ.

Чацвёртага ліпеня прыбылі мы ў Пермь. Прыезд у кожнае месца быў прыкры і пакутлівы для нас; вось і ў Пярмі сядзелі цэлы дзень на дварэ, трэба было чакаць, пакуль знойдуць якое-небудзь памяшканне. Далі нам нарэшце нейкае малюсенькае памяшканне; пані Тэкля адразу занялася ўладкаваннем ложка, г. зн. паслання на лавах, а тут увайшлі да нас некалькі паноў з бліжэйшых знаёмых, аднак аднаго, які без нашага дазволу там размясціўся, вымушаны былі выправадзіць. Быў гэта нейкі пан Сулькоўскі, немалады ўжо чалавек, які, здаецца, пасля вяртання ў край скончыў раптоўнай смерцю. Я звыкла пры размяшчэнні рабіла пратэкцыю маім зычлівым аднапаветнікам і тым, хто нам дапамагаў у дарозе, але шкода мне заўсёды было таго пана Сулькоўскага. Прысутныя карысталіся нашай гасціннасцю: Колышка, цёзка павешанага ў Вільні Баляслава Колышкі, Круповіч і яшчэ некалькі.

Даведаўшыся, што ў адным месцы гатуюць танныя абеды, сказала пра тое маім таварышам, і 20 чалавек карысталіся з гэтага адкрыцця. У Пярмі сустрэлася мне вельмі мілая неспадзяванка: праз акно ад дома паліцыі заўважыла праходзіўшую знаёмую мне таварышку па вязніцы сястры маёй Антаніны, п. Ідалію Бандзынскую. Клікнула яе і пасля сардэчнага пры-

вітання даведалася, што маці яе была прыгаворана на 8 месяцаў заключэння ў пермскай турме. Атрымаўшы ад обер-паліцмайстра дазвол пайшла яе адведаць. Запомнілася мне, як яна ціха, спакойна пераносіла тое прыкрае жыццё. П. Ідалія, міленькая паненка, здаецца, выйшла замуж за пермскага паліцмайстра, немца на ўрадавай службе. Калі прыйшла да іх, застала абедзвюх за шыццём кашуль для вязняў-палякаў. П. Ідалія са слязамі апавядала мне, якім прыкрым ёсць для яе побыт у вязніцы; прасілі, каб я засталася ў Пярмі на два тыдні, але я не згадзілася на тое, пастанавіўшы без затрымак прадаўжаць шлях да месца майго прызначэння. Праз пару дзён мы выязджалі з Пярмі а трэцяй раніцы. Невыносны быў такі ранні пад'ём, спаць жудасна хацелася, асабліва пані Тэкля гэта прыкра пераносіла. Хацела яна застацца на нейкі час у Пярмі, пакрыўджаная няветлівымі паводзінамі таварышаў па падарожжы; партыя наша складалася ў большай частцы з моладзі рамесніцкага класу, і хоць была і шляхта, але без належнага хатняга выхавання, не ўмеўшая паважаць ні ўзрост, ні нядолю. З гэтай прычыны падарожжа нашае было прыкрым, але нельга было прадбачыць, як бы было далей, можа яе памясцілі б з цывільнымі злачынкамі, расіянкамі, а можа як прыгавораную да катаржных работ памясцілі б яе з кайданнікамі. Я хацела адразу не лезці з парадамі, але пры такіх думках, бачачы яе смутнай і плакаўшай, пачала прасіць, каб ехала з намі. У Пярмі далучылі да нас больш вязняў, так што партыя наша складалася з 315 чалавек; паміж новапрыбылых, як мы падазравалі, было некалькі шпегаў.

Ад Чабаксар, дзе мы пахавалі Франкоўскага, мелі мы заўсёды хворых на тыф; пад'язджаючы да Екацярынбурга захварэў паміж іншых пан Антоні Урбасевіч; не хацеў бядак расставацца з калегамі, якіх, нягледзячы на іхнія недахопы, палюбіў усёй душой, але лекары прызналі неабходным пакінуць яго ў шпіталі. На гэтую вестку заплакаў бядак, як дзіця. Найбольш шкадаваў свайго прыяцеля. Не знаючы стану свайго здароўя, моцна перажываў, што калегі не хочуць браць яго з сабой. Праводзячы яго, выязджаўшага ў шпіталь, так зламанага мукамі фізічнымі і маральнымі, я не магла ўстрымацца ад слёз і як роднага брата з болем праводзіла. Назаўтра я пайшла ў шпіталь, каб яго адведаць; тады першы раз адкрыта выгаварыўся мне, што мае крыўду на калегаў, якія ў хваробе зусім яго пакінулі, што калі ў дарозе дождж яго намачыў, то на этапе не паклапаціліся пра сухую пасцель, спаў на мокрым, а ніводзін з калег не падышоў да яго, каб на яго глянуць.

— Пані адна сястрой мне была, — сказаў.

— Бо я ў пану бачыла брата, — адказала яму са слязамі.

Паміж хворымі п. Яскулоўскі з Берасцейскага павета пачуваўся найгорай, быў непрытомны, пазнаў мяне ўсё ж і прасіў, каб я яго яшчэ на другі дзень адведала. Я выканала тое пажаданне, пайшла назаўтра развітацца з хворымі, гатова была нават застацца з імі, але ўзважыўшы добра акалічнасці, зразумела, што ім бы гэта ні на што не прыдалося, а сябе папхнула б

у пропасць. Хворыя самі нават прасілі, каб не заставалася; я наняла двух добрых людзей, каб даглядалі хворых, і з жалем развіталася з імі. Урбасевіч не разумеў таго, што хворы на тыф і перажываў, што доктар Акуліч памясціў яго разам з хворымі на тую гарачку, быў зусім прытомны. Чула, што быццам бы выздаравеў, але з ліку тых, хто застаўся ў Екацерынбургскім шпіталі, нікога ўжо ніколі не бачыла.

Апошнія ночы ў Пярмі зусім не магла спаць, праходзілі ў мяне перад вачыма вобразы палеглых братоў паўстанцаў, іх ганебнае смерць ад рукі ката; бачыла стрыечнага брата, Уладзіслава Навіцкага, які, паранены ў балоце пад Дубічамі, не меў сілы, каб з яго выбрацца, і так, стоячы, сканаў... Бачыла Баляслава Колышку, павешанага ў Вільні, і іншых замардованых за жаданне бараніць Бацькаўшчыну. Пыталася, ці той зруйнаваны быт столькіх сямей і зямля, залітая крывёю, нейкі плён дасць, ці гнеў і міласць Божую прынясе, ці ж боль жонак, сясцёр і матак, бачыўшых, як іхнія мужы, браты і сыны на эшафоце гінулі, не перапросіць Бога за нашы і продкаў нашых віны і не вымаліць лепшай для народа нашага долі? У думках маіх узнікала бура, у сэрцы пякло, а ў душы жудасны боль. Не магла супакоіцца і з хрысціянскай пакорай маліць пра міласэрнасць Збаўцы, які да апошняй кроплі кроў сваю праліў на крыжы за нас і за тых, якія яго крыжавалі, і ў жудасных муках маліўся да Айца свайго нябеснага, гаворачы: «Ойча, даруй ім, бо не ведаюць, што робяць!» Не ўмела маліцца з пакорай волі Божай і ў ім толькі, а не ў людзях, шукаць уцехі.

Даехаўшы да Кунгара, павятовага горада ў Пермскай губерні, там трохі ажыла. Знайшла пару знаёмых чалавек, між іншымі Уладзіслава Міцкевіча з нашага павета, які разам з бацькам маім быў зняволены ў Вільні ў «святога Пятра», потым сям'ю Далеўскіх, якая складалася з маці, наймацнейшай старой, і трох дачок: Зузанны, Юзэфы і Ксаверы. Што гэта за высакародныя былі жанчыны, узор патрыётак і хрысціянак, якія пасвяцілі сябе няшчасным і іншых да падобнага пасвячэння заахвочвалі. Як анёлы божыя, на зямлю пасланыя, неслі дапамогу хворым у шпіталі, апякалі іх, аддавалі апошнія паслугі памiраўшым і памёрлым, сустракалі прыбываўшыя партыі выгнанцаў і аказвалі ім мажлівую дапамогу, падсалоджвалі іх смутную долю, цэлыя дні, а часам і ночы праводзілі за шыццём кашуль і бялізны для вязняў. Прынялі да сябе ў навуку беднага хлопчыка, каб яго далучыць да карыснай працы і да ўсёй той дзейнасці самі прыклад падавалі. Я прабыла ў іх двое сутак. Прыйшоўшы да іх я была так змучана нядоляй, такая непрытомная, што не ведала, што рабіць, а яны добрыя, мілыя, так сардэчна мяне прынялі, што як бы святло божае заззяла, зніклі чорныя думкі мае. Запрасілі таксама блізкіх маіх знаёмых пп. Рапцэвіча, Лапінскага і Сакалоўскага; у выніку я супакоілася і прыйшла да сябе. Са смуткам і ўдзячнасцю я пакідала сям'ю пп. Далеўскіх, бо загадалі рушыць далей. Падарожжа станавілася ўсё больш

нязносным з-за павялічваўшайся гарачыні і мноства абрыдлых насякомых на этапах.

10 ліпеня мы прыбылі ў Цюмень; размясцілі нас у астрозе, у асобным пакоі пры шпіталі. Мужчынам у этапе было вельмі цесна, душна, паветра жудаснае, у горад ім выходзіць не дазвалялі; у нашым досыць вялікім пакоі размясціліся тры сям'і. На трэці дзень вечарам, калі ўжо дзверы былі замкнёныя, п. Тэкля самлела. Будзіла яе, як магла, нічога не дапамагло, пачала крычаць, клікаць, стукаць у дзверы, прасіць доктара; прыйшоў адзін, потым другі; п. Рапцэвіч застаўся пры хворай пільнаваць ноччу, а лепей ёй не рабілася. Змучаная была бедалага такім складаным і цяжкім падарожжам. Чацвёра сутак мы знаходзіліся ў Цюмені; чым бліжэй мы былі да нашага месца прызначэння і далей ад любімай Бацькаўшчыны, тым смутней нам усім было. Сарваныя без ніякай падрыхтоўкі тым ходам агульных падзей, не мелі разумення пра тое жыццё, якое нас чакала. Я ведала людзей толькі з боку добрага, ідэальнага, на малым прасторы нашай зямлі; пасля вывазкі з краю зразумела, што трэба быць асцярожнай і людзей баяцца. Вельмі мучыла мяне гэтая думка, што сястра мая ў выніку такой недасведчанасці прыме яшчэ больш пакут. 31 ліпеня ўжо выехалі з Цюмені. Мы былі там цэлы тыдзень; хадзіла на могілкі, дзе знайшла 11 свежых магіл, адны з надпісамі, іншыя без; забалела мне ад той абыякавасці калегаў, якія хавалі памерлых сваіх брацціяў, бо ўсе, прынёсшыя свае жыцці на алтар Бацькаўшчыны, заслужылі памяць. Была таксама і ў нашым касцёле, малы гэта касцёлік, як каплічка, адзін толькі алтар, некалькі абразоў, малая гармонія, 6 харугваў і лаўкі па абодвух баках.

Пані Тэкля засталася ў Табольску, шкада мне яе было, бо хоць не раз нязносная яна для мяне была, шанавала я яе і любіла; разумная, практычная, называлі яе эгаісткай, але была сведкай, што астатнім магла падзяліцца з тым, каму сапраўды трэба было, была літасцівай над нядоляй і сапраўднай патрыёткай. Не хацелася ёй спяшацца на катаржныя работы, таму засталася там, дзе ёй трохі лепей было.

Сеўшы на параход, я не адчувала ні прыемнасці, ні нязручнасцяў падарожжа; не маючы чым заняцца і забавіцца, аддалася зноў роспачлівым думкам пра страшную будучыню. Ніякай уцехі, ніякіх жаданняў не адчувала ў сэрцы, толькі велізарная туга мяне агарнула, туга па бацьку, па сёстрах, а асабліва па наймалодшай Антосі, якую выхоўвала. Яна ў настаўніцкай працы была найлепшая, найсумленнейшая, трывалая і бескарысная памочніца мая, калі мне прыйшла думка заняцца выхаваннем дзяцей суседзяў і сваякоў спачатку на вёсцы пры маіх бацьках, а пасля смерці маці нашай — у Лідзе, яна мне была ў думках і днём, і ноччу, у сне і наяву. Ад пачуццяў падобнай тугі няхай Бог захавае кожнага, хто ў Яго верыць! Трэба было аднак жыць і далей, што раз далей ехаць. У тым маім нешчаслівым становішчы ніколі аднак не думала пра скарачэнне сабе жыцця самазабой-

ствам, хаця такой жудаснай мне падавалася смерць на зямлі ворагаў і такой вялікай мая прывязаннасць да зямлі бацькоўскай. Некаторыя жанчыны мелі шчаслівую думку ўзяць з сабой трохі пяску з бацькоўскіх мясцін і хавалі яго, як каштоўную рэліквію, як лекі супраць тугі, памерлым браццям пасыпалі трохі той нашай зямлі на вочы, каб ім тая чужая зямля лягчэйшай падавалася.

Бацьку свайго найлепшага я ўжо ніколі не ўбачыла; памёр ён у найвялікшай нядолі і патрэбе: шкадавалі яму ўсяго, нават кавалка хлеба. Так бедалага пісаў да мяне: «Усё ў мяне адабралі, усяго мяне пазбавілі, нічога не маю». Нейкі час у селяніна свайго, даўнейшага прыгоннага, меў прытулак; у курнай, як на Літве, мужыцкай хаце, з яды маючы толькі капусту, гарох з канапляным алеем; хворы на астму так цэлы пост пражыў. Як цернь у зраненым целе, так думка пра тую нядолю бацькі майго і ўсіх чальцоў сям'і сэрца маё раздзірае!

VIII

Цяпер трэба мне вяртацца да апавядання, г. зн. туды, куды мяне вязуць, дзе мне загадана знаходзіцца, у Томск! Карабель плыве спраўна, спакойна па Обі, берагі якой таксама спакойныя. Рака фанабэрыцца, што цяжару вязняў не чуе, як бы гуляе з караблём, звіваецца, шуміць, хвалюецца. Кожны з вязняў то сядзіць у выбраным кутку, то ходзіць або размаўляе, дзеліцца з таварышамі сваімі думкамі, я толькі смутная, пагружаная ў мінулае, жагнаю ў думках месцы, дзе закончылі жыцці тыя, хто змагаўся за край, дзе іхняя кроў пралівалася. Знайходжу нарэшце на параходзе сям'ю Астраменцкіх, бацьку пана Віталіся, жонку Казіміру з Лапацінскіх, трох малых дачушак: Марысю, Габрыню і Ядвісю, а таксама брата пані Казіміры, п. Лапацінскага. Ведалі яны майго брата Цыпрыяна, які пасля заканчэння маскоўскага ўніверсітэта пайшоў у паўстанне ў Кобрынскім павеце і быў у партыі Траўгута. Пп. Астраменцкія запрасілі мяне ў сваю каюту; былі гэта вельмі шаноўныя людзі, пры гэтым разумныя, практычныя, дзетак мелі мілых, ветлівых, то і мне лепш было ў іхняй кампаніі. Плылі да вечара, нарэшце карабель затрымаўся на цэлую ноч за 8 вёрст ад гарадка Сургута. Стараста наш п. Вецкі з 10-цю калегамі і жаўнерам паехалі ў горад для пакупкі харчавання; я цэлую ноч амаль вока не заплюшчыла; дзень 6 жніўня прывітала ўспамінам, як у мінулым годзе сабраўшыся ў вялікім ліку ў лідскім касцёле прасілі Бога пра змену долі любімай нашай Бацькаўшчыны Мы плылі далей і далей, берагі амаль заўсёды роўныя, пакрытыя лазой або елкамі, рака, як кажуць, шырынёй з вярсту, дзе-нідзе відаць толькі пару асцяцкіх хатак, карой пакрытых. Бедны народ асцякоў жыве толькі рыбай, збожжа ніякага не сеюць, хлеба не маюць. Нашы брацці за кавалак выдзеленага ім хлеба атрымалі па некалькі рыб. Аднаму старому падарылі бялізну; радаваўся бязмерна, найхутчэй у яе пераадзеўся, а апрануўшы на яе

яшчэ свае лахманы, пражагнаўся і кланяўся да зямлі, 15 паклонаў адбіў, дзякуючы за падарунак.

На параходзе ў нашай каюце месцілася 9 чалавек: сям'я пп. Астраменцкіх з братам складалася з 6 чалавек, потым былі пп. Вашчынскія і я: цесна, душна і нязручна нам было. П. Астраменцкая, непараўнальная жонка і маці, адданая сваёй сям'і, пастаянна была занятая дзецьмі, гэта быў увесь яе свецік, гэтая мілае сямейнае колка; яна не мела і не шукала іншых прыемнасцяў, таварыскія стасункі падтрымлівала толькі па абавязку.

Пан Астраменцкі займаўся ў краі адміністраваннем і інтарэсамі маёнткаў у добрах п. Элізы Ажэшкі; яго будучая жонка была па суседстве настаўніцай. Нягледзячы на выдатную падрыхтоўку, нягледзячы на найшчырэйшую ахвоту і любоў да працы, не мог п. Астраменцкі знайсці ў Томску ніякага занятку для сябе, таму жонка, якая ведала дасканала французскую і нямецкую мовы і ехала з мужам па ўласнай волі, вывучыла расейскую мову і выстаралася выкладання гэтых моваў у гімназіі, што дало магчымасць для ўзорнага ўтрымання і надання дзецям адпаведнага выхавання. Пасля смутнай смерці жонкі, якая памерла ад раку грудзей, пан Астраменцкі перабраўся з асірацелымі дочкамі ў Казань.

Не памятаю, як доўга мы ехалі; у дзень прыезду ў Томск было холадна, і ішоў дождж. Найперш моклі на прыстані, чакаючы на фурманкі, якія мелі нас перавезці ў астрог, размешчаны на супрацьлеглым канцы горада. Прыехалі нарэшце да велізарнага, некалькіпавярховага гмаха, які мог змясціць звыш тысячы вязняў — быў гэта астрог. Тут зноў чакалі на холадзе і дажджы да вечара, пакуль нас не размясцілі: сем'ям і мужчынам раней далі месцы; нарэшце і мяне выклікалі; замерзлая і прамоклая я ўвайшла ў абшырны і цёплы пакой, а адтуль прызначаны падафіцэр, астрожны наглядчык, завёў мяне ў сваё памяшканне. Спытаў маё прозвішча і здзівіўся, калі яго пачуў; праз хвілю запытаў зноў, ці не дачка я Алойзы Табенскага з Вугольнікаў, адказала, што я — яго ўнучка; выказаў вялікае да мяне спачуванне, папрасіў адразу сваю жонку стварыць для мяне ўсякія магчымыя выгоды, а мне загадаў, каб адразу распрануласа і легла ў чысты і мякка пасланы ложак. Сказаў яшчэ, што лічыць сябе шчаслівым прыняць і адратаваць з няшчасця ўнучку сп. Антонія Табенскага, які яго таксама пашкадаваў, калі будучы яшчэ жаўнерам, належаў да тых, якія будавалі сігнальны тэлеграф у Вугольніках, маёнтку майго дзядулі. Развітаўшыся з шаноўным наглядчыкам, легла ў ложак і на цэлы тыдзень ў ім засталася з гарачкай, якую займела ад холаду і стомленасці.

Вось жа спаткала вялікую божую міласэрнасць над сабой, бо пасля такога доўгага і пакутлівага падарожжа не атрымала, як уяўляла сабе, месца для смерці ў астрозе, запоўненым тысячамі хворых на тыф, а такое выгаднае для мяне памяшканне і ўсялякія выгоды. З глыбіні сэрца я дзякавала Даўцу

ўсялякага дабра, Айцу Нябеснаму, за яго міласць і апеку нада мной; пераканалася, што і на выгнанні можна знайсці добрых людзей, трэба толькі ўсю веру ў Бога ўлажыць і з палёгкай аддацца волі Яго Найсвяцейшай, якая для дабра нашага кіруе падзеямі.

Пасля тыднёвай хваробы я пачала ўжо хадзіць, якраз у той дзень віцагубернатар Томска, п. Фрызель, інспектаваў вязніцу, зайшоў таксама і да мяне. Гаварыла з ім па-французску і прасіла яго, каб мне застацца ў Томску; сказаў, што згодзіцца на гэта і можа запрапануе мне, каб засталася ў яго пры дзецях, калі я згаджуся на прапанаваныя ўмовы. Сказала, што гэта будзе залежаць толькі ад майго здароўя, калі буду магчы, то ахвотна і з удзячнасцю прыму яго прапанову; гаварыць так мусіла з ветлівасці, бо ўваходзіць у дом чыноўніка лічыла за горшае для мяне, чым уваходзіць у вязніцу, тым больш, што знаёмая мне маладая пара пп. Каралькоў, зайшоўшы да кс. пробашча прасілі пра пратэкцыю для мяне і даведаліся, што знаёмыя палякі прасілі ксяндза выстарацца якую настаўніцу з поляк, сасланых у Сібір за палітычныя злачынствы. На другі дзень пайшла ў касцёл з п. Аляксандрам Штэйнам, правізарам аптэкі з Вільні, які пазней стараннямі ксендза ў Томску, у п. Мальгудовіча застаўся. П. Штэйн быў апрануты ў світку з простага сукна, я мела таксама кепскую вопратку, пайшлі найперш да касцёла, дзе ў глыбіні сэрца падзякавала Пану Богу, што даў мне шчасце бачыць Яго ў Найсвяцейшым Сакраманце, просячы яго пра апеку, дзякуючы за прызначэнне мяне на жыхарства ў месца, у якім ёсць святыня Панская.

Пазней падаліся да пробашча. Той, пабачыўшы нашыя строі, завагаўся, дзе нас прыняць; мы не доўга раздумваючы, увайшлі ў пакой для адпачынку, дзе з радасцю прывіталі слугу божага, кс. Юзафа Энгельгарда, які праз пару гадоў у Казані, купаючыся ў рацэ, патануў.

Ласкава нас прыняў ксёндз-пробашч, частаваў нас гарбатай і абяцаў пагаварыць з пп. Пацалаеўскімі, якім патрабавалася настаўніца.

Гэта былі мае першыя няпэўныя і баязлівыя крокі на той чужой зямлі ў Томску!

П. Штэйн адразу паступіў у аптэку п. Мальгудовіча; вельмі шмат з таварыства выправілі далей на месцы прызначэння, але іншых пакінулі ў Томску да распараджэння тутэйшай улады. Вяртаючыся ў астрог затрымалася на мосце і, абапёршыся на парэнчы, задумалася, гледзячы на раку. Неспадзявана спыняецца каля мяне пан Лапінкі і пытаецца:

— Што, пані, тут робіш?

— Гляджу ў раку і думаю, што лепей было б у яе хвалі кінуцца, чым хадзіць па тутэйшай зямлі.

— О, няхай пані не ўпадае ў роспач, маю яшчэ трохі часу, пайшлі шукаць жыллё для пані.

Пайшлі, і з яго дапамогаю знайшла вялікі пакой, чысты, з утрыманнем, г. зн. пражываннем, мыццём, самаварам раніцай і вечарам за 8 рус. руб. штомесячна.

Вяла да яго дарога, добра брукаваная плоскімі камянямі, па баках былі драўляныя ходнікі з парэнчамі. Увайшоўшы ў касцёл, атрымоўваеш мілае ўражанне на выгляд так чыста ўтрымоўванага прытулку Панскага, дзе найняшчаснейшыя з людзей, вязень, жаўнер, бадзяга, які тужыць па Айчыне і сям'і, у цішыні можа выліць боль душы, распавесці пра свій прыгнёт, крыўды і маральныя пакуты, дзе кожны спазнае ўцеху, умацаванне духу і адвагу да барацьбы з лёсам!

Сёння томскі касцёл узорна ўпрыгожаны стараннямі цяперашняга пробашча кс. Валерыя Грамадскага.

З вялікім смуткам развіталася з ад'язджаўшым таварыствам; кожнага з іх чакала цяжкае жыццё, знявагі, нястача, самотнасць, праца, неадпаведная іхнім здольнасцям; а продыхі толькі пагубныя, якія нішчылі здароўе і як атрута дзейнічалі на маральнае жыццё. З 300 000 сасланых у Сібір у 1863 годзе, не ведаю, ці дзясятая частка вярнулася ў край не змарнаваная фізічна і маральна; бо цяжкая праца, якую яны выконвалі, з цягавітым, моцным тамтэйшым людам, падрывала хутка іхнія сілы, а за гэта давалі ім назву недалэнгаў....

Пасля развітання з таварышамі вярталася дадому, прайшоўшы кавалак дарогі, аглянулася яшчэ раз, але бляск сонца і слёзы ў вачах не далі мне іх бачыць. Яшчэ гляджу, а тут даганяе мяне п. Лапінскі:

— Хачу яшчэ раз з паняй развітацца, — гукае.

Я была ўдзячная яму за гэта, і мы пайшлі разам ў маё жыллё, а па дарозе зайшлі яшчэ да п. Штэйна. П. Баляслаў Лапінскі быў прыгавораны ў Бернаўт у Томскай губерні; з пункту гледжання клімату і кампаніі было гэта адно з найлепшых месцаў у гэтай губерні. На маё пытанне:

— Што мусіш, пан, рабіць? — адказаў:

— Не ведаю, можа знайду месца якога памочніка эканома.

Вось на такую працу трэба было марнаваць дарагія гады маладосці і занядбаць набытую ва ўніверсітэтах навуку!

Развіталіся тады назаўсёды! Пасля вяртання ў край са зламаным здароўем быў на лячэнні ў Меране, і было яму ўжо лепей, але адной ночы пачалася жудасная бура, адчынілася акно ў яго пакоі, устаў з ложка спацелы, каб яго зачыніць; у гэтую хвілю агарнуў яго холад, атрымаў запаленне лёгкіх, ад якога памёр.

Я даведаўшыся, што ксёндз з Томска мае выехаць у Табольск для выканання сваіх абавязкаў перад парафіянамі, пайшла на споведзь перад пачаткам новага на выгнанні жыцця. Не была гэтая споведзь з добрай падрыхтоўкай і супакаеннем, але з міласэрнасці Божай прынесла вялікую пацеху маёй

душы. У малітве і ўдзяленні святых сакрамантаў шукалі ўсе полькі-выгнанкі ўцехі і чэрпалі сілы для змагання з тугой, якая нас апаноўвала. Праз некалькі дзён пасля пакідання вязніцы і шаноўных даглядчыкаў, якія мне аказалі вельмі шмат спачування, з нанятага ўжо жылля пайшла да віца-губернатаршы сказаць ёй, што здароўе маё, знішчанае доўгім і нязручным падарожжам, патрабуе лячэння і адпачынку; таму вымушана адмовіцца ад гонару прыняцця абавязкаў настаўніцы пры іхніх дзецях, як гэта мне п. губернатар прапаноўваў.

Неўзабаве пасля гэтага прыехала п. доктарша Пацалаеўская пазнаёміцца са мной. Выпытвала дэталёва пра маю падрыхтоўку ў навуках. Я смела адказвала на яе пытанні і дала слова, што сумленна займуся выхаваннем яе дзяцей; прасіла, каб зайсці да іх для знаёмства з яе мужам і дзецьмі. Мусіла на тое згадзіцца, хоць у такой вопратцы, якую мела, прыкра мне было ім прадстаўляцца. Назаўтра раніцай прыслалі па мяне коней, і я паехала да пп. Пацалаеўскіх. Усё мне ў іх падабалася, пачаўшы ад мілых дзяўчынак да самога доктара; толькі пакоік, прызначаны мне, малюткі, досыць цёмны і з вялікай печчу нязручным мне падаўся, асабліва для заняткаў. Што да платы, то сказаў мне п. Пацалаеўскі, што будучы незаможным, не можа мне прызначыць больш, як 250 рас. руб., тым больш, што дочкі яго распачалі ўжо вучобу і што ён задаволены настаўнікамі, таму не можа перарываць заняткі. І так былі настаўнік музыкі п. Габрыель Міхалоўскі з Вільні, добрую мае методыку і прыязныя стасункі з ім атрымоўваюцца, англічанка выкладае ангельскую. Нейкая расейка вучыць сваёй мове і матэматыцы, з той рассталіся б, каб тыя заняткі не былі для яе адзіным сродкам для жыцця. Мяне прасіў пра мацярынскую апеку над дзецьмі, пастаянны за імі догляд, да таго ж пра навуку рэлігіі, польскую, французскую і нямецкую мовы, польскую і агульную гісторыю, геаграфію і ручную працу. Я згадзілася на гэтыя ўмовы, гаворачы, што ў сённяшнім маім становішчы нічога іншага жадаць не магу, што мне ў іх падабаецца, што маю надзею з прынятымі абавязкамі сумленна справіцца. Прасіла даць мне 20 рас. руб наперад для прывядзення сябе ў парадак. Настаяла на той умове. Справіла сабе за гэта сякую-такую вопратку і зажыла. Было гэта свята нараджэння Маці Божай. Выходзячы з касцёла, сустрэла прысланых сюды перада мной абываценяў Лідскага павета пп. Адама Марачэўскага і Яна Рыхлевіча; абодва гэтыя некалі вельмі заможныя грамадзяне, памерлі больш за дзеяць гадоў таму назад ужо пасля вяртання з Сібіры. С. п. Адам Марачэўскі пазнаёміў мяне з усімі сваімі знаёмымі, з сям'ёй найшаноўнейшых паноў Віткевічаў, у якіх, як і ў самім пану Адаму, мела зычлівых і прыязных мне людзей аж да выезду з Сібіры. Пані Вітковіч, мілосніца цярпеўшай людназсці, была непараўнальнай у пасвячэнні сябе і ахвярнасці для бліжніх, у абмежаванні сябе самой. Ішла з кійком у руках, сціпленька апранутая, у хустачцы на галаве, але з лёгкасцю можна было пазнаць у ёй высокае паходжанне і вялікую дабры-

ню пры найлепшым выхаванні. Я займела ад высакароднай гэтай матроны шмат дабрыні, і гэтага ёй да магілы не забуду. На другі дзень пайшла ў паліцыю, каб аддаць лісты да маіх крэўных у краі; тут сустрэла сястру Дамброўскую з Вільні, апранута бедна, па-свецку; не было каму старацца, каб пакінуць яе пры касцёле ў Томску; таму няшчасная манашка мусіла аддаліцца ад гэтага месца ўцехі і ехаць у балоцісты гарадок Нарым. Шкада мне яе было сардэчна, здавалася мне, што яшчэ пры жыцці ідзе ў магілу!

Знаёмыя мае, пра якіх успамінала, адведалі мяне пару разоў. Доктар Струміла прасіў прыняць для захоўвання грошы аднаго з яго знаёмых, які, хворы на тыф, мусіў застацца ў томскім шпіталі. Зашыты яны былі ў палатняны пас, а калі іхні ўладальнік п. Пшавоскі прыйшоў да здароўя, аддала яму схаваныя грошы, якія ў шпіталі лёгка маглі б знікнуць. У суботу 14-га верасня ў дзень Маці Божай, а 5-й гадзіне па поўдні паехала да пп. Пацалаеўскіх і прабыла ў іх пяць гадоў. Старэйшая іхняя дачушка Люця мела 11 гадоў, малодшая Коця — 9. Люця прыгожая была, Коця менш ладная, але вялікіх здольнасцяў да навук, абедзве міленькія, вясёлыя, Коця асабліва была гуллівая і свавольная. Самі паны Пацалаеўскія вельмі сімпатычныя.

Дні міналі за днямі пры рэгулярнай працы і розных занятках, якіх ніколі не бракавала; сплылі нарэшце два гады майго ў панства побыту; таму задумалася мне падрыхтаваць маіх вучаніц да 1-й святой камуніі. Паразмаўляла пра тое найперш з п. Пацалаеўскай, якая мяне вельмі прасіла пра іх падрыхтоўку; бацька не быў супраць, я ўзялася за годную, наколькі гэта ў людской моцы, падрыхтоўку дзяўчынак да прыняцця імі Бога і Пана.

На некалькі дзён перад тым перапыніла ўсе ўрокі і забавы, і былі мы занятыя набліжаўшымся ўрачыстым днём. Маці сказала пашыць ім прыгожыя белыя сукенкі, адзетыя ў іх з вяночкамі і вэлюмамі на галовах пайшлі перад выездам да касцёла развітацца з бацькам. Бацька сардэчна іх пацалаваў, але быў нейкі задумлівы і смутны.

Прыгожая была душа ў гэтым чалавеку, але вялікія захапленні і заляцанні прывабных сібірскіх жанчын, а таксама занядбанне рэлігійных практык зрабілі на яго найгоршы ўплыў, знішчылі спакой душы і здароўе. Я ніколі шкадаваць не перастану і дараваць сабе не змагу, што не была з ім адкрытая, наадварот пазбягала яго таварыства. Чалавека такой прыгожай натуры, такога шляхетнага характару, пры тым вялікага розуму, энергіі, адвагі, ненавідзеўшага фальш, а аднак ляцеўшага ў пропасць разбэшчанасці, ніколі не сустракала.

Кс. Міхал Скарубскі, які спавядаў маіх вучаніц і ўдзяліў ім першую св. Камунію, бываў у нас, размаўляў з дзецьмі, гуляў і жартаваў з імі, і паненкі былі шчаслівыя, калі ён заглядваў да нас на хвілю. Праз нейкі час панства Пацалаеўскіх змяніла жыллё, з таго часу мы з дзяўчынкамі жылі асобна, у афіцыне дома, у якім размяшчалася панства Пацалаеўскіх. Мы мелі два пакоікі, пярэднюю і кухеньку разам з шаснаццацігадовай дзяўчынкай для

прыслужвання. На абед мы хадзілі да панства Пацалаеўскіх, а гарбату рана і ўвечар мелі ў сябе. Калі хто да нас прыходзіў, пані Пацалаеўская таксама нас адведвала, чым рабіла нам вялікую прыемнасць. Доктар у доме таксама быў госцем, бо выконваючы абавязкі гарадскога лекара, быў вельмі моцна заняты, а пры тым запрашаўся знаёмымі вечарам на карты. Знаёмыя мае па ссылцы адведвалі нас таксама час ад часу, прыходзіла часта п. Віткевіч, яе дочкі Марыня, маладзенькая 14-гадовая паненка, Геня — меўшая 9 ці 10 гадоў, і брацік іхні Стась, які меў 15 гадоў; былі гэта дзеці шаноўных бацькоў, надзвычай старанна выхаваныя, таварыства якіх добра ўплывала на маіх вучаніц, і таму было вельмі мне пажаданым. Але заўважыла пані Пацалаеўская, што Стась (які цяпер ёсць вядомы ўсім як мастак і пісьменнік п. Станіслаў Віткевіч) мае пэўную прыхільнасць да Люці, абавязала мяне, каб маладога Стася не запрашала на свае імяніны, якія набліжаліся. З вялікім смуткам я мусіла на тое згадзіцца і ніколі не забуду той прыкрай для мяне хвілі, калі Стась, у якім я бачыла найпрыгажэйшыя прыкметы душы, прыйшоў павіншаваць мяне з імянінамі і не быў мной запрошаны, пайшоў смутны, не могучы схаваць узрушання. У пп. Вітковічаў вучаніцы мае найлепш гулялі, а я цешылася з таго, што развіваліся ў тым доме іхнія польскія пачуцці. Гулялі там у розныя гульні, за фанты прысуджалі Стася і прыяцеля яго Конрада Прушынскага, сённяшняга народнага пісьменніка, чалавека вялікіх на тым шляху заслуг, дэкламаваць якую-небудзь паэзію; менавіта ў адзін з вечароў адзначыліся маладзёны прыгожай дэкламацыяй не толькі твора нашага прарока Адама, але і ўласных сваіх вершыкаў. Да таго дзіцячага кола польскага таварыства належалі дачушкі пп. Астраменцкіх і Жэня Прушынская, іхняя прыяцелька і таварышка ў навуцы, сястра п. Конрада Прушынскага.

IX

У той час я моцна зажурылася, бо мяне закранулі балючыя страты. Памёр бедны, дарагі мой бацька, у самоце, у нястачы, у занядбанні. Страціла таксама любімага брата Цыпрыяна. У дзень, калі атрымала пра яго смерць вестку, была вымушана суправаджаць паненак на святочны вечар, дзе бачачы весялосць і паўсюль усмешлівыя твары, сэрца мне разрывалася ад думкі пра мае пакуты і страты. Назаўтра адбылося жалобнае набажэнства за спакой яго душы; было шмат зычлівых да мяне асоб, пераважна жанчын, бо мужчыны ў тую пару амаль усе былі занятыя. Дзве пані, якія любілі мяне, Вікторыя Пянькоўская, жонка Людвіка Пянькоўскага і жонка доктара Марыя Гутаровіч, прыйшлі раней, перад набажэнствам і пасля заканчэння ўсяго пайшлі. Няхай ім Бог небам заплаціць за іх сардэчнасць. Штораз смутней было мне ў панства Пацалаеўскіх. Сам пан доктар пачаў цярпець на здароўе, не гаварыў нікому пра тое, але відочна худнеў і смутнеў. Жонка яго ўражана была падобнымі праяўленнямі, я пасля перанесеных стратаў

не магла ўцешыцца. Шаноўны доктар пан Конрад Хмялеўскі[1], радзіў мне, каб змяніла неяк лад жыцця, і было б вельмі добра, каб магла выехаць куды-небудзь на вёску. Не мела на гэта фінансаў, а пакінуць працу, каб стаць каму-небудзь цяжарам, не хацела. Бясцэнны доктар выпытваў яшчэ, чаму не куру папяросаў, як перад тым? Адказвала на гэта, што атрымала ліст ад сястры, у якім мне піша, што цэлую зіму з шасцёркай дзяцей прабыла ў неацепленым жыллі, харчуючыся толькі хлебам, таму нягодна, каб пры такой смутнай рэчаіснасці дазваляла сабе такія непатрэбныя выдаткі. На другі дзень шаноўны доктар прынёс мне вялікі пудэлак папяросаў, каб я ўпрыемніла сабе жыццё, бо ўбачыў ужо ўва мне схільнасць да меланхоліі. Адчувала, што са мной кепска, не ведала, як сабе парадзіць. Сказала пану Пацалаеўскаму, што мушу пакінуць іхні дом і змяніць занятак; доктар, як і пані лічылі гэта за капрызы з майго боку; нікому з іх не прыйшло ў галаву, што мне ўжо не хапае маральных сіл, што такі быў у мяне вынік прайшоўшых падзей, атрыманых удараў. Доктар Хмялеўскі прыйшоў аднаго дня паведаміць мне, што мае ўжо для мяне жыллё з усімі выгодамі і бясплатна.

Падзякавала яму найсардэчней за яго зычлівасць, але рашуча адмовіла прыняць гэтую ахвяру, гаворачы, што ніхто з нашага таварыства не ёсць такім заможным, каб мог аказаць мне падобнае дабрадзейства. Дачулася, што каталіцкае таварыства шукае чалавека, які б заняўся вучобай і апекай над дзецьмі бедных католікаў, сірот па польскіх жабраках, вырашыла гэтым заняцца. Прызналі гэта за вар'яцтва — пан Пацалаеўскі гневаўся на мяне, а не дадумаўся, каб прапісаць мне нешта ўзмацняльнае, нейкія сродкі для супакаення нерваў. Трэба мне было абавязкова болей спаць, не прымушаць сябе да рэчаў прыкрых, такіх як вымушаныя візіты да суб'ектыўных асоб.

У апошні год майго побыту ў панства Пацалаеўскіх прыйшоў на свет сынок, якога назвалі Домцем, бо імя бацькі было Дамінік. Прыгожанькае гэтае дзіцятка сталася пацехай для бацькоў, якія з сапраўднай любоўю мітусіліся каля прыгожанькага маленькага.

Паненкі станавіліся ўжо паўнагадовымі, трэба было іх ужо ў свет выпраўляць, а я не была здольная прыняць на сябе гэты абавязак суправаджаць іх на ўсіх забавах, знаёмствах. Баялася адказнасці ў выпадку няўдачнага

[1] Конрад Хмялеўскі (нар. 1838 у Вільні, пам. 10 жніўня 1899 у Налянчове) — польскі лекар, дырэктар курорту ў Налянчове, удзельнік аргшанізацыі па падрыхтоўцы Студзеньскага паўстання, сібірак. Сын Аляксандра і Пелагеі Алендскай. Закончыў Шляхецкі інстытут у Вільні і Лекарскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта (1860). Удзельнічаў у падрыхтоўцы Студзеньскага паўстання, належаў да арганізацыі «белых». У студзені 1862 года быў арыштаваны і сасланы ў Верхнеудзінск, Табольск і Томск. У 1867 годзе яму дазволілі вярнуцца ў край. З 1867 да 1869 года практыкаваў у Ковелі, потым перабраўся ў Варшаву. Разам з Фартунатам Навіцкім і Вацлавам Ігнацым Лясоцкім уваскрэсіў Лячэбную ўстанову ў Налянчове, дырэктарам якой быў ад 1886 года да смерці. Памёр у Налянчове, быў пахаваны на гарадскіх могілках у Бахотніцы.

выбару Люці сярод дабіваўшайся яе рукі моладзі; а магло гэта наступіць вельмі хутка, бо з Люці была прыгожая паненка. Каб яе выбар упаў не на паляка, я таго б не перанесла, а пярэчыць усёў сям'і панства Пацалаеўскіх не хацела. Пры тым мела непераадольную агіду да гэтага таварыства, яго звычаяў, да тых розных строяў і бяссонных начэй. Вось якія былі прычыны, з-за якіх я мусіла расстацца з сям'ёй панства Пацалаеўскіх, з сумам для іх і болем для мяне, бо як бы там ні было, палюбіла гэты дом, які мне Пан Бог з міласэрнасці сваёй для жыцця на выгнанні прызначыў. Прыняла абавязак наглядчыцы ў прытулку на Ялані, томскім прадмесці, дзе пан Чыгір разам з кс Юзафам Давідоўскім, рэктарам семінарыі ў Варнянах на Жмудзі, нанялі для дзяцей памяшканне. Нарэшце я пакінула дом панства Пацалаеўскіх. Суровыя ў меркаваннях людзі называлі гэта шаленствам, так было на першы погляд, але ў рэчаіснасці іначай.

Не буду апісваць сцэны расстання майго з домам доктара: скажу толькі, што п. Пацалаеўскаму і мне шмат яно здароўя і жыцця каштавала. З-за нагавораў п. Малгудовіч змяніў ужо доктар свае добрыя пра мяне думкі, аднак не ведаў зусім, што дочкі яго ўжо былі нядобрымі да мяне, што цалкам былі аддадзены паням Аршалавай і дзвюм іншым, што ў іх дамах і іхнімі стараннямі меліся рабіцца планы на будучыню яго дачок і г. д. Доктар наяву ні ў чым мяне не абвініў, нядаўна яшчэ прасіў, каб над дочкамі яго наглядала, гаворачы:

— Пані не ведае, якія гэта жанчыны, якія сапсутыя! Няма ні адной шаноўнай, хоць маюць мілую і сціплую знешнасць. Не хачу думаць, што можа стацца з Люцяй і Коцяй пасля маёй смерці, страх мяне агарнае! Я павінна была хаця б яшчэ на год у іхнім доме застацца; цяпер шкадую і кару сябе, што таго не зрабіла.

У прытулку было больш за дзясятак дзяцей: дзяўчынкі і хлопчыкі; у тым самым доме жыў ксёндз рэктар Давідовіч з некалькімі ксяндзамі, з якіх прыгадваю кс. Міхала Валоўскага, вельмі набожнага старца, якога раней, хоць вельмі коратка і рэдка, адведвала, і ён рады быў мяне бачыць; кс. Ігнацыя Дашкліневіча, старога, але яшчэ моцнага; кс. Плацыда Шаркоўскага, маладога яшчэ, вялікага аскета. Усе яны што дзень адпраўлялі святую імшу; айцец рэктар вучыў дзяцей рэлігіі і моцна працаваў над падрыхтоўкай іх да Св. Камуніі. Спавядаліся яны ў вялікую сераду, а ў вялікі чацвер прынялі Пана Езуса вельмі набожна з вялікім засяроджаннем духу. Яшчэ вечарам таго ж дня прыехала з вёскі сястра адной з дзяўчынак — Альжбеткі, каб яе забраць з сабой. Айцец рэктар не згадзіўся на гэта, хочучы, каб яшчэ адзін дзень яна правяла ў канцэнтрацыі духу. Разгневаная гэтай адмовай, жанчына пайшла да губернатара, абвінаваціла кс. Дашкліневіча ў заснаванні школкі і прымусовым утрыманні Альжбеткі, патрэбнай ёй у тыя дні на гаспадарцы; кідала пры тым найабрыдлівыя ачарненні на ксяндза-рэктара. У выніку таго абвінавачвання кс. Дашкліневіч быў арыштаваны і

пасля некалькідзённага ўвязнення высланы ў Каінск на поўнач Томскай губерні, а дзяцей загадалі распусціць. Кс. рэктару дазволілі заглянуць яшчэ перад ад'ездам дадому; смутнае гэта было для мяне расставанне, увесь Томск, а дакладней каталіцкае таварыства аплаквала выезд айца рэктара. Паколькі некаторыя дзеці паходзілі з вёсак патрэбны быў пэўны час на апавяшчэнне бацькоў, каб іх забралі, іншыя зноў не маглі знайсці прытулак так хутка, а тут паліцыя пастаянна прыходзіла, прымушаючы, каб іх не было. У роспачы я пайшла да губернатаршы і благала яе пра апеку над няшчаснымі сіротамі; сказала ёй, што я — апякунка і старшыня ва ўсіх прадпрыемствах для няшчасных у Томску, таму няхай жа мае літасць над найняшчаснейшымі з усіх польскімі сіротамі, якія ніадкуль не могуць атрымаць дапамогі на той чужой зямлі. З гневам адказала мне, што ўсё тое, што робіцца па волі і загадзе яе мужа, ёсць справядлівае.

— Не пярэчу таму, але я пэўная, што тыя, хто выконвае загады пана генерала дапускаюць злоўжыванні, бо не магу дапусціць, каб пан генерал загадаў гэтых бедных дзяцей выкінуць на вуліцу ў такія моцныя маразы без цёплай вопраткі для таго, каб памерзлі.

Пайшла генеральша злая і разгневаная, але паліцыя не выганяла дзяцей, пакуль іх не паразбіралі. Альжбетку забрала пані губернатарша пад сваю апеку і памясціла ў прыюце для праваслаўных дзяцей. Я пасялілася на нейкі час у Астраменцкіх. Пайшла мне на дабро тая размова з губернатаршай, бо калі адзін з золатапрамыслоўцаў прыехаў у Томск, каб знайсці настаўніцу для сваіх дзяцей, і не могучы знайсці ні адной расейкі, наладзіў вечар пад назвай «Крышэнне капусты» і запрасіў п. губернатаршу і жонку начальніка жандармерыі і ў вясёлай размове прасіў тых паняў даць яму настаўніцу; у гэты час п. губернатарша прыпомніла пра мяне і сказала, што ведае адну польку, праўда сапраўдную фанатычку, але якая добра гаворыць па-французску, і можа яе рэкамедаваць. Абедзве гэтыя пані абяцалі звярнуцца да сваіх мужоў па дазвол для мяне на выезд з Томска, калі той пан згодзіцца прыняць мяне пад сваю адказнасць. З таго часу я зноў мела за што жыць, а з матэрыяльнага погляду мела ўмовы лепшыя, чым перад тым. Яшчэ да майго выезду ў паўднёвую енісейскую тайгу да пп. Квяткоўскіх настаўніцай даведалася я пра невылечную хваробу пана Пацалаеўскага. Ксёндз Давідовіч, ведаючы таксама пра гэта, напісаў «Трактат аб споведзі» і прыслаў мне тую кніжачку, абавязаўшы мяне аддаць яе доктару Пацалаеўскаму. Я, ведаючы ўзрыўны характар доктара, не мела на гэта адвагі, як таксама і ніхто са знаёмых, бо ўсе ведалі, што ад часу сваёй жаніцьбы доктар не спавядаўся і заўсёды кпіў з касцельных набажэнстваў і сакрамантаў. Знайшоўся нарэшце адзін з ксяндзоў, які адважыўся ўручыць брашурку доктару Пацалаеўскаму. Сказаў так:

— Пайду ў імя Божае, мо ж той пан мяне не заб'е, а нічога больш не баюся.

Быў гэта с. п. кс. Ігнацы Дашкліневіч. Пайшоў смела; калі зазваніў у дзверы, сам пан Пацалаеўскі адчыніў яму іх і ветліва прывітаў прыйшоўшага, адказаўшы на вітанне ксендза

— На векі вякоў, аман.

Калі селі для размовы, ксёндз Дашкліневіч адазваўся:

— Ксёндз Давідовіч, ведаючы, што пан цяжка хворы, і клапоцячыся пра панскую душу напісаў «Трактат аб споведзі» і патрабуе шаноўнага пана прачытаць яго цалкам, робіць ён гэта з найлепшага сэрца, вельмі просіць, каб пан прачытаў гэтую яго працу ад пачатку да канца і даў яму ў тым слова

Доктар выслухаў спакойна тую прамову, пацалаваў руку ксяндза і даў слова, што выканае просьбу ксяндза Давідовіча, як ксёндз таго вымагае. На другі дзень прасіў жонку, каб прывяла мяне. Калі я прыйшла, сказаў так:

— Ксёндз Давідовіч напісаў для мяне «Трактат аб споведзі» — прашу напісаць яму падзяку за яго да мяне зычлівасць і сказаць, што прачытаў ад пачатку да канца; не ўсё супадае з маімі перакананнямі, але зраблю тое, што мне ксёндз Давідовіч радзіць; буду спавядацца, а паню прашу аб арганізацыі мне споведзі.

Я паехала адразу да кс. Валерыя Грамадзкага, у той час яшчэ вікарыя, з просьбай пра спаўненне пажаданняў хворага доктара Пацалаеўскага. Пазней рабіла падрыхтоўку ў доме для прыёму ксендза з Панам Богам, што мела адбыцца назаўтра а 10-й раніцы. Пасля вельмі кароткай споведзі і Св. Камуніі, а потым пасля выхаду ксендза жонка, дочкі і я прыйшлі павіншаваць хворага са шчасцем, якое спазнаў; доктар выказаў вялікае задавальненне з паяднання з Панам Богам і некалькі разоў сказаў:

— Ото, ксёндз, ото, ксёндз, каб усе былі такія. Што ж можна вымагаць ад слабога чалавека!

Праз два, здаецца, тыдні выехаў хворы доктар не на лячэнне, як гаварыў, а на свой канец у Белакурыцкую, не могучы перанесці віду любімай сям'і пры сваёй смерці. Вёска Белакурыцкая размешчана за 70 вёрст ад Томска ў прыгожай мясцовасці, паблізу канца адгалінавання Алтайскіх гор, мела свежае паветра, якое вельмі карысна дзейнічала на хворых, і належала таму да лячэбных месцаў, мала яшчэ зведаных. Праз нейкі час патэлефанаваў пан Пацалаеўскі, каб мы неадкладна прыехалі: кс. Грамадзкі, старэйшая яго дачка Люцыя і я. Жонка хацела абавязкова ехаць з намі, але пані Аршавулава і Шушлаева, без парады якіх ужо нічога не рабілася, а таксама Люцыя, не дазволілі таго, гаворачы, што нельга нічога рабіць супраць волі хворага, што калі б хацеў, каб жонка прыехала, то тэлефанаваў бы і да т. п. Я прасіла з усіх сіл пані Пацалаеўскую, каб ехала, гаварыла, што прыбыўшы на месца магла б адразу не паказвацца, а была б гатова, калі б муж паклікаў; Люцыя аднак цвёрда не дазволіла маці ехаць, і мы паехалі ўтраіх.

Ложка хворага стаяла пасярод пакоя, доктар ляжаў на ім без руху, рукі меў складзеныя на грудзях, як у памерлага. Калі мы ўвайшлі, павярнуў на нас смутна-радасны позірк:

— А жонка! Дзе жонка? Чаму не прыехала?

Пацалаваў потым дачку, прывітаў ксендза і мяне.

— Стань насупраць мяне, дзіцятка маё, — сказаў да Люці, — так, каб вочы мае на цябе глядзець маглі. Але чаму жонка не прыехала? — звярнуўся з пытаннем да мяне.

Адказала што прыедзе, а засталася, каб знайсці надзейную асобу, каб ёй даверыць малога Домця.

— О, жонка, жонка! Якая добрая жонка! Якая цярплівая жонка! О, чаму яна не прыехала і калі прыедзе!?

Я адразу затэлефанавала, каб прыехала да нас з доктарам Ажэшкам, бо баялася за яе ў такім смутным і хваравітым тым падарожжы. Хворы нецярпліва выглядаў жонку; колькі разоў дзверы адчыняліся, павяртаў зрок свой у той бок і пытаўся, ці гэта не жонка. З Люцяй размаўляў вельмі шмат; мы сядзелі пры доктары наперамену. Пану Буткевічу, які зычліва пры ім знаходзіўся, доктар, паказваючы на мяне, сказаў:

— Гэта сапраўдная наша прыяцелька.

Ксяндзу сказаў, што спавядацца не будзе, бо святой камуніі ўжо прыняць не можа. Калі ў чарговы раз мы з Люцяй знайходзіліся пры хворым, апошні раз сказаў:

— Няма жонкі, прагнуў бы яе ўбачыць. О, жонка! Найлепшая жонка!

Потым папрасіў мяне, каб пакінула яго з Люцяй, прамовіў:

— Як буду паміраць, паклічу пані.

Недзе праз паўгадзіны ўвайшла пакліканая, доктар сказаў:

— Бывайце.

Паглядзеў з болем, пачалося хрыпенне. Доктар Грамадзкі пачаў малітву за канаючых. Доктару падалі грамнічную свечку, ён уткнуў зрок у адну кропку і зрабіў апошні выдых.

Пры дапамозе пана Буткевіча апранулі памерлага і паклалі яго на тапчане; маліліся пры ім наперамену. Была сям'я панства Буткевічаў, яшчэ некалькі католікаў, прыходзілі таксама тамтэйшыя жыхары. Гарачыня была вялікая, і цела пачало разлагацца, нягледзячы на прымяненне ўсякіх сродкаў нельга было зменшыць удушлівага паветра, таму забілі труну і перанеслі яе ў пакой, дзе прыезджы ксёндз адпраўляў набажэнства і спавядаў. Са святой імшой чакалі да 11-й гадзіны; было ўжо па ахвяраванні, калі пачуліся званкі, і пані Пацалаеўская ўбегла ў пакой і кідаючыся на труну з болем загаласіла:

— Што вы нарабілі, чаму не далі мне пабачыць мужа! О, муж мой дарагі!

Трэба было ўгаворваць няшчасную, каб аддалілася ад так жудасна чутнага паветра і каб не перашкаджала ксендзу адпраўляць святую імшу.

Жудаснага болю і роспачы гэтай беднай кабеты апісаці не здоляю. Удары адзін за другім падалі на яе; пасля страты мужа пахавала ў наступным годзе прыгожага сынка, двухгадовага Домця, праз год шаснаццацігадовая дачка Коця памерла ад сухотаў і так хутка злучылася з бацькам, па якім невыказна сумавала.

Уміраючы Коця прасіла маці, каб дазволіла Люці выйсці замуж за аўдаверўшага пару месяцаў назад доктара Фларэнцыя Ажэшку, які быў яшчэ жанатым падчас смерці доктара Пацалаеўскага. Маці не адмовіла паміраючай дачцы; Люця аддала сваю руку пану Ажэшку, і я бачыла яе ў першыя гады жыцця з мужам, на 17 гадоў старэйшым за яе, як шчаслівую жонку, добрую маці і мачыху, выхоўваўшую двух сынкоў, якія засталіся ад першай жонкі доктара Ажэшкі. Яны дагэтуль у Томску, дзе пасяліўся доктар з часоў высылкі ў 1863 годзе. (Доктар Ажэшка быў родным братам с. п. Ажэшкі, мужа нашага празаіка Элізы Ажэшкі.)

Пасля вяртання ў Томск з асірачонай сям'ёй я падалася да паноў Астраменцкіх, адкуль 20 лістапада мусіла выехаць у паўднёвую Енісейскую тайгу, як настаўніца да паноў Квяткоўскіх, золатапрамыслоўцаў.

У пярэдадзень майго выезду, які быў разам і днём маіх імянін, я споўніла пажаданне пані Астраменцкай, хочучы развітацца з таварыствам палякаў у Томску, запрасіла бліжэйшых знаёмых на гарбату. Вечарам прыйшоў пасланец з паведамленнем ад пана Квяткоўскага, што заўтра выязджаем, таму каб была падрыхтавана. Назаўтра я паехала ў кватэру яго крэўных, у якіх спыніўся. Прыняў мяне пан Квяткоўскі ў сваім кабінеце і гледзячы на мяне пытліва і сурова, запытаў гнеўна:

— Какое это сборище было у вас вчера? (Які гэта сход быў у вас учора?)

— Было толькі некалькі чалавек, зычлівых знаёмых, якія хацелі са мной развітацца, а таксама скласці пажаданні да дня імянін, якія на ўчора прыпалі, — адказала.

Тым жа голасам і загадным тонам сказаў, каб я асцерагалася, бо ён мае права нагляду за мной і што кепска мне будзе, калі захачу сабе занадта дазволіць. Хоць у крытычным маім становішчы я вымушана была выехаць на пасаду, аднак папярэдзіла пана Квяткоўскага, што не згодная, каб са мной так паступалі, няхай сабе шукае каго іншага на маё месца. У гэты момант вочы пана Квяткоўскага прынялі іншы выраз, усмешка з'явілася на твары, і прамовіў да мяне па-польску, абяцаючы, што мне добра ў іх будзе, гаварыў, што сам быў даўней палякам і католікам і г. д. Мусіла ехаць, бо іначай быць не магло.

Калі назаўтра вечарам прыбыла да іх паўторна, застала звыш дзясятка чалавек, якія сядзелі ва ўрачыстым маўчанні. Святло яскрава асвятляла ўсё таварыства. З прыветлівай мінай тлусты, чырвоны, у арыгінальным строі, у доўгіх ботах і кароткім кафтане працягнуў пан Квяткоўскі мне руку на прывітанне, потым не стоячы, як гэта звычайна робяць расейцы, але з

цяжкасцю ўкленчыўшы, пачаў адбіваць паклоны, ад якіх яму вочы страшна крывёю набеглі. Па сканчэнні малітвы паднялі яго, і пачалося цалаванне ўсіх, не разбіраючы полу і ўзросту. Потым наступіла апрананне і выезд. Жудаснае мела падарожжа з тым п'яным панам, пачувалася куранём у кіпцюрах крэчата; у дарозе мусіла прыкурваць яму папяросы, бо яму, апранутаму ў велізарнае мядзведжае футра цяжка было паварушыцца; пра розныя спазнаныя прыкрасці мушу прамаўчаць.

Прыбыўшы ў Марынск затрымаліся на двухгадзінны адпачынак. Пан Квяткоўскі быў заняты размовай, а я, маючы з Томска адзін ліст для паслання, паслала яго з прыслужнікам. Пан Квяткоўскі, даведаўшыся пра гэта, моцна разгневаўся, а таму я сказала, што далей не паеду, а вярнуся ў Томск, бо ранейшыя яго нягжэчныя паводзіны абяцаюць мне вельмі кепскае жыццё ў яго дома, што 100 руб., дадзенага мне ім і ўжо выдаткавагага задатку, вярну яму ў Томску, бо была пэўная, што пакуль іх не зараблю, мае знаёмыя пазычаць мне патрэбныя грошы. Пан Квяткоўскі адразу палагоднеў і свае пагрозы замяніў на жарт. Таму паехалі далей, да так званай рэзідэнцыі Каргіно, дзе золатапрамыслоўцы мелі вялікія склады самых розных матэрыялаў: вопраткі, абутку, правізіі, патрэбных для жыцця ўсяго насельніцтва, якое складалася з работнікаў, пасяленцаў, г. зн. злачынцаў, якія адбылі прызначаныя гады пакарання на цяжкіх работах, атрымалі ад урада зямлю і грошы на будаўніцтва і тым спосабам утварылі абшырныя вёскі. Усе тавары дастаўляліся з Краснаярска, калі рэкі ставалі і з лёгкасцю можна было перавезці іх цераз Енісей у Тайгу. Едучы да Каргіна набраліся досыць страху з-за пачаўшайся вялікай снежнай замяці; густы снег сыпаўся і сыпаўся, коні ісці не хацелі; тады фурман, якога звалі конюхам пачаў думаць пра ратунак. Сані нашы былі запрэжаны ў два кані, але не пры дышле, а адзін за адным, бо на вузкіх тамтэйшых дарогах памясціцца не маглі. Фурман выпраг пярэдняга каня, падняў аглоблі ўверх, каб нас лягчэй было знайсці. Я была страшна перапужана, увесь час малілася, а мой таварыш драмаў, час ад часу адзываючыся парай слоў. Дзякуй Богу, вёска была блізка, і неўзабаве пачуліся галасы людзей, прыбыўшых нам на ратунак. Раскапалі снег лапатамі, сані не былі яшчэ цалкам засыпаны, іхні верх і нашыя галовы падымаліся яшчэ над снегам, так што мы маглі дыхаць. Раскапалі снег і на дарозе, і а 12-й ночы мы спыніліся ў Каргіно. Правялі нас у домік рэзідэнта, чалавека простага стану, які прымаў транпарты, высыланыя з Краснаярска і дастаўляў іх золатапрамыслоўцам у тайгу. (Тайга — гэта пушча, у якой у пэўных месцах, на берагах рэк ёсць золата). Домік рэзідэнта быў малы, нізкі з малымі вокнамі, а шыбы былі пакрыты тоўстым слоем снегу.

Далі мне на ноч маленькі пакойчык, які магу параўнаць з магілай, такое гнятлівае зрабіў на мяне ўражанне. Я так здранцвела маральна, што не падумала ні пра Бога, ні пра Маці Найсвяцейшую, ні пра анёла ахоўніка,

у якім магла шукаць і знайсці суцяшэнне. На другі дзень далі мне снеданне і сказалі, што неўзабаве паедзем далей. Пан Квяткоўскі, заняты рахункамі, прамовіў да мяне пару слоў, паведаміўшы пра выезд. Рухаючыся ў дарогу з Краснаярска я мела на сабе два футры: адно доўгае, як шляфрочак на белых зайцах, другое шырокае вавёркавае; боцікі высокія, да калень, на белых зайцах, з сукна і на гузікі зашпіляныя. Цяпер на ўсё гэда мусіла надзець яшчэ доху, г. зн. від мяшка, пашытага з аленевых шкур, шэрсцю наверх, з каптуром на галаве. Паколькі за намі ехалі другія сані някрытыя, я прасіла пана Квяткоўскага, каб ехаць асобна, а каб не здарыўся выпадак, пра якія пан Квяткоўскі апавядаў, што пры хуткім бегу коней у гарыстых мясцовасцях падарожны выпадаў з саней і заставаўся на дарозе, прывязалі мяне паскамі да саней, у якіх я ляжала, як у ложку. Дзіўная рэч, сані нясліся пастаянна з гары на дол, з долу на гару, а я смачна спала. А поўначы аказаліся на месцы, у Тайзе паноў Квяткоўскіх. Я прасіла, каб мяне правялі ў мой пакой, бо змучаная дарогай не хацела займацца туалетам і прадстаўляцца сабранаму таварыству. Пані Квяткоўская разам з полькай паняй Сабалеўскай, якая знаходзілася ў іх, прыйшлі са мной знаёміцца. Пані Квяткоўская, кузіна томскага арыстакрата Асташова, з заможнай сям'і, была асобай, усюды любімай у таёжным таварыстве, вельмі прыветліва мяне прывітала і праз увесь час майго побыту ў іх быда добрая да мяне. Была гэта жанчына набожная, рэлігійная, добрага сэрца і хрысціянскіх цнотаў. Дзеткі былі мілыя і ветлівыя: 10-гадовая дзяўчынка Юленька — дзіця з вялікімі да навук здольнасцямі; 9-гадовы Ціша (Ціхан), 7-гадовая Маша, з якой займалася па 15 хвілін, 5-гадовы Кеня (Інакенцій), малы растаропны хлопчык, найманодшы ў сям'і, улюбёнец маці. Трэці хлопчык, сын парабка, прыняты ў таварыства, дапамагаў дзецям у гульнях. Былі яшчэ два старэйшыя сыны панства Квяткоўскіх: Пётр — адстаўны марскі афіцэр і Базыль — пакалечаны, гарбаты, кіраваў прыіскам у бацькі. Паляк Дамброўскі, студэнт Кіеўскага ўніверсітэта, выконваў абавязкі матэрыяльна адказнага, г. зн. афіцыяла, які выдаваў матэрыялы, патрэбныя для дома і работнікаў, а таксама меў надзор над свірнамі, якія там называюцца амбарамі. Гэта было ўсё дамашняе таварыства. Госці часта адведвалі панства Квяткоўскіх, але пераважна асобы, якія гулялі ў карты. Я хутка прывыкла да ўсяго і да ўсіх; імпанавала мне прастата ў жыцці, у абыходжанні, у вопратцы, лёгкасць і шчырасць у размовах. Вучні мае былі вельмі лёгкія ў кіраванні. Пасля перадабедзенных урокаў хадзілі мы з дзецьмі на шпацыр, хоць маразы былі вельмі моцныя, звыш 40 градусаў, але мы цёпла апраналіся: у авечыя кажушкі, футраныя шапкі і валёнкі. Дзеці гулялі блізка каля дому, дзе снег быў больш утаптаны: ездзілі на малых саначках, самі сябе возячы, у чым і дзяўчынкі ім дапамагалі.

Я не мела дастатковых навыкаў у расійскай мове, хоць у Літве ў гімназіях і пансіёнах вучылі ўсе прадметы на той мове, і мой першы настаўніцкі

абавязак у расійскім доме выпадаў, то пазней адвыкла ад яе і часта была заклапочана, як выказацца, прасіла не раз пана Дамброўскага выратаваць мяне ад клопату. Па яго парадзе пачала чытаць рускія часопісы, знаёміцца з літаратурай; падабаліся мне перакладзеныя з нямецкай і ангельскай прыгожыя аповесці, і лягчэйшай стала для мяне на той мове размова.

Надышла вясна, зніклі снягі, у канцы траўня зямля пакрылася прыгожай зелянінай, і з'явіліся кветкі; лягчэй мне зрабілася на душы, але сумавала па касцёле і па сваіх.

У капальнях пачаліся работы; у час адпачынку мы хадзілі з дзецьмі паглядзець на працу работнікаў. Дзеці апавядалі мне з вялікім веданнем справы і вялікім захапленнем пра ўсё, што тычылася тых работ. Панства Квяткоўскіх, седзячы ў цёплыя дні на верандзе, назірала за рухам, які панаваў на ўсім прыіску; усё там ажыло, прырода і людзі, работы ішлі ў вялікай спешцы, з запалам, бо лета будзе кароткае, а работы вельмі шмат. Адразу ў першыя дні траўня разышлася вестка, што некалькі работнікаў уцякло. Вялікую гэта крыўду рабіла ўладальніку капальні, бо замяніць іх не было каму, паколькі толькі зімой стараліся прыдбаць работнікаў. Неўзабаве злавілі няшчасных уцекачоў, бо, не знайшоўшы ў тайзе ніякага харчу, падходзілі да прыіска, каб дастаць хлеба. Адзін з уцекачоў, агаладалы, слабы, да цяжкай работы не здатны, прызначаны быў з дзвюмя кабетамі да капання градак пад кветкі каля акон дома; другі — да работ свайго прызначэння, і ўсе заўсёды без яды да абеду, які даваўся ў звычайную пару. Прыехаў памочнік спраўніка з казакамі, а паколькі на прыіску час вельмі дарагі, то адразу пасля пачастунку ўрадніка прыступілі да суда над злачынцамі, прызначэння і выканання кары, якая была выканана хвастаннем казацкімі нагайкамі. Не далічыліся паміж вінаватымі таго, які з кабетамі капаў градкі пад кветкі. Кабеты паўтаралі, што няшчасны гаварыў ім пару разоў, што не пераживе цялеснай кары. Быў, наколькі я ведаю, чалавекам інтэлігентным, які дзіцем страціў бацькоў, быў прыняты і выхоўваўся як уласнае дзіця ў вельмі заможнага купца. Па заканчэнні навук вёў справы свайго апекуна, размаўляў на замежных мовах, належаў да заможных таварыстваў. На няшчасце палюбіў гульню ў карты, пачаў траціць сродкі свайго апекуна, які не звяртаў на гэта ўвагі, пакуль ішло пра малыя сумы, нарэшце ўвайшоў у гульню з шулерамі па прафесіі, прайграў значную суму свайго дабрадзея, за што заключылі яго ў вязніцу і пасля доўгага сядзення быў прыгавораны да цяжкіх работ.

Гэтага няшчаснага пачалі шукаць. Знайшлі яго ў так званай хлебапякарні, дзе пекары пяклі хлеб для работнікаў і варылі яду, павешанага пад нізкім дахам у пазіцыі ўкленчанага, бо з-за свайго высокага росту не мог бы інакш памясціцца.

Калі прыступілі да пакарання астатніх вінаватых, падышоў адзін з іх да Базыля Квяткоўскага, які ў маёнтку бацькі быў «упраўляючым» кіраўніком прыіска, і закрычаў, падаючы перад ім на калені:

— Васіль Аляксандравіч, прабачце мяне!

Базыль адказаў, што не можа, бо ён ужо другі раз уцякае, тады ўцякач ударыў яго нажом у жывот. Разлёгся страшны крык. Пані Квяткоўская, пачуўшы яго і ўбачыўшы любімага сына, якога са звешанай галавой неслі некалькі чалавек, крыкнула:

— Забілі Васю, забілі! — і ўпала самлеўшая.

Пасля агляду параненага ўбачылі, што ўсё раненне абмежавалася разрэзам летняй вопраткі і лёгкай драпінай шкуры на жываце. Страта прытомнасці была ад перапуду. Работнік быў у роспачы, бо ў якасці прылады помсты меў толькі малы, тупы сцізорык, які склаўся пры ўдары. Вінаватага пакаралі нагайкамі, адаслалі ў вязніцу, дзе яго асудзілі на 12 гадоў катаржных работ. Пасля адбыцця прызначанага тэрміну вязніцу даўно пакінуў.

Прыведзены клапатлівай маці доктар застаў пана Базыля зусім здаровым, але стары бацька, уражаны здарэннем, захварэў і праз тры дні памёр. Ніхто не прадбачыў ніякай небяспекі, дапускалі толькі, што нездаровы, бо выпіў, можа больш, чым звычайна. То сядзеў на верандзе, то ляжаў, а калі я прыйшла да яго сказаў мне сваім звычайным голасам, падаючы папяросу:

— Rauchen Sie!

Адразу пасля гэтага крыкнуў:

— Прападаю! Дабраславёны, хто веруе!

Ноччу маці і сыны сядзелі пры хворым, я ляжала на ложку, не распранаючыся. А 1-й ночы ўвайшоў пан Пётр да мяне і, заліваючыся слязамі, гукнуў:

— Бацька сканаў!

Я застала малодшых дзяцей укленчыўшымі пры ложку, залітымі слязамі.

Суседзі з'ехаліся на пахаванне. Мы з дзецьмі вілі вянкі і паклалі ў труну шмат свежых кветак. Пахавалі нябожчыка на прыіскавых могілках, дзе ўжо спачывала найстарэйшая дачка панства Квяткоўскіх, якую бацькі і сваякі называлі Кацяй, далей некалькі магіл з ліку службоўцаў і работнікаў. Скончылася існаванне чалавека, абдаранага добрым сэрцам, досціпам, здаровым розумам, сімпатычнай знешнасцю. Шчасце яму спрыяла, меў добрую жонку, паслушных дзяцей, здольных да навук, са шляхетным характарам, любімы ўсімі суседзямі — з тым усім, аднак, кепска скончыў, бо страціў веру. Сам яе не меў і дзецям яе не пакінуў, то таксама не спазналі яны шчасця ў жыцці, бо без веры кепска жыць і памірaць.

Не магу нічога не распавесці пра гэтую сям'ю, якую маю добра ў памяці, і так:

Пётр ажаніўся неабдумана ў Пецярбургу, страціў надзею і кепска скончыў, пакінуўшы малую дачушку;

Базыль памёр нежанаты, працуючы ў прыісках на чужых;

Іван пасля заканчэння ўніверсітэта ажаніўся і працуе доктарам у паўднёвай енісейскай тайзе;

Аляксандр, студэнт універсітэта, ажаніўся перад заканчэннем навук, у часы ўладарання Аляксандра II быў замешаны ў справе сацыялістаў і павешаны;

Цімафей, юрыст, перад заканчэннем навук за ўдзел у справе Софіі Пяроўскай быў сасланы ў далёкую Усходнюю Сібір;

Ціхана, майго вучня бачыла 14 гадоў назад у Пецярбургу ўжо як студэнта ўніверсітэта;

пра сёмага брата Інакенція нічога не ведаю;

Юлія, мая вучаніца, скончыла ўніверсітэт са ступенню доктара медыцыны;

наймалодшая Марыя стала фельчаркай.

Бачыла неяк пані Квяткоўскую, Ціхана і Марыю ў Пецярбургу; пасля яшчэ, купляючы білет у Маскве ў касе, сустрэла пані Квяткоўскую і Машу — што цяпер з імі, не маю звестак.

X

Восенню я атрымала ліст з чорнай пячаткай; была гэта смутная вестка пра смерць маёй сястры Эміліі Урублеўскай, якая памерла ў Вільні. Паведаміла мне пра гэта найстарэйшая яе дачка Марыя. Я перахварэла гэтую вестку і пастанавіла ад гэтага часу жыць і працаваць для асірацелай сям'і, якая аказалася ў крайняй нэндзы пад апекай старой вернай прыслужніцы, заградовай шляхцянкі, далёкай крэўнай нашай маці Анелі Макарэвіч. Дзякуючы яе апецы дзеці не памерлі з голаду і неяк так выйшлі на людзі, а было іх шасцёра. Наймалодшая дачка с. п. Эміліі, Ядвіга Шмердт, памерла, пакінуўшы двухгадовую дачушку Марыхну, якая мае на сёння 11 гадоў і вучыцца ў школе для чыгуначнікаў у Стшамешыцах Івангродскіх. Гэтай Марыхнай апякуецца і вядзе гаспадарку найстарэйшая яе цётка Марыя Хомская, дачка Эміліі, тая, якая прыслала мне вестку пра смерць маці. Апека над сям'ёй, якая засталася пасля памерлай сястры, патрабавала большай зарплаты, а я не была пэўная, ці такую мне маглі б плаціць, паколькі пасля смерці мужа інтарэсы пані Квяткоўскай захісталіся. Таму трэба было шукаць сабе новае месца. Я размаўляла з паняй Вр., шкада мне было пакідаць іхні дом, так што абедзве паплакалі, гаворачы пра нашае расстанне. Я прыняла абавязкі ў панства Гелз для дзвюх дзяўчынак: іхняй дачушкі Альжбеткі, якую звалі Ляляй, і для другой паненкі па суседстве, Воленькі Плотнікавай.

Пан Гелз быў спраўнікам, таму займаў важную пасаду на прыісках. Пані Гелз, старэйшая за мужа на гадоў 10 і вельмі непрыгожая, абавязкова хацела пазбавіцца ад настаўніцы, маёй папярэдніцы, якая яе не вельмі паважала, са мной заўсёды была добрай і ветлівай.

Я атрымоўвала ў гэтым доме 600 рас. рублёў зарплаты, мела вялікі пакой з веніцыянскім акном, прыслугу і ўсякія выгады. Вучаніцы мае, добрыя і ветлівыя дзяўчынкі, былі здольныя і ахвотныя да навук. Акрамя адзінай дачушкі мела панства Гелз пад апекай пляменніка Паўлушу Костарава, 12-гадовага хлопчыка. Бацька яго, жанаты з сястрой пані Гелз, быў ваенна-марскім афіцэрам. Жылі некаторы час у Японіі, дзе неўзабаве абое памерлі, пакінуўшы малога сынка смяртэльна хворым, як здавалася, на водную пухліну пад апеку старэнькай нянькі. Была гэта верная іх прыгонная, надзвычай прывязаная да пані Костаравай і да пані Гелз, якіх выхавала. Няня гэтая з цяжка хворым дзіцем, забраўшы пажыткі, якія засталіся пасля яго бацькоў, адолела такое далёкае падарожжа па сушы і вадзе, лячыўшы, як магла, тое дзіця, дабралася да Пецярбурга, дзе ў той час жыло панства Гелз. Яна вельмі любіла свайго выхаванца, пра яго толькі думала, для яго жыла, каго Паўлуша любіў, таго і яна любіла, напружваючы заўсёды сваю ўвагу, ці выпадкам панства Гелз не рабіла якой розніцы паміж Ляляй і Паўлушам. Не магла яна перанесці і найменшай яго адсутнасці, калі ён быў на ўроках са сваім настаўнікам, стаяла пад дзвярыма, прыслухоўваючыся да размовы, а часта, не могучы ўжо зладзіць з сабой, уваходзіла ў пакой, несучы ім чаго-небудзь смачнага з'есці ці папіць. Уся ўзрушаная, прасіла Паўлушу, каб быў паслушны, ветлівы, у навуках пільны. І добрае было з Паўлушы дзіця! Не ведаў ён сваіх бацькоў, няня, якая выхоўвала яго, была простай вясковай жанчынай, а ён вызначаўся вялікай шляхетнасцю характару і здольнасцямі і тактам у паводзінах. Паўлуша атрымаў добрых апекуноў найперш у асобе няні, якая ўратавала яму жыццё, потым у шаноўных дзядзькі з цёткай і нарэшце ў пане Сільванду, сваім настаўніку, як бы з Божай ласкі яму пасланым. Пан Юзаф Сільванд быў польскім патрыётам, нягледзячы на французскае прозвішча. Студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта, за паўстанне 1863 года сасланы ў Сібір, быў запрошаны панствам Гелз настаўнікам для іхняга пляменніка. Пан Сільванд быў чалавекам разумным, вучоным, энергічным, найшляхетнейшага характару, з вялікім веданнем свету і тактам паводзін у таварыстве і ў розных акалічнасцях жыцця, быў ён узорам для ўсіх нашых братоў-палякаў. Такі шаноўны чалавек выхоўваў сірату; Паўлуша палюбіў свайго настаўніка, слухаў яго парады і навукі, з якіх доўга яшчэ карыстаўся, перапісваючыся з ім.

На прыіску пані Квяткоўскай пасяліўся жанаты доктар п. Дзьячэнка; жонка яго старалася заняць маё месца ў панства Гелз, якіх без усякіх цырымоній часта адведвала, распавядаючы ім пра сваю дасканаласць ва ўсіх навуках, а на мяне нагаворваючы самыя розныя пакасьці. Калі гэта ўсё ні да чаго не прывяло, заняла месца ў пані Вр., дзе магла працаваць нават з карысцю для дзяўчынак, бо як расейка дасканала ведала сваю мову і літаратуру, стала канкрэтна для Юліі Вр. добрай правадніцкай на шляху набыцця ведаў, а можа нават пад яе ўплывам Юля пазней паступіла ва ўніверсітэт.

На вечарах у панства Гелз бывалі звычайна палякі, маладыя людзі, якія па большай частцы займалі нішы неадпаведныя іхнім здольнасцям у навуках, аднак іх усюды ахвотна прымалі, бо былі сапраўднай аздобай таварыства. Вось гэтыя паны, прыязджаючы да панства Гелз, заходзілі да мяне перад пачаткам забавы, і час наш сыходзіў на размовы аб прыгодах нашага жыцця, нашай долі і нядолі. Бо я ішла з маімі выхаванкамі спаць а 10-й, а вячоркі трывалі да 6-й — 7-й раніцы. А 8-ай падавалі снеданне мне і дзецям, а 9-й я пачынала ўрокі. Паны Гелз прыходзілі на снеданне найраней а 12-й, а я са сваімі выхаванкамі і пан Сільванд з Паўлушам складалі ім таварыства, маючы разам гадзіну адпачынку і другое снеданне. Потым быў урок музыкі і кароткая перадабедзенная прагулка, бо абед падавалі а 5-ай; вечарам летам адбываліся доўгія шпацыры, зімой было чытанне дзіцячых часопісаў, забавы з ляльками, ручная праца для іх. І так час мне праходзіў прыемней, чым у Томску, прыкрым толькі была аддаленасць ад касцёла; міналі тыдні, месяцы і нават гады, а нідзе ўбачыць славы Божай, нідзе прагненняў душы заспакоіць не магла. Нават і мужчыны, маладыя людзі, якія прыходзілі да мяне на гутаркі, гаварылі: «Усё ў нас ёсць, добра нам тут, а толькі прагнень душы нашай і сэрца заспакоіць не можам, таму так нам тужліва і журботна!». Няшчасны быў той, хто ўдаваўся ў прыязныя стасункі з тамтэйшымі жыхарамі, або хто жаніўся, праз кароткі час упадаў у п'янства, марнаваўся і ў нэндзы гінуў. Нічога яго задаволіць не магло, бо адна толькі рэлігія і малітва, якая з яе выплывала, вера ў прысутнасць Бога на кожным месцы не аднаму журботнаму выгнанцу прыносіла палёгку. Будучы яшчэ ў панства Вр., бачыла нейкага старога жаўнера, які сядзеў пад акном казармы, у якой ноччу мелі прытулак работнікі, і чытаў нешта ў акулярах, падышла бліжай і ўбачыла кніжку для набажэнства, зусім цёмную ад доўгага ўжытку. Запытала ў яго па-польску, як называецца і адкуль у яго гэтая кніжка? Адказаў, што паляк, называецца Навіцкі, узяты быў у войска перад 1831 годам, пасля паўстання ў пакаранне высланы ў сібірскія палкі, заканчвае тут сваё жыццё, прыняты вартаўніком з міласэрнасці пана Квяткоўскага. Калі бачыла яго другі раз, бядак горка плакаў, бо прапалі яго акуляры і ўжо маліцца з кніжкі не можа.

Адзін жаўнер з Камчаткі пеша прыйшоў на Літву, на родную зямлю, бо журба давала яму крылы для ўцёкаў; адна маці з шасцёркай дзяцей вярнулася з Сібіры ў родны край на Літву толькі на жабрачым хлебе. О, бо як маці роднай, так і радзімай зямлі ніхто і нішто паляку замяніць не можа. Таму жудаснымі і бязлітаснымі ёсць выказванні некаторых варшавякаў да бедных ліцвінаў, якія туды прыбывалі:

— Чаго пан ці пані прыехаў або прыехала ў Варшаву? Мусіш пан або пані мець значныя грошы.

Пачуць гэта з вуснаў паляка маці, якая хацела дзяцей сваіх выдабыць з зямлі выгнання і прывесці іх у любую Айчыну, якой прысвяціла сваю мала-

досць, здароўе і шчасце; маці якая тужыла вечна па той Айчыне і прагнула дзяцей сваіх навучыць асновам веры сваіх бацькоў і іхняй мове, такія словы ад землякоў пачуць, гэта для яе стылет убіць у сэрца, гэта для яе страшней, чым смерць ад ворага прыняць! О, палякі, майце ж літасць над беднымі выгнанцамі. Вы ж ведаеце, што цар не дазволіў ліцвінам вяртацца на іх родную зямлю, на іх любімую Літву. Што ж ім выгаворваць, што збіраюцца сюды, у Варшаву, адкуль іх у 1863 годзе заклікалі да паўстання, што хочуць тут прыладзіць сваіх дзяцей да нейкай працы і навучыць польскай мове. Ці ж хочаце, каб нашчадкі польскіх патрыётаў змарнаваліся? О, такія не вартыя назвы палякаў і католікаў!...

Паўтара года, здаецца мне, была я ў панства Гелз; у гэты час стараліся яны за пасаду і атрымалі такую ў Пецярбургу, з гэтай нагоды пан Сільванд і я мусілі шукаць новай працы. Адна пані, жонка золатапрамыслоўца, прапанавала мне, каб я занялася выхаваннем яе дачкі, гаворачы мне, што яе муж ахвотна дасць мне 600 расійскіх рублёў, а яна ад сябе дадасць яшчэ 100 рублёў і гарантуе найлепшае абслугоўванне і выгоды жыцця, бо як добрай прыслугі мне даць не магла, то мне сама зробіць усё, што трэба будзе і прыслужыць мне. Аднак я не мела адвагі застацца ў таго панства, бо вядомы быў сам той пан як нахабны, таму баялася, каб не спаткалі мяне ў іхнім доме якія непрыемнасці, і таму я прыняла абавязкі настаўніцы ў начальніка жандараў у Краснаярску, палкоўніка Разіна за 400 рублёў. Мы выехалі ўсе ў Краснаярск, золатапрамысловец, які жыў на паўдарозе с. п. Браніслаў Завадскі даў вечар развітання для паноў Гелз. Заехалі мы да іх і былі надзвычай пышна прынятыя: танцы, музыка, спевы, гульня ў карты працягваліся цэлую ноч да белага дня, у кожнай з тых забаў браў удзел пан Сільванд.

Аднаго разу падышла да мяне маладая паненка Таццяна Іванаўна Папова, са слязамі кідаючыся мне ў абдымкі і пачала распавядаць пачуцці кахання і шкадавання з прычыны ад'езду пана Сільванда, а таксама абыякавасці яго пры расстанні. Шкада мне яе было, супакоіла, як магла, параіўшы, каб узяла сябе ў рукі, бо пан Сільванд выехаць мусіць і што становішча яго такое, што не можа абяцаць ёй шчаслівай будучыні, нарэшце павінен вярнуцца ў радзімы край і да сям'і. Нарэшце пачуліся паштовыя званкі і экіпажы сталі перад ганкам; тады ўсё таварыства сабралася ў салоне, п. Сільванд сыграў на развітанне марш з такім пад'ёмам і сілай, што за малым струны фартэпіяна і сэрцы праводзіўшых і праводзімых не палопаліся. Пасля заканчэння марша развітаўся з усімі і выйшаў сядацца ў экіпаж, за ім вышлі і ўсе астатнія. У дарозе пан Сільванд быў смутны, я ўнікала з ім размовы, а з Краснаярска напісала яму, каб парай ветлівых слоўцаў уцешыў Таццяну І. П., дадаючы, што калі пачуццем за пачуцце заплаціць не можа і не павінен, то на спачуванне яна мае права. Падзякаваў мне за параду і выканаў яе, у выніку чаго Таццяна выйшла замуж за некага са сваёй нацыя-

нальнасці. Пана Сільванда праз шмат гадоў бачыла летась. Заўсёды шляхетны і высакародны гэты чалавек не ажаніўся, але пасля многіх цяжкасцяў жыцця цешыцца дабрабытам і павагай у людзей, займае пасаду натарыюса ў адным з гарадоў Ломжынскай губерні.

Я ў Краснаярску знайшла добрую ўдачу ў доме панства Баніных, якія былі са мной вельмі ветлівыя, дзеці мелі добрыя сэрцы, але былі капрызныя, асабліва дзяўчынка, распешчаная бацькам. Найбольш мела з ёй клопату падчас урокаў музыкі, на якіх капрызнічала, упіралася і нічога не хацела вучыць. Пані Баніна была надзвычай гаваркая. Ніколі ў жыцці, ні перад тым, ні пасля таго не здаралася мне чуць асобу, якая б так шмат гаварыла. Мучыла яна мяне ўдзень і ўначы. Днём перарывала нам урокі, а ноччу пазбаўляла сну. Што нядзелю я бывала з дзецьмі ў царкве, а што месяц прыходзіў поп адпраўляць малітвы за памерлых, на набажэнстве я разам з дзецьмі мусіла прысутнічаць. Наймільшымі маімі перадышкамі былі шпацыры з дзецьмі, пеша ці экіпажам, а таксама адведзіны панны Тэклі Траханоўскай, якая стараннямі пана Баніна і доктара Мазарава была вызвалена ад цяжкіх работ у Іркуцкай губерні і пакінута ў Краснаярску. Жыла яна ў малым доміку адна, зусім не звяртаючы ўвагі на меўшыя месца ў Краснаярску выпадкі забойстваў. Пасля забойства адной швачкі, полькі, прыбылай з Варшавы, я радзіла ёй, каб не жыла адна, а пры якой-небудзь польскай сям'і. Панна Тэкля і слухаць пра гэта не хацела, хоць магла апасацца за свой спакой, бо мела рэпутацыю заможнай — даўгоў не мела і за ўсё плаціла наяўнымі. Жыла самотная 20 гадоў у Краснаярску, не адчувала недастачы, атрымоўвала штогод 100 рас. рублёў ад пані Анелі Паклеўскай, вядомай у нашым краі і на Сібіры філантропкі, Далей мела 50 рублёў ад доктара Вільгельма Віламоўскага, жыхара Краснаярска і прысыланых з Варшавы грошай ад былой сваёй вучаніцы пані Мушанавай і іншых людзей. Пасля яе смерці знайшлі ашчаджаных 600 рублёў. Няшчасная толькі была, што праз увесь час побыту ў Краснаярску не спавядалася і памерла таксама без споведзі, гневалася на мяне, што пасля вяртання майго ў край рэдка да яе пісала.

Паколькі панства перабіралася ў Благавешчанск, дзе пан Банін меў атрымаць пасаду губернатара, я мусіла шукаць іншае месца, бо не хацела ехаць з імі і што раз аддаляцца ад любімай Бацькаўшчыны. Пасля расстання з імі я паехала ў Іркуцк, каб пабачыцца з сястрой Антанінай. Любімая Антося па дарозе ў Сібір знайшла вернага таварыша сваёй долі і нядолі ў асобе пана Эдварда Лазоўскага.

Што гэта за сціплая была падрыхтоўка да ўрачыстага абраду зашлюбін. Панна маладая спякла булачку для таварышаў і ўзялася за мыццё і шмараванне бруднай этапнай хаткі, дзе мела адбыцца «выгнанскае вяселле». І што за неспадзяванка! Ксёндз прыбыў раней, чым на яго спадзяваліся, а маладая «гаспажа» з хвалявання рады сабе даць не магла. Без пышнасці,

без шлюбных картэжаў, без кветак і яркіх агнёў дабраславіў слуга Божы двух верных яму дзетак.

Падарожжа да Іркуцка было вельмі нязручнае, я ехала з Краснаярска з нейкім Сасноўскім, казацкім есаулам, старым кавалерам, вялікім грубіянам. Па дарозе мы затрымаліся на нейкай паштовай станцыі, дзе нават парадачнага прытулку не было, адзін дрэнны пакой з выбітым акном, холадна жудасна, спала не распранаючыся, а хутчэй толькі драмала, бо да кампаніі есаулу прыйшоў даглядчык пошты, пілі, елі і смяліся гэтыя паны. У дадатак даглядчык быў брухамоўцам і хваліўся гэтым перад сваім таварышам. Што гэта была за непрыемная размова. Назаўтра мы спынілі-ся ў горадзе Канску, а даведаўшыся, што там ёсць адна польская сям'я, падалася да іх, просячы пераначаваць. Вельмі гасцінна мяне прынялі, сам пан Н. паехаў паразмаўляць і разлічыцца з есаулам. У той жа дзень дапамаглі мне гэтыя паны ў адшуканні новага таварыша падарожжа, быў гэта нейкі гандляр з Уладзівастока, падобна, яўрэй, які перайшоў у праваслаўе, неканкрэтная асоба. Па дарозе забіраў ён нейкія тавары, якія абцяжарвалі сані, я баялася, ці гэта не золата, потым прыняў у свае сані нейкай падазронай знешнасці чалавека, словам пачало мяне гэта ўсё непакоіць, і я вырашыла пры першай магчымасці з ім расстацца. У адным сяле пасля вельмі небяспечнай пераправы цераз раку, цэлы тыдзень мусілі чакаць пакуль дарога не ўсталюецца. Я размясцілася ў аднаго вяскоўца, у якога дома жанчыны былі прыветлівыя, а домік чысцюткі, а таварыш мой спыніўся ў заездзе. Пасля тыдня чакання рэкі сталі, мы выправіліся ў падарожжа і затрымаліся ў паштовым заездзе. Там я знайшла нейкага адстаўнога афіцэра з жонкай, якія ехалі ў Іркуцк, і прасіла надалей прыняць мяне ў іхняе таварыства. Калі яны на тое згадзіліся, пераканала майго гандляра, што яму больш выгадна будзе ехаць з якім мужчынам, заплаціла, што належала і паехала далей у новым таварыстве.

Што за радасць была пры сустрэчы з любімай Антосяй, яе шаноўным мужам і малымі дзеткамі. Найстарэйшая дачушка Маня мела гадоў 6, малодшая Ядвіня — 4, а наймалодшы Стась яшчэ хадзіць не ўмеў. Пазнаёмілася там з прыяцелем Лазоўскіх, шаноўным іркуцкім пробашчам, ксендзам Янам Швярніцкім і з іншымі палякамі, якія там жылі.

Лазоўскія вельмі хацелі, каб яў іх засталася, але я ўжо мела дамоўленае месца ў панства Корзунаў у Табольскай губерні і пастанавіла прыбліжацца да радзімы, а не аддаляцца ад яе. Шмат на маё такое рашэнне паўплывала пані Траханоўская, але расстанне з сястрой і яе слёзы пры развітанні, смутак шаноўнага любімага швагра, не пачутыя мной настойлівыя ўгаворы ксяндза Швярніцкага ёсць для мяне назаўсёды балючым успамінам. Бедны мой швагер! Пры сустрэчы са мной праз пару гадоў у Смаленскай губерні ў маёнтку Вянзноўцы сказаў мне:

— Пачаткам нашых няшчасцяў быў твой выезд з Іркуцка.

Адно магу сказаць на маё апраўданне, што Лазоўскія, бачачы мае цвёрдае рашэнне, завагаліся ва ўгаворах і паказвалі награную абыякавасць, што канчаткова паўплывала на маё рашэнне, што да Траханоўскай, то яна ўласна мела на мэце інтэрас, бо п. Корзун была плямянніцай п. Альфонса Паклеўскага, слаўнага народнага дабрачынца, магната, які варочаў мільёнамі ў Сібіры, таму пані Тэкля думала, што, будучы ў Корзунаў, я пазнаёмлюся з панам Паклеўскім і выпрашу для яе значную суму. Пакрыўдзілася аднак на мяне, бо я была перакананая, што яна мае больш грошай, чым патрэбна, а зрэшты я не мела адвагі каго-небудзь пра што-небудзь прасіць.

Вялікі смутак агарнуў мяне пры выездзе з Іркуцка, але не магла адважыцца ехаць 2000 вёрст далей на Алакму, куды мусілі ехаць Лазоўскія. Швагер стараўся знайсці для мяне нейкае лепшае таварыства, што яму ўдалося. З ваколіц ракі Лены ехаў нейкі малады афіцэр, адстаўны кавалерыст, які быў жанаты з дачкой генерала ў Пецярбургу і загадваў прыскамі ў нейкага магната золатапрамыслоўца. Ехалі мы хутка без затрымак і адно толькі мелі здарэнне, якое не мела, дзякуючы Богу, ніякіх кепскіх вынікаў. Едучы адной ночы доўгай Іркуцкай тайгой, дзе не было відаць ніякага чалавечага жылля, мы размаўлялі пра розніцу выхавання жанчын у Польшчы і Расіі; афіцэр ставіў на многа вышэй спецыяльную адукацыю поляк, чым сваіх землячак. Мы былі вельмі занятыя той размовай як заўважылі бегшага да нас чалавека, які ўскочыў у сані. Афіцэр закрычаў:

— Хто ты і чаго хочаш? — выхапіў пісталет і, не атрымаўшы адказу, хацеў страляць. Я, уражаная, стрымала яго руку, тут двое нейкіх людзей хапаюць за ногі гэтага чалавека і цягнуць яго па снезе. Аказалася, што гэта быў нейкі «падрадчык», дастаўшчык, які пакрыўдзіў нанятых людзей, а тыя хацелі яго пабіць ці забіць, таму ён шукаў ратунку ў праезджых, кінуўся ў нашы сані і амаль жыццём за гэта не заплаціў. Мы былі вельмі задаволены, што ад нас ён пайшоў цэлым. Афіцэр разважаў над тым, што б было, каб ён яго застрэліў. Ехаў ён у Пецярбург з важным для золата-прамыслоўца і сябе інтэрасам, а быў бы затрыманы, суджаны, страціў бы пасаду, абяздоліў бы жонку і г. д. Таму дзякаваў Богу і мне, што ўтрымала яго ад забойства чалавека. Быў гэта малады чалавек, той шаноўны афіцэр, ветлівы, адукаваны, добра думаў, а да таго найвыдатна размаўляў па-французску.

Вельмі хутка мы аказаліся ў Краснаярску, бо толькі праз шэсць дзён дарогі. Таварыш мой паехаў далей, а я затрымалася ў п. Тэклі Траханоўскай і пасля некалькіх дзён адпачынку мелася выехаць да пп. Корзунаў у Табольскую губерню. Жонка прамыслоўца, ехаўшага з Енісейскай Тайгі, якая, можа, хацела мяне за настаўніцу для сваёй дачкі, даведаўшыся цяпер пра мой выезд, прыбыла ў Краснаярск са сваім 12-гадовым сынам, просячы, каб завезла яго ў Томск да сваякоў, якія меліся памясціць яго ў гімназію, на што я ахвотна і бясплатна згадзілася. Панна Тэкля вельмі перажывала ад расстання са мной, яна старалася сабраць нейкую сумку, каб выехаць са мной; дастала нават

у доктара Віланеўскага і багатага купца Кузняцова на тую мэту грошы, але гэтага было недастаткова на ўсё падарожжа ў Варшаву і на пачатковае жыццё там, а ўлічыўшы, што я яшчэ Сібіры пакінуць не магла і была зрэшты сталай апекай для яе, змушана была бедалага застацца на месцы. У палове снежня выехала я з маім малым таварышам наёмнымі коньмі ці так званай вольнай поштай. Па сібірскіх вёсках мужыкі маюць для падарожных падрыхтаваныя коні, сустракаюць падарожных, наймаюцца таней, чым на пошце, а вязуць так жа хутка. Я дамовілася з фурманам, каб давёз мяне да пошты, не хочучы затрымлівацца ў заездах, з-за боязні, каб не трапіць на дом разбойнікаў, тым больш, што за таварыша падарожжа мела 12-гадовага абаронца. Едучы хутка, мы наблізіліся да першага сяла за Краснаярскам, цёмна ўжо было на свеце, я адразу заўважыла, што фурман мінае пошту і надзвычай хутка вязе нас недзе іначай, я пачала крычаць на яго, але ён мне нічога не адказваў, зусім быццам не чуў; ляціць далей, аж нарэшце затрымліваецца перад нейкай хатай і нічога не гаворачы здымае рэчы з саней. З хаты выходзяць некалькі барадатых мужыкоў і ўносяць нашыя пакункі ў хату. Мы праходзім праз вялікі пакой, поўны моцных мужчын, у другі меншы пакойчык, у якім нас памясцілі. Спыталі, ці хочам гарбаты, я за яе падзякавала, а мой малады таварыш, сплаканы пасля развітання і змучаны дарогай заснуў адразу на прыгатаванай на зямлі пасцелі. Я заснуць не магла, пастаянна думала, што нас гэтай ноччу заб'юць, таму рыхтавалася да смерці, горача малілася Пану Богу, адчытала 15 таямніц ружанца, які падаравала мне яшчэ ў астрозе мая віленская цётка марыявітка, Ганна Табенская; пасля пажару кляштара ў Порыве знайшлі яе спаленай пад дзвярыма прэлажонай разам з дзвюмя манахінямі, сястрой Барбарай і сястрой Калюмбай. Пасля ўсіх тых малітваў, пастаянна чакаючы прыбыцця разбойнікаў, змучаная заснула. Не ведаю, як доўга так спала, разбудзіў мяне ўваход мужыка са святлом і яго вокліч:

— Уставайце! Чацвёртая гадзіна, пара ехаць! — Усё было ўжо падрыхтавана: вада для мыцця, самавар, які блішчаў, як золата, малако да гарбаты і адборныя калачы. Мы падсілкаваліся і вырушылі ў дарогу, дзякуючы Богу, што нам яшчэ жыць дазволіў. Назаўтра мы спыніліся ў горадзе Каінску, дзе жыў доктар Старагродскі з сям'ёю, мае знаёмыя з Томска; сям'я доктара сардэчна нас прыняла, дапамаглі купіць кашму на ногі, якой мы накрывалі сабе ногі, як лямцавай коўдрай, едучы на санях. Я мела цяпер уласны экіпаж, бо на першай паштовай станцыі за Краснаярскам купіла сані за 7 рас. рублёў. Цэлыя суткі мы прабылі ў доктара Старагродскага: частавалі нас адборнай смятанай са свежым тварагом, чаму дзеці асабліва радаваліся. Калі я запытала пані Старагродскую, ці гэта здорава для дзяцей, адказала: «Няхай ядуць, колькі і што хочуць, пакуль я жывая». Маладая гэтая кабета памерла неўзабаве, пакінуўшы чацвёра дзяцей, з якіх дачку Ядвігу і сына Мечыслава я бачыла пазней у Смаленску ў іхняй цёткі пані Плахецкай.

Прыехаўшы шчасліва ў Томск, заехала найперш да сваякоў ехаўшага са мной хлопчыка, пакінула яго ў іх, а сама паехала да Люці з Пацалаеўскіх Ажэшка, маёй былой выхаванкі. Затрымалася ў яе на пару дзён, была некалькі разоў у любімым касцёліку, дзе перад тым на працягу 6 гадоў майго побыту ў Томску шмат пацехі для душы атрымала; бачылася са знаёмымі і пакінула Томск назаўжды!

Выехала зноў уласным экіпажам і на першай паштовай станцыі сустрэла двух паноў, якія ехалі ў Пецярбург. Адзін з іх быў, здаецца, генерал Іваноў, а другі — ураднік для спецыяльных даручэнняў ці таксама давераная асоба нейкага магната з Сібіры. Абое — людзі інтэлігентныя і шаноўныя, аказалі мне дапамогу з наёмам коней, бо мы ехалі ў адзін бок; абавязалі мяне таксама, каб на станцыях не казала асобна падаваць для сябе самавар, а піла гарбату разам з імі, на што я ахвотна згадзілася, бо размова з тымі панамі прыносіла мне сапраўдную прыемнасць. Былі яны знаёмыя з нашай літаратурай, многа чыталі, а цывільны пан ведаў нават пару вершаў нашага Адама Міцкевіча. Чакаючы на станцыі на коней я мела вельмі прыкрую сустрэчу. Вось жа едучы некалі ўжо перад тым у Іркуцк затрымалася для змены пошты. Чакала таксама на коней нейкае панства, маладая сям'я. Марскі афіцэр з Уладзівастока, малады бландзін, прыстойны паручнік і яго жонка, якая не мела поўных 16 гадоў. Я пазнаёмілася з імі і праз увесь час чакання на коней з імі размаўляла. З усёй шчырасцю апавядаў мне той малады чалавек, што ажаніўся па каханні з паненкай, якая скончыла навуку ў прыватным пансіёне, і вязе цяпер сваю жонку да яго маці, абывацелькі Кастрамской губерні з просьбай, каб занялася яе выхаваннем, якое дагэтуль ёсць ніякім. Бо пансіён ва Уладзівастоку, як казаў, нічога не варты, ніякіх паняццяў пра грамадскае жыццё, пра навуку не дае. Таму едзе да маці, якая яго вельмі любіць і ёсць вялікай высакароднасці жанчына, таму не адмовіць просьбе сына. Відаць было, што маладая сям'я, толькі месяц назад злучаная шлюбнымі вузламі, была моцна закаханая; ён яе абдымаў, апранаў, вельмі цешыўся, як дзіця з цацкай.

Цяпер ізноў на станцыі сустрэла гэтую маладую асобу, ужо ўдаву! Сказала яна мне, што едучы з Уладзівастока ў Кастраму мелі сціплыя на дарогу грошы, таму муж мусіў прадаць сваё футра, а тут схапіла іх марозная зіма, што празяб яе бедны муж, захварэў у Табольскай губерні і памёр ад чорнай воспы! Маладая няшчасная жонка не мела грошай на пахаванне мужа, не мела з чаго жыць. Можа, высланыя ад маці грошы былі ў дарозе, але цяперашняе становішча маладой удавы было жудаснае. Я распавяла пра той смутны выпадак таварышам падарожжа; яны далі мне 25 рас. руб. з просьбай, каб уручыла іх беднай удаве. Я зрабіла гэта і развіталася з няшчаснай, але яна з намовы атачаўшых яе людзей прыйшла да ад'язджаўшых, каб ім падзякаваць; паны сабе таго не хацелі б, баючыся зараження хваробай.

У далейшай нашай дарозе выпаў з маіх саней, дзіравых у нагах, абраз, вельмі дарагі для генерала, бо дадзены быў яму з дабраславеннем у дзень шлюбу. Генерал вельмі тым засмуціўся, таму мы выслалі адразу пасланца з абяцаннем узнагароды, калі прынясе назад згубу, што і сталася.

У Омску на пошце я развіталася з шаноўнымі таварышамі падарожжа і, узяўшы дрожкі, паехала да генерала Расетэра, паводля дадзенага мне паняй Корзун рэкамендацыі. Пані генеральша была з дому графіня Корф, пан генерал быў інтэндантам у Омску, абое найвысакароднейшыя людзі, найлепшыя католікі; у кожным горадзе, дзе асядалі, былі дабрадзеямі касцёла. Будучы ў Омску разам з панам Альфонсам Паклеўскім, цывілізатарам Заходняй Сібіры, які за фундамент асветы прызнаваў рэлігію, спрычыніўся да прабудовы нашых касцёлаў і святынь іншых вызнанняў, і панства Расетэр, пан генерал-губернатар Хрушчоў, а пасля яго генерал-губернатар Дугамель спрычыніліся да пабудовы і ўпрыгожання касцёла ў Омску. Усе яны сардэчна прынялі сасланага ў Сібір перад паўстаннем 1863 г. маладога каплана, інтэлігентнага чалавека, з сэрцам, якое гарэла любоўю да Бога і бліжняга, каплана, які клапаціўся пра славу Бога. Той верны слуга Хрыста, кс. Валеры Грамадскі, цяпер пробашч томскі, выказваў патрэбы касцёла, а высакародныя, названыя вышэй, паны ахвотна іх залагоджвалі. Выклікалі яны таксама мастакоў айчынных і замежных для аздаблення Божай святыні, у чым ім слава і падзяка. Вось жа, калі я прыбыла да панства Расетэр, пані генеральша прыняла мяне ветліва і радзіла, каб далей я ехала з маімі таварышамі, бо лепшых не знайду, а адной ехаць небяспечна, а пры тым панства Корзун ўжо два месяцы чакае майго прыезду. Выслала адразу лакея да тых паноў, просячы затрымацца яшчэ на пару гадзін, забяспечыла мяне правізіяй на дарогу, дала пасылачкі і рэкамендацыі для пані Корзун і потым адразу адправіла мяне з Омска. Пасля некалькідзённай дарогі я аказалася ў Падуні ў доме п. Уладзіслава Корзуна. Быў тут галоўны ў Заходняй Сібіры бровар п. Альфонса Паклеўскага, а загадчыкам гэтага завода быў п. Уладзіслаў Корзун, жанаты з дачкой Вінцэнта Паклеўскага і пляменніцай п. Альфонса. Пан Корзун быў інжынерам па адукацыі і як такі, і пры тым падпалкоўнік — меў пасаду ў Астрахані; але жонка сумавала па радзімых краях, мусіў пайсці ў адстаўку, а потым прыняць пасаду загадчыка на бровары п. Альфонса Паклеўскага. Быў гэта чалавек парадачны, разумны, інтэлігентны, добра выхаваны, паўсюль любімы і шанаваны. Жонка яго пані Анета, выхаваная сваёй цёткай, жанчынай з мужчынскім характарам, укладам і прывычкамі, была дакладнай копіяй сваёй цёткі, розум хуткі, сэрца залатое, характар шляхетны, але дзікасць ва ўчынках. Дзеці, Ядвіня і Вітольдак, разумныя, да навукі ахвотныя і здольныя, вельмі мне падабаліся.

Усё атачэнне ж складалася з нікчэмных нахлебнікаў. Былі Ў Падуні тры браты Шаневічы, якія займалі пасады афіцыялістаў: Фларыян, Фелікс і

Францішак, жанаты з сястрой прыяцеля панства Корзунаў, чыноўніка па асобых даручэннях пры егамосці губернатары ў Омску. Пані Францішчыха была нахлебніцай і любіўшай плёткі кабетай, кпіла яна з мяне, высмейвала і дзяцей супраць мяне кепска настройвала. Пані Анеце я адразу не спадабалася; яна кабета эмансіпаваная, апранутая па-мужчынску, валасы кароткія, шапачка на галаве, жалезная палачка ў руцэ, жанчын старога, як гаварыла, пакрою пераносіць не магла. Папярэдніца мая, панна Юзэфа, была маладая, прыстойная і эмансіпаваная, усім Шаневічам падабалася. Але я не мела тых прыкідаў і не смелая з натуры ўпала духам, засумнявалася ў сабе і сваёй адукацыі, адным словам прыдурэла. Дзеці аднак пачалі ў навуках паспяваць. Ядвіня сказала маці, што пры мне за два месяцы больш даведалася, чым пры панне Юзэфе за цэлы год. Праца з маімі выхаванцамі і прагулкі з імі былі для мяне найвялікшай прыемнасцю; але ў таварыстве, пра якое ведала, што яно мне не спрыяла, знайсці сабе месца я не ўмела. Трэба было ні на што не зважаць, энергічней паступаць, не таіцца, як я, што ўжо ўласнага ценю баялася. Мінула зіма і вясна, насталі вакацыі, на якіх пастаянна былі госці, то кузіны пані Корзун, то зноў нейкія знаёмыя чыноўнікі акцызу і іншыя; потым прыехалі паны Расетэры.

Калі кузіны ад'ехалі, у доме прыціхла, але я не супакоілася. За 700 вёрст ад Падуня быў у нейкай вёсцы, высланы з маёй сястрой шаноўны фурман і селянін майго нябожчыка бацькі Юзаф Ляпеша. Я напісала яму, што намерана выехаць з Сібіры. Пасля атрымання майго ліста ён прыехаў у Падань, каб са мной развітацца. Я прасіла пана Уладзіслава Корзуна, каб пакінуў яго ў сябе, на што ён ахвотна згадзіўся, разгледзеўшы ў Ляпешы парадачнага чалавека. Калі пазней я спазнала нейкія непрыемнасці і не захацела там жыць, я папрасіла пані Расетэр, каб была ласкавая паведаміць панам Корзунам, што я мушу, ад іх выехаць. Сталася, як я хацела, паны Корзуны не ўгаворвалі мяне застацца, але абое былі журботныя і засмучаныя. Пан Корзун даў мне каня да Цюмені, а за правадніка шаноўнага Юзафа Ляпешу. Выехала на пачатку верасня. Чамадан мела пры сабе, а куфар, у якім былі кніжкі, ноты і бялізна, быў прывязаны ззаду тарантаса. Ехалі мы хутка, раптам Юзаф, які сядзеў з фурманам, пачуўшы нейкі стук, выскачыў з тарантаса з рэвальверам у руцэ і ўбачыў, што шнуры, якія прытрымлівалі куфар разрэзаны і куфар на зямлі. Мы ўзялі куфар у тарантас і паехалі далей, не ўбачыўшы нават злодзея, бо напэўна схаваўся недзе ў рове. Я была ўдзячная пану Корзуну, што даў мне шаноўнага Ляпешу за правадніка, і з таго часу шкадую, што не патрафіла пагадзіцца з акалічнасцямі і не засталася ў іх даўжэй, бачачы, што дзеці ў навуках паспяваюць. Калі б не пастаянны смутак на душы і не туга па краі, можа б гэтага не зрабіла. Паны Корзуны выслалі дзяцей у Рыгу на выхаванне, самі, хоць яшчэ не старыя людзі, памерлі, спачатку пані Анета, а пазней яе муж Уладзіслаў. Ляпеша, які быў пры іх смерці, гаварыў, што пані Анета хацела спавядацца, але ксяндза не было; пан Уладзіслаў

памёр раптоўнай смерцю ад анеўрызму, ужо перакананы ў нешляхетнасці і інтрыгах Шаневічаў. Памерлі яны абое ў Падуні, а пахаваны былі ў Таліцы ў фамільным магільніку пп. Паклеўскіх у Пермскай губерні. Пан Адам Паклеўскі быў дабрадзеем Падуня, які засялялі спачатку дзікімі, паходзіўшымі з разбойнікаў, пасяленцамі, а пазней ён стаў месцам жыхарства найвыдатнейшых людзей; Падунь стаў вялікім сялом, жыхары яго мужчыны знаходзілі заробак на бровары п. Альфонса, жанчыны займаліся гаспадаркай і гандлем; знайшліся самыя разнастайныя рамесніцы; заквітнела кемлівасць, а з ёй пачала святлець парадачнасць. Я не раз чула, як тамтэйшы люд дабраслаўляў свайго дабрадзея, як з удзячнасцю прамаўляў яго прозвішча, як яго расхвальваў. Вітольд Корзун, мой вучань, надзвычайных здольнасцяў юнак, памёр пасля заканчэння вучобы; сястра яго Ядвіня вучылася далей ва ўніверсітэце ў Швейцарыі. Таленавітая, высока адукаваная, з залатым сэрцам, любімая ўсімі сваякамі па бацьку і па маці.

XI

Маючы пасля маніфеста ў 1876 г. права пакінуць Сібір, я адразу скарысталася з дазволу і, едучы ў Смаленскую губерню, заскочыла ў родны край, у любімую Вільню.

У Вільні пры моцным старанні с. п. Аўрэліі Герман я атрымала дазвол затрымацца толькі на адзін тыдзень. Прабыла гэты час у найвысакароднейшай маёй кузіны Юліі Прыбыткі, якая жыла на Зарэччы, была ў п. Аўрэліі Герман, у графіні Наталіі д'Густ дэ Кондрай, у п. Паўліны Прыбыльскай і ў іншых прыязных асоб; склала аднак найперш падзяку Богу і Маці Божай Вастрабрамскай за міласэрдзе нада мной, за ласку, што бачу любімую Айчыну. Аблівалася гаручымі слязамі радасці і ўдзячнасці да Бога..., аплаквала смерць дарагіх людзей з сям'і, сваякоў, і прыяцеляў, і тых, хто прыняў пакутніцкую смерць у Вільні на Лукішках і ў іншых мясцовасцях нашага краю... Найвысакароднейшая прыяцелька мая п. Эвеліна Асціловіч, якая пры няшчасным выездзе з Вільні да апошняй хвілі не пакідала мяне, а цяпер была амаль неадлучная. Атрыманых пачуццяў і ўражанняў не здольная апісаць; ведаю толькі, што радасныя злучаліся з найсмутнейшымі. Не хапала мне найлепшага бацькі, дзядзькі Тадэвуша Навіцкага, брата Цыпрыяна, сястры Эміліі Урублеўскай, столькіх людзей прыязных і кроўных, не хапала мне шчасця Айчыны. Тыдзень хутка мінуў, паліцыя загадала мне выязджаць. Дабралася чыгункай да станцыі Араны, а адтуль нанятым возам да пп. Тараевічаў. Позна ўжо трохі было, а мы ехалі лесам, дарога кепская, гразкая, ненадзейная. Нарэшце ўбачылі з чалавекам, які мяне вёз, нейкае святло; быў гэта ўжо дом паноў Тараевічаў, да якіх мы дабіраліся. Сабакі загаўкалі, мы заехалі пад ганак; выйшла служка правяла мяне ў вітальню, дзе ўжо быў пан Тараевіч, зацікаўлены прыбыццем незнаёмай нечаканай падарожніцы. Я, бачачы тое, смела сказала:

— Прыехала з далёкіх краёў, прашу начлегу. Я — Табенская.

На тыя словы выбегла схаваная за дзвярыма п. Тараевіч і кінулася мне ў абдымкі.

— Пані — панна Альжбета Табенская?

— Так, пані.

О, як жа яна мяне чулліва абдымала, не маглі гаварыць, абедзве плакалі. Пані Тараевіч мяне даўней не ведала, толькі сястру маю Антаніну Лазоўскую. Пляменніца пані Тараевіч панна Браніслава Прабароўская, міленькая паненка, занялася гарбатай, арганізацыяй начлегу для мяне. Ноччу мы доўга размаўлялі, я сказала, што надоўга ў іх затрымацца не магу і прашу коней на заўтра; бо я кіравалася да майго брата, які жыў у фальварку Рудаў, дзе я правяла апошнія хвіліны перад арыштам, і хацела чым найхутчэй абняць пазасталую пасля дарагой сястры Эмілії сям'ю. Пры тым баялася парушыць дазвол. Назаўтра п. Браніслава першая вычэквала майго абуджэння і першая мяне прывітала; я хутка апранулася і пасля кароткай малітвы ўсе селі за снеданне. Я даведалася пра смутную долю землеўладальнікаў у нашых краях, пра кантрыбуцыі, перасследы, пра цяжкасці з выхаваннем дзяцей, пра пазачыненыя касцёлы, пра ніякую надзею на будучыню. Смутак напоўніў мне душу... Мы з паняй Тараевіч плакалі, панна Браніслалава старалася перапыніць нашую смутную размову, пачала гаварыць пра таварыства паненак па суседстве, што маюць часопісы і газеты, дастаўляюць кніжкі і часопісы для чытання і г. д., гэта робіць іхняе жыццё трохі рознабаковым. Вялікі недахоп моладзі мужчынскага полу, ніякіх забаў, смутна, нудна ў краі, як пасля пахавання. Трынаццаць гадоў сплыло ад паўстання, а раны, нанесеныя грамадству, яшчэ не загаіліся. Распавядалі мне, што не было дома, дзе б некага з сям'і не бракавала. Насельніцтва зменшылася, парадзела: то ў паўстанні, то на выгнанні смерць рознымі спосабамі забірала свае ахвяры; з дзяцей Польскай зямлі; тыя, што засталіся енчылі ў кайданах няволі. Па школах загадалі вучыць рэлігіі па-расійску, польская мова была забаронена, ксяндзы сасланыя на выгнанне, касцёлы пазачынены, панішчаны, пазняважаны, прыстасаваны пад розны ўжытак: як казармы, свірны. Вораг-прыгнятальнік усё патрафіў знішчыць, а прыйдзе ўсё ж час, калі будзе павінен здаць справаздачу са свайго валадарства, адказаць за пралітую кроў, за збуранае шчасце сямей, за ўсе пакуты і катаванні.

Пасля абеду я развіталася з высакароднымі панамі Тараевічамі і паехала дп паноў Квінтаў, даўніх прыяцеляў і суседзяў нашых сваякоў. Жылі яны ў адным з маёнткаў гр. Патоцкіх, змарнаваным цяпер іхнім спадчыннікам Аўгустам Патоцкім. Застала ўжо толькі дачок пп. Квінтаў, яны самі абое памерлі. Змены людзей, месцаў і побыту былі да непазнання. Ад паннаў Квінтаў выехала ў Рудаў, але даведаўшыся, што па дарозе ў Забалаці жыве стары кс. Рачыньскі, затрымалася, каб яго адведаць. Прыняў

мяне прыветліва, як выгнанку, прыбыўшую з далёкіх краёў; падзякавала яму за ўдзяленне святых алеяў майму памiраўшаму бацьку. Запозна выкліканы не мог ужо ксёндз яго спавядаць, а толькі надзяліў канаўшага старога святымі алеямі. Кс. Рачыньскі жыў у той час у Васілішскай парафіі, дзе перад паўстаннем на працягу 30 гадоў быў пробашчам кс. Ануфры Сыльвід. Потым перабраўся ў Забалаць, дзе наймаў памяшканне пры плябаніі і нядаўна памёр, маючы 90 гадоў. Быў гэта экс-піяр, таварыш і прыяцель з семінарыі кс. біскупа Красінскага. Распавяла яму, як вяртаючыся з Сібіры заехала, а дакладней завярнула ў Вятку, каб пабачыцца з маім братам кс. Мечыславам Табенскім, які быў хатнім капеланам кс. біскупа, быўшага ў Вятцы. Расказала, як ласкава кс. біскуп мяне прыняў, як мне апавядаў пра сваю тугу, пра заняткі садаводствам, кветкамі, канарэйкамі, у чым шукаў і не мог знайсці ўцехі і забыцця. Расплакаўся стары кс. Рачынскі, слухаючы гэтае маё апавяданне; асабліва быў узрушаны, калі яму распавяла, як у дзень майго выезду пасля св. імшы, той біскуп пакутнік дабраславіў мяне на далейшае падарожжа і на далейшае жыццё.

Адведала ў Забалаці на могілках магілу шаноўнага майго дзеда Алойзага Табенскага, дзядзькі Фелікса, пахаванне ўсёй сям'і Араноўскіх, якія сябравалі з маімі сваякамі, ані аднаго чалавека з гэтай іхняй шматлікай сям'і не засталося, магілы ўсіх узвышаюцца на гэтых могілках.

Развіталася з ксяндзам Рачыньскім і Забалаццю і рушыла далей. Заехала ў маёнтачак Варонічы, які знаходзіўся за некалькі вёрст, дзе жыла ўдава з Нарбутаў Зофія Жураўская, дачка Нікадэма Нарбута. Бацька пані Зофіі ўфундаваў у Заблоцкай парафіі малы драўляны касцёлік, у якім на вялікія святы і ўрачыстасці Божай Маці адпраўляліся набажэнствы. Шмат людзей тады туды з'язджалася, як таксама і нашы родзічы са сваімі сем'ямі. Пасля касцёла мы ездзілі на абед да пп. Нарбутаў, дзе іхняя дачушка Зофія, сястра мая Эмілька і я весела забаўляліся. Памятаю, як п. Нікадэм Нарбут у касцёле перад св. імшой прагаворваў ружанец, а потым голасна гукаў: «Вытніце ў Нікадэма», бо мяне надзвычай дзівіла гэтае біццё Нікадэма, якога я сабе ўявіць не магла. П. Зофія Жураўская была першай маёй сваячкай, якую я сустрэла на радзімай зямлі. Мне можна было правесці з ёй двое сутак, шмат мы мелі для расповядаў, нажаль, смутных рэчаў.

З Вароніч адвезла яна мяне ў Васілішкі, дзе я хацела памаліцца на магілах маіх бацькоў. У дарозе адгаворвала ўголас ружанец; кузінка дэкламавала, а я здзівілася яе памяці, бо ўвесь той, з 15 таямніц складзены ружанец, умела па-старасвецку на памяць, без пропуску ніводнай з малітваў, якія ўваходзілі ў склад таго ружанца.

Смутны быў для мяне від прыгожага францішканскага, а пазней дамініканскага касцёла ў Васілішках, перароблена цяпер у царкву. Адведала могілкі, дзе спачывалі парэшткі маёй набожнай маці, а потым падаліся на новыя за Васілішкамі могілкі, на якіх быў пахаваны мой бацька. Папла-

калі абедзве на яго магіле і адмаліліся сардэчна за яго і за ўсіх, а асабліва за тых, хто развітаўся з жыццём пасля майго выезду.

Васілішскія яўрэі са здзіўленнем і прыязнасцю, а разам і з сумнымі ўспамінамі пра мінулае мяне прывіталі. Усё змянілася ў Васілішках, бо нішчыцелям дабрабыту ў іхняй справе яшчэ і пажар дапамог.

З Васілішак паехала ў Рудаў, дзе ўжо не сустрэў мяне любы бацька, не загаўкаў на прывітанне наш стары сабака Даскор; усё было новае ў тым доме. Непрыязь панавала паміж маімі братамі, судзіліся паміж сабой. Від той іхняй нязгоды быў ударам для сэрца майго. Не доўга пабыла ў Рудаве і падалася ў Ліду, дзе бачыла для сябе зычлівую сям'ю пана Віталіса Яноўскага, далёкіх, але сэрцу майму блізкіх сваякоў, п. Валераву Юзэфу з Гумбарэвічаў Нарбут, Зыгмунта Урублеўскага, майго швагра, і яго дочак, сірот па Эмільцы, маёй сястры, у якой мяне арыштавалі і якая так перажывала маю ссылку.

Была ў касцёле, у якім у час дэманстрацыі мы так урачыста спявалі «Божа, што ж Польшча». Не было ўжо ў тым касцёле кс. дэкана Хлявінскага, пазбавілі яго таго дэканства і выслалі ў малую парафію Асаву. Змены ў грамадстве былі велізарныя; едучы ў Ліду, я заўважала маёнткі, заселеныя зусім новымі ўладальнікамі; заехала пад ганак даўніх маіх знаёмых пп. Бердаўскіх, а тут выходзіць служка і гаворыць, што ўладальнікі маёнтка нейкія расейцы, што ранейшая пані жыве ў афіцыне, а пан высланы ў Сібір. Пані Бердаўская ад цяперашняга ўладальніка ў арэндзе трымае свой маёнтачак. Правяла мяне пасля тых тлумачэнняў у сціплы пакойчык і пайшла па паню. Праз кароткі час у пакой увайшла п. Валерыя з Александровічаў Бердаўская, і я не пазнала яе. Пакідала яе маладой элегантнай, а цяпер мела перад сабой нейкую постаць, загорнутую ў нейкі шырокі шляфрок, у цёплай хустцы на галаве. Прыйшла са стадолы, дзе сама наглядала за малацьбітамі.

Такія і падобныя ім былі змены амаль у кожным маёнтку. Толькі ў Красулі пацешылася відам усіх шаноўных, любімых сваякоў: найшаноўнейшай старой Юліі Яноўскай, стрыечнай сястры маёй нябожчыцы маці, яе сына Тэафіла, нявесткі Брыгіды са Стычынскіх і ўнука Вінцэнта.

Гнаная бояззю адказнасці і жаданнем пабачыць усіх, дарагіх майму сэрцу, пасля некалькігадзіннага побыту ў пп. Яноўскіх з Красулі падалася ў Дайноў, дзе жыла пані Адальфова з дачкой Зофіяй і сынам Уладзіславам. Бо, на жаль, старэйшыя яе дзеці: Вальдэмар, Людвіка і сястра Анета ўжо паўміралі. Якую ж вялікую розніцу знайшла ў гэтым доме. Пані Адольфава выглядала так, як бы з яе выдзерлі сэрца. Была поўная, як заўсёды, анёльскага цярпення, ціхая, але збалелая, з выразам болю і адчаю ў вачах. Мы ўспаміналі пра нашых памерлых, смерць якіх заўсёды была для душ і сэрц нашых балючай ранай. Сястра мая Антаніна лічыла панну Адальфову за найлепшую сваю прыяцельку, таму ўжо і для сапраўднай іх заслугі былі

яны для мяне невыказна мілымі. Уся сям'я пп. Адольфаў была ідэальна добрая і нейкай непараўнальнай ціхасці і лагоднасці. З Дайнова паехала ва Уніхоўшчыну да пп. маршалкоўства Марачэўскіх. Тут, як і ўсюды ў тым падарожжы, пры прывітанні спазнала пачуцці вялікай радасці. Пані маршалкова жыла ў Вільні для навучання сваіх дзяцей; была яна ў прыязных стасунках са с.п. маім любімым дзядзькам, які сваёй дабратой падсалоджваў маё жыццё ў падарожжы ў Сібір і на месцы выгнання. Быў ён найшаноўнейшым, вялікага розуму, даўнейшых грамадзянскіх прынцыпаў і цнот чалавекам; карэспандэнцыя ад яго поўная заахвочвання да вытрымкі на дарозе пакут, падтрымліваў мяне на духу, а маімі лістамі з Сібіры дзяліўся з паняй Марачэўскай, разам іх чыталі.

Сам збалелы, няўцешны пасля страты сына, Уладзіслава, сапёра, які загінуў пад Дубічамі, не выказваў таго, што адчуваў перад бліжнімі прыяцелямі, аднак умеў мне падаць падтрымку.

Пасля тых маіх візітаў, якія не больш як тыдзень часу ў мяне забралі, вярнулася ў Ліду. Забрала маю пляменніцу Тэклю Урублеўскую, 16-гадовую паненку, якую хацела памясціць у Варшаве ў кравецкую навуку. З Ліды да чыгуначнай станцыі Араны даехала коньмі, а адтуль чыгункай да Варшавы.

XII

Аказаліся на месцы ноччу ці познім вечарам; памятаю толькі, што мяне, непрызвычаеную да падарожжаў у польскіх краях, такое выдатнае асвятленне вакзала, рух, гамонка і элегантнасць канкрэтна асляпілі. Пасля розных прыгодаў той ночы, бо:

1) Не магла знайсці жылля добрых знаёмых, якія ў выніку пераезду, змянілі адрас;

2) Мая сціплая вопратка зачыняла перада мной дзверы гатэляў, заехала нарэшце ў Саскі гатэль, у якім не я, а мой рамізнік дамаўляўся пра нумар, там мяне нарэшце прынялі.

Назаўтра пасля кароткай малітвы ў касцёле мы падаліся на горад з мэтай знайсці каго-небудзь са знаёмых і знайшлі сям'ю пп. Лясковічаў, якія нас вельмі прыветліва прынялі і запрасілі перабрацца да іх. Таму мы пакінулі гатэль і пачалі з п. Лясковіч шукаць памяшканне для Таклюні. Знайшлося, але ў цэлым не асабліва добрае з усіх поглядаў; і так, хоць Таклюня ўжо добра ўмела шыць, мусіла заплаціць за першы год 100 рас. руб., толькі другі быў без аплаты. Бедная Таклюня цярпела голад, а працаваць мусіла амаль што без перапынку. Работа трывала ад 6-й раніцы да 12-й ночы з малымі перапынкамі на снеданне, абед і вячэру, якая складалася са шклянкі гарбаты і адной булкі. Было ў тым магазіне некалькі паннаў, працавалі яны не пры акне, але пры супрацьлеглай сцяне, каб не выглядалі на вуліцу і не перашкаджалі сабе. Вечарам шылі, пакуль зусім не цямнела, а потым пры запаленай лямпе дзяўчаты сядзелі да паўночы, пастаянна

працуючы; не да шмат чаго тая іх работа прыдавалася, бо вочы ім зліпаліся, і часта тое, што нашылі, трэба было пароць. Дарагая і шаноўная мая Таклюня спазнала там шмат бяды.

Пасля размяшчэння Таклюні пералічыла свае грошы і са страхам убачыла, што ўжо маю вельмі няшмат. Трэба мне было абавязкова выстараца нейкае месца і выехаць у якую-небудзь з губерній еўрапейскай Расіі. Вельмі перапужаная тым, прайшла ў касцёл святога Аляксандра шукаць суцяшэння ў малітве. Калі вярталася дадому па вуліцы Новы Свет, пачаў ісці дождж. Я ўвайшла ў нейкую браму, каб на хвіліну схавацца, а за мной паспяшалася яшчэ шмат людзей.

Тады гляджу, а тут стаіць каля мяне знаёмы мне з Томска доктар Зыгмунт Брадоўскі, з жонкай якога я сябравала ў Томску. Я вельмі абрадавалася гэтаму спатканню, але ў гэтую хвілю прыйшло мне на думку, што, можа, не захоча прызнацца ў знаёмстве са мной, бо становішча змяняе людзей... Стаю так у нерашучасці, што рабіць, а пан доктар, убачыўшы мяне, загукаў са здзіўленнем:

— Пані Табенская, што пані тут робіш?

— Схавалася ад дажджу.

— Ну, так, але ў Варшаве, як даўно прыехала пані? Якія маеш намеры на будучыню?

— Маю намер шукаць пасады настаўніцы ў якой-небудзь з губерній еўрапейскай Расіі, — адказала.

— Я зараз шукаю настаўніцы для сынка майго Зыгмуся; жонка мая марыла пра тое, каб пані выхавала нашых дзяцей; цяпер яна ўжо памерла. Марыся наша вучыцца ў пансіёне ў Кракаве, для Зыгмуся патрэбна настаўніца, каб падрыхтаваць яго ў першы клас гімназіі. Едзь, пані, да мяне! Я жыву ў Смаленскай губерні, у заштатным мястэчку Ельна.

— Вельмі ахвотна, — адказала.

А паколькі была ў тым доме фатаграфія фірмы Пуцяты, у якой працаваў наш супольны з Томска знаёмы п. Антоні Прушынскі, доктар запрапанаваў, каб мы прыйшлі да яго, каб пагаварыць пра наш інтэрас. Калі доктар запытаў, якой аплаты хачу, сказала, што ад калегі ссыльнага не вазьму больш як 20 рас. рублёў. Так адразу была заключана дамова. Бачачы ў тым вялікую міласэрнасць Божую нада мной, пабегла ў касцёл св. Аляксандра, падзякавала правідзенню за такую апеку нада мной; слёзы мае змяніліся на радасць, бо чаго ж Бог зрабіць не можа!

Шчасліва пачувалася ў доме доктара Брадоўскага, чалавека шаноўнага, правага характару; малы Зыгмусь — сапраўдны анёлак, падобны да сваёй нябожчыцы мамусі, з доўгімі светла-бландзіністымі валасамі, тып польскага хлапчаняці. Ён быў надзвычай прывязаны да боны, немкі, якая яго, паўтарагадовага сіротку, пасля смерці пані доктаршы ўзяла пад сваю апеку, здорава і маральна яго выхоўвала, маючы таксама да яго вялікую прывязанасць.

Памятаю, раз адна са знаёмых пацыентак доктара запрасіла мяне і Зыгмуся да сябе на гарбату. У размове пра розныя рэчы мы зачапілі і панну Шарлоту; гаспадыня смяялася з яе, паўтараючы, як дзіўна яна некаторыя выразы вымаўляе па-расейску — забаўна гэта было па сутнасці, але Зыгмуся гэта разгневала. Калі мы вярталіся дадому, я сказала яму:

— Не зважай, Зыгмусь, на тыя жарты, і не пераказвай п. Шарлоце таго, што чуў; нічога тут па сутнасці няма кепскага, але, можа, ёй прыкра будзе. Чужаземцы звычайна кепска размаўляюць па польску і па-расейску, бо гэтыя мовы цяжкія для іх, не саромеюцца яны гэтага, бо стараюцца ведаць тыя мовы толькі настолькі, на колькі ім абавязкова патрэбныя для выказвання сваіх думак. Гэта толькі мы, палякі, стараемся грунтоўна ведаць чужыя мовы.

— Як гэта! — выгукнуў Зыгмусь, — пані хоча, каб я нешта ўтаіў ад панны Шарлоты, якая мяне выхавала, як маці. — І не даўся нічым сябе пераканаць. Шаноўная панна Шарлота была сапраўдным дабрадзействам для гэтай сям'і: працавітая, гаспадарлівая, усё ўмела рабіць, усё дагледзець.

Мястэчка Ельна вельмі нагадвалв мне радзімыя месцы. З сапраўднай прыемнасцю рабіла я з Зыгмусем два разы дзённыя прагулкі, пад час якіх праводзілі французскую канферэнцыю.

Год і пару месяцаў была я ў доме доктара Брадоўскага, а калі Зыгмуся адвезлі ў школу, выехала ў Варшаву, дзе застала пп. Завадскіх, знаёмых з Енісейскай Тайгі і прыняла ў іх абавязкі настаўніцы для іхніх дзяцей: Вікці, Генрыся і малюткага 10-ці месячнага Больця, якога разам з мамкай мела мець пад сваёй апекай. Аднак, калі паны Завадскія выехалі на Сібір, дзе мелі сваю капальню золата і былі вымушаны быць там яшчэ тры гады, я з дзецьмі была гэты час ў доме шаноўных пп. Залескіх, сваякоў пані Завадскай, у маёнтку Крупіцы, у Гарадзенскай губерні, Бельскім павеце, у Сямятыцкай парафіі. Тут мяне ў працы Пан Бог дабраславіў: дзеткі цалкам да заняткаў не прызвычаеныя з замілаваннем браліся за навукі і ручную працу. У бабуні Залескай была яшчэ дачушка пп. Завадскіх Геня, якая прыйшла на свет у Сібіры і якую я ў Краснаярскім краі трымала да хрышчэння. Геня, фіглярная, вясёлая, а часам капрызная, была пестаю, фаварыткаю бабці. Летам мы праводзілі цікавыя паходы ў лес; бабця забяспечвала чародку ўнукаў пажыўнымі прысмакамі, дзеткі са смехам забаўляліся на свежым паветры, размаўлялі са мной, і я з прыемнасцю бачыла, што розум іхні развіваецца, а сэрцайкі запаўняюцца пачуццямі набожнасці і любові да бліжняга. Калі мае выхаванкі навучыліся добра чытаць, я прапанавала для Генрысі «Прыяцеля дзяцей», а для Вікці — «Сямейныя вечары». Мае дзеткі з гонарам літаратараў засядалі за кнігі, а потым доўга і падрабязна размаўлялі пра тое, што чыталі.

Шаноўныя паны Залескія абдаралі мяне сваёй прыязнасцю, а я мела да іх вялікую павагу і давер ды таксама прывязалася да маладой чародкі. Так

мне добра было ў тым доме, як у найлепшых і найбліжэйшых сваякоў; трэба дадаць, што само адчуванне, што я ўжо ў сваёй Айчыне, напаўняла мяне шчасцем. Дагэтуль я зусім не ведала гэтай мясцовасці, але хоць незнаёмая, была гэта, аднак, польская зямля, такая любімая, а не айчына маіх ворагаў! Пп. Завадскія, будучы далёка ад дзяцей, хацелі, каб яны што тыдзень да іх пісалі. Я вельмі ахвотна згадзілася на тое, бачачы ў тым маральную карысць для дзяцей, у якіх развіваліся такім чынам іх думкі і пачуцці, і што вучыліся дзяліцца імі са сваімі бацькамі, а паколькі я патрабавала, каб добрым і прыгожым пісьмом таксама рабілі прыемнасць бацькам, таму ў арфаграфіі і каліграфіі таксама стараліся.

Тры гады былі мы ў Крупіцах. Нарэшце прыехалі з Краснаярска пп. Завадскія. Была гэта радасць не для пісання як з боку пп. Залескіх, так і пп. Завадскіх ды іхніх дзетак. Нядоўга, аднак, затрымаліся пп. Завадскія ў Крупіцах, інтарэсы клікалі іх у Варшаву, дзе Генрысь ў гімназію, а Віктуся ў пансіён п. Жаляшкевіч мелі паступіць. Таму я пакінула мілы дом п. Залескай і падалася ў Варшаву.

Даўнія мае выхаванцы сёння выраслі; Вікця цяпер пані Лагунова, жонка афіцэра і маці двух мілых сынкоў — жывуць у Варшаве; Генрысь на трэцім годзе ў Кракаўскім універсітэце; Геня — пані Пушкевіч, жонка тэхніка ў Краснаярску і мае ўжо малую дачушку; Болек — вучань VIII класа філалагічнай гімназіі ў Варшаве.

Пабыўшы кароткі час у Варшаве, я мела ехаць у Казань да Лазоўскіх, якія пару месяцаў назад у тым горадзе пасяліліся. Швагер мой Эдвард, будучы некалькі гадоў у тайзе ў Якуцкай вобласці над Ленай, пачаў моцна хварэць на вочы, мусіў пакінуць сваю карысную пасаду і падацца для лячэння ў Казань да слаўнага акуліста, паляка Адамінка. На жаль, надзея нас усіх падвяла, хвароба вачэй аказалася невылечнай, была гэта так званая «зялёная вада». У выніку пасля аперацыі бедалага бачыў трохі левым вокам, правае было зусім страчана.

Развітаўшыся ў Варшаве з панствам Завадскіх, падалася да маіх сваякоў. Падарожжа было ўдалае, і вялікая радасць была пры сустрэчы з Лазоўскімі, якую аднак памяншаў від калецтва няшчаснага Эдварда. Лазоўскія мелі ўласны домік над Волгай. Перад домікам іхнім спыняўся трамвай, моцна аблягчаючы ім камунікацыю з цэнтрам горада. За домам быў дужа вялікі сад, у ім некалькі дзясяткаў пладовых дрэў, дзве альтанкі, з якіх адна з двума вокнамі, з падлогай, з лаўкамі і сталом, другая ўтворана з гонкіх раслін, якія густа зрасліся, аточаная дрэвамі, давала такі мілы цень. У альтанцы з лаўкамі арганізоўвалі мы не раз гарбату, і там нам міла праходзіў час у апавяданні прыгод, што здарыліся ў час нашага побыту на выгнанні. Дзеткі Лазоўскіх былі вельмі мілыя, наймалодшы з іх Казя, які нарадзіўся на Алакмеце, а ахрышчаны ў Казані, быў хворы, слабенькі, заўсёды на руках у нянькі з сумным тварыкам, калі яго хацела ўзяць на рукі, адварочваўся смутна, гаворачы:

— Нага баліць, — што мела значыць: «Не хачу».

Дзіўная была мова гэтага дзіцяці; некалькі слоў, якія вымаўляў, не абазначалі прадметаў, якія належала пад тымі назвамі разумець. Напрыклад, цукар называў «вока», разынкі — «малпа», салдатаў — «права — лева», «не хачу» — «нага баліць». А гаворачы гэта ўсё хаваў галоўку на грудзях няні. Ніхто не меў надзеі, што гэтае дзіця будзе жыць. Бацька і іншыя дактары вырашылі, што мае страўнікавыя сухоты, бедная маці лячыла яго, як магла хатнімі лекамі.

Аднойчы, калі яго насіла па садзе, малы Казя ўбачыў спелыя маліны і паказаў іх ручкай маці, даючы ёй зразумець, каб яму іх дала. Бедная маці, якую вяло прадчуванне, сарвала дзве спелыя ягадкі, думаючы, што яму ўжо ўсё адно, бо і так на смерць прыгавораны, падала свайму малечы. Казя з'еў іх з прагнасцю і прасіў болей, радасць у вачах яго блішчала, і ад гэтага дня пачаў прыходзіць да здароўя. Пасля прыезду ў Казань спазнала вялікую радасць з нагоды неспадзяванкі, якую мне справіў шаноўны Эдвард. Ён паклікаў дзевяцігадовую Ядвіню і васьмігадовага Стася і загадаў ім зайграць на скрыпачках тое, што для мяне вывучылі. Былі гэта некалькі народных спеваў, якія яны вельмі прыгожа выканалі.

У Казані знайшліся знаёмыя са школ, яшчэ адзін настаўнік з Казанскай гімназіі, які пазнаёміў Эдварда з п. Юшкевічам, сваім калегам з гімназіі. Першая з тых сямей мела двух сыноў, другая сына і дачушку. Дзеці тыя моцна пасябравалі, хаця маладое пакаленне Лазоўскіх на шмат маладзейшае было за рэшту таварыства.

Прыбыў у той час у Казань аж з Акатні вельмі шаноўны, набожны і вялікай навукі ксёндз Эразм Ключэўскі, пакутнік, ссыльны, прыгавораны на цяжкія работы ў Тунцы і Акатуі, мясцовасцях, прызначаных для сасланых ксяндзоў. Ксёндз Эразм Ключэўскі вызначаўся не толькі высокай адукацыяй, але і непараўнальна добрым сэрцам. Таму пп. Юшкевічы, людзі вельмі шаноўныя і набожныя, карыстаючыся з прысутнасці кс. Ключэўскага, запрасілі яго, каб быў ласкавы падрыхтаваць іхніх дзяцей: Вітольдзіка і Антосю, дваіх дванаццацігадовых блізнятак, да 1-й святой камуніі.

Набожныя і выхаваныя рэлігійна дзеці Лазоўскіх, 12-гадовая Марыня і 10-гадовая Ядвіся, разам з імі адпраўлялі рэкалекцыю і рыхтаваліся да такога вялікага і святога акту, які меў на ўсё жыццё вельмі вялікае значэнне. Дзень 1-й святой камуніі тых дзетак быў вялікай урачыстасцю не толькі для іх саміх, але і для сямей Юшкевічаў і Лазоўскіх, для вялікага кола прыяцеляў і знаёмых.

Ксёндз Ключэўскі ў пярэдадзень гэтага акту, вечарам выспавядаў дзетак — назаўтра рана была яшчэ папраўка. Дзеткі былі вельмі прыгожа ўбраныя ў белае, у вэлюмах і вянках на галаве; Вітольдзік быў цераз плячо перавязаны стужкай і меў букецік кветак пры сэрцайку, і ўсе таксама мелі белыя рукавічкі. Сем'і і госці сабраліся ў касцеле і маліліся за тых чацвярых

дзяцей; выглядалі яны вельмі прыгожа, такія набожныя, такія заглыбленыя ў малітву. Ксёндз Ключэўскі сказаў казанне, потым адправіў святую імшу і ўдзяліў святую камунію. Пасля святой імшы адгаварыў уголас з дзецьмі падзячную малітву, сказаў невялікае казанне і абдарыў памятнымі абразкамі. Панства Юшкевічы запрасілі ўсіх да сябе на абед, а на другі дзень шматлікая тая кампанія сабралася ў Лазоўскіх; цэлы дзень правялі ў садзе, бо паветра было цёплае і надвор'е спрыяла.

Жыццё ў Казані ў прыемным атачэнні падалося нам раем, але бедны наш Эдвард, не могучы і не хочучы ўжо займацца медыцынай, смутнеў што раз больш, задумваючыся над тым, што будзе ў будучыні, бо ішло, як па масле, капіталік, які меў, не даваў дастаткова працэнтаў, і не раз трэба было яго парушаць. Знаёмыя Лазоўскіх — пп. Юшкевічы, Валіцкія і іншыя радзілі, каб заняўся нейкім прадпрымальніцам, напрыклад, пякарствам. Эдвард, які не любіў медыцыны, і толькі з волі маці вучыўся ёй, схапіўся за пададзеную думку. Прадаў свой міленькі домік і адразу пачаў шукаць месца для пякарні. Усё ішло, як па масле, надзвычай хутка наняў прыдатнае памяшканне, дамовіўся з пекарамі. Сястра мая засмучаная жудаснай стратай выгляду каханага мужа, цяпер цешылася, што выручае яго, будзе магчы на ўсю сям'ю і на выхаванне дзяцей зарабіць. Так адчынілі пякарню; першым печывам падзяліліся з прыяцелямі, на другі дзень ужо пачалі прадаваць. Антося сама прадавала пячэнне, муж вёў ёй рахункі, я займалася гаспадаркай, рынак быў блізка, усё можна было лёгка дастаць без гандлявання, бо з тамтэйшымі перакупшчыкамі лёгка дамовіцца пра цану, і што важней — не ашукаюць яны, як яўрэі, на цэнах і гатунках. Прыстасоўвалася да звычаяў, там прынятых: і так, напрыклад, на свята Спаса (што адпавядае нашаму Перамяненню Панскаму) пяклі пірагі з яблыкамі, у пятніцу рыхтавалі іх з рыбай. Часта смажыла яблычнае павідла і ракушкі, якімі наяданліся дзеці. Пячэнне, якое пастаўляла пякарня Лазоўскіх, было выключнае, усе палякі з прылеглых, а некаторыя з дальшых вуліц у іх печыва бралі. Два прафесары ўніверсітэта пп. Бандонін і Крушэўскі, некалькі генералаў-палякаў і нават расіян, хочучы падтрымаць існаванне пякарні, бралі штодзень на кніжачку, а ў канцы месяца аплачвалі належнае. Даход быў даволі значны, але гэтая пастаянная без адпачынку праца была зацяжкая для беднага Эдварда, які страціў цікавасць да яе пасля адкрыцця, што яго чалядніцы на ўсім яго абкрадаюць: на муцэ, дражджах, яйках, цесце сырым і печаным.

Эдвард, такі высакародны і добры чалавек, як найлепш абходзіўся з людзьмі, а тыя няўдзячныя па-зладзейску яму адплачвалі. Потым на даваршэнне да ўсяго пекары Эдварда, падкупленыя ўладальнікамі іншых пякарань, якія дбалі пра свае інтарэсы, пачалі псаваць цеста, так што не раз усё печыва было сырым, да яды не прыдатнае. Бяда і клопат з тым усім вычарпвалі Эдварда: пачаў наракаць, скардзіцца. Антося адна, без дапамогі,

не магла ўсяго адолець. Аднойчы адна з яе знаёмых пані Дульванд, зайшоўшы да яе, застала яе змучанай, амаль непрытомнай, падмяніла яе на пару гадзін, каб бедная Антося пашла ўздрамнуць і адпачыць трошачкі.

Пякарня Лазоўскіх была размешчана ў прыгожым месцы. Насупраць яе быў Дзяржавінскі парк, у якім знаходзіўся помнік гэтаму паэту. Парк быў выдатна дагледжаны, вельмі прыгожыя клумбы, кветкі, высакародныя дрэвы, элегантныя альтанкі; быў таксама там і рэстаран, дзе што дзень вечарам грымела музыка і ў які са шпацыру заходзіла шмат людзей. Жылы дом Лазоўскіх быў у падворку, я з дзецьмі там размяшчалася, а Лазоўскія прыходзілі толькі на кароткі адпачынак.

Але ўжо ніякія прыемнасці і прывязь знаёмых не здолялі падсаладзіць жыццё Лазоўскіх, роспач агарнула беднага Эдварда, а няшчаснай сястры забракла сіл маральных і фізічных на той від глядзець — упала ў роспач. У такім становішчы, пакінуўшы жонку, Эдвард выехаў з Казані, не гаворачы нікому, куды едзе. Праз пару дзён толькі напісаў са Смаленска, што купляе маёнтак за пару тысяч, размешчаны за дзве мілі ад гэтага горада. Было гэта неяк восенню. Антося ўзяла на дапамогу паню Барбару Сянькевіч, якой меўся дапамагаць п. Паплаўскі, прыяцель Эдварда, з тым разлікам, што калі пераканаецца, што гэта добры інтэрас, то пякарню ад Лазоўскіх адкупіць. Але неўзабаве пераканаўся, што кожны дзень прыносіў нейкі нават значны дэфіцыт, прыходзіў усё ж дапамагаць пані Сянкевіч і мне. Потым заступіў яго пан Астрамецкі, мой знаёмы з Томска, а яго добрая знаёмая заступіла паню Сянкевіч. Тады Антося, не думаючы доўга, забрала дзяцей і што забраць удалося ды паехала да мужа, пакідаючы ў Казані мяне са Стасем да канца школьнага года. Я працавала заўзята, дом здала студэнтам, Стась таксама меў там пакойчык; я мясцілася ў пякарні. Апавясціла, што пякарня прадаецца і нарэшце прадала яе доктару Стравінскаму за 300 руб. з усім абсталяваннем, якое каштавала Лазоўскаму каля 3000 руб. Сама зняла для сябе і для Стася памяшканне ў закрыстыяна пры касцёле. Стась хадзіў у школу, я варыла яму абед і рыхтавала снеданне. Ад Лазоўскіх пачала атрымліваць досыць суцяшальныя навіны: Антося зусім не шкадавала, што пакінула Казань, бо яе муж увесь у роспачы, не мог сам адолець клопаты і інтарэсы. Маёнтачак іхні быў малы, але выдатна размешчаны і забудаваны, дом выгадны, абшырны з высокімі столямі, падлога ясенева, паркетная, вокны мэбля і абіцце вельмі добрыя і каштоўныя, інвентар, павозкі летнія і зімовыя, коні і вупраж, мясцовасць найвыдатнейшая, суседскае таварыства зычлівае. Вазноўка была размешчана за 12 вёрст ад Смаленска, і ездзілі ў яе добрай брукаванай дарогай.

З нецярпеннем чакала вакацыяў і выезду з Казані. Загадзя сказала ўпакаваць добрае, новае піяніна, за якое Эдвард заплаціў 100 руб, а на версе размясціла пазакручанае ў коўдры больш даражэйшае сталовае начынне,

для віяланчэлі сказала зрабіць футарал, дзве пары скрыпак, дзве фузіі і ўсю мэблю выслала загадзя ў Смаленск. А сама са Стасем, калі ўжо здаў экзамен і атрымаў перавод з уступнага ў 1-шы клас, адразу з Казані выехала. Як доўга ехалі чыгункай, не памятаю, у Смаленску наняла пошту, і мы рушылі ў Вазноўку. Стась не мог яе дачакацца, пра ўсё дапытваўся паштальёна, не раз выскакваў з брычкі і бег, зрываючы па равах кветкі. Нарэшце ўбачылі чаканую Вазноўку. Пакуль фурман адчыняў вароты, Стась выскачыў з брычкі і пабег пад ганак, куды на яго сустрэчу выйшлі бацькі і ўся сям'я. Якія ж прыемныя і якія вясёлыя былі тыя вакацыі, ніколі гэтага не забуду! У Вазноўцы быў вялікі сад, хаця яшчэ занядбаны; меў прыгожую ліпавыя алеі, выдатныя пладовыя дрэвы, цяністыя альтанкі. За садам былі навозы, лес, а трохі далей невялікі ручаёк, але для купання выдатны! Антося аказалася дасканалаю гаспадыняю — што за масла, малако і смятанку там мелі, а якія смачныя радыскі, салаты і бульбачкі, найпрыгажэйшыя кветкі, насенне якіх аж з Рыгі здабывала. Трэба было дзякаваць Богу за тую прыгожую Вазноўку і ў ёй ціха сядзець, але на гэтым свеце шчасце не трывалае, такім яно было і для Лазоўскіх.

Яшчэ ў час вакацый я пісала ў Пецярбург, даведвалася, калі і на якіх умовах прымаюць паненак у пансіён святой Кацярыны. Атрымаўшы адказ у азначаны час, адвезла туды Маню і Ядвіню і памясціла ў Маскве ў французскім інтэрнаце. Абедзве гэтыя ўстановы былі толькі для дзяцей каталіцкага вызнання. За Маню плаціл бацькі, а Ядвіня стараннем ксендза дэкана Баранцэвіча, калегі майго брата кс. Мечыслава была прынята бясплатна. Школа тая, а хутчэй інтэрнат, вельмі мне падабалася з усіх бакоў; была яна пад кіраўніцтвам прэлажонай, рэлігійнай, набожнай француженкі; бібліятэка складалася з найлепшых маральных і карысных кніжак, а пачаўшы ад прэлажонай і закончыўшы вартаўніком, усе там былі французамі. Абедзвюх сваіх пляменніц я сама на месца адвезла, падарожжа прайшло шчасліва, і я мела вялікую прыемнасць, бо сустрэла ў Маскве на вакзале паню Квяткоўскую з яе дачкой Марыяй; спыніліся мы ўадным гатэлі, таму бачыла і Ціхана, яе сына і майго былога выхаванца, цяпер ужо студэнта ўніверсітэта.

Стась быў памешчаны ў смаленскую гімназію, а жыў у нейкай панны Лідзіі. Нешчаслівае было для яго размяшчэнне, вучылі яго там кепскаму, меў кепскую кампанію.

Неўзабаве для Лазоўскіх пачаліся розныя прыкрасці. Блізка ад Вазноўкі пры дарозе стаялі па абодва бакі корчмы. Адна належала Эдварду Лазоўскаму і прыносіла яму 300 руб. гадавых дывідэнтаў. Другая належала нейкаму багатаму чыноўніку, які меў уласную дысцілярню (спіртзавод). Той пан дабіўся ва ўладаў, каб другая карчма мусіла быць знесенай. Такая няўдача моцна расстроіла Эдварда і паўплывала на тое, што здаў у арэнду Вазноўку латышам за 500 руб. Тыя латышы ў колькасці 36 чалавек, са-

браўшы з поля збожжа і вымалаціўшы яго, забралі ўраджай з Вазноўкі і ўцяклі ў сваю латышскую зямлю. І так адразу страцілі Лазоўскія збожжа, увесь інвентар, коней, упраж, вазы, брычкі, крытыя і някрытыя, таксама сані, скрыпкі, віаланчэль, фузіі, нават і падлогу, якую выдралі. Здэпрэсаваныя такім знішчэннем іхняй прыгожай Вазноўкі, Лазоўскія ўжо вяртацца ў яе не хацелі, таму, прадаўшы яе, купілі вёску Паляны, размешчаную за 6 вёрст ад Смаленска, узяўшы на гэтую пакупку банкаўскую пазыку, бо ўжо грошай у іх не хапала. Вёска была харошая, зямля вельмі добрая, але не было жылога дома, і мясцовыя ўмовы былі вельмі кепскія.

Маня, іхняя дачушка, якая была ў пансіянаце ў Пецярбургу, вярнулася дадому, бо ёй пецярбургскі клімат не падыходзіў: 9 месяцаў хварэла, так што толькі тры засталіся на вучобу

Ад таго часу пачалося няшчасце Лазоўскіх і дайшлі яны да апошняй згубы. У Палянах няшчасны Эдвард памёр ад роспачы. Антося яшчэ пару гадоў прабыла ў Смаленскай губерні.

Я ў сябе мела трох хлопчыкаў на выхаванні, а Антося прыбыла ў Варшаву на 10 год пазней.

Я паехала ў Варшаву ў 1885 г. Пераканалася, што мела слушнасць, сумуючы па краі і імкнучыся ў яго. Дабрачынная Варшава хлебам і соллю прыняла бедных выгнанцаў, літоўскіх бадзягаў. Знайшліся высакародныя сэрцы, чулыя да нядолі бліжняга, якія рознымі спосабамі ўмелі прыйсці нам на дапамогу.

Ядвіня Лазоўская паспяхова закончыла сваю вучобу. Стась, найстарэйшы з братоў, які адзін толькі меў такое шчасце, бо першымі яго крокамі на полі вучобы кіравалі бацькі і іхнімі стараннямі пачаў разумовую працу, сам уласнымі стараннямі вучобу скончыў. Іншыя тры з дапамогай добрых і спагадлівых людзей вучыліся ў Варшаве. Даўні малюткі і слабенькі Казя, закончыўшы школу рамёслаў у Варшаве п. Кюнэ, атрымаў атэстат і пасля здачы экзаменаў у школу майстроў у Дэмбраве, з-за адсутнасці вакансій застаўся практыкантам на вугальных шахтах. Гэта была цяжкая і поўная небяспекі праца. Мы стараліся адгаварыць Казю ад таго выезду, а адзін са знаёмых шахцёраў дадаў, што для тае працы патрэбны атлетычныя сілы, вялікае здароўе, што даўней толькі разбойнікі і прыгавораныя да цяжкіх работ там працавалі. Мы з маці не хацелі дазваляць выезд, Казя папрасіў выбачыць, што ў гэтым выпадку нашых парад не паслухае, і пасля споведзі і выслухвання Святой Імшы поўны рашучасці выехаў у імя Божае, гаворачы, што перакананы ў тым, што палякі, хіба толькі пад зямлёй працуючы, могуць сабе сякую-такую будучыню забяспечыць. Як шаноўны Казя, так і браты яго з дзяцінства мусілі змагацца з лёсам і перажылі доўгія хваробы, якія трывалі па некалькі гадоў.

Я бедная тулячка не расчаравалася ў веры, якую ўкладала на найвышэйшага Тварца. Заўсёды да канца жыцця буду дзякаваць Богу за прытулак, які ў міласэрнасці сваёй знайсці сказаў; дзякаваць буду, што мяне да бацькоўскай зямлі вярнуў, паміж братамі памясціў, што нада мной бедным чарвяком яго вечнае вока адчуваецца. Захоўваю таксама ў маім сэрцы нязгаслую ўдзячнасць да тых, якія бедным бадзягам у імя літасці да бліжняга і ў імя польскай Айчыны з дапамогай і парадай паспяшаліся. Хоць ведаю, што людзі іхніх прынцыпаў і іхняга характару не любяць, каб левая рука ведала пра тое, што робіць правая, няхай мне вольна будзе, ідучы за поклічам сэрца, успомніць шаноўных дактароў Касінскага J., Матлакоўскага, Малеў, Бонды, Цяшкоўскага і Пшацлаўскага, якія сваёй дапамогі сям'і нашай ніколі, у любую пару дня і нават ночы не адмовілі і заўсёды ахвотна на ратунак спяшалі. Шаноўная дабрачынная сенатарша Рамбялінская і с.п. графіня Аляксандрава Аўгустова Патоцкая сваёй пратэкцыяй і апекай таксама падтрымлівалі нас у цяжкія хвіліны жыцця. Ім усім шаноўным панам, мужам справядлівым і шляхетным матронам пры заканчэнні гэтай маёй працы ад шчырага сэрца: «Бог заплаціць», — выказваю.

Успаміны Яўстаха Шалевіча

Польскі гісторык Людвіка Жыцкая[1] ў кнізе, надрукаванай у 1939 г., сярод іншых успамінаў згадала і мемуары жыхара Лідчыны Яўстаха Шалевіча. Шалевіч на пачатку XX стагоддзя перапісваўся з рэдакцыяй кракаўскай газеты «Przyjaciel Ludu», у якой тады працавала Жыцкая. Менавіта па яе просьбе ён і напісаў два сшыткі сваіх ўспамінаў, якія сёння разам з яго лістамі ў рэдакцыю захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы[2].

Гэтыя ўспаміны з'явіліся да 1914 г., і з аналізу тэкстаў бачна, што, як найменей, другі сшытак напісаны ў 1909 г. У Шалевіча атрымаўся дастаткова сумбурны тэкст, бо аўтар яўна не меў навыкаў сістэматычнага напісання вялікіх наратываў. Здаецца, ён зашмат чытаў авантурных раманаў і стараўся пісаць «прыгожа» і «як у раманах».

На жаль, на старонках аўтабіяграфіі аўтар не сказаў, дзе жыла і чым валодала яго сям'я, і не зразумела, нават, у якім маёнтку ён нарадзіўся. Вядома, што Шалевічы герба Сялява (ці Шалава) на Лідчыне жылі ў Жалудоцкай, Ваверскай і Васілішкіх парафіях і займалі розныя павятовыя пасады. З ўспамінаў бачна, што мемуарыст Яўстах Шалевіч першы перыяд жыцця правёў у Жалудоцкай парафіі.

Вядома пра існаванне на Лідчыне маёнткаў Лебяда Шалевічоўская (1690 г.) і Шалева (XIX ст.). З 1790 г. Міхал Шалевіч (дзед мемуарыста) валодаў фальваркам Заляскоўшчына з вёскай Субачы ў Жалудоцай парафіі. Потым гэтая маёмасць перайшла да бацькі Яўстаха Шалевіча — Феліцыяна (сына Міхала і Ізабэлы з Навіцкіх) і яго брата Ежы, у сярэдзіне 1844 г. фальварак Заляскоўшчына з вёскай Субачы — гэта 74 дзясяціны зямлі, 4 мужчынскія і 5 жаночых душ. Потым гэтая маёмасць перайшла да сына Феліцыяна — Адольфа Шалевіча. Брат Яўстаха — Адольф Шалевіч (сын Феліцыяна), якога мемуарыст узгадвае ў сваіх успамінах, у 1847–48 гг. вучыўся ў Лідскай павятовай вучэльні, у якой потым вучыўся і Яўстах Ша-

[1] Życka L. Działalność popowstaniowa Polakyw na ziemi mińskiej (materiały i wspomnienia) / L. Życka, M. Łęska. Warszawa, 1939.

[2] Szalewicz Eustachy. Wspomnienia szkolne ze szkoły powiatowej w Lidzie i gimnazjum w Nowogrydku // ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 4. Спр. 172.; Szalewicz Eustachy. Historja kościła żołudzkiego oraz wspomnienia o żołudzkiej parafji. Słów parę o obok leżącej Iszczołskiej parafji. Słów kilka o Szczuczynie. Lida. Parafja Koleśnicka // ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 4. Спр. 482.

левіч. У 1891 г. Адольф Шалевіч валодаў маёнткам Галадзішкі (190 дзесяцін) у Нацкай парафіі[1].

У старой прэсе я знайшоў некалькі карэспандэнцый у прэсу Яўстаха Шалевіча і некалькі згадак пра яго. Напрыклад, у траўні 1886 г. Яўстах Шалевіч паведамляў: *« … пра пажар у мястэчку Астрына. Падобна, там згарэла каля 200 дамоў, а ўцалела ледзь 20 дамоў. Кажуць, пажар пачаўся з пякарні, у якой пяклі мацу. Для яўрэяў-пагарэльцаў збіраюць сродкі яўрэі іншых гарадоў і мястэчак. У Жалудку для іх спяклі на свята 15 пудоў мацы, а ў Шчучыне — 25 пудоў. Таксама адусюль ім дасылаюць розныя рэчы і гаспадарчыя прылады. Вось якая ўзаемадапамога паміж яўрэямі. І адначасова, хрысціяне-пагарэльцы ніякай дапамогі ніадкуль не маюць.*

На ўскрайку Лідскага павета, ад вёскі Сялец, што каля ракі Нёман, дзе з'явілася чыгуначная станцыя, распачаты новы водны маршрут, які злучыў гэтую станцыю з Гародняй. Ад Гародні сюды і назад ходзіць паравы карабель. Такім чынам, можна патрапіць у Гародню за 5 гадзін заплаціўшы трошкі больш за рубель. Гэтым маршрутам карыстаецца шмат народу, а яўрэі вязуць у Гародню мільёны яек, закупленых у ваколіцах Жалудка, Орлі і іншых мястэчак.

Пасля прыезду з Варшавы на Лідчыну Лявіцкага, у павеце пачало хутка развівацца пчалярства. … Адзін ваколічны шляхціц мае добрую пасеку, якая прыносіць каля 1000 рублёў штогод і дае яму магчымасць вучыць 2 сыноў…»[2].

Шалевіч шукаў грамадскага прызнання і дапамогі і таму актыўна займаўся самарэкламай і пісаў сам пра сябе: *«Піша нам механік-самавук Яўстах Шалевіч, які жыве… каля Вільні. Ён прыдумаў некалькі практычных прылад, якія могуць быць карыснымі ў вясковай гаспадарцы. Напрыклад, апарат для кантролю начнога вартаўніка, машыну, якая адчыняе і зачыняе браму перад любым транспартам, машынку, якая падлічвае колькі вёрст праехаў воз, прыладу, якая будзіць, запальвае лямпу, налівае ваду, падае абутак і г. д. Вынаходнік мае надзею, што людзі добрай волі грунтоўна дапамогуць яму дапрацаваць гэтыя механізмы, бо сам ён не мае сродкаў»*[3].

Справа даходзіла нават да містыфікацый, калі ён, як быццам пра іншага чалавека, усё роўна расказваў сам пра сябе: *«Геніяльны самавучка. Цікавую інфармацыю даслаў нам Яўстах Шалевіч пра аднаго маладога ваколічнага шляхціца Яна Радзевіча, які жыве ў вёсцы Янава недалёка да Нёмана. «Шмат пра яго чуў, — піша Шалевіч, — а потым сам паехаў, каб пераканацца, што гэта праўда. Вучыўся ён вельмі мала — толькі адзін год у вясковай школе, а зараз жыве ў пушчы, далёка ад мястэчка і людзей. Што ён там робіць? У сваім пакоі, са свай-*

[1] Malewski Czesław. Rodziny szlacheckie na Litwie w XIX wieku Powiaty lidzki, oszmiański i wileński. Warszawa, 2016. S. 197–198.
[2] Gazeta Świąteczna. 1886. 9 maja.
[3] Kraj. 1901. 19 stycznia (1 lutego).

го невялікага насценнага гадзінніка зрабіў такую прыладу, якая калі выставіць час, будзіць яго ўначы а патрэбнай гадзіне і паднімае ложак, каб вынаходнік сеў. На стале ў яго хаце стаіць шафка ў форме каплічкі, з яе ў вызначаны час выходзіць выразаны з дрэва хлопчык і запалкай падпальвае лямпу. Усе гэта зроблена проста, але прыгожа. І я бачыў яго 3-ю работу. У маленькай шафе месціцца адмысловая шпулька, якая сама звівае і намотвае ніткі.…

Гэты геніяльны самавучка мае 26 гадоў, у яго слабае здароўе, і ён не можа працаваць на гаспадарцы. Параіў паехаць вучыцца на якую-небудзь Варшаўскую фабрыку, але ён не ў стане гэтага зрабіць.

Колькі такіх здольных людзей марнуецца без навукі, пры тым, што маглі б зрабіць шмат карыснага. Шмат такіх людзей у нашым краі, але не хапае ім адукацыі»[1], — у тэксце ўсе супадае з самім Шалевічам — і вынаходніцтвы, і малая адукацыя, і слабое здароўе, вось толькі аўтар амаладзіў сам сябе недзе гадоў на 10.

Апошні раз Шалевіча, пераблытаўшы яго імя, успомнілі ўжо пасля яго смерці. Нейкі Вітольд Радзевіч пісаў: *«Знаў… „пана Яна“ жалудоцкай гміны… які жыў адзінока і з дрэва рабіў розныя цуды, якія моцна здзіўлялі яго суседзяў. Яшчэ хлопцам ён зрабіў механічны гадзіннік, які будзіў яго арыгінальным спосабам, а менавіта — з шафкі гадзінніка выскокваў д'ябал і біў хлопца ў плечы. Яго па-мастацку ўпрыгожаны разьбой экіпаж падчас вайны немцы вывезлі ў Берлін»*[2].

Гэты вынаходнік-самавук з Лідчыны варты таго, каб яго памятаць, а яго цікавыя мемуары, вартыя, каб быць надрукаванымі. Сканаванне ў архіве дзвюх частак успамінаў Яўстаха Шалевіча аплаціў мой дарагі сын Вадзім Лаўрэш.

З вялікай прыемнасцю бяру ў рукі пяро каб выканаць пажаданне Найшаноўнейшай Пані[3] і занатаваць успаміны пра свае школьныя часы. Як я ўжо пісаў у папярэднім лісце, жадаю, каб пані гэтак жа шчыра працавала і надалей.

Прайшло ўжо 50 гадаў, як я пакінуў гэтыя мілыя для мяне навучальныя ўстановы, але і сёння соладка згадваю тыя часы. На працягу ўсяго жыцця толькі некалькі разоў снілася мне школа, і заўсёды пры гэтым я быў шчаслівы.

Маю ў Пецярбургу вельмі шляхетнага пляменніка, які мяне любіць і якому я хоць па кроплі, але расказваў пра сваё дзіўнае жыццё. У лісце

[1] Gazeta Świąteczna. 1887. 13 marca.

[2] Kurier Wileński. 1938. 18 sierpnia.

[3] Тэкст напісаны Шалевічам пра просьбе Людвікі Зыцкай, якая не паспела яго надрукаваць, бо пачалася Першая сусветнай вайна, але перадала ў архіў і унесла ў каталог, што дазволіла мне знайсці яго ў Віленскім архіве. — *Л. Л.*

я прасіў, каб ён прыслаў гэтую кніжку, у якой, уласна, я цяпер і пішу пра сваё дзіўнае авантурнае жыццё[1].

Першая частка

Гісторыя Жалудоцкага касцёла і ўспаміны пра Жалудоцкую парафію. Некалькі слоў пра суседнюю Ішчалнскую парафію і трошкі пра Шчучын. Ліда. Каляснiцкая парафія[2]

Гісторыя Жалудоцкага касцёла і ўспаміны пра Жалудоцкую парафію

Касцёл у Жалудку, які сёння існуе, пачаў будавацца графіняй Генавэфай Тызенгаўз з Пуслоўскіх у 1825 г. Яго сцены былі вымураваны, можа, на тры локці, пасля чаго праца спынілася. У такім стане касцёл праіснаваў да 1850 г. Яго будоўлю аднавіла дачка вышэй згаданай уладаркі Жалудка, графіня Германцыя Уруская, пасля чаго, за тры гады касцёл быў пабудаваны[3].

Я меў тады 11 гадоў і прысутнічаў пры пераносе начыння са старога касцёла. Новы касцёл высвеціў тагачасны пробашч, прыемны і шляхетны каплан кс. Наркевіч.

Як сёння памятаю прыгожую прамову кс. Наркевіча з пахвалой фундатарам. Графіня цалкам за свой кошт пабудавала святыню і потым, на працягу болей, чым 30 гадоў, ахвяравала грошы на рамонт касцёла, бо парафіяне як пры пабудове касцёла, гэтак і потым, ніякіх больш-менш значных грошай не сабралі.

Парафіяльны касцёл мае форму крыжа. Касцельнае начынне прывезлі з Варшавы, а абразы — з Італіі. Прыгожыя арганы зрабіў варшаўскі майстар Жаброўскі.

Пра абразы ў галоўным алтары я не ведаю. А ў правай капліцы — Пан Езус на крыжы і ўкленчыўшая св. Магдалена. У левай капліцы абраз Трох Каралёў, якія пакланяюцца Хрысту — знаўцы лічаць, што гэта вельмі добры твор.

У 1887 г. стараннем жалудоцкіх месцічаў, на чале якіх стаяў шавец Казімір Куцэвіч (знакаміты паэт), у нефе касцёла, з левага боку прэзбітэрыюма, у пабудаваным алтары размешчаны прыгожы абраз св. Міхаіла Арханёла

[1] Маецца на ўвазе вялікі блакнот, у якім Шалевіч пісаў свае ўспаміны.

[2] ДГАЛ. Ф. 1135. Воп. 4. Спр. 482. Szalewicz Eustachy. Historja kościła żołudzkiego oraz wspomnienia o żołudzkiej parafji. Słów parę o obok leżącej Iszczołskiej parafji. Słów kilka o Szczuczynie. Lida. Parafja Koleśnicka.

[3] Сучасны будынак у стылі класіцызму быў пабудаваны ў 1853 г. з бутавага каменю і цэглы паводле праекта вучонага і тэарэтыка позняга класіцызму, архітэктара Караля Падчашынскага.

які перамагае сатану, пэндзля знакамітага былога пробашча кс. Шукевіча (другі алтар павінны былі зрабіць у хуткім часе). У алтарыку, які носяць падчас працэсій, ёсць яго ж пэндзля выдатны абраз Маці Божай, якая трымае на руках дзіцятка Езуса. Каля ўвахода ў касцёл стаяць статуі ў натуральную велічыню св. апосталаў Пятра і Паўла.

Гэтыя статуі ў старым касцёле стаялі ў галоўным алтары, а потым яны 34 гады захоўваліся ў складзе. Над ганкам, які абапіраецца на 4 калоны, бачым гіпсавую фігуру Пана Езуса, які дабраслаўляе дзяцей. Над касцельным фасадам ёсць дастаткова сімпатычная драўляная вежа, а над вялікім алтаром вежачка-сігнатурка[1]. Будаўніком жалудоцкага касцёла быў вядомы ў нашай старане, надворны радца граф Урускі, архітэктарам і тэхнікам — знакаміты чалавек — Муравінскі.

Сучасная жалудоцкая святыня стаіць недалёка ад месца ранейшага Кармеліцкага касцёла, закон гэты быў знішчаны, і на месцы былога касцёла зараз растуць сады. Стары касцёл быў драўляны і стаяў каля вёскі Фарны Канец, можа за 1/3 вярсты ад новага касцёла. З касцёла кармелітаў пабудавалі плябанію. Гэтай старой драўлянай плябаніі было як найменей 150 гадоў, пра што сведчыць яе старажытная архітэктура і іншыя прыкметы. Яшчэ 20 гадоў таму яна выглядала моцнай, а можа яшчэ і сёння стаіць, але я пра гэта не ведаю.

Могілкі каля старога касцёла, дзе спачываюць парэшткі маіх дзядоў і аднаго са стрыяў (стрый — дзядзька па-бацьку — *Л. Л.*), сталі пашай для цялят і нерагацізны каля дома доктара К. Крыжы і помнікі на гэтых могілках ужо амаль што ўсе знішчаны. 25 гадоў, як я адтуль з'ехаў, але памятаю камень — сведак былых дзіцячых гадоў, на якім меўся памятны яшчэ мне знак-компас, зроблены былым пробашчам кс. Шукевічам. Парафільныя могілкі, якія месцяцца за 2 вярсты ад касцёла, вядомы ўсім як Вялікасельскія магілы, бо там недалёка ёсць вёска з назвай Вялікае Сяло.

Ад веку Жалудком валодалі Тызенгаўзы[2]. Дачка Рудольфа Тызенгаўза (апошняга ўладальніка з гэтага роду) выйшла замуж за галічаніна графа Урускага. Мелі яны сына і дзве дачкі. Іх сын, маючы 13 гадоў, плаваў, ці вучыўся плаваць і… утапіўся. Яго парэшткі былі прывезены ў Жалудок, і труна з целам пастаўлена ў касцельным склепе каля акна, праз якое яе заўсёды можна было ўбачыць. Праз два гады труну пераставілі ў глыбіню склепа. Бацькі графіні Урускай з Тызенгаўзаў на пачатку былі пахаваны на парафіяльных могілках. Потым сакрэтна, уначы, іх парэшткі былі перанесены і перазахаваны ў падзямеллі касцёла.

[1] Да пачатку XX ст. над галоўным фасадам узвышалася 8-гранная шатровая званіца і такая ж па форме сігнатурка над алтарнай часткай.

[2] Пра гісторыі Жалудка гл: Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 57–72.

Знакамітыя пробашчы ў Жалудку, якіх памятаю, гэта: кс. кс. Крукоўскі і Шукевіч. Як вядома, кс. Шукевіч быў мастаком і пры тым вельмі любіў розныя навукі, пераважна фізіку, хімію і астраномію. Усталяваў компасы і, расказвалі, што яго пакой быў завалены рознымі навуковымі прыборамі. Пры гэтым ксёндз з'яўляўся слаўным прапаведнікам. Кс. Крукоўскі таксама быў знакамітым прамоўцам і меў выдатны голас спевака. Ён казаў прыгожую прамову па памерлай графіні Тызенгаўз, пачаўшы са слоў: «Не памерла дзяўчына, але спіць», — а потым цытаваў словы з нейкага Евангелля. Казаў, што с. п. Генавэфа Тызенгаўз з Пуслоўкіх была ўзорнай жонкай, чалавекам чулым да слуг і падданых, і потым пералічыў усе яе цноты і сказаў, што яна не памерла, але пайшла ў новае жыццё і г. д., і г. д. А трэба ведаць, што яна памерла вельмі маладой, на 25-м годзе жыцця. На гэтай прамове ў касцёле быў мой бацька, які пра ўсё гэтак распавёў мне, і я па сёння ўсё памятаю.

Я ўжо і сам памятаю, як пробашчам быў таксама кс. Траскоўскі, які хутка пераехаў у Вільню. На яго месца заступіў прыемны і выхаваны кс. Наркевіч. У яго часы вікарыямі былі кс. кс. Зянкевіч і законнік Рыжы — ён вельмі добра прамаўляў казанні і прыгожа спяваў тэнарам. З'ехаў адсюль на Валынь. Кс. Наркевіч толькі некалькі гадоў быў у Жалудку і потым пераехаў у іншую парафію. Бадай, праз 3 гады пасля паўстання 1863 г. нешта за ім знайшлі і выслалі ў Сібір. Праз нейкі час ён вярнуўся ў край і хутка памёр.

Пасля яго ў Жалудок прыехаў агульнавядомы кс. Ясінскі, якога я добра памятаю, а з ім яго годны вікарый кс. Ліпко. Гэтыя слаўныя людзі былі вялікімі ворагамі алкаголю. Яны за 3 гады вырвалі сваіх парафіян з няволі, горшай за паганства — гарэлкі.

Св. касцёл, як наш бацька, хваляваўся за дабро для сваіх дзяцей і больш за 50 гадоў ваяваў з алкаголем. Пачаў у 1858 г. са стварэння «Брацтва цвярозасці»[1]. У добра мне знаёмай Жалудоцкай парафіі ў той час служылі шляхетныя і руплівыя ксяндзы: пробашч Ясінскі — слаўны прапаведнік і

[1] Каталіцкім касцёлам у 1850–х гадах быў ініцыяваны рух за цвярозасць, які разглядаўся ўладамі як пагроза напаўненню бюджэту і небяспечная «польская» грамадская ініцыятыва. Аднак ураду давялося пайсці на пэўныя захады, каб зменшыць спажыванне алкаголю, у тым ліку даўшы палёгку піваварам, бо да гэтага часу падаткавая палітыка стымулявала перавагу гарэлкі над усімі іншымі алкагольнымі напоямі. На месцах былі створаны «Камітэты для назірання за правільным продажам алкагольных напояў». У Лідзе такі камітэт пад кіраўніцтвам павятовага маршалка шляхты (прадвадзіцеля дваранства) Рамуальда Казіміравіча Кастравіцкага (кавалер ордэна Св. Уладзіміра 4–й ступені) з'яўляецца ў 1846 г. Акрамя маршалка, камітэт утваралі 3 сябры камітэта і 13 дэпутатаў, папяровымі справамі камітэта займаўся «пісьмавадзіцель» павятовага маршалка шляхты. Мемуарыст Мірон Браніслаў Нарбут пісаў: *«З 1860 года, калі ў цэлым Краі пачаў абуджацца разумовы рух, актыўна клапаціліся пра заснаванне народных школ і лідзяне, а духавенства пашырала таварыства цвярозасці з даволі паспяховым вынікам,*

яго годны памочнік кс. Ліпко. Пачалі яны зацятую барацьбу з гарэлкай і перамаглі гэтага страшнага ворага — праз 3 гады піякаў у Жалудоцкай парафіі не было.

Гэтыя ксяндзы пры кожнай магчымасці заклікалі ўступаць у «Брацтва цвярозасці», гэтак было і на казаннях і на катэхізацыі дзяцей і г. д. Калі ксяндзы прыязджалі да хворага, ці па калядзе, яны збіралі вакол сябе людзей і распавядалі ім навуку цвярозасці. Кс. Ясінскі, займаючыся гаспадаркай, часамі падыдзе да жней ці касцоў і не шкадуючы часу ўгаворвае іх. І якое шчасце паміж людзей запанавала! Такі [не п'ючы] чалавек паедзе на рынак толькі па патрэбе, каб залатвіць свае справы і хутка вернецца дахаты. Ён не сядзіць недзе ў шынку з сябрамі да позняй ночы, а глядзіць за канём, і яго каня не скрадуць, дамоў прыязджае цвярозы, і не б'е сваю жонку, і не гоніць з хаты дзяцей. Кабеты ішлі да нашых ксяндзоў і за іх збавенчую працу кленчылі ім у ногі. Неяк у плябанію прыйшло 30 кабет. Да іх выйшаў ксёндз Ясінскі:

— Што трэба, дзеці мае?

— А ці кс. Ліпко ўдома?

— Так, удома.

— Найпакорліва просім, каб выйшаў да нас.

Выходзіць кс. Ліпко. Усе кабеты пападалі да ног святароў і са слязьмі падзякавалі ксяндзам за іх апостальскую працу.

Кс. Ясінскі у 1867 г. быў пераведзены з Жалудка ў Вільню. Жалудоцкія парафіяне, ідучы на Кальварыю, усёй грамадой заходзілі да Ясінскага, каб выказаць яму сваё шанаванне і ўдзячнасць за святарскую працу.

Кс. Ясінскі (экс-піяр) доўгі час служыў у беластоцкім жаночым інстытуце прафесарам рэлігіі. Потым быў пробашчам у Жалудку. Кс. Ясінскі варты быў быць біскупам, але яго панізілі да вікарыя віленскага касцёла св. Пятра, і на гэтай пасадзе ён памёр. Пахаваны на могілках св. Пятра з левага боку ад уваходу ў капліцу, жыў 91 год і, здаецца, памёр у 1892 г. Кс. Ліпко таксама даўно адышоў у вечнасць.

Гонар і вечная слава ім, бо былі яны найшляхетнейшымі капланамі і сапраўднымі Хрыстовымі слугамі (Мая сям'я вельмі, о, вельмі гэтым апосталам абавязана).

Недзе ў 1863 г. ксяндзам было забаронены ўтрымліваць «Брацтва цвярозасці», але некаторыя ксяндзы не склалі зброі і рабілі справу, пераважна,

---

так што побыт лідзян значна палепшыўся, і ў 1862 годзе спаткаць п'янага лідзяніна было ўжо рэдкасцю». Неабходна заўважыць, што ідэя народнай цвярозасці прыйшла да нас з Еўропы, і асаблівы ўздым гэтага руху прыйшоўся на 1858–63 гг., г. зн. перад самым паўстаннем: *«У Царства Польскае цвярозасць прыйшла ў 1857 г. і адтуль у канцы 1858 г. распаўсюдзілася ў сумежных губернях: Ковенскай і Гарадзенскай. ...у снежні 1858 цвярозасць прыйшла і да нас... і да 1 сакавіка 1859 г. цвярозасць распаўсюдзілася па паветах: Віленскім, ...збольшага па Ашмянскім і Лідскім»*, — паведамляла Памятная кніга Віленскай губерні за 1860 г. Да канца 1859 г. 39 408 чалавек на Лідчыне публічна, у храмах, прынялі на сябе абавязак устрымлівацца ад ужывання алкаголю.

на споведзі. Такім быў кс. Рыхлевіч з Ражанкі. Прыходзіць чалавек яму да споведзі:

— А ці ты п'еш водку?

— П'ю, ксёнжачку!

— Тады ідзі сабе з Богам, я цябе спавядаць не буду.

Пасля гэта чалавек кідаў піць і толькі тады ішоў да споведзі. І гэтак ксяндзы ваявалі за цвярозасць.

Ведаў я гэтых ксяндзоў, і гэта мае даўнія, дзіцячыя ўспаміны. На выдатных казаннях кс. Ясінскага я бываў, можа, са 100 разоў, яго апостальскія навукі і сёння для мяне важныя. (Калі прынёс у рэдакцыю фотаздымак кс. Ясінскага і прасіў, каб зрабілі з яго партрэт, мяне накіравалі да сябра пана… і ён мне гэта зрабіў).

Пасля вялікай колькасці яго казанняў, уладальнік маёнтка Красулі Яноўскі зачыніў вінакурню. Дзеля добрага прыкладу разам з сям'ёй уступіў у брацтва. За ім пайшлі яго службовыя асобы і прыслуга, а потым і сяляне (тады яшчэ быў прыгон). Рух набіраў моцы: кожную нядзелю, кожную службу ў касцёле запісвалася ў брацтва і ратавалася ад гэтай пошасці па 50–80 чалавек.

Тыя, якія ў часы кс. Ясінскага зарэкліся не піць гарэлку, амаль што ўсе трымаліся ў гэтай добрай справе ажно да смерці, і яшчэ і сёння некаторыя з іх жывуць. Толькі ў 1864 г. ксяндзам было забаронена прапаведаваць цвярозасць, і вырасла новае пакаленне, якое не слухала навукі нашых ксяндзоў. І людзі зноў пачалі піць алкагольныя напоі.

Жалудоцкія парафіяне касцёла любілі і шанавалі свайго пробашча кс. Ясінскага.

Пасля кс. Ліпко Жалудоцкім вікарыем стаў кс. Станіслаў Ішора — маладзенькі ксёндз, які толькі 2 гады як быў высвечаны на каплана. Быў гэта вельмі прыгожы і прыстойны чалавек. Ён меў такое сэрца і душу, што яго вельмі любілі прыхаджане. Ён у памяць пакутнікаў 1863 г. прачытаў у касцёле маніфест з заклікам да паўстання і ў той жа дзень выехаў да кс. Рыхлевіча ў Ражанку. Заўтра ў Лідзе ўжо ўсё ведалі. Жандары, якія прыехалі яго арыштоўваць, не знайшлі кс. Ішору і забралі кс. Ясінскага. Кс. Ішора мог пайсці ў лес ці выехаць за мяжу, але яго арыштавалі, бо ён сам аддаў сябе ў рукі ўладаў, кажучы пры гэтым: «Я маніфест чытаў, бярыце мяне, пробашч не вінаваты…». Перад тым, як яго павезлі, кс. Ішора заклікаў людзей, каб тыя развітваліся з ім плачам і енкамі — ён сказаў людзям: «Мяне заб'юць».

Кажуць, што на пачатку, папярэднік Мураўёва, генерал-губернатар Назімаў пакараў яго пяццю гадамі ссылкі ў Сібір, але прыехаў сам Мураўёў, яшчэ раз судзіў справу, і нашага дарагога кс. Ішору пакаралі смерцю ў Вільні на Лукішках — за веру, за касцёл, за Бацькаўшчыну. З рук ворагаў атрымаў ён смерць і карону пакутніка[1].

Жалудок, як быццам, не вельмі гістарычнае мястэчка. Не памятаю, калі і які шведскі кароль зімаваў у Жалудку[2].

У 1867 г. у Жалудоцкай парафіі пачалі адбывацца вялікія цуды.

Сялянка Язафата Казлоўская з вёскі Доўгай[3] пайшла капаць бульбу. Калі вечарам вярталася назад (а ўжо пачынала цямнець), перад сабой на дарозе яна ўбачыла нейкую асобу ў белым. Язафата зразумела, што бачыць нешта зверхчалавечае, моцна спужалася і адбегла ад дарогі на некалькі крокаў. Тады тая асоба кажа ёй: «Не бойся мяне, Язафата, падыдзі бліжэй да мяне, маю табе шмат што сказаць». Язафата з вялікім страхам падышла да яе, і тая асоба працягвала: «Я ёсць Маці Езуса Хрыстуса. Уся ваша вёска вельмі нягодная. Не раз над ёй вісела кара майго сына, але я прасіла за вас. Адзін толькі ў вашай вёсцы ёсць праведнік і богабаязны чалавек — Урбановіч. Прыходзьце да яго па вечарах і чытайце вось такія малітвы (якія — не памятаю). І ты таксама вялікая грэшніца. Таму ідзі заўтра на споведзь да кс. Ясінскага і май на ўвазе, што пасля найсвяцейшага сакраманту будзеш дзве гадзіны цяжка пакутаваць. Пасля гэтага прыходзь на гэтае месца, і я штодзень буду табе тут з'яўляцца». Язафата ўдома расказала пра ўсё свайму мужу і ўсёй сям'і. Падобна, яшчэ ў той вечар яны пайшлі маліцца да Урбановіча. На раніцы жанчына пайшла да кс. Ясінскага на споведзь і ўсё яму расказала. Пасля святога сакраманту ёй стала дрэнна, і ў такім стане яна прабыла дзве гадзіны. Кс. Ясінскі раіў ёй пакласці мшал пад галаву. Спыталі ў кс. Ясінскага, што ўсё гэта можа значыць? Як быццам ён коратка адказаў: «Убачыце, што тут сёння будзе». Усе гэта я пачуў ад жалудоцкага арганіста Вінцэнта Ліхвяровіча.

Чуткі пра цудоўнае з'яўленне Язафаце Маці Божай з хуткасцю птушкі разляцелася па парафіі і па цэлым Лідскім павеце, і потым, зразумела, што ў вёску Доўгую пайшлі пілігрымы. Штодзень тут збіралася дзве і болей тысячы людзей. Язафата кожны дзень хадзіла на тое месца, і заўсёды Маці Божая, як быццам, з'яўлялася ёй. Гэта было ў далінцы каля Тошачкі (?) і

[1] Кс. Станіслаў Ішора прачытаў у касцёле паўстанчы маніфест і сам здаўся ўладам. Ён быў асуджаны ў Вільні на 5 гадоў катаргі, нягледзячы на амністыю для тых, хто сам здасца ўладам. Генерал-губернатар Назімаў змякчыў пакаранне да 5 гадоў высылкі. На няшчасце, 26 траўня ў Вільню прыбыў новы генерал-губернатар Міхаіл Мураўёў і замяніў прыгавор карай смерці. 3 чэрвеня (22.05) 1863 года ксёндз Ішора быў расстраляны на Лукішках і стаўся першай ахвярай Мураўёва ў Вільні.

[2] У 1706 г. шведскі кароль Карл XII меў у Жалудоцкім кармеліцкім кляштары зімовую кватэру. Адсюль выязджаў у Орлю для агляду моста цераз Нёман і 8 сакавіка ледзь не загінуў з-за таго, што на рацэ пачаў ламацца лёд. А на наступны дзень ён сустрэў дэпутацыю горада Вільні. Тады ж шведы па загадзе караля абстралялі Маламажэйкаўскую царкву, якая здзівіла яго сваім незвычайным выглядам.

[3] У 1828 г. вёска Доўгае належала да Арлянскай грэка-каталіцкай парафіі, але Язафата Казлоўская, хоць і насіла імя ў гонар Язафата Кунцэвіча, была рыма-каталічкай.

там, дзе яна з'яўлялася, павінна была з'явіцца крыніца. Потым, як быццам, Маці Божая сказала, што ад сёння яна будзе з'яўляцца пад крыжамі, і з гэтага часу народ пачаў збірацца каля гэтых крыжоў. Язафата заўсёды была ўкленчаная, у хустцы, накрыўцы, уся ў малітвах і казала, што і зараз бачыць Маці Божую. Але больш маўчала. Пілігрымы ішлі з Вільні і яе ваколіц, са Жмудзі і нават з Варшавы.

Хутка Язафату арыштавалі. Некалькі тыдняў яна сядзела ў Лідскай, а потым Віленскай турме. Яе дапытвалі паліцэйскія, з ёй размаўлялі дактары і ксяндзы. Некаторыя ксяндзы ёй верылі і лічылі Язафату святой асобай.

Дзе толькі ў чужой парафіі яна з'яўлялася на фэст, жанчыну запрашалі на абед у плябанію, дзе ксяндзы падрабязна распытвалі аб яе візіянерстве. Кс. Ялянеўскі[1], тагачасны жалудоцкі вікарый, казаў майму тату, што ўся гэта гісторыя праўда. Іншыя ксяндзы казалі, што простая кабета, якая нават і чытаць не ўмее, кажа пра такія рэчы, аб якіх можам ведаць толькі мы, святары.

Як жа выглядала Маці Божая? Язафата казала, што яна вылучалася прыгажосцю, большай за сярэдняю, мела распушчаныя валасы, была ў белым убранні, падпяразаная блакітнай стужкай і, вядома, босая.

Дактары лічылі, што ў Язафаты, падобна, хвароба кшалту меланхоліі (яна мела цалкам добрае здароўе). Паліцыя падазравала, што за ёй стаіць кс. Ясінскі, які даў ёй такую камунію, што яна дзве гадзіны была хворай. Па выніках справы, ксяндза перавялі ў Вільню. Два гады ён жыў у доме графа Тышкевіча, дзе яго і наведвалі жалудоцкія парафіяне, якія ішлі на Кальварыю, і выказвалі яму ўдзячнасць за апостальскую працу. Потым яго панізілі да вікарыя касцёла св. Пятра.

Я таксама ведаў гэтую Язафату і два разы зачапіў яе наконт цудаў. Мела яна вельмі невялікі дар слова. Яе цуды дапамагаў разгалошчваць раней згаданы Урбановіч, і ён жа разносіў ваду з крыніцы. Некаторыя лічылі тую ваду цудадзейнай і карысталіся ёй як лекам, напрыклад, ад зубнога болю. Другім памагатым у распаўсюджванні цуда Язафаты быў Міхал Сіпайла з Вялікага Сяла, ён казаў людзям невялікія гаворкі-казанні. На адным з такіх яго казанняў я таксама быў.

Здаецца, Язафата праз Урбановіча загадала парафіянам, што каб убачыць у Жалудоцкім касцёле вялікі цуд, трэба шчыра пасціцца 12 пятніц на Узнясенне Маці Божай. Некаторыя пасціліся, але ніякіх цудаў не было. Мне моцна не падабалася, што некаторыя з памочнікаў Язафаты мелі з усяго гэтага прыбытак. Урбановіч хадзіў па вёсках, разносіў цудоўную ваду, заклікаў да посту і малітвы і начаваў у вёсцы Дзірванцы, у добра знаёмага яму гаспадара Коўчыка. Неяк на ранку ў гэтай хаце сабралася шмат народу

[1] Кс. Яўстах Ялянеўскі, падобна яшчэ жыве і недзе ў Троцкім павеце служыць пробашчам. — *заўвага аўтара.*

на супольную малітву, падчас якой з ім адбылася вельмі непрыемная гісторыя. З-за сораму, ён больш у гэтай вёсцы не паказваўся.

Праз нейкі час губернатар вырашыў паставіць у Доўгай варту з казакаў і жандараў і загадаў: «Разгонять!». Жандары нарабілі спраў, а казакі неміласэрна разганялі пабожных вернікаў нагайкамі. Сярод народу з'яўлялася інтэлігенцыя ў сялянскай вопратцы, бо з сялянамі паліцыя ласкавей сябе паводзіла. Калі знаходзіцца ў Доўгай стала немагчыма, людзі пачалі збірацца па начах, каб памаліцца недалёка ад крыжоў.

Гэта ўсё цягнулася 2 гады. Пад канец другога года, мне ў галаву прыйшла думка таксама падлячыцца ў Доўгай. Можа, і я атрымаю якія ласкі нябесныя, бо шмат пілігрымаў атрымлівалі дапамогу ад Маці Божай? Неяк я намовіў пайсці на ўсю ноч у Доўгае разам з сабой 8 моцных, як дубы, мужчын. Пачатак пілігрымкі быў вельмі паэтычным. Калі мы былі паміж мястэчкам і дваром, над намі праляцеў вельмі прыгожы метэарыт, ён разбіўся на вялікія часткі і знік у бязмежнай прасторы. Потым мы бачылі частковае зацьменне Месяца, што на мяне зрабіла дзіўнае ўражанне. Потым перад намі дарогу перайшоў воўк, што павінна было абазначаць шчасце. Але закончылася наша пілігрымка вельмі непрыемна.

Маімі таварышамі ў гэтым падарожжы былі: раней згаданы арганіст, другі — яго стрыечны брат, добра знаны ў Жалудку Люцыян-слесар, і быў паміж намі нават адзін праваслаўны. Мы шчасліва прыйшлі ў вёску Прэцім, дзе хаваўся жандар. Пасля зацьмення, у небе ўжо ярка і прыгожа свяціў месяц. Нарэшце, спыніліся недалёка ад крыжоў. Паўсюдна, каля крыжоў і на полі былі бачны купкі людзей, якія маліліся ўкленчыўшы.

З нашай групы першым укленчыў я, другім — арганіст. Мы рупліва, у голас адчыталі Літанію да Найсвяцейшай Панны. Тады да мяне падышоў жандар, заглянуў мне ў вочы і сказаў: «Сколько вас тут?» Тады арганіст ускочыў і пабег так хутка, як толькі змог, а жандар кінуўся за ім. «Стой», — закрычаў жандар і стрэліў з рэвальвера ў паветра. Арганіст меў трошкі лепшыя ногі, і жандар застаўся далёка ззаду. Уцякаючы, арганіст зачапіўся за сялян, якія спалі ў полі і ўпаў. «Злодзей», — закрычалі сяляне і схапілі арганіста, але ў цемры разабраліся, каго злапалі, і далі арганісту каня, каб ён як найхутчэй патрапіў дамоў.

Наш шаноўны Люцыян-слесар пабег у бок вёскі, але яго злапалі, ён атрымаў нагайкі і быў арыштаваны. Нас засталося чацвёра: я, сталяр Вількін, шавец Мацей (праваслаўны) і яшчэ адзін, але як пачалася страляніна, усе кудыхто падзеліся, а як толькі з'явіліся конныя казакі з нагайкамі, усе людзі пабеглі ў бок лесу. Сталяр быў ужо немалады чалавек, але страх мае вялікія вочы, і адкуль у яго толькі ўзяліся ногі? Хутка на полі каля крыжоў нікога не засталося. Я прыбег да лесу і, каб адпачнуць, трошкі паляжаў, а потым пайшоў берагам лесу ўправа. Стаяла глухая ноч. Знайшоў нейкі дом, пагрукаўся ў дзверы. Выходзіць нейкі напаўраспрануты яўрэй і пытаецца, адкуль

я буду і чаму ўначы швэндаюся? Спытаў дарогу да Жалудка, ён рукой паказаў мне накірунак сказаў, каб я ішоў напрасткі праз поле і лес у тым кірунку, у лесе будзе вялікая дарога, і па ёй, у правы бок да Жалудка — 10 вёрст.

Акрамя мяне, жандар пазнаў усіх жалудоцкіх (бо я жыў за некалькі вёрст ад мястэчка) і запакаваў усіх «да казы» (мясцовая часовая вязніца — *Л. Л.)*. Выпытваў ва ўсіх, хто такі быў з вамі у чорным адзенні? Усе адказалі, што не ведаюць, бо гэты чалавек далучыўся да іх па дарозе. Калі б мяне ўзялі — мне было б найгорш. Справа гэта была ў 1869 г., праз няшмат гадоў пасля паўстання, і шляхту яшчэ паўсюдна высялялі, а я ж быў шляхціцам. Жалудоцкай «казой» для мяне справа б не закончылася, пазнаёміўся б я і з лідскім «частаколам»[1] (турмой — *Л.Л.*).

Я тую памятную ноч пехатой зрабіў каля 4 міль. Ад мяне да Жалудка было 4 вярсты, адтуль да Доўгай — 8, да таго фальварка — 2, разам 14. А яшчэ назад. Вось і падлічвайце.

Час ад часу я пытаўся ў Урбановіча: «Што чутно?» Ён заўсёды адказваў: «Усё ў нас добра». А наогул, гэтыя падзеі далі надзею, што праз цуд і нашу веру, наш касцёл выстаіць.

Пасля вяртання з турмы Язафата мела яшчэ дзіцё, якое, калі выжыла, дык мае сёння 44 гады. Праз некалькі гадоў Язафата і яе памочнікі Урбановіч і Сіпайла — усе адышлі ў вечнасць.

І ўсё прайшло, і ўсё мінула, і ўсё засталося ў мінулым… а што там такое яшчэ было — невядома.

Канец.

P.S.

У Жалудоцкай парафіі, як і ў іншых месцах, панавалі жудасныя забабоны.

Божае Нараджэнне, Вялікдзень і Зялёныя Святы заўсёды святкавалі па 4 дні.

У вёсцы Дзірванцы жыў каваль Станіслаў Зацікевіч. На другі дзень пасля Новага года я прыехаў да яго з работай. Каваль сказаў, што рабіць ён не можа, бо сёння свята.

— Якое ж сёння свята?

— А, таксама Божае Нараджэнне.

— Дык, калі яно ўжо было?

— А ў нас свята ад 1-га дня Божага Нараджэння да Новага года і яшчэ 1 дзень пасля Новага года[2].

Кс. Ясінскі сябе не шкадаваў, каб выкараніць гэтыя звычаі, але ў яго не атрымалася. Народ хутчэй адрокся ад гарэлкі, чым ад забабонаў. […]

[1] У Лідзе турма складаецца з двух дамоў: мураванага і драўлянага якія агароджаны вялікім частаколам. Пераважна ў гэтым месцы ў памятны год сядзелі палітычныя злачынцы. — *заўвага аўтара.*

[2] У нашай карчме з–за гэтых святаў Зэлік меў вельмі добры прыбытак. — *заўвага аўтара*.

25 гадоў таму месціч А.Б. адчыніў маленькую крамку. Калі яўрэі прыйшлі ў Літву і завалодалі гандлем, дык, можа, ад тых часоў гэта быў першы гандаль, які адкрыў неяўрэй. Нашы браты, замест дапамогі свайму, як маглі яго ўціскалі — казалі, што ён лянівы католік, не хоча працаваць і таму адкрыў краму. І прыйшлося А.Б. хутка зачыніць сваю краму. На тым жа месцы адчыніў крамку праваслаўны адстаўны жаўнер, у таго справа пайшла лепей, бо ён на вынас гандляваў гарэлкай з закускай.

Гэтак было 25 гадоў таму. Некалькі гадоў таму я чуў, што ў Жалудку адчынілася кааператыўная крама і справы ў ёй ідуць нядрэнна.

У Жалудку сярод месцічаў былі дзве важныя асобы. Арганіст Вінцэнт Ліхвяровіч — вялікі майстар-самавук і шавец-паэт Казімір Куцэвіч. Арганіст ужо не жыве, а паэт яшчэ не памёр. Па яго вершах бачна, што не меў ён ніякай навукі, але ў вершах яго ёсць пачуцці, і бачна, што аўтар мае вялікі і рэдкі талент.

Я нарадзіўся ў Жалудоцкай парафіі і жыў у ёй 30 гадоў, і яна назаўсёды застанецца ў маёй памяці.

Некалькі слоў пра суседнюю парафію ў Ішчалне

Маёнтак Ішчална, каля якога стаіць парафіяльны касцёл, належаў Валям. Дачка апошняга Валя выйшла замуж на лідскага віца-маршалка Лясковіча, а дачка Лясковіча стала жонкай Важынскага. Такім чынам, Ішчална належала гэтым апошнім. Апошні з Важынскіх — Баляслаў, быў жанаты з малодшай сястрой Станіслава Грабоўскага, якая ў пасаг прынесла мужу 75 000 рублёў. Гэтая магнатка, бачачы нешта нядобрае ў паводзінах мужа, сама забрала сваё жыццё стрэлам з рэвальвера. Засталіся 3 дачкі і сын, які вучыўся ў Рыжскай гімназіі і, падобна, вучыўся добра, што сярод дзяцей магнатаў бывае рэдка. На жаль, ён памёр, калі вучыўся у 5-м класе. Маёнтак застаўся ў руках яго сёстраў[1].

Недалёка ад палацыка, у маёнтку стаіць невялікі мураваны дамок-скарбец. Там захоўваюцца некаторыя гістарычныя рэчы Валяў: браня, шышакі і г.д.[2] Сховішча было ў асобным пакоі. За некалькі тыдняў да самазабойства Важынскай яе служка ўвайшоў у сховішча і ўбачыў там нейкага невядомага, прыгожага пана ў чорным убранні. Невядомы ўхапіўся за руку служкі і так моцна сціснуў яе паміж плячом і локцем, што на руцэ засталіся сінія плямы. Невядома, ці казаў што гэты невядомы прыгажун. Служка закрычаў з вялікім намаганнямі вырваўся з рук невя-

[1] Падрабязна пра гісторыю Ішчалны, гл: Лаўрэш Леанід. Страчаная цывілізацыя. Гістарычныя хронікі: Маёнтак Ішчална // Новы замак. 2022. Выпуск 10. С. 179–200.

[2] Пра прыватны музей–архіў Ішчалны гл: Лясковіч Караль. Красовы двор і яго суседзі. (Пераклад і каментаванне Леаніда Лаўрэша) // Лідскі летапісец. 2021. №3–4 (95–96). С. 85–104.; 2022. №1–2 (97–99). С. 43–84.

домага, потым кінуўся ў палацык і расказаў ўсё, а як доказ, прадэманстраваў сінякі (распавёў пра гэта тагачасны Ішчалнянскі пробашч кс. Свяцкевіч).

Пры касцёле маецца прымураваны трысценак — як быццам пакой. Там захоўваецца 6 трунаў з парэшткамі былых уладальнікаў маёнтка: Валяў, Лясковічаў, Важынскіх. Валь памёр ужо гадоў 120 таму, а Важынскія гадоў з 50. Я яшчэ памятаю, як гадоў 40 таму адчыняліся ўсе труны і я бачыў парэшткі гэтых магнатаў[1].

Таксама гадоў з 40 таму, у Ішчалнянскай парафіі, у часы вышэйзгаданага пробашча кс. Свяцкевіча адбылася страшная авантура, ці дакладней — злачынства. Памёр тут багаты селянін па прозвішчы Ёч. Яго прыгожа апранулі і пахавалі на парафіяльных могілках. Назаўтра людзі прыйшлі зноў кагосьці хаваць. Знаёмыя Ёча пайшлі праведаць ягоную магілу і ўбачылі жудасную карціну: магіла раскапаная, і цела без вопраткі і нават без бялізны выкінутае з труны, а ў нябожчыка адрэзана кісць адной рукі. Адразу пра гэта расказалі пробашчу, і той выклікаў паліцыю. Распачалося следства, але паліцыя нічога даведацца не змагла[2].

Праз некалькі тыдняў, васілішскі ключвойт Галушка (зараз гэта ўраднік), аб'язджаючы свой участак, заехаў у карчму ў Масявічах і знайшоў там адстаўнога жаўнера, які падазраваўся ў крадзяжах, са скураной торбай на плячах.

— Ты маеш пашпарт?

— Я хаджу па сваёй воласці, і пашпарта мець не павінен.

— А што маеш у торбе?

Той адчыніў торбу — на версе ляжала чыстая бялізна.

— А што там пад бялізнай?

— Там ляжыць кавалак сала, які мне гаспадыня дала.

Злодзей бярэ гэта ў рукі і закідвае за ложак яўрэйкі. Паліцыянт загадвае дастаць і бачыць, аж там адрэзаная чалавечая кісць рукі!

Ураднік арыштаваў яго і даставіў у Васілішкі. Следства паказала, што гэта была кісць нябожчыка Ёча, нябожчыка абабралі 3 злачынцы, і, зразумела, усе яны былі пакараныя.

У 1863 г. пробашчам у Ішчалне быў кс. Фалькоўскі. Ён прачытаў заклік да сялян далучацца да паўстання, за што быў расстраляны ў Лідзе. Месца пакарання выбралі недалёка ад горада, на Выгане, дзе зараз стаіць ветраны млын. Не раз, ідучы гэтым месцам, я думаў пра гэтую магілу нашага шаноўнага кс. Фалькоўскага.

Некалькі слоў пра Шчучын

[1] Пра пахаванне ў касцёле гл: Лясковіч Караль. Красовы двор і яго суседзі.

[2] Пра такія злачынства, гл: Лаўрэш Леанід. Прыход у Мыто // Лідскі Летапісец. 2021. №2 (94). С. 19–29.

Сімпатычнае мястэчка Шчучын знаходзіцца за 2 мілі ад Жалудка і за 8 ад Ліды. З ранейшых часоў і зараз гэта ўласнасць князёў Друцкіх-Любецкіх. Здаўна там былі 2 кляштары: піяраў і сясцёр міласэрнасці.

Ксяндзы-піяры утрымлівалі 6-ці гадовую школу[1]. У гэтай школе вучыўся і мой бацька. Ён расказваў, як іх вельмі грунтоўна вучылі і каштавала гэта 40 грошаў у год. Ніякай формы ў вучняў не было, і кожны хадзіў у школу ў сваёй вопратцы, нават хоць у кажушку. Гаспадыням кватэр, якія здымалі, плацілі прадуктамі. Усе было на дзіва танна, і пуд жыта каштаваў 25 грошаў, а ўсё ацэньвалася ад гэтага кошту[2]. Утрыманне аднаго хлопца ў школе каштавала 20 рублёў у год (?). Усё гэта было каля 1812 г. Ксяндзы-выкладчыкі вучылі вельмі старанна і розгаў не шкадавалі.

Адзін з прафесараў школы, кс. Астроўскі, як мне апавядаў прафесар Урбановіч, быў знакамітасцю. Пэўна праз 40 гадоў пасля яго смерці, я бачыў яго намаляваны алеем партрэт. Гэты партрэт знакамітага каплана і педагога пераехаў у жытло арганіста.

Не ведаю добра, у якім годзе, але недзе пасля 1831 г. закон піяраў скасавалі. Не ведаючы сваёй будучыні, піяры перад сваім упадкам пабудавалі прыгожыя і вялікія мураваныя касцёл і кляштар. У ваколіцах Шчучына ксяндзы-піяры мелі свой вялікі маёнтак і пасля скасавання закона піяраў, як і касцёл з кляштарам, ён патрапіў у рукі ўрада.

У Шчучыне здаўна меўся закон сясцёр міласэрнасці[3]. Яны таксама мелі свой маёнтак. Сёстры ў сваім кляштары ўтрымлівалі 20–30 бедных хворых і няшчасных, якім яны ствараліе добрыя ўмовы жыцця. Напрыклад, нейкая невылечна хворая па прозвішчы Дабачынская, ляжала ў іх кляштары 23 гады.

Пасля скасавання кляштара, яго маёмасць таксама была канфіскавана, а кожнай з сясцёр прызначылі пенсію па 15 рублёў штогод.

Гаспадары навакольных маёнткаў, як маглі, прысылалі ім збожжа, бульбу, птаства і іншыя прадукты. Гэтак, з ласкі Божай, і жылі сёстры пры гэтым дзяліліся лішкамі ежы з нэндзамі. Яшчэ яны ўтрымлівалі школку для дзяўчынак і штогод вучылі па 20 чалавек. За стол і навуку бралі вельмі няшмат, а з бедных наогул нічога не бралі. Вучылі дзяўчынак рэлігіі і дама-

[1] Піярскія калегіюмы ў ВКЛ з'явіліся пры канцы XVII ст. Сапраўдны росквіт гэтых устаноў наступіў у нас пасля заканчэння вынішчальнай Паўночнай вайны, пасля 1721 г., і ў 1736 г. утварылася асобная Літоўская правінцыя піяраў. Але яшчэ ў 1718 г. уладальнік Шчучына Ежы Юзафовіч–Глябніцкі запрасіў манахаў–піяраў, каб яны адкрылі школу. У 1726 г. Сойм пацвердзіў заснаванне ў Шчучыне калегіюма піяраў і ўсе фундацыі яму ад Юзафовіча–Глябіцкага і яго дачкі Тарэзы, якая пасля смерці бацькі апекавала калегіюм.

[2] 1 злоты быў роўны 15 капейкам срэбрам, а 1 грош, які традыцыйна адпавядаў 1/30 злотага, роўны ½ сярэбранай капейкі.

[3] Сёстры міласэрнасці св. Вікенція дэ Поля, вікенціянкі (Szarytki), шэрыя сёстры, каталіцкая жаночая кангрэгацыя, заснаваная ў 1633 г.

водству. Дзяўчынкі вышывалі для касцёлаў прыгожыя арнаты, капы, дываны і г. д. Мая старэйшая сястра атрымала выхаванне ў гэтым кляштары, і таму я добра пазнаёміўся з гэтай установай у 1853 г., якраз, калі там вучылася мая сястра. Старшай паннай там была Жадзейка, панна-ахмістрыня Юзэфа Качаноўская, далей: панна Кацярына Панятоўская і панна Ганна Стэфановіч. Кухняй і гаспадаркай займалася панна Францішка, прозвішча якой я забыўся. Панна Жадзейка памерла ў 1853 г., і яе месца заняла панна Качаноўская. Немаладая панна Францішка таксама хутка памерла, і засталіся толькі 2 манашачкі. У 1866 г. іх перавялі ў Вільню. Гадоў 20 таму ў Вільні я зайшоў ў кляштар і сустрэў там раней знаёмую мне манашку Ганну Стэфановіч.

У Шчучыне заўсёды былі добрая дактары. Адзін з іх, Жахоўскі, хутка вылечыў мяне ад болю ў горле, ад якога, з перапынкамі, я пакутаваў амаль што 22 гады. Другі доктар, Іваноўскі, быў добрым урачом і чалавекам, нават ад багатых браў няшмат грошай, а ад бедных наогул не прымаў платы. І калі памёр, пакінуў сваёй жонцы 400 рублёў.

Шчучынская парафія не вызначалася пабожнасцю і, акрамя гэтага, у Шчучыне меўся дрэнны звычай — рынкавы дзень тут быў прызначаны на нядзелю. У выніку гандляры і шынкары жылі, як каралі, а ў касцёле заўсёды было некалькі дзесяткаў ці яшчэ меней людзей. Здаецца, зараз ужо адмянілі гэты дрэнны звычай і рынак, калі не памыляюся, перанеслі на аўторак[1]. Я ўжо 25 гадоў як выехаў з тых мясцін і не ведаю, што там зараз робіцца.

Царквы ў Шчучыне ніколі не было, бо праваслаўных, можа мелася некалькі чалавек. Хутка пасля паўстання каля касцёла пабудавалі і царкву.

З Шчучынскай мяжуе Васілішская парафія. У ёй здаўна жыў вельмі пабожны народ. У парафіі мелася 2 касцёлы: адзін, парафіяльны па-дамініканскі ў мястэчку, другі, філіяльны, за 2 вярсты ад мястэчка.

У 1866 г. парафіяльны касцёл перавялі пад царкву. Сведкі гэтага распавядалі, што калі пачалі выносіць з касцёла найсвяцейшыя сакраманты і ўсё начынне, стаяў страшны плач, енк і лямант. Калі быў скасаваны касцёл у Дубічах[2], званы з яго перавезлі ў васілішскі касцёл. Толькі гадоў з 8 таму, Васілішскія парафіяне дачакаліся прыгожага мураванага касцёла (у Старых

[1] Рынак у Шчучыне ўжо з паловы XVIII ст. збіраўся па нядзелях, У 1895 г. нядзельныя кірмашы перанесены на чацвер. Абарот кожнага такога рынкавага дня ў 1868 г. не перавышаў 800 рублёў.– Гл: Шымялевіч Міхал. Збор твораў / укл. Л. Лаўрэш. Гродна, 2019. С. 78.

[2] Мірон Браніслаў Нарбут пісаў: *«У Радунскай парафіі быў філіяльны касцёл у Дубічах, пабудаваны ў лесе над возерам, дзе знаходзілася фігура Пана Езуса, слынная сваімі ласкамі. Сюды з розных, нават далёкіх краёў збіраліся людзі для атрымання адпушчэння граху. Цяпер на загад расійскага ўрада касцёл знесены, а фігура Збавіцеля перанесена да касцёла парафіяльнага ў*

Васілішках — *Л. Л.*)[3]. Праўда, я сам яго не бачыў, але іншыя расказваюць пра яго з захапленнем.

Ліда

Ліда, мая любімая Ліда! Тут я правёў тры гады за навукай (з 1855 па 1858 г.). Тут мне з дзяцінства ўсё знаёмае, усе дрэвы і кожны камень у бруку!

Пасля вялікага пажару 1892 г. Ліда непазнавальна змянілася. Раней гэты быў невялікі павятовы горад, які зараз моцна вырас і стаў непадобным сам на сябе. Ад ранейшай Ліды застаўся замак закладзены вялікім князем ВКЛ Гедымінам. Калі я ўпершыню ўбачыў замак, сцены яго былі значна вышэйшымі, але святатацкая рука моцна разабрала іх, а сёння губернатар загадаў абляпаць цэментам і такім чынам падтрымаць сцены[4].

Я памятаю, што за замкам было чыстае поле, але ўжо даўно тут вырасла вялікая частка горада, якая мае назву «Ферма». У маі тут прыгожа, як у раі! Усе дамы ў зелені.

Таксама за чыгункай ўтварылася вялікая вуліца[5]. Наш прыгожы горад дачакаўся дзвюх чыгунак, якія прайшлі праз яго[6]. Раней было некалькі заезных корчмаў, а сёння тут маецца 8 паважных гатэляў. Дрожак наогул не было, а зараз іх некалькі дзясяткаў. У Лідзе закладзена кааператыўная крама, але з-за непаразумення паміж заснавальнікамі яна хутка знікла.

Некалькі гадоў таму, паненка, сваячка дэкана Шкопа, заснавала каля касцёла кніжную краму, якая нармальна працуе. Наколькі ведаю, у горадзе маецца некалькі неяўрэйскіх крам, найлепшая з іх каля кніжнай крамы. Таксама ёсць крамка на ўскрайку горада, якая сябе там добра адчувае[7].

Раней у горадзе былі 3 касцёлы: фарны, кармелітаў і піяраў. Кармеліцкі зачынілі пасля паўстання 1831 г., піярскі згарэў 1845 г., але яго мураваныя сцены стаялі да 1861 г., калі яго перарабілі ў царкву. Застаўся адзін фарны

Начы». — гл: Нарбут Мірон Браніслаў. Лідскі павет у сярэдзіне XIX ст // АСОБА І ЧАС. Беларускі біяграфічны альманах. Выпуск 6. Мінск, 2015. С. 106–124.

[3] Гл: Панімаш Г. І. Касцёл святых апосталаў Пятра і Паўла ў Старых Васілішках // Рэха мінуўшчыны: Зборнік Студэнцкага навуковага таварыства факультэта гісторыі і сацыялогіі ГрДУ. Вып. 1. Гродна, 2010. С. 158–168.

[4] Маецца на ўвазе кансервацыя замка да Першай сусветнай выйны. Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. Гродна, 2017. С. 32–33.

[5] Гл: Абрамовіч Уладзіслаў. Слабодка — прадмесце Ліды // Лідскі Летапісец. 2014. №1 (65). С. 65–66.

[6] Гл: Лаўрэш Леанід. Лідская чыгунка. Дакументальная аповесць // Маладосць. 2018. №7. С. 120–139.; №9. С. 116–122.

[7] Пра кніжныя крамы таго часу гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. С. 48.

касцёл. Муры кармеліцкага касцёла доўга стаялі але 3 гады таму былі разбураны[1].

Лідская парафія вельмі вялікая. Некалькі гадоў таму арганіст казаў мне, што яна мае 16 000 вернікаў.

Могілкі знаходзяцца за вярсту ад касцёла. Тут ёсць некалькі прыгожых помнікаў, але на могілках адбылася гісторыя, якая мне вельмі не падабаецца.

Некалькі дзесяткаў гадоў таму, павятовым доктарам у Лідзе быў Садоўскі. Невядома ад чаго адначасова ў яго памерлі двое дзяцей. Яго жонка не змагла гэтага перажыць і з роспачы атруцілася. Усіх траіх пахавалі каля самай паўночнай сцяны капліцы[2] і паставілі не надта вялікі помнік, на якім выгравіравалі прыгожы вершык, якога я, на жаль, не памятаю.

10 гадоў таму я не знайшоў помніка Садоўскай на сваім месцы і моцна здзівіўся, бо на яго месцы стаяў помнік па доктару Гузе. Капаючы гэтую магілу, парэшткі Садоўскай і яе дзяцей былі выкаваны, а помнік аднесены на якія 10 метраў ад капліцы! Зямля пад магілы Садоўскіх калісьці была купленая, але нават пасля гэтага іх парэшткі выкапалі і перанеслі ў іншае месца.

Я лічу, што адміністрацыя касцёла зрабіла ўсё гэта вельмі не па-людску, дэканам у той час быў вядомы… кс Сянкевіч (на месцы характарыстыкі Сянкевіча стаіць трохкроп'е — *Л. Л.*).

Каляснiцкая парафія

Зараз я даўно ўжо стала жыву ў гэтай парафіі. Пасля 1831 г. драўляны касцёл адсюль быў перанесены ў Радунь, а парафію падзялілі на 3 ці 4 часткі і далучылі да іншых парафій. Аднак праз нейкі час, стараннем вялікай колькасці асоб, быў закладзены новы касцёл, а парафія адноўлена ў старых межах. Пробашчам сюды перавялі з Гародні вельмі руплівага і працавітага каплана кс. Рудзіса. Была пабудавана драўляная капліца, у якой і сёння адпраўляюцца набажэнствы, і быў закладзены вялікі мураваны касцёл. Закладны кутны камень гэтага касцёла быў пакладзены біскупам Ропам. Наш новы касцёл ужо накрыты, але да заканчэння працы яшчэ далёка, і дай Божа, каб за 5 гадоў дабудавалі[3].

Каляснiцкім ксяндзам раней належаў прыгожы фальварак Калеснiкі. Пасля канфіскацыі ён пераходзіў з рук у рукі, покуль не дастаўся Цітову,

[1] У 1908 г. касцёл кармелітаў быў разабраны, хоць касцельныя муры ўсё яшчэ стаялі да ўзроўню даху. Цэгла выкарыстоўвалася для будаўніцтва кашараў Паўночнага вайсковага гарадка. У тым жа 1908 г. кляштар занялі вайскоўцы. Пад час нямецкай акупацыі ў будынку былога кляштара месціўся жаўнерскі клуб, а з 1927 г. тут стала размясцілася староства Лідскага павета.

[2] Жонка Максімілія Садоўская з Даўгялаў (узрост — 27 гадоў), дзеці Людвіка і Ян. Памерлі 13 лістапада 1845 г.

[3] У ліпені 1911 г. паведамлялася, што будаўніцтва касцёла ў Калесніках з–за недахопу грошай ідзе цяжка, гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы.

дзеці якога і сёння валодаюць гэтай маёмасцю. Ранейшы касцёл стаяў у самым фальварку, акружаны прыгожым садам і могілкамі. Святатацкая рука знішчыла ўсе помнікі, пакінуўшы толькі адзін — нейкага Жаброўскага. Нядаўна ў фальварку мелася манаполька (крама гарэлкі — *Л. Л.*), але яна была зачынена, а ў яе памяшканні заснавана школа[4].

Знакаміты прамоўца кс. Рудзіс ў мінулым годзе цяжка захварэў, працяглы час лячыўся за мяжой, пасля чаго ўсё ж вярнуўся ў парафію, але дактары забаранілі яму працаваць. Сёння парафіяй займаецца кс. Казімір, якога нядаўна тут сустракалі вернікі.

Парафія складаецца з палякаў, летувісаў і беларусаў, і кс. Рудзіс гэтак паставіў справу, што ў нашым касцёле не было ніякіх крыўдаў і спрэчак.

Са слоў нашага арганіста, у Калесніцкай парафіі налічваецца каля 5 000 вернікаў, з якіх 500 выехала ў Амерыку[5].

Некалькі гадоў таму ў Калесніках створана сельскагаспадарчае кола і каапératыўная крама. Справа на пачатку ішла добра, покуль, усё не сапсаваў няшчасны алкаголь. Але зараз з іншымі людзьмі справа пайшла добра. Старшынём нашага сельскагаспадарчага кола ёсць Сядлікоўскі[6]. Акрамя гэтай, паўсталі тры іншыя хрысціянскія крамы, і зараз у нас 4 хрысціянскія на 2 яўрэйскія крамы.

1900–1939 гг. С. 35.

[4] «У кастрычніку 1906 г. Расійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляла, што *«пад уплывам ксяндзоў у Эйшышскай і іншых суседніх парафіях Лідскага павета арганізаваныя таварыства цвярозасці, сябры таварыстваў устрымліваюцца ад ужывання алкаголю. Абароты манапольных крамаў зменшыліся да мінімуму. У Калесніках такая крама наогул зачынена»*. — Цыт па: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. С. 17.

[5] Прэса пісала, што эміграцыя настолькі пашырылася, што на радзіме ўжо месцамі паставалі палі. З суседняй з Калеснікамі вёскі Бутрыманцы, народны карэспандэнт пісаў у газету «Наша Ніва»: *«Сярод эканамічных праяў у жыцці тутэйшых вёсак ёсць адна вельмі цікавая і важная — гэта эміграцыя ў Амерыку. Пачалася яна тут ужо гадоў дзесяць, або і больш, і цяпер ужо ўзрасла да вялікай меры. Ёсць тут у ваколіцы такія вёскі, у каторых прыходзіцца на кожную хату па „амерыканцу“, а часам і больш. Едуць найбольш людзі маладыя, дужыя, назбіраўшыя на роднай зямліцы запасы сілы, каб там, за морам, прамяняць яе на амерыкансія долары. Едуць нават дзяўчаты і падросткі. Я пільна ўслухаўся да гутарак аб гэтай Амерыцы аб „амерыканцах“ і ня чуў ні разу скаргі на няўдачу, нараканні на тое, што ездзілі, ці выпраўлялі каго ў Амерыку. Праўда, два чалавекі вярнуліся, страціўшы грошы і не даехаўшы — бо іх ашукалі агенты. А шмат хто, прыехаўшы прывозіў з сабой грошы, часам, вялікія грошы. Гэтыя амерыканскія грошы не пайшлі прахам, а далі змогу шмат каму з сялян паадкупляць ад паноў зямлі. І дзеля гэтага, тутака гаспадары па вёсках жывуць ня бедна, хоць зямля і не надта выгодная — бо камяністая, але ж маюць яе шмат: па паўвалокі і больш. Ці не дзеля гэтага тут і народ святлейшы, як па іншых кутох Беларусі»* — Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. С. 63.

[6] Газета «Кур'ер Літоўскі» ў 1908 г. пісала пра: *«Калеснікі. Падобна, пачынаецца нейкі рух па падвышэнні асветы і дабрабыту народу. Рух гэты пачаўся з заснавання ашчадна–пазыкавых кас, сельскагаспадарчых таварыстваў, кааператыўных крам і г.д. …Па вясне сп. Браніслаў Ёч, Пётр Сядлікоўскі і ксёндз Рудзіс арганізавалі сельскагаспадарчае таварыства… Сябры тава-*

Кіраўнік нашай кааператыўнай крамы В. Б., сын селяніна ў вёскі Крывілі, з'яўляецца сапраўдным аматарам літаратуры і навукі і мае не малую бібліятэку, недзе з 200 тамоў. Я час ад часу да яго прыязджаю ці прыходжу ўпешкі і маю прыемнасць размаўляць з ім пра навукі і літаратуру, чаго пазбаўлены ў сваім доме. Ён здаўна выпісвае 1 ці 2 газеты, шмат чытае і ведае больш, чым любы іншы месціч. Сяляне — вернікі нашай парафіі, выпісваюць недзе з 10 газет, з якіх, можа, 2, а можа, болей — летувіскія.

Не магу не расказаць пра адну забаўную спрэчку.

У вёсцы Н. ёсць вельмі разважлівая і сімпатычная дзяўчынка Н. якая заўсёды жадае усё гвалтам перарабіць на летувіскую мову, а я прыкладаю ўсе свае высілкі, каб утрымаць яе ў сваёй нацыянальнасці. Ёй даюць чытаць кніжкі, выдадзеныя хоць і па-польску, але ў летувіскім духу, а я, каб усыпіць яе пільнасць, апошнім разам даў ёй пачытаць «Ядвігу — каралеву польскую». Але іншыя асобы маюць на дзяўчыну ўплыў большы за мой. Адзін з іх, дзіўна зацяты летувізмам, вельмі дрэнна абазваў каралеву Ядвігу, што мяне моцна пакрыўдзіла. Я так разумею і чытаў пра гэта, што шаноўныя летувісы не жадаюць прызнаць таго, што польская каралева Ядвіга вырвала іх з паганскай цемры і прывяла да сапраўднай веры.

Другая частка ўспамінаў. Мае навукі

1.

Чытаць па складах мяне навучыла маці. Да навукі чытання я вялікіх здольнасцей не выказваў, і таму вучыць мяне было складана. Пісьму і арыфметыцы навучыў бацька. Правай рукой мне заўсёды было цяжка рабіць дакладныя рухі, таму каліграфія была вартая жалю6: давалася цяжка і псавала настрой так, што адчуваў я сябе нешчаслівым. Але да арыфметыкі ў мяне праяўляліся здольнасці. Любіў яе надзвычайна: цікава мне было рабіць разлікі. Дык вось, з трох гадоў маімі настаўнікамі былі маці і бацька. Калі мой брат скончыў лідскую пяцікласную павятовую школу, ён прыехаў дамоў і некалькі месяцаў рыхтаваў мяне да паступлення ў першы клас.

Навучыцца чытаць па-руску было нялёгкай задачай, да таго ж добрых падручнікаў я не меў. Не разумеў, што чытаю, і таму часта плакаў, бо быў надзвычай чулым дзіцём.

Граматыку, матэматыку, геаграфію і іншыя навукі я засвойваў хутка. Затое неабходнасць вучыць нешта на памяць была для мяне бядой. Мой брат,

рыства чытаюць сялянам лекцыі па аграноміі... Колькасць таварыства дасягае 40 чалавек». У 1911 г. у мястэчку Калеснікі ўжо стала працавала сельскагаспадарчае таварыства і кааператыўная крама. — Гл: Лаўрэш Л. Л. Шэпт пажоўклых старонак. Лідчына ў люстэрку прэсы. 1900–1939 гг. С. 18.

на шэсць гадоў за мяне старэйшы, у школе меў калегу Б. К., які потым стаў ксяндзом і дэканам у Лідзе. Будучы ксёндз меў уласцівасць: ён адразу запамінаў адзін раз прачытаны тэкст. А вось да матэматыкі ў яго здольнасцей не было.

Да ўзросту поўных дзесяці гадоў вучыцца мне было нецікава, але на адзінаццатым годзе невядома адкуль з'явілася вялікая ахвота да навук.

Калі мой брат Адольф на працягу некалькіх месяцаў жыў дома (у Васілішскай парафіі, было гэта ў 1853 г.), сусед, с. п.[1] Ів., запрасіў яго гувернёрам да свайго сына. Як слыннаму ў акрузе настаўніку, плаціў яму вельмі добра — пяцьдзясят рублёў у год. Усе дзівіліся, бо звычайна заробак гувернёра складаў сорак рублёў у год. Раней, калі мой брат вучыўся ў школе і займаўся рэпетытарствам, дык браў па шэсць рублёў з вучня за гэты перыяд. А ў мае часы за такую працу бралі ўжо па дзесяць рублёў.

Пасля ад'езду брата да Ів. я папрасіў бацьку, каб ён і мяне аддаў пад руку Адольфа — рыхтавацца да першага класа, бо вельмі я жадаў вучыцца! Не хутка яшчэ бацька выбраўся да с. п. Ів. і толькі амаль што праз паўгода прывёз мне радасную вестку, што я прыняты (рыхтавацца да школы — *Л. Л.*). Адбылося гэта ўвечары, каля агню. Мая радасць не мела межаў. У той жа вечар пры ложку я падзякаваў Пану Богу за яго вялікую ласку. Бацькі гэта бачылі і вельмі радаваліся. Тата завёз мяне да с. п. Ів., і там пад кіраўніцтвам свайго брата я з вялікай ахвотай і з запалам пачаў займацца навукамі. Меў розум лепшы, чым мае таварышы, якіх было там шэсць чалавек. Часам вельмі шкодзіў галаўны боль, ад якога я пакутаваў з дзяцінства.

2.

Нарадзіўся я хворым і слабым, і адразу, як толькі нарадзіўся, пачаў хварэць, і хварэў усё жыццё, і ніколі не быў здаровы і шчаслівы — ніводнага дня, ніводнай гадзіны! Натура вытварала са мной нейкія выбрыкі, і за ўсё жыццё я быў шчаслівы, можа, некалькі хвілін. Маці распавядала, як паклала мяне малога на высокі ложак, а я з яго ўпаў на падлогу і моцна пабіўся.

Шмат працаваў, шмат вучыўся і быў ужо гатовы да першага класа. На вакацыі я прыехаў дадому і ў жніўні павінен ужо быў ехаць вучыцца (у Ліду — *Л. Л.*) — чакаў гэты дзень як неба. Набліжаецца жаданая хвіліна, але раптам бацькі паведамляюць, што сёлета я ў школу не пайду, бо, можа, за год маё здароўе паправіцца[2] (да дзесяці гадоў я быў хворы і палову пражытага на той момант часу правёў у ложку). Як у гэтым вершыку: «Хоць ён бледны і сухотнік, але да стрэльбы ахвотнік!»[3] Гэтак і я на пачатку

[1] Святой памяці.

[2] Тады можна было ісці ў першы клас хоць у дваццаць гадоў. — заўвага аўтара.

жыцця быў бледны і выглядаў як сухотнік, але да навукі быў вялікі ахвотнік!

Вестка пра тое, што я не пайду ў школу, ударыла мяне як маланка. Нічога не адказаў я бацькам, а толькі схаваўся ў кут і заплакаў. А хутка новая бяда — эпідэмія халеры, і таму бацькі не жадаюць аддаваць мяне ў небяспечны горад. Але нарэшце надышоў чаканы дзень. Выбраліся да Ліды, прыехалі на паштовую станцыю Місявічы[4] і спаткалі там паштальёна, які ў гэтую хвіліну прыехаў з Ліды. «Што чутно ў горадзе?» — пытаецца бацька. Як вядома, часта людзі з камара могуць зрабіць мядзведзя, паштальён быў з гэтакіх і таму адказаў майму бацьку: «Дрэнныя навіны, штодзень у горадзе ад халеры памірае па дваццаць пяць чалавек»[5]. Бацька спужаўся і ўжо хацеў паварочваць назад, але я заенчыў — і ён вырашыў так: няхай, маўляў, пра тое, прыняць мяне ці не прыняць, думае школьны лекар. Едзем!

У Лідзе з кватэры мы вышлі на вуліцу. Спаткалі шаноўнага скарбніка Крахельскага, начальніка майго брата, які тады служыў у скарбовай касе.

— Што ты тут робіш?

— Прывёз у школу хлапчука.

— А не баішся Пана Бога? Нашто прывёз гэтую худобу? Як пачне вучыцца — адразу памрэ[6].

Я адразу адчуў да Крахельскага вялікую непрыязнасць, і гэтае пачуцце доўга ў мяне не праходзіла. Было гэта ў 1855 годзе.

Мой бацька зноў пачаў хвалявацца. Да нас на кватэру зайшоў мой брат Адольф. Я адвёў яго ўбок і папрасіў, каб на міласць Бога мяне пакінулі ў Лідзе, бо я надта хачу вучыцца. Адольф угаварыў бацьку, і той вырашыў зняць для мяне кватэру ў сп. Цемахоўскай, дзе кватаравалі ён сам і прафесар Урбановіч. За стол і памяшканне гаспадыня згадзілася браць сорак пяць рублёў штогод. Багатыя людзі за кватэры для сваіх дзяцей-вучняў плацілі па пяцьдзясят рублёў. У першы год майго побыту ў школе плата

[3] У тэксце — па-беларуску.

[4] Паштовая станцыя паміж Лідай і Ішчолнай.

[5] Падчас той эпідэміі халеры ў Лідзе штодня памірала 3—4 чалавекі.

[6] Для параўнання, Ян Булгак пісаў пра той час: «*… сярод тагачаснай шляхты панавала даўняе, яшчэ даволі распаўсюджанае меркаванне, што навука дрэнна адбіваецца на здароўі. Прадузятасць паходзіла з таго, што моладзь мужчынскага полу, прызвычаеная да гарцавання на кані, да палявання і ўвогуле да руху на свежым паветры, без радасці садзілася за кніжкі, і ў школьным пакоі ёй было цесна і душна. Часта пасля некалькіх гадоў, праведзеных у гімназіі без аніякіх поспехаў, бацькі забіралі дадому вусатых сыноў, у якіх ужо не граматыка была ў галаве, а жаніцьба. Так было з братам маёй маці — дзядзькам Тадэвушам Хаціскім, які вярнуўся… з другога класа гімназіі ў Навагрудку, бо бацькі баяліся дрэнных наступстваў школы для яго квітнеючага здароўя. А хлопец быў ужо як дуб, проста са школы пачаў ездзіць у сваты і праз пару гадоў ажаніўся. Большасць тагачаснай моладзі не скончыла гімназіі: чатырохкласны школьны стаж ужо лічыўся сур'ёзным вынікам, а універсітэцкі дыплом папросту быў рэдкасцю*». Гл: Булгак Я. Край дзіцячых гадоў / Я. Булгак. — Мінск, 2004. — С. 75.

за навучанне каштавала два рублі пяцьдзясят капеек, а на другі год падаражала да трох рублёў[1].

Дакупілі некалькі кніжак, адзежу брата перарабілі для мяне, і ўсё гэта разам каштавала для бацькі пяцьдзясят пяць рублёў (верагодна, з платай за кватэру — *Л. Л.*).

Лекцыі павінны былі пачынацца праз некалькі дзён, і бацька прапанаваў на гэты час з'ездзіць дахаты, але я, каб зберагчы сілы, адмовіўся. Знайшоў добрага таварыша — вучня чацвёртага класа Болеся Цемахоўскага, сына гаспадыні. З ім я хадзіў па гораду, і ён растлумачыў і расказаў мне шмат цікавага.

Ён вучыўся ў чацвёртым класе, а я толькі што паступіў у першы, і таму паміж намі была розніца, як паміж генералам і простым салдатам, але мы мелі аднолькавыя погляды і зацікаўленасці і таму хутка пасябравалі.

З цікавасцю я разглядаў школьны будынак і думаў: «Калісьці я тут буду вучыцца, якое гэта будзе шчасце».

3.

Нарэшце надыходзіць гэтая мілая гадзіна, гэтая дарагая і жаданая хвіліна — пачатак заняткаў. Уваходжу я ў школу! Як тут усё прыгожа, урачыста, як усё цешыць вышэйшым сэнсам! Адразу палюбіў я ўсіх прафесараў, пачаў паважаць іх як вышэйшых істот. Прэфекта (дырэктара) лічыў нейкім серафімам[2]. Лекцыі слухаў з надзвычайным запалам і замілаваннем. Дзіўна закахаўся ва ўсе навукі без выключэння: ад рэлігіі да малявання і каліграфіі. Уважліва слухаў лекцыі прафесараў, глытаючы кожнае слова. Прапусціць хоць адно — было б для мяне вялікай стратай. Таму на ўроках паводзіў сябе ўзорна — па-анёльску. Жадаў, каб да мяне ставіліся як да стараннага, працавітага, добрага вучня. Калі сустракаў прафесараў на вуліцы, саступаў ім дарогу. Здымаў перад імі шапку не толькі таму, што існавала такое правіла і гэта быў абавязак вучня, але і з-за сапраўднай павагі да іх. І мае высілкі пачатку не прайшлі марна. Я заслужыў славу ўзорнага вучня.

У нашым класе стары прафесар Пігулеўскі выкладаў тры прадметы: рускую мову, арыфметыку і геаграфію. На школьным сходзе, у прысутнасці дырэктара, ён сказаў: «Шалевич будет украшением нашего училища»[3] — і хутка мне пасыпаліся чацвёркі і пяцёркі[4].

Пад адным дахам я кватараваў з прафесарам Урбановічам[5] (вучыў нас чыстапісанню, чарчэнню і маляванню). Гэта быў вельмі светлы чалавек, па-

[1] Аўтар не піша, за год ці за месяц.

[2] У сэнсе «анёлам». Серафімы — вышэйшы чын анёлаў, асабліва набліжаных да Бога.

[3] Тут і далей, аўтарскі тэкст на рускай мове даецца ў сучаснай граматыцы.

[4] Адзнакі па пяцібальнай шкале.

[5] Настаўнік «чистописания, черчения и рисования, коллежский секретарь Иосиф Васильевич Урбанович». Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1858 г. — Вильно, 1858. —

добна, выхаванец былога Віленскага ўніверсітэта[6]. Усё жыццё пражыў нежанаты. Паходзіў з ваколіцы каля Нёмана, са шляхты Лідскага павета. Яшчэ ён быў музыкантам, добра граў на скрыпцы і кларнеце. Як мог навучаў мяне музыцы. Быў вялікім аматарам навукі, збіраў да сябе хлопцаў і вучыў іх прыватна, часцей без усялякай аплаты, каб толькі пашыраць кола аматараў навукі і мастацтва. Акрамя вышэй згаданых прадметаў, ён у першым класе выкладаў геаметрыю, у другім — землямерную справу, а ў трэцім — архітэктуру. Трыццаць гадоў займаў пасаду прафесара ў Лідзе і лічыўся чалавекам выключных ведаў. Вынаходзіў новыя метады навучання і тлумачыў кожны прадмет зразумела і даступна. Вельмі цікава і меладычна кампанаваў музыкальныя фрагменты опер, як, напрыклад, кантрданс «Спеў гандальера», які я граю і цяпер і захоўваю яго нотны запіс. Вельмі цікавіўся ўсім новым, што ў той час з'яўлялася: тэлеграфам, паравымі машынамі і г. д. Не ведаў ён, што пасля яго смерці з'явяцца тэлефоны, грамафоны, друкаркі.

Гэты шляхетны чалавек і дасведчаны прафесар палюбіў мяне, як сваё дзіця, а я да яго ставіўся як да лепшага бацькі. Казаў мне, каб я ў вольны час прыходзіў да яго. Правіў мае працы па фізіцы, касмаграфіі і натуральнай, рускай і агульнай гісторыі і г. д. Расказваў пра электрычнасць, маланку з бліскавіцаю, дождж, град, снег і шмат пра што яшчэ. Я ўсё гэта слухаў з вялікай увагай і захапленнем, бо ў першым класе пра гэтакія рэчы не расказвалі, і мае калегі пра гэта ніякага ўяўлення не мелі. Называў мяне «Яўсташак-душачка». Нарэшце прапанаваў перасяліцца ў яго пакой. Тады жыццё наша закіпела. Мы цэлымі вечарамі гралі, і бывала, што я засынаў са скрыпкаю ў руках. Гулялі мы з ім па гораду не як прафесар і вучань, а як калегі. Душы нашы былі адным цэлым. Прыватна вучыў мяне маляваць, і за год у мяне сабраўся вялікі стос папер, якія прыдаліся на экзаменах пры пераходзе з першага ў другі клас. Падчас агульнага збору ўсіх вучняў у адной зале дырэктар высока ацаніў мае малюнкі і ўсім прысутным паставіў мяне ў прыклад. На пасведчанні за першы клас дырэктар напісаў: «Благодарю Шалевича за его успехи во всём. Благодарю ещё более за усердие к рисованию, выказанное им сверх прямых по классу обязанностей».

Калі я пачаў працаваць разумова, адчуў, як хутка развіваюцца мае здольнасці, і таму працаваў усё больш і больш. Я быў узорным вучнем і пры пераходзе з класа ў клас кожны раз узнагароджваўся пахвальнымі кніжкамі.

Калі здаваў экзамены з першага ў другі клас, ішло ўсе так добра, што я прамаўляў два-тры словы — і «пяцёрка» была гатовая. Успамінаю іспыт па геаграфіі. Здаваў яго самому дырэктару. Ён любіў гэтую. навуку, бо ра-

С. 42.

[6] Віленскі ўніверсітэт быў закрыты пасля паўстання 1831 года.

ней быў прафесарам геаграфіі і гісторыі. Я таксама быў яго ўлюбёнчыкам, ён не раз гладзіў мяне па галаве. Я выцягнуў білет, але дырэктар пажадаў задаць мне свае пытанні. Кажа мне па-руску:

— Калі б мы пачалі капаць глыбокую яму, куды б мы нарэшце патрапілі?

— На другі бок зямнога шара.

— А праз які вядомы пункт Зямлі мы б прайшлі?

— Праз цэнтр Зямлі, — адказваю.

— Да цэнтра Зямлі мы б ішлі ўверх ці ўніз?

— Уніз.

Потым мой дарагі дырэктар пажадаў мяне трохі падлавіць, ці насамрэч я ўсё разумею, і, гледзячы ў кніжку, гартае яе старонкі і як бы між іншым кажа сам сабе:

— А пасля цэнтра зямлі мы таксама будзем ісці ўніз...

Я раптоўна здагадваюся і на ўвесь клас крычу:

— Не! Тады мы будзем ісці ўверх!

— Отлично, отлично! — таксама голасна гаворыць дырэктар і загадвае мне вяртацца на месца.

Прафесары усміхаліся, а ўвесь клас пільна за мной назіраў.

Калі вяртаўся на лаву, радасці маёй не было межаў, і каб мне ў той момант хто прапанаваў атрымаць у падарунак палову Еўропы, для мяне гэта нічога б не значыла.

Хацеў тады прасіць свайго шаноўнага дырэктара, каб ён дазволіў мне яшчэ расказаць нейкіх цікавостак на гэтую тэму. Бо я мог растлумачыць яму, чаму пасля цэнтра напрамак руху змяняецца. Рукамі над галавой грэблі б пясок, і ён бы падаў на нас, а потым імкнуўся б да цэнтра зямлі. І мы самі павінны былі б упасці на цэнтр зямлі. Па геаграфіі я атрымаў «5», але мне хацелася падскочыць і расказаць, што ўсё гэта мне раней растлумачыў добры і шляхетны прафесар Урбановіч.

Гэткія «падскокванні» бывалі ў мяне не раз. Калі прафесар Пігулеўскі чытаў байкі Крылова, мне так спадабаліся досціпы аўтара, што я падскочыў і выказаў сваё задавальненне. Прафесар за гэта не пакараў мяне, бо зразумеў, чаму я так зрабіў, і быў нават задаволены маімі паводзінамі. На занятках па арыфметыцы я таксама рабіў падскокі — калі даведваўся пра нешта новае. Матэматыка мне заўсёды падабалася. Я захапляўся незвычайнымі людзьмі, якія яе прыдумалі. Тым больш што, напрыклад, геаметрыя яшчэ за 500 гадоў да нараджэння Пана Езуса стаяла надзвычай высока!

Прафесар Пігулеўскі, вельмі мілы і добры настаўнік, ладна выкладаў свае прадметы, але, як стары чалавек, калі-нікалі рабіў малыя памылкі. Неяк задаў вусна рашыць некалькі дзесяткаў арыфметычных задач. Сярэдні па здольнасцях вучань Ів. хутка, але няправільна адказаў на яго пытанне накшталт: «Чаму роўная гэтая сума?» Прафесар пагадзіўся з памылковым

адказам. Мае амбіцыі былі прыніжаны тым, што гэты сярэдні вучань адказвае хутчэй за мяне. Я павінен быць заўсёды першым і лепшым! І мне здавалася, што гэты вучань памыліўся. Пачалі рашаць наступнае, а потым яшчэ новыя заданні, і не было мне часу падумаць. Вучні развязвалі задачы і адказвалі настаўніку. Тады я ўстаў і сказаў: «Здаецца мне, што мы тую задачу няправільна развязалі». Прафесар загадаў ісці да дошкі. Рашэнне выйшла па-мойму. Прафесар ухапіў мяне за галаву, пацалаваў, потым перад усім класам пахваліў і прызнаў памылку. Вялікая радасць тады ахапіла мяне.

У другім класе арыфметыка стала яшчэ больш складанай, але я ўсё роўна яе любіў. Вось толькі напаткала мяне вялікая да сябе непрыязнасць.

Прафесар Віткоўскі добра выкладаў гэты прадмет, але меў недахоп — нічога ў яго нельга было спытаць. Усе прафесары мяне любілі за тое, што я цікавіўся ў іх кожнай рэччу і пра ўсё выпытваў, а гэты не дазваляў задаваць пытанні — такі меў прынцып. А я не мог яму дараваць, што ў такой важнай навуцы, як матэматыка, нічога нельга ўдакладніць ці спытаць.

Хоць я моцна любіў бацькоў і сястру, у школу я вяртаўся з вялікай ахвотай. Перад Божым Нараджэннем без памяці ляцеў са школы на кватэру, хутка сабраў свае скарбы — кніжкі — і быў гатовы ехаць дахаты. На шчасце, бацька сам прыехаў за мной. Дахаты ехаў як у рай. Назаўтра доўга парадкаваў свае кніжкі. Бацькі казалі, каб я адпачываў, бо маю слабае здароўе, але я іх не слухаў. Пасля свят заўсёды вяртаўся ў Ліду на два дні раней тэрміну, каб, барані Божа, ні хвіліны не страціць. У школу ішоў вясёлы і рваўся вучыцца! Тое самае было на Вялікдзень. Усе экзамены здаваў на «выдатна». Па ўсіх прадметах меў «5» і толькі па каліграфіі «4».

Апрача свайго звычайна слабага здароўя, у школе меў я цяжкую хваробу. З-пад левага рабра ў мяне пачаў вылазіць вялікі гуз і дайшоў да паловы жывата. Мяне лячыў ад гэтага знакаміты ў той час у Лідзе доктар Понсэ (Ponset). Загадваў ставіць на жывот п'яўкі, а калі ранкі ад п'явак трохі загойвалі, ставіў банкі. Здавалася што на пузе ў мяне з'явілася адна вялікая банка. Акрамя гэтага, даваў глытаць нейкія лекі. І хвароба прайшла… але я прапусціў пяць лекцый.

Хворы чалавек натуральна баіцца холаду. А паколькі я ўсё жыццё быў хворым, дык з маленства да старасці яго баяўся. У лідскай школе печы не надта палілі, імкнуліся, каб было нам не надта горача, і таму ўсе зімовыя месяцы я курчыўся ад холаду і дрыжаў. Так было на працягу ўсёй маёй вучобы, толькі ў Наваградку стала лепш.

Калі прыехаў на вакацыі дахаты, дык адразу расклаў свае кніжкі і пачаў рыхтавацца да другога класа — вучыў рэлігію, геаграфію і іншыя навукі. Дарагі прафесар Урбановіч задаў мне на вакацыі вывучыць пяцьсот французскіх слоў, якія я потым яму пераказваў. Акрамя гэтага, я прачытаў духоўную кнігу — «Голас набожнай душы». У дзяцінстве і маладосці я вельмі

любіў чытаць духоўныя кнігі і з адзінаццаці да дваццаці двух — дваццаці трох гадоў правёў над імі не менш часу, чым яўрэй над Торай.

У другім класе меў тую самую ці нават большую цягу да навукі, хаця галава балела болей, чым да гэтага. Я на той боль не звяртаў увагі. У першай чвэрці пасыпаліся «чацвёркі» і «пяцёркі», але потым я меў толькі «пяцёркі».

У другім класе адбылася такая прыгода. Неяк абвясцілі, што з пэўнай даты нашу школу будзе інспектаваць куратар Віленскай навучальнай акругі Урангель[1]. Нас навучылі, як яму адказваць, калі ён запытае, і як яго тытулаваць пры звароце. Наказалі нам, каб вопратка і абутак былі ў найлепшым стане. Я вучыўся дзень і ноч, каб добра адказаць куратару, калі ён да мяне звернецца. Але мой мундзір быў парваны, і я не меў часу занесці яго да краўца. Дзень за днём хадзіў у школу ў такім мундзіры, і калі з візітацыяй прыехала важная асоба, я пайшоў у школу з дзіркамі на мундзіры пад пахай.

Дайшла чарга да нашага класа. Куратар прапанаваў ксяндзу што-небудзь у нас запытаць. Ксёндз запытаў пра Хрыста. Хто адкажа? Усе сядзяць. Ксёндз задае пытанне яшчэ раз. Я ўстаю і адказваю. Потым куратар прыказвае задаць пытанне прафесару матэматыкі. Той выклікае мяне да дошкі. А я пачаў прыкрываць сваю дзірку пад пахай і так спужаўся, што ўсё ўва мне замёрла. Прафесар прадыктаваў мне задачу. Я стаю ля дошкі як пафарбаваны слуп і не маю паняцця пра задачу — думаю толькі: што будзе? Што будзе, калі я гэтай задачы не развяжу? Узношу думкі да Пана Бога: Божа міласэрны, змілуйся, змілуйся нада мною. У той момант я быў самым нешчаслівым чалавекам у свеце. Так нерухома прастаяў я некалькі хвілін — прафесар цярпліва чакаў. Пот з ілба градам ліецца па твары, а я стаю каля дошкі, каб ніхто не бачыў дзірку на маім мундзіры. І тут са мной нешта здараецца — як быццам прасвятленне находзіць. Раптоўна я разумею, як развязаць задачу. Збіраюся з думкамі і пішу на дошцы тое, што трэба. Куратар яшчэ пра нешта пытаецца, я адказваю, але твар у мяне ўвесь мокры ад поту. Куратар усміхаецца і кажа: «Совершенно вспотел!», пасля чаго адпускае на месца.

Пасля пераводных экзаменаў з другога ў трэці клас я ўзяў пахвальную кнігу, і дырэктар напісаў мне ў ёй падзяку, але зместу гэтай падзякі не памятаю. Кніжку і пасведчанне доўга хаваў як рэліквію, але пасля пэўнага выпадку яны загінулі.

Школьныя часы і ўсе тыя здарэнні мне добра запомніліся. Карціны таго жыцця і сёння стаяць перад вачамі. Да ўзросту пяцідзесяці гадоў ці яшчэ трохі болей я любіў расказваць пра час вучобы свайму сябру, арганісту

[1] Апякун Віленскай вучэбнай акругі, генерал-лейтэнант, барон Рыгор Пятровіч Урангель. Гл.: Памятная книжка Виленской губернии на 1858 г. — Вильно, 1858. — С. 34.

з Жалудка Вінцэнту Ліхвяровічу, з якім мы сябравалі шмат гадоў. Расказваў і любімаму пляменніку, які цяпер жыве ў Пецярбургу. Ён лекар, капітан гвардыі і прасіў мяне каб я апісаў яму ўсё сваё жыццё, а сталася так, што я Найшаноўнейшай Пані апішу хаця б свае школьныя часы. А можа, потым патроху і ўсё сваё авантурнае жыццё апішу.

Трэці клас для мяне быў таксама шчаслівы. Па алгебры і каліграфіі меў «4», а па ўсіх астатніх навуках — «5». Алгебра мне добра не ішла, таму што прафесару Віткоўскаму нельга было задаць пытанні, а шмат якія тэмы цяжка было зразумець самому.

У трэцім класе, каля Вялікадня, у мяне моцна забалела галава і падняўся ціск. Гэта адбылося таму, што я працаваў двое сутак і пасля нават не змог пайсці на заняткі. Але неяк ачуняў і гэты клас добра закончыў. Зноў атрымаў пахвальную кнігу, і дырэктар напісаў падзяку на пасведчанні.

У трэцім класе мне спадабалася маляваць карты. У лідскай школе амаль усе сцены былі завешаны геаграфічнымі і гістарычнымі картамі. Я заўсёды разглядваў іх з вялікай цікавасцю. Каб грунтоўна вывучыць Германскі саюз, хацеў перамаляваць карту гэтай краіны і прасіў нашага дарагога дырэктара дазволіць мне ўзяць яе дахаты. Дырэктар згадзіўся і сказаў, што іншаму ён бы не дазволіў. Я падрыхтаваў вялікі аркуш кардона, якога нельга было купіць у краме, наклеіў на яго белую паперу, паменшыў карту ў чатыры разы і старанна скапіраваў. Калі паказаў сваю карту дырэктару, той мяне вельмі пахваліў. Аднак потым я не мог яе забраць у Наваградак, бо мой брат ўзяў яе на захаванне і паклаў у шафу казначэйства, адкуль яна знікла. Другой картай, якую я вельмі старанна скапіраваў, была карта Віленскай губерні, але гэта было ўжо ў Наваградку. Прафесар геаграфіі Лэрывер прапанаваў, каб я пакінуў гэтую карту ў гімназіі, але я з ім не пагадзіўся: жадаў мець яе ў сябе.

У мой час рэлігію выкладалі па-польску. Дарэчы, на калідорах і ў класах на перапынках па-польску размаўляць дазвалялася, але польская мова не выкладалася. Аднак на запусты 1858 года яе выкладанне дазволілі[1]. Прафесарам польскай мовы стаў нейкі Бякеша. Як сёння, так і тады нашы вучні-палякі не надта імкнуліся вывучаць сваю мову. Таму шаноўны прафесар мусіў да іх звяртацца з прамовамі пра неабходнасць яе вывучэння.

Лідская школа па-руску называлася так: «Лидское уездное пятиклассное для дворян училище». Выкладаліся ў ёй наступныя навукі: рэлігія, мовы

[1] У выніку рэформ Аляксандра II нейкі час цягнулася палітычная «адліга», былі памілаваны паўстанцы 1831 года, і інш. Аднак пасля паўстання 1863 года польская мова была цалкам забаронена ва ўсіх установах не толькі Беларусі, але і этнічнай Польшчы. Цяпер мала хто ведае, што пасля 1863 года выкладанне ў польскіх школах, гімназіях і Варшаўскім універсітэце вялося выключана па-руску. Ва ўсіх установах віселі шыльды з надпісам: «Говорить по-польски запрещено».

(руская, французская, пры мне нейкі час выкладалася польская), матэматыка, гісторыя Расіі і сусветная, маляванне, каліграфія, пачаткі камерніцтва, паняцце пра будаўніцтва (у трэцім класе) і заканазнаўства (у пятым).

Калі я вучыўся, дырэктарам лідскай школы працаваў Аляксандр Аляксеевіч Шахаў. На мясцовы манер яго назвалі прэфектам па-руску — «штатным смотрителем Лидского дворянского училища»[1].

Прафесарамі рэлігіі па чарзе былі тры ксяндзы: Віткоўскі, потым Драцэвіч і, нарэшце, Свірскі. Гэты апошні працаваў самы працяглы час.

Прафесар рускай мовы Гулін нарадзіўся ў Пецярбургу. Пры мне толькі адзін раз коньмі ездзіў у свой родны горад, чыгункі яшчэ не было. Прывёз адтуль здымак на срэбнай блясе — першы фотаздымак, які я бачыў у жыцці.

Прафесар французскай мовы Баўблеўскі добра ведаў свой прадмет і прыгожа яго выкладаў.

Выкладчыкам нямецкай мовы быў немец-католік Ягор Фэглер. Вельмі маральная асоба, сімпатычны і мілы. Быў жанаты на сп. Сумарокавай. Я быў яго любімцам. Неяк ён узяў мяне пад руку, і так мы прайшлі з ім палову горада, да яго кватэры, дзе ён пасадзіў мяне каля сябе і мо паўгадзіны тлумачыў свой прадмет, а потым пазычыў вельмі важны падручнік па нямецкай граматыцы, які немагчыма было купіць. Нямецкую мову выкладаў вельмі добра, і я любіў яго, як роднага бацьку.

Польскай мове нас вучыў Бякеша, працавіты і старанны настаўнік, але, як я ўжо пісаў, нашы вучні не надта жадалі карыстацца яго навукай.

Прафесар матэматыкі Віткоўскі добра выкладаў, але праблемай было тое, што яму нельга было задаць пытанне. Гэты настаўнік сапсаваў мне адзнаку па алгебры. На экзаменах ён нецярпліва бліскаў вачыма. Быў занадта строгі, недаступны і моцна лаяўся на вучняў.

Прафесарам геаграфіі ў старэйшых класах быў вельмі самавіты і прыемны чалавек — Мінейка. Калі ён з'ехаў, на яго месца прыслалі з Масквы нейкага Бутоўскага.

Гэты быў вельмі вучоны, казалі, што раней выкладаў у Маскоўскім універсітэце, але за нейкую палітычную справу яго выслалі ў Ліду. Быў добрым і нават вялікім прамоўцам. Гэтакіх прамоўцаў я ў сваім жыцці бачыў толькі два-тры разы. Нават прафесар Урбановіч такім не быў. Прамаўляў — як Богам натхнёны. Калі ён першы раз прыйшоў да нас у трэцім класе чытаць лекцыю па геаграфіі і распавёў пра Расію, мы адразу адчулі яго прамоўніцкі дар і глыбокія веды. Здавалася, што ў грудзях яго гарыць агонь, і хацелася стаць такім, як ён.

[1] Наглядчыкам павятовай дваранскай вучэльні ў Лідзе ў 1860 годзе быў надворны дарадца Аляксандр Аляксеевіч Шахаў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1860 г. — Вильно, 1860. — С. 39.

Бутоўскі быў у вялікай роспачы з-за ссылкі ў Ліду і такога свайго нізкага сацыяльнага становішча. На лекцыях мог сваволіць, бегаць па класе, падскокваць, рабіць страшныя міны, але заўсёды меў прыстойны выгляд, і ўсё гэта было яму да твару. Пры гэтым вучні глядзелі на яго са здзіўленнем і толькі трымаліся за лавы, а я звычайна знаходзіўся ў нервовым стане і да таго ж меў схільнасць да гумару, таму часам з-за смеху падаў з лавы на зямлю! Іншы раз у класе стаяў такі рогат, што ў суседнім чацвёртым класе немагчыма было праводзіць заняткі. Калі нехта не ведаў урока і адказваў няправільна, Бутоўскі звычайна казаў: «Попал пальцем в чернильницу!» Потым хапаў за руку і ўціскваў палец ў чарніліцу.

Няшчасным мучанікам у яго быў вучань Уладак Крахельскі, сын казначэя. Ён быў запісаны ў журнале першым, і таму яму заўсёды прыходзілася адказваць урокі, тады як астатнія адказвалі не гэтак часта. Крахельскі не быў добрым вучнем, яго палец не раз бываў чарніліцы. Бутоўскі круціў яго палец ва ўсе бакі і часам хадзіў з хлопцам па класе пад ручку.

Неяк на лекцыі Крахельскі сказаў:

— В Орлеане памятник орлеанской дрове[1].

Настаўнік тут жа яго запытаў:

— Что такое дрова?

— Дровица, — адказаў Крахельскі.

— А что такое дровица?

— Паненка.

— А што такое паненка?

Вучань замаўчаў…

А настаўнік, разышоўшыся, адказаў за вучня: «Это высшее существо! Это сверхнепонятное существо! Это неестественное существо! Это благородное существо!..»

Нават дырэктар не смеў выступаць супраць Бутоўскага.

Урбановіч, як я ўжо пра яго пісаў, выкладаў каліграфію, маляванне, геаметрыю ў першым класе, каморніцтва — у другім, у трэцім — пачаткі будаўніцтва. Ён быў здольны педагог. У кожнай навуцы выдумляў свае метады і тлумачыў вельмі зразумела і даступна для вучняў. Гэта быў пасапраўднаму важны чалавек, вялікі сябар навукі, прагрэсу і вынаходніцтваў. Я пазнаёміўся з ім, калі настаўнік меў пяцьдзясят шэсць гадоў. Бачыў яго дзённік — у маладосці Урбановіч пісаў гусіным пяром: ніводзін найлепшы почырк не можа быць прыгажэйшым. Стальных пёраў ён не цярпеў і не мог імі пісаць. Калі вучань прыносіў на заняткі стальное пяро, ён заганяў пяро ў лаўку: зломіш — і няма стальнога пяра.

На сваёй кватэры збіраў вучняў і праводзіў бясплатныя прыватныя заняткі, а калі хто плаціў, таму казаў дзякуй. Прыватна вучыў усіх, хто сам гэ-

[1] Крахельскі пераблытаў словы «дева» і «дрова».

тага жадаў. Мяне ён вельмі любіў і зняў мой партрэт. Гэта было ў 1856 годзе, пра фатаграфію ў Лідзе яшчэ мала хто ведаў. Ён мне не раз тлумачыў, як з дапамогай сонечнага святла здымаць партрэты і пейзажы. А свой першы фотаздымак ён, як і я, бачыў у Гуліна, калі той прывёз яго з Пецярбурга.

З прыватных вучняў Урбановіча самымі вядомымі і лепшымі былі Лойка і Шчотка. Для сабе ён зрабіў яшчэ і фотапартрэт Шчоткі. Звяртаючыся да вучня, называў яго «каралевічам», і таму яго самога звалі «каралём», а паколькі я быў яго фаварытам, дык і мяне «каралём» называлі.

Я кватараваў па вуліцы Крывой у доме Калясінскай. Адзін раз па гэтай вуліцы разам ішлі прафесары Бутоўскі і Урбановіч. Урбановіч прапанаваў Бутоўскаму зайсці да Шалевіча: «Гэта выд атны вучань, яму будзе прыемна, калі мы да яго зойдзем. Ён шмат працуе над геаграфіяй і цяпер чэрціць карту Германскага саюза». Бутоўскі адказаў: «Каб ён нават зоркі з неба здымаў, дык настаўнік і тады не павінен па-сяброўску заходзіць да вучня, заходзіць можа толькі па службе». Але ўсё ж адзін раз сам да мяне зайшоў.

Наш слаўны прафесар Бутоўскі — паяц, комік і фігляр, якога свет не бачыў, — быў рускім пісьменнікам[1], ён ў Лідзе напісаў кнігу. Нарцыз Шаблоўскі, які сёння яшчэ жыве, перапісваў рукапіс гэтага твора, а выдалі яго ў Вільні. Праз дваццаць гадоў я ва ўсіх рускіх кнігарнях Вільні шукаў гэтую кнігу як памяць пра свайго прафесара, але не знайшоў[2]. Яна складалася з трыццаці дзвюх глаў, з якіх я памятаю толькі тры: «Грех скончался», «Правда осталась в Иерусалиме» і «Гостеприимство в бегах».

Наш шаноўны прэфект добра піў гарэлачку[3]. Вучань пятага класа Баляслаў Цямахоўскі, з якім я пазнаёміўся і пасябраваў у Лідзе, напісаў такія радкі пра свайго дырэктара:

---

[1] Гл.: Бутовский, А. Рассказы детям о достопримечательнейших событиях истории России / А. Бутовский. — Типография Карла Крайя, 1851.

[2] Здаецца, гэтая кніга існавала толькі ў рукапісе. Слядоў выдання яе ў Вільні я не знайшоў.

[3] *«Рускія людзі ў цывільнай адміністрацыі краю сустракаліся вельмі рэдка, большай часткай толькі ў губернскіх гарадах, у павятовых рускі чалавек уяўляў сабой выключную з'яву. Прытым тутэйшы рускі службовы люд быў зусім адмысловага гатунку. Карэнных выхадцаў з Расіі заносіла сюды якая-небудзь выпадковасць… Такія назіранні я вынес з вельмі многіх гарадоў Паўночна-Заходняга Краю, куды мяне кідаў лёс. Усяго даўжэй мне прыйшлося пражыць з батальёнам нашага палка ў горадзе Лідзе Віленскай губерні. Тут у цывільнай адміністрацыі, пачынаючы з гараднічага, усе былі тутэйшыя. Праўда, найшоўся адзіны рускі, наглядчык павятовай вучэльні, званы па польскай тэрміналогіі „панам прэфектам", ды і той быў горкі п'яніца. Гэта быў карэнны русак, але ў маральных адносінах зусім бесхарактарны. Відаць, яго схавалі ў гэтую глухмень за п'янства. Да сваёй вучэльні ён амаль не меў дачынення, і… настаўнікі выкладалі так, як хацелі, без усякага кантролю; балазе ў той час яшчэ не была ўсталявана, як зараз, сістэматычная рэвізія выкладання з боку акруговых начальнікаў»*. Гл: Любарский, И. В. В мятежном крае. (Из воспоминаний) / И. В. Любарский // Исторический вестник. — 1895. — Т. 59, №3. — С. 818.

Наш директор уж взбесился,
Это видно со всего,
Он и с совестью простился,
Верно, верно, уж давно!

Для него и грех скончался,
Как Аркадий наш сказал.
Он и с истиной расстался,
Это всякий замечал.

Все пороки в нём слилися,
Верьте, правду говорю,
Черти садом собралися
В черную его душу.

Ром и водку без разбора
Пьет, как воду, завсегда.
Знает Мала, Вера, Сара
Его, всякая корчма.

Кроме водочки, милее
Нет ему уж ничего.
Сердце бьёт его сильнее,
Лишь увидит он вино!

І, відавочна, пад канец сваёй працы ў школе гэты алкагалічны спецыяліст піў усё больш.

Памочнікам старых прафесараў быў Пігулеўскі, вучоны, лагодны і мілы стары. Ён выкладаў наступныя прадметы: рускую мову, арыфметыку, геаметрыю і (у другім класе) геаграфію. Нялёгка яму было ўтрымліваць сям'ю. Старшы яго сын вучыўся ва ўніверсітэце, і расказвалі, што вучыўся дрэнна. Два другія сыны хадзілі ў нашу школу, абодва былі вельмі неразвітымі. Пра яго дачок нічога не ведаю.

У нашай лідскай школе былі тры праваслаўныя вучні: Пігулеўскія і Ніканаў. Гэты вучыўся сярэдне, але меў прыгожы почырк.

Рускія выкладчыкі: дырэктар, прафесар рускай мовы Гулін і Пігулеўскі. Выкладчыкі-палякі: Баўмблеўскі, Урбановіч і Рудзінскі. Прафесар падрыхтоўчага класа Фэглер — немец-католік.

У падрыхтоўчым класе форма для вучняў была не патрэбна, і кожны хадзіў у цывільным адзенні. А ў павятовай школе і ў гімназіі мелася абавязковая форма: сурдут з цёмна-зялёнага сукна з пунсовым каўняром, пунсовымі выпушкамі і металічнымі жоўтымі гузікамі з гербам губерні,

бліскучымі, у два рады. На шапцы (кепі — *Л. Л.*) з цёмна-зялёнага сукна былі пунсовыя паскі і такія ж выпушкі. Верхнім адзеннем служыў доўгі плашч з шырокай палярынай і вузкім стаячым каўняром — усё гэта з шэрага сукна. Форма мне вельмі падабалася, бо была зручнай і прыгожай. Калі я вучыўся ў трэцім класе, яе скасавалі і замест увялі паліто, падобнае на сучаснае (верагодна, падобнае на паліто — шынель — гімназіста пачатку XX стагоддзя — *Л. Л.*) У мае часы ў школах яшчэ выкарыстоўвалі цялеснае пакаранне, скасавалі яго ў 1859 годзе.

Наш любімы Шахаў сек вучняў добра, даставалася ім, бывала, і па трыццаць розгаў, часам і кроў пырскала, але ён усё роўна рабіў сваю справу. Лупцавалі нават вучняў чацвёртага і пятага класаў, але я вучыўся добра, мяне ніколі не секлі.

Адзін чатырохкласнік, гувернёр Д. з кватэры Нарбутовай, сын шляхціца з ваколіцы В., вучыўся добра, але быў вялікі свавольнік. Неяк, калі ўжо празвінеў званок на лекцыі, ён бомбай уварваўся ў наш клас, кленчыў на стале і паказваў усім нам нягжэчную частку цела. І трэба ж было такому здарыцца, што ў гэты момант у клас, каб весці ўрок, увайшоў ксёндз. А тая частка цела якраз была накіраваная ў бок ксяндза. Небарака саскочыў са стала і думаў схавацца, але ксёндз усё заўважыў і паставіў яго на калені ў калідоры вучэльні — ніякія малітвы, абяцанкі і просьбы не дапамаглі. Дырэктар заўважыў на калідоры ўкленчанага Д. і прапісаў яму яшчэ розгаў. Атрымаў спадар гувернёр! Другі раз той жа самы Д. быў абвінавачаны прафесарам Урбановічам, і зноў яму розгаў мала не было!

Урбановіч у Лідзе на адным месцы працаваў выкладчыкам трыццаць гадоў. Чалавек гэты быў надзвычай скупы. Да канца жыцця ён накапіў вялікія грошы і дажываў век разам з пляменнікамі ў ваколіцы Астравухі. Меў шчаслівую старасць. Не піў гарэлкі, піва і наогул ніякіх алкагольных напояў у рот не браў. Не паліў ні файкі, ні цыгары (папярос у той час яшчэ не было). Я бачыў яго карціны (ён сам іх намаляваў) такога зместу: сатана з рагамі, на курыных нагах, нахіляе галінку, на якой сядзяць курыльшчык, піток, аматар жанчын і карцёжнік. А вакол людзі рознага веку, стану і полу з вытарашчанымі вачыма імкнуцца да гэтай галінкі…

Другая карціна: д'ябал на курыных лапах, з рагамі, са страшным выразам твару трымае ў руках шыльду, на якой напісана: «Бяздзейныя, лянівыя, дзёрзкія — заходзьце!»

Урбановіч мяне называў «Яўстафьюшка-душачка», а каго не любіў, на тых крычаў: «Ты скотина, подлец! Будешь, будешь целовать в косматую ручку, но пощады никакой не будет!» Гэта азначала: калі пойдзеш у пекла, дык будзеш касматую руку д'ябла цалаваць, але дарэмна — раней трэба было думаць.

Наша школа месцілася на вуліцы Віленскай, у прыватным доме нейкага Міцкевіча. Гэты дом яшчэ нядаўна існаваў, і калі я праходзіў каля яго, заў-

сёды успамінаў мілыя і светлыя часы маёй вучобы. А калі вокны былі расчынены, я з вялікай цікавасцю заглядаў у пакоі. Але не так даўно той дом згарэў, і на памяць пра яго застаўся толькі кавалак даху на паштоўцы[1].

Яшчэ раней за мяне ў Лідзе з'явіўся мастак Пятрусевіч. Ён акварэллю намаляваў партрэт выкладчыка Урбановіча. Партрэт скапіраваў добры малявальшчык-канцылярыст Віталіс Шаблоўскі. З Шаблоўскім я быў у сяброўскіх стасунках і выкленчыў у яго гэты партрэт. Захоўваў у сябе такую дарагую памяць пра свайго прафесара. Калі я ўжо вучыўся ў Навагрудку, прафесар Фэглер прасіў аддаць яму гэты партрэт таварыша. Я не мог спрачацца з паважаным Фэглерам і з вялікім болем у сэрцы мусіў расстацца з дарагой для мяне рэччу. Лёс Фэглера быў сумным — ён памёр у Вільні, і пасля смерці абодвух дарагіх для мяне настаўнікаў я расшукваў той партрэт або яго копію, але не знайшоў.

Як сярод добрага зерня знаходзіцца насенне пустазелля, так і сярод вучняў бываюць нягоднікі, якія даюць прафесарам мянушкі. Так Урбановіча ўсе называлі Каралём і рэдка калі інакш. Вількоўскага называлі Віш, Фэглера — Флюк, Баўмблеўскага — Апалонік. Гэты звычай — даваць прафесарам мянушкі — мне надта не падабаўся. Пачуўшы іх, я выходзіў з сябе і гэтым здабыў сабе шмат непрыяцеляў сярод вучняў. Калі прапаноўвалі сарваць лекцыю, я, як вельмі правільны вучань, не згаджаўся, і злосць калег выліваласа на мяне. Аднаго разу яны нават хацелі закруціць мне галаву ў паліто і пабіць. А другі раз мяне выклікалі на двубой — кулачны паядынак. Я быў вельмі слабы і не паспеў літаральна нават адным пальцам паварушыць, як апынуўся на зямлі. Нічога не мог зрабіць са сваімі праціўнікамі — ні словам, ні сілай. Але мяне вельмі крыўдзілі іх злаславасць і дурата, бо як жа можна не паважаць настаўнікаў, якія нас вучаць і да дабра вядуць.

І нарэшце пра знакамітага Рудзкага — вартаўніка нашай школы. Ён служыў тут 38 гадоў. Паколькі без розгаў у той час вучыць не атрымлівалася, менавіта ён і выконваў пакаранне. Вучні, якія прайшлі праз рукі Рудзкага, у мой час былі ўжо палкоўнікамі, генераламі, канонікамі, прэлатамі і г. д. Неяк на пошце я сустрэўся з адным палкоўнікам, які атрымаў выхаванне ў нашай вучэльні. Распытваў ён мяне пра Ліду і школу. Між іншым, успомніў вартаўніка. «Рудзкі і цяпер служыць, — адказаў я палкоўніку. — Без яго ніяк». — «Шчаслівую меў руку... добра мяне стымуляваў», — уздыхнуў афіцэр.

Чацвёрты і апошні клас

Атрымаўшы пасведчанне за трэці клас, я паехаў дахаты. Тут з першага дня расклаў свае любімыя кнігі і пачаў рыхтавацца да чацвёртага класа.

[1] Невядома, дзе на вуліцы Віленскай стаяў дом Міцкевіча. З тэксту бачна, што згарэў ён ужо пасля пажару 1891 года, верагодна, на пачатку XX стагоддзя, а яго дах бачны на нейкай з паштовак.

Праз тры тыдні атрымаў ліст ад брата пра тое, што Лідская школа закрыта, але замест павятовай вучэльні ў Наваградку створана сямікласная гімназія. Ён прапанаваў мне прыехаць у Ліду, каб потым далей вучыцца ў Наваградку.

Калі я прыехаў у Ліду, дык даведаўся, што заняткі ў Наваградку пачынаюцца толькі 15 верасня, і таму я маю цэлы месяц вольнага часу. Спадарыня З., з чыёй дачкой быў заручаны мой брат, папрасіла мяне, каб я гэты месяц папрацаваў настаўнікам у яе трох сыноў. Старэйшы намерваўся ехаць са мной у Наваградак. Я заўсёды быў нервовы, надзвычай чулы і сентыментальны.

У канцы месяца я пайшоў да дырэктара, каб атрымаць пасведчанне пра заканчэнне трох лідскіх класаў. Шаноўны дырэктар выправіў для мяне ў Наваградак пасведчанне з падзякай наступнага зместу: «Ученик Шалевич во всех отношениях превосходный молодой человек. Как бы мне приятно было услышать, что гг. Боублевский и Феглер[1], его бывшие учителя, а мои товарищи, помогли ему в переводе в IV класс. А. Шахов».

Яшчэ ён напісаў да свайго школьнага калегі, інспектара Беляўскага, добры ліст пра мяне. З гэтакай рэкамендацыяй я не меў праблем, і мяне прынялі ў чацвёрты клас. У гэты клас запісалася ажно пяцьдзясят пяць вучняў, і таму ў ім было цяжка. Першымі вучнямі класа лічыліся Абламовіч і Стос. Абламовіч — сын багатага гаспадара маёнтка Парасека на восемдзесят дзевяць дымоў. Стос — сын каваля, праваслаўны. Абодва вучыліся толькі на «5». Пасля гімназіі Абламовіч вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, а Стос стаў прафесарам гісторыі, ён потым пісаў, што выхаваны ў польскім духу.

У нашым класе было восем татар, з іх Абрахам Улан і Мурэчучык вучыліся не надта добра. Усяго гімназія налічвала трыццаць татар. Акрамя аднаго вялікага фігляра і штукара, усе яны нармальна вучыліся і былі разумнымі і спакойнымі хлопцамі, не схільнымі да глупстваў і дрэнных учынкаў.

У гімназіі выкладаліся наступныя навукі: рэлігія, мовы (руская, польская (часова, да паўстання 1863 года — *Л. Л.*), нямецкая, французская, славянская), арыфметыка, алгебра, геаметрыя, гісторыя Расіі, а таксама сусветная і натуральная, геаграфія Расіі і агульная, фізіка, хімія, астраномія.

Рэлігію выкладалі тую, да якой належаў вучань. Катэхізмы і маральную навуку нам выкладаў ксёндз Бядрынскі, потым ён быў пробашчам у Вільні. Пры мне на невялікі тэрмін пасаду дырэктара займаў Лебедзеў (рускі), а потым яго змяніў паляк Чашніцкі (ці Чэсніцкі, дакладна не памятаю). Інспектар Бяляўскі добра выкладаў фізіку і геаметрыю. Рускай мове вучылі: у старшых класах — Дзмітрыеў, а ў малодшых — Савельеў. Польскую мову выкладалі: у старэйшых — Каўчан (ён выкладаў і лаціну), а ў малодшых — Гайбовіч. Выкладчыкам французскай быў наш лідзянін Баўм-

[1] Гэтыя настаўнікі былі пераведзеныя ў Навагрудскую гімназію.

блеўскі, нямецкай — на пачатку Гілберт, а потым Хэрмут. Алгебры вучыў стары спалячаны Васілеўскі. Натуральную гісторыю выкладаў вельмі мілы чалавек Кабецкі (караім). Агульную і рускую гісторыю — Чайкоўскі. Геаграфію — Лерывер, ён паходзіў з Францыі. Памочнікам старшых настаўнікаў быў Савельеў. Маляваць вучыў Пранкоўскі.

Для нашага любімага Фэглера месца адразу не знайшлося, і ён нейкі час лічыўся пры гімназіі пазашкольным наглядальнікам. Толькі праз некалькі месяцаў зноў стаў прафесарам гімназіі. Гэтага добрага чалавека ніхто ў Наваградку не паважаў, і ён павінен быў кожны дзень абыходзіць кватэры вучняў.

Акрамя двух, усе прафесары гімназіі вельмі добра выкладалі свае прадметы. Напрыклад, інспектар Бяляўскі. Калі ён тлумачыў геаметрыю, дык не было такога, каб нехта выйшаў з класа, не зразумеўшы тэмы. Ксёндз Бядрынскі, выслухаўшы нашы адказы, пачынаў наступную тэму, а калі заставаўся яшчэ вольны час, так добра расказваў нам анекдоты, што мы трымаліся за бакі ад рогату.

Шаноўны прафесар Каўчан добра выкладаў лаціну і польскую мову, і ад яго можна было шмат чаму навучыцца, але я ў той час быў вельмі хворы. Бог стварыў мяне як генія ці вялікага чалавека, але хвароба ўва мне ўсе забіла!

Прафесар Кабецкі выкладаў заалогію, батаніку і мінералогію. Хэрмут вучыў нямецкай мове па методыцы, якой у той час ніхто не карыстаўся. За гэта на яго абураліся некаторыя вучні са сваімі бацькамі і нават сам дырэктар. Выкладаў ён па методыцы, якая сёння ўжо прызнаная і агульнавядомая.

Наогул, усе прафесары добра выкладалі, і вучні наваградскай гімназіі вызначаліся добрай вучобай і прыкладнымі паводзінамі. Толькі потым з Ліды прыехаў адзін вучань, І. К., якога перад гэтым выгналі з Полацкага кадэцкага корпуса. Ён шмат што выраблял і горш за ўсіх вучыўся. Адна авечка ўвесь статак псавала. Я з ім жыў на адной кватэры, але ён быў маім вялікім непрыяцелем і праследаваў мяне.

З-за ўзмацнення хваробы мне прыйшлося пакінуць гімназію ў чацвёртым класе. Адбылося гэта 16 лістапада 1859 года.

Я прыехаў дамоў і пятнаццаць гадоў працаваў на гаспадарцы. Меў слабае здароўе, тым не менш працаваў фізічна. Каля 1875 года заняўся выкладаннем і так працую ўжо трыццаць шэсць гадоў. З маіх вучняў адзін выйшаў у інжынеры, другі стаў капітанам, ёсць ксяндзы і г. д. А самы галоўны вучань і сваяк, самы таленавіты ў маёй сям'і, стаў нашым першым студэнтам у Інстытуце шляхоў зносін. Але ён пакінуў гэты свет у маладыя гады. Яго бацька і мой родны брат не вытрымаў страты і хутка пасля сына таксама памёр. Я застаўся адзін.

У Наваградку я кватараваў у сп. Грыфін, якая палюбіла мяне як сына. Вечарамі часта хадзіў да яе паразмаўляць. Інспектару яна пра мяне заўсёды гаварыла добра. Яе муж вучыўся ў школе з Адамам Міцкевічам.

Пасля гімназіі я сустракаўся толькі з адным маім прафесарам — з Васілеўскім, у Вострай браме.

Як у Лідскай прагімназіі, так і ў Наваградскай гімназіі сярод вучняў я меў сяброў і ворагаў. У першым класе ў мяне быў прыяцель Міцкевіч, сын эканома з маёнтка Грабоўскага[1], але ён хадзіў у школу толькі адзін год. У гэтым класе я таксама сябраваў з добрым хлапчуком Феліксам Яцінскім. Ён заўсёды быў каля мяне, і ўсе сваркі, бойкі і звады ў нас былі агульнымі. Рассталіся мы з ім у Лідзе ў 1858 годзе, зноў жа сустрэліся ў Эйшышках — толькі праз пяцьдзясят гадоў.

Калі я вучыўся ўжо ў другім класе, у першы клас паступіў Тэафіл Баркалеўскі з маёнтка Ражанка, унук агародніка[2] Барташэвіча. Сірата, ён не меў ні бацькі, ні маці, гадаваўся добрым дзедам. Гэта быў спакойны хлопец, які старанна вучыўся і добра сябе паводзіў. З ім я сябраваў тры гады, мы разам выходзілі гуляць за горад і марылі пра далейшую адукацыю. Неяк выпадкова сустрэліся ў Наваградку, каля па-дамініканскага касцёла, і, як яўрэі пра гандаль, пачалі спрачацца пра астраномію. Я махаў рукамі і амаль крычаў: «Які гэты сусвет вялікі: да Месяца — пяцьдзясят тысяч міль, да Сонца — дваццаць мільёнаў міль, да найбліжэйшай зоркі — чатыры больёны міль! А колькі ж да самай далёкай?! За гэтакай размовай не заўважылі, што да нас наблізіўся наш шаноўны дырэктар. Калі ён з намі параўняўся, мы як жаўнеры выцягнуліся і знялі шапкі, а ён нам гжэчна адказаў кіўком галавы. Было бачна, што дырэктар чуў нашу размову і яму было прыемна.

Меў я і двух ворагаў, якія праследавалі мяне на кожным кроку: у першы год гэты былі Ігнат Каліноўскі (жыў з ім на адной кватэры) і Адам Баранцэвіч, з якім я мучыўся тры месяцы. Каліноўскага за нейкі ўчынак выгналі з Полацкага кадэцкага корпуса, і таму ён вучыўся ў Лідзе, а потым, на маю пакуту, у Наваградку. Я сварыўся з ім цэлы год — ён даводзіў мяне да таго, што я выходзіў на замкавую гару і біўся галавой аб камяні. Каліноўскі быў подлым хлопцам, неяк у Наваградку ён так штурхануў вучня Г., што ў таго ад удару аб сцяну з носа пайшла кроў. За гэта інспектар Каліноўскага пакараў.

Каліноўскі заўсёды глядзеў з-пад ілба і кожны дзень рабіў мне шкоду. У Лідзе адзін хлопец праз яго пайшоў на той свет.

У Лідзе маімі калегамі па вучобе былі сп. В. Ячыноўскі, І. Кяшкоўскі ды І. Ільцэвіч, цяпер у Вільні жыве Станіслаў Ёдка. Ксяндзамі сталі Мацей Гарасімовіч, Адам Сакалоўскі, Баляслаў Асецкі, Яўстах Карповіч, Аляксандр Рынкевіч і Пётр Казакоўскі.

Ксёндз Гарасімовіч старанна вучыўся і быў добрым школьным калегам. Служыў вікарыем і пробашчам па вёсках, потым быў рэктарам у Віленскай

[1] Верагодна, з Вялікага Мажэйкава.

[2] Агароднік — селянін, які апрацоўваў малы кавалак зямлі — агарод.

духоўнай семінарыі. Працаваў сакратаром біскупа Грынявіцкага, лічыўся яго дарадцам і правай рукой. Яны планавалі зрабіць ў дыяцэзіі шмат перамен, але біскупа выслалі, здаецца ў Яраслаўль[1].

Неяк прыязджаю я ў Ліду і сустракаю ксяндза Гарасімовіча ў касцёле вікарыем. Лячу да яго, каб выказаць сваё шанаванне (прыемна было сустрэцца, бо доўга не бачыліся). Што сталася? Чаму яго з рэктара семінарыі перавялі ў вікарыі, ды яшчэ да ксяндза Карповіча!?

Пасля Ліды ксёндз Гарасімовіч нядоўга служыў пробашчам у Новым Двары (Лідскага павета), потым заняў пасаду лідскага дэкана і пасля Ліды вярнуўся ў Вільню прэлатам.

Паходзіў з дробнай шляхты з ваколіцы Кербядзі Лідскай парафіі. У школе быў ціхім, спакойным, працавітым вучнем. Як і я, з іншымі вучнямі не гуляў (у мяч ці іншыя гульні) і ўзорна сябе паводзіў. Калі я быў у Лідзе ў 1904 годзе, раптоўна да дэкана прыйшла тэлеграма: памёр ксёндз Гарасімовіч.

У адной школе з ксяндзом Адамам Сакалоўскім я вучыўся толькі год — ён у чацвёртым класе, а я ў першым. Але мы жылі ў адной гаспадыні. Пасля чацвёртага класа ён паступіў у семінарыю і стаў ксяндзом. Меў добры голас і спяваў у хоры біскупа Адама Красінскага. Сакалоўскі пачынаў служыць вікарыем у вясковых касцёлах, потым больш за трыццаць гадоў працаваў пробашчам у Начы. З-за хваляванняў у парафіі паміж Начанамі і Дубічанамі[2] яго перавялі. Здаецца, цяпер працуе пробашчам у Жырмунах. Мае сустрэчы з ім заўсёды былі прыемнымі — пакуль ён служыў у Начы, я часта бачыў яго, бо я жыў у той жа парафіі.

Баляслаў Асецкі — мой школьны калега і блізкі сусед. Пасвячоны ў ксяндзы ў 1863 годзе, ён павінен быў служыць у Жалудку. Дзесяць гадоў служыў вікарыем у Радуні, дзе потым — не ведаю. Закончыў сваё жыццё ў Паставах. Ксёндз Якалоўскі расказваў, што прэлат Бядрынскі пасля смерці пакінуў у спадчыну 180 тыс. рублёў, 2/3 гэтых грошай былі запісаныя на яго сям'ю, але і ксяндзу Асецкаму належала атрымаць 17 тысяч рублёў. Казалі, што сабе ён пакінуў толькі 3 тысячы, а рэшту аддаў на дабрачыннасць. Калі гэта праўда, дык чэсць яму і хвала!

Ксёндз Яўстах Карповіч — сын медыка з Жалудка, калега па школе і мой добры знаёмы з дзяцінства. Цяпер служыць пробашчам у Ракаве Мінскай губерні. Ад прэлата Бядрынскага таксама ў спадчыну атрымаў многа грошай. Нарадзіўся ў вялікай сям'і, меў шэсць братоў і пяць сясцёр.

Ксёндз Аляксандр Рынкевіч таксама нешта атрымаў ад ксяндза Бядрынскага. Дзе цяпер служыць — не ведаю.

---

[1] Біскуп Караль Грынявецкі (1841–1929) у 1883 годзе быў прызначаны папам Львом XIII віленскім біскупам, а ў 1885 годзе сасланы ў Яраслаўль за супрацiў русіфікацыі.

[2] Хваляванні былі выкліканы патрабаваннем летувіскіх вернікаў служыць імшу па летувіску.

Ксёндз Пётр Казакоўскі паходзіў з Радунскай парафіі. Усё жыццё правеў у Польскім каралеўстве. Калі пастарэў — прасіў, каб яго пахавалі сярод радунскіх сваякоў, што і было зроблена.

Прэлат Бядрынскі[1] меў трохі больш за семдзесят гадоў, але быў яшчэ здаровы і, калі б не адзін выпадак, мог бы яшчэ доўга жыць. Аднойчы ён вяртаўся ад вясковага пробашча, коні панеслі, разбілі яго брычку, і Бядрынскі загінуў.

Адкуль прэлат меў так шмат грошай — невядома. Я пра гэта думаў. Каб кожны год адкладаў па тысячы, дык трэба было жыць сто восемдзесят гадоў, а ён пражыў толькі семдзесят. Калі працаваў прафесарам у Наваградку, атрымліваў звычайны заробак і пра яго вялікія грошы ніхто не чуў. Да таго ж лёкай прэлата пасля смерці скраў з яго камода 12 тысяч рублёў (гэта акрамя тых 180 тысяч).

Ай, мая шаноўная пані, я добра ведаю, адкуль гэтыя грошы паходзяць.

Як вядома, адміністратар Жылінскі[2] пабудаваў на Коннай вуліцы вельмі прыгожую камяніцу. Казалі, што з усіх пробашчаў ён цягнуў добрую

[1] Феліцыян Бядрынскі (Бядржынскі) — прэлат, кандыдат тэалогіі (не блытаць з сучасным кандытатам навук), схаластык вялікага Віленскага кафедральнага капітула, законаастаўнік Віленскай мужчынскай гімназіі і Марыінскага вышэйшага жаночага вучылішча, кавалер ордэна Св. Станіслава 3 ст., узнагароджаны залатым наперсным крыжам і медалём за вайну 1853–1856 гадоў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. — Вильна, 1875. — С. 136–137.

[2] Пётр Жылінскі (1817–1887) — кіраўнік Віленскай дыяцэзіі, прэлат-прэпазіт (глава манаскага закона) кафедры, доктар тэалогіі, кавалер ордэна Св. Станіслава 1 і 2 ст. з імператарскай каронай, кавалер ордэна Св. Уладзіміра 3 ст., узнагароджаны наперсным крыжам, медалямі за вайну 1853–1856 гадоў і падаўленне паўстання 1863–1864 гадоў. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1875 год. — Вильна, 1875. — С. 136. Масолаў А.: *«Некалькі пазней узвысіўся вілейскі дэкан П. Жылінскі, чалавек яшчэ не стары, але цалкам сівы, трымаўся як каталіцкі біскуп — важна і стрымана. Ён атрымаў адзін з лепшых Віленскіх прыходаў — Вострабрамскі (каля гэтага касцёла — знакамітая брама з капліцай, пад'язджаючы да брамы па вузкай вуліцы, усё людзі здымалі шапкі) і прызначаны прэлатам»*. Гл: Мосолов, А. Н. Виленские очерки 1863–1865 гг. / А. Н. Мосолов. — СПб., 1898. — С. 117–118. Пётр Жылінскі, пасвечаны ў святары ў 1842 годзе. Пробашч Віленскай Вастрабрамскай парафіі. У 1866 годзе і ў 1868–1883 гадах — адміністратар Віленскае дыяцэзіі ў сувязі са ссылкай у Вятку біскупа Адама Станіслава Красінскага. Выявіў сябе як актыўны прыхільнік русіфікацыі касцёла. У лістападзе 1869 года, падчас аўдыенцыі ў Аляксандра II, заявіў, што з'яўляецца сапраўдным патрыётам Расіі і гатовы ўсім ахвяраваць дзеля Айчыны і цара. У 1871 годзе даў дазвол на выданне расейскамоўнага катэхізму «Рымска-каталіцкі катэхізіс пра паслухмянасць і адданасць прастолу і Айчыне нашай Расіі або тлумачэнне 4-й запаведзі Госпада, якая датычыць начальства і яго ўлады». У 1876 годзе для паскарэння русіфікацыі касцёлаў былой Мінскай дыецэзіі падзяліў яе на два візітатарствы — Мінскае і Слуцкае. Палітыка адміністратара выклікала рэзкі супраціў вернікаў і святароў. 23 студзеня 1878 года Жылінскі атрымаў ліст ад кардынала Кацярыні, у якім Ватыкан абвінавачваў яго ў самавольным уступленні ў кіраванне дыецэзіяй, а таксама ў спробах пазбыцца лепшых ксяндзоў і ўвесці ў касцёл рускую мову. Рым патрабаваў ліквідацыі пасад візітатараў. Напрыканцы 1882 года Пётр Жылінскі выехаў у Ватыкан, дзе адрокся ад ранейшых «памылак» і атрымаў адпушч-

даніну — пробашч нават самай малой парафіі павінен быў даваць яму ў лапу 150 рублёў штогод.

Казалі яшчэ, што нейкі ксёндз нібыта прапаноўваў Жылінскаму за арэнду Вострай Брамы 50 тыс. рублёў штогод, але той не згадзіўся. Усе гэтыя грошы не аднаму Жылінскаму ішлі, іншыя прэлаты таксама «сваё» мелі. Адзін спадар расказаў яўрэю, што Жылінскі прыгожую камяніцу пабудаваў. «Ай, я і не такую б камяніцу паставіў, каб гэтакую маці меў...»

Неяк, калі Жылінскі сядзеў у сакрыстыі Вострай Брамы, у касцёл прыйшоў нейкі селянін. Селянін запытаўся ў мясцовага хлопца: «Каму тут, паночак, на імшу даваць?» Жартаўнік адказаў: «Дай гэтаму ксяндзу (паказвае на Жылінскага), толькі папрасі яго, каб Жылінскаму грошай не даваў, бо той імшу не адправіць». Селянін падыходзіць, нізютка кланяецца, і, падаючы грошы, кажа: «Прашу, вяльможны ксяндзюлячку, прыняць за імшу, толькі Жылінскаму не давай, бо той імшы не адправіць!» — «Ня дам. Ня дам!» — адказаў Жылінскі[3].

У час вучобы майго брата ў Лідскай школе да мяне дырэктарам там працаваў нейкі католік Падзерня. Гэта быў вельмі шляхетны чалавек, так пра яго казаў мне Урбановіч. У яго час з рускіх там працаваў толькі выкладчык рускай мовы Лаўроў, быў яшчэ немец, выкладчык нямецкай мовы Гілберт, а усе астатнія — палякі[4]. Пры мне Гілберт выкладаў у Наваградку і так казаў пра чужую для яго мову: «Як у гэтых палякаў усё аднолькава: шкляны слоік, спявае слоік[5] і я слоік[6]».

Тады яшчэ выкладалася латынь. Прафесарам латыні быў Заблоцкі, французскай мовы — Масіні, скрыпач, пры мне ён ужо быў на пенсіі і граў на скрыпцы з раніцы да вечара. Неяк ён сваёй музыкай давёў мяне да слёз. Урбановіч спытаў у мяне: «Каралевіч, чаго плачаш?» — «Спадар Масіні так прыгожа грае!»

У часы Падзерні ў Лідзе былі вучнёўскія спевы. У мае часы такога ўжо не было, але мы стварылі аматарскі калектыў. Мы збіраліся па чатыры-пяць (а часам і сем) чалавек і гралі, кіраваў намі Віталіс Шаблоўскі.

Лісты

Шаноўны ксёндз-рэдактар!

З вялікай прыемнасцю бяру ў рукі пяро, каб выканаць жаданне спадара рэдактара і апісаць цяг свайго жыцця і свае працы па механіцы. Нават не для таго, каб гэта было надрукавана ў газеце, а проста каб вы ведалі.

энне грахоў. Зразумела, што такі «свой» чалавек меў поўную свабоду красці.

[3] Увесь гэты дыялог у Вострай Браме запісаны па-беларуску.

[4] У сэнсе — мясцовыя рыма-католікі.

[5] Скажонае «słowik» — салавей.

[6] Скажонае «człowiek» — чалавек.

З шасці гадоў я ніколі не выпускаў з рук нажа. У дзесяць гадоў рабіў маленькія вазкі, домікі і г. д. У адзінаццацігадовым узросце, выслухаўшы расповед майго с. п. бацькі, зрабіў мадэль помпы, і яна добра пампавала ваду. Тады ж зрабіў малы ветраны млын з бразготкай, якую было чуваць на палову вярсты. Потым ствараў прыгожыя сэрцайкі, кошыкі і крыжыкі з паперы — паненкі і пані бралі іх сабе на памяць. Пасля зрабіў ткацкі варштат і ткаў стужкі, выдумляючы арнамент.

З-за вельмі слабага здароўя ва ўзросце трынаццаці гадоў я ледзь паступіў у першы клас прагімназіі ў Лідзе. Вельмі любіў навуку і сваіх настаўнікаў, яны таксама добра да мяне адносіліся.

У 1858 годзе тую прагімназію закрылі, і я пачаў вучыцца ў Навагрудскай гімназіі. Там мяне надта зацікавіў вялікі мураваны ветраны млын, які стаяў на замкавай гары, недалёка ад маёй кватэры. Таму ў вольныя ад навукі гадзіны я прыходзіў да яго. Млынар быў надта злы і праганяў вучняў без цырымоній. Але да мяне ён ставіўся добра і дазваляў нават падымацца на вышэйшы паверх ветрака. Прыехаўшы дамоў на вакацыі, я зрабіў маленькі драўляны ветрачок з лопасцямі ў 1,5 локця, з кашом і скрыняй. Засыпаўшы ў вятрак чыстага пяску, можна было назіраць усе этапы працы млына.

Слава аб маім млыне разышлася па акрузе. У той час па Жалудоцкай парафіі хадзіў механік, нейкі Адамовіч. Ён, пачуўшы пра мой млын, адмыслова заехаў да нас, каб яго ўбачыць. На жаль, мяне тады не было дома, і механік, агледзеўшы млын, сказаў бацькам: «Калі ваш сын пойдзе па гэтай дарозе, дык узнімецца высока».

Але я не пайшоў па гэтай дарозе і ўсё жыццё блукаў па бездарожжы ў міражах.

З трох гадоў я заўсёды адчуваў галаўны боль і праз гэта не змог вучыцца далей, не дайшоў і да пятага класа, і давялося мне пакінуць любыя навукі. Схіліўшы галаву, плакаў і маліўся перад абразам Маці Божай у па-дамініканскім касцёле ў Наваградку, слёзы капалі на падлогу. Але гэта не дапамагло, я пакінуў гімназію і прыехаў дахаты, каб заняцца гаспадаркай, але патроху і майстраваў.

У 1864 годзе зрабіў сабе маленькую, у палову локця, арфу. Зрабіў яе, не маючы ні варштатаў, ні прылад, ні хоць якіх інструкцый. З інструментаў меў толькі вялікую нязграбную сякеру, долата і пілку. Увесь час быў заняты гаспадаркай і сваю арфу рабіў вечарамі і па начах. Не маючы струн, зрабіў іх з моцных навошчаных нітак. Арфа атрымалася лепшай, чым я спадзяваўся, і служыла мне больш за год.

У 1865 годзе я прыняўся за новую (ужо вялікую) арфу. Варштат пазычыў у цеслі — добрага суседа, і на гэты раз меў адпаведны матэрыял: струны зрабіў з дроту, прыдумаў, як змайстраваць сапраўдны корпус і механізм нацяжэння струн. Гэтая вялікая арфа працавала пятнаццаць гадоў і цяпер

яшчэ жыве, на баку яе надпіс: «1865 год». Акрамя гэтых двух арфаў я зрабіў яшчэ чатыры. З іх адна ў 1871 годзе пайшла жалудоцкаму пробашчу ксяндзу Гайжэўскаму.

У той час я зрабіў некалькі машынак для чысткі бульбы. У 1866 годзе паставіў на полі малы вятрак, які працаваў тры гады. Усё гэта рабіў я з задавальненнем, але мне ніколі не хапала грошай.

Тры гады бесперапынна спаць не мог, усё думаў: як набіваць валікі для катрынкі? Але неяк раптам бы хто малатком па галаве ударыў — гэтак стрэліла мне мысль пра тое, як гэта можна зрабіць.

У Жалудку жыў арганіст Вінцэнт Ліхвяровіч, малады і вельмі здольны да рамёстваў чалавек. Ён быў сталяр-самавук і інструментальшчык, якіх мала. Выдатна дадаў галасы да гармоніі. Рабіў такія рэчы, якіх і ў Вільні не рабілі. Свой свайго заўсёды пазнае, і зразумела, што мы пасябравалі. Я навучыў яго нотам, і мы стварылі аматарскі музычны калектыў. Зрабілі мы катрынку, якая грала «Вітай Панна!», і потым радасна скакалі па пакоі. Я навучыў яго набіваць валік для катрынкі, і яна магла граць усё, што пажадаеш — нават і старасвецкі англез ці што іншае.

Я ўсё жыццё меў замілаванне да механікі. Як толькі канчаў рабіць адну рэч, дык адразу браўся за іншую. І покуль не зраблю — есць і спаць не магу, хаджу як упыр і грызуць мяне думкі пра новы праект!

Для маёй працы трэба было ўмець ліць латунь, і таму, калі я быў у Лідзе, зайшоў я да яўрэя-злотніка, які ліў бронзу. «Навучы мяне латунь адліваць», — кажу. Майстар паглядзеў на мяне і па маіх вачах зразумеў, як гэта мне неабходна! Вучыў мяне паўгадзіны, але я прыехаў дадому і адразу раздзьмуў горн, сабраў усё, што трэба, і адліў якасны латунны ключ.

Яшчэ ў 1865 годзе я, калі рабіў арфу, пазычыў у цеслі яго варштат і потым зрабіў сабе свой. З таго часу праца мая пайшла!

З самага дзяцінства я незвычайна любіў бляхарства. За некалькі гадоў цяжкай і мазольнай працы дайшоў да добрых вынікаў, бо зрабіў ажно чатыры бляшаныя самавары.

У 1868 годзе стварыў вялікі глобус, намаляваў на ім усе часткі сусвету, акіяны, моры, і ўсё гэта атрымалася прыгожа. Потым падарыў яго для навучання геаграфіі п. Стацкевічу. Другі такі ж глобус зрабіў праз дзесяць гадоў. Абодва былі з паперы, атрымаліся як трэба: круглыя, гладкія, моцныя і ў сярэдзіне пустыя. Другі глобус маю ў сябе і сёння — ён добра прыдаўся мне для навучання.

У 1873 годзе міравому суддзі з Жалудка Байлатаву[1] зрабіў механічную лодку сваёй канструкцыі — круцілася воднае кола, і лодка, як параход, ішла па вадзе. Суддзя — малады яшчэ чалавек — працяглы час ездзіў на гэтай

[1] Васілій Іосіфавіч Байлатаў.

лодцы па вялікім ставе і добра бавіў час. Слава пра мой выраб дайшла ажно да Польскага каралеўства.

Каля 1875 года стрэліла мне ў галаву думка зрабіць паравую машыну. На чыгуначнай станцыі ў Аранах[1] прасіў машыніста, каб той раскрыў для мяне цыліндр і клапанную сістэму паравой машыны, і я мог зразумець, як яна працуе. На пэўных умовах машыніст-немец хоць і са страхам, але ўсё ж паказаў мне тое, што трэба. Як толькі я вярнуўся дадому, пачаў збіраць усё належнае і рабіць паравую машыну — лакамабіль.

Цыліндр і іншыя штучкі адліў з волава, бо з гэтым металам ужо ўмеў працаваць. Кацёл зрабіў у стылі самавара са звычайнай белай бляхі. Калі ўсё было гатова, заліў вады, паклаў вугалю і дзьмухаў-хукаў, каб хутчэй распальвалася. Хацелася, каб як хутчэй. Нарэшце бачу: ёсць моцны пар. Хачу ўзяцца рукой за кран, каб пусціць пар у цыліндр, — рука не рухаецца, а сэрца гвалтоўна стукае. Не магу, не магу. Што будзе, што будзе?! А калі ўся мая праца марная?! Нарэшце сабраў усю сілу волі і адкрыў кран!

О Езус! Хрысце! Кола машыны хутка і шалёна закруцілася. Бегаю, крычу, скачу па дому як вар'ят! Усіх напужаў і ўсё ў хаце перавярнуў.

Але мая машына была пабудавана са слабых матэрыялаў і нядоўга мне служыла. Цешыўся ёю толькі некалькі тыдняў. Потым закінуў у кут, дзе яна праляжала васямнаццаць гадоў.

У 1885 годзе з бляхі, на манер варшаўскіх машын, я зрабіў сікаўку, якая палівала вуліцы. Магла ўжывацца пры пажары, бо струмень вады з яе перабіваў праз аднапавярховы дом.

Праз нейкі час ізноў прыйшла да мяне ідэя пабудаваць лакамабіль. Тады я ўжо меў лепшыя слясарныя і сталярныя інструменты, ды і нейкія грошы з'явіліся. Кацёл зрабіў з тоўстай меднай бляхі, цыліндр і ўсё патрэбнае да яго адліў з латуні — атрымалася надзейна і добра. Кола было хоць драўлянае і невялікае, але для вагі акутае волавам[2]. Кацёл меў мернае шкло і клапан бяспекі.

Калі падняўся ціск у катле і паравая машына пачала круціць кола — для навукоўцаў праблема на гэтым была б ужо вырашана, але механікам патрэбна, каб машына рабіла нешта карыснае. Таму я зрабіў яшчэ малатарню, якая малаціла, сартавала і ссыпала зерне ў мяшок. Зрабіў і малы тартак, які пілаваў палена на дошкі. На катле меўся свісток, які было чуваць за паўвярсты.

Зрабіў яшчэ шмат механізмаў, напрыклад, у 1867 годзе — конную малатарню, якая служыла доўгі час.

---

[1] Праз Ліду Палеская чыгунка прайшла толькі ў 1882 годзе, але па самаму поўдню Лідскага павета праходзіла чыгунка «Пецярбург — Варшава». Таму Шалевіч і бачыў паравоз у Аранах (тады Троцкага павета).

[2] Аднацыліндравай паравой машыне цяжкае кола патрэбна для інерцыі, каб зрушваць поршань з «мёртвай кропкі».

Спрабаваў сябе ў шавецкім і рымарскім рамёствах. Шаўцом не стаў, а рымарская справа нават і пайшла.

Гадзіннік. Ён атрымаўся вялікі, некаторыя колышасцерні ў ім маюць памер добрага сподка. Усе дэталі драўляныя і зробленыя маімі рукамі без ніякага такарнага станка — кола выразаў сякерай. Як выразаць зубцы на колах — прыдумаў сам. Рабіў гадзіннік у вольны час, пры агні, па вечарах. Мазольна працаваў паўгода, і нарэшце 28 чэрвеня 1898 года мой гадзіннік пайшоў. Дакладна паказваў час і біў гадзіны. Віленскі гадзіннікавы майстар, яўрэй, сказаў мне: «Рабіць такі гадзіннік — катаржная праца». Да гадзінніка я зрабіў яшчэ шмат дадаткаў — ён і абутак на раніцу падаваў, і дзверы, калі трэба, адчыняў і г. д.

Некалькі гадоў таму, у 1905-м, я цалкам перастаў майстраваць. Гадзіннік і ўсе свае рэчы вынес на гарышча, дзе яны і спачываюць. Узрост. Механікай займаўся пяцьдзясят гадоў — меў такое жаданне канструяваць розныя рэчы, што падобна было на хваробу. Але маю такі ўзрост, што ўжо нічога добрага зрабіць не магу.

18 лютага 1913 года.

Шаноўная спадарыня!

Што пані можа сказаць пра вершык «На смерць Нарбута»?[1] Я, як вялікі знаўца літаратуры, яго вельмі люблю, бо добра памятаю той страшны час. Аўтара гэтага верша я ведаў асабіста[2], мы блізка жылі і часта сустракаліся. Ён з'яўляўся невычарпальнай крыніцай анекдотаў — на вячорках заўсёды быў душой кампаніі і ўсіх весяліў, але з'яўляўся вельмі мілым чалавекам і вялікім патрыётам. У тым няшчасным годзе ён, як і я, меў шмат маральных пакут. Хаця я нават, можа, і больш. С. п. Даніэль Камінскі меў хворыя ногі і памёр у 1868 годзе.

Наш народ вельмі цёмны! Зараз, здаецца, заблішчэлі іскры асветы. Неяк мой пляменнік прыехаў да свайго бацькі і прывёз з сабой ровар. Аднойчы ён ехаў роварам, а кабета ішла насустрач. Калі яна ўбачыла, што чалавек едзе на кійку, дык вырашыла, што гэта злы дух, і пачала жагнацца, а потым уцякла ў поле. Назаўтра ён зноў паехаў і на сваім шляху дагнаў селяніна. Той, убачыўшы, што чалавек едзе на двух колах, пачаў жагнацца і бараніцца імем Езуса.

Некалькі гадоў таму над нашым дваром з'явіўся паветраны балон. Кабеты, якія працавалі ў полі, пачалі кленчыць і маліцца, жагналіся самі, жагналі балон, бо палічылі гэта за нябесную з'яву, за якой прыйдуць голад, мор, вайна і пажары. Гэтыя людзі і цяпер жывуць.

[1] Верш надрукаваны, гл.: Kamiński, D. Na zgon Narbutta / D. Kamiński // Ziemia Lidzka. — 2003. — №3 (55).

[2] Аўтар — Даніэль Камінскі з маёнтка Сапунцы пад Радунню.

Тры гады таму зноў над намі з’явіўся паветраны балон. Мае кабеткі ўжо не жагналіся, а толькі глядзелі з цікавасцю. Я ім шмат расказваў, што паветраны балон — гэта не цуд, а вынаходніцтва чалавека.

Я ведаў аднаго старога, які вучыў дзяцей чытаць і пісаць і не браў за гэта грошы.

Успаміны Яна Сегеня[1]

Успаміны пра Ліду канца XIX стагоддзя

Каментар перад тэкстам унука аўтара — Януша Сегеня: «Напісаны Янам Сегенем сынам Нікадыма (1875—1973), маім дзедам, недзе каля 1960 года (хаця можа быць і шмат раней). Мае бацькі жылі ў Лідзе ў 1883—88 гадах, да пажару»[2].

Ліда — павятовы горад Віленскай губерні.

Тут быў развалены даўнейшы замак, сцены высокія, можа якіх з 10 метраў, а таўшчыня каля асновы недзе 1,5 м. паводле сённяшніх мераў.

Былі тут яшчэ і два кляштары адзін «Кармеліцкі», другі «Піярскі». Першы займалі вайсковыя ўлады. Там быў таксама клуб і жытло палкоўніка. У другім была царква і жытло папа Каяловіча.

Вялікая вуліца «Віленская» ідзе з поўначы на поўдзень. Другая вуліца якая ідзе на захад — «Каменка», таксама досыць вялікая і густа забудаваная.

Паралельна Віленскай вуліцы з заходняга боку была вуліца «Крывая», ішла ад рынку каля развалін замка на «Ферму».

Недалёка ад замка, пры касцельным пляцы быў ладны мураваны дамок. Гэта было «Казначэйства» (Скарбовая каса). За некалькі дзесяткаў метраў ад тога «Казначэйства» была вуліца «Замкавая», шырокая, можа 8 метраў,

---

[1] Набор на кампутару і першаснае рэдагаванне Януша Сегеня, унука аўтара.

[2] 6 кастрычніка 1891 г. ў Лідзе здарыўся яшчэ больш грандыёзны пажар, згарэла 3/5 горада, практычна ўся цэнтральная частка. У «Памятнай кніжцы» пісалася: *«Пажарам, які адбыўся з невядомай прычыны, знішчана 444 жылыя дамы і 283 халодныя пабудовы з рухомай маёмасцю пацярпелых (страты 679.408 р.). Пры гэтым згарэлі: архіўныя справы, кнігі і некаторыя бягучыя паперы: Паліцэйскай управы, павятовага спраўніка, З'езду Міравых суддзяў, прадвадзіцеля дваранства, З'езду Міравых пасярэднікаў, павятовай Прысутнасці па воінскай павіннасці, Дваранскай Апекі, Гарадской Управы, Сірочага Суда, Мяшчанскай управы і метрычныя сшыткі яўрэяў, якія захоўваліся ў казённага рабіна. 10 кастрычніка, у тым жа г. Лідзе, згарэлі, ад неасцярожнага абыходжання з агнём 10 жылых і 9 халодных пабудоў з рухомай маёмасцю пацярпелых (страты 53.635 р.)»* (Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1893 г. Вильно, 1892. ч. 2. С. 108.). Пажар 1891 г., між іншым, знішчыў пабудаваны ў XVIII ст. будынак Лідскай ратушы які стаяў на базарнай плошчы. Ратуша служыла вайсковай гаўптвахтай, а прыбудова — адрынай для пажарнікаў. Пасля гэтага пажару новая забудова Ліды ішла з улікам патрабаванняў пажарнай бяспекі Расійскай Імперыі.

да левага боку балота. На пагорку стаяў замак, а вакол яго багна (балота, гразь) і млынарскі стаў, вадзяны млын стаяў над рэчкай Лідзейкай пры Наваградскім тракце, які злучаўся з вуліцай Віленскай. Рэчка Лідзейка абцякала горад з усходняга боку. За рэчкай знаходзіліся вёскі Раслякі і Зарэчча. Зарэчча на сёння далучана да горада. Гэта паўднёва-ўсходні канец горада Ліды. Вось на тым Зарэччы пры вуліцы Гарыстай — вугал Мастоўскай знаходзіцца наш пляц зямлі 40 сажняў у даўжыню па вул. Мастоўскай і 18 сажняў у шырыню па вуліцы Гарыстай. Ідучы далей на поўнач даходзім да вул. Вызвалення, якая злучалася на мосце з вул. Віленскай. Ідучы далей у кірунку Вільні будзем мець Касцельную плошчу (пляц) (зараз плошча Свабоды, ці Волі), налева прыватныя дамы і заезд Ленскага. Пры ім вулачка, пераезд на вуліцу Крывую. Далей дамы яўрэйскія (паміж імі гатэль «Віленскі» Віленчыка), за ім кляштар кармеліцкі і сад да самай Каменскай вуліцы (зараз 3-га траўня). Па правым баку вуліцы Віленскай, як раз насупраць гатэлю стаіць парафіяльны касцёл, могілкі і фруктовы сад за ім пляцы і дамы п. Андрушкевіча, потым пошта конная, дом яўрэйскі і далей аж да вуліцы Лідскай, якая вяла да вёскі Раслякі (за рэчку).

Зараз вернемся на левы бок вуліцы Віленскай. Далей за паваротам на вуліцу Каменку будзе цэлы квартал прыватных дамоў яўрэяў, потым ідуць суконніцы або крамы (крамы з таварамі пераважна лакцёвымі (мернымі). Ззаду за імі рынак, які за аптэкай злучаецца з вуліцай Віленскай. Аптэка была ў доме пана Пясецкага, дом мураваны, двухпавярховы. На тым кавалку рынку, які прылягаў да вуліцы Віленскай быў адгароджаны невялікі пляц, а на ім невялікі дом для варты «Караульное здание» («Вартавы будынак»). Перад ім пры самай вуліцы стаяла паходная вайсковая каса і палкавы штандар (сцяг). Гэта пляцоўка была брукаваная і ўтрымоўвалася вельмі чыста. Як на праўду, то і ўся вуліца Віленская ад «Казначэйства» і да ліставой пошты была брукаваная і тут перад царквой у розныя святы і парадныя дні адбываліся ўсе парады і вайсковыя прэзентацыі.

Насупраць плошчы, каля рынку па левым баку вуліцы быў пляц і драўляны дом, але вельмі прыгожы, і вялікі падворак у кветках і ружах, быў там таксама і сапраўдны жывы, нават, не навязаны воўк, пострах для ўсіх дзяцей, асабліва яўрэйскіх. Быў гэта дом пана Буткевіча, маршалка павета.

Паліцэйская ўправа размяшчаўся ў доме Камянецкага, акурат насупраць аптэкі, гэта быў таксама будынак двухпавярховы, вялікі, мураваны.

Прыхадская вучэльня размяшчалася насупраць царквы ў доме пані Крахельскай. Яшчэ далей за лістовай паштай у другім доме Буткевіча была Дваранская Апека і Вайсковая Прысутнасць. Павятовая вучэльня была пры вуліцы Каменскай у доме пана Рудніцкага. Была таксама і вязніца пры той жа вуліцы Каменскай, толькі далей на захад, амаль на канцы горада — будынак дзяржаўны, існуе і зараз.

Ні адна вуліца акрамя Віленскай і часткі Каменскай не была брукаванай. Дамы малыя, драўляныя. Гразі і смецця сям-там па костачкі, у іншых месцах па калена.

У Лідзе ў той час стаяў полк данскіх казакоў. Трэба разумець, што ў горадзе размяшчаўся толькі штаб, а казакі з коньмі стаялі за горадам, займаючы гумны і стадолы для коней і сябе. З той нагоды шмат засталося казацкай натуры ў нашых вёсках.

Такі вобраз Ліды быў да пажару горада ў 1888–89 гг.

Успаміны ксяндза Бародзіча[1]

Ксёндз Юзаф Бародзіч, вікарый ў Лідзе (верасень 1898 — студзень 1899)

…атрымаў распараджэнне на перавод вікарыем у Ліду. Губернатар вырашыў, што ў Лідзе за мной будзе лепшы нагляд з боку мясцовай жандармерыі і асабліва праслаўленага палякажэрцы і ворага касцёла папа Каяловіча, які на працягу 40-ці гадовай «дзейнасці» шмат ксяндзоў саслаў у кляштары ці ў выгнанне. […]

Ліда з'яўляецца павятовым горадам і вузлавой станцыяй на перакрыжаванні чыгуначных ліній — Палескай і Сядлецкай[2]. Каля горада паўсюдна растуць хвойныя лясы, глеба пясчаная. У горадзе маецца старажытны, але ўбогі касцёл у раманскім стылі[3]. У мае часы яго знешні выгляд быў варты жалю, выглядаў касцёл сумна і занядбана, да таго ж быў ён замалы, бо не мог умясціць нават чацвёртую частку вернікаў. Лідская парафія налічвала да 18 тысяч душ[4]. Яшчэ да студзеньскага паўстання 1863 г. у Лідзе меўся багаты кляштар з прыгожым касцёлам, але ён быў замкнуты Мураўёвым[5].

Аб вяртанні кляштарнага касцёла[6] ці аб дазволе на пабудову новага лідзяне прасілі здаўна, але поп Каяловіч заўсёды ім перашкаджаў бо даводзіў губернатару, што гэта было б шкодна для праваслаўя.

На ўзгорку, недалёка ад касцёла, яшчэ стаялі руіны старога замка[7]. Але калі імі ніхто не будзе апекавацца, дзякуючы яўрэям і маскоўскаму гаспадараванню, хутка ад замка і следу не застанецца.

Мясцовы вясковы люд бедны, але яўрэі вельмі багатыя. Гандаль і прамысловасць знаходзіцца ў іх руках, і яны нават арандуюць маёнткі. Адзіны Лясковіч[8] гаспадарыць сам, чым дае добры прыклад суседзям, якія пуска-

[1] Pod wozem i na wozie: pamiętniki Józefa Borodzicza, czyli kilka lat pracy duszpasterskiej na Litwie, Białej Rusi i w głębi Rosyi. Kraków, 1911. S. 15–16.; 17–23.

[2] Сядлецкая лінія (зараз Маладзечна — Ліда — Масты) пачала працаваць толькі у 1906 г. — *Л. Л.*

[3] Маецца на ўвазе фарны касцёл пабудаваны ў другой палове XVIII ст. у стылі барока.

[4] У лідскую парафію ўваходзілі вернікі горада і значнай частцы павета.

[5] Маецца на ўвазе касцёл і кляштар піяраў, які пасля пажару 1843 г. не дзейнічаў і пасля 1863 г. быў перададзены праваслаўным.

[6] Відавочна, маецца на ўвазе касцёл кармеліцкага кляштара, які стаяў нядзейсны з часоў паўстання 1831 г.

[7] Сваявольная яўрэйская дзятва выломвае мур кавалкамі і скідвае ўніз замкавага ўзгорка.

юць свае маёнткі ў арэнду.

Да часоў Мураўёва ў Лідзе віравала гандлёвае жыццё, але пасля паўстання 1863 г. горад заняпаў і ўжо ніколі не вярнуўся да стану ранейшага росквіту.

У горадзе і ваколіцах урад замяніў некалькі касцёлаў на цэрквы, а людзей альбо сілай перавёў у праваслаўе альбо як «упартых», неміласэрна праследаваў[9].

Кожная вёска прымусова мусіла трымаць царкоўныя школы і настаўніка-русіфікатара. У гэтых школах сістэматычна ганьбілася каталіцтва і ўсімі спосабамі людзі намаўляліся да прыняцця праваслаўя. Папы раздавалі дзецям праваслаўныя абразы, медальёны і ўсходнія крыжыкі, прышчапляючы нянавісць да ўсяго каталіцкага.

Самыя руплівыя мае папярэднікі спрабавалі змагацца з гэтым ціскам русіфікатараў, але поп Каяловіч разам з жандарамі і паліцыяй заўсёды пазбаўляўся ад гэтакіх ксяндзоў і высылаў іх ці на пакуту (у кляштар — *Л. Л.*), ці ў выгнанне. Знайсці віну было не цяжка. Тым больш, што згодна з загадамі Мураўёва каталіцкае духавенства ў Літве павінна было служыць ураду ў якасці прылады для русіфікацыі краю і слепа падпарадкоўвацца бюракратыі. Хто паводзіў сябе па-іншаму, таго каралі.

Казанні ў касцёле дазволена было прамаўляць толькі пробашчу, але толькі з выдадзенай урадам кніжкі Бялабрэскага. За імправізацыі падчас казанняў ксяндзу пагражала суровая кара.

* * *

Калі я прыехаў ў Ліду, пробашчам, дэканам і катэхітам быў 60-ці гадовы стары — хворы і худы[10]. Не дзіва, што парафія была занядбана. Жывучы ў сталай небяспецы з боку паліцыі і папа, ён ратаваўся ад іх незвычайнай гасціннасцю. А яны злоўжывалі гасціннасцю пробашча гэтак моцна, што пры канцы яго плябанія замяніла ім рэстаран і дом картачнай гульні[11]. Сам гаспадар сядаў за картачны столік разам са сваімі гасцямі, каб адмыслова

[8] Верагодна, маецца на ўвазе ўладальнік маёнтка Кір'янаўцы Станіслаў Лясковіч.

[9] Гаворка ідзе пра прымусовае скасаванне уніі.

[10] Сянкевіч Юзаф, ксёндз-пробашч і дэкан у Лідзе ў 1889–1905 гг. Міхал Шымялевіч пісаў: *«У выказванні сваёй прыхільнасці да трону некаторыя ксяндзы перамагалі праваслаўных папоў. Лідскі дэкан Сянкевіч у святочныя дні аздобіў касцельную браму транспарантам, на якім была намалявана манаграма цара і царыцы з надпісам „Боже, царя храни“»*. Зараз перапахаваны на Слабадскіх могілках

[11] Жырмунскі ксёндз Генрык Бальцэвіч пісаў: *«Інтэлігенцыя не працуе з народам і ўвесь свой час праводзіць за картамі. Ксёндз ёсць „пажондным“ партнёрам калі не хапае чацвёртага. Карцёжная гульня ёсць адзіным нашым інтэлектуальным высілкам у правінцыі, цэнтрам гэтага руху часта ёсць плябанія а варштатам капланскай працы — зялёны столік. За картамі, „інтэлектуальнай“ ежай служаць плёткі, „тоўстыя“ нясмешныя анекдоты і ў самым лепшым выпадку палітыка, якая разумеецца на газетным узроўні»* — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. Monachium, 1905. S. 67.

прайграць ім грошы і такім чынам даць хабар. Таму з'яўляўся кавалерам розных ордэнаў імперыі і нават адзначаны манархам крыжам з надпісам: *«Доброму пастырю за хороший пример»*[1].

Горш было з вікарыямі, асабліва з тымі, якія не жадалі падпарадкоўвацца «ўставам» Мураўёва. Ксёндз-дэкан гамаваў запал маладых і даваў ім бацькоўскія парады:

— Асцярожна, — казаў.

— Мой дарагі, за табой ужо жандары сочаць, поп данёс. І, што? Кар'еру сабе сапсуеш і мне клопату наробіш!

Відавочна, адразу пасля прыезду ў Ліду, ксёндз-дэкан накіраваў мяне з візітам да спраўніка Ляўданскага[2]. Гэты чыноўнік прапанаваў мне прыняць яго пратэкцыю і прачытаў лекцыю пра лаяльнасць і правільныя думкі. Пры гэтым страшыў, што ў адваротным выпадку я буду мець цяжкія наступствы. У канцы падабрэў і ласкава прапанаваў мне быць паслухмяным, бо, пэўна, я ёсць *«лепш выхаваным»* ксяндзом, чым мой папярэднік, г. зн. — менш «фанатычным». Пры гэтым не забыўся нагадаць мне, што *«рука руку мые»*, што кожны вікарый павінен плаціць яму па сто рублёў штогод за яго працу па абароне вікарыя перад губернатарам.

Пасля спраўніка прыйшла чарга папа (Каяловіча — *Л. Л.*). Гэты мне прама сказаў, што трэба падпарадкоўвацца ўладам і быць вольным ад усялякага «фанатызму»:

— Тутэйшыя людзі спяць, — сказаў ён. — Няхай спяць, і не трэба іх будзіць!

Афіцэр жандармерыі прыняў мяне з вялікай пачцівасцю і засведчыў, што мне ў Лідзе будзе добра, калі я буду «ўмець жыць».

* * *

Такімі былі мае першыя крокі на гэтай пасадзе.

Прадставіўшыся ўладам, я змог пачаць працаваць з людзьмі. Слухаючы споведзі, менавіта тут першы раз пачуў *беларускую мову* (курсіў мой — *Л. Л.*), якую да гэтага часу цалкам не ведаў. Мне яна падалася дзіўна сумнай, але

[1] Той жа Генрык Бальцэвіч пісаў: «*У Гародні, на такой важнай пляцоўцы, з усіх бакоў абкладзенай праваслаўем і русіфікацыяй, дэканам ёсць разбэшчаны пошукам выгады ксёндз, скончаны сібарыт, адзінай мэтай якога ёсць падабацца ўраду. Ва ўсіх павятовых гарадах нашай дыяцэзіі сядзяць дэканы альбо рашуча праўрадавыя (Ясевіч, Сайкоўскі), альбо несвядомыя прылады ў дзяржаўных руках (Сянкевіч, Карвоўскі, Шымкевіч, Дзякевіч). У іх касцёлах народ не мае нічога ні для сэрца, ні для розуму. Касцёлы брудныя, казанні ніжэй крытыкі, хораў, гэтага магутнага сродку прыцягнення народа да касцёла, няма, арганы лямантуюць аб божай помсце, касцельныя служкі жывуць у п'янстве і распусце, а ксяндзы — рэнегаты ці сібарыты — збіраюць грошы*». — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 65.

[2] Лідскі спраўнік Сцяпан Мацвеевіч Ляўданскі. За сваю службу атрымаў розныя адзнакі і быў узнагароджаны ордэнам Уладзіміра 3-й ступені. — Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1903 г. Вильно, 1902. ч. 3. С. 58.

беларускі народ спадабаўся мне сваёй незвычайнай пачцівасцю. Ён на дзіва шчыры і ўдзячны, калі ставішся да яго з добрым сэрцам і прыхільнасцю[1].

Адразу зразумеў, што старыя і малыя цалкам не ведаюць пацераў. Пра катэхізіс, відавочна, не было нават і мовы.

Паколькі я не меў права навучаць народ з амбона, пачаў штонядзелю і на святы катэхізаваць людзей з алтара, а таксама кожны раз, калі мяне выклікалі да хворага. З цяжкасцю сабраў 600 дзяцей. Пасля двухмесячнай навукі, адбылася першая, самая вялікая да гэтага часу ў Лідзе ўрачыстасць першай св. камуніі.

* * *

У той час адбыўся інцыдэнт, які напужаў увесь горад. З касцёла знік партрэт маскоўскага князя Аляксандра Неўскага, «святога», непрызнанага Рымам, які быў размешчаны ўнутры касцёла ў часы Мураўёва (увесь сказ перакладзены гэтак, як у аўтарскім тэксце — *Л. Л.*). Пачалося следства. Нікога не знайшлі, але падазрэнне скіравалася на мяне, і жыццё маё адразу пагоршылася, нават нягледзячы на тое, што даў спраўніку «ў лапу» 19 рублёў, каб супакоіўся[2].

Тады ж закончылася пераробка кляштара ў расійскі клуб[3]. На яго адкрыццё арганізавалі вечарыну з танцамі і запрасілі гасцей, між іншых і ксяндза-дэкана разам са мной. Усімі спосабамі я спрабаваў адмовіцца ад удзелу ў гэтай урачыстасці, але ксёндз-дэкан загадаў ісці разам з ім. У апошнюю хвіліну я змог уцячы ў касцёл і там схавацца. Ксяндзу-дэкану давялося ісці аднаму і глядзець на гульні расійскай моладзі ў месцы, дзе раней маліліся манахі. Маё ж становішча яшчэ больш пагоршылася.

* * *

А працы для мяне меней не стала: удзень спавядаў, а ўначы ездзіў да хворых. Хаваць нябожчыкаў дапамагалі папы... Так, менавіта папы! Нічога дзіўнага. Бо за кожнага, навернутага ў праваслаўе, урад плаціў ім па 50 рублёў! Таму яны прыкладалі ўсе намаганні, каб як мага больш перахапіць сабе, хоць бы і нябожчыкаў. Паліцыя ім у гэтай справе дапамагала. Бывала і так, што ксёндз адпраўляў на могілкі цела каталіка, а поп апрануты ў «царкоўныя рызы» з паліцыяй перахоплівaў хаўтуры па дарозе і хаваў нябожчыка, як ужо праваслаўнага. Што не зробіш, каб атрымаць 50 рублёў[4]. Ксёндз саступаў, бо за супраціў паліцыі яму пагражала выгнанне ці кляштар.

Пераважна гэтак адбывалася ў вёсцы Дакудава, дзе касцёл замянілі

[1] Успаміны пісаліся ў той час, калі летувіс па паходжанню, кс. Бародзіч не быў яшчэ «беларусажэрцам» і таму цалкам аб'ектыўна пісаў пра лідзян, як пра беларусаў.

[2] У сваіх успамінах, надрукаваных у 1928 г., кс. Бародзіч піша, што менавіта ён сам асабіста спаліў абраз Аляксандра Неўскага. — Гл: X. kan. J. Borodzicz. Kresy Wileńskie w niebezpieczenstwie. Wilno, 1928. S. 6.

[3] Маецца на ўвазе кляштар кармелітаў.

[4] Не магу не заўважыць, што гэта новыя «Мёртвыя душы» па-беларуску.

на царкву, але «ўпартыя» ездзілі ў Ліду за 30 км[1]. Каб пазбегнуць адказнасці, людзі хавалі сваіх памёршых нават без ксяндза. Бывала, што паліцыя і наўпрост забараняла ксяндзу ехаць на пахаванне. Так, напрыклад, калі ў 1899 г. памерла спадарыня Нарбут — жонка Тэадора Нарбута і маці Людвіка, ксяндзам было забаронена прыехаць, каб высвеціць труну і магілу. Сям'я і людзі пахавалі нябожчыцу ў маёнтку Шаўры[2].

* * *

Уплыў папоў на каталіцкае насельніцтва не застаўся без згубных вынікаў: у самім горадзе давала аб сябе знаць рэлігійная абыякавасць. З-за вайсковай службы, а таксама царкоўных школ, моладзь размаўляла па-рускy, а мясцовы поп часта наведваў ваколічныя вёскі, пры гэтым заходзіў у кожную хату і раздаваў «иконы» і медальёны. Такім чынам вёска і сяляне страчвалі сваю рэлігійную самасвядомасць.

Зразумела, што горшыя ўзоры паводзін духоўнай і свецкай улады знаходзілі сваіх руплівых паслядоўнікаў. У нашым народзе шырылася п'янства, распуста, людзі пачалі верыць ва ўсялякія забабоны, множылася звадніцтва, а крадзёж стаў звычайнай справай. Дайшло да таго, што большая частка парафіянаў не наведвала касцёл і не прыступала да Святых сакрамантаў[3].

Што мне было з гэтым рабіць? Як ратаваць загубленыя душы? Як дагрукацца да іх?

---

[1] З вёскай Дакудава справа больш складаная, чым піша ксёндз Бародзіч. Зразумела, што ўніяцкая (грэка-каталіцкая) царква пасля 1839 г. стала праваслаўнай, а грэка-католікі пачалі лічыцца праваслаўнымі. Але ў Дакудаве, як у былой Радзівілаўскай маёмасці, так званых «Нойбургскіх маёнтках», раней меўся пратэстанцкі збор, які недзе ў XVIII ст. быў заменены на касцёл. У 1784 г. у гэтай вёсцы ёсць уніяцкая царква і касцёл філіяльны лідскаму. У першай палове XIX ст. касцёл ужо зачынены, але ў спісах парафіян-уніятаў ад 1829 г. яшчэ запісана шмат іх сваякоў рыма-католікаў. На пачатку XX ст. Дакудава — ужо чыста праваслаўная вёска. Стымул у 50 рублёў (добрыя скураныя боты ў той час каштавалі меней за 3 рублі) усё ж працаваў.

[2] Становіцца зразумелым, чаму сам Тэадор Нарбут пахаваны каля Нацкага касцёла, а яго жонка і дзеці асобна.

[3] Прыкладна ў той жа час ксёндз Генрык Бальцэвіч з Жырмун пісаў: *«Пабожнасць нашага люду я назваў бы паганскім хрысціянствам. Рэлігійныя абрады выконваюцца досыць скрупулёзна, а ў жыцці — паганскі дух. Народ ходзіць у касцёл, спавядаецца, штодзённа адмаўляе пацеры, цалкам адбывае пасты і адначасова поўны ўзаемнае незычлівасці, цешыцца з чужога гора, не шануе чужой уласнасці, падпаламі сее нянавісць паміж суседзяў, сваркамі і праклёнамі робіць пекла з сваёй сям'і. Наш звычайны селянін будзе засмучаны з-за страты ружанца ці з таго, што сплюне пасля камуніі, але без усялякага сумнення ўлезе на чужы луг, ніву, лес, абкрадзе брата, будзе за рубель ці кілішак фальшыва сведчыць у судзе, грошы, пазычаныя без сведак, не верне, будзе крыўдзіць удаву і сірот, і пры тым ніхто не абароніць слабых, бо прызвычаіўся да пакутаў бліжняга і шануе толькі сілу. Адзін селянін скраў кавалак сала, але гэта была пятніца і таму не еў гэтае сала ні ў той дзень, калі скраў, ні ў наступны і толькі ў нядзелю пачаў есці тое, што скраў. Іншага злапалі, калі пасвіў быдла на чужой ніве, ён пры гэтым меў ружанец і маліўся».* — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 68.

Самай лепшай нагодай для працы з людзьмі сталася для мяне каляда[1]. Пачаў аб'язджаць парафію і наведваць вёску за вёскай, хадзіць ад дома да дома. Трымаўся наступнага плану: прыехаўшы ў вёску першы раз (а вёскі былі вельмі вялікімі), ішоў ад хаты да хаты і на пачатку свянціў хату, а потым кожнага экзаменаваў на веданне катэхізіса. Пасля чаго аглядаў падарункі папоў і заканчваў запрашэннем сабрацца ўсім у зручным месцы. Тут, узяўшы іх усіх у свае рукі, прыкладаў усе сілы, каб разбудзіць іх сумленне, накіраваць да святой веры і растлумачыць, якімі шкоднымі для іх з'яўляюцца царкоўныя школы. Заўсёды рабіў націск на тое, каб прыбралі розныя праваслаўныя медальёны, іконы і замест іх сам раздаваў сялянам абразы. Патрабаваў, каб пільна хадзілі ў касцёл.

Гэтак аб'ехаў усю парафію. Але як толькі закончыў гэтую справу, на мяне ўжо гатова была скарга — чуйны поп (Каяловіч — *Л. Л.*) пра кожны мой крок даносіў губернатару. Пачаліся «справки», следства і допыты.

Мне пагражала вязніца. Каб уратаваць мяне, біскуп раней выраку ўладаў перавёў мяне вікарыем у Трокі.

Перад выездам з Ліды, у дзень Трох Каралёў, развітаўся з гасцінным беларускім людам[2]. Весткі пра мой перавод вернікі сустракалі енкам і плачам. Усе хацелі, каб я не спяшаўся з ад'ездам. Відавочна, я не мог ім гэта абяцаць, бо справа ад мяне не залежала. Тады вернікі атачылі мяне ў плябаніі і сказалі, што нікуды мяне не адпусцяць, покуль з Вільні не вернецца лідская дэлегацыя да біскупа, якую яны выслалі, каб ратаваць мяне.

Тады ж у плябанію прыйшоў спраўнік і жартам звярнуўся да мяне з вершам:

За Лидские пороки, едете в Троки
А с Трок — прямо в острог.

Потым выдаў мне білет на вольны праезд па Менскай губерні і загадаў, каб я паціху выйшаў праз заднія дзверы плябаніі і гародамі ішоў на вакзал. На вакзале мне была выдадзена інструкцыя пра тое, што мне трэба хавацца ад парафіян і таму я паеду кружной дарогай ў напрамку Менска — на станцыю Нёман[3]. Там я дачакаюся цягніка ў бок Вільні і гэтак даеду да біскупа. У Нёмане прайшлося чакаць усю ноч. Каб я мог адпачнуць, начальнік станцыі[4] выдзеліў для мяне асобны пакой. Я лёг на канапу і хутка заснуў. Тады адбылася дзіўная рэч — мяне нешта разбудзіла, і я ўбачыў, як

[1] Аднак кс. Бальцэвіч адзначаў, што «*„візіта парафільяная“, ці так званая ў нас „каляда“, ці ж не ператварылася яна ў нас у напаўненне капланскіх торбаў і кішэняў?*» — Цыт. па: Bolcewicz Henryk. Stosunki kościelne na Litwie: listy otwarte księdza do księży. S. 79.

[2] Цікава, але ў 1920-я, кс. Бародзіч ужо б ніколі не назваў лідскіх рыма-католікаў беларусамі.

[3] У той час праз Ліду яшчэ не прайшла Полацк — Сядлецкая чыгунка, і ў Менск трэба было ехаць праз Баранавічы.

у пакой уваходзіць жандар, бярэ графін, які стаіць каля мяне на стале і паднімае яго ўверх. З станцыйнай платформы праз вакно ў пакой пранікала дастаткова свету, каб усё гэта было добра бачна. Я вырашыў, што жандар хоча мяне ўдарыць і закрычаў. Жандар пра маё знаходжанне тут не ведаў і таму аслупянеў ад страху, пасля чаго, разбіўшы графін, упаў на падлогу і нават званітаваў. На мой крык збегліся чыгуначнікі разам з начальнікам станцыі. Усе яны аслупянелі ад здзіўлення, калі ўбачылі на падлозе непрытомнага жандара. Потым стала вядома, што жандару пра мяне ніхто не расказаў, а ў пакой ён зайшоў, каб папіць вады.

Тым часам вернікі даведаліся, што мяне ўжо няма ў Лідзе. Не паверыўшы гэтаму, народ зноў прыйшоў у плябанію, абшукаў усе закуткі і толькі тады пераканаўся ў праўдзівасць чуткаў. Узнялася вялікае абурэнне, але рабіць нешта ўжо было позна. Разышліся па хатах.

[4] З 2 снежня 1895 года начальнік станцыі Нёман — Міхаіл Андрэевіч Сёмушкін, *«скончыў Маскоўскую павятовую вучэльню, праваслаўнага веравызнання»*. Гл: Памятная книжка Виленской губернии на 1900 г. Вильно, 1900. ч. 1. С. 107.

Успаміны Міхала Шымялевіча

Міхал Шымялевіч (18.X.1879 — 11.01.1969). Лепшы лідскі гісторык XX ст. Нарадзіўся з вёсцы Пяляса, адукацыю пачаў ў Лідскай павятовай вучэльні. У 1901 г. малады Шымялевіч працаваў у Лідскай судова-міравой акрузе, канцылярыі з'езду міравых суддзяў, памочнікам сакратара.

Верагодна першай надрукаванай працай Шымялевіча была кніга «Горад Ліда і Лідскі замак», 1905. Далей выдаў кнігу: Szymielewicz Michał. Szkice etnograficzne o Tatarach litewskich. 1906. Шимелевич М. Литовские татары. Вильно, 1906. і «Szymielewicz Michał. O tatarach w powiecie lidzkim. Lida. 1914.» (верагодна, усе кнігі на рускай мове).

З 1905 па 1908 г. прозвішча чыноўніка Шымялевіча знікае з даведнікаў Віленскай губерні, вядома, што малады гісторык-аматар атрымаў грант ад гістарычнага таварыства для вучобы ў Кракаве, верагодна, у знакамітым Ягелонскім універсітэце. Атрымаўшы вышэйшую гістарычную адукацыю ў еўрапейскім універсітэце, вяртаецца ў Ліду.

Здаў дадатковыя экзамены і з 1910 г. па 1939 г. зарабляў на жыццё прыватнай юрыдычнай практыкай. Вёў справы большасці маёнткаў вакол Ліды і меў вялікія магчымасці вывучаць гістарычныя архівы шматлікіх сем'яў.

У 1914 г. пачалася Першая сусветная вайна і ў 1915 г. Шымялевіч пакінуў родны горад, стаў бежанцам. Пасля 1918 г. вярнуўся ў Ліду і перажыў усе навальніцы якія прайшлі праз наш горад.

9 лістапада 1922 г. была абрана першае польскае Лідскае Павятовае самакіраванне у складзе: Павятовы аддзел і Павятовы сеймік. Сярод 6 членаў Павятовага аддзела быў і Міхал Шымялевіч. Гэта значыць, што гісторык адразу патрапіў у «вярхі» польскай павятовай улады. Але пасля стварэння ў кастрычніку 1926 г. у Лідзе гуртка «Таварыства беларускай школы» Міхал Шымялевіч стаў сябрам гэтай арганізацыі. У 1927 г. сябар ТБШ Міхал Шімялевіч выбіраецца ў Гарадскую раду.

У 1936—1939 гг. Шымялевіч быў сябрам рэдакцыйна-выдавецкага камітэта часопіса «Лідская зямля» («Ziemia Lidzka»), дзе ён апублікаваў каля 30-ці бліскучых краязнаўчых артыкула, яго матэрыялы друкаваўся у кожным нумары. Тэксты Міхала Шымялевіча атрымалі агульнае прызнанне. Віленская прэса пры канцы 1930-х гг. адназначна вылучала Шымялевіча сярод усіх аўтараў «Лідскай Зямлі» і называла «лепшым знаўцам Лідскай гісторыі і нястомным збіральнікам мясцовых народных звычаяў».

У 1940 г. Міхал Шымялевіч быў вывезены ў Казахстан, ягоны дом плошчай 71,41 м² у Лідзе быў канфіскаваны. Найвялікшую каштоўнасць меў велізарны архіў гісторыка і таму адмыслова дасланыя ў Ліду выкладчыкі БДУ з Мінска пачалі займацца апрацоўкай архіваў Шымялевіча. Яго архіў згарэў разам за цэнтрам горада ў 1941 г.

Цудам выжыў. Пасля 1948 г. жыў у Сопаце. Напісаў некалькі каштоўнейшых прац якія былі дэпанаваныя ў Бібліятэцы імя Асалінскіх ва Ўроцлаве, у горадзе дзе жыла яго дачка.

Міхал Шымялевіч — сапраўдны культурны герой Лідчыны. Ягоным імём трэба было б назваць адну з вуліц нашага горада, а магчыма і адну з установай культуры ці асветы — напрыклад музей а можа гарадскую бібліятэку, гімназію ці ліцэй.

З таго свету[1]

Хто ў Лідзе не знаў старога Казіміра Вісманта?

50 гадоў таму быў гэты чалавек яшчэ ў росквіце сіл, трохі сіваваты, трохі лысаваты, але шыракаплечы, румяны і да жанчын цікаўны. Яго белая хатка пад саламяным дахам, атуленая галінастай ліпай, стаяла на Вісмантах[2] пад Лідай і пры абсаджаным бярозамі навагрудскім гасцінцы была добра бачная ад самых парафіяльных могілак. За хаткай стаяла малая абора, а трохі далей — добра пабудаванае гумно. Хатку атачала прызба[3] з каменю, на якой было так прыемна пасядзець вечарам і, папіваючы смачны квас з бярозавага соку[4] альбо яшчэ цёплае малако, паразмаўляць пра былое.

[1] Szymielewicz Michał. Z tamtego świata // Ziemia Lidzka. 1937. №11. S. 117–120.

[2] Вісманты — тэрыторыя на поўдзень ад каталіцкіх могілак, якая прымыкае да сучаснага праспекта Пераможцаў. У 1507 г. паляўнічы Захарыяш Кузьміч атрымаў ад караля Жыгімонта 6 валок (128 гектараў) зямлі на паўднёвай ускраіне горада. Гэтая мясцовасць па меншай меры да 1717 г. так і называлася — Кузьмішкі. У 1668 г. Кузьмішкі перайшлі ва ўласнасць Аляксандра Вісманта. Пазней Кузьмішкі былі падзеленыя паміж шматлікімі сваякамі і пачалі называцца Вісманты. У 1797 г. у Вісмантах былі закладзеныя могілкі, якія ў наступныя паўтара стагоддзя служылі месцам супакаення каталіцкай шляхты. Род Вісмантаў займаў высокія пазіцыі ў лідскай эліце. Лявон Пётр Вісмант у 1906–1914 гг. быў бурмістрам горада.

[3] Прызба — збудаванне-насып уздоўж вонкавых сцен па перыметры драўлянага дома, служыла для засцерагання пабудовы ад прамярзання зімой. Можа быць проста земляны насып уздоўж сцен. У больш прасунутым варыянце ўладкоўваўся з каменю, дошак (якія для прыгажосці часам нават бялілі вапнай) або жэрдак, установленых на адлегласці 30–50 см ад сцен хаты; паміж дошкамі і хатай засыпалі пілавінне, салому, кастрыцу, шлак, торф, зямлю (дзёран). Вышыня прызбы — да другога рада бярвення.

[4] Выраб смачанага кавасу з бярозавага соку Шымялевіч апісвае ў артыкуле «Бярозавы

У старога ў хатцы пад столлю стаяла скрынка, поўная старых пажоўклых папер пісаных і па-славянску (па-старабеларуску. — *Л. Л.*), і па-польску. Паперы памяталі яшчэ часы караля Аляксандра Ягелончыка, калі пазнейшая ваколіца Вісманты называлася «імём Кузмянамі альбо Кузмішкамі… пад самай Лідай за замкам гаспадарчым ляжачай» і стала ўласнасцю гаспадарчага баярына Лук'яна Гайкі, ці Гаеўскага. Потым, у 1668 г., тут асеў землеўладальнік са Жмудзі пан Аляксандр Вайцехавіч Вісмант, ад якога і пайшоў род Вісмантаў лідскіх. Пра гэта сведчыў прыхаваны ў скрынцы вывадны дэкрэт Дэпутацыі Літоўска-Віленскай ад 12 студзеня 1799 г. з ладна намаляваным гербам Сас: «Жоўты маладзік на тарчы двума рагамі павернуты ўгору, на кожным яго рагу па залатой шасцікутнай зорцы, а з сярэдзіны яго ляціць уверх страла, у блакітным полі, на шлеме над каронай пёры паўліна прабітыя стралой управа». Стары Вісмант ведаў на памяць свой вялікі шматаркушовы радавод з ўсімі датамі і памятаў шмат цікавых гісторый. Яго бацька калісьці хацеў выгадаваць з сына паважанага чалавека і нават запісаў яго ў дваранскую школу ў Лідзе, але пану Казіміру неяк не пашанцавала і застаўся ён паважным земляробам на ўласнай зямлі. Меў ён трошкі болей за дваццаць гадоў, калі ў 1863 г. шляхта Лідскага павета ўзяла свае крамнёвыя стрэльбы, пісталеты і ржавыя шаблі і кінулася на прыгнятальнікаў. З той вайны пан Казімір выйшаў чыста, суха і гладка. Нават без падазрэнняў. Але пра вайну ніколі не распавядаў, бо пра «польский мятеж» расійскія ўлады ніколі не забывалі і ўспамінаць пра ўдзел у тых падзеях заўжды было небяспечна. Праз трыццаць гадоў пасля той вайны, калі пан Казімір ужо састарэў і стаў больш пабожным, чым у маладосці, бычылі яго, як пехам у пакоры пайшоў ён з Ліды, абносячы ад пробашча да пробашча цыдулку лідскага ксяндза Юзафа Сянкевіча — пастырскую візітацыю ксяндза-біскупа Аўдзеевіча, якая павінна была адбыцца ў дэканаце. Што здарылася? Ніхто не разумеў, толькі ўжо пасля смерці нехта, можа Станіслаў Калясінскі з Трацьякоўцаў, шапнуў камусьці з маладых, што пан Казімір меў нібы на сваім паўстанцкім сумленні ўдзел у экзекуцыі нейкага карчмара, ці ў Майстроўцы каля Цыбараў, ці ў іншай карчме, карчмара, прысуджанага паўстанцкім судом за даносніцтва.

У пана Казіміра быў сын, якога ён вучыў на арганіста, і ажно чатыры дачкі. Гэта былі часы, калі пачыналася будоўля чыгункі з Вільні на Роўна. Да гэтага часу Ліда была кутом, забітым дошкамі ад астатняга света. Пры будаўніцтве дарогі наплыла тут рознай басоты, пачалі рэзаць багацейшых ксяндзоў па плябаніях, нападаць на адзіночныя хутары. Часы былі страшныя. Да пана Казіміра вечарамі хадзіла на пасядзелкі і размовы лідская прыгарадная моладзь: вядома, у доме тры дарослыя дачкі і чацвёртая, Броня, ужо ўбіваецца ў пёры. Пан Казімір кожнага любіў пачаставаць тытунём і тым больш быў задаволены, калі той, каго пачаставаў, голасна чхаў. Ча-

сок».

сам, вечарам у нядзелю, вялікая кампанія гуляла ў «злапай курыцу» (цёця-бабка), «у суседа» (рух цэлай кампаніі), «спаведніка» і г. д. Часам распавядалі ўсялякія цікавыя гісторыі, выпадкі ў горадзе, анекдоты, байкі, жахі альбо пра чары ці пра Пінокіа, ці якім іншым лялькаводзе. Часам маладзёны дэкламавалі «Kiwona męczenika bożego»[1], «Uchwałę gromady żydowskiej o oddaniu syna Chaśki w soldaty» за тое, што не хадзіў у лазню, альбо такія вершы, як «Панскае ігрышча» ці «Адказ на панскае ігрышча» і іншыя, якія праз нейкі час былі надрукаваныя ў Кракаве ў кніжачках Мацея Бурачка[2]. Нярэдка прыходзілі з гармонікам і тады танчылі на глінянай падлозе кадрыль, лансье[3], польку, мазуркаву польку і вальс. Для забавы хлопцы любілі танчыць «мікіту», перакладаючы ногі праз кій, які трымалі ў руках, і пры гэтым прыпяваць: «мікіта, чы ты та». У карты не гулялі, толькі ў мужчынскім таварыстве бавіліся ў «шэсцьдзесят шэсць», «воза», «кіксу», а разам з паненкамі — на картах гадалі. У звычайны дзень у пана Казіміра ўвечары служыла для асвятлення наша родная каханая лучына, а ў святочны дзень — газавая лямпа, напачатку — капцілка без шкла, а потым, калі газа ў вялікай колькасці з'явілася ў продажы ў Вільні і Лідзе, — са шклом.

Дзень Усіх Святых лічыцца жалобным святам. Так ужо павялося, што на Усе Святыя і на Дзень Задушны ані вяселяў, ані хрэсьбін не робяць. Сабраліся ўвечары таго дня, як звычайна, у пана Казіміра некалькі маладых хлопцаў і пачалі апавядаць пра тое і гэтае, пра святых, пра нябожчыкаў, пра жахі, пра ксяндза, які з'яўляецца ў сутарэннях палаца ў Дворышчы, пра бледны агонь, які пастаянна блудзіць стала каля Няцечы, і пра іншыя цікавыя рэчы. Было каля адзінаццаці вечара, калі хтосьці з Расаловічаў кінуў словы пра тое, што ў гэтую пару, пэўна, ніхто з кампаніі не меў бы адвагі пайсці на могілкі і прынесці сюды, у дом, напрыклад, крыж з магілы. «А ты бы пайшоў?» — запыталі ў Расаловіча. «Аёй, чаму не? Што дасцё

[1] Легенда пра Ківона, Божага пакутніка, гл.: Kiwon: Pociech, żywot i śmierć Kiwona bożego, męczennika żydowskiego. Bracia Worzałłowie, 1913.

[2] З гэтых некалькіх радкоў выцякае, што вершы Францішка Багушэвіча мелі папулярнасць яшчэ да выдання ягоных кніжак, перапісваліся і чыталіся падчас вячорак. Вядома, што паэт быў знаёмы з польскай пісьменніцай Эліза Ажэшка і наведваў яе ў Гродна. Ажэшка пісала ў пісьме да Яна Карловіча з Гродна 02.11.1887 г.: *«Тры тыдні таму назад быў у мяне добры Ваш знаёмы з Вільні п. Багушэвіч. Вельмі прыемна правяла я з ім некалькі гадзін. Ён мне чытаў свае беларускія паэзіі дый нават даў мне адпісы з іх з асобным вершыкам, гэтак сама па-беларуску …. Ці-ж ня праўда, што гэты рэчы вельмі харошыя, маюць нейкае асаблівае харство, і мяне вельмі цікавіць, ці здолеюць іх зразумець дый засмакаваць у іх нашыя сяляне? Будучым летам папрабую чытаць іх маім міневіцкім знаёмым»* (Гл.: Талочка Улад. Фр. Багушэвіч і Э. Арэшчыха // Запісы Беларускага навуковага таварыства. Вільня, 1938. Сш. 1. С. 35.*)*. Як бачым пры канцы 1887 г. вершы Багушэвіча яшчэ невядомы на радзіме і Эліза Ажэшка яшчэ толькі плануе іх «пусціць у народ» — перадаць сялянам свайго маёнтка ў Мінявічах. А першая кніга паэта, «Дудка беларуская», выходзіць у Кракаве ў 1891 г.

[3] Лансье — англійскі парны бальны танец, блізкі да кадрылі, складаецца з пяці фігур.

за гэта?» Пачалі таргавацца. Казалася пра кварту гарэлкі, пра рубель, нават пра кварту тытуню, але ні да чаго не дамовіліся. Раптам, калі гандляваліся за фунт цукерак, з цёмнага кута адазвалася Броня — та, наймалодшая.

— Я пайду і прынясу вам крыж, а што за гэта дасцё?

— Ты?.. Сікша! А што хочаш?

— Дайце фунт цукерак і дакажу, што не сікша! Яшчэ, халера, лаецца!

— Ваў!

— Але пабажыцеся, што не ашукаеце.

— Даліпан, — пабажыўся Расаловіч.

— Не, ты пабажыся па-сапраўднаму, па-каталіцку, скажы «далібог» і стукні сябе ў грудзі.

Усе засмяяліся, толькі Расаловіч зрабіў міну, быццам усё гэта несур'ёзна, ударыў сваёй правай рукой сталяра ў грудзі і вымавіў — «далібог!».

— Вось і пайду, вось і пайду…

Босая, у адной сукенцы, накінула хустку і, стукнуўшы дзвярыма, знікла. «Куды яна пойдзе, палова вярсты да магілах, дойдзе да брамы, пастаіць пад кутом і вернецца дахаты», — закончыў стары пан Казімір, усе праз хвіліну забылі пра спрэчку і пачалі размаўляць пра іншае.

Вісела чорная лістападаўская ноч. Зімны вецер шумеў і рваў голае галлё бярозаў на гасцінцы, раз-пораз кідаў у твар жмені мокрага восеньскага дажджу. Са Слабады даносіўся жалобны вой сабакі. Броня адважна выйшла на гасцінец, мінула вісмантаўскі выган, вайсковыя склады, гмінныя збожжасховішчы і падышла пад самыя могілкі. Навобмацак спусцілася ў роў, залезла на муры і слізганула па мокрых і халодных камянях муроў на могілкі. У могілкавых соснах вецер шумеў яшчэ страшней, дзесьці з боку пастуквала галінка дрэва, а над могілкавай капліцай заплакала сава. Фунт цукерак!.. Фунт цукерак!.. У каляровых паперках з залатымі літарамі. Карамель! Кожная з ягадкай! Пасунулася наперад і, расставіўшы рукі, навобмацак пачала шукаць. Галлё шыпшыны і язміну хвасталі і калолі яе твар і рукі. Ёсць! Намацала крыж. Але ён аброс імхом, стары і вялікі. Ня гэты. Пайшла далей. Зноў вые вецер, плача сава, зноў тыя ж шыпшына і язмін. Чарговая магіла з старой і крывой агароджай. Зноў крыж, але гладкі, новы, толькі такі сама цяжкі. Яшчэ адзін упарты рух наперад — і зноў крыж. Рухам рукі абмацала — гладкі, не вялікі, роўны з ёй ростам. Наступіла на свежую, яшчэ мяккую магілу, упёрлася рукамі ў мокрыя канцы крыжа і адчула, што крыж паддаўся і пахіліўся. Ухапілася і ўсім целам адкінулася назад — крыж нахіліўся разам з ёй. Яшчэ раз і з паваротам, яшчэ і з паваротам. А цёмна, аніц не бачна. Падважыла крыж плячом знізу, ірванула ўверх і крыж нахіліўся. Ухапіла крыж за плячыма, пахіліла ўправа і ўлева і пачала цягнуць з зямлі. Крыж доўгі і, здавалася, біўся аб труну. Але вырвала. Хапіла абедзвюма рукамі, павярнула і таўканула ўбок, туды дзе бачны чорныя дрэвы. Зноў магіла, знаў агароджа, мур, роў, гасцінец. Ухапіла крыж рукамі і па-

пёрла наперад. Фунт цукерак! Вецер свістаў і падганяў яе ў спіну, крыж шараваў па мокрым пяску, а яна ўжо бегла. Што здарылася? Праз шум дрэваў пачула як быццам крыкі: Броня! Была ўжо насупраць выгану. І яшчэ раз: Броня! Ці гэта голас маці? А дадому яшчэ так далёка. Першы раз цапнуў яе за плечы мароз, і адчула страх. Хутчэй, хутчэй, але ногі не слухаюцца. А тысячы галасоў адусюль крычалі: Броняяя! Уляцела з крыжам на падворак, дрыжачымі рукамі адчыніла дзверы сяней, грымнула хатнімі дзвярыма і, непрытомная, уварвалася ў хату. Крыж упаў з яе рук і сама яна, белая як крэйда, абсела каля крыжа на гліняную падлогу.

Езус-Марыя, крыж! Аслупянелі ўсе, хто быў у хаце. Крыж з могілак! Ратуйце Броньку! Страціўшую прытомнасць Броню палажылі ў ложак, пачалі трэсці. Стары пан Казімір перажагнаўся, падняў крыж з падлогі і абапёр аб печ. Усіх ахапіў чорны жах. На нейкі час зрабілася ціха, толькі ў ложку слаба дыхала бледная Броня, а за вокнамі на падворку шумеў вецер, і здавалася, што пад вокнамі нехта размаўляе. Старэйшая сястра Броні, узіраючыся ў чорнае акно, дзіка закрычала: «Нябожчык! Там нябожчык!» Усе паглядзелі ў вакно: там на самай справе рухалася белая цень, і здавалася, што праз шум і ўдары ветру можна было пачуць голас нябожчыка — «аддай мой крыж!». Усе пабялелі і пачалі жагнацца. Стары пан Казімір упаў на калені перад крыжам, а за ім упалі на калені ўсе, хто быў у хаце, і заспявалі «Анёл Панскі звеставаў Панне Марыі». Потым прамовілі літанію за душы памерлых верных і да ўсіх святых. Мінула поўнач. Калі закончылі астатні «Вечны адпачынак», у падпечку залапатаў крыламі певень, а потым голасна і доўга запеў раз, потым другі... сёмы. Вецер на дварэ паволі сцішаўся і наогул сціх. У вокны глядзела самая чорная ноч. Броня апрытомнела, агледзела ўсіх і шэптам прамовіла: «А фунт цукерак?» Моладзь, прыгнечаная паводзінамі малой авантурысткі, паўголасам загаварыла, якімі адважнымі бываюць дзяўчаты. Мінула другая гадзіна. Калі пачулі, што ў стрыя Сямёна зарыпала вага на студню, усе госці разам, сарамліва жагнаючыся, выйшлі з хаты. Пан Казімір вынес крыж у сені....

Наранку, калі развіднела, пан Казімір аднёс крыж на могілкі і ўставіў ў шырока расхістаны дол. Утаптаў пясок, адмовіў «Анёл Панскі» за душу непатрэбна патурбаванага нябожчыка і пайшоў у касцёл. У той дзень, як заўжды ў Задушны дзень, на могілкі надышло шмат народу. Тут і прычыталі, і плакалі, і разам маліліся. Доўга стаяла некалькі вяскоўцаў над зруйнаванай магілай іх знаёмага. Шапталіся, паціскалі плячыма. Потым доўга хадзілі размовы, што гэты нябожчык у пэўны час вылазіць са сваёй труны і прыходзіць аж да сваёй хаты, якая стаіць за некалькі вёрстаў ад могілак.

Сын пана Казіміра ў той самы Задушны дзень знайшоў на падворку пад вокнамі паламаную галіну бярозы з прычэпленай да яе старой мужчынскай кашуляй, невядома адкуль сарванай ветрам. Броня атрымала свой фунт цукерак за 15 капеек і пастанавіла ніколі больш не лазіць ноччу

на могілкі. Яшчэ пару тыдняў хадзіла як зачараваная, уначы размаўляла ў сне, зрывалася з ложка. Старая Шоціха на маладзік уначы сабрала на могілках імху, тры разы тым імхом, добра змяшаным з лавандай, абкурыла Броню і дзяўчына выздаравела. Яна потым вельмі добра выйшла замуж, за пана Станіслава Аўгуста Панятоўскага ў Ляхаўку, што пад Васілішкамі, але, бядачка, памерла маладой.

Вечны адпачынак
Дай ім, Пане,
А святло вечнае няхай ім свеціць.
Аман.

У цішы могілак…[1]

Пад канец XVIII ст. хрысціянскія могілкі горада Ліды знаходзіліся на ўзгорку паміж вуліцамі Гражыны, Вызвалення, Гарыстай[2]. Тут, над старым млынарскім ставам, стаяла драўляная ўніяцкая царква Уваскрашэння Гасподняга, пабудаваная з дрэва, разабранага парафіяльнага касцёла ў 1765 г., пры царкве знаходзіўся шпіталь для ўбогіх, г. зн. прытулак.

Згодна з сенацкім указам 24 снежня 1771 г. могілкі патрэбна было пераносіць за горад, у месца, якое знаходзіцца ад апошняга гарадскога будынка не бліжэй за сто сажняў, былыя могілкі не адпавядалі гэтым патрабаванням. Таму па распараджэнні губернскіх уладаў у 1797 г. былі закладзеныя новыя могілкі на замкавай зямлі, на іншым узгорку за ракой Лідзеяй у сасновым бары, які некалі займаў цэлыя Кузьмішкі — уладанні паноў Вісмантаў. Адпачатку новыя могілкі не мелі дакладна акрэсленых межаў, аднак каля 1840 г. на сродкі пані Клары Якавіцкай, як належала па прадпісанні, могілкі былі акапаныя ровам і агароджаныя невысокім валам. Роў і вал, аднак, не баранілі могілкі ні ад быдла, якое пасвілася побач, ні ад непажаданых асобаў. У 1886 г. на сродкі пані Лясковіч была выбудаваная брама на могілкі — чатыры мураваныя слупы з драўлянымі варотамі. Каля 1900 г. распачалася і праз некалькі гадоў закончылася будоўля новай мураванай агароджы могілак. У памяць гэтага ўлева ад увахода з унутранага боку была ўмураваная табліца з надпісам: «Агароджана ў 1903 г. коштам парафіян, стараннем ксяндза-дэкана Юзафа Сянкевіча, М. Пацэвіча, Я. Падгайнага, камення Стэфана Макрэцкага за якіх Здровась Марыя». Згаданы капітан Стэфан Макрэцкі, уладальнік маёнтка Вінькаўцы, праз

[1] Szymielewicz Michał. W cmentarnej ciszy // Ziemia Lidzka. 1937. №11. S. 117–120.

[2] Былі і яшчэ адны ўніяцкія могілкі каля царквы св. Мікалая ў цэнтры горада. Таксама рыма-каталіцкія могілкі былі каля аарнага і гармеліцкага касцёлаў.

нейкі час, як генерал зброі Войска Польскага, быў начальнікам Сярэдняй Літвы.

У 1805 г. ксёндз Вінцэнт Нарбут, пробашч і дэкан лідскі, пабудаваў тут досыць вялікую драўляную капліцу, якую высвяціў ў гонар св. Барбары, панны і мучаніцы, як патронкі добрай смерці, абраз гэтай святой знаходзіўся ў вялікім алтары. Пасля скасавання ў Лідзе касцёла кармелітаў і пажару касцёла піяраў, падчас рамонту фары, з дазволу дыяцэзіяльных уладаў, сюды былі часовы перанесеныя парафіяльныя набажэнствы. У 1848 г. капліца была грунтоўна рэстаўраваная. У 1905 г. невядомы злачынец падпаліў капліцу, але пажар быў патушаны. У капліцы калісьці быў стары арган, перанесены сюды з фары, у 1904 г. гэты арган перададзены філіі ў Крупава, дзе ён згарэў разам з касцёлам ў 1919 г. Каля капліцы на двух слупах стаяла званіца з двума званамі: адзін вагой у пуд, другі — 30 фунтаў (12 кг). У 1885 г. Стэфан Буткевіч, былы маршалак Лідскага павета пабудаваў новую, ашаляваную і крытую гонтам званіцу. У 1930 г. кс. Гіпаліт Баярунец, пробашч і лідскі дэкан, на месцы старой капліцы пачаў мураваць новую, якая цяпер ужо накрытая.

На могілках здаўна стаяў драўляны шпіталь, невядома кім і калі пабудаваны і калі зруйнаваны, пасля зруйнавання ўбогія не мелі дзе жыць. Панна Марыя Ле Форт, гувернантка, адпісала для тутэйшых убогіх 66 рублёў срэбрам. Кс. Юзафат Вайшвіла, лідскі экс-піяр, які дажываў у лідскай парафіяльнай плябаніі, дадаў яшчэ 150 рублёў, і за гэтыя грошы ў 1845 г. пабудавалі новы драўляны шпіталь. У 1856 г. тут жылі 12 убогіх. Калі гэты шпіталь струхнеў, пані Лясковіч пабудавала за агароджай могілак драўляны шпіталь, які існуе і цяпер.

Раней, да арганізацыі каля 1865 г. асобных могілак для праваслаўных, на старых могілках хавалі нябожчыкаў усіх хрысціянскіх вызнанняў. Знайшоў тут вечны пакой пан Ксаверы Эстка (1787–1855), харунжы Лідскага павета з Дакудава, евангелік. На ягоным нагробку, работы віленскага разьбяра Вяржбоўскага[1], вялікая кніга з надпісам на ёй: «Браты! Тут пахаваны ваш бліжні, які хацеў падмануць сваю магілу». Недалёка ад гэтай магілы спачывае евангелік-лютэранін Фрыдэрык Неўман, падпалкоўнік (1813–1869). На камені яго нагробка надпіс: «Пане! Скажы яму: „Ідзі да мяне!“, мне скажы, Пане: „Не плач!“. Смуткуючая жонка паставіла гэты помнік». Трохі глыбей, за капліцай, спачывае пад моцнай глыбай барон Эрнест Медэм (1846 г.)[2]. Помнік нябожчыку паставілі таварышы па зброі з Галіцкага палка егераў. Помнікі з надпісамі па-расійску на помніках нябожчыкам

[1] Насамрэч, гэта праца вядомага віленскага майстра Юзафа Казлоўскага (1818—1863).

[2] «Земскі спраўнік, адстаўны маёр Эрнест Аляксандравіч барон Медэм» — Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. Вильна, 1845. С. 105. Лідскі спраўнік быў сынам графа Аляксандра Іванавіча (Аляксандра Фрыдрыха) Мэдэма, (1803—1859) — тайнага дарадцы, генеральнага консул у Егіпце (1838—1841), надзвычайнага і паўнамоцнага амбасадара у Персіі (1841—1845), пасланніка ў Бразіліі (1848—1854) і ў Вашынгтоне (1854—1855),

праваслаўнага веравызнання: Пятра Масіны (1850 г.), Якуба Масіны (1860 г.), Марыі Патрэсавай (1861 г.).

Каля самай капліцы ляжыць вялікая гранітная пліта, на якой яшчэ можна прачытаць: «Юзаф Грабавецкі, герба Гржымала, з Падляшша, доктар Медыцыны і Акушэр, член Імператарскага таварыства лекараў у Вільні, калежскі асэсар, нарадзіўся 19 сакавіка 1786 г., памёр 4 снежня 1849 г.

Для сям'і быў шчасцем,
Для гэтай краіны здароўем,
Дабрачынцам убогіх,
Мілоснікам дарагіх праўдаў.
Выразаў у Вільне Гарбацэвіч».

Аўтарам гэтых радкоў быў згаданы вышэй кс. Юзафат Вайшвіла і фразу «Мілоснікам дарагіх праўдаў» ужыў не выпадкова і не для рыфмы, але толькі таму, што, каму патрэбна, вядома пра тое, што Юзаф Грабавецкі быў членам масонскай ложы Гарлівы Ліцвін у Вільні[3].

На другім баку капліцы сабраны магілы ксяндзоў, старых і маладых, тут ляжаць:

Юзаф Сянкевіч, пробашч і дэкан Лідскі (1905 г.)[4],

Альберт Стэцкі, місіянер (1898 г.),

Антоні Кулакоўскі, місіянер (1904 г.),

Станіслаў Пацынка, вікары (1918 г.),

Ян Кандрат, вікары (1924 г.)[5].

Пад мармуровымі плітамі спачывае сям'я ўласнікаў Мелужына і Воранава:

бацька лідскага Мэдэма пахаваны ў Шанхаі. Графскі і баронскі род Мэдэмаў паходзіў з Гесена. Пры канцы XV ст. яны перасяліліся ў Прыбалтыйскі край. Адна галіна роду Мэдэмаў атрымала графскую годнасць Рымскай імперыі ў 1779 г.

[3] Юзаф Грабавецкі нарадзіўся на Падляшшы і быў выхаванцам Віленскага універсітэта. Доктарскую навуковую ступень атрымаў у 1817 г. (Гл: Bieliński Józef. Stan nauk lekarskich za czasów Akademii medyko-chirurgicznej wileńskiej. Warszawa, 1888. S. 344.). У 1815 г. будучы доктар медыцыны жыў у Свіслачы і адсюль даслаў у Віленскае імператарскае лекарскае таварыства працу «Historia fistulae ventriculi» і 1816 г. быў абраны членам таварыства (Гл: Bieliński Józef. Cesarskie towarzystwo lekarskie wileńskie (1805—1864). Warszawa, 1890. S. 38.). Грабавецкі з'яўляўся аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў па медыцыне. Пасля Свіслачы пераехаў у Шчучын, дзе памёр у 1844 г. (Гл: Bieliński Józef. Stan nauk lekarskich za czasów Akademii medyko-chirurgicznej wileńskiej. Warszawa, 1888. S. 344.). На Лідчыне ў 1844 г. Грабавецкі валодаў маёнткам Старадворцы з 5 прыгоннымі (Czesław Malewski. Wykaz alfabetyczny z 1844 r. majątków pow. Lidzkiego // Ziemia Lidzka. №2 (60) -2004.).

[4] Юзаф Сянкевіч, лідскі ксяндз-пробашч і дэкан у 1889—1905 гг., выкладчык ў лідскай павятовай школе.

[5] У 1986 г., ратуючы ад варварскага знішчэння, парафіяне перанеслі магілы гэты ксяндзоў на Слабадскія могілкі.

«Юзаф Зарэцкі, сын Войцеха, герба Варня, генерал-лейтэнант корпуса інжынераў. Нарадзіўся ў Скамарохах 19 снежня 1800 г. Памёр у Пецярбургу 29 студзеня 1869 г.».

Каля яго ляжыць верная жонка «Ганна Зарэцкая, g (eboren) v (on) Гравеніц. 1 ліпеня 1807, † 1 лістапада 1891».

Іх сын Мікалай Юзаф Варня Зарэцкі[1], нарадзіўся 11 верасня 1843 г., памёр 12 студзеня 1883 г.

[1] Зарэцкі (Заржецкі) Юзаф — інжынер, генерал-лейтэнант; будаўнік Кранштацкі фартоў. Нарадзіўся ў 1800 г. Памёр 29 студзеня 1869 г. Выхоўваўся ў Віленскім універсітэце і па заканчэнні фізіка-матэматычнага факультэта (1826) паступіў у інстытут інжынераў шляхоў зносін. У 1829 г., пасля заканчэння курса, пасля іспыта атрымаў чын паручніка інжынераў шляхоў зносін з залічэннем на сапраўдную службу — у рэзерв і камандзіраваны на здымкі (тапаграфічныя — Л.Л.) каля Ноўгарада. Калі ж (у 1830 г.) была ўтворана марская будаўнічая частка, дырэктар будаўнічага дэпартамента, генерал Карбальер, запрасіў яго сваім пад асабістым наглядам, займацца праектам докаў для Кранштадта. Зарэцкі быў пераведзены ў будаўнічую частку, з прыкамандзіраваннем да Кранштацкай інжынернай камандзе і з гэтага часу, на працягу амаль сарака гадоў, прысвяціў сябе будаўнічай дзейнасці. У 1838 г., зрабіў велічэзную працу пры ннеадстку сродкаў — закончыў будаўніцтва карабельнага Мікалаеўскага дока. За гэты час Зарэцкі атрымаў чыны: штабс-капітана (1834 г.) і капітана (1837 г.) і звярнуў на сябе асабістую ўвагу цара які часта наведваў будаўнічыя працы. Калі на пачатку 1839 г. была распачата пабудова фрэгатнага дока, Зарэцкі быў прызначаны асобным яго будаўніком і будаўніком Абводнага канала ў Кранштадце. Да гэтых вельмі складаным абавязкаў у 1843—44 гг. былі дададзены яшчэ новыя абавязкі: 1) будаўніка батарэі «князь Меншыкаў», для якой, па даручэнні Гасудара Імператара, ім быў складзены праект, і 2) абавязак па пабудове купецкай брамы Кранштацкай гавані. Пабудова докаў была зусім скончана ў 1846 г. Але на гэтым будаўнічыя працы не спыніліся. У снежні 1848 г. палкоўніку Зарэцкаму загадана скласці праект на пабудову батарэі на заходнім фронце Кранштацкага форта; у 1849 г. яму ж даручана было перарабіць купал рымска-каталіцкага касцёла, і, нарэшце, у 1850 г. загадам цара ён прызначаны будаўніком Кранштацкай крэпасці. Адначасова з гэтым Зарэцкі прымаў удзел у работах розных камісій, быў членам камісіі пад старшынствам генерала Вільсана па ўстаноўцы водаадліўнай паравой машыны ў доках Кранштацкага басейна, камісіі па арганізацыі першага навучальнага марскога экіпажа ў Кранштадце і камісіі па загарадзі паўночнага фарватэру, дзе меў галоўны нагляд за працамі, якія рабіліся па складзеным ім праекце. Падчас Усходняй вайны ён зладзіў пры Лісіным носе гавань для кананерак і прымаў дзейны ўдзел па прывядзенню крэпасці ў абарончы стан. У снежні 1855 г. Зарэцкі быў прызначаны на пасаду члена агульнай прысутнасці будаўнічага дэпартамента і неўзабаве, (з 1 студзеня 1856) атрымаў чын генерал-маёра. У 1860 г. ён быў прызначаны членам марскога будаўнічага тэхнічнага камітэта і членам агульнай прысутнасці інжынернага дэпартамента ваеннага міністэрства, такім чынам парваў са сваёй ранейшай будаўнічай дзейнасцю і цалкам прысвяціў сваю далейшую службу адміністрацыйным пасадам. З вялікай колькасці складзеных ім праектаў розных збудаванняў асаблівай увагі заслугоўваюць два: праект Балтыйскага порта, і праект гандлёвага порта для Пецярбурга на левым беразе Нявы каля кананерскага вострава выспы. З 1863 г. Зарэцкі быў членам тэхнічнага камітэта галоўнай інжынернай управы ваеннага міністэрства, а з 1867 г. — членам будаўнічага аддзялення марскога тэхнічнага камітэта. Чын генерал-лейтэнанта атрымаў 1 студзень 1864 г. Першая ў Расіі марская астранамічная абсерваторыя пабудавана ў 1856 г. у два-

Яго жонка: Марыя Зарэцкая.

Іх дачка: Ганна Зарэцкая, памерла ў росквіце гадоў (1900 г.).

Амаль што кожны землеўладальнік у Лідскай парафіі меў тут зарэзерваваныя дзялкі для сваіх радоў, і так:

Качанова і Касоўшчына. Станіслаў Адамовіч (1780–1838), прэзідэнт павятовага лідскага суда Фелікс Адамовіч[2] (1783–1876), гродскі прэзідэнт Лідскага павета, Гаспар Адамовіч (1794–1856), суддзя Лідскага павета, Эмілія Буткевіч з Адамовічаў (1813–1879), маршалкова Лідскага павета, а яе муж, Стэфан Буткевіч (1815–1896), лідскі маршалак, спачывае каля ўвахода на могілкі, пад фундаванай ім званіцай.

Курэсеўшчына. Мае адзінага прадстаўніка: «Ян Тюкала (1783–1867), капітан б. польскіх войск». Іншыя Тюкалы болей палюбілі Белае Балота з Гроднам, а Курэсеўшчыну пакінулі.

Вялікая Перапечыца мае некакалькі нагробкаў: «С. п. Ксаверы Рыло, Надворны саветнік і жыхар Лідскага павета. Жыў 62 гады, памёр 22 лютага 1836 г. Засмучаныя дочкі просяць аб „Здровась Марыя“».

Яго сын: «С. п. Канстантын Рылло, карнет гусарскага палка караля Нідэрландаў.

Жыў 22 года, памёр 3 жніўня 1847 г. Сёстры ў суме просяць аб трох «Здровась Марыя»».

Дочкі, з надпісам: «Тут спачываюць парэшткі с. п. Альбертыны з Рылаў Садоўскай, памерла 17 мая 1867 г. ва ўзросце 53 гадоў».

Яе муж: «Тут спачываюць парэшткі с. п. Рафала Садоўскага, стацкага саветніка і кавалера. Памёр 8 жніўня 1869 г. ва ўзросце 58 гадоў».

Першай яго жонкі, ад якой Садоўскім належала Баяршчына пад Лідай (цяпер Тумялевічаў) «DOM. Максімілія з Даўгялаў Садоўская і двое дзяцей Людвіка і Яна, жонка лідскага павятовага лекара, калежскага асэсара, пакінуўшая гэты свет 13 лістапада 1845 г. ва ўзросце 27 гадоў». На нагробку верш:

Не парэшткі памёрлай ляжаць пад гэтым валуном,
Разам шчасце чулай маці пахавана.
Сэрца мужа прабіта гэтым страшным ударам,
Чутны голас жалю і смутку,
Трое дзетак-сіротак пакінула на зямлі,
Каб навечна застацца з двумя памёрлымі[3].

ры Кранштацкага штурманскага вучылішча па праекту і пад кіраўніцтвам лідзяніна Зарэцкага (Гл: Русский биографический словарь: В 25 т. /А. А. Половцов. М., 1896—1918. Т. 10. С. 231.).

[2] «Фелікс Апалінар’евіч Адамовіч, дэпутат Камітэта па назіранні за продажам алкагольных напояў» — Памятная книжка Виленской губернии на 1845 год. Вильна, 1845. С. 103.

Без нагробка ляжаць тут сын павятовага лекара Ян Садоўскі (1905 г.), яго жонка з Квяткоўскіх, іх сын Ян Рафал Садоўскі і некалькі іншых членаў гэтай сям'і.

Чэхаўцы. «Тут спачывае с. п. Казімір Мяцеша сын Банькоўскі б. суддзя Лідскага павета, пам. 18 кастрычніка 1871 г., жыў 76 гадоў»[4].

Скаўронішкі. «Тут спачываюць с. п. Пётр Жаба і дачка Памэла Нарбут, пам. 18 сакавіка 1872 г. ва ўзросце 47 гадоў».

Трацякоўцы. «Тут адпачываюць парэшткі жыхара Лідскага павета Яна Калясінскага пам. 27 чэрвеня 1874 г. і жонкі Антаніны Калясінскай пам. 13 сакавіка 1863 г.».

«Магілы сям'і Станіслава Калясінскага. Яго сын Станіслаў пам. 7 лютага 1897 г., меў 24 гады».

Сям'я Крахельскіх, якая доўгі час жыла ў Лідзе, пакінула некалькі магіл:

«Магілы Крахельскіх. С. п. Тэафіла Крахельская пам. 20.II.1881 г. ва ўзросце 58 гадоў. Найлепшай з маці ад шчыра кахаючых дзяцей.

Бацькі!
Тут пад гэтым халодным каменем ляжаць вашыя парэшткі
І трох сыноў падлеткаў, пахаваных разам.
Пяць асобаў зачынены ў панурых скляпеннях.
Які ж сум у нашых душах, якая вострая боль!
Асірацелі сыны і дачка без бацькоўскай апекі,
Страцілі бацьку і найлепшую маці, сіроты навек!
Мінак, які чытаеш на гэтым смутным помніку,
Злітуйся як чалавек і пабожна памаліся:
«О Божа літасцівы, дай вечнае збавенне
Гэтым душам, чые парэшткі пакрывае гэты склеп».

[3] Лідзянін Яўстах Шалевіч пісаў ў сваіх мемуарах: «Могілкі знаходзяцца ў вярсце ад фарнага касцёла. Тут ёсць некалькі прыгожых помнікаў, але на могілках адбылася гісторыя, якая мне вельмі не падабаецца. Некалькі дзясяткаў гадоў таму, павятовым доктарам ў Лідзе быў Садоўскі. Невядома ад чаго, адначасова ў яго памерлі двое дзяцей. Яго жонка не змагла гэтага перажыць і з роспачы атруцілася. Усіх траіх пахавалі каля самай паўночнай сцяны капліцы і паставілі не надта вялікі помнік на якім выгравіравалі прыгожы вершык, якога я, на жаль, не памятаю (вершык, гл. вышэй. — *Л. Л.*). 10 гадоў таму я не знайшоў помніка Садоўскай на сваім месцы і моцна здзівіўся, бо на яго месцы стаяў помнік па доктару Гузе. Парэшткі Садоўскай і яе дзяцей былі выкапаны, а помнік аднесены на якія 10 метраў ад капліцы! Зямля пад магілы Садоўскіх калісьці была выкупленая, але нават пасля гэтага іх парэшткі выкапалі і перанеслі ў іншае месца. Я лічу, што адміністрацыя касцёла зрабіла ўсё вельмі не па-людску. Дэканам тады быў вядомы… кс. Сянкевіч (трохкроп'е стаіць на месцы нядобрай характарыстыкі Сянкевіча. — *Л. Л.*)». — Гл: Лаўрэш Л. Л., Лаўрэш Г. І. Там, дзе спыніўся час…. Лідскія гістарычныя. 2024. С. 98—99.

[4] Так у крыніцы.

«С. п. Юзаф Крахельскі, казначэй і жыхар Лідскага павета. Меў 50 гадоў. Пакой твоёй душы, дарагі бацька!».

С. п. іхнія дзеці Уладзіслаў, Аляксандр і Віктар.

«Тут ляжыць Ружа з Туровічаў Крахельская, скарбнікава Лідскага павета. Памерла 19 мая 1837 г., мела 19 гадоў».

«С. п. Нарцыс Крахельскі, жыхар Лідскага павета. Нарадзіўся 14 кастрычніка 1829 г., памёр 11 снежня 1890 г.».

Густа «засяляюць» свае могілкі гарадскія жыхары:

Павятовы лекар Раймунд Гузе (1896 г.)[1].

Эмілія з Шостакаў Ляўданская[2], жонка спраўніка Лідскага павета (1893 г.).

Марцін Галаўня (1888 г.).

Ян Стасевіч, бургамістр (1901 г.).

Анна з Малашкевічаў Яцкевіч, бургамістрава (1840 г.).

Яна з Ліпінскіх Зэдлер, аптекарова (1871 г.).

Аркадзь Мразоўскі, землямер (1895 г.).

Род Яна Андрушкевіча, бургамістра.

Леон Стабінскі, бургамістр.

Лёг тут «Аляксандр Талочка, калежскі рэгістратар, пам. 7 красавіка 1846 г. ва ўзросце 27 гадоў.

Гадоў жыў нешмат
Спачывай ты, сябар,
Хай гук трубы анёла
Заклікае на суд Найвышэйшы».

Найбольш тут каменных нагробкаў паходзіць з другой чвэрці XIX ст. Выразаны яны ў Вільні. Каля 1880 г. у Лідзе па вуліцы Віленскай на ўласным плацы залажыў майстэрню нагробкаў Баляслаў Хруль, пасля яго смерці (1889 г.) майстэрняй кіравала яго ўдава Анэля з Малеўскіх Хруль. Некаторыя нагробкі паходзяць з майстэрні Волка-Карачэўскага ў Падубне.

Найлепшы помнік пабудавала маці сыну з надпісам:

«Станіславу Хагмаер 23 красавіка 1906 г. — 18 верасня 1930 г. Каханаму адзінаму, памяць ад маці».

[1] «Надворны саветнік Раймунд Станіслаў Рудольфавіч Гузе, адукацыю атрымаў у С.-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, каталіцкага веравызнання, на пасадзе з 22 ліпеня 1879 г.» — Памятная книжка Виленской губернии на 1887 год. Вильна, 1886. С. 13.

[2] Яе муж, паліцэйскі спраўнік з 1888 да 1900 г. Сцяпан Мацвеевіч Ляўданскі. За сваю службу атрымаў розныя адзнакі і быў узнагароджаны ордэнам Уладзіміра 3-й ст. — Памятная книжка Виленской губернии на 1903 г. Вильно, 1902. ч. 3. С. 58.

Ладны камень быў прывезены на магілу памерлага лідзяніна, старога кавалера, які пакінуў добрыя спадкі сваім далёкім крэўным. На камені выкананы бронзавы барэльеф з партрэтам нябожчыка і надпіс:

«Аляксандр Ёдка, памёр у Варшаве 17.XII.1933 г. у 75 гадоў. Прайшоў праз жыццё, робячы дабро. Удзячная радзіна».

Арыгінальна выглядаюць «магілы Граблісаў»: цэлы мураваны дом з дзвярыма і вокнамі.

Яшчэ гусцей могілкі запоўнены зраўнаванымі з зямлёй магіламі дробных сельскіх гаспадароў і земляробаў: Ёдкаў, Болтуцяў, Таўгінаў, Хруляў, Астравухаў, Падгайных, Бунькаў, Капачэляў, Стрыбуцёў, Клышэйкаў, Ходзькаў, Хутных, Ракаў, Буракоў, Трацякоў, Касякоў, Семакоў, Шостакаў, Латушкаў, Саладухаў, Кісялёў, Сегеняў, Брэйваў, Чарнякоў, Майсакаў, Пуйдакаў, Чарнавусаў, Белавусаў і т. д. і т. д.

А вось новая старонка гісторыі.

Першыя ахвяры Вялікай вайны ад 1915 г. Шэраг салідных драўляных крыжоў з надпісамі, выкананымі гатычнымі літарамі, якія пасля болей чым дваццаці гадоў яшчэ чытаюцца:

«Браніслаў Плюціцкі Саніт. Bialystoker Kriegs Hospital».

«Юзаф Зяневіч 400 мінскі полк».

«Баляслаў Скажынскі».

Першыя ахвяры польска-бальшавіцкай вайны 1919 г.: каля дзеда Яна Шкопа (1909 г.) магіла з надпісам: «С. п. Віктар Шкоп, валанцёр В. П. загінуў за Бацькаўшчыну ў барацьбе з бальшавікамі каля Лебяды 16 студзеня 1919 г., меў 19 гадоў».

Далей — красавік 1919 г., бой за Ліду, узяцце Ліды, адыход і зноў узяцце 28 верасня 1920 г.

«Генрык Жылінскі, паручнік 1-га Сувальскага палка, загінуў у баях пад Лідай 16 красавіка 1919 г.»

Паручнік Юзаф Гундэрман
Паручнік Сяверын Шыманюк
Паручнік Фелікс Асецкі
Паручнік Юзаф Клемпінскі
Паручнік М. Шчалкоўскі
Паручнік Феліцыян Радкевіч
Вахмістр Францішак Марчык
Серж. Ян Вцёрка
Шар. Станіслаў Кураш
Шар. Мечыслаў Мінтле
Ст. Шар. Станіслаў Парыж
Кан. Ян Валковек
Ст. Шар. Ян Матэрак
Ст. Шар. Антон Долята

Кан. Юзаф Паўляк
Шар. Ян Петрашак
Шар. Стэфан Мікалайчык
Шар. Юзаф Баравіцкі
Шар. Уладзіслаў Алтер
Шар. Віктар Сэдляк
Кан. Павел Рухлік
Кан. Ян Ваўрыняк
Кан. Уладзіслаў Орпель

У той жа агароджы — супольная магіла ўсіх тых, якія загінулі ў ваколіцах Ліды ў 1919–1920 гг. і парэшткі якіх былі сабраныя тут у 1924 г. Супольная магіла з'яднала тут і тых, якіх летам 1920 г. у даліне пры збегу тракту і шашы Ліда — Гродна расстраляў асобны аддзел ЧК пры штабе арміі Тухачэўскага ў Лідзе. Надпіс на гэтай магілай:

«40 невядомых закладнікаў з Беластока, Гродна і Ваўкавыска, забітых бальшавікамі ў жніўні — верасні 1920 г.»[1].

Мой Божа! Ці ж гэты малады, але хцівы да ўлады і славы, інтэлігентны афіцэр Тухачэўскі, якога я бачыў на вуліцах Ліды ў аўтамабілі, пакрытым чырвонай палярынай з залатымі махрамі, калі зацвярджаў выракі асобага аддзела, думаў пра тое, што калісьці і сам ён будзе расстраляны ў патыліцу з браўнінга? Забіты так, як і няшчасных ахвяр забівалі па яго камандзе.

Бо якім судом вы будзеце судзіць, такім і вас асудзяць, ды якою меркай вы будзеце мераць, такою вам адмераць. Мацвей VII, 2

Разам з братамі-жаўнерамі ўцяклі да Маці-Зямлі і тыя, хто пры жыцці меў адвагу адарвацца і ўзляцець за аблокі, да неба, але… загінулі смерцю лётчыка:

Паручнік Аляксандр Ціхоцкі.

Сяржанты-пілоты Баляслаў Паўляк, Францішак Чарнецкі, Павел Стэнцель.

У іншым месцы спачывае Уладзімір Біюць, падкамісар паліцыі на пенсіі (1928 г.), а каля яго грамада паліцэйскіх:

Ян Вільканец, паставы, 33 года, «загінуў ад рук бандытаў 21 мая 1922 г.»,
Юліян Каўняровіч, «загінуў смерцю храбрых 23 кастрычніка 1922 г.»,
Юзаф Алесь, «трагічна загінуў» (1935 г.).

Тут ляжаць настаўнікі, якіх забрала да вечнага спачынку «белая пані» сухота:

Юзаф Вось (1929 г.)[2],
Анна Філіпкоўская (1930 г.),
Ядвіга Шкоп (1931 г.),

[1] Агульная магіла 40 закладнікаў знаходзіцца ў некалькіх метрах на ўсход ад абеліска з арлом, над ёй зараз ўстаноўлены металічны крыж.
[2] Зяць Міхала Шымялевіча.

Францішак Краўчык (1935 г.),

Станіслаў Фэглер, прафесар дзяржаўнай гімназіі ў Лідзе (1930 г.).

Недалёка ўвесь у кветках надгробак Ядзі Шыманскай, няшчаснай ахвяры нёманскага пляжа (4 ліпеня 1937 г.)[1].

Не меней як дзесяць тысяч парэшткаў лідзян ляжыць тут, на 4 гектарах, і ў цені сасновага бору не памятаюць ні пра свае няшчасці, ні пра свае радасці. З праху паўсталі і ў прах вярнуліся.

Ліда ў гады Вялікай вайны[2]

I

Лета 1914-га выдалася гарачае і сухое. Тэмпература паветра ў чэрвені і ліпені дасягала 40 градусаў у цені, а на працягу некалькіх тыдняў не выпала ні кроплі дажджу. Вада ў рэках, азёрах і ставах спала. На Нёмане ад Морына да Орлі не маглі прайсці платы, і сплаў дрэва спыніўся. Паветра напоўнілася дымам. На поўдні, за Нёманам, удзень уздымаліся аблокі дыму, а ўначы было бачна зарыва пажараў — гарэў лес. У Раманаўцах над ракой Лебядой і ў Жыжме над ракой Жыжмай пад клубамі белага дыму цьмелі тарфянікі. Звычайна цяжкапраходныя Дакудаўскія і Дзітвянскія балоты высахлі, і па іх ездзілі, як па полі. Каб пайшоў дождж, у вясковых цэрквах і касцёлах служыліся набажэнствы, палі абыходзілі працэсіі з харугвамі і пабожнымі спевамі.

Ураджай сена і канюшыны ў тым годзе ў Лідскім павеце быў добры. Касьба і сушка травы прайшла вельмі ўдала. Сенажаці на лугах былі сухія і лёгкадаступныя, там не закладвалі стагоў на зіму, а вазілі сена адразу ў вёскі. Таксама быў добры ўраджай жыта і яравых, добра ўрадзіла бульба. Грыбоў у лясах не было, добра ўрадзіліся ягады, але праз спякоту і вялікую суш хутка даспелі і зніклі. Садавіна не ўрадзіла, але было шмат мёду. Словам, год быў добры, толькі што не струменіўся малаком і мёдам. На палях усё даспела адначасова, і для збору ўраджаю бракавала працоўных рук. Таму наёмным працаўнікам плацілі ўдвая — 1 рубель за дзень працы касцам, 60 капеек жнеям.

[1] 4 ліпеня 1937 г. падчас Свята Мора працягвалася на рацэ Нёман у рацэ патанула вучаніца 3-га класа Купецкай гімназіі піяраў Ядвіга Шыманская, якая таксама прыехала святкаваць. Дзяўчынка разам з выпускніком Купецкай гімназіі каталася на лодцы па Нёмане і лодка перакулілася. Цела дзяўчынкі было знойдзена праз некалькі дзён у трох кіламетрах ніжэй Сяльца (гл: Kurjer Wilenski. №184 (4147). 7 lipca 1937; Kurjer Wilenski. №186 (4149). 9 lipca 1937).

[2] Szymielewicz M. Lida w latach wielkiej wojny // Ziemia Lidzka. 1939. №7–8. S. 185–198.

Ліда, як заўжды ўлетку, вылюднела: хрысціянская і яўрэйская інтэлігенцыя выехала на лецішчы ці нават у Друскенікі на салёныя воды, школьная моладзь раз'ехалася па вёсках — да бацькоў ці сяброў. Лясы і берагі рэк напоўніліся жыхарамі горада, якія швэндаліся без справы: службоўцамі, гандлярамі, настаўнікамі і моладдзю. Там і сям у цені навіслай алешыны дзесьці над Вярсокай ці Сольчай з вудай у руцэ сядзелі загарэлыя, як індзейцы, гімназісты, а па лясах з кошыкамі ці жбаночкамі ў руках блукалі квяціста апранутыя вучаніцы гімназіі Навіцкіх[1] з Ліды. Вечарамі на чыгуначных станцыях і паўстанках збіралася дачнае грамадства, каб кагонебудзь сустрэць або праводзіць ці папросту паглядзець на цягнікі. Дзесьці, сярод спірэю і язміну, пад плотам, некалькі хлопцаў з мандалінай, гітарай і балалайкай у руках цягнулі несмяротныя «Карабейнікі», «Свеціць месяц» ці «Вальс вар'ята».

28 (15) чэрвеня ў Сараева Гаўрыла Прынцып неяк лёгка зрабіў некалькі стрэлаў, з якіх пачаўся пажар Сусветнай вайны. У Лідзе чытачы газет толькі паціскалі плячыма і дзівіліся, навошта трэба было забіваць спадчынніка трона Аўстра-Венгрыі ды яшчэ разам з жонкай. Але пакаленні, якія перажылі некалькі крывавых войнаў і памяталі забойства Аляксандра II[2], прэзідэнта Карно[3], каралевы Эльжбеты[4], Абрэнавічаў[5], вялікага князя Сяргея Аляксандравіча[6], Сталыпіна і шмат каго іншых, якія бачылі тэрор расійскай рэвалюцыі 1905 г., калі чыноўнікаў рознага рангу забівалі як пеўняў на птушніку, збольшага не ўразіліся падзеямі ў Сараева. І хто ведае, ці Гапоны і Азефы былі вынаходніцтвам толькі расійскай улады? Пагаварылі на тэму Сараева і забыліся. Значна большую цікавасць узбудзіла ў грамадстве спроба забойства ў вёсцы Пакроўскае Табольскай губерні Рыгора Распуціна, якому праз некалькі тыдняў пасля сараеўскага забойства нейкая баба на прыстані распарола нажом жывот. Распуцін, просты селянін з Сібіры, быў вядомы па ўсёй Расіі: ён быў здольны замаўляць крывацёк малому спадчыннiку расійскага трона вял. кн. Аляксею, меў вольны доступ да цара

[1] Лідскай жаночай гімназіі Навіцкіх.

[2] Аляксандр II забіты нарадавольцамі ў 1881 г.

[3] Карно Мары Франсуа Садзі (1837–1894) — інжынер і палітык, прэзідэнт Францыі ў 1887–1894 гг. 24 чэрвеня 1894 г. пасля вітальнай прамовы на выставе ў Ліёне прэзідэнту было нанесенае смяротнае нажавое раненне італьянскім анархістам Сантэ Казерыа. Карно пражыў самае кароткае жыццё сярод усіх прэзідэнтаў Францыі, ён памёр на 57-м годзе жыцця.

[4] Каралева Эльжбета (1837–1898) — жонка імператара Аўстра-Венгрыі Франца Іосіфа I, забітая анархістам Луіджы Лукені, калі яна ў суправаджэнні адной са сваіх фрэйлін ішла па набярэжнай Жэневы.

[5] Аляксандр I Абрэновіч (1876–1903) — кароль Сербіі ў 1889–1903 гг., апошні прадстаўнік дынастыі Абрэновічаў. Забіты групай афіцэраў-змоўшчыкаў разам з жонкай, каралевай Драгай, пад час так званага Майскага пераварота.

[6] Вялікі князь Сяргей Аляксандравіч (1857–1905) — пяты сын цара Аляксандра II, маскоўскі генерал-губернатар. Загінуў ад бомбы рэвалюцыянера Каляева.

і царыцы і цешыўся іх спагадай і прыязнасцю. Сярод пецярбургскай арыстакратыі Распуцін быў вядомы як пабожны старац, поўны духу з дарам прарока. Пасміхаючыся, але за зачыненымі вокнамі, у нас у правінцыі пра гэтага святога старца пераказвалі на вуха розныя непрыстойныя гісторыі. Можа быць, і выпадак з Распуціным быў зроблены і раздзьмуты толькі з мэтай адцягнуць увагу натоўпу ад катастрофы, якая ўжо насоўвалася, як чорная хмара, каб скіраваць увагу ў іншы бок. А тым часам, як звычайна працавалі, выконвалі службовыя абавязкі, гулялі ў прэферанс, збіраліся ў лідскім рэстаране вядомых братоў Вінаградавых на гулянкі, кахаліся, сварыліся і мучыліся ў штодзённым шэрым жыцці. Маленькія людзі, як чарвякі, выгіналіся вакол сваіх маленькіх што дзён ных спраў, а вялікія людзі ўладжвалі вялікія інтарэсы. І ў тое шэрае штодзённае жыццё стукнула як гром з яснага неба — в а й н а!

II

Лідскі павет у 1914 г. складаўся з 23 гмін: Лідскай (Дуброўня), Дакудаўскай, Ганчарскай, Беліцкай, Жалудоцкай, Арлянскай, Ражанкаўскай, Радунскай, Шчучынскай, Лядскай (Дэмбрава), Астрынскай, Дубіцкай, Пакроўскай (Нарбутава)[1], Васілішскай, Лябёдскай, Тарноўскай (Белагруда), Мытлянскай, Забалацкай, Каняўскай, Эйшышскай, Беняконьскай, Александраўскай (Палецкішкі), Жырмунскай — і належаў да Віленскай губерні. Агульная плошча павета 5615,7 км^2, а лічба жыхароў (без г. Ліды) даходзіла да 250 000. Гміны Ліпнішская, Сядліцкая, Суботніцкая і Іўеўская, якія цяпер належаць да Лідскага павета[2], у тым часе ўваходзілі ў склад Ашмянскага павета, які сваёй плошчай (6885,1 км2) і колькасцю насельніцтва (да 270000) пераўзыходзіў усе астатнія паветы Віленскай губерні. Найвышэйшым чыноўнікам і прадстаўніком Лідскага павета быў павятовы маршалак шляхты граф Людвік Грабоўскі[3], прамы нашчадак апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Панятоўскага ад марганатычнага шлюбу з Эльжбе-

[1] Цяпер — вёска Першамайская Шчучынскага раёна, гістарычная назва — Сабакінцы, перад Першай сусветнай вайной мястэчка пераназванае ў Пакроўскае, перад Другой сусветнай — у гонар Людвіка Нарбута ў Нарбутава.

[2] Пры канцы 1930-х гг. гэтыя абшары ўваходзілі ў Лідскі павет.

[3] Мае пошукі паказваюць, што Шымялевіч, як заўсёды, меў рацыю. Альжбета Грабоўская з Шыдлоўскіх (1748—1810) мела 16 гадоў, калі будучы кароль Рэчы Паспалітай, а ў той час яшчэ літоўскі стольнік, патрапіў пад яе жаночыя чары і прапанаваў яе бацьку, харунжаму, абірацца паслом на канвакацыйны сойм. Пасля ўступлення на трон Станіслаў Аўгуст даў бацьку Альжбеты асобнае Познанскае кашталянства, а потым пасадзіў у крэсла плоцкага ваяводы. Акрамя жаночай прывабнасці яна мела яна яшчэ добры розум і разуменне палацавага этыкету і пражыла 20 гадоў пры двары Станіслава Аўгуста, уплывала на прызначэнне ўраднікаў, стараст, на узнагароджанне чыноўнікаў, была прызнана найвышэйшай арыстакратыяй і мела павагу да канца свайго жыцця». Ва ўзросце 20 ці 21 год Альжбета выйшла замуж за ўдаўца, генерала Яна Ежы Гра-

тай Грабоўскай. З судова-адміністрацыйнага боку павет быў падзелены на 8 акруг з земскім начальнікам у кожнай акрузе, а з паліцэйскага боку — на 5 паліцэйскіх станаў з сядзібамі станавых прыставаў у Воранаве, Эйшышках, Шчучыне, Васілішках і Беліцы. На чале паліцыі павета стаяў павятовы спраўнік Яўген фон Гротэ дэ Буко[4]. Сталіцай павета была Ліда, дзе месцілася ўся павятовая ўлада: канцылярыя маршалка шляхты, шляхецкая апека, вайсковы камісарыят, павятовы з'езд, паліцэйская ўправа, сельскагаспадарчая ўправа, скарбовы інспектар, скарбовая каса, управа 5-й акцызнай акругі, павятовы вайсковы начальнік, школьны інспектар і т. д. Горад Ліда меў 16000 жыхароў, дзяржаўную мужчынскую гімназію, прыватную жаночую гімназію Навіцкіх, дзве прыватныя прагімназіі, вышэйшую

боўскага. Пасля шлюбу Грабоўскія выехалі ў свой маёнтак ў Літве. Калі генерал памёр, ад гэтага другога шлюбу засталося пяць дзяцей: Аляксандр, Павел, Міхал, Казімір, Ізабела і Станіслаў. Прычым натарыяльна было заверана, што Станіслаў — сын караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У кастрычніку 1784 г. кароль марганатычна жаніўся з удавой генерала Грабоўскага. «Дзеці яе адгэтуль выхоўваліся пры двары, кароль меў да іх вялікую ласку праз каханне да пані Грабоўскай, якую, аднак, публічна за жонку не прызнаваў не толькі таму, што гэта было дрэнна для каралеўскай годнасці, але і таму, што не жадаў пагаршаць і так дрэнныя адносіны з Грабоўскімі — лідарамі дысідэнцкіх канфедэрацый» — пісаў гісторык Юльян Барташэвіч. Таемная жаніцьба таксама дрэнна ўздзейнічала на рэлігійныя пачуцці народа, які і да таго не любіў Грабоўскую і абвінавачваў яе ў спрыянні збліжэнню караля з Расіяй. Перад выбухам паўстання 1794 г., кароль адправіў сваю жонку ў Галіцыю, а потым у Вену. У гэты час сын караля Станіслаў, вучыўся ў Рыме, кароль дасылаў сваёй жонцы 300 дукатаў у квартал, а сыну — 250. Пазбаўлены кароны Станіслаў Аўгуст жыў у Пецярбургу, дзе па міласці цара Паўла I яму было дазволена мець свой двор, пані Грабоўская, пакінуўшы дзяцей у Варшаве, прыехала да свайго мужа і была з Панятоўскім да ягонай смерці ў сакавіку 1798 г. Было ёй ў той час каля 50 гадоў. Пасля смерці караля вярнулася ў Варшаву, і праз нейкі час яе салон пачаў лічыцца лепшым у горадзе. Памерла Альжбета Грабоўская 28 траўня 1810 г. Прызнаны сын караля Панятоўскага, Станіслаў, нарадзіўся 1780 г. і атрымаў прозвішча Грабоўскі — кароль ніколі не жадаў публічна прызнавацца ў сваім марганатычным шлюбе. Станіслаў Грабоўскі — з 1793 г. камандор мальтыйскага ордэна, з 1812 г. — сакратар Рады Міністраў герцагства Варшаўскага, з 1819 г. — каштэлян, з 1825 г. — міністр асветы і рэлігійных вызнанняў Польскага каралеўства, у 1836 г. — генеральны кантралёр у чыне расійскага тайнага дарадцы. Меў дзве жонкі: Цацылію з Дамбоўскіх і Юлію з Забелаў. З першай жонкай меў дачку Меланню і сыноў Леана і Людвіка. З другой жонкай меў дачок Марыю і Міхаліну. Граф Людвіг (другі сын Станіслава і Цацыліі з Дамбоўскіх) нарадзіўся ў 1809 г. Меў дзве жонкі: Лаўру з Бычэўскіх і Камілу з Астрогаў. Ад першай жонкі меў сына Уладзіслава, які ў сваю чаргу жаніўся з Марыяй Мілачэўскай і меў сына Людвіка, які і займаў пасаду маршалка Лідскага павета. Маршалак лідскай шляхты Людвік Грабоўскі быў жанаты з Марыяй Свентажэцкай, меў сына Уладзіслава (1890 г.н.) і дачку Зоф'ю. — Гл: Лаўрэш Леанід. Маршалкі Лідскага павета // Лідскі Летапісец. 2020. №2 (90). С. 13—19.

[4] Яўген фон Гротэ дэ Буко (1862–1944), лідскі спраўнік, у 1915 г. добраахвотнікам пайшоў на фронт, у 1917 г. атрымаў чын генерал-маёра, у 1918 г. — лідар беларускага руху ў Лідзе, пра яго гл. Лаўрэш Леанід. Генерал Яўген фон Гротэ дэ Буко // Лідскі летапісец. 2014. №1 (65). С. 59–64.

пачатковую школу, дзве парафільныя школы — мужчынкую і жаночую, народную вучэльню, талмуд-тору і слаўную іешыву рабіна Райнеса. У Лідзе знаходзіліся фабрыкі і заводы: два бровары — Папірмайстра і Пупко, спіртзавод Стругача, тартак Палячака, ліцейны завод братоў Шапіраў, тытунёвая фабрыка Віленчыка, фабрыка па вырабе мыла Кіяловіча, фабрыка разліву манапольнага алкаголю, шмат крам і аптовых складаў. З фінансавых устаноў у горадзе меліся: Таварыства ўзаемнага крэдыту, Яўрэйскі супольны банк, Банкаўская кантора Янушкевіча. Дзякуючы свайму знаходжанню на скрыжаванні дзвюх чыгуначных ліній Ліда сваімі фабрычнымі вырабамі, таварнымі складамі, банкаўскімі і адукацыйнымі ўстановамі лічылася дастакова значным горадам у прамежку паміж Вільняй і Баранавічамі, Маладзечнам і Ваўкавыскам. Бурмістрам горада быў надворны дарадца Лявон Пётр Вісмант, ягоным намеснікам — падпалкоўнік запасу Баляслаў Гейштаўт, абодва лідзяне-католікі і трапілі на свае пасады праз выбары.

У Лідзе стала, з часоў падзелаў Рэчы Паспалітай, дыслакаваліся расійскія войскі. У 1872–1887 гг. тут знаходзіўся штаб 4-га палка данскіх казакоў, прычым сам полк часткова месціўся ў горадзе, а часткова ў ваколіцах горада. У 1887–1891 гг. у Лідзе кватараваў 2-й чыгуначны батальён. Пасля пераводу гэтага батальёна ў Баранавічы ў горад перадыслакаваўся 89-ы рэзервовы батальён пяхоты з Дынабурга. Хутка гэты батальён перафармаваны ў 2-батальённы 185-ы Лідскі резэрвовы полк, з якога потым створаны 4-батальённы 172-і Лідскі полк пяхоты. Гэты полк адпачатку кватараваў у прыватных наёмных дамах, часткова размяшчаўся ў маёнтку Нясікаўшчына пад Лідай, у мястэчку Беліца і нават у Алькеніках. Кожны год 28 (15) мая полк выязджаў у летні лагер пад Араны, адкуль вяртаўся звычайна 28 (15) верасня. У 1908–1912 гг. на землях, падораных горадам, ваенная будаўнічая камісія на чале з генерал-маёрам Канабіхам пабудавала для Лідскага палка прасторныя і на той час добра абсталяваныя казармы, куды полк пераехаў у 1912 г. У гэтым палку служылі жаўнеры з сярэдняй і ўсходняй Расіі. Афіцэраў мясцовага паходжання налічвалася толькі некалькі чалавек. Камандзірам палка быў палкоўнік Уладзімір Раманаў.

Пасля дэмабілізацыі Манжурскай арміі ў 1906 г. з Далёкага Усходу ў Ліду была пераведзеная 9-я паветраплавальная рота, якая першапачаткова дыслакавалася ў прыватных хатах па вуліцы Віленскай, каля праваслаўных могілак. У 1910 г. у Лідзе была сфармаваная 4-я паветраплавальная рота. Будаўнічая камісія на перададзенай дзяржаўным скарбам зямлі маёнтка Перапечыца, які належаў Яну і Міхалу Садоўскім, пабудавала казармы і іншыя патрэбныя будынкі, у тым ліку вялізны элінг для дырыжабляў — драўляны на металічным каркасе.

Каардынаваў дзейнасць цывільных уладаў з вайскоўцамі павятовы вайсковы начальнік, які прымаў ад вайсковага камісарыята прызванага на службу рэкрута, праводзіў адбор і рассылаў рэкрутаў па палках. Жаўне-

ры пасля адбыцця кадравай службы ці працягвалі службу ў резерве, ці прыпісваліся ў народнае апалчэнне і таму захоўвалі па хатах нават неабходны рыштунак. Над усімі вайсковымі ўладамі стаяў камендант горада падпалкоўнік Кароўнікаў.

Галоўным ваенным асяродкам нашых земляў была Вільня: тут стала знаходзіўся камандуючы вайсковай акругай са сваім штабам і ўсімі неабходнымі службамі і ўправамі, камандаванне 3-га армейскага корпуса, камандаванне 27-й і 43-й дывізій, некалькі палкоў пяхоты і кавалерыі, артылерыя, інжынерныя аддзелы і т. д. Камандуючым войскамі Віленскай акругі быў генерал-ад'ютант, генерал ад кавалерыі Павел фон Рэненкампф, які пасля пачатку вайны аўтаматычна станавіўся камандуючым арміяй.

На дабрабыт такіх гарадоў, як Вільня, Коўна, Гродна, Ліда, Баранавічы, Слонім і інш., значны ўплыў рабілі вялікія грошы, якія даваліся на ўтрыманне войска і дадавалі значную частку да гандлёвага абароту гэтых гарадоў, стымулюючы развіццё рознічнага і аптовага гандлю, павялічваючы падаткі і забяспечваючы хуткі рост гарадоў. Іншыя павятовыя гарады — Навагрудак, Ашмяны, Вілейка і г. д., якім бракавала гэтай «жыццядайнай крыніцы», — знаходзіліся ў нэндзе і развіваліся значна павольней.

III

У Дзяржаўнай думе ў Пецярбургу і ў расійскай прэсе доўгі час абмяркоўвалася справа даўзбраення арміі. Левыя партыі былі супраць выдаткаў на мілітарызацыю і прапагандавалі пацыфізм. У другой палове чэрвеня, у часы побыту ў Пецярбургу прэзідэнта Францыі Пуанкарэ, там страйкавала вялікая колькасць фабрычных рабочых, адбываліся вулічныя дэманстрацыі, якія праходзілі з гвалтам. Тут, у Лідзе, разумелі, што хтосьці, не жадаючы саюзу з Францыяй, такім чынам пераконваў французаў у няпэўнасці Расіі як саюзніка, хворага на рэвалюцыю. Тым часам з нагоды сараеўскага забойства вяліся дыпламатычныя перамовы.

23 (10) ліпеня аўстра-венгры ўручылі ў Белградзе ультыматум з патрабаваннем адказу да 6 вечара 25 (12) ліпеня. Аднак адказ Сербіі не задаволіў аўстра-венграў, і таму ў той жа дзень яны абвясцілі частковую мабілізацыю. 26 (13) ліпеня былі разарваныя стасункі з Сербіяй, а праз два дні пачалося бамбадаванне Белграда. Расія, якая здаўна супернічала з Аўстра-Венгрыяй за першынства на Балканскім паўвостраве, заступілася за Сербію. Не было сумневу, што Францыя выступіць на баку Расіі. Аўстра-венгры абапіраліся на Германскую імперыю, якая ў адпаведнасці з трактатам трайнога саюза абавязана была падаць ім усялякую дапамогу ў выпадку вайны. Справа міру або вайны ляжала ў руках Англіі, без дапамогі якой Расія і Францыя не жадалі пачынаць вайну з немцамі. Пра гэта ўсё адкрыта пісалася ў газетах і зусім вольна абмяркоўвалася на вуліцах. Насельніцтва

прарочыла буйнамаштабную вайну. Нарасталі страх і нервовае хваляванне. У паветры моцна запахла порахам, але ўвогуле не дапушчалася, каб цывілізаваныя народы у XX ст. «взбесились от жира» і пачалі самую агідную разню па ўсім свеце.

25 ліпеня 1914 г. на лідскай чыгуначнай станцыі, як і на іншых станцыях, была вывешаная аб'ява, перададзеная тэлеграфам, пра тое, што чыгунка здымае з сябе ўсялякую адказнасць за тэрміны перавозу грузаў. Была гэта першая афіцыйная ластаўка, якая прадвяшчала надыходзячую буру. У той жа дзень на палігоне пад Аранамі, калі артылерыя выставіла свае гарматы і рыхтавалася да вучэбных стрэльбаў, раптам была атрыманая тэлеграма з загадам спыніць вучэнні і выступіць на месца пастаяннай дыслакацыі — на зімовыя кватэры. Адначасова юнкерам Віленскай вайсковай вучэльні, якія знаходзіліся ў тым жа лагеры пад Аранамі, начальнік вучэльні генерал-маёр Адамовіч зачытаў загад аб прысваенні вайсковых званняў 170 юнкерам выпускнога курса. Такія імпрэзы, як правіла, праводзіліся ў дзень Праабражэння Гасподняга, 19 (6) жніўня. Маладым афіцэрам уручылі толькі афіцэрскія шаблі, бо абмундзіраванне яшчэ не было гатовае. Праз некалькі гадзін лагер ліквідавалі і войска пачало марш. Сярод афіцэрскіх і падафіцэрскіх жонак пачаўся перапалох, кінуўшы ўсё, яны з лецішчаў накіраваліся ў гарады.

У нядзелю, 26 (13) ліпеня, калі па чыгунцы з Аран пачалі прыбываць аддзелы палка, у горадзе ўжо ведалі: пачынаецца в а й н а! Першыя прыбылыя аддзелы Лідскага палка ўзялі пад ахову ўсе чыгуначныя аб'екты: масты, водаправоды і іншыя тэхнічныя сродкі абслугоўвання, а таксама сувязь. Усюды стаялі ўзброеныя салдаты, забараняўся нават выхад на перон вакзала. Для нас, цывільных, усё гэта выглядала дзіўна і несамавіта. Паліцыя і жандары «па сакрэце» расказвалі гараджанам, што такія экстраардынарныя меры бяспекі выкліканы небяспекай страйку чыгуначнікаў. Сельскае насельніцтва, занятае сваімі штодзённымі справамі і клопатам, у найменшай ступені разважала пра катастрофу, якая на нас насоўвалася. Таму ў бліжэйшую нядзелю ў касцёлах і цэрквах, як і заўжды, браліся шлюбы, людзі з музыкай і танцамі святкавалі вяселлі і хрэсьбіны.

29 (16) ліпеня Расія абвясціла мабілізацыю Кіеўскай, Маскоўскай і Казанскай вайсковых акруг. Пра гэта мы даведаліся з газет пад вечар наступнага дня, у чацвер 30 (17) ліпеня. На вуліцы Віленскай[1] горада сабраліся групкамі гараджане, яны чыталі толькі што атрыманыя з цягніка газеты, і кожны на свой капыл каментаваў бягучую сітуацыю ў свеце. Мабілізацыя яшчэ не пачалася, і агульным перакананнем было тое, што Расія толькі робіць дэманстрацыю сваёй магутнасці, а насамрэч вайны не будзе, бо ніхто яе не хоча. Зрэшты, балканскія справы для Расіі ўвогуле

[1] Цяпер Савецкая.

заўжды былі самымі складанымі і толькі шкодзілі ёй. Праз некалькі гадоў слушна сказаў міністр замежных спраў Ізвольскі, што няма ніякага сэнсу змушаць разанскага селяніна праліваць сваю кроў за незразумелыя для яго інтарэсы Сербіі. Над Лідай, выконваючы вучэбны палёт, нізка кружыў аэраплан «Фарман». Ён зрабіў круг над рынкам[1] і паляцеў на ўсход. Раптам аэраплан пачаў хутка зніжацца і падаць. Натоўп раззявак, думаючы, што аэраплан упадзе ў зарасці вольхі каля рэчкі Лідзейкі, кінуўся ў бліжэйшыя завулкі — Шкляны, Камерцыйны, Паліцэйскі[2]. Але пілот выраўняў машыну, і яна зноў узвілася пад аблокі. Раззявакі пачалі вяртацца да цэнтра, і якраз у гэты час па Віленскай вуліцы на дрожках да паліцэйскай управы імчаўся, трымаючы ў руцэ дэпешу, павятовы паліцэйскі спраўнік Гротэ дэ Буко. Адразу ўсе зразумелі: м а б і л і з а ц ы я! У імгненне вока вуліца апусцела. Да позняй ночы горад не спаў. Кожны зразумеў, што вайна непазбежная і нікога яна не абміне.

Мабілізацыю ў горадзе павінны былі праводзіць: управа вайсковага начальніка, прызыўная камісія і паліцыя. Маршалак шляхты граф Грабоўскі[3], які павінен быў узначаліць мабілізацыю ў павеце, ад вясны лячыўся ў Пецярбургу — ён меў камяні ў жоўцевым пузыры і ў нырках. Яго абавязкі выконваў земскі начальнік 1-га ўчастка Міхаіл Трафімаў. Па-

[1] Сучасная плошча Леніна.

[2] Гэтыя вуліцы вялі ў бок рэчкі Лідзеі.

[3] Грабоўскі Людвіг Владзіслававіч, маршалак лідскага павета з 07.06.1906 па 25.07.1916 г. Як вядома, дваранскія выбары ў Заходніх губернях паўстанне адноўлены не былі і граф Людвіг Владзіслававіч Грабоўскі на сваю пасаду быў прызначаны. У 1903—1917 гг. ён пабыў павятовым правадзіцелям дваранства Дзісенскага, Лідскага і Віленскага паветаў. Людвіг Грабоўскі быў мясцовым абшарнікам, валодаў маёнткамі ў Лідскім павеце Віленскай губерні і Навагрудскім павеце Мінскай губерні. Ягоная жонка мела маёнткі ў Вілейскім і Свянцянскім паветах. Да 39 гадоў ён займаўся гаспадаркай у сваіх маёнтках, пакуль ў 1903 г. ня быў прызначаны земскім начальнікам ў Свенцянскім павеце. Кар'ера Л. В. Грабоўскага складвалася дрэнна, але ён працягваў служыць, бо спадзяваўся, што губернскае кіраўніцтва выканае свае абяцанні і ён атрымае хуткае падвышэнне па службе і такім чынам вырашыць свае матэрыяльныя праблемы. Аднак пасада маршалка каштавала яму двух маёнткаў, якія давялося прадаць для пакрыцця расходаў па службе, і страты даверу мясцовых абшарнікаў. Пра абяцанні службовай кар'еры давялося нагадваць гадамі, адзіным суцяшэннем было залічэнне ў спіс кандыдатаў на пасаду віцэ-губернатара Віленскай альбо ў адной з цэнтральных губерняў. Грабоўскі спрабаваў атрымаць пасаду старшыні Віленскага павятовага з'езда міравых суддзяў ці перавесціся ў Вільню участковым міравым суддзёй, але ягоныя просьбы былі пачутыя толькі ўлетку 1916 г. і ён атрымаў жаданую пасаду Віленскага павятовага маршалка дваранства. Аднак губерня была ўжо акупавана немцамі (Гл: Байрашаускайте Тамара. Институт предводителей дворянства в западных губерниях Российской империи во второй половине XIX в. — начале XX в. (Виленская и Ковенская губернии) // Białoruskie Zeszyty Historyczne №41. Białystok, 2014. S. 84—85.) Таксам Людвіг Грабоўскі быў вядомым конназаводчыкам, пра ягоны ўдзел у Агульнарасійскай выставе 1883 г. пісаў Уладзімер Гіляроўскі ў кнізе «Сябры і сустрэчы»: *«Палова чэрвеня, а ўжо пачыналі вызначацца кандыдаты на выйгрыш дэрбі, хоць ўладальнікі на ранішніх галопах стараліся*

вятовы спраўнік фон Гротэ дэ Буко, капітан рэзерву, яшчэ да пачатку вайны падаў у адстаўку па ўзросце, чакаў загаду аб выхадзе на пенсію і таму знаходзіўся ў адпачынку. У сувязі з набліжэннем вайны віленскі губернатар Вяроўкін перапыніў яго адпачынак і загадаў выконваць свае абавязкі. Ва ўправах ужо некалькі дзён працавалі, рыхтуючы розныя паперы, неабходныя пры мабілізацыі сельскага насельніцтва ў павеце. На бяду, у той жа час у Беняконях згарэла ўправа гміны з шафкай, у якой былі падрыхтаваныя мабілізацыйныя дакументы. На гэтую тэму шмат балбаталі, але выпадак ніякіх наступстваў за сабой не пацягнуў, акрамя ўзмоцненай працы, каб аднавіць знішчаныя лісты. Праца ва ўстановах вялася ўдзень і ўночы.

30 (17) ліпеня аб 11-й гадзіны ночы выконваючы абавязкі маршалка шляхты Трафімаў атрымаў дэпешу, змест якой дазваляў думаць, што мабілізацыйныя справы варта прыпыніць. Усе працуючыя ў прызыўной камісіі з прычыны гэтага слабага пробліску надзеі ўздыхнулі з палёгкай і ледзь не пайшлі дахаты. Праз некалькі гадзін новая дэпеша адмяніла папярэднюю і загадала далейшы працяг працы. Калі бракавала бланкаў, паліцыя будзіла друкара Айзіка Эпштейна, які ўжо спаў, і выпраўляла ў друкарню яго працаўнікоў, бланкі тэрмінова друкаваліся. А тым часам конная паліцыя ўсю ноч імчалася ўсімі дарогамі ў цэнтры гмін і да паліцэйскіх прыставаў, уручаючы ім мабілізацыйныя распараджэнні.

У пятніцу 31 (18) ліпеня Ліду і ўсе вёскі ў павеце ўпрыгожылі каляровымі плакатамі.

З іх:

1) чырвоныя прызывалі ў войска шарагоўцаў рэзерву;

2) блакітныя — народнае апалчэнне з прызыву 1908–1913 гг., прычым ваеннаабавязаныя старэйшых узростаў былі залічаныя ў народнае апалчэнне з рэзерву;

3) белыя загадвалі пастаўку коней у войска, і

4) белыя паведамлялі кошты на прадметы экіпіроўкі, якія прызыўнікі павінны былі прынесці з сабой.

Акрамя таго, вялікі плакат з подпісам камандуючага войскам генерал-адьютанта ген. фон Рэненкампфа апавяшчаў жыхароў гарадоў і вёсак пра салідарную адказнасць за захаванне чыгункі, тэлеграфа і іншых сродкаў

схаваць жвавасць сваіх крэкоў (Крэк — фаварыт) … Як журавель на балоце, у далёкім куту іпадрома нерухома стаяў польскі конназаводчык Людвіг Грабоўскі. Свайго трэцягодку, які, як ён верыў, павінен па-за канкурэнцыяй ўзяць дэрбі, Грабоўскі не пускаў сёння, таму што шмат сабралася публікі. Гэты заўзяты паляўнічы любіў скакавую публіку толькі ў тыя моманты, калі ягонага коня, які ўзяў вялікі прыз, публіка заахвочвала апладысментамі. Тады Грабоўскі прама ад вагаў, яшчэ не астылага скакуна браў левай рукой за лейцы і правадзіў перад трыбунамі пад апладысменты публікі, у адказ размахваючы цыліндрам паднятым вышэй галавы каня» (Гл: Гиляровский В. А. Друзья и встречи. Сборник. Москва: Директ-Медиа, 2010. С. 112—113.)

камунікацыі і сувязі. Адначасова камандуючы войскам забараніў продаж алкаголю як у дзяржаўных, так і ў прыватных месцах продажу. Горад і вёска былі заспетыя мабілізацыяй знянацку, бо яшчэ некалькі дзён таму ніхто не дапушчаў, што справы зойдуць так далёка. У кавярні Маліноўскага (цяпер крама Бердаўскіх каля кінатэатра «Эдысон») афіцэры лідскага гарнізона пілі каву і палітызавалі на тэму, што «Германцам следует побить морду!» (Германцам варта пабіць пысу). Затое натоўпы інтэлігенцыі і простых гараджан як па камандзе рынуліся да акенцаў ашчадных кас, у банкі і банкаўскія канторы, каб забраць свае ўклады. У Лідзе каля скарбовай касы пры казначэйстве стаяла чарга даўжынёй у паўкіламетра, якая некалькі разоў абвівала касу. Каб вярнуць свае грошы, у чарзе стаяла каля паўтары тысячы чалавек. У Вільні з вуснаў у вусны перадаваліся весткі пра тое, што запасы золата з віленскіх банкаў ужо вывезены ў Ніжні Ноўгарад, і таму ў Віленскім дзяржаўным банку быў такі вялікі натоўп адборнай публікі, што шыкоўна прыбраныя пані парвалі свае багатыя строі, страцілі брыльянты і капелюшы, падрапалі твары і пашкодзілі рукі і ногі. Але банкаўскія чыноўнікі ў Лідзе і Вільні спраўна выдалі людзям іх грошы.

У суботу 1 жніўня (19 ліпеня) раніцай з самых дальніх кутоў Лідскага павета, усімі дарогамі, на вазах і пешшу ў горад збіраліся ваеннаабавязаныя мужчыны, зганялі мабілізаваных коней. Не абышлося без эксцэсаў: натоўп мабілізаваных мужчын, якія ішлі ў Ліду па Гродзенскім тракце, атакавалі гарэлачную краму ў Арлянцы (каля ракі Дзітва), разрабавалі і спалілі яе. Разам з манапалькай згарэла вялікая старажытная карчма графа Маўраса, якая стала на другім баку тракту, насупраць гарэлачнай крамы. Падобныя эксцэсы былі і ў іншых паветах, а дзе-нідзе ў патрыятычным угары грамілі местачковыя крамкі і таўклі гандляроў-яўрэяў. Гэта была расійская звычка, з якой пачынаецца ўсякая вайна. Добры паказаў такі пагром у Запарожжы Мікалай Гогаль у аповесці Тарас Бульба, а Гогаль з'яўляецца карыфеем расійскай літаратуры, на творах якога, як на ўзорах нянавісці да палякаў і яўрэяў, выгадаванае цэлае пакаленне ў царскай Расіі. Праз некалькі дзён віленскія газеты надрукавалі загад генерала Рэненкампфа, згодна з якім былі павешаныя чатыры чалавекі, вінаватыя ў пагроме гэтай манапалькі, у тэксце загада нават не ўказваліся прозвішчы павешаных і месца пакарання. Загад быў надрукаваны як улётка і развешаны па горадзе і вёсках. На чыгунцы адмянілі ўсе пасажырскія цягнікі, якія праходзілі праз Ліду. У Ліду з іншых чыгунак прыбылі брыгады машыністаў, кандуктараў і іншых ўсякага кшталту чыгуначных адмыслоўцаў, а таксама шмат лакаматываў. Удзень і ўначы без перапынку імчаліся ваенныя эшалоны з усходу на захад. З 12-гадзінным спазненнем ледзь працiскаліся па шчыльна застаўленых рэчамі станцыях паштовыя цягнікі. Уезд у Вільню і выезд без дазволу ўладоў быў забаронены. На гарадскі магістрат лёг абавязак размяшчаць войскі і мабілізаваных. Бурга-

міcтр Ліды Вісмант праводзіў свой адпачынак на Чорным моры і таму быў выкліканы адтуль тэлеграмай. Нават маючы дазвол для праезду, ён моцна спазніўся на працу. Пакуль не было бургамістра, яго абавязкі выконваў намеснік Гейштаўт, а размяшчаў мабілізаваных пашпартыст Іосіф Якубоўскі. Без адпачынку лётаў ён па горадзе, вы значаў жытло, арганізоўваў кухні, месцы для мабілізаваных коней, знаходзіў харчы і фураж. Для жаўнераў былі рэквізаваные будынкі мужчынскай гімназіі па вуліцы Камерцыйнай, жаночай гімназіі Навіцкіх па вуліцы Каменскай, пачатковая школа каля замка, абедзве парафіяльныя школы, іешыва, клуб Таварыства дабрачыннай пажарнай аховы, піўныя і іншыя будынкі. У горадзе сабралася каля 5000 мабілізаваных людзей і 2000 коней. Рэгістрацыя і агледзіны мабілізаваных жаўнераў адбываліся ў гарадскім парку па вуліцы Каменскай[1], дзе раслі стагадовыя вольхі. Тут, у парку, быў летні тэатр — зробленая з дошак пабудова з лаўкамі без даху. Менавіта тут размясцілася вайсковая камісія. У летнім тэатры лекары аглядалі мабілізаваных, пісары вялі рэгістрацыю. А з парку даносіліся енкі жанчын і дзіцячы плач — сем'і развітваліся з сваімі «кармільцамі». Людзі памяталі, што ад прызыву ў войска на Руска-японскую вайну ў 1904 г. вызваля ліся тыя, хто меў чацвёра і больш малых дзяцей, таму некаторыя на вазах везлі з сабой усю сям'ю. Большасць з іх больш ніколі не пабачылі сваіх дзяцей. У тыя дні быў уладкаваны адзіны ва ўсім Лідскім павеце невялічкі дзіцячы прытулак у Жалудку на сродкі князёў Святаполк-Чацвярцінскіх. Далейшы лёс гэтых пакінутых бацькамі дзяцей залежаў толькі ад літасці чужых людзей. У малых і вялікіх абшарніцкіх дварах, у надзеі на хуткі канец вайны, па меры магчымасці не выганялі з кватэр пакінутых жонак і дзяцей мабілізаваных парабкаў і выплачвалі ім некаторы час грошы, якія раней зарабляліх іх мужы і бацькі.

Адначасна на гарадскім Выгане каля вуліцы Фалькоўскага[2], па вуліцы Віленскай каля праваслаўных могілак і на выездзе ў бок Навагрудка, каля каталіцкіх могілак, ішоў адбор коней. Большасць людзей спакойна прадавалі сваіх коней, бо кошты дзяржаўнага закупу былі добрыя. Аднак былі і тыя, хто, прадаючы, плакалі па сваіх конях. Закупачныя камісіі працавалі як машыны. Шапталіся потым, што на мабілізацыі коней гэтыя камісіі добра нажыліся. Пасля рэгістрацыі мабілізаваных мужчын пераводзілі ў замак, дзе іх прымалі унтэр-афіцэры, адтуль адных адпраўлялі ў казармы Лідскага палка, а другіх вялі на чыгунку і размяшчалі па вагонах для перавозу ў іншыя палкі.

Афіцэры запасу і рэзерву самі прыходзілі да павятовага вайсковага начальніка.

[1] Прыкладна тут цяпер стаіць кінатэатр «Юбілейны».

[2] Цяпер тут гарадскі парк

IV

Тым часам у ноч 1 жніўня (19 ліпеня), як пра гэта трохі пазней прачыталі мы ў газетах, у Пецярбургу нямецкі амбасадар граф Пурталес уручыў міністру замежных спраў Сазонаву ноту з патрабаваннем адмовы ад мабілізацыі і папярэдзіў, што калі Расія не зробіць гэтага на працягу 12 гадзін ад моманту ўручэння ноты, дык немцы пачнуць мабілізацыю сваёй арміі. Пасля прачытання ноты міністр Сазонаў спытаў: «Гэта вайна?» «Не, — адказаў амбасадар, — гэта толькі крок ад вайны». Нямецкая мабілізацыя планавалася так, што ў кожны момант магла быць прыпыненая, а потым адноўленая зноў, у той час як расійскую, як потым казалі, прыпыніць было немагчыма. Прыпыненне і потым аднаўленне расійскай мабілізацыі выклікала б хаос і велізарныя матэрыяльныя страты, прычым аднаўленне мабілізацыі было б магчымым толькі адпачатку, па новай праграме. Для гэтага трэба было б стварыць новую праграму мабілізацыі, на што спатрэбілася б шмат часу і працы адмыслоўцаў. За гэты час непрыяцель мог бы маршавым крокам прайсці ўсю Расію. Расійская мабілізацыя была як лавіна і не было спосабу яе прыпыніць. Каля 7-й гадзіны вечара 1 жніўня (19 ліпеня) нямецкі амбасадар прыбыў да міністра замежных спраў з нотай аб'яўлення вайны, але перад тым, як уручыць ноту міністру Сазонаву, ён засведчыў, што калі расійскі ўрад вырашыць згадзіцца на дэмабілізацыю, дык ноту з абвяшчэннем вайны ўручаць не трэба. Сазонаў адказаў, што не баіцца пагроз і гатовы прыняць ноту. Амбасадар уручыў ноту, але пры гэтым вельмі хваляваўся, у яго так дрыжэлі рукі, што ён ледзь не ўпусціў ноту на падлогу. Нота была адасланая цару ў Пецяргоф. Увечары таго ж дня ў Берліне кайзер Вільгельм з балкона свайго палаца вітаў тлумы маніфестуючых немцаў, якія прыйшлі да палаца, каб падтрымаць пачатак вайны і слаўнае нямецкае войска. «Узняўшы меч, — закончыў кайзер, — зноў у похву яго можна ўкласці толькі з гонарам». 2 жніўня (20 ліпеня) у Пецярбургу ў Зімовым палацы цар Мікалай II пасля набажэнства таксама звярнуўся да прадстаўнікоў арміі і флоту з прамовай, якую закончыў: «Урачыста тут сведчу, што не атрымаю спакою да той хвіліны, пакуль апошні непрыяцельскі жаўнер не пакіне нашу зямлю». Ніводны з гэтых манархаў не атрымаў ад гісторыі шанец стрымаць сваё слова гонару.

Увечары ў нядзелю 2 жніўня (20 ліпеня) у газетах вялікімі літарамі сцісла паведамлялася: «Пецярбург. 19.VII. Амбасадар нямецкі ўручыў міністру замежных спраў ад імя свайго ўрада аб'яўленне вайны Расіі».

У той жа дзень 2 жніўня (20 ліпеня) абвешчана, што Пецярбург і губерні — Пецярбургская, Інфлянцкая, Курляндская, Ковенская, Віленская, Віцебская, Гродзенская, Валынская, Падольская, Бесарабская, Мінская — і ўсё Каралеўства Польскае знаходзяцца ў стане вайны і апублікаваны ўказ пра ваенную цэнзуру. Ваеннымі цэнзарамі ў Лідскай паштова-тэлеграфнай

управе былі прызначаны: начальнік паштовай управы, надворны да радца Калянкоўскі і чыноўнік дваранскай апекі Брухаў. Згодна з гэтым указам, абавязкам цэнзара стаў прагляд міжнароднай перапіскі, а таксама прагляд і вынятак у вызначаных выпадках мясцовай перапісцы. Адначасова абвешчаны мараторый на вэксалі.

У панядзелак 3 жніўня (21 ліпеня) у Лідзе мабілізаваныя ў войска настаўнікі народных школ у адпаведнасці з загадам школьнага інспектара Баўбліса арганізавалі патрыятычную маніфестацыю, хадзілі па горадзе з царскім партрэтам і трохкаляровымі сцягамі і спявалі «Боже, царя храни» і «Славься, славься русский царь» і т. п. Некалькі баязлівых мясцовых абывацеляў і нават некалькі гандляроў далучыліся да гэтай маніфестацыі і дапамагалі крычаць «ура». Напрыканцы маніфестанты групкамі разышліся па патайным шынкам, дзе яшчэ можна было дастаць забаронены алкаголь, выпіўка справакавала некалькі скандальных боек, у якіх узялі ўдзел асобы, вельмі паважаныя ў тутэйшым грамадстве.

У Лідзе, як, зрэшты, і ва ўсім краі, у выніку загаду зверху ў касцёле, царкве і ў сі нагозе здзяйсняліся набажэнствы за перамогу. На гэтыя набажэнствы з'яўляліся толькі афіцыйныя асобы, была адпраўленая тэлеграма імператару з выяўленнем вернападданых пачуццяў абывацеляў горада Ліды, збіраліся капейкавыя і рублёвыя ахвяраванні на вядзенне вайны, на Чырвоны Крыж і да т. п. Абшарнікі Лідскага павета (не ўсе, аднак) пасля аб'яўлення вайны падпісалі ў Вільні цару ганаровы адрас з падтрымкай.

Раніцай у чацвер 6 жніўня (24 ліпеня) на пляцы каля казармаў пашыхтаваўся 172-і Лідскі полк з поўным паходным рыштункам. Палкавы святар адслужыў малебен, а камандзір палка Раманаў вітаў асабісты склад, пажадаў хуткай перамогі і вяртання з фронту да родных агменяў. На цырымоніі іграў палкавы аркестр, прысутнічалі тысячы гараджан: дзеці, жонкі, сваякі і знаёмыя тых, хто ішоў на вайну. Пры развітанні быў такі жудасны лямант і плач, што ніхто з прысутных не мог утрымацца ад слёз. Полк па-батальённа, з музыкай і сцягамі пайшоў на станцыю для пагрузкі. Пры адпраўленні кожнага эшалона паўтараліся сцэны развітання з дарагімі людзьмі, якія ішлі на смерць. Разгорнуты да колькасці ваеннага часу 172-і полк налічваў 4000 штыкоў. У войску Рэненкампфа полк заняў месца на левым крыле ўздоўж Аўгустоўскіх лясоў. Пасля вайны і рэвалюцыі ў Расіі з былой імперыі і з нямецкага палону ў Ліду і Лідскі павет вярнулася не болей пятай часткі шарагоўцаў і некалькі афіцэраў.

Пазней з народнага апалчэння старэйшых узростаў была сфарміравана 385-я пешая Віленская дружына дзяржаўнага апалчэння, якую ўзначалілі два лідзяніны — падпалкоўнікі запасу Адольф Малеўскі і яго намеснік Баляслаў Гейштаўт. Таксама была сфармаваная 66-я конная сотня, якую ўзначаліў падпалкоўнік запасу Пізанім. Віленская дружына была адпраўленая ў Вільню, конная сотня — у Эйшышкі.

Уступ ... 3
З кнігі знакамітага прафесара біялогіі Станіслава Юндзіла: «Успаміны майго жыцця» ... 5
Лідчына ва ўспамінах Яўхіма Лелевеля ... 7
Дзённік дамініканскага візітатара (фрагмент) ... 10
Фрагмент успамінаў Андрэя Розэна ... 12
Успаміны Дома лідскіх піяраў. апошняга рэктара ксяндза Вайшвілы (фрагмент) ... 14
Успаміны Мірона Браніслава Нарбута ... 20
Лідскі павет у сярэдзіне XIX ст. ... 21
Ліда і лідзяне ... 21
Шляхта ваколічная ... 35
Пан Юзаф Гружэўскі ... 40
Селянін у летаргічным сне ... 42
Дубічы ... 43
Шлюбныя войскі ... 45
Зоф'я Кавалеўская: Гісторыя Лідскага паўстання: успаміны пра Людвіка Нарбута ... 48
Успаміны Івана Любарскага ... 126
Успаміны Мітрафана Мяжэцкага ... 144
З успамінаў Вандаліна Шукевіча ... 146
Успаміны Юльяна Гжымайлы-Прыбыткі ... 153
Сабачыя гады. Успаміны лідзяніна 50-гадовай даўніны ... 158
Успаміны Тэадоры Манчунскай з Нарбутаў ... 166
Успаміны Камілы Юрэвіч з Нарбутаў пра гісторыка Тэадора Нарбута ... 170
Успаміны Альжбеты Табенскай ... 174
Успаміны Яўстаха Шалевіча ... 283
Першая частка ... 286
Другая частка ўспамінаў. Мае навукі ... 302
Успаміны Яна Сегеня ... 328
Успаміны ксяндза Бародзіча ... 331
Успаміны Міхала Шымялевіча ... 338
З таго свету ... 339
У цішы могілак... ... 344
Ліда ў гады Вялікай вайны ... 353

Зямля, якой ужо не ўбачыш
Лідчына XVIII — XIX стагоддзяў ва ўспамінах

Составитель Леанід Лаўрэш
Переводчик Леанід Лаўрэш

Гэта другая кніга ў серыі «Лідскі кнігазбор», заснаванай ў 2018 годзе. Кніга складаецца з лідскіх мемуараў XIX стагоддзя.